ШКОЛЬНАЯ БІБЛІЯТЭКА

АНАРЭ ДЭ БАЛЬЗАК

ГАБСЭК
БАЦЬКА ГАР'Ё

ШКОЛЬНАЯ БІБЛІЯТЭКА



АНАРЭ ДЭ БАЛЬЗАК

ГАБСЭК

АПОВЕСЦЬ

БАЦЬКА ГАР'Ё

РАМАН

Мінск
«Юнацтва»
1996

ББК 84 (4 Фр)
Б 21
УДК 840-93

Для старэйшага школьнага ўзросту

Пераклад з французскай мовы

Мастак В. В. Дударанка

Бальзак А.

Б 21 Габсэк: Аповесць; Бацька Гар'ё: Раман: Для ст. шк. узросту / Пер. з фр. У. В. Палупанава, А. В. Дынько; Маст. В. В. Дударанка. — Мн.: Юнацтва, 1996.— 304 с., іл. — (Школьная бібліятэка).

ISBN 985-05-057-3.

Аповесць «Габсэк», раман «Бацька Гар'ё» — толькі дзве невялікія часткі з цыкла «Чалавечая камедыя», у склад якой уваходзяць 95 асобных твораў. Усе разам яны ствараюць шырокую карціну жыцця Францыі ў эпоху вялікіх гістарычных перамен ад Французскай рэвалюцыі 1789 года да 30—40 гадоў XIX стагоддзя.

Б $\frac{8400000000—056}{М\ 307\ (03)—96}$ 67—96

ББК 84 (4 Фр)

ISBN 985-05-0057-3

© У. В. Палупанаў, А. В. Дынько. Пераклад, 1996
© В. В. Дударанка. Афармленне, 1996

ГАБСЭК

АПОВЕСЦЬ

Барону Баршу дэ Пэнаэну

З усіх былых выхаванцаў Вандомскага каледжа, здаецца, толькі адны мы з табою выбралі літаратурную ніву, — нездарма ж мы захапляліся філасофіяй у тым узросце, калі нам належала захапляцца толькі старонкамі De viris[1]. Мы сустрэліся з табою зноў, калі я пісаў гэтую аповесць, а ты працаваў над сваімі цудоўнымі творамі пра нямецкую філасофію. Такім чынам, мы абодва не здрадзілі свайму прызванню. Спадзяюся, табе будзе гэтаксама прыемна бачыць тут сваё прозвішча, як мне прыемна яго напісаць.

Твой стары школьны сябар
дэ Бальзак

Аднойчы зімовым вечарам — было гэта ў 1829 ці 1830 годзе — у салоне ў вікантэсы дэ Гранльё позна, аж да першай гадзіны ночы, заседзелася двое гасцей. Яны не належалі да сваякоў. Адзін, прыгожы малады чалавек, пачуўшы, што гадзіннік на каміне выбіў першую гадзіну, паспяшаўся адвітацца. Калі на двары загрукаталі колы яго экіпажа і вікантэса засталася адна з братам ды

[1] *De viris illustribus* («Аб знакамітых мужах») — хрэстаматыя рымскага гісторыка Карнелія Непота (I ст. да н. э.), у якой падаюцца, галоўным чынам, біяграфіі палкаводцаў, служыла дапаможнікам для вывучэння лацінскай мовы ў школах.

сябрам сям'і, якія заканчвалі партыю ў пікет[1], яна падышла да дачкі; дзяўчына стаяла каля каміна, робячы выгляд, што ўважліва разглядае ажурны ўзор над агменем, але, відавочна, яна прыслухоўвалася да грукату кабрыялета; гэта прымусіла маці ўпэўніцца ў сваіх прадчуваннях.

— Каміла, калі ты й далей будзеш трымаць сябе з графам дэ Рэсто гэтак, як сёння вечарам, мне давядзецца адмовіць яму ад дому. Паслухай мяне, дзіцятка, я ж табе не чужая, дазволь мне часам памагаць табе ў жыцці. У семнаццаць год дзяўчына яшчэ не здольная меркаваць ні пра мінулае, ні пра будучыню, ні пра пэўныя патрабаванні грамадства. Скажу табе толькі адно: маці ў спадара дэ Рэсто — гэта жанчына, якая здольная праглынуць мільённае багацце, гэта асоба нізкага паходжання: да замужжа прозвішча ў яе было Гар'ё, і яна мела вельмі нядобрую рэпутацыю. Яна дрэнна ставілася да свайго бацькі і, далібог, не заслугоўвае такога добрага сына, як месье дэ Рэсто. Малады граф яе вельмі любіць і падтрымлівае з сыноўняй адданасцю, вартай усялякае пахвалы. А як ён клапоціцца пра сваіх сястру, брата! Адным словам, у яго сапраўды ўзорныя паводзіны, але, — дадала вікантэса з хітраватай усмешкаю, — пакуль яго маці жывая, ні адна прыстойная сям'я не даверыць гэтаму міламу юнаку будучыню і пасаг сваёй дачкі.

— Я пачуў некалькі слоў з вашай з мадам дэ Гранльё размовы, і мне вельмі хацелася б сёе-тое сказаць, — прамовіў сябар сям'і, якога мы згадвалі раней. — Граф, я выйграў, — дадаў ён, павярнуўшыся да партнёра. — Пакідаю вас і спяшаюся на дапамогу вашай пляменніцы.

— Вось ужо сапраўды слых страпчага! — здзівілася вікантэса. — Дарагі Дэрвіль, як вы маглі пачуць, пра што мы гутарылі з Камілай... Мы ж шапталіся ледзьве чутна.

— Я ўсё зразумеў з вашых вачэй, — адказаў Дэрвіль, апускаючыся ў глыбокі фатэль каля каміна.

Камілін дзядзька сеў побач з пляменніцай, а мадам дэ Гранльё — на нізкім крэселцы паміж дачкой і Дэрвілем.

— Пара мне, вікантэса, расказаць вам адну гісторыю, якая прымусіць вас перамяніць погляд на становішча графа Эрнэста дэ Рэсто ў вышэйшым свеце.

— Гісторыю?! — ускрыкнула Каміла. — Расказвайце хутчэй, спадар Дэрвіль!

---

[1] Гульня ў карты для дзвюх асоб.

Страпчы кінуў на мадам дэ Гранльё позірк, з якога яна зразумела, што гэты аповяд будзе ёй цікавы. Вікантэса дэ Гранльё сваім багаццем і знатным паходжаннем належала да найбольш уплывовых дам у Сен-Жэрменскім прадмесці[1], і, вядома, можа падацца дзіўным, што звычайны парыжскі страпчы асмеліўся размаўляць з ёю, як з роўнай сабе, і вельмі вольна трымаць сябе ў яе салоне. Але тлумачыцца гэта лёгка. Мадам дэ Гранльё, вярнуўшыся ў Францыю разам з каралеўскай сям'ёю, пасялілася ў Парыжы і спачатку жыла толькі на сродкі, прызначаныя ёй Людовікам XVIII з сум цывільнага ліста[2], — становішча для яе невыноснае. Страпчы Дэрвіль выпадкова заўважыў фармальныя парушэнні, дапушчаныя ў свой час Рэспублікай пры продажы маёнтка Гранльё, і заявіў, што гэты дом належыць вярнуць вікантэсе. Згодна з яе даручэннем ён павёў працэс у судзе і выйграў яго. Асмялеўшы ад гэтага поспеху, ён распачаў паклёпніцкую справу з прытулкам для старых і дамогся таго, што вікантэсе вярнулі лясныя абшары ў Ліснэ. Пасля гэтага ён пацвердзіў яе правы на ўтрыманне некалькіх акцый Арлеанскага канала і досыць вялікія будынкі, якія імператар ахвяраваў грамадскім установам.

Маёмасць вікантэсы дэ Гранльё, вернутая дзякуючы намаганням маладога паверанага, пачала даваць ёй каля шасцідзесяці тысяч франкаў штогадовага даходу, а тут яшчэ падаспеў закон аб вяртанні страт эмігрантам, і яна атрымала вялізныя грошы. Гэты страпчы, чалавек надзвычай сумленны, адукаваны і сціплы, меў добрыя манеры і хутка зрабіўся сябрам сям'і Гранльё. Сваімі паводзінамі ў дачыненні да спадарыні дэ Гранльё ён дасягнуў пашаны і займеў кліентуру ў найлепшых дамах Сен-Жэрменскага прадмесця, аднак не карыстаўся іх прыхільнасцю, як мог бы гэта рабіць якісь славалюбца. Ён нават адхіліў прапановы вікантэсы, якая пераконвала яго прадаць сваю кантору і перайсці ў судовае ведамства, дзе ён мог бы пры яе заступніцтве вельмі хутка зрабіць кар'еру. За выключэннем дома вікантэсы дэ Гранльё, дзе ён часам праводзіў вечары, Дэрвіль бываў у свеце толькі дзеля падтрымання сувязей. Ён лічыў сябе шчаслівым, што, аддана абараняючы інтарэсы спадарыні дэ Гранльё, пака-

---

[1] Раён Парыжа, заселены пры Бальзаку дваранскай знаццю.

[2] Сума, прадугледжаная дзяржаўным бюджэтам на асабістыя расходы манарха і ўтрыманне яго двара.

заў і сваю вартасць, інакш ягонай канторы пагражаў бы заняпад: у ім не было пранырлівасці звычайнага страпчага. З таго часу, як граф дэ Рэсто з'явіўся ў доме вікантэсы, Дэрвіль, заўважыўшы сімпатыю Камілы да гэтага юнака, пачаў штодня наведваць салон спадарыні дэ Гранльё, як той франт з Шасэ-д'Антэн[1], які толькі што атрымаў доступ у арыстакратычнае кола Сен-Жэрменскага прадмесця. За некалькі дзён да названага вечара ён сустрэў на балі мадмуазэль дэ Гранльё і сказаў ёй, паказваючы вачыма на графа:

— Шкада, што ў гэтага юнака няма двух-трох мільёнаў! Праўда?

— Чаму «шкада»? Я не думаю, што гэта няшчасце, — адказала яна. — Месье дэ Рэсто чалавек вельмі здольны, адукаваны, мае добры аўтарытэт у міністра, да якога ён прыкамандзіраваны. Я ані не сумняваюся, што з яго выйдзе выдатны дзеяч. А калі «гэты юнак» атрымае ўладу, багацце само прыйдзе яму ў рукі.

— Слушна, але калі б ён быў багаты ўжо цяпер!

— Калі б ён быў багаты... — чырванеючы, паўтарыла Каміла, — што ж, тады б усе паненкі, што тут танцуюць, аспрэчвалі яго адна ў адной, — дадала яна, паказваючы на ўдзельніц кадрылі.

— І тады, — сказаў страпчы, — мадам дэ Гранльё не была б тым адзіным магнітам, што прываблівaў яго позіркі. Вы, здаецца, зачырванеліся... у чым прычына? Вы неабыякавыя да яго? Ну, скажыце, калі ласка...

Каміла порстка паднялася з крэсла.

«Яна закахалася ў яго», — падумаў Дэрвіль.

З таго часу Каміла пачала выказваць асаблівую ўвагу страпчаму, зразумеўшы, што Дэрвіль ухваляе яе сімпатыю да Эрнэста дэ Рэсто. А да тае пары, хоць ёй і было вядома пра тое, што яе сям'я шмат у чым абавязана Дэрвілю, яна мела да яго больш павагі і сяброўскае прыхільнасці, чым цеплыні. У яе манерах і голасе было нешта такое, што паказвала на адлегласць, вызначаную паміж імі нормамі, прынятымі ў свеце. Удзячнасць — гэта абавязак, які дзеці не надта ахвотна бяруць у спадчыну ад бацькоў.

Дэрвіль зрабіў паўзу, задумаўшыся, а пасля пачаў наступным чынам:

---

[1] Раён Парыжа, дзе пры Бальзаку жыла фінансавая буржуазія.

— Сённяшні вечар нагадаў мне пра адну падобную да рамана гісторыю, якіх больш у маім жыцці не здаралася... Ну вось, вам ужо і смешна; вам весела чуць, што ў страпчага могуць быць нейкія раманы. Але ж і мне некалі было дваццаць пяць год, а ў тыя маладыя гады я пабачыў ужо шмат дзіўных рэчаў. Мне спачатку давядзецца расказаць вам пра адну дзейную асобу майго апавядання, якой вы, вядома ж, не маглі ведаць. То быў адзін ліхвяр... Не ведаю, ці вы з маіх слоў здолееце ўявіць сабе твар гэтага чалавека, які я, з дазволу Акадэміі, гатовы назваць *месяцападобным*, бо яго жаўтлявая бясколернасць нагадвала колер срэбра, з якога аблузалася пазалота. Валасы ў майго ліхвяра былі зусім прамыя, заўсёды дбайна зачасаныя і — з ладнай ужо сівізною — попельна-шэрыя. Твар быў нерухомы, у яго рысах адсутнічала ўсялякая пачуццёвасць, як у Талейрана[1], здавалася, што гэтыя рысы вылітыя ў бронзе. Вачам, маленькім і жоўтым, быццам у тхара, і амаль без вейкаў, было балюча ад яркага святла, таму ён захінаў іх вялікім брылём паношанага картуза. Востры кончык доўгага носа, пабіты рабаціннем, нагадваў свярдзёлак, вусны былі тонкія, быццам у алхімікаў ці ў вельмі старых дзядоў на карцінах Рэмбрандта і Мэтсу. Размаўляў гэты чалавек ціха, мякка, ніколі не гарачыўся. Яго ўзрост быў таямніцай: я ніколі не мог зразумець, ці ён састарэў ад часу, ці наадварот — добра захаваўся і застанецца маладжавы на вечныя вякі. Усё ў ягоным пакоі было пацёртае, але дагледжанае, пачынаючы ад зялёнага сукна на пісьмовым стале і да каберца перад ложкам, — зусім як у халодным прытулку самотнай старой дзеўкі, якая цэлы дзень толькі й робіць, што наводзіць парадак ды навашчвае мэблю. Узімку ў ягоным каміне ледзь тлелі галавешкі, прысыпаныя попелам, і яго агмень ніколі не азараўся яркім агнём. Ад першай хвіліны пасля абуджэння і да вечаровых прыступаў кашлю ўсе яго дзеянні былі размеркаваныя, як рух маятніка. Гэта быў чалавек-аўтамат, завод якога падналяўляўся штодня. Гэтаксама як макрыца, што, паўзучы па аркушы паперы, імгненна спыняецца і дранцвее, калі да яе дакранешся, вось так і гэты чалавек раптам змаўкаў пасярод размовы, чакаючы, пакуль аціхне грукат

[1] *Талейран*, Шарль Морыс (1754—1838) — вядомы пры Напалеоне I дыпламат і палітык, які вызначаўся надзвычайнай беспрынцыповасцю.

экіпажа, што праязджаў пад вокнамі, і не хочучы ўзмацняць голасу. На ўзор Фантанэля ён дбайна ашчаджаў сваю жыццёвую энергію[1] і гнаў прэч усякія чалавечыя пачуцці. Яго жыццё цякло ціха, як бяжыць пясок у старым пясочным гадзінніку. Здаралася, праўда, што яго ахвяры гучна абураліся, уздымалі немаведама які гвалт, але ўрэшце надыходзіла мёртвая цішыня — быццам на кухні, дзе толькі што зарэзалі качку. І толькі пад вечар чалавек-вэксаль ператвараўся ў звычайнага чалавека, а злітак металу ў ягоных грудзях — у чалавечае сэрца. Калі ён бываў задаволены скончаным днём, ён паціраў рукі, і з глыбокіх зморшчын на яго твары быццам праменілася весялосць, — далібог, цяжка знайсці іншыя словы, каб перадаць гэтую яго нямую ўсмешку, Гэтую гульню мускулаў на яго твары, якая выяўляла, відаць, тыя самыя пачуцці, што і бязгучны смех Скураной Панчохі[2]. Заўсёды, нават у хвіліны найбольшай радасці, ён быў ашчадны на словы і стрымліваў свае пачуцці. Такога вось суседа паслаў мне лёс, калі я, працуючы тады яшчэ малодшым пісцом у канторы страпчага і будучы студэнтам апошняга курса на факультэце права, жыў на вуліцы Грэ. У гэтым змрочным і сырым доме не было двара, усе вокны выходзілі на вуліцу, а пакоі нагадвалі манаскія келлі: усе аднолькавай велічыні, з адзінымі дзвярыма, што вялі ў доўгі цёмны калідор з маленькімі акенцамі. Зрэшты, некалі гэты будынак напраўду служыў манастырскім заезным дваром. У такім змрочным жытле любы свецкі гарэза адразу губляў усю сваю бойкую гуллівасць яшчэ раней, чым заходзіў да майго суседа; дом і яго жыхар вельмі добра дапасоўваліся адно да аднаго — як скала і прыліплая да яе вустрыца. Адзіны чалавек, з якім стары, як кажуць, падтрымліваў адносіны, быў я. Ён часам заходзіў да мяне папрасіць агню, браў пачытаць якую кнігу або газету, і дазваляў мне таксама заходзіць увечары ў свой катушок, дзе мы, здаралася, гутарылі, калі ён меў схільнасць да гэтага. Такія знакі даверу былі плёнам чатырохгадовага суседства і маіх узорных паводзін, якія тлумачыліся адсутнасцю ў мяне грошай і

---

[1] Бальзак мае на ўвазе ў вышэйшай ступені ўраўнаважаны і спакойны характар французскага пісьменніка Фантанэля (1657—1757).

[2] *Скураная Панчоха* — мянушка паляўнічага Наці Бумпо, героя серыі раманаў амерыканскага пісьменніка Фенімора Купера (1789—1851).

рабілі маё жыццё шмат у чым падобным да жыцця старога. Ці былі ў яго сваякі, сябры? Бедны ён быў ці багаты? Ніхто не здолеў бы адказаць на гэтыя пытанні. Я ніколі не бачыў грошай у яго ў руках. Яго багацце, калі яно і было, захоўвалася, відаць, у сутарэнні нейкага банка. Ён сам спаганяў па выдадзеных яму вэксалях і сам бегаў па ўсім Парыжы на сваіх танклявых, сухіх, нібы ў аленя, нагах. Аднаго разу, дарэчы, ён такі пацярпеў праз сваю празмерную асцярожлівасць. З нейкай прычыны ў яго было тады пры сабе золата, і раптам адна манета — а гэта быў падвойны напалеяндор — выпала з кішэні яго камізэлькі. Жыхар, што ішоў па прыступках следам за старым, падняў манету і хацеў яе вярнуць. Але стары замахаў рукамі:

— Гэта не мая! — закрычаў ён. — Золата! У мяне? Няўжо я жыў бы так, як жыву, каб быў багаты?!

Штораніцы ён сам варыў сабе каву на жалезнай пячурцы, якая стаяла ў закуродымленым куце побач з камінам; абед яму прыносілі з рэстарацыі; і ў строга вызначаны час старая брамніца прыходзіла прыбіраць у яго пакоі. Прозвішча ў яго — з дзіўнай волі выпадку, які Стэрн назваў бы прадвызначальным, — было вельмі нязвыклае: Габсэк[1]. Пазней, калі ён даручыў мне весці яго справы, я даведаўся, што да пачатку нашага з ім знаёмства яму ўжо было семдзесят шэсць гадоў. Ён нарадзіўся ў 1740 годзе ў прадмесці Антверпена; маці ў яго была жыдоўка, бацька — галандзец; поўнае яго імя гучала так: Жан-Эстэр ван Габсэк. Вы, напэўна, памятаеце тую справу з забойствам жанчыны, празванай Гожаю Галандкай, — справу, якая так захапіла свайго часу ўвесь Парыж. Дык вось, калі я ў размове з суседам паміж іншым прыгадаў пра гэтую падзею, стары, без ніякае зацікаўленасці і эмоцый, паведаміў:

— Яна была мая ўнучатая пляменніца.

І гэта было ўсё, што здолела выклікаць у яго смерць ягонай адзінай спадкаемніцы, унучкі яго сястры. На судовым разборы я даведаўся, што сапраўднае імя Гожай Галандкі было Сара ван Габсэк. І калі я папрасіў яго растлумачыць тую дзіўную акалічнасць, чаму ўнучка яго сястры насіла ягонае прозвішча, ён адказаў з усмешкай:

— У нашым родзе жанчыны ніколі не выходзілі замуж.

---

[1] Той, хто харчуецца сухама *(франц.)*.

Гэты дзіўны чалавек ні разу не захацеў убачыць ніводную прадстаўніцу чатырох жаночых пакаленняў, што складалі яго радню. Ён ненавідзеў сваіх спадкаемніц і нават думкі не дапускаў, каб хто-небудзь мог завалодаць яго багаццем нават пасля яго смерці. У дзяцінстве маці ўладкавала яго юнгам на карабель, і ў дзесяцігадовым узросце ён адплыў да земляў, якімі Галандыя валодала ў Ост-Індыі. Там ён бадзяўся цэлыя дзесяць гадоў. І цяпер у зморшчынах яго жаўтаватага лба хаваліся, відаць, сляды цяжкіх выпрабаванняў і неспадзяваных, страшных падзей, нечаканых удач, рамантычных гісторый і бязмернае радасці, галодных дзён і няўдалага кахання, вялікага багацця, банкруцтва і новага ўзбагачэння, і, вядома ж, смяротнай небяспекі, калі жыццё вісіць на адным валаску і яго ратуюць лічаныя імгненні ці раптоўны бязлітасны і рашучы ўчынак, які можа апраўдаць толькі жыццёвая неабходнасць. Ён ведаў месье дэ Лалі, адмірала Сімеза, месье дэ Кергаруэта і д'Эстэна, байі дэ Сюфрэна, месье дэ Партандзюэра, лорда Карнуэлса, лорда Гастынгса, бацьку Тыпа-Саіба і Тыпа-Саіба самога[1]. З ім вёў справы той самы саваяр, што служыў у Дэлі ў раджы Махаджы-Сіндыяха і дапамагаў узвышэнню магутнасці дынастыі Махаратаў. Былі ў яго нейкія сувязі і з Віктарам Юзам ды іншымі славутымі карсарамі, бо ён доўга жыў на востраве Сен-Тама. Ён усяго паспытаў, спрабуючы разбагацець, і хацеў нават знайсці знакаміты залаты скарб, закапаны племем дзікуноў недзе ў ваколіцах Буэнас-Айрэса. Ён меў дачыненне да ўсіх перыпетый вайны за незалежнасць Злучаных Штатаў. Але пра Індыю ці Амерыку ён гутарыў толькі са мною, дый тое вельмі рэдка, і кожны раз пасля гэтага нібыта раскайваўся за сваю «балбатлівасць». Калі лічыць чалавечнасць і лучнасць людзей своеасаблівымі рэлігіямі, дык Габсэка можна было б назваць атэістам. Хоць я ставіў сабе за мэту вывучыць гэтага чалавека, але, на свой сорам, павінен прызнаць, што да апошняй хвіліны яго душа так і засталася для мяне таямніцай за сямю пячаткамі. Часам я нават пытаўся ў сябе, якога ён полу. Калі ўсе ліхвяры — падобныя да яго, дык, пэўна, яны ўсе павінны належаць

---

[1] Тут упамінаюцца імёны ваенных і палітычных дзеячаў Францыі, Англіі і Індыі часоў англа-французскай барацьбы за ўладу ў Індыі (50—60-я гады XVIII ст.) *Кергаруэт, дэ Партандзюэр* — персанажы «Чалавечай камедыі».

да роду бясполых. Ці захоўваў ён вернасць рэлігіі сваёй маці, лічачы ўсіх хрысціян за здабычу? Ці стаў каталіком, магаметанінам, прыхільнікам брахманізму ці лютэранінам? Я нічога не ведаў пра яго веравызнанне. Ён здаваўся хутчэй абыякавым да рэлігійных пытанняў, чым добрым вернікам. Увогуле ён ужо сам ператварыўся ў залатога балвана, за што яго ахвяры — дзеля смеху ці дзеля кантрасту — далі яму мянушку «тата Габсэк». Аднойчы вечарам я чарговы раз зайшоў да гэтага чалавека. Ён сядзеў, як звычайна, у сваім глыбокім фатэлі, нерухомы, як стод, утаропіўшыся ў выступ на каміне і нібыта перабіраючы ў думках свае ўліковыя квіткі ды цэтлікі. Закуродымленая лямпа на аблезлай зялёнай падстаўцы кідала цьмянае святло на яго твар, не ажыўляючы яго ніводнаю фарбай, і ён толькі здаваўся яшчэ больш бледным. Стары зірнуў на мяне і моўчкі паказаў рукой на крэсла, дзе я звычайна сядзеў.

«Пра што думае гэты чалавек? — пытаўся я ў сябе. — Ці ведае ён, што на свеце ёсць Бог, пачуцці, жаночае каханне, шчасце?»

І мне нават зрабілася неяк шкада яго, быццам ён быў цяжка хворы. Але я выдатна разумеў, што, маючы мільёны ў банку, ён можа ў думках уяўляць сабе, што валодае ўсімі краінамі, якія аб'ездзіў, аблазіў, узважыў, ацаніў, абрабаваў.

— Дзень добры, тата Габсэк, — сказаў я.

Ён павярнуў галаву, і яго густыя чорныя бровы ледзь зварухнуліся, — гэты характэрны ў яго рух быў раўназначны самай ветлівай усмешцы ў жыхара поўдня.

— Нешта вы хмурыцеся сёння, як таго дня, калі атрымалі паведамленне пра банкруцтва кнігавыдаўца, якога гэтак хвалілі за спрыт, ды ўрэшце зрабіліся ягонай ахвярай.

— Ахвярай? — здзіўлена перапытаў ён.

— А памятаеце, ён дамогся тады ад вас палюбоўнага пагаднення перапісаць усе вэксалі на падставе сваёй неплацежаздольнасці, а потым, калі справы ў яго наладзіліся, спасылаючыся на гэтае пагадненне, запатрабаваў, каб вы зменшылі яму доўг.

— І праўда, ён быў хітрун, — пагадзіўся стары. — Але потым я зноўку яго прыціснуў.

— Можа, вам пара ўжо спаганяць па якіх-небудзь вэксалях? Здаецца, сёння трыццатае.

Я ўпершыню загаварыў з ім пра грошы. Ён ускінуў на мяне вочы і неяк кпліва варухнуў брывамі; а потым ціхім пісклявым галаском, вельмі падобным да гуку флейты ў руках няўмелага музыканта, прамовіў:

— Я забаўляюся.

— Дык вы часам і забаўляецеся?

— А вы думаеце, паэт — толькі той, хто друкуе вершы? — спытаў ён, паціскаючы плячыма і пагардліва прыжмурваючыся.

«Паэзія? У такой галаве?» — здзівіўся я, бо тады яшчэ нічога не ведаў пра яго ранейшае жыццё.

— А ў каго можа быць болей бліскучае жыццё, чым у мяне? — сказаў ён, і позірк у яго загарэўся. — Вы малады, у вас бунтуе кроў, а ў галаве праз гэта — туман. Вы глядзіце на распаленыя галавешкі ў каміне і бачыце ў агеньчыках жаночыя твары, а я ў іх бачу толькі вуголле. Вы ўсяму верыце, а я не веру нічаму. Што ж, вядома, вы можаце і далей песціць свае ілюзіі. А я вам зараз скажу, да чаго ўвогуле зводзіцца чалавечае жыццё. Будзьце вы бадзягам-вандроўнікам ці дамаседам, які ніколі не адыходзіць ад каміна ды жонкі, усё адно ўрэшце надыходзіць узрост, калі ўсё жыццё паўстае як простая звычка да любага вам асяроддзя. І тады шчасце — у практыкаванні сваіх здольнасцяў адносна рэальнасцей жыцця. Апроч гэтых двух правіл, усё астатняе — фальш. У мяне, напрыклад, прынцыпы мяняліся згодна з абставінамі: мне даводзілася іх мяняць у залежнасці ад геаграфічнае шыраты. Тое, што ў Еўропе называюць уцехай, у Азіі падлягае жорсткаму пакаранню. Тое, што ў Парыжы называюць заганай, за Азорскімі астравамі лічыцца неабходнасцю. На зямлі няма нічога трывалага, ёсць толькі ўмоўнасці, і ў кожным клімаце яны розныя. Таму для чалавека, якому міжволі часта даводзілася прыладжвацца да ўсякіх грамадскіх нормаў, усялякія вашы маральныя правілы і перакананні — пустыя словы. Непарушнае толькі адно пачуццё, укладзенае ў нас самою прыродай: інстынкт самазахавання. У дзяржавах еўрапейскай цывілізацыі гэты інстынкт завецца асабістым інтарэсам. Вось пажывіце гэтулькі, як я, дык даведаецеся, што з усіх даброт на зямлі ёсць толькі адна досыць надзейная, каб чалавеку варта было да яе імкнуцца. Гэта... золата. У золаце сканцэнтраваныя ўсе сілы чалавецтва. Я вандраваў, бачыў, што на ўсёй зямлі ёсць раўніны і горы. Раўніны надакучаюць, горы стамляюць;

карацей кажучы, у якім месцы жыць — гэта не мае значэння. А што да нораваў — дык чалавек усюды аднолькавы. Усюды ідзе барацьба паміж беднымі і багатымі, усюды. І яна непазбежная. Дык лепш бы ўжо самому душыць, чым дазваляць, каб цябе душылі. Усюды мускулістыя людзі працуюць, а худыя пакутуюць. Дый асалоды паўсюль адны і тыя ж, і паўсюль яны аднолькава забіраюць сілы; але даўжэй за ўсе асалоды жыве толькі адна ўцеха — фанабэрыя. Фанабэрыя! Гэта заўжды наша «я». А што можа задаволіць фанабэрыю? Золата! Патокі золата. Каб ажыццявіць нашыя вычварныя задумы, патрэбен час, патрэбны матэрыяльныя магчымасці ці намаганні. Ну і што! У золаце ў зародку закладзена ўсё, і яно ўсё здольна зрабіць рэальным.

Толькі вар'яты ды хворыя людзі могуць знаходзіць шчасце ў тым, каб кожны вечар бавіць час, гуляючы ў карты і спадзеючыся выйграць некалькі су. Толькі дурні могуць траціць час на разважанне пра самыя будзённыя справы: уссядзецца якая такая паня на канапе — адна ці ў якой-небудзь прыемнай кампаніі, — і невядома, чаго ў ёй болей, крыві ці лімфы, тэмпераменту ці дабрачыннасці? Толькі прасцякі могуць думаць, што яны прыносяць карысць навакольным, займаючыся выпрацоўкаю палітычных прынцыпаў, дзякуючы чаму нібыта можна кіраваць падзеямі, якіх ніколі не магчыма прадбачыць. Толькі ёлупням можа быць прыемна гаманіць пра актораў і паўтараць іхнія досціпы, кожны дзень хадзіць на шпацыр, соўгацца там сюды-туды, як тыя звяры ў клетцы, з тым, бадай, невялікім адрозненнем, што ў іх болей прасторы; прыбірацца дзеля іншых, ладзіць бяседы дзеля іншых, выхваляцца чыстапародным канём ці навамоднаю брычкай, якую пашчасціла купіць на цэлыя тры дні раней за суседа. Вось вам і ўсё жыццё вашых парыжан: усё яно ўкладаецца ў гэтыя некалькі сказаў, ці не так? Але зірніце на існаванне чалавека з той вышыні, на якую ім не ўзняцца. У чым шчасце? Гэта альбо моцныя хваляванні, альбо размераныя заняткі, якія ператвараюць яго ў нешта накшталт добра адрэгуляванага англійскага механізму. Вышэй за гэтае шчасце стаіць так званая «высакародная» цікаўнасць — імкненне пранікнуць у таямніцы прыроды і дасягнуць выбітных вынікаў, імітуючы яе з'явы. Вось вам, у двух словах, усё мастацтва і навука, халоднасць і жорсткасць. Ці ж не? Гэтак вось праходзяць перада мною ўсе чалавечыя пачуцці, якія распаляюцца ў

сутыкненні самых розных інтарэсаў, што напаўняюць нашае грамадства, а я — я ўважліва разглядаю іх — і застаюся спакойны. Вашую навуковую цікаўнасць — своеасаблівы двубой, у якім чалавек заўсёды церпіць паражэнне, — я замяняю пранікненнем у першапрычыны і матывы, якія кіруюць чалавецтвам. Карацей, я валодаю светам, не натамляючы сябе, а свет — не мае нада мной ніякай улады.

— Вось паслухайце, — загаварыў ён, памаўчаўшы, — я раскажу вам дзве гісторыі, якія здарыліся сёння раніцай у мяне на вачах. Тады, напэўна, вы зразумееце, у чым мае ўцехі.

Ён устаў, зачыніў дзверы на засаўку; падышоўшы да акна, захінуў старую дывановую парцьеру, якая завішчала колцамі, пасоўваючыся па металічным пруце; і нарэшце зноў сеў у крэсла.

— Сёння раніцай, — сказаў ён, — мне трэба было выставіць даўжнікам толькі два вэксалі: астатнія яшчэ ўчора я пусціў на разлікі па сваіх аперацыях. Хоць які барыш! Бо пры ўліку я скідаю з плацежнай сумы выдаткі на вяртанне пазыкі і стаўлю па сорак су за рамізніка, хоць і не думаю яго наймаць. Вам, мусіць, смешна, што за нейкія шэсць франкаў працэнта я бягу праз увесь Парыж? Але ж гэта я! Чалавек, які нікому не падпарадкоўваецца і плаціць усяго сем франкаў падатку. Дык вось, першы вэксаль, на тысячу франкаў, падаў мне адзін малады чалавек — сапраўдны прыгажун ды фарсун: камізэлька ў іскарку, ларнет, адкрытая брычка, конь англійскай пароды і г. д. А падпісаны вэксаль быў жанчынай — адной з найпрывабнейшых парыжанак, жонкай досыць багатага памешчыка (і апроч таго — графа). Чаму ж яснавяльможная графіня падпісала гэты вэксаль, які не меў сілы, але практычна быў абсалютна надзейны? А таму, што ўсе гэтыя вартыя жалю кабеты, свецкія пані, да таго баяцца сямейных скандалаў, якія могуць паўстаць у выпадку апратэставання вэксаля, што яны гатовыя разлічыцца нават сваёю асобай, калі няздольныя заплаціць грашмі. Мне надта карцела выведаць таямніцу гэтага вэксаля. Што за ім хаваецца: глупства, бяздумнасць, каханне ці спагада? Другі вэксаль на такую ж суму, падпісаны нейкай Фані Мальво, падаў мне адзін гандляр палатном — відавочны кандыдат на банкруцтва. Бо ніводзін чалавек, які мае хоць самы малы крэдыт у банку, не пойдзе да мяне ў кантору: першы ўжо крок ад

парога пакоя да майго стала сведчыць пра поўны яго адчай, пра марныя пошукі атрымаць пазыку ў любым банку і пра набліжэнне непазбежнага краху. Мне даводзіцца бачыць толькі зацкаваных аленяў, за якімі гоніцца цэлая зграя пазыкадаўцаў. Графіня жыве на Гельдэрскай вуліцы, а Фані Мальво — на вуліцы Манмартр. Пра што я толькі сабе не думаў, калі сёння ўранні выходзіў з дому! Калі ў гэтых жанчын няма чым плаціць, яны, вядома, сустрэнуць мяне ласкавей за роднага бацьку. Я ўяўляў, якія штукі пачне выкідаць графіня, якую састроіць камедыю за гэтую тысячу франкаў! Як ветліва яна заўсміхаецца, залапоча ліслівым, пяшчотным галаском — тым самым, якім заляцаецца да малойчыка, на чыё імя выдадзены вэксаль. Можа, нават будзе мяне маліць! А я...

Стары скінуў на мяне халодным позіркам.

— А я буду непахісны! — сказаў ён. — Я прыходжу заўжды як адплата, як дакор нячыстаму сумленню... Але пакінем мае здагадкі. Раскажу лепш пра тое, што было, калі я прыйшоў.

— Графіня яшчэ не ўставала, — паведаміла мне пакаёўка.

— Калі ж яе можна пабачыць?

— Не раней дванаццаці.

— Што, графіня хварэе?

— Не, месье, яна вярнулася з балю а трэцяй гадзіне раніцы.

— Маё прозвішча Габсэк. Перадайце, што прыходзіў Габсэк. Я зайду яшчэ раз апоўдні.

І я пайшоў да выхада, пакідаючы бруднымі чаравікамі плямы на дыване, што быў пасланы на мармуровай лесвіцы. Я люблю пэцкаць дываны ў багатых людзей і раблю гэта не праз дробязнае сваё самалюбства, а каб даць гэтым асобам адчуць учэпістыя кіпцюры Немінучасці.

Прыходжу на вуліцу Манмартр, у няўклюдны дом, адчыняю ў браме старую фортку, аглядаю двор, што нагадвае калодзеж, у які ніколі не зазірае сонца. У пакойчыку брамніцы цёмна, шкло ў вакенцы зацухмоленае, як рукаў цёплага, але заношанага халата.

— Тут жыве мадэмуазель Фані Мальво?

— Тут, але яе цяпер няма. Калі вы наконт вэксаля, дык яна пакінула вам грошы.

— Я зайду пазней, — быў мой адказ.

Яна пакінула грошы ў брамніцы — што ж, гэта цудоўна, але мне цікава паглядзець на саму даўжніцу. Я ўяўляў яе гэткай прыгожанькаю баламутніцай. Дык вось. Ранак я правёў на бульвары, разглядаючы гравюры ў вітрынах. Але роўна апоўдні я ўжо быў у гасцёўні, дзверы з якой вялі ў спальню графіні.

— Гаспадыня толькі нядаўна першы раз пазваніла, — заявіла мне пакаёўка. — Я не думаю, каб яна прыняла вас цяпер.

— Я пачакаю, — адказаў я і сеў у крэсла.

Праз пэўны час жалюзі расчыніліся, пакаёўка выбягае і кажа:

— Калі ласка, месье.

Па салодкім галаску пакаёўкі я адразу сцяміў, што яе гаспадыні няма чым плаціць. Але затое якая гэта была прыгажуня! Спяшаючыся, яна паспела накінуць на аголеныя плечы кашміравы шаль, і пад ім добра ўгадваліся яе прывабныя формы. На ёй быў толькі багаты пеньюар, аздоблены беласнежнымі брыжамі, а гэта значыла, што прачцы, здольнай мыць тонкую бялізну, яна павінна была плаціць не менш за дзве тысячы франкаў у год. Яе галаву, як у крэолкі, абвінала нядбала павязаная стракатая ядвабная хустка, з-пад якой выбіваліся буйныя чорныя кудзеры. Пасцель была змятая, і гэта сведчыла, што сон у жанчыны быў трывожны. Мастак аддаў бы нямала за магчымасць пабыць гэтым ранкам хоць некалькі хвілін у спальні ў маёй даўжніцы. Кожная складка фіранак тут дыхала пяшчотаю. Прасціна, што збілася набок на блакітным пухавіку, ярка вылучалася сваімі белымі карункавымі фальбонкамі на яго светла-сінім фоне і, здавалася, яшчэ захоўвала невыразны адбітак прывабных форм, якія дражнілі ўяўленне. На мядзведжай шкуры, кінутай пад ногі бронзавым ільвам, што падтрымлівалі ложак з чырвонага дрэва, блішчалі белым аксамітам чаравікі, нядбайна скінутыя стомленаю жанчынай, што позна вярнулася з балю. З крэсла на падлогу, засланую шыкоўным дываном, звешвалася ўшчэнт пакамечаная сукенка. Ножку крэсла абвіналі тонкія празрыстыя панчохі, нібыта занесеныя сюды подыхам ветру. На канапцы валяліся белыя шаўковыя падвязкі. На каміне блішчаў і пераліваўся ўсімі колерамі вясёлкі паўраскрыты дарагі веер. Шуфляды ў камодзе былі выцягнутыя. Па ўсім пакоі былі раскіданыя кветкі, брыльянты, пальчаткі, паясы, шматлікія іншыя рэчы бальнага ўбору. Пахла

нейкай далікатнай парфумай. Ва ўсім адчувалася пазбаўленая гармоніі прыгажосць, бачыліся раскоша і непарадак. Але за гэтай раскошаю праглядвала беднасць, што пагражала жанчыне і яе каханку, выскаляючы на іх свае вострыя бязлітасныя зубы.

Стомлены твар графіні нагадваў сваім выглядам яе спальню, якая яшчэ захоўвала прыкметы мінулага свята. Раскіданыя паўсюль рэчы выклікалі ў мяне жаль: яшчэ ўчора яны былі яе ўборам, хтосьці захапляўся імі. Зліваючыся ў адно, яны ўтваралі вобраз кахання, атручанага згрызотамі, вобраз бязладнага жыцця, раскошы, гаманлівай марнасці; яны выдавалі танталавы пакуты, з якімі яна старалася падоўжыць настолькі нетрывалыя ўцехі свайго існавання. Чырвань на шчоках у гэтай жанчыны сведчыла толькі пра далікатнасць яе тонкае скуры, але твар быў ужо трошкі азызлы, і гэта яшчэ мацней акрэслівала цёмныя кругі вакол яе вачэй. Аднак жыццёвая энергія віравала ў ёй па-ранейшаму, і адзнакі бязладнага жыцця не псавалі яе прыгажосці. Бляскам сваіх вачэй яна нагадвала адну з найпрыгажэйшых Ірадзіяд, што належалі пэндзлю Леанарда да Вінчы (а некалі я, дарэчы, гандляваў палотнамі старых майстроў), ад яе павявала сілаю і жыццём. Ні ў лініях яе прывабнага стану, ні ў рысах стомленага аблічча не было нічога кволага ці недасканалага. Несумненна, яе павінны былі кахаць, але сама яна была мацнейшая за гэтае пачуццё. Адным словам, гэтая жанчына мне спадабалася. Даўно маё сэрца не білася з такім хваляваннем. І можна сказаць, што я ўжо атрымаў сваю плату. Ды я сам аддаў бы тысячу франкаў, каб зноў зведаць пачуцці, якія нагадалі б мне дні маёй маладосці.

— Месье, — прамовіла яна, прапанаваўшы сесці, — ці не будзеце вы такія ласкавыя, каб крыху адтэрмінаваць плацеж?

— Да заўтра, апоўдні, графіня, — прамовіў я, складваючы вэксаль, які толькі што паказаў. — Да гэтага часу я не буду мець права апратэставаць ваш вэксаль.

А сам падумаў: «Плаці, плаці за ўсю гэтую раскошу, за свой тытул, за сваё шчасце, за ўсе выключныя прывілеі, якімі ты карыстаешся. Дзеля аховы свайго дабра багацеі прыдумалі трыбунал, суддзяў, гільяціну, на якую дурні лезуць самі, як матылькі на полымя. Але для вас, людзей, якія спяць на ядвабе ды ядвабам накрываюцца, ёсць нешта іншае: прыхаваныя ўсмешкаю згрызоты і

скрогат зубоў, пачвары з ільвінымі пашчамі, што ўтыкаюць свае іклы вам у самае сэрца.

— Апратэставаць вэксаль? Няўжо вы гэта зробіце? — прамовіла яна, утаропіўшыся ў мяне вачыма. — Няўжо вы мяне так мала паважаеце?

— Графіня, нават каб мне быў вінен кароль і каб ён не заплаціў у тэрмін, я падаў бы на яго ў суд хутчэй, чым на любога іншага даўжніка.

У гэтую хвіліну нехта ціха пастукаў у дзверы.

— Мяне няма дома! — незадаволеным голасам крыкнула графіня.

— Анастазі, гэта я. Мне трэба пагутарыць з вамі.

— Крыху пасля, дарагі, — адказала яна не так рэзка, але й зусім не ласкава.

— Што за жарты! Вы ж з кімсьці там размаўляеце, — азваўся голас, і ў пакой увайшоў мужчына. Відавочна, гэта быў сам граф.

Графіня зірнула на мяне, і я адразу зразумеў, што цяпер яна зрабілася маёю рабыняй.

Быў час, малады чалавек, калі я па сваёй дурноце не апратэстоўваў вэксаляў. У 1763 годзе, у Пандышэры, я пашкадаваў адну жанчыну, і што з гэтага атрымалася?! Яна абдзерла мяне як ліпку! Ды так мне і трэба! Навошта я ёй даверыўся!

— Што вам трэба, месье? — спытаў у мяне граф.

І тут я прыкмеціў, што ягоная жонка дрыжыць дробнымі дрыжыкамі — уся яе аксамітная шыя спрэс пакрылася гусінаю скурай. Мяне разбіраў смех, хоць ніводзін мускул не зварухнуўся на маім твары.

— Гэта адзін з маіх пастаўшчыкоў, — сказала графіня.

Граф павярнуўся да мяне спінай, і я выцягнуў з кішэні ражок складзенага вэксаля. Заўважыўшы мой бязлітасны жэст, маладая кабета нахілілася і неўпрыкмет ад мужа сунула мне ў руку брыльянт.

— Вазьміце, — ціха прамовіла яна, — вазьміце і хутчэй ідзіце адсюль.

У абмен на брыльянт я вярнуў ёй вэксаль і, адбіўшы паклон, выйшаў з пакоя. На маю думку, брыльянт каштаваў добрых тысячу дзвесце франкаў. На графскім падворку я ўбачыў цэлы натоўп рознай дворні: лёкаяў, якія чысцілі шчоткамі свае ліўрэйныя фракі ды наводзілі на боты глянец, конюхаў, якія старанна мылі раскошныя эпіпажы. Адным словам, я ўбачыў тое, што гоніць да

мяне гэтых знатных паноў, тое, што прымушае іх з прыстойным выглядам красці мільёны і прадаваць радзіму. Каб ходзячы пешкі, не запэцкаць сваіх лакіраваных боцікаў важны пан і той, хто намагаецца быць да яго падобным, гатовы сам з галавой акунуцца ў гразь. Якраз у гэты момант вароты расчыніліся, і ў двор на кабрыялеце ўляцеў той самы малады франт, які ўлічыў у мяне графінін вэксаль.

— Месье, — сказаў я, калі ён выскачыў з кабрыялета, — вось дзвесце франкаў, перадайце іх, калі ласка, графіні і скажыце, што заклад, які яна мне дала, я крыху прытрымаю. Словам, на гэтым тыдні ён яшчэ будзе ў яе распараджэнні.

Франт узяў грошы, і па яго вуснах прабегла ўсмешка, якая казала: «Ага, заплаціла! Ну што ж, выдатна!»

І я прачытаў на яго твары ўсю будучыню графіні. Гэты бялявы прыгажун, халодны, бяздушны ігрок, дойдзе да галечы сам і давядзе яе разам з мужам і дзецьмі, прамантачыўшы іх спадчыну. А потым у іншых салонах учыніць разруху не горшую, чым артылерыйская батарэя ў непрыяцельскіх войсках.

Урэшце я накіраваўся на вуліцу Манмартр да мадэмуазель Фані. Падняўшыся па вузкіх пакручастых сходах на шосты паверх, я ўвайшоў у двухпакаёвую кватэру, дзе ўсё дыхала чысцінёй і блішчала, як новенькі дукат. Тут не было ніводнай пылінкі. У першым пакоі мяне сустрэла маладзенькая гаспадыня, апранутая проста, але з вытанчанасцю парыжанкі. Ветлівы выгляд ёй надавалі грацыёзная галоўка, свежы колер твару. Каштанавыя, прыгожа зачасаныя валасы, што ляжалі двума гладкімі паўколцамі, прыкрывалі скроні, і гэта рабіла асабліва выразнымі яе блакітныя вочы. Сонца, якое трапляла ў пакой праз фіранкі на вокнах, мяккім цяплом ахутвала яе сціплую постаць. Вакол дзяўчыны ляжала шмат раскроенага палатна, і я зразумеў, чым яна зарабляла на жыццё: безумоўна, яна была швачка. Гэтая жанчына здавалася мне феяю адзіноты.

Я падаў ёй вэксаль і прамовіў, што ўжо заходзіў раніцай, але не заспеў яе дома.

— Дык жа я пакінула вам грошы ў брамніцы, — здзівілася дзяўчына.

Я зрабіў выгляд, што не пачуў яе адказу. І толькі спытаў:

— Вы, як відаць, рана выходзіце з дому.

— Наогул, я вельмі рэдка куды выходжу. Але, ведаеце, калі ўсю ноч прасядзіш за працай, на золку вельмі хочацца пакупацца.

Я паглядзеў уважлівей і адразу разгадаў яе. Перада мною стаяла дзяўчына, якая, вядома ж, зарабляла на жыццё цяжкай штодзённай працай. Відаць, яна была з сям'і якога-небудзь сумленнага фермера: на яе твары праступалі дробныя вяснушкі, якія звычайна бываюць у вясковых дзяцей. Ад яе веяла дабрынёй, сапраўдным чалавечым цяплом. Я трапіў у атмасферу такой шчырасці, душэўнай чысціні, што мне адразу зрабілася лягчэй дыхаць. Бедная прасцячка! Яна яшчэ ў нешта верыла: над узгалоўем яе сціплага драўлянага ложка вісела распяцце, упрыгожанае дзвюма галінкамі буксу. Я ажно замілаваўся ёю і быў гатовы прапанаваць гэтай дзяўчыне грошай у пазыку, пад дванаццаць працэнтаў, каб дапамагчы ёй наладзіць якую-небудзь прыбытковую справу. Але тут жа стрымаў сябе, падумаўшы, што ў яе, пэўна, ёсць малады стрыечны брат, які прымусіць яе падпісваць вэксалі і абдзярэ гаротніцу як ліпку. З такімі думкамі я і пайшоў ад яе, перасцерагаючы сябе ад велікадушных намераў: мне досыць часта даводзілася назіраць, што калі самому дабрадзею і не зашкодзіць дабрачыннасць, то таго, каму яна аказана, яна можа знішчыць. Як толькі вы сёння ўвайшлі ў мой пакой, я якраз думаў пра Фані Мальво — вось з каго выйшла б добрая жонка, маці сямейства. Варта толькі параўнаць чыстае самотнае жыццё гэтай дзяўчыны з жыццём багатай графіні, што пачала ўжо падпісваць вэксалі і неўзабаве скоціцца на самае дно ўсялякіх заганаў.

Задумаўшыся, ён на хвіліну замоўк, а я ў гэты час разглядаў яго.

— Ану, скажыце, — раптам спытаў ён, — хіба дрэнныя ў мяне забавы? Хіба ж не цікава зазірнуць у самыя патаемныя куточкі чалавечай душы? Хіба ж не цікава пранікнуць у чужое жыццё і ўбачыць яго без прыкрас, як на далоні? Чаго толькі не нагледзішся! Тут і брыдкія раны, і несуцешнае гора, тут і пакуты кахання, і беднасць, якую падпільноўваюць воды Сены, і юнацкія асалоды — пагібельныя прыступкі, што вядуць да эшафота, і смех адчаю, і пышныя святы.

Сёння ты сведка трагедыі: сумленны працаўнік, бацька вялікай сям'і канчае жыццё самагубствам, бо не можа пракарміць сваіх дзяцей. Заўтра — сведка камедыі: ма-

лады лайдак спрабуе разыграць перад табою сучасны варыянт класічнай сцэны зачароўвання Дыманша яго даўжніком[1]! Вы, канечне, чулі пра хвалёнае красамоўства новаяўленых добрых пастыраў мінулага стагоддзя? І я, бывала, траціў нямала часу, слухаючы іх. Яны здолелі ў чымсьці паўздзейнічаць на мае погляды, але — ніколі! — на мае паводзіны, як сказаў нехта. Дык ведайце, што ўсе гэтыя нашы славутыя прапаведнікі, усялякія там Мірабо, Верньё[2] і іншыя — усяго толькі заікі, вартыя жалю, у параўнанні з маімі штодзённымі прамоўцамі. Якая-небудзь закаханая маладая паненка, стары гандляр на мяжы банкруцтва, маці, якая імкнецца схаваць благі ўчынак сына, мастак, пазбаўлены кавалка хлеба, вяльможа, які трапіў у нямілась, і, можа стацца, з-за адсутнасці грошай страціць вынікі сваіх шматгадовых намаганняў, — усе гэтыя людзі іншы раз уражваюць мяне сілаю свайго слова. Выдатныя акцёры! І ўсе яны даюць спектакль дзеля мяне аднаго! Але ашукаць мяне ім ніколі не ўдасца. Мой позірк, як у пана Бога: я адразу бачу, што ў іх у душы. А хіба можна адмовіць у чымсьці таму, хто мае ў руках мяшок з золатам? У мяне хопіць багацця, каб купіць чалавечае сумленне, каб кіраваць усемагутнымі міністрамі праз іх фаварытаў, пачынаючы з канцылярскіх служкаў і канчаючы іх каханкамі. Ці ж гэта не ўлада? Калі захачу, я змагу валодаць найпрыгажэйшымі жанчынамі, купляць самыя далікатныя пяшчоты. Ці ж гэта не асалода? Хіба ўлада і асалода не ўяўляюць сабою сутнасць нашага новага грамадскага ладу? Такіх, як я, у Парыжы чалавек дзесяць. Мы ўладары вашых лёсаў: ціхенькія, нікому невядомыя. Што такое жыццё, як не машына, якая прыводзіцца ў рух грашмі? Памятайце, што сродкі да дзеяння зліваюцца з яго вынікамі: ніколі не ўдаецца размежаваць душу і пачуцці, дух і матэрыю. Золата — вось духоўная сутнасць усяго сучаснага грамадства. Я і мае пабрацімы, звязаныя са мною агульнымі інтарэсамі, у азначаныя дні тыдня сустракаемся ў кавярні «Феміда» каля Новага моста. Там мы гутарым, адкрываем адзін аднаму фінансавыя таямніцы. Ніводнае, самае вялікае багацце не ўвядзе нас у зман, бо мы

---

[1] Сцэна з камедыі Мальера (1622—1673) «Дон-Жуан», у якой герой п'есы так спрытна спакушае свайго крэдытора Дыманша, што той не асмельваецца патрабаваць у яго доўг.

[2] *Мірабо, Верньё* — крупныя палітычныя дзеячы і аратары эпохі першай Французскай буржуазнай рэвалюцыі.

валодаем сакрэтамі ўсіх знакамітых сям'яў. У нас ёсць пэўная «чорная кніга», куды мы заносім звесткі аб дзяржаўным крэдыце, банках, гандлі. У якасці духоўнікаў біржы мы ўтвараем, так бы мовіць, трыбунал свяшчэннай інквізіцыі, аналізуем самыя, на першы погляд, бяскрыўдныя ўчынкі багатых людзей і не памыляемся ніколі. Адзін з нас назірае за судзейскім асяроддзем, другі — за фінансавым, трэці — за вышэйшымі чыноўнікамі, чацвёрты — за камерсантамі. А пад маім наглядам знаходзіцца залатая моладзь, акцёры і мастакі, свецкія людзі, гульцы — самая цікавая частка парыжскага грамадства. І кожны расказвае нам пра таямніцы сваіх суседзяў. Падманутыя пачуцці, закрануты гонар маюць доўгія языкі. Заганы, расчараванне, помста — найлепшыя агенты паліцыі. Як і я, мае пабрацімы ўсім нацешыліся, усім перанасыціліся і любяць цяпер толькі ўладу і грошы дзеля самога валодання ўладай і грашмі. Вось тут, — сказаў ён, павёўшы рукой, — у гэтым халодным пакоі з голымі сценамі, самы палкі закаханы, які ў любым іншым месцы выклікаў бы на двубой любога з-за вострага слоўца, моліць мяне, як Бога, пакорліва прыціскаючы рукі да грудзей! Праліваючы слёзы вар'яцкай нянавісці або самоты, моліць мяне і самы пыхлівы гандляр, і самая пыхлівая красуня, і самы ганарлівы вайсковец. Сюды прыходзіць з мальбою і вядомы мастак, і пісьменнік, чыё імя будзе жыць у памяці нашчадкаў. А вось тут, — дадаў ён, прыціскаючы палец да лба, — тут у мяне вагі, на якіх узважваюцца спадчына і карыслівыя інтарэсы ўсяго Парыжа. Ну, як вам цяпер здаецца, — сказаў ён, павярнуўшыся да мяне бледным сваім тварам, быццам вылітым з серабра, — ці не хаваюцца гарачыя пачуцці за гэтай халоднай, застылай маскай, якая так часта здзіўляе вас сваёй нерухомасцю?

Я вярнуўся ў пакой зусім ачмурэлы. Гэты высахлы дзядок неяк раптоўна вырас у маіх вачах, зрабіўшыся фантастычнай фігурай, увасабленнем улады золата. Жыццё і людзі выклікалі ў мяне ў гэту хвіліну жах. «Няўжо ўсё ў свеце залежыць ад грошай», — думаў я сабе. Потым доўга не мог заснуць. Усё мроіліся навокал горы золата. Дый прыгажуня графіня не выходзіла з галавы. Павінен прызнацца шчыра: на мой сорам, яна спачатку засланіла сабою вобраз Фані Мальво, чыстай прастадушнай істоты, якой наканавана вечна працаваць і заставацца невядомай. Але раніцай, у туманных мроях

абуджэння, мілае дзявочае аблічча адразу ўзнікла ў маёй памяці з усёй прывабнасцю, і я ўжо думаў толькі пра яе.

— Ці не жадаеце выпіць шклянку вады з цукрам? — перапыніўшы Дэрвіля, спытала графіня Гранльё.

— З прыемнасцю, — адказаў ён.

— Ведаеце, — пазваніўшы званочкам, заўважыла графіня, — я крыху не разумею, якое дачыненне ўся гэтая гісторыя мае да нас?

— Сарданапал![1] — усклікнуў Дэрвіль, ужыўшы сваё ўлюбёнае слоўца. — Зараз я зганю сон з вачэй мадмуазэль Камілы! Няхай ведае, што яе шчасце яшчэ зусім нядаўна залежала ад татачкі Габсэка. Але з тае прычыны, што некалькі дзён таму стары памёр, дажыўшы да васьмідзесяці дзевяці гадоў, спадар дэ Рэсто неўзабаве атрымае ў спадчыну вялікае багацце. Я зараз растлумачу, як і чаму. Што да Фані Мальво, дык вы яе добра ведаеце. Яна стала маёю жонкай.

— Бедны хлопец, — бясхітрасна прамовіла графіня, — і ён прызнаецца ў гэтым перад сведкамі.

— А хоць бы і перад усім светам! — усхвалявана адказаў страпчы.

— Піце, піце салодкую ваду, мой бедны Дэрвіль. Вы нічога не дасягнеце ў жыцці, затое будзеце самым лепшым і самым шчаслівым сярод людзей.

— Такім чынам, вы былі на вуліцы Эльдэр, — падымаючы заспаную галаву, азваўся дзядзька Камілы. — І што вы там рабілі?

— Праз колькі дзён пасля маёй размовы са старым галандцам, — прадоўжыў Дэрвіль, — я абараніў дысертацыю, атрымаў ступень ліцэнцыята права і быў неўзабаве залічаны ў калегію страпчых. Давер старога скнары Габсэка да мяне рос на вачах. Ён пачаў звяртацца па бясплатныя парады ў сваіх розных рызыкоўных справах, якія самы дасведчаны практык, сабраўшы дакладныя звесткі, палічыў бы безнадзейнымі. Чалавек, на якога ніхто не меў уплыву, выслухоўваў мае парады з нейкай асабліваю павагаю. І гэтыя парады ішлі яму на карысць. Адпрацаваўшы тры гады ў канторы звычайным страпчым, я атрымаў там пасаду старэйшага службоўца і пераехаў з вуліцы дэ Грэ да майго шэфа, які, акрамя стала і кватэры, прызначыў мне зарплату: сто пяцьдзесят франкаў у месяц. Гэта быў для мяне самы

---

[1] *Сарданапал! (скаж. фр.)* — гром і маланка!

шчаслівы дзень! Калі я зайшоў да старога ліхвяра, каб з ім развітацца, ён не выказаў ніякіх пачуццяў, нават не сказаў, магу я ці не надалей заходзіць да яго ў госці; ён толькі акінуў мяне сваім позіркам, па якім можна было меркаваць, што гэты чалавек валодае дарам празорцы. Але ў канцы таго ж тыдня стары сам наведаў мяне. Ён прынёс вельмі складаную справу, звязаную з адчужэннем зямельнага ўчастка. Так ён працягваў карыстацца маімі парадамі бясплатна, хоць рабіў выгляд, што плаціў за іх.

У канцы 1819 года мой начальнік, марнатравец і вялікі аматар павесяліцца, заграз у даўгах і быў вымушаны прадаць кантору. Хоць у тыя часы патэнт страпчага не каштаваў гэтак дорага як цяпер, аднак жа ён запрасіў за сваю ўстанову неверагодную суму — ажно сто пяцьдзесят тысяч франкаў. Актыўны і адукаваны чалавек мог бы сумленна жыць на даходы з гэтай сумы і за гадоў дзесяць расплаціўся б за даўгі. Я ж, сёмы ў сям'і невялікага буржуа з Наёна, не меў такіх сродкаў і ў капіталістычных колах ведаў толькі татачку Габсэка. Аднак пыхлівае жаданне набыць самастойнасць, а таксама нейкі прабліск надзеі прымусілі мяне ўсё-такі пайсці наведаць старога ліхвяра.

І вось аднаго разу надвячоркам я павольна пайшоў у бок вуліцы дэ Грэ. Сэрца маё моцна білася ад хвалявання, калі я пастукаў у дзверы знаёмага змрочнага дома. Я адразу ўспомніў усё, што казаў мне стары скнара ў той час, калі я быў далёкі ад разумення трывог, што ахоплівалі кожнага на парозе гэтага дома. Я ішоў прасіць, як і ўсе іншыя. І тады я сказаў сабе: «Не бойся! Сумленны чалавек павінен усюды захоўваць свой гонар. Няма чаго прыніжацца з-за грошай! Буду такім жа практычным, як і ён».

Пасля майго пераезду, каб не мець суседзяў, татачка Габсэк заняў і маю кватэру. Акрамя таго ён зрабіў у дзвярах невялічкае акенца з кратамі і адчыніў іх толькі пасля таго, як пазнаў мяне ў твар.

— Што, — прамовіў ён сваім тоненькім галаском, — ваш начальнік прадае сваю кантору?

— Адкуль вы ведаеце? — здзівіўся я. — Пра гэта ён гаварыў толькі са мною.

Вусны старога расцягнуліся ў куточках рота, быццам фіранкі на вокнах, аднак гэта нешта падобнае да ўсмешкі суправаджалася халодным абыякавым позіркам.

— Толькі пагэтаму я і маю гонар бачыць вас у мяне, — вытрымаўшы паўзу, падчас якой я адчуваў сябе ніякавата, суха дадаў ён.

— Выслухайце мяне ўважліва, спадар Габсэк, — вымавіў я як мага спакайнейшым тонам, хоць мяне моцна бянтэжыў блакітны бляск яго праніклівых вачэй.

Ён жэстам дазволіў мне гаварыць.

— Я ведаю, што вас расхваляваць цяжка, таму не буду марна губляць час, каб намаляваць вам становішча беднага службоўца, які спадзяецца толькі на вас, бо не мае на свеце нікога бліжэйшага. Але гаворка не пра блізкасць. Справы ёсць справы, а не слязлівыя раманы для ўражлівых жанчын. Ну дык вось. Майму начальніку кантора прыносіла па дваццаць тысяч франкаў штогод. Спадзяюся, што ў маіх руках яна будзе прыносіць па сорак тысяч франкаў. Ён прадае яе за сто пяцьдзесят тысяч. Я адчуваю, — я пастукаў пальцам па сваім ілбе, — што ў мяне тут сёе-тое ёсць і калі вы дасцё мне такую ссуду, я выплачу вам яе за дзесяць гадоў.

— Вось гэта размова, — прамовіў татачка Габсэк, працягваючы мне сваю руку. — Колькі вяду справы, яшчэ ніводзін мне так ясна не выказаў мэту свайго прыходу. А якія ў вас гарантыі? — І змераўшы мяне позіркам з ног да галавы, адказаў сам сабе: «Ніякіх». — Колькі вам год, малады чалавек?

— Праз дзесяць дзён споўніцца дваццаць пяць. Інакш я не меў бы права заключаць пагадненні.

— Сапраўды.

— Ну дык як, спадар Габсэк?

— Магчыма, — стрымана адказаў стары.

— Праўда? Тады мусім спяшацца, а то могуць даць больш.

— Вось што. Прынясіце мне заўтра раніцай ваш выпіс з метрычнай кнігі, а я за ноч усё абдумаю.

Раніцай у восем гадзін я ўжо стаяў перад Габсэкам. Ён павольна ўзяў у рукі афіцыйную паперу, начапіў на нос акуляры, кашлянуў, плюнуў, яшчэ больш захінуўся ў сваю чорную накідку і пачаў уважліва чытаць выпіс з метрычнай кнігі, выдадзены мэрыяй. Пасля пакруціў яго ў руках, зірнуў на мяне, зноў кашлянуў, паёрзаў на сваім крэсле і нарэшце вымавіў:

— Што ж, паспрабуем заняцца гэтай справай.

Мяне пачало калаціць.

— Бяру я за крэдыт па-рознаму. Самае меншае — пяцьдзесят працэнтаў, а бывае, што сто, дзвесце і нават пяцьсот.

Пры гэтых яго словах я спалатнеў.

— З вас жа я па знаёмству вазьму толькі дванаццаць з паловай працэнтаў, — тут, павагаўшыся, ён дадаў: — Не, з вас я вазьму па трынаццаць працэнтаў гадавых. Падыдзе?

— Падыдзе, — адказаў я.

— Але калі гэта здаецца вам зашмат, абараняйцеся, Гроцый[1]. (Ён, здаралася, жартам называў мяне Гроцыем.) Я прашу з вас трынаццаць працэнтаў. Такая ўжо ў мяне прафесія. Падумайце, ці зможаце вы заплаціць. Я не люблю людзей, якія прымаюць любыя ўмовы. Не задорага?

— Не, — адказаў я, — расплачуся, толькі давядзецца папрацаваць.

— А можа, — прамовіў ён, кінуўшы на мяне свой іранічны позірк, — заплацяць вашы кліенты?

— Не, ліха яго бяры, — закрычаў я, — хутчэй дам адсячы сабе руку, але не стану рабаўніком! Усё сам выплачу!

— Тады да пабачэння, — сказаў мне татачка Габсэк.

— Аднак ганарары я буду браць згодна з таксай, — дадаў я.

— На некаторыя справы не існуе таксы, як, напрыклад, на атрыманне адтэрміноўкі плацяжоў, на палюбоўныя пагадненні. Тут можна браць па дзве, па тры тысячы франкаў, а то і па шэсць тысяч, у залежнасці ад важнасці справы, ды яшчэ за перамовы, за раз'езды, за складанне актаў, усялякіх выпісаў і за гаварыльню ў судзе. Трэба толькі знаходзіць такія справы. Я буду рэкамендаваць вас як дасведчанага, талковага страпчага, накірую да вас кліентаў, а яны пацягнуць да вас гэтулькі судовых іскаў, што ваша адвакацкая брацыя лопне ад зайздрасці. Мае калегі Вербруст, Пальма, Жыганэ даручаць вам вясці справы аб адчужэнні зямельных надзелаў, а ў іх такіх спраў процьма. Такім чынам, у вас будзе дзве кліентуры: адна застанецца ў спадчыну ад вашага начальніка, а другую дам вам я. Здаецца мне, трэба ўзяць

---

[1] *Гроцый*, Гуго (1583—1645) — галандскі юрыст і рэакцыйны грамадскі дзеяч.

з вас пятнаццаць працэнтаў гадавых, бо вы ўсё-такі атрымліваеце ад мяне паўтараста тысяч.

— Згода, але не больш гэтага, — цвёрда сказаў я, жадаючы падкрэсліць, што гэта мяжа, і далей я не пайду.

Татачка Габсэк памякчэў, бо, відаць, быў задаволены мною.

— За кантору я сам заплачу, — сказаў ён. — Пастараюся дамагчыся большай скідкі з кошту канторы і з сумы залогу.

— Як пажадаеце, усё ў вашых руках.

— А вы пасля гэтага падрыхтуеце для мяне пятнаццаць вэксаляў, кожны па дзесяць тысяч франкаў.

— Толькі трэба зарэгістраваць гэтае двайное пагадненне.

— Не! — перапыняючы мяне, злосна прамовіў Габсэк. — Чаму я павінен даваць вам больш, чым вы мне.

Мне нічога не заставалася, як прамаўчаць.

— Акрамя працэнтаў, — дадаў ён ужо спакайнейшым тонам, — вы будзеце, пакуль я жывы, бясплатна весці мае справы. Згода?

— Згода. Толькі ніякіх выдаткаў за кошт маіх сродкаў.

— Слушна. — І тут жа дадаў з неўласцівым яго твару выразам пяшчоты: — А вы дазволіце мне наведваць вас?

— Заўсёды буду рады вас бачыць.

— Толькі ведаеце, раніцай гэта і вам, і мне нязручна: у вас свае справы, у мяне свае.

— Заходзьце вечарамі.

— Не-не-не, — хуценька запярэчыў ён. — Вам жа трэба бываць на людзях, сустракацца з кліентамі. А я таксама маю сяброў, з якімі праводжу вечары ў кавярні.

«Нішто сабе — у яго сябры?», — падумаў я.

— Што ж, тады давайце сустракацца за абедам.

— Вось і дамовіліся, — узрадаваўся Габсэк. — А пятай гадзіне пасля наведвання біржы. Я буду прыходзіць да вас два разы на тыдзень: у сераду і ў суботу. Мы будзем па-сяброўску гутарыць пра справы. Ай-яй-яй! Калі-нікалі я бываю ў добрым настроі. Вы пачастуеце мяне крыльцам курапаткі і келіхам шампанскага, і мы так слаўна пагамонім! Я ведаю гэтулькі цікавых павучальных гісторый пра мужчын і асабліва пра жанчын.

— Добра. Курапатка і шампанскае за мною.

— Толькі глядзіце, дужа не раскашуйце, а то пазбавіцеся майго даверу. Не наймайце шмат прыслугі.

Вазьміце сабе адну старую кухарку. Я буду наведваць вас і цікавіцца вашым здароўем. Я ж укладу ў вас, э-хе-хе, цэлы капітал! Мне трэба ведаць, як ідуць вашы справы. Ну, годзе! Чакаю вас вечарам разам з вашым начальнікам.

— Даруйце мне маю нясціплую цікаўнасць, але я хацеў бы спытацца, — сказаў я, калі мы ўжо былі каля парога, — навошта вам спатрэбіўся ў гэтай справе мой выпіс з метрычнай кнігі?

Жан-Эстэр ван Габсэк паціснуў плячыма і, хітра ўсміхаючыся, адказаў:

— Эх, моладзь, моладзь! Запомніце назаўсёды, спадар адвакат, каб калі-небудзь не даць абвесці сябе вакол пальца: калі чалавеку менш за трыццаць, то яго сумленнасць і здольнасці яшчэ могуць нейкім чынам быць гарантыяй забеспячэння ссуды. А пасля трыццаці ўжо ні на кога нельга разлічваць.

І стары зачыніў за мною дзверы.

Праз тры месяцы пасля гэтай размовы я ўжо быў страпчым, і неўзабаве мне пашчасціла, мадам, выйграць справу аб вяртанні вам вашай нерухомай маёмасці. Дзякуючы гэтаму, я зрабіўся вядомым. Хоць мне даводзілася выплачваць Габсэку велізарныя працэнты, праз пяць гадоў я разлічыўся з ім цалкам. Я ажаніўся з Фані Мальво, якую пакахаў усёй душою. Падабенства нашых лёсаў, працоўнае жыццё, сумесныя поспехі яшчэ больш умацавалі нашы ўзаемныя пачуцці. Пасля смерці яе дзядзькі, багатага фермера, яна атрымала ў спадчыну семдзесят тысяч франкаў, што дазволіла нам расплаціцца з Габсэкам. З тае пары маё жыццё ператварылася ў бесперапыннае шчасце і дабрабыт. Больш не буду гаварыць пра сябе, бо шчаслівы чалавек — тэма нецікавая.

Вернемся зноў да нашых герояў.

Праз год пасля таго, як я набыў кантору, мяне запрасіў аднойчы на вечарыну адзін з маіх знаёмцаў. Ён прайграў заклад маладому франту, вядомаму свецкаму льву, слава пра якога тады грымела па ўсіх салонах. Я маю на ўвазе спадара дэ Трая.

— Слава пра яго грыміць яшчэ і сёння, — перапыніў страпчага граф дэ Борн. — Ніхто так шыкоўна не апранаецца і ніхто так, як ён, не ўмее кіраваць коньмі, запрэжанымі цугам. А як Максім гуляе ў карты, як ён есць і як п'е! Гэта трэба бачыць. Ён ведае толк у жарабках, у капелюшах, разбіраецца ў жывапісе. Усе жанчыны

вар'яцеюць ад яго. Ён прагульвае па сто тысяч у год, хоць я не чуў, каб у яго было хоць невялікае памесце ці нейкая рэнта. Гэта той тып вандроўнага рыцара, які блукае па салонах, па будуарах, бульварах, быццам тая амфібія, бо невядома, якога ён полу, мужчынскага ці жаночага. Карацей кажучы, граф Максім дэ Трай — істота вельмі дзіўная, вартая на ўсё і ні на што не вартая, можа выклікаць і страх, і пагарду, здольная быць дабрачыннай і злачыннай, высакароднай і подлай, заплямленай хутчэй брудам, чым крывёю. Турботы яго хвалююць больш, чым згрызоты сумлення, пачуцці займаюць болей, чым думкі. Гэта чалавек знешне палкі, а ўсярэдзіне халодны, як лёд. Ён уяўляе сабою бліскучае звяно сувязі паміж катаржнікамі і людзьмі вышэйшага свету. Інакш кажучы, Максім дэ Трай належыць да таго высокаінтэлектуальнага класу, з якога часам выходзяць Мірабо, Піты, Рышэлье, але болей за ўсё — графы дэ Хорны, Фук'е-Тэнвілі і Каньяры[1].

— Дык вось, — гаварыў далей Дэрвіль, выслухаўшы да канца брата вікантэсы, — я шмат чуў пра гэтага чалавека ад няшчаснага старога Гар'ё, аднаго з маіх кліентаў, і таму пазбягаў з ім сустракацца. Аднак мой знаёмы так настойліва запрашаў мяне на гэтую вечарыну, што я не змог адмовіцца, каб не выглядаць пыхліўцам.

Вам цяжка ўявіць, мадам, што такое хлапечая вечарынка. Гэта неверагодная пышнасць і вытанчанасць, раскоша скнары, які дзеля таго, каб адзін раз пусціць пыл у вочы, гатовы змарнаваць вялікія грошы. Заходзіш, і цябе адразу ж уражвае парадак на стале, устаўленым бліскучым срэбрам, звонкім крышталём, засланым бялюткім абрусам. Адным словам, не жыццё, а казка. Маладыя людзі паводзяць сябе ветліва, шчыра ўсміхаюцца адзін аднаму, размаўляюць паўшэптам і нагадваюць маладажонаў, вакол якіх ззяе німб некранутай чысціні.

А гадзіны праз дзве вы скажаце, што ўсё тут нагадвае поле бітвы: усюды кавалкі бітага шкла, змятыя сурвэткі, рэшткі недаедзеных страў, на якія цяпер брыдка глядзець. Стаіць гоман, нястрыманы смех, перасыпаны вострымі эпіграмамі і непрыстойнасцямі. Вакол вас адны барвовыя твары, бліскучыя вочы. У гэтым няспынным

---

[1] Аўтар супастаўляе крупнейшых палітычных дзеячаў XVIII—XIX стст. з *дэ Хорнам* і *Каньярам* — вядомымі авантурыстамі таго часу.

гармідары нехта б'е бутэлькі, нехта зацягвае суразмоўцу на двубой. Тут абдымаюцца, там б'юцца. У паветры вісіць нясцерпны чад, у якім змяшаліся сотні пахаў, у суцэльны рык зліліся сто галасоў. Ніхто не ведае, што ён есць, што гаворыць. Адзін змрочна маўчыць, іншы безупынку балбоча, а нехта, як звон, паўтарае адно і тое слова. Нейкі жартаўнік спрабуе дырыжыраваць гэтым садомам, а нейкі разумнік прапануе арганізаваць оргію. Калі б сюды трапіў цвярозы чалавек, ён палічыў бы ўсё гэта за вакханалію.

І вось сярод гэтага гармідару граф дэ Трай паспрабаваў дамагчыся маёй прыхільнасці. Паколькі я быў яшчэ пры памяці, то трымаўся з асцярогай. Ён жа хоць і меў выгляд моцна п'янага чалавека, увесь час думаў пра свае справы. Не ведаю, як гэта здарылася, але калі я пакідаў салон Грыньёна а дзевятай гадзіне ўвечары, граф зачараваў мяне цалкам, і я паабяцаў пазнаёміць яго з татачкам Габсэкам. Ён здолеў выцягнуць гэта з мяне, спекулюючы такімі словамі, як «гонар», «дабрачыннасць», «графіня», «сумленная жанчына», «няшчасце» і гэтак далей.

Прачнуўшыся назаўтра, я паспрабаваў успомніць тое, што адбылося напярэдадні. Урэшце мне здалося, што дачка аднаго з маіх кліентаў магла страціць сваю рэпутацыю, а таксама павагу свайго мужа, калі да дванаццаці гадзін дня не здабудзе пяцьдзесят тысяч франкаў. Тут яшчэ былі і запазычанні па гульні ў карты, і неаплочаны рамізнік, і яшчэ нейкія выдаткі. Мой абаяльны сабутэльнік пераконваў мяне, што гэта досыць багатая дама і што за некалькі год яна зможа вярнуць страты, нанесеныя яе дастатку. І толькі тут я зразумеў, чаму мой сябар гэтак настойліва запрашаў мяне да сябе. На мой сорам, я нават не мог уявіць сабе, наколькі сам Габсэк быў зацікаўлены, каб памірыцца з гэтым фарсуном. Карацей, не паспеў я ўстаць з ложка, як мне паведамілі, што з'явіўся месье дэ Трай.

— Граф, — сказаў я, калі мы абмяняліся традыцыйнымі камплімэнтамі, — я не разумею, чаму вам так хочацца, каб менавіта я адвёў вас да Габсэка. Ён жа самы ветлівы і самы бяскрыўдны з усіх ліхвяроў і заўсёды пазычыць вам грошай, калі мае іх — дакладней, калі вы дасцё яму дастатковыя гарантыі.

— Месье Дэрвіль, — адказаў дэ Трай, — я і не думаў прымушаць вас выконваць абяцанне, якое вы мне далі ўчора.

«Сарданапал! — сказаў я сам сабе, — няўжо я дазволю гэтаму чалавеку думаць, што не магу стрымаць сваё слова?»

— Учора я меў гонар растлумачыць вам, што вельмі недарэчна пасварыўся з татачкам Габсэкам, — працягваў дэ Трай. — Я добра ведаю, што ва ўсім Парыжы няма лепшага за яго фінансіста, які б у канцы месяца, пакуль не падведзены вынікі, змог вам даць адразу сотню тысяч. Таму я і папрасіў вас, каб вы памірылі мяне з ім. Але не будзем больш гаварыць пра гэта.

І змераўшы мяне ветліва-абразлівым позіркам, ён пайшоў да выхада.

— Я еду з вамі да Габсэка, — не вытрымаў я.

Калі мы прыехалі на вуліцу дэ Грэ, мой фарсісты спадарожнік пачаў азіраць усё наўкола з такой дзіўнай, напружанай увагай, што я быў моцна гэтым уражаны. Ён то палатнеў, то чырванеў, то раптам твар яго набываў колер нейкай мерцвянай жаўцізны, а калі ён убачыў пад'езд Габсэка, на яго лбе праступілі дробныя кропелькі халоднага поту. Не паспелі мы саскочыць з кабрыялета, як з-за рога на вуліцу дэ Грэ выехаў фіякр. Мой сусед адразу ж, быццам каршун, угледзеў у кутку карэты жаночае аблічча, і яго твар асвяціўся звярынай радасцю. Ён паклікаў хлопчыка, які быў побач, і папрасіў таго патрымаць каня. Па сцёртых прыступках мы падняліся ў кватэру старога ліхвяра.

— Месье Габсэк, — прамовіў я, — гэта адзін з маіх самых блізкіх сяброў, — і дадаў на вуха, — ...ад якога, я не ведаю, як ратавацца. Спадзяюся на вашу прыхільнасць да яго, вядома, за звычайныя працэнты і калі вам гэта будзе выгодна.

Граф дэ Трай нізка пакланіўся Габсэку, сеў і падрыхтаваўся слухаць таго, прыняўшы паставу каранаванай асобы, якая магла б зачараваць каго хочаце, толькі не Габсэка, які сядзеў моўчкі каля каміна і нават не зварухнуўся. Ён у гэты момант нагадваў вядомую статую Вальтэра перад уваходам у Французскі Тэатр, асветленую вячэрнімі агнямі. На прывітанне ён толькі прыўзняў свой паношаны картуз, які ў яго заўсёды быў на галаве, і жоўтая макаўка голага чэрапа, быццам са старога мармуру, мільгануўшы, яшчэ больш узмацніла гэта падабенства.

— Грошы я маю толькі для маіх заўсёдных кліентаў, — прамовіў стары.

— Дык, значыць, вы моцна пакрыўдзіліся на мяне за тое, што я дайшоў да банкруцтва ад іншых? — усміхнуўшыся, сказаў граф.

— Да банкруцтва? — з іроніяй перапытаў яго Габсэк.

— Вы хочаце сказаць, што той, у каго нічога няма, не можа збанкрутаваць? Тады паспрабуйце знайсці ў Парыжы хоць аднаго з такім самым значным капіталам, як у мяне! — усклікнуў гэты фарсун і, ускочыўшы з месца, крутануўся на абцасах. Але гэта несур'ёзная выхадка не ўразіла Габсэка. — Хіба я не самы блізкі сябра Ранкероляў, дэ Марсэ, Франчэсіні, абодвух Вандэнэсаў, Ажуда-Пінта, — урэшце, усіх маладых людзей з Парыжскай эліты? Я — нязменны партнёр па гульні ў карты аднаго прынца і вядомага вам пасланніка. Я маю прыбыткі ў Лондане, у Карлсбадзе, у Бадэне, у Баце. Хіба гэта няпраўда?

— Праўда.

— Вы абыходзіцеся са мною, нібы з губкаю: чакаеце, пакуль я набрыняю золатам у свецкім коле, а потым возьмеце ды выціснеце яе. Толькі памятайце, што вы — таксама губка, і смерць некалі выцісне вас.

— Магчыма.

— Што было б з вамі, каб на свеце не было такіх, як я? Мы з вамі непадзельныя, быццам душа і цела.

— Сапраўды.

— Дык давайце паціснем адзін аднаму рукі, добры татачка Габсэк, бо ж вы згодны з тым, што я сказаў.

— Ведаеце, чаму вы прыйшлі да мяне? — холадна вымавіў стары ліхвяр. — Бо Жырар, Пальма, Вербруст і Жыганэ сытыя па горла вашымі вэксалямі і гатовы збыць іх хоць каму, страціўшы нават пяцьдзесят працэнтаў. Але, як здаецца, яны выклалі вам палову намінала, таму вашы вэксалі не вартыя цяпер і дваццаці пяці працэнтаў. Не, дзякую вам! Хіба ж магу я, — працягваў Габсэк, — пазычыць хоць адзін шэлег чалавеку, які вінаваты мне трыццаць тысяч франкаў, а за душою не мае ні сантыма? Не даўней, як пазаўчора, вы прайгралі ў карты на балі ў барона Нусінгена дзесяць тысяч франкаў.

— Шаноўны пане, — прамовіў граф, гледзячы старому ў вочы з выключнай нахабнасцю, — як ідуць мае справы, хай вас не цікавіць. Галоўнае, каб я заплаціў у тэрмін.

— Гэта праўда.

— Мае вэксалі будуць заўсёды аплачаныя.

— Магчыма.

— Такім чынам, цяпер для вас галоўнае пытанне: змагу я ці не даць вам дастатковы заклад пад ссуду на тую суму, якую я хацеў бы пазычыць у вас?

— Слушна.

З вуліцы данёсся грукат карэты, што пад'язджала к дому.

— Зараз я вам нешта прынясу, і, мне думаецца, вы будзеце цалкам задаволены, — сказаў паспешліва дэ Трай і выбег з пакоя.

— О сыне мой! — усклікнуў Габсэк, ускокваючы з месца і працягваючы мне рукі, як толькі граф знік за дзвярыма. — Калі заклад у яго каштоўны, ты выратаваў мне жыццё! Я ледзь не памёр. Вербруст і Жыганэ ўздумалі пажартаваць з мяне. Але дзякуючы табе я сёння сам з іх пасмяюся.

Такім я яго яшчэ не бачыў. У радасці старога было нешта жудаснае, і хоць гэта радасць была кароткаю, яна запомнілася мне назаўсёды.

— Калі ласка, заставайцеся тут, — дадаў ён. — Хоць я ўзброены і ўпэўнены ў сабе, бо некалі паляваў на тыгра і біўся на палубе карабля пры абардажы не на жыццё, а на смерць, аднак я ўсё ж такі пабойваюся гэтага франтаватага прайдзісвета.

І стары ліхвяр зноў сеў у сваё крэсла да стала. Яго твар зрабіўся бледным і спакойным.

— Дарэчы, — хуценька дадаў ён, павярнуўшыся да мяне. — Зараз вы, несумненна, убачыце тую прыгажуню, пра якую я некалі вам расказваў: я чую, як па калідоры крочаць арыстакратычныя ножкі.

І сапраўды, у пакой увайшоў малады фарсун, трымаючы пад руку жанчыну, у якой я адразу ж пазнаў адну з дачок старога Гар'ё, тую самую графіню, у спальні якой аднойчы пабыў Габсэк. Яна мяне спачатку не заўважыла, бо я стаяў у ваконнай нішы, а калі яны ўвайшлі, адразу ж адвярнуўся тварам да шыбы.

Трапіўшы ў сыры цёмны пакой ліхвяра, жанчына недаверліва паглядзела на свайго кавалера. Яна была такая прыгожая, што мне зрабілася яе шкада, нягледзячы на яе памылкі. Было відаць, што яе сэрца рвецца на кавалкі ад страшэннай трывогі, і высакародныя ганарлівыя рысы не маглі схаваць гэты боль. Малады чалавек зрабіўся для яе злым геніем. Я падзівіўся прадбачлівасці Габсэка, які чатыры гады таму, па першым вэксалі, прадбачыў лёс гэтай пары. «Відаць, — падумаў я, — гэтая

пачвара з анёльскім тварам кіруе жанчынай, спрытна карыстаючыся ўсімі яе слабасцямі: пустаслоўем, рэўнасцю, прагай да асалоды, прывабнасцю свецкага жыцця».

— Аднак, — усклікнула вікантэса, — дабрачынныя рысы гэтай жанчыны таксама былі яго зброяй. Карыстаючыся яе адданасцю і велікадушшам, якія ўвогуле ўласцівы жаночаму роду, ён злоўжываў яе пяшчотай, каб за гэта дарыць ёй злачынныя радасці.

— Прызнаюся вам, — працягваў Дэрвіль, — не разумеючы знакаў, якія падавала яму спадарыня дэ Гранльё, — мяне не дужа кранаў лёс гэтай няшчаснай істоты. Ён, можа, і быў прывабны ў вачах свету, аднак жудасны ў вачах таго, хто ўмеў чытаць у яе сэрцы. Што мяне ўразіла больш, дык гэта не забойца, малады чалавек з такім чыстым чалом, свежымі вуснамі, мілай усмешкай, белымі, як снег, зубамі. Цяпер яны абое стаялі перад сваім суддзёй, які глядзеў на іх тым жа паглядам, які, напэўна, у шаснаццатым стагоддзі быў у старога манаха-дамініканца, калі той назіраў за катаваннем двух няшчасных маўраў у глухіх сутарэннях найсвяцейшай інквізіцыі.

— Шаноўны пане, — загаварыла графіня дрыготкім голасам і працягнула Габсэку шкатулку, — ці можна атрымаць за гэтыя дыяменты іх поўны кошт, пакінуўшы за сабою права выкупу?

— Можна, мадам, — уступіў у размову я, выходзячы з аконнай нішы.

Графіня рэзка павярнулася ў мой бок, здрыганулася, пазнаўшы мяне, і я ўбачыў позірк, які на любой мове значыў бы: «Маўчыце!»

— Гэта, — прадоўжыў я, — называецца ў нас, юрыстаў, «умоўным продажам з правам выкупу пасля», і ўяўляе сабою дамоўленасць аб перадачы маёмасці, рухомай ці нерухомай, на вызначаны тэрмін, па заканчэнні якога ўласнасць можа быць вернута ўладальніку пасля таго, як ён сплаціць пакупніку абумоўленую суму.

Графіня з палёгкай уздыхнула. Максім дэ Трай нахмурыў бровы, відаць, баяўся, што ліхвяр дасць менш, чым каштавалі дыяменты, бо іх кошт быў няўстойлівы.

Габсэк схапіў лупу і пачаў моўчкі разглядаць прапанаваныя дыяменты. Каб я пражыў на свеце яшчэ сто гадоў, усё роўна мне ніколі не забыць гэтай карціны. Бледныя шчокі старога ліхвяра пачырванелі ад хваляван-

ня, яго патухлыя вочы, у якіх адбіваліся дыяменты, заблішчалі звышнатуральным бляскам. Ён устаў, падышоў да акна, разглядаючы дыяменты, потым паднёс іх да свайго бяззубага рота так блізка, нібыта збіраўся праглынуць. Ён нешта мармытаў сабе пад нос, дастаючы са шкатулкі то браслеты, то завушніцы з падвескамі, то каралі, то дыядэмы, круціў іх у руках, падносіў бліжэй да святла, каб вызначыць чысціню вады, адценні, памеры алмазаў. Ён выцягваў каштоўнасці са шкатулкі, клаў іх назад, потым зноў выцягваў, гуляючы з імі, як дзіця.

— Цудоўныя дыяменты! Да рэвалюцыі яны каштавалі б трыста тысяч франкаў! Чыстай вады! Відавочна, яны з Індыі — з Галконды або з Вісапура! Вам вядома, колькі яны каштуюць? Не, не, толькі Габсэк, адзіны ў Парыжы, можа вызначыць іх кошт. Падчас Імперыі запрасілі б больш за дзвесце тысяч, каб зрабіць на заказ гэткія ўпрыгожанні. — І ён з прыкрасцю дадаў: — Але ж цяпер дыяменты губляюць цану, бо Бразілія напоўніла рынкі алмазамі, якія, праўда, не такой чыстай вады, як індыйскія. Жанчыны носяць іх толькі на прыдворныя балі. Вы там бываеце, мадам?

Габсэк кідаў гэтыя жорсткія словы і з непрыхаванай радасцю працягваў разглядаць дыяменты, адзін за адным.

— Гэты чысты, — казаў ён, — а вось гэты з плямкай. А вось на гэтым расколінка. Ну, а гэты проста прыгажун!

Увесь яго бледны твар быў асветлены водбліскамі алмазаў, і гледзячы на Габсэка, мне чамусьці ўзгадаліся зеленаватыя старыя люстэркі ў правінцыяльных гатэлях, цьмянае шкло якіх зусім не адлюстроўвае светлавых блікаў: чалавеку, які наважыўся паглядзецца ў іх, здаецца, што ён бачыць паміраючага ад апаплексічнага ўдару.

— Ну дык як? — спытаў граф, ляпнуўшы Габсэка па плячы.

Старое дзіця ўздрыгнула, адарвалася ад сваіх бліскучых цацак, паклала іх на пісьмовы стол, села на сваё месца і зноў ператварылася ў ліхвяра, пачцівага, але жорсткага і халоднага як мармуровы слуп.

— Колькі вам трэба?

— Сто тысяч, на тры гады, — адказаў малады граф.

— Што ж, можна, — прамовіў Габсэк, асцярожна выцягваючы з шкатулкі, зробленай з чырвонага дрэва, сваю найвялікшую каштоўнасць — вельмі дакладныя

вагі. Ён павольна ўзважыў дыяменты, вызначыў на вока (адзін Бог ведае як) вагу аправы. У час гэтай аперацыі яго твар выказваў то вялікую радасць, то моцнае намаганне перасіліць яе.

Графіню апанавала здранцвенне — я добра разумеў чаму. Відаць, яна ўяўляла сабе глыбіню прорвы, у якую падала. Яе мучылі згрызоты сумлення і, здавалася, хапіла б аднаго слова, каб выратаваць яе. Я не вытрымаў:

— Скажыце, калі ласка, мадам, гэтыя дыяменты належаць вам? — маё пытанне прагучала выразна.

— Мне, месье, — адказала яна, акінуўшы мяне ганарлівым позіркам.

— Пішыце акт, вы, балбатун! — загадаў мне Габсэк, саступаючы сваё месца за сталом.

— Мадам, вядома ж, замужам? — задаў я другое пытанне.

Яна хуценька кіўнула галавою.

— Я не буду складаць акт! — гучна сказаў я.

— Чаму гэта?

— А вось чаму, — і я адвёў старога да акна, каб напаўголасу растлумачыць яму, што замужняя жанчына ва ўсім залежыць ад мужа, таму гэты гешэфт будзе лічыцца незаконным: Габсэку не ўдасца спаслацца на сваё няведанне, бо ж будзе існаваць акт. А ў акце будуць пералічаны ўсе каштоўнасці з указаннем вагі, кошту і памеру, і ліхвяру давядзецца іх вярнуць.

Габсэк перапыніў мяне кіўком галавы і павярнуўся да абаіх злачынцаў:

— Яго праўда. Усё мяняецца. Восемдзесят тысяч гатоўкаю, і дыяменты застаюцца ў мяне, — прамовіў стары глухім пісклявым голасам. — Пры здзелках наконт рухомай маёмасці ўласнасць лепшая за любыя акты.

— Аднак... — паспрабаваў нешта сказаць малады чалавек.

— Згаджайцеся або забірайце ўсё назад, — спыніў яго Габсэк і працягнуў графіні яе шкатулку. — Я не хачу рызыкаваць.

— Вам лепш кінуцца ў ногі вашаму мужу, — сказаў я на вуха графіні.

Па маіх вуснах ліхвяр зразумеў тое, што я сказаў, і холадна зірнуў на мяне.

Малады фарсун спалатнеў. Графіня вагалася.

І тут Максім дэ Трай рашуча наблізіўся да яе. Я пачуў, як ён даволі гучна сказаў ёй на вуха: «Бывай, дарагая

Анастазі! Будзь шчаслівая! А я... Заўтра я пазбаўлюся ад усіх турбот».

— Месье! — роспачна залямантавала маладая жанчына, звяртаючыся да Габсэка. — Я прымаю вашы ўмовы.

— Вось і добра, — задаволена прамовіў стары. — З вамі не проста гутарыць, мая даражэнькая.

Ён тут жа падпісаў банкаўскі чэк на пяцьдзесят тысяч і ўручыў яго графіні.

— А цяпер, — сказаў ён з вальтэраўскай усмешкай, — я выдам вам на трыццаць тысяч вэксаляў, якія надзейныя, быццам золата. Граф дэ Трай толькі што сказаў мне, што яго вэксалі будуць аплочаныя, — дадаў Габсэк, падаючы жанчыне вэксалі, падпісаныя маладым франтам. Яны былі апратэставаны адным з калегаў Габсэка, і, відаць, іх прадалі за бясцэнак.

Максім дэ Трай аж застагнаў, пры гэтым няцяжка было разабраць словы: «Стары мярзотнік!»

Аднак татачка Габсэк, нават не павёўшы брывом, выцягнуў з картоннага карабка два пісталеты і холадна прамовіў:

— За мною першы стрэл, бо я — пакрыўджаны бок.

— Максім! — ціха ўсклікнула ахопленая дрыжыкамі графіня, — вы павінны папрасіць у месье прабачэння.

— Месье, у мяне не было намеру абразіць вас, — прамармытаў граф.

— Я гэта добра ведаю, — спакойным голасам адказаў Габсэк, — у вашы намеры ўваходзіла толькі не плаціць за вэксалі.

Графіня ўскочыла з месца, хуценька развіталася і, відаць, ахопленая жахам, выбегла з пакоя. Граф дэ Трай вымушаны быў пайсці за ёю. Але перад тым як выйсці, ён прамовіў:

— Калі каму-небудзь вы скажаце хоць слова пра ўсё гэта, спадары, праліецца мая ці ваша кроў.

— Амін, — кінуў яму ў адказ Габсэк, моцна сціскаючы ў руках пісталеты. — Каб праліць кроў, трэба спачатку мець яе, а ў цябе, мой мілы, замест крыві ў жылах — бруд.

Калі дзверы зачыніліся і ад пад'езда ад'ехалі два экіпажы, Габсэк усхапіўся з месца і пачаў скакаць, паўтараючы ў такт:

— А дыяменты ў мяне! А дыяменты мае! Добрыя, прыгожыя і недарагія! Ай-яй-яй! А Вербруст і Жыганэ думалі мяне падшпіліць. Выйшла ж наадварот: я іх

падшпіліў. Сапраўды, я — бацька ў параўнанні з імі. Ну і твары ў іх будуць, калі я вечарам пры даміно раскажу ім сённяшнюю гісторыю!

Гэта нястрыманая радасць, гэта злосная сквапнасць дзікуна, які атрымаў у свае рукі некалькі белых каменьчыкаў, так моцна ўразілі мяне, што я на нейкі час страціў мову.

— А-а, ты яшчэ тут, галубок, — нарэшце заўважыўшы мяне, прамовіў ён. — Сёння мы папалуднуем разам. І зробім гэта ў цябе: ты ж ведаеш, што я не вяду гаспадаркі, ну а рэстараны з іх прыправамі ды соусамі, з іх няякаснымі вінамі могуць атруціць і д'ябла.

Толькі цяпер ён разгледзеў, які выраз мае мой твар, і адразу ж зрабіўся падобным да халоднага стода.

— Вам гэтага не зразумець, — сказаў ён, сядаючы ля каміна, у якім на вуголлях стаяў бляшаны рондаль з малаком. — Можа, паснедаеце са мною, — дадаў ён, — тут павінна хапіць на дваіх.

— Дзякую, — адказаў я, — я заўсёды снедаю апоўдні.

У гэты момант у калідоры пачуліся нечыя паспешлівыя крокі.

Нехта спыніўся перад дзвярыма Габсэка і настойліва некалькі разоў пастукаў у іх.

Ліхвяр паглядзеў у вакенца, зробленае ў дзвярах, пасля адчыніў самі дзверы. У пакой зайшоў мужчына гадоў трыццаці пяці, які, напэўна, паказаўся яму бяскрыўдным, нягледзячы на тое, з якой раз'юшанасцю апошні пастукаў у дзверы.

Наведвальнік быў апрануты проста, і знешнасць яго нагадвала нябожчыка герцага Рышэлье. Гэта быў муж графіні, і вы, вядома, сустракалі яго ў свеце. У яго была, прабачце мне гэты выраз, арыстакратычная пастава, уласцівая дзяржаўным мужам, жыхарам вашага прадмесця.

— Месье, — прамовіў ён, звяртаючыся да Габсэка, які зноў зрабіўся вельмі спакойным, — гэта мая жонка толькі што выйшла адсюль?

— Магчыма.

— Вы што ж, месье, не разумееце мяне?

— Я не маю гонару ведаць вашу жонку, — адказаў ліхвяр. — Сёння раніцай у мяне было шмат рознага люду: жанчын, мужчын, дзяўчат, падобных да юнакоў, і юнакоў, падобных да дзяўчат. Мне, ведаеце, цяжка...

— Кіньце жарты, месье! Я маю на ўвазе жанчыну, якая толькі што выйшла ад вас.

— А як я магу ведаць, што гэта — ваша жонка? Я не меў шчасця бачыць вас раней.

— Памыляецеся, месье Габсэк, — з глыбокай іроніяй вымавіў граф. — Аднойчы раніцай мы ўжо сустракаліся ў спальні маёй жонкі. Вы прыходзілі спаганяць грошы па вэксалі, з якога яна ніякіх грошай не атрымлівала.

— А гэта ўжо не мая справа — выведваць, за якія каштоўнасці ёй была вернута гэта сума, — запярэчыў Габсэк, кінуўшы на графа злосны хітраваты позірк. — Я ўлічыў яе вэксаль пры разліках з адным маім калегам. Дарэчы, шаноўны, дазвольце заўважыць, — дадаў Габсэк, спакойна насыпаючы каву ў малако, — мне здаецца, што вы не маеце права павучаць мяне ў маім уласным доме. Апроч таго, я дасягнуў паўналецця яшчэ ў шэсцьдзесят першым годзе мінулага стагоддзя.

— Шаноўны спадар, вы толькі што купілі ў маёй жонкі дыяменты за дужа нізкую цану. Яны не належаць ёй, гэта родавыя каштоўнасці.

— Я не лічу сябе абавязаным пасвячаць вас у таямніцы маіх спраў, аднак, калі графіня, не спытаўшыся ў вас, узяла дыяменты, вы павінны былі пісьмова папярэдзіць усіх злотнікаў, каб яны іх не куплялі — яна магла прадаць іх па частках.

— Месье! — усклікнуў граф. — Вы не ведаеце маёй жонкі.

— Няўжо?

— Як замужняя жанчына, яна падпарадкоўваецца мужу.

— Магчыма.

— Яна не мела права распараджацца гэтымі дыяментамі...

— Слушна.

— Дык як жа тады, месье?

— А во як! Я ведаю вашу жонку, яна падпарадкоўваецца мужу, — згодзен з вамі; ёй яшчэ й іншым даводзіцца падпарадкоўвацца, — *але вашых дыяментаў я не ве-да-ю.* Калі ваша жонка падпісвае вэксалі, дык, відавочна, яна можа заключаць і камерцыйныя пагадненні, купляць дыяменты ці браць іх на камісію дзеля продажу. Гэта здараецца.

— Бывайце, месье! — закрычаў граф, палатнеючы ад гневу. — Ёсць суд!

— Слушна.

— Вось гэты месье, — дадаў граф, паказваючы на мяне, — быў сведкам продажу.

— Магчыма.

Граф пайшоў у бок дзвярэй. Бачачы, што справа робіцца сур'ёзнаю, я вырашыў умяшацца і замірыць праціўнікаў.

— Граф, — сказаў я, — ваша праўда, але й спадар Габсэк не вінаваты. Вы не можаце падаць на яго ў суд, пакінуўшы ў баку вашу жонку, а гэтым працэсам вы наклічаце ганьбу не толькі на яе адну. Я страпчы, але пацвярджаю вам, не як афіцыйная асоба, а як сумленны чалавек, што продаж быў зроблены ў маёй прысутнасці. Але я не думаю, што вам удасца скасаваць гэту здзелку як незаконную, ды й нялёгка будзе выявіць, што прададзены менавіта вашы дыяменты. Па справядлівасці праўда ваша, а па закону вы пацерпіце крах. Месье Габсэк чалавек вельмі сумленны і не будзе адмаўляць таго, што купіў дыяменты дужа выгадна для сябе, ды і я, згодна з абавязкам і згодна з сумленнем, сведчу пра гэта. Аднак калі вы пачнеце перасуды, вам наўрад ці пашанцуе. Раю вам пайсці на міравую з месье Габсэкам. Бо ён зможа даказаць у судзе сваю добрасумленнасць, а вам давядзецца ўсё роўна выплаціць суму, заплачаную ім. Згадзіцеся лічыць свае дыяменты ў закладзе на сем, на восем месяцаў, нават на год, калі раней гэтага тэрміну вы не зможаце вярнуць грошы, атрыманыя графіняй. А можа, вы выбераце такі варыянт: выкупіце іх сёння ж, даўшы на тое неабходныя гарантыі?

Увесь гэты час ліхвяр вельмі нервова мачаў хлеб у каву і снедаў, але пачуўшы словы «пайсці на міравую», кінуў на мяне позірк, у якім я прачытаў: «Малайчына! Спрытна карыстаешся маімі ўрокамі!» Я адказаў яму позіркам, які ён добра зразумеў: «Справа дужа нявыгадная, брудная, таму вам трэба як мага хутчэй заключыць узаемнае пагадненне». Габсэк не мог упарціцца, бо ведаў, што я скажу на судзе ўсю праўду. Граф падзякаваў мне добразычлівай усмешкай. Пасля доўгіх абмеркаванняў, у якіх сваёй хітрасцю і сквапнасцю Габсэк заткнуў бы за пояс удзельніка любога дыпламатычнага кангрэсу, я склаў акт, дзе граф прызнаваў, што атрымаў ад Габсэка восемдзесят пяць тысяч франкаў, уключаючы ў гэтую суму і працэнты пры ссудзе, а Габсэк абавязваўся пасля выплаты яму ўсёй сумы пазыкі вярнуць дыяменты графу.

— Якое марнатраўства! — з сумам у голасе ўсклікнуў граф, падпісваючы акт. — Як перакінуць мост цераз гэтую бездань?

— Месье, а ў вас шмат дзяцей? — сур'ёзным тонам спытаўся Габсэк.

Пры гэтых яго словах граф скаланууся, быццам стары ліхвяр, як дасведчаны лекар, намацаў балючае месца. Ён не адказаў нічога.

— Так, так, так, — прамармытаў Габсэк, зразумеўшы яго панурае маўчанне. — Я вашу гісторыю ведаю назубок. Гэта ваша жонка — сапраўдны дэман, а вы, відаць, яшчэ моцна кахаеце яе. Разумею! Яна нават мяне прымусіла хвалявацца. Можа, вы хочаце выратаваць сваё багацце, зберагчы яго для аднаго ці для двух сваіх сыноў? Раю вам: кідайцеся ў вір свецкіх асалодаў, гуляйце дзеля выгляду ў карты, трацьце грошы ды часцей заходзьце да Габсэка. У свецкіх колах мяне будуць клікаць жыдам, эфіопам, ліхвяром, грабежнікам, гаварыць, што я давяду вас да галечы. А мне наплявацъ! За знявагу крыўдзіцель дорага заплаціць! Ніхто так не страляе з пісталета і не валодае шпагай, як я. Гэта ўсім вядома. І яшчэ раю вам, — знайдзіце надзейнага сябра, калі можаце, і шляхам фіктыўнага пагаднення перадайце яму ўсю вашу маёмасць. Як гэта ў вас, юрыстаў, называецца? Здаецца, *фідэікоміс*? — спытаў ён, павярнуўшыся да мяне.

Граф быў засяроджаны на сваіх клопатах і, пакідаючы нас, сказаў Габсэку:

— Заўтра я прынясу вам грошы. Трымайце дыяменты напагатове.

— Мне здаецца, што ён дурань, як і ўсе гэтыя вашы прыстойныя людзі, — холадна прамовіў Габсэк, калі граф выйшаў.

— Скажыце лепш — як людзі, ахопленыя страсцю.

— А за складанне акта няхай вам заплаціць граф, — сказаў Габсэк, калі мы развітваліся.

Праз некалькі дзён пасля гэтай гісторыі, якая адкрыла мне страшныя таямніцы свецкай жанчыны, граф завітаў уранні да мяне.

— Месье, — сказаў ён, увайшоўшы ў мой кабінет. — Я хачу параіцца з вамі ў вельмі важнай справе. Лічу сваім абавязкам заявіць, што я адчуваю да вас вялікі давер і спадзяюся даказаць гэта. Вашы паводзіны на працэсах мадам дэ Гранльё надзвычай пахвальныя. (Вось бачыце, мадам, — адзначыў страпчы, павярнуўшыся да вікан-

тэсы, — паслугу я вам зрабіў зусім простую, а колькі разоў атрымаў за гэта ўзнагароду...) Я з павагаю схіліў галаву перад графам і адказаў, што я толькі выконваў абавязак сумленнага чалавека.

— Дык вось, месье, я маю дакладныя звесткі пра таго дзіўнага чалавека, якому вы абавязаны сваім становішчам, — сказаў граф, — і з гэтых маіх звестак вынікае, што ваш Габсэк — філосаф з школы цынікаў. Што вы думаеце наконт яго сумленнасці?

— Граф, — адказаў я, — Габсэк мой дабрадзей... З-за пятнаццаці працэнтаў, — дадаў я, смеючыся. Аднак яго сквапнасць усё ж не дае мне права надта адкрыта гаварыць пра яго з незнаёмым мне чалавекам.

— Гаварыце, месье. Вашая шчырасць не можа нашкодзіць ні Габсэку, ні вам. Я не думаю, што гэты ліхвяр падобны да анёла.

— У таты Габсэка, — сказаў я, — ёсць адно галоўнае правіла, якога ён трымаецца ў сваіх паводзінах. Ён лічыць, што грошы — гэта тавар, які можна са спакойным сумленнем прадаваць, дорага ці танна, у залежнасці ад абставін. Ліхвяр, які бярэ вялікія працэнты за ссуду, на яго думку, такі ж капіталіст, як і любы іншы ўдзельнік прыбытковага прадпрыемства ці спекуляцыі. А калі адкінуць яго фінансавыя прынцыпы і яго разважанне пра чалавечую натуру, якімі ён апраўдвае сваё ліхвярства, дык я лічу, што ва ўсім Парыжы няма далікатнейшага і сумленнейшага за яго чалавека. У ім жывуць дзве істоты: скнара і філосаф, нізкае і высокае. Калі я памру, пакінуўшы малых дзяцей, ён будзе іх апекуном. Вось, месье, якім я ўяўляю сабе Габсэка, грунтуючыся на сваім досведзе. Я нічога не ведаю пра яго мінулае. Магчыма, ён быў карсарам; магчыма, вандраваў па ўсім свеце, гандляваў дыяментамі ці людзьмі, жанчынамі ці дзяржаўнымі сакрэтамі, але я глыбока ўпэўнены, што ніводная чалавечая душа не атрымала такой жорсткай загартоўкі, як ягоная. У той дзень, калі я прынёс яму свой доўг і расплаціўся цалкам, я з нейкай асцярогай спытаў у яго, чаму ён браў з мяне такія вялікія працэнты і чаму ён, жадаючы дапамагчы мне, свайму сябру, не дазволіў сабе зрабіць гэта зусім бескарысліва. «Сыне мой, я пазбавіў цябе ад удзячнасці, я даў табе права лічыць, што ты мне нічым не абавязаны. Таму мы з табою найлепшыя ў свеце сябры». Гэты адказ, месье, лепш за ўсялякія словы дае вам Габсэкаў партрэт.

— Я прыняў рашэнне раз і назаўсёды, — прамовіў граф. — Падрыхтуйце, калі ласка, усе неабходныя акты для перадачы Габсэку правоў на маю маёмасць. І толькі вам, месье, я магу даверыць складанне сустрэчнай распіскі, у якой ён заявіць, што продаж з'яўляецца фіктыўным і што ён абавязваецца кіраваць маёй маёмасцю, як пажадае, а потым перадасць яе ў рукі майго старэйшага сына, калі той дасягне паўналецця. Але я павінен сказаць вам наступнае: мне боязна хаваць у сябе гэту распіску. Мой сын так прывязаны да маці, што і яму я не магу даверыць гэты каштоўны дакумент. Я прашу вас узяць яго да сябе на захаванне. У выпадку маёй смерці Габсэк прызначыць вас спадкаемцам маёй маёмасці. Такім чынам, усё прадугледжана.

Нейкі час граф маўчаў. Выглядаў ён дужа ўсхваляваным.

— Я тысячу разоў прашу ў вас прабачэння, шаноўны пане, — што патурбаваў вас, — нарэшце загаварыў ён, — але я так пакутую, ды яшчэ і маё здароўе моцна мяне непакоіць. Нядаўнія падзеі з'явіліся для мяне вялікім ударам, і трэба было, каб я паклапаціўся і зрабіў сякія-такія рашучыя захады.

— Месье, — адказаў я, — перш за ўсё дазвольце падзякаваць вам за давер. Але каб апраўдаць яго, я павінен заўважыць, што гэтымі захадамі вы зусім абяздоліце... вашых малодшых дзяцей, а яны ж таксама носяць ваша прозвішча. Няхай ваша жонка мела грахі перад вамі, аднак жа вы яе некалі кахалі, і яе дзеці маюць права на пэўную забяспечанасць. Вымушаны заявіць вам, што я не згаджуся прыняць на сябе пачэсны абавязак, які вы ўскладваеце на мяне, пакуль іх доля не будзе дакладна вызначана.

Граф скалануўся, на вачах у яго выступілі слёзы, і ён сказаў, моцна паціснуўшы мне руку:

— Я яшчэ вас добра не ведаў. Вы зрабілі мне балюча, але і парадавалі мяне. Сапраўды, трэба ў першым жа пункце сустрэчнай распіскі вызначыць, якая доля належыць гэтым дзецям.

Я праводзіў яго да дзвярэй маёй канторы, і мне здалося, што яго твар пасвятлеў ад задаволенасці гэтым справядлівым учынкам.

— Вось, Каміла, як маладыя жанчыны коцяцца ў бездань. Бывае дастаткова аднаго танца на балі, раманса, спетага пры фартэп'яна, выезду за горад, каб іх напатка-

ла непапраўнае няшчасце. Да яго імкнуцца самі, прыслухоўваючыся да голасу самаўпэўненага пустахвальства, ганарлівасці, паверыўшы ўсмешцы, паддаючыся легкадумнасці маладога ўзросту. А як толькі жанчына пяройдзе вядомую мяжу, яна адразу ж трапляе ў рукі трох фурый, імя якім ганьба, раскаянне, беднасць, і тады...

— Мая бедная Каміла ўжо дрэмле, — прамовіла вікантэса, перапыняючы страпчага. — Ідзі, дачушка, спаць. Няма чаго пужаць цябе гэтымі агіднымі карцінамі, твая душа і так будзе чыстай і дабрадзейнай.

Каміла дэ Гранльё зразумела маці і выйшла.

— Вы надта далёка зайшлі, дарагі Дэрвіль, — сказала вікантэса, — страпчы ўсё-такі не маці і не прапаведнік.

— Але ж у газетах і не такое пішуць...

— Бедны Дэрвіль! — перапыніла яго вікантэса. — Я вас не пазнаю. Няўжо вы думаеце, што мая дачка чытае газеты? — Пасля хвіліны маўчання яна дадала: — Працягвайце вашу гісторыю.

— Дык вось. Прайшло тры месяцы пасля пацвярджэння купчай на маёмасць графа, якая перайшла да Габсэка...

— Цяпер можаце называць імя графа — дэ Рэсто, бо маёй дачкі тут няма, — сказала вікантэса.

— Хай будзе так, — згадзіўся страпчы. — Прайшло шмат часу пасля гэтых падзей, але я ўсё ніяк не атрымліваў таго важнага дакумента, які павінен быў захоўвацца ў мяне. У Парыжы страпчых так захапляе плынь штодзённых спраў, што ім няма калі аддаваць шмат часу кожнаму свайму кліенту, за пэўнымі выключэннямі. І вось аднаго разу, у час абеду, на які я запрасіў да сябе Габсэка, калі мы ўсталі з-за стала, я спытаў, што яму вядома пра месье дэ Рэсто, чаму пра яго няма больш ніякіх чутак.

— На тое ёсць важкія прычыны, — адказаў Габсэк. — Ён пры смерці. Граф з тых людзей, у якіх вельмі тонкая душа, яны не могуць супраціўляцца бядзе: яна іх забівае. Жыццё — гэта складанае, цяжкае рамяство, і трэба прыкласці намаганні, каб яго засвоіць. Калі чалавек спазнае жыццё, церпячы ўсе ягоныя пакуты, фібры яго душы загартоўваюцца і набываюць своеасаблівую гнуткасць, і гэта дазваляе ім кіраваць сваёй чуллівасцю. Нервы тады робяцца не горш за стальныя спружыны — гнуцца, але не ломяцца. А калі яшчэ і стравaванне добрае,

дык пры такой падрыхтоўцы чалавек будзе жыць доўга, як ліванскі кедр, дарэчы, цудоўнае дрэва.

— Няўжо граф памрэ? — усклікнуў я.

— Магчыма, — сказаў Габсэк. — Пасля яго смерці ў вас з'явіцца прыбытковая справа.

Я паглядзеў на майго госця і спытаў, каб выявіць яго намеры:

— Растлумачце мне, калі ласка, чаму вы выказалі спагаду толькі да мяне і да графа?

— Бо толькі вы з ім даверыліся мне без хітрыкаў, — адказаў ён мне.

Хоць гэты адказ і дазваляў мне думаць, што Габсэк не будзе злоўжываць сваім становішчам, калі нават знікне сустрэчная распіска, аднак я ўсё ж наважыўся наведаць графа. Я сказаў, што мяне чакаюць справы і мы выйшлі з дому разам з Габсэкам. На вуліцу Эльдэр я прыехаў вельмі хутка. Мяне правялі ў гасцёўню, дзе графіня гуляла са сваімі малодшымі дзецьмі. Калі лёкай паведаміў пра маё з'яўленне, яна ўсхапілася з месца, пайшла мне насустрач, потым села і моўчкі паказала рукою на вольнае крэсла каля каміна. Яна адразу ж быццам прыкрыла твар маскай, пад якой свецкія жанчыны добра ўмеюць хаваць свае пачуцці. Ад перажытых бедаў твар яе крыху пабляк, аднак чароўныя рысы не змяніліся і сведчылі пра колішнюю прыгажосць.

— У мяне вельмі важная справа да вашага мужа, мадам, і я хацеў бы пагаварыць з ім...

— Калі вам гэта ўдасца, вам больш пашанцуе, чым мне, — адказала яна, перапыніўшы мяне. — Граф дэ Рэсто нікога не хоча бачыць, прыходы свайго доктара пераносіць з цяжкасцю і нават мне не дазваляе глядзець за ім. Дзіўна сябе паводзяць гэтыя хворыя! Яны, як дзеці, самі не ведаюць, чаго хочуць.

— А можа, наадварот, — яны, як дзеці, добра ведаюць, чаго хочуць.

Графіня пачырванела. Я ўжо амаль шкадаваў, што дазволіў сабе такую рэпліку ў стылі Габсэка, і паспяшаўся змяніць тэму гутаркі.

— Аднак жа нельга, мадам, гэтак доўга пакідаць хворага сам-насам з сабою.

— Побач з ім яго старэйшы сын, — адказала графіня.

Дарэмна я пільна глядзеў ёй у вочы; гэтым разам яна не пачырванела, і мне здалося, што яна цвёрда вырашыла не даць мне дабрацца да яе таямніц.

— Вы павінны зразумець, мадам, што мая настойлівасць не выклікана нясціплай цікаўнасцю. Тут закрануты важныя інтарэсы...

Я прыкусіў язык, бо адчуў, што пайшоў не туды. Графіня адразу ж скарыстала мой промах.

— Інтарэсы майго мужа і мае — непадзельныя, шаноўны... — прамовіла яна. — Таму нішто вам не перашкаджае звярнуцца да мяне...

— Справа, дзеля якой я прыйшоў, мае дачыненне толькі да графа, — цвёрда сказаў я.

— Я перадам яму пра ваша жаданне пагаварыць з ім.

Аднак яе пачцівы тон і ветлівы выгляд не маглі ашукаць мяне, — я здагадаўся, што яна ні за што на свеце не пусціць мяне да свайго мужа. Я яшчэ нейкі час гаварыў пра розныя, неістотныя рэчы, каб добра паназіраць за графіняй; але як і ўсе жанчыны, выпрацаваўшы план дзеянняў, яна хавала яго з вялікім майстэрствам, што сведчыць пра найвышэйшую ступень вераломства ў прадстаўніц прыгожага полу. Страшна сказаць, але я чакаў з яе боку ўсяго, нават злачынства. Бо ў кожным яе руху, у яе паглядзе, у яе манеры трымаць сябе, у інтанацыях голаса адчувалася, што яна добра ведае, якая будучыня яе чакае. Я развітаўся з ёю... А цяпер я раскажу вам заключныя сцэны гэтай драмы, дадаўшы да іх акалічнасці, якія выявіліся з цягам часу, а таксама дэталі, разгаданыя праніклівым Габсэкам і мною самім. З таго часу як граф дэ Рэсто, відаць, акунуўся ў акіян свецкіх асалодаў і пачаў марнатравіць сваё багацце, паміж ім і графіняй адбываліся сцэны, якія далі графу падставу яшчэ больш ненавідзець жонку, чым гэта было раней. А калі ён цяжка захварэў і злёг, тады цалкам выявілася яго агіда да яе і да малодшых дзяцей: ён забараніў ім уваходзіць да яго ў спальню, і калі гэту забарону спрабавалі нарушыць, гэта выклікала такія небяспечныя для яго жыцця прыпадкі, што сам лекар маліў графіню, каб яна падпарадкоўвалася мужавым загадам. Графіня дэ Рэсто бачыла, як уся іх сямейная маёмасць — маёнткі, фермы, дом, дзе яна жыве, пераходзяць у рукі Габсэка, які здаваўся ёй казачным чарадзеем, што паглынаў яе багацці, і яна, безумоўна, зразумела, што ў мужа ёсць нейкая таямнічая задума.

Максім дэ Трай у гэты час, ратуючыся ад сваіх настойлівых крэдытораў, падарожнічаў па Англіі. Толькі ён мог расказаць графіні праўду пра патаемныя захады,

падказаныя графу ліхвяром дзеля абароны ад яе. Кажуць, яна доўга не згаджалася ставіць свой подпіс, які, згодна з нашымі законамі, неабходны для продажу маёмасці, але граф дамогся гэтага ад яе. Графіня думала, што муж пераводзіць сваю маёмасць у грошы, і што пачак крэдытных білетаў, у які яна ператварылася, захоўваецца ў патайной шафе ў якога-небудзь натарыуса ці ў банку. Паводле яе разлікаў, у спадара дэ Рэсто павінен быў абавязкова знаходзіцца ў руках нейкі дакумент, які даваў старэйшаму сыну магчымасць абараніць свае правы на атрыманне часткі маёмасці, што належала бацьку. Таму яна вырашыла ўстанавіць пастаянны нагляд за спальняй мужа. У доме яна была дэспатычнай гаспадыняй і падпарадкавала ўсё свайму жаночаму віжаванню. Яна ўвесь дзень сядзела ў гасцёўні перад спальняй мужа, прыслухоўвалася да кожнага слова ці гуку, што маглі даносіцца адтуль. А ўвечары ёй слалі тут жа пасцель, хоць яна да раніцы не спала. Доктар быў таксама на яе баку: паказная адданасць мужу гэтай пані зачароўвала ўсіх. З уласцівай ёй хітрасцю вераломнай істоты яна хавала сапраўдныя прычыны агіды, якую выказваў да яе муж і так па-майстэрску разыгрывала жалобу, што адразу набыла вядомасць. Пэўныя ахоўніцы нораваў нават лічылі, што яна загладзіла свае грахі. Але ўвесь час у яе ўваччу стаяла беднасць, якая чакала яе пасля смерці графа, калі яна занепадзе духам. Такім чынам, гэтая жанчына адрынутая ад ложка, дзе памірaў яе муж, накрэсліла вакол яго магічнае кола. Яна была далёка ад яго і побач з ім, пазбаўленая ўсіх правоў і, разам з тым, усемагутная; яна выдавала з сябе адданую жонку, а сама пільнавала час яго смерці, нібы тое насякомае, што капае ў пяску спіралепадобную норку і, стаіўшыся на дне яе, чакае выбраную ахвяру, прыслухоўваючыся да падзення кожнай пясчынкі. Самы суровы мараліст быў бы вымушаны прызнаць, што графіня моцна любіць сваіх дзяцей. Кажуць, смерць бацькі была ёй навукай. Яна вельмі любіла дзяцей і імкнулася схаваць ад іх сваё распуснае жыццё; іх малы ўзрост дазваляў ёй лёгка рабіць гэта і выклікаць любоў да сябе. Яна дала ім найлепшую, бліскучую адукацыю. Прызнаюся, што я стаўлюся да гэтай жанчыны з нейкай павагаю і жалем, за што Габсэк яшчэ нядаўна падсмейваўся з мяне. У тую пару графіня ўжо была пераканаяная ў подласці Максіма дэ Трая і горкімі слязамі замольвала грахі свайго мінулага. Я веру ў гэта. Хоць

захады, якія яна рабіла, каб захапіць багацце мужа былі агіднымі, але, відаць, яны былі прадыктаваны матчынай любоўю і жаданнем выкупіць сваю віну перад дзецьмі. Потым, як і іншыя жанчыны, што перажылі буру пачуццяў, яна цяпер шчыра імкнулася стаць дабрачыннай. Можа, яна і спазнала цану дабрачыннасці толькі тады, калі сабрала сумны ўраджай сваіх памылак. Кожны раз, як Эрнэст выходзіў ад свайго бацькі, яму ўчыняўся інквізітарскі допыт: што граф рабіў і пра што гаварыў. Хлопчык казаў ёй нават больш, чым яна пытала, і лічыў, што гэта цікаўнасць маці тлумачыцца вялікай яе любоўю да бацькі. Мой візіт занепакоіў графіню: яна бачыла ў маёй асобе здзяйсненне графавай помсты і вырашыла ні за што не падпускаць мяне да чалавека на смяротным ложку.

Прадчуваючы нядобрае, я хацеў убачыцца з месье дэ Рэсто, бо турбаваўся за лёс сустрэчных распісак, якія маглі трапіць у рукі графіні: тады б яна распачала бясконцыя працэсы з Габсэкам. Я досыць добра ведаў характар ліхвяра, каб быць упэўненым у тым, што ён ніколі не верне графіні маёмасць, атрыманую ад графа, але ў тэксце сустрэчных распісак былі некаторыя моманты, якія ў дзеянне мог прывесці толькі я. Жадаючы прадухіліць столькі няшчасцяў, я прыйшоў да графіні другі раз.

— Я заўважыў, мадам, — сказаў Дэрвіль вікантэсе дэ Гранльё з таямнічым выглядам, — што існуюць некаторыя маральныя з'явы, на якія мы не звяртаем дастаткова ўвагі. Па сваёй натуры я люблю назіраць, і ў справы, якія мне даводзілася весці, асабліва, калі ў іх разгараліся чалавечыя пачуцці, заўсёды неяк уносіў дух аналізу. І я заўсёды не пераставаў здзіўляцца здольнасці праціўнікаў разгадваць патаемныя думкі і намеры адзін аднаго. Бывае, што паміж двума ворагамі існуе такая падобная яснасць розуму, такая ж сіла ўнутранага зроку, як паміж закаханымі, якія могуць чытаць у душы думкі адзін аднаго. І вось, калі мы другі раз засталіся з графіняй сам-насам, я адразу ўцяміў, што яна мяне ненавідзіць, і здагадаўся — чаму, хоць яна хавала свае пачуцці за ветлівасцю і гасціннасцю. Я быў вымушаны ведаць яе таямніцы, а любая жанчына ненавідзіць таго, перад кім ёй даводзіцца чырванець. Яна здагадалася, што хоць я і даверaная асоба яе мужа, аднак ён яшчэ не паспеў перадаць мне сваю маёмасць. Наша размова, якую я тут не

буду пераказваць, засталася ў маёй памяці як адна з самых небяспечных боек, што мне давялося весці ў жыцці. Гэтая жанчына, надзеленая ад прыроды ўсімі чарамі спакусніцы, была то даступная, то ганарлівая, то ласкавая, то даверлівая; яна нават спрабавала распаліць маю мужчынскую цікаўнасць, выклікаць каханне ў маім сэрцы, каб скарыць мяне, але ёй гэта не ўдалося. Калі я збіраўся пайсці ад яе, то заўважыў у яе вачах такую лютую нянавісць, што ажно здрыгануўся. Мы развіталіся ворагамі: ёй бы хацелася знішчыць мяне, а я яе шкадаваў, што для такіх характараў, як у яе, гэта выглядае ганебным. Яна адчула гэту літасць і ў ветласці маіх слоў, прамоўленых на развітанне. Я даў ёй зразумець, што, як бы яна ні хітрыла, яе чакае непазбежнае банкруцтва; і, напэўна, жах ахапіў яе.

— Калі б я мог пагаварыць з графам, то, прынамсі, лёс вашых дзяцей...

— Ніколі! Тады я ва ўсім буду залежаць ад вас! — запярэчыла яна, перапыніўшы мяне з пагардай.

Паколькі барацьба паміж намі прыняла такі адкрыты характар, я вырашыў сам выратаваць гэту сям'ю ад беднасці, якая ёй пагражала. Дзеля гэтай мэты я быў гатовы, калі спатрэбіцца, пайсці нават на юрыдычна незаконныя дзеянні. І вось якія: я ўзбудзіў супраць графа дэ Рэсто іск на ўсю суму яго фіктыўнага доўгу Габсэку і атрымаў выканаўчы ліст. Графіні, вядома, давялося хаваць ад свету судовае рашэнне. Яно давала мне права пасля смерці графа апячатаць яго маёмасць. Потым я падкупіў аднаго слугу ў графскім доме, і гэты чалавек абяцаў выклікаць мяне ў любы час дня і ночы, калі яго гаспадар будзе пры апошнім уздыху — для таго, каб я мог прыехаць нечакана, напужаць графіню пагрозай неадкладнага вопісу маёмасці, і такім чынам выратаваць сустрэчныя распіскі. Потым я даведаўся, што гэтая жанчына вывучала Грамадзянскі кодэкс, у той час як за сцяной чуліся стогны паміраючага мужа. Жудасную карціну мы ўбачылі б, каб маглі зазірнуць у душы спадкаемцаў, што абступаюць ложак паміраючага. Колькі тут інтрыг, разлікаў, хітрасцей — і ўсё дзеля грошай. Але пакінем гэтыя падрабязнасці, досыць агідныя самі па сабе, хоць пра іх трэба было сказаць, бо яны дапамогуць вам уявіць пакуты гэтай жанчыны, пакуты яе мужа і прыўзнімуць заслону над замоўчанымі сямейнымі драмамі, падобнымі да гэтай. Два месяцы граф дэ Рэсто

ляжаў адзін у сваім пакоі, змірыўшыся са сваім лёсам. Смяротная хвароба паступова знішчала яго цела і розум. Як і іншыя цяжка хворыя, ён не быў пазбаўлены дзівацтваў. Не дазваляў прыбіраць у сваім пакоі, адмаўляўся ад усялякіх паслуг і нават не хацеў, каб перасцілалі яго пасцель. Гэта надзвычайная яго апатыя адбілася на ўсім: мэбля ў пакоі стаяла абы-як, пыл і павуцінне пакрылі нават самыя прыгожыя рэчы. Чалавеку, некалі багатаму і вытанчанаму, быццам бы давала асалоду тое невясёлае відовішча, што было ў яго перад вачыма ў гэтым пакоі, дзе і камін, і пісьмовы стол, і крэслы былі застаўлены рэчамі, якія патрэбны хвораму: пустымі і поўнымі бутэлечкамі, амаль выключна брудныміі, раскіданай бялізнай, разбітымі талеркамі, грэлкаю без корка ля каміна, ваннай з нявылітаю мінеральнаю вадой. У кожнай драбніцы гэтага бязладдзя адчуваўся крах чалавечага жыцця. Перад тым як забраць чалавека, смерць выказвала сваю прысутнасць у рэчах. Дзённае святло выклікала ў графа жах, таму аканіцы былі ўвесь час зачынены, і гэты паўзмрок надаваў пакою яшчэ большую панурасць. Хворы моцна схуднеў. Здавалася, што толькі ў вачах свяціўся апошні агеньчык жыцця. Нешта жудаснае было ў змярцвелай белізне яго твару, найперш з тае прычыны, што доўгія адпушчаныя валасы, якія ён не дазваляў падразаць, тонкімі пасмамі абрамлялі яго запалыя шчокі. Ён нагадваў аднаго з фанатыкаў-пустэльнікаў. Гора патушыла ў ім усе чалавечыя пачуцці, хоць яму яшчэ не было і пяцідзесяці; а быў жа час, калі ўвесь Парыж ведаў яго такім бліскучым і такім шчаслівым!

Аднойчы раніцай, у пачатку снежня 1824 года, Эрнэст, сын графа, сядзеў каля яго ложка і з вялікім засмучэннем глядзеў на бацьку. Бацька расплюшчыў вочы і ўбачыў яго. Сын спытаў:

— Баліць, тата?

— Не, — адказаў граф з жахлівай усмешкай. — *Усё — вось тут і вакол сэрца!* — І ён дакрануўся схуднелымі пальцамі да сваёй галавы, а потым з такім пакутлівым выглядам прыціснуў руку да запалых грудзей, што сын не вытрымаў і заплакаў.

— Чаму ж не прыходзіць Дэрвіль? — спытаў граф у свайго камердынера, якога лічыў адданым слугой, у той час як гэты чалавек быў цалкам на баку яго жонкі. — Як жа так, Марыс? — вымавіў ён і з вялікімі намаганнямі

сеў на ложку. Здавалася, яго розум прасвятлеў. — За апошнія два тыдні я раз сем, не меней, пасылаў вас па майго паверанага, а яго ўсё няма. Вы што, жартуеце са мною? Зараз жа, не адкладваючы, адпраўляйцеся і прывядзіце яго мне сюды! Калі вы не паслухаецеся, я сам падымуся і паеду...

— Мадам, — сказаў камердынер, заходзячы ў гасцёўню, — вы чулі, што сказаў граф? Што ж мне цяпер рабіць?

— Зрабіце выгляд, быццам едзеце да гэтага страпчага, а вярнуўшыся, паведаміце графу, што ён выехаў з Парыжа за сорак лье на важны працэс. І яшчэ паведаміце, што ён вернецца ў канцы тыдня.

«Хворыя ніколі не вераць у блізкі канец, — думала графіня, — і ён будзе чакаць, пакуль гэты чалавек не вернецца». Напярэдадні ўрач сказаў, што граф не працягне і сутак. Калі праз дзве гадзіны камердынер паведаміў графу несуцяшальную звестку, той вельмі захваляваўся.

— Божа мой, божа! — паўтараў ён раз за разам, — толькі на цябе маё спадзяванне.

Ён доўга глядзеў на свайго сына і нарэшце сказаў яму слабым голасам:

— Эрнэст, сынок мой, ты яшчэ вельмі малады, але ў цябе чыстая душа і ты павінен зразумець, наколькі святое тое абяцанне, якое ты дасі свайму паміраючаму бацьку. Ці адчуваеш ты, што зможаш захаваць таямніцу, каб нават маці не выведала яе? У гэтым доме я веру толькі табе аднаму. Ты не здрадзіш майму даверу?

— Не, татка.

— Дык вось, Эрнэст, я зараз дам табе заклеены канверт, які адрасаваны месье Дэрвілю. Ты павінен схаваць яго так, каб ніхто не ведаў, а потым выйдзеш з дому і кінеш яго ў паштовую скрынку на рагу вуліцы.

— Добра, тата.

— Ідзі пацалуй мяне. Цяпер мне, сынок, будзе не так цяжка паміраць. Гадоў праз шэсць ці сем ты даведаешся, якая гэта важная таямніца, і ты будзеш добра ўзнагароджаны за сваё разуменне і за сваю адданасць бацьку. І ты тады ўбачыш, як я любіў цябе. А цяпер пакінь мяне на хвілінку і нікога да мяне не пускай.

Эрнэст выйшаў у гасцёўню і ўбачыў, што там стаіць яго маці.

— Эрнэст, — прамовіла яна, — хадзі сюды. — Яна села і, прытуліўшы сына моцна да грудзей, пацалавала яго. — Эрнэст, татка толькі што гаварыў з табою?

— Але, мама.

— Што ён табе сказаў?

— Я не магу паўтарыць гэта, мама.

— Ах, мой ты сыночак! Як я рада, што ты ўмееш маўчаць. Запомні назаўсёды два прынцыпы: ніколі не маніць і быць верным свайму слову.

— Мамачка, якая ж ты добрая! Ты ніколі ў жыцці не хлусіла, я ўпэўнены ў гэтым!

— Не, сыночак! Былі моманты, калі я гаварыла няпраўду. Я вымушана была рабіць гэта, але пры такіх умовах, якія мацнейшыя за ўсе законы. Паслухай, Эрнэст, ты ўжо вялікі вырас і разумееш ўсё. Ты бачыш, што твой бацька адштурхоўвае мяне, не жадае, каб я глядзела за ім. Гэта несправядліва. Ты ж ведаеш, як я яго люблю.

— Але, мама.

— Бедны мой хлопчык, — прамовіла графіня ў слязах. — Ва ўсім вінаваты злыя людзі, якія абгаварылі мяне, хацелі разлучыць з тваім татам, бо яны зайздросцяць нашаму багаццю. Калі б твой татка быў здаровы, мы хутка памірыліся б, і ён, вельмі добры і чулы, хутка зразумеў бы сваю памылку. Але хвароба засціла яму розум, і ён перастаў мне давяраць. Яшчэ адзін доказ таго, што розум яго не ў парадку, гэта тое, што ён вылучае цябе сярод іншых дзяцей. Ты ж ніколі не заўважаў, каб да хваробы ён менш за цябе любіў Паліну і Жоржа. А цяпер усё залежыць ад яго капрызаў. Яго пяшчота да цябе прымусіла даць табе дзіўнае даручэнне. Сыночак мой, калі ты не хочаш давесці нашу сям'ю да галечы, калі не хочаш, каб твая маці хадзіла, як жабрачка, скажы мне ўсё...

— А-а-а! — дзіка закрычаў граф, адчыніўшы дзверы. Ён стаяў на парозе паўраздзеты, худы як шкілет. Яго жудасны крык моцна ўразіў графіню, і яна здранцвела, гледзячы на мужа. Граф быў гэткі бледны і слабы, што, здавалася, толькі што выйшаў з магілы.

— Вам мала таго, што вы атруцілі ўсё маё жыццё, вы нават памерці не дасцё мне спакойна, і яшчэ хочаце сапсаваць душу майго сына! — крычаў ён ахрыплым голасам.

Графіня ўкленчыла перад ім. Страшэнны выгляд паміраючага ўразіў яе так, што слёзы ручаём пацяклі з яе вачэй.

— Пашкадуйце мяне! Пашкадуйце, — маліла яна.

— А вы мяне шкадавалі?! — спытаў ён. — Я дазволіў вам змарнаваць усё ваша багацце, а цяпер вы хочаце маё растраціць, і сына майго зрабіць жабраком!

— Добра! Не шкадуйце мяне! — маліла яна. — Але дзяцей! — Загадайце — і я пайду ў манастыр, скончу там свой удовін век. Я падпарадкуюся, я зраблю ўсё, каб выкупіць маю віну перад вамі. Але дзеці! Няхай хоць нашы дзеці будуць шчаслівыя!

— У мяне толькі адно дзіця! — адказаў граф, працягваючы ў роспачы свае ссохлыя рукі да сына.

— Даруй! Я так раскайваюся, так раскайваюся, — рыдала графіня, абдымаючы вільготныя ад поту ногі свайго мужа.

Рыданні перашкаджалі ёй гаварыць, горла перахапіла, адтуль вырываліся нейкія незразумелыя гукі.

— Вы раскайваецеся! І гэта пасля таго, што вы толькі што казалі Эрнэсту! — сказаў паміраючы і адштурхнуў яе нагою. — Мяне ад вас кідае ў холад, — дадаў ён з такой абыякавасцю, ад якой павеяла жудасцю. — Вы былі кепскай дачкой, вы былі кепскай жонкай, вы будзеце кепскай маці...

Няшчасная жанчына самлела ў яго перад нагамі. Граф дабраўся да ложка, лёг і праз некалькі гадзін страціў прытомнасць. Прыйшлі святары, каб прычасціць яго. Апоўначы ён памёр. Ранішняя сцэна вычарпала яго апошнія сілы. Я прыехаў апоўначы разам з татам Габсэкам. Дзякуючы перапалоху, які гаспадарыў у доме, мы без перашкод праніклі ў маленькую гасцёўню, сумежную са спальняй нябожчыка, і ўбачылі траіх дзяцей, якія плакалі; з імі былі два святары, што засталіся, каб правесці ноч каля цела. Эрнэст падышоў да мяне і сказаў, што маці захацела пабыць адна ў пакоі памерлага графа.

— Не заходзьце туды! — прамовіў ён, і мяне ўсхвалявалі тон і жэст, які суправаджаў гэтыя яго словы. — Яна там моліцца.

Габсэк засмяяўся характэрным сваім бязгучным смехам. Я ж быў так уражаны выразам твару хлопчыка, што не змог падзяліць іроніі старога ліхвяра. Убачыўшы, што мы ўсё-такі ідзём да дзвярэй, хлопчык падбег да іх і крыкнуў у шчыліну.

— Мама, да цябе прыйшлі гэтыя агідныя людзі!

Габсэк адштурхнуў яго, быццам пёрка, і расчыніў дзверы. Якое відовішча мы ўбачылі! У пакоі быў поўны вэрхал. Графіня нерухома стаяла пасярэдзіне. Валасы ў яе былі распушчаныя, у вачах свяціўся адчай. Вакол яе раскіданы былі паперы, анучы, паношаная вопратка. Страшна было бачыць гэты беспарадак побач з нябожчыкам. Як толькі граф сканаў, яго жонка ўзламала ўсе шафы, усе шуфляды пісьмовага стала, дыван вакол яе быў густа засланы абломкамі мэблі, паразразанымі партфелямі. Усюды дабраліся яе дзёрзкія рукі. Магчыма, яе пошукі спачатку былі беспаспяховыя, але сама яе пастава, яе хваляванне падказвалі мне, што яна ўрэшце знайшла таямнічыя паперы. Я кінуў позірк на пасцель і, дзякуючы інтуіцыі страпчага, якая выпрацавалася ў мяне ў выніку вядзення многіх спраў, здагадаўся, што тут адбылося. Труп графа дэ Рэсто ляжаў ніцма, галавой да сцяны, з пагардаю адкінуты, як адзін з тых канвертаў, што ляжалі на падлозе, бо і ён цяпер быў толькі непатрэбнай абалонкай. Яго закачанелыя, раскінутыя рукі і ногі стваралі неверагодна жудасную позу. Напэўна, паміраючы хаваў сустрэчную распіску пад падушкай, спадзеючыся зберагчы яе да самай смерці. Графіня здагадалася, дзе ляжалі паперы, ды й гэта можна было зразумець з жэсту скручанай, мёртвай рукі. Падушка была адкінута, на ёй яшчэ быў відзён след жаночага чаравіка. На дыване перад графіняй я ўбачыў разарваны пакет з гербавымі пячаткамі графа. Я хуценька падняў яго і прачытаў надпіс, які сведчыў, што паперы ў ім павінны быць перададзены мне. Я паглядзеў на графіню з суровасцю следчага, які вядзе допыт злачынцы.

У каміне дагаралі паперы. Пачуўшы, што мы прыйшлі, графіня кінула іх у агонь, бо ўбачыла ў першых радках распараджэнні наконт сваіх малодшых дзяцей і падумала, што знішчае завяшчанне, якое пазбаўляла іх спадчыны, хоць, дзякуючы маёй настойлівасці, яны таксама мелі права на частку маёмасці. Цяпер яе ахапіў моцны жах перад толькі што зробленым злачынствам, сведкамі якога мы апынуліся, і яе збянтэжанаму розуму ўжо, мабыць, уяўлялася, як яна стаіць перад эшафотам, а кат выпальвае ёй таўро распаленым жалезам. Цяжка дыхаючы, яна глядзела на нас ашалелымі вачыма і чакала першых нашых слоў.

— Што вы нарабілі! — крыкнуў я, выхапіўшы з каміна кавалачак паперы, яшчэ не кануты агнём. — Вы разарылі сваіх дзяцей! Гэтыя ж дакументы забяспечвалі ім багацце.

Рот у графіні перакрывіла, быццам яе вось-вось павінен быў разбіць параліч.

— Эге! — прамовіў Габсэк, і гэты ягоны вокліч нагадваў скрып меднага падсвечніка, пасунутага на мармуровай пліце. Пасля некаторай паўзы, стары сказаў мне спакойным голасам:

— Ці не збіраецеся вы пераканаць графіню, што я не з'яўляюся законным уладаром маёмасці, якую мне прадаў граф? З гэтай хвіліны яго дом належыць мне.

Мяне быццам доўбняй ударылі па галаве, і я страціў мову на нейкі час. Графіня заўважыла здзіўлены позірк, які я кінуў у бок ліхвяра.

— Месье! Месье! — маліла яна яго, не знаходзячы іншых слоў.

— У вас ёсць фідэікоміс? — спытаў я нарэшце Габсэка.

— Магчыма, — адказаў ён.

— Вы хочаце скарыстаць злачынства графіні?

— Вядома.

Я пайшоў да выхада, а графіня апусцілася на крэсла побач з ложкам памерлага і залілася горкімі слязамі. Габсэк пайшоў услед за мною. На вуліцы я моўчкі павярнуў у другі бок, але ён падышоў да мяне, глянуў сваім праніклівым позіркам мне ў вочы і прамовіў пісклявым голасам:

— Ты што, возьмешся судзіць мяне?

З таго часу мы рэдка бачыліся. Габсэк здаў асабняк графа ў наём, лета ён праводзіў па-панску ў яго землях, пачуваючы сябе гаспадаром: будаваў фермы, рамантаваў млыны, садзіў дрэвы. Аднойчы я спаткаў яго сярод прысад парка Цюільры.

— Графіня трымае сябе па-геройску, — сказаў я яму. — Яна цалкам аддае сябе выхаванню дзяцей, дала ім выдатную адукацыю. Асабліва старэйшы робіць поспехі...

— Магчыма, — быў традыцыйны адказ старога ліхвяра.

— Паслухайце, — не стрымаўся я, — няўжо вы не абавязаны дапамагчы Эрнэсту?

— Дапамагчы Эрнэсту? — усклікнуў Габсэк. — Не, не! Няшчасце — лепшы настаўнік. Яно навучыць яго ведаць

цану грашам, цану мужчынам і жанчынам. Няхай ён паплавае на хвалях парыжскага мора! І калі зробіцца добрым лоцманам, мы дадзім яму карабель.

Я развітаўся з ім, надта не раздумваючы пра сэнс гэтых яго слоў. Хоць, дзякуючы маці, малады дэ Рэсто ставіўся да мяне з агідай і не схільны быў прасіць у мяне парад, я ўсё-такі вырашыў пайсці на мінулым тыдні да Габсэка, расказаць яму пра каханне Эрнэста і Камілы і папрасіць яго хутчэй выканаць сваё абавязацельства, бо малады граф вось-вось павінен быў дасягнуць паўналецця. Стары ліхвяр ляжаў у ложку, ён даўно і цяжка хварэў, відаць, дажываў апошнія дні. Мне ён сказаў, што дасць адказ, калі падымецца на ногі і зможа займацца справамі, — несумненна, ён не жадаў разлучацца нават з найменшай часцінкай свайго багацця, пакуль у ім тлела хоць маленькая іскрынка жыцця. Іншай прычыны для адтэрміноўкі не было. Я ж бачыў, што ён хворы больш сур'ёзна, чым сам сабе ўяўляў, і прабыў у яго даволі доўга, — мне хацелася ўбачыць, да якой мяжы дайшла яго сквапнасць, што ператварылася на парозе смерці ў нейкае вар'яцтва. Не жадаючы мець за суседзяў чужых людзей, ён цяпер здымаў увесь дом, жыў у ім адзін, а ўсе пакоі пуставалі. У яго спальні ўсё было па-ранейшаму. Яе выгляд, добра мне знаёмы, за шаснаццаць год ані не змяніўся: кожная рэч быццам захоўвалася пад шклом. Усё тая ж брамніца, адданая яму бабуля, па-ранейшаму была яго даверанай асобай, вяла яго гаспадарку, дакладвала пра наведвальнікаў, а цяпер, у час хваробы, глядзела за ім, пакідаючы свайго мужа-інваліда сцерагчы ўваходныя дзверы, калі падымалася да гаспадара. Габсэк быў вельмі слабы, аднак усё ж прымаў некаторых кліентаў, сам атрымліваў прыбыткі, але так спрасціў свае справы, што для кіравання імі па-за сценамі пакоя яму было дастаткова зрэдку пасылаць з даручэннямі інваліда. Пры заключэнні дагавора, згодна з якім Францыя прызнала Рэспубліку Гаіці[1], Габсэка прызначылі членам камісіі па ацэнцы і ліквідацыі ўладанняў французскіх падданых у гэтай былой калоніі і для размеркавання паміж імі сум пакрыцця страт, бо ён валодаў вялікімі звесткамі пра старыя маёнткі ў Санта-Дамінга, пра іх уладальнікаў і плантатараў. Вынаходлівы розум Габсэка адразу ж падказаў яму думку заснаваць пасрэдніцкае агенцтва па

[1] Францыя прызнала Рэспубліку Гаіці ў 1825 годзе.

рэалізацыі прэтэнзій былых землеўладальнікаў і іх спадкаемцаў, і ён атрымліваў прыбыткі ад гэтага прадпрыемства нароўні з афіцыйнымі яго заснавальнікамі, Вербрустам і Жыганэ, не ўкладаючы ніякіх капіталаў, бо яго веды былі самі па сабе значным укладам. Агенцтва дзейнічала не горш за перагонны куб, выцягваючы прыбыткі з маёмасных прэтэнзій людзей недасведчаных, недаверлівых або тых, што ведалі пра спрэчнасць сваіх правоў. У якасці ліквідатара Габсэк вёў перамовы з буйнымі плантатарамі, і кожны з іх, імкнучыся павысіць ацэнку сваіх зямель ці як мага хутчэй зацвердзіцца ў правах, рабіў яму падарункі, адпаведныя свайму багацтву. Гэтыя хабары ўяўлялі сабой нешта накшталт уліковага працэнта, што вяртаў Габсэку прыбыткі з тых пазыковых абавязацельстваў, якія яму не ўдавалася захапіць; пасля праз агенцтва ён скупляў за нішто абавязацельствы на больш дробныя сумы, а таксама тыя абавязацельствы, уладальнікі якіх спяшаліся рэалізаваць іх, лічачы за лепшае атрымаць неадкладна хоць невялікую кампенсацыю, чым чакаць паступовых і надзейных плацяжоў ад рэспублікі. У гэтай буйнай афёры Габсэк быў ненасытным удавам. Штораніцы ён атрымліваў падарункі і сквапна разглядаў іх, быццам міністр якога-небудзь набоба, разважаючы, варта ці не за такую цану падпісаць памілаванне. Габсэк прымаў усё: ад кашаля з рыбай да пачка свечак — падарунка людзей сквапнаватых, браў сталовае срэбра ад багатых людзей і залатыя табакеркі ад спекулянтаў. Ніхто не ведаў, як ён карыстаўся ўсімі гэтымі падарункамі. Усё прыносілі яму дамоў, але адтуль нічога не выносілі.

— Далібог, кажу вам, — гаварыла мне брамніца, мая старая знаёмая, — здаецца, што ён глытае ўсё гэта, ды толькі не на карысць сабе — вунь, як схуднеў увесь, высах, зрабіўся быццам птушачка, што ў маім сценным гадзінніку.

І вось у мінулы панядзелак Габсэк прыслаў па мяне інваліда, і той, зайшоўшы да мяне ў кабінет, сказаў:

— Хутчэй паедзем, месье Дэрвіль. Гаспадар падводзіць апошнія падлікі, зжаўцеў, як цытрына, спяшаецца пагаварыць з вамі. Смерць ужо схапіла яго за горла, адтуль даносяцца апошнія хрыпы.

Увайшоўшы ў пакой Габсэка, я быў здзіўлены тым, што стары ўкленчыў ля каміна, хоць там не было агню, а толькі вялікая гурба попелу. Ён злез з ложка і дапоўз

да каміна, але паўзці назад у яго ўжо не было сілы і не было голасу, каб паклікаць на дапамогу.

— Мой стары сябра, — сказаў я, падымаючы яго і дапамагаючы дабрацца да пасцелі. — Вам холадна? Чаму вы не загадаеце распаліць камін?

— Мне зусім не холадна, — адказаў ён. — Не трэба паліць, не трэба! Я адыходжу, галубок, — прамовіў ён, кінуўшы на мяне патухлы, бясколерны позірк. — Сыходжу адсюль, сам не ведаю, куды, але сыходжу! У мяне ўжо пачалася *карфалогія*[1], — дадаў ён, ужыўшы медыцынскі тэрмін, што даказвала поўную яснасць яго розуму. — Мне раптам здалося, быццам па ўсім пакоі коціцца золата, і я ўстаў, каб падняць яго. Куды ж цяпер пойдзе ўсё маё дабро? Казне я яго не пакіну, я напісаў тэстамант. Знайдзі яго, Гроцый. У красуні-галандкі засталася дачка. Я неяк сустрэў яе ўвечары на вуліцы Віўен. У яе мянушка *«Агеньчык»*, яна прыгожанькая, як амур, знайдзі яе, Гроцый! Ты мой душапавернік, бяры тут усё, што захочаш, еш — яды ў мяне многа. Ёсць паштэты з гусінай пячонкі, мяшкі кавы, цукру. Ёсць залатыя лыжкі. Вазьмі для сваёй жонкі сервіз майстра Адыё. А каму ж дыяменты? Ты нюхаеш тытунь, хлопчык? У мяне шмат тытуню, розных гатункаў. Прадай яго ў Гамбург, возьмуць у два разы даражэй. Урэшце, у мяне ўсё ёсць, і з усім трэба развітацца! Давай, тата Габсэк, не бойся, будзь самім сабою...

Ён узняўся на пасцелі, яго твар, быццам з бронзы, выразна акрэсліўся на падушцы; учапіўшыся кашчавымі пальцамі сваёй рукі за коўдру, быццам хочучы ўтрымацца за яе, ён зірнуў на камін, такі ж самы халодны, як яго позірк, і памёр пры поўнай свядомасці, пакінуўшы сваёй брамніцы, інваліду і мне аблічча насцярожанай увагі, якія былі ў старцаў старажытнага Рыма, што стаялі за консуламі на карціне Лецьера «Смерць Брутавых дзяцей».

— Годна сябе трымаў, стары скнара! — па-салдацку адрапартаваў інвалід.

У мяне ўсё яшчэ гучала ў вушах фантастычнае пералічэнне багацця, якое я пачуў ад памерлага, і я міжволі паглядзеў на гурбу попелу ў каміне, заўважыўшы, што туды павернуты яго застылыя вочы. Велічыня гэтай гурбы ўразіла мяне. Я ўзяў камінныя абцугі

---

[1] Несвядомыя рухі рук паміраючага.

і, сунуўшы іх у попел, наткнуўся на нешта цвёрдае, — там ляжала гара золата і серабра, пэўна, яго прыбыткі за час хваробы. У яго не было сіл прыхаваць іх лепш, а недаверлівасць не дазваляла адаслаць усё гэта ў банк.

— Бяжыце да міравога суддзі! — сказаў я інваліду. — Тут трэба тэрмінова ўсё апячатаць.

Уражаны апошнімі словамі Габсэка і тым, што нядаўна сказала мне брамніца, я ўзяў ключы ад пакояў абодвух паверхаў і вырашыў паглядзець, што там. У самым першым пакоі, які я адчыніў, я знайшоў тлумачэнне яго словам, што здаваліся мне пазбаўленымі сэнсу, і ўбачыў, да чаго можа дайсці сквапнасць, калі яна ператвараецца ў бяздумны інстынкт; прыклады такога мы часта бачым у правінцыі. У пакоі, сумежным са спальняй нябожчыка, сапраўды аказаліся і падгнілыя паштэты, і горы ўсялякіх прыпасаў, нават вустрыцы і рыба, пакрытыя пышнай цвіллю. Я ледзь не задыхнуўся ад смуроду, у якім зліліся розныя пахі. Усюды кішэлі чарвякі і насякомыя. Падарункі, зробленыя нядаўна, ляжалі ўперамешку са скрынкамі розных памераў, з пачкамі чаю, мяшкамі кавы. На каміне ў срэбнай супавой місцы захоўваліся накладныя квітанцыі розных грузаў, якія прыходзілі на яго імя ў партовыя склады Гаўра: цюкоў хлопку, скрынак цукру, бочак рому, кавы, індыга, тытуню — цэлага базару каланіяльных тавараў! Пакой загрувашчвала дарагая мэбля, срэбныя рэчы, лямпы, карціны, вазы, кнігі, выдатныя гравюры без рамаў, у скрутках, і самыя разнастайныя рэдкасці. Магчыма, што не ўсе рэчы былі падоранымі, частка іх, пэўна, уяўляла сабою нявыкупленыя заклады. Я бачыў шкатулкі з каштоўнасцямі, упрыгожаныя гербамі і вензялямі, прыгожыя наборы сурвэтак з абрусамі, багатую, але без таўра, зброю. Разгарнуўшы кнігу, якая, як мне падалося, стаяла не на сваім месцы, я знайшоў там некалькі банкаўскіх білетаў па тысячы франкаў кожны. Тады я вырашыў уважліва агледзець кожную, нават самую маленькую рэч, прамацаць падлогу, столь, карнізы і сцены, каб знайсці ўсё золата, да якога быў такі прагны гэты галандзец, варты пэндзля Рэмбрандта. Ніколі яшчэ ў маёй юрыдычнай практыцы я не сустракаў гэткага спалучэння сквапнасці са своеасаблівым характарам. Вярнуўшыся ў спальню памерлага, я знайшоў на яго пісьмовым стале разгадку таго, як паступова збіраліся ўсе гэтыя рэчы. Пад прэс-пап'е ляжала перапіска Габсэка з гандлярамі, якім

ён звычайна прадаваў падарункі сваіх кліентаў. Аднак, ці можа, таму, што ён занадта дорага прасіў за прадукты і за рэчы, ці гандляры вельмі часта рабіліся яго ахвярамі, ніводная здзелка не атрымалася. Ён не хацеў прадаваць прадукты ў краму Шэвэ, бо Шэвэ патрабаваў трыццаціпрацэнтнай скідкі. Пакуль ён таргаваўся з-за некалькіх франкаў, тавар псаваўся. Срэбра не было прададзена, бо Габсэк адмовіўся ўзяць на сябе выдаткі на дастаўку. Мяшкі з кавай заляжаліся, бо ён не хацеў скінуць на ўтруску. Урэшце, кожны прадмет служыў нагодай для доўгіх спрэчак, — гэта было прыкметай таго, што Габсэк здзяцініўся і зрабіўся ўпарты, як усе старыя, у якіх захапленне пераважыла розум. І я ставіў сабе пытанне, якое ён не раз задаваў сабе: «Каму застанецца ўсё гэтае багацце?» Успомніўшы, якія дзіўныя звесткі даў ён мне пра сваю адзіную спадкаемніцу, я зразумеў, што мне давядзецца весці пошукі ў самых падазроных дамах Парыжа, каб аддаць вялізнае багацце ў рукі нейкай разбэшчанай асобы. Але перш за ўсё ведайце, што, згодна з бясспрэчнымі дакументамі, граф Эрнэст дэ Рэсто неўзабаве стане ўладаром багацця, якое дазволіць яму ажаніцца з мадэмуазель Камілай ды яшчэ выдзеліць прыстойны капітал маці і брату на пражыццё, а сястры — на пасаг.

— Добра, дарагі Дэрвіль, — мы пра гэта падумаем, — адказала мадам дэ Гранльё. — Месье дэ Рэсто павінен быць вельмі багатым, каб такая сям'я, як наша, згадзілася парадніцца з ім. Не забывайце, што мой сын рана ці позна стане герцагам дэ Гранльё і аб'яднае багацце двух дамоў Гранльё. Я хачу, каб і зяць быў роўны яму.

— Але ці ведаеце вы, — уставіў слова граф дэ Борн, які герб у Рэсто? Чатыры залатыя шчыты з чорнымі крыжамі на барвовым полі, упоперак якога — срэбная паласа. Вельмі старадаўні герб.

— Гэта праўда, — пацвердзіла вікантэса, — да таго ж, Каміла можа і не бачыцца са сваёй свякрухай, парушальніцай дэвіза на гэтым гербе — Res tuta[1].

— Мадам дэ Басэан прымала ў сябе графіню дэ Рэсто, — заўважыў стары дзядзька.

— Ну, толькі на званых вечарынах! — запярэчыла вікантэса.

Парыж, студзень 1830.

---

[1] *Res tuta (лац.)* — надзейнасць.

БАЦЬКА ГАР'Ё

РАМАН



Вялікаму і славутаму Жафруа дэ Сент-Ілеру[1] ў знак захаплення ягонымі працамі і геніем.

Дэ Бальзак

Мадам Ваке, у паненках дэ Канфлан[2], старэнькая кабета, вось ужо сорак год трымае сямейны пансіён на вуліцы Нёў-Сент-Жэнеўеў, што між Лацінскім кварталам[3] і прадмесцем Сэн-Марсэль у Парыжы. Дзверы пансіёна, вядомага пад назваю «Дом Ваке», адчынены для ўсіх: мужчын і жанчын, маладых і старых, і ніхто ніколі дрэнным словам не абмовіўся пра гэтую паважаную ўстанову. Але, праўду казаць, дык за апошнія трыццаць год ніводная маладая жанчына там не жыла, а хлопцы з'яўляюцца толькі тыя, каму сям'я адшкадоўвае даволі скупыя грошы. І ўсё ж у 1819 годзе, калі разгортваецца дзеянне гэтае драмы, тут апынулася адна бедная дзяўчына. Як бы ні дыскрэдытавала слова «драма» занадта

---

[1] *Жафруа дэ Сент-Ілер*, Эцьен (1772—1844) — вядомы французскі вучоны-заолаг, вылучыў тэорыю падабенства будовы арганізмаў жывёльнага свету. Прысвячэнне рамана «Бацька Гар'ё» Жафруа дэ Сент-Ілеру ўпершыню з'явілася ў выданні 1843 г. Бальзак знаходзіўся пад моцным уплывам біялагічных і фізіялагічных тэорый пачатку XIX ст.

[2] *Дэ Канфлан* — часціца *«дэ»* — знак дваранскага паходжання.

[3] *Лацінскі квартал* — раён на левым беразе Сены, дзе знаходзіцца парыжскі універсітэт Сарбона, вышэйшыя навучальныя ўстановы, музеі, бібліятэкі. Гэты квартал з'яўляецца асяродкам студэнцтва ды інтэлектуалаў.

частае і недарэчнае ягонае ўжыванне ў гаротнай літаратуры нашых дзён, мы мусім звярнуцца да яго; хоць аповесць наша не з'яўляецца драматычнаю ў сапраўдным сэнсе слова, але калі вы перагорнеце апошнюю старонку, можа, нехта з вас і пралье слязу intra ды extra muros[1]. Ці зразумеюць аповесць за межамі Парыжа? Сумняваемся. Сцэны, поўныя назіранняў і мясцовага каларыту, пэўныя падрабязнасці, могуць быць ацэненыя па заслугах толькі між узгоркамі Манмартра і вышынямі Манружа, у гэтай слыннай даліне лядашчых халупаў і чорных ад бруду канаў, даліне, перапоўненай сапраўднымі пакутамі і часта няшчырымі ўцехамі, дзе жыццё такое бурлівае, што, каб здарэнне запамяталі адносна надоўга, яно мусіць быць зусім нечувалым. Зрэшты, падчас і тут можна сустрэць гора, якое робіцца велічным і ўрачыстым у зборы заган і дабрадзейнасцей: перад такім горам сунімаюцца і робяцца спагадлівымі себялюбцы і дзялкі; аднак іх добрыя пачуцці такія ж мімалётныя, як далікатны смак спехам праглынутае ягады. Каляскіца цывілізацыі падобна на каляскіцу ідала Джагернаўта[2]: калі пад кола трапляе менш падатлівае чалавечае сэрца, яна сцішае хаду, але затым крышыць яго ўшчэнт і пераможна шыбуе далей. Накшталт гэтага можаце паступіць і вы, седзячы ў пухкім фатэлі, трымаючы гэтую кнігу пялегаванаю рукою, кажучы: «Можа, гэтая мяне павесяліць». Прачытаўшы ж аб патаемных нягодах бацькі Гар'ё, вы з апетытам павячэраеце, а бяздушнасць сваю залічыце ў віну аўтару, упікнуўшы яго за паэтычныя прыдумкі і перабольшванні. Дык ведайце: драма гэтая не фантазія і не раман. All is true[3], яна настолькі праўдзівая, што кожны ў сваім жыцці, а, магчыма, і ў сваім сэрцы, знойдзе яе пачаткі.

Дом, у якім месціцца сямейны пансіён, належыць мадам Ваке. Ён знаходзіцца ў ніжняй частцы вуліцы Нёў-Сент-Жэнеўеў, там, дзе гэтая вуліца настолькі стромка спускаецца да вуліцы Арбалет, што нават на конях па ёй праязджаюць рэдка.

Гэтая акалічнасць і спрыяе цішыні, якая пануе ў цесных завулках паміж двума купаламі: Валь дэ Грас[4] і

---

[1] *Intra ды extra muros* — у межах горада і за яго межамі *(лац.)*.
[2] *Джагернаўт* — адно з выяўленняў індыйскага бога Вішну.
[3] *All is true* — усё праўда *(англ.)*.
[4] Валь дэ Грас — вайсковы шпіталь.

Пантэона[1], двума вялізнымі манументамі, што змяняюць нават самую атмасферу, насычаючы яе жоўтым тонам сваіх сцен, азмрочваючы строгімі колерамі купалоў. Тут брук сухі, у канавах няма ні вады, ні бруду, узбоч сцен шугае трава. Самы бесклапотны чалавек, трапіўшы сюды, робіцца смутным, грукат фурманкі тут — падзея, дамы — панурыя, ад муроў патыхае астрогам. Парыжанін, які завітае ў гэтыя кварталы, пабачыць адно сямейныя пансіёны, навучальныя ўстановы, галечу або нуду; тут канае старасць, а маладосць вымушана працаваць. Няма ў Парыжы квартала болей жахлівага і, мушу заўважыць, менш вядомага. Вуліца Нёў-Сент-Жэнеўеў — як бронзавая рамка для карціны, — толькі яна адзіная можа стаць належным фонам для нашага апавядання, якое патрабуе, магчыма, больш цёмных фарбаў і сур'ёзных думак, каб чытач ужо з самага пачатку пранікся настроем, падобным да пачуцця падарожніка пры спуску ў катакомбы: з кожнаю прыступкаю блякне святло, і голас павадыра паступова глухне. Удалае параўнанне! Хто вырашыць, што назіраць страшней: чэрствыя сэрцы ці парожнія чэрапы. Фасадам пансіён выходзіць у невялічкі садок, такім чынам, дом утварае з вуліцаю Нёў-Сент-Жэнеўеў прамы вугал, адкуль бачная толькі бакавая сцяна дома. Паміж садком і домам, перад яго фасадам пралёг выкладзены шчэбенем неглыбокі жолаб шырынёю ў туаз[2], а ўздоўж яго — пясчаная дарожка, па баках якой у вялікіх бела-блакітных фаянсавых вазонах раслі герань, алеандры і гранаты. Каб трапіць у двор, трэба прайсці праз веснічкі, да якіх прыбіта шыльда з надпісам: «ДОМ ВАКЕ», а ніжэй: «СЯМЕЙНЫ ПАНСІЁН ДЛЯ АСОБ РОЗНАГА ПОЛУ І ІНШАЕ». Калі зазірнуць удзень праз брамку ў краты, на якой вісіць пранізлівы званочак, то насупраць вуліцы, у канцы канавы, можна ўбачыць сцяну, на якой мясцовы мастак намаляваў арку пад зялёны мармур, а ў яе нішы — статую Амура. Калі нейкі аматар сімвалаў убачыць гэтага Амура, з якога пачаў ужо злазіць лак, дык ён, напэўна, палічыць статую сімвалам

---

[1] *Пантэон* — адзін з гістарычных помнікаў Парыжа. Пабудаваны ў XVI—XVII ст. як сабор, пасля Вялікай французскай рэвалюцыі 1789 г. ператвораны ў месца спачывання вялікіх людзей. На франтоне надпіс: «Вялікім людзям — удзячная Бацькаўшчына». Там спачываюць Гюго, Заля, Жарэс ды іншыя. А вось Бальзак пахаваны на могілках Пэр-Лашэз, адкуль у канцы рамана Расціньяк кідае выклік Парыжу.

[2] *Туаз* — мера даўжыні (1 м 945 мм).

парыжскага кахання, вынікі якога вылечваюць у некалькіх кроках адсюль. Аб часе ўзнікнення гэтага ўпрыгожвання нагадвае нам напаўсцёрты надпіс пад цокалем, які сведчыць, што Вальтэру быў аказаны ўрачысты прыём пры вяртанні таго ў Парыж у 1777 годзе:

Хто б ты ні быў, о чалавек,
Ён твой настаўнік і навек...

Позна ўвечары, замыкаюць не брамку ў краты, а глухую браму. Садок, шырынёю роўны фасаду дома, сціснуты паміж агароджай ад вуліцы і сцяною суседняга дома, цалкам схаванаю пад дыванам плюшча, настолькі маляўнічы для Парыжа, што прыцягвае позіркі прахожых. Усе сцены вакол садка спавітыя фруктовымі шпалерамі і вінаграднымі лозамі; іх кволыя і запыленыя плады штогод з'яўляюцца прадметам хвалявання мадам Ваке і яе размоў з жыхарамі. Уздоўж сцен цягнецца вузкая сцяжынка, якая вядзе пад засень ліпаў, ці *ліпп*, як, нягледзячы на сваё высакароднае з сям'і дэ Канфлан паходжанне, упарта вымаўляе мадам Ваке, не зважаючы на граматычныя заўвагі пансіянераў. Між бакавых сцяжынак размешчана курціна артышокаў, абсаджаная шчаўем, пятрушкаю ды латуком, па кутках яе растуць пірамідальна падрэзаныя пладовыя дрэвы. Пад засенню ліпаў укапаны ў зямлю пафарбаваны ў зялёны колер стол, а вакол яго — крэслы. Сюды прыходзяць пацешыцца філіжанкаю кавы ў самую летнюю спякоту, калі ў пяску на сонцы можна яйкі пячы, тыя з жыхароў пансіёна, хто дастаткова багаты, каб дазволіць сабе піць каву.

Чатырохпавярховы з мансардамі дом, пабудаваны з вапняку, быў пафарбаваны ў жоўты колер, які прыдае амаль усім парыжскім дамам нейкі пошлы выгляд. На кожным паверсе — па пяць акон з дробнымі рамамі і жалюзі, але ніводнае жалюзі не ўздымаецца роўна з іншымі, кожнае вісіць абы-як. Бакавы фасад гэтага дома мае толькі па два акны на паверсе. Вокны першага паверха аздоблены кратамі з жалезных прутоў.

За домам двор шырынёю прыкладна ў дваццаць футаў, дзе мірна сужываюцца свінні, куры, трусы. У глыбіні двара ўзвышаецца павець для дроў, між ёю і акном кухні прычэплена скрыня для захоўвання правізіі, а пад ёю сцякаюць хатнія памыі. З двара на вуліцу Нёў-Сент-Жэнеўеў вядзе вузенькая фортка, праз якую кухарка зганяе

ўсё смецце, шчодра паліваючы гэты сметнік вадою, каб ачысціць двор і пазбегнуць штрафу за парушэнне чысціні.

Першы паверх быў нібы спецыяльна прызначаны пад сямейны пансіён. Першы пакой з вокнамі на вуліцу і шклянымі ўваходнымі дзвярыма з'яўляецца гасцёўняй, з яе можна прайсці ў сталовую, якая, у сваю чаргу, аддзелена ад кухні лесвіцаю з квадратнымі драўлянымі прыступкамі, пафарбаванымі і навошчанымі. На свеце няма нічога журботней гэтай гасцёўні, у якой з мэблі стаяць фатэлі і крэслы, абабітыя валасяною тканінаю ў бліскучую і матавую палоскі.

Сярэдзіну пакоя займае круглы стол з мармуроваю чорнаю з рабым стальніцаю, а на стале для ўпрыгожання сервіз для кавы з белага фарфору з напаўсцёртымі пазалочанымі абадкамі; такі посуд зараз сустракаецца ў кожнай хаце. Падлога ў пакоі насцелена даволі дрэнна, сцены да ўзроўня пляча абшыты панелямі, а вышэй — абклеены глянцавітымі шпалерамі, на якіх намаляваны ключавыя сцэны «Тэлемака», прычым героі гэтай класічнай трагедыі адлюстраваны ў колерах. Міжаконне прыцягвае позіркі пансіянераў выяваю банкету, наладжанага ў гонар сына Адысея німфай Каліпса. Вось ужо гадоў сорак гэтая карціна з'яўляецца аб'ектам кпінаў маладых жыхароў дома Ваке: яны спадзяюцца ўзняцца над уласнаю доляю, смеючыся з вячэры, на якую іх змусіла галеча. Чарэнь каміна заўсёды чысты, — сведчанне таго, што агонь тут запальваюць толькі па вялікіх святах. Затое наверсе ён аздоблены дзвюма вазамі з бляклымі штучнымі кветкамі пад шклянымі каўпакамі і, між імі, надзіва безгустоўным камінным гадзіннікам з сіняватага мармуру. У гэтым першым пакоі стаіць асаблівы пах, якому ў нашай мове і наймення няма: мы маглі б назваць яго *пахам пансіёна*. Гэта пах затворніцтва, цвілі, гнілі, ад яго дрыжыкі ўсяго прабіраюць, ён б'е сырасцю ў нос, паўзе пад адзенне; ён патыхае сталовай, смярдзіць сенцамі, кавалерам, шпіталем. Можа, стала б магчыма апісаць гэты пах, калі б патрапілі падлічыць, колькі і якіх моташлівых частак дабаўляе сюды з кашлем sui generis[1] кожны, малады ці стары, пансіянер. Дык вось, нягледзячы на ўсе гэтыя жахі, калі вы параўнаеце гасцёўню са сталоваю, якая знаходзіцца побач, вы скажаце, што

[1] *Sui generis* — у сваім родзе *(лац.)*. Тут: своеасаблівага.

гасцёўня была нават вельмі прыгожай і духмянай, як сапраўдны будуар.

Сцены сталовай аж да столі абабітыя дрэвам і некалі былі пафарбаваны, праўда, цяпер ужо немагчыма вызначыць, у які колер, бо на гэтым грунце ўзорыста ляглі слаі бруду. Да сцен лепяцца ліпкія буфеты, у якіх захоўваюцца мутныя шчарбатыя графіны, металічныя паддоннікі, стосы тоўстых фарфоравых талерак з блакітнаю каёмкаю, выраблены у Турнэ[1]. У адным з куткоў стаіць скрыня з нумаранымі шуфлядкамі, дзе — для кожнага паасобку — ляжаць заплямленыя, залітыя віном сурвэткі пансіянераў. Яшчэ тут сустрэнеш прадметы мэблі з роду тых, якія немагчыма знішчыць. Гнаныя адусюль, яны знайшлі прытулак у пансіёне, нібы аскепкі цывілізацыі ў шпіталі для невылечаных хворых. Тут вы ўбачыце барометр з капуцынам, які вылазіць, калі ідзе дождж; мярзотныя гравюры ў чорных лакіраваных з залатым рубам рамках, ад выгляду якіх знікае апетыт; насценны гадзіннік, упрыгожаны рогам і меднаю інкрустацыяй; зялёную печ; кенкеты Аргана[2], дзе пыл змяшаўся з алеем; доўгі стол, пакрыты настолькі бруднаю цыратаю, што дасціпны жыхар піша на ёй сваё імя пальцам, не маючы стыла[3]; крэслы-калекі; мізэрныя саламяныя цыноўкі, што ляжаць адвеку, не ведаючы зносу; замурзаныя грэлкі з разламанымі прадушынамі, драўляныя ручкі якіх ператварыліся ў вугаль. Каб растлумачыць, наколькі ўся гэтая мэбля старая, гнілая, трухлявая, ненадзейная, паржавелая, скасабочаная, ледзь жывая, мы вымушаны будзем апісваць доўга, затрымаўшы пачатак нашае аповесці, а гэтага нам чытачы, не маючы лішняга часу, не даруюць. Чырвоная падлога — няроўная з-за фарбавання ды націрання. Уся ў плямах, яна вось-вось спарахнее. Карацей кажучы, тут валадарыць адкрытая, нават без намёка на паэзію, згушчаная, скнарная галеча.

Гэты пакой бывае ў поўным бляску каля сёмай гадзіны раніцы, калі кот мадам Ваке прыходзіць туды перш за сваю гаспадыню, скача па буфетах, тыцкаецца носам у кубкі з малаком, накрытыя талеркамі, напяваючы сваю ранішнюю песеньку. Неўзабаве з'яўляецца і сама гаспадыня ў цюлевым каптурыку, з-пад якога вылезла пасма

---

[1] *Турнэ* — прамысловы горад у Бельгіі.

[2] *Кенкет Аргана* — удасканаленая алейная лямпа.

[3] Прылада для пісьма.

нязграбна накладзеных валасоў; крочыць яна, пашоргваючы зношанымі пантофлямі. На яе паношаным сытым твары нос здаецца дзюбаю папугая; пульхныя ручкі, укормленае цела, як у царкоўнага пацука, пакалыхванне празмерна поўных грудзей — усё гарманіруе з гэтым пакоем, дзе нават са сцен сочыцца гора, дзе прытаілася спекуляцыя, і дзе мадам Ваке не робіцца млосна ад таго, што яна ўдыхае агідна-цёплае паветра гэтага пакоя.

Яе зімны, як першы восеньскі замаразак, твар, маршчыны, што разыходзяцца ад вачэй, нарэшце, вочы, якія ўмеюць усміхацца лепей за вочы танцоўшчыц і злавесна хмурыцца, як вочы ліхвяра; уся ейная асоба вызначае характар пансіёна, а пансіён азначае ейную асобу. Катаргі без цівуноў не бывае, цяжка ўявіць сабе адно без другога. Бледная пульхнасць гэтай кабеціны — вынік вобразу яе жыцця, таксама як тыфус ёсць следства заразнага паветра шпіталяў. Ніжняя шарсцяная спадніца выпаўзае з-пад верхняй, перашытай са старой сукенкі, з якое праз дзіркі лезе вата — увесь гэты выгляд нагадвае нейкім чынам гасцёўню, сталовую, садок, папярэджвае пра кухню і дазваляе здагадацца, што за людзі жывуць у пансіёне. Гаспадыня з'яўляецца апошняю рыскаю ў палатне. Мадам Ваке недзе каля пяцідзесяці гадоў, і яна падобна *на ўсіх жанчын, якія хапілі ліха.* У яе шкляны позірк, цнатлівы выгляд зводніцы, гатовай ускіпець ад абурэння, каб заплацілі болей; зрэшты, яна б зрабіла ўсё, што хочаце, каб палегчыць свой лёс: напрыклад, выдала б Жоржа ці Пішэгру[1], калі б і Жоржа і Пішэгру да гэтага яшчэ не выдалі. І ўсё ж пансіянеры кажуць, што «ў душы яна кабета неблагая», лічачы яе незаможнай і чуючы, як яна кашляе і стогне не менш, чым яны. Кім быў месье Ваке? Яна ніколі не расказвала пра нябожчыка. Як ён страціў сваё багацце? «Яму не пашанцавала», — адказвала яна. Ён дрэнна абышоўся з ёю, пакінуўшы адно вочы, каб плакаць, гэты дом, каб жыць, і права не спачуваць нічым няшчасцям, бо, па яе словах, яна перанесла ўсе магчымыя пакуты.

Пачуўшы дробную хаду гаспадыні, тоўстая кухарка Сільвія спяшалася гатаваць снеданне для пансіянераўжыхароў.

---

[1] *Жорж і Пішэгру* — Шарль Пішэгру і Жорж Кадудаль, завадатары раялісцкай змовы 1804 г., рыхтавалі замах на Напалеона І. Ім здрадзіў адзін з хаўруснікаў. Кадудаля гільяцінавалі, Пішэгру памёр у астрозе.

Пансіянеры, якія не жылі ў доме Ваке, звычайна запісваліся толькі на вячэру, што каштавала ім трыццаць франкаў на месяц. Калі пачынаецца наша гісторыя, у доме Ваке жыло сем чалавек. Дзве лепшыя кватэры пансіёна знаходзіліся на другім паверсе. У меншай жыла сама мадам Ваке, большая належала мадам Куцюр, удаве інтэнданцкага камісара часоў Рэспублікі. З ёю жыла адна зусім маладзенькая дзяўчына, Віктарына Тайфэр, якой яна замяняла маці. Дзве гэтыя жанчыны плацілі за свой пансіён амаль восемсот франкаў. Адну з двух кватэр на трэцім паверсе займаў стары па прозвішчы Пуарэ, другую — прыкладна саракагадовы мужчына, які насіў чорны парык і фарбаваў бакі; ён іменаваў сябе былым негацыянтам, звалі яго месье Ватрэн. Чацвёрты паверх складаўся з чатырох пакояў, два з якіх здымалі пастаянныя жыхары: мадэмуазель Мішано, старая дзеўка, і былы фабрыкант вермішэлі, макарон і крухмалу — ён дазваляў зваць сябе бацькам Гар'ё. Два астатнія пакоі прызначаліся залётным птушкам, бяздольным студэнтам, тым, хто, як бацька Гар'ё і мадэмуазель Мішано, не мог плаціць болей сарака пяці франкаў у месяц за харч і жытло; але мадам Ваке яны не дужа падабаліся, і прымала яна іх толькі ў тым выпадку, калі лепшага не знаходзілася: занадта многа яны елі хлеба. У той час адзін з двух вольных пакояў займаў малады чалавек, які прыехаў з ваколіц Ангулема ў Парыж вывучаць права. Шматлікай сям'і яго родных даводзілася жыць у нястачы, каб мець магчымасць дасылаць сыну тысячу дзвесце франкаў у год. Эжэн дэ Расціньяк, так яго звалі, быў адным з тых хлопцаў, якіх прывучыла да працы нядоля, якія з ранніх гадоў усведамляюць, колькі спадзяванняў ускладаюць на іх бацькі, хлопцаў, якія рыхтуюць сабе бліскучую кар'еру, добра ўзважыўшы важнасць навучання і прыстасоўваючы сваё навучанне да далейшага развіцця грамадства, каб першымі сабраць плады. Без ягоных цікавых назіранняў і спрыту, з якім ён пранікаў у парыжскія салоны, наша аповесць згубіла б шмат неабходных дэталяў, бо імі яна абавязана яго яснаму розуму і імкненню разблытаць таямніцы аднаго жахлівага лёсу, якія старанна хавалі і вінаватыя, і ахвяры.

Над чацвёртым паверхам знаходзілася гарышча для сушэння бялізны і дзве мансарды: там спалі слуга Крыстоф і тоўстая кухарка Сільвія.

Апрача сямі пансіянераў-жыхароў, у мадам Ваке абедалі — год менш, год больш — студэнты, чалавек з восем з факультэтаў права або медыцыны і два-тры сталыя наведвальнікі з квартала.

Такім чынам, падчас абеду ў сталовай збіралася васемнаццаць чалавек, а можна было б пасадзіць нават дваццаць; але раніцаю сюды прыходзілі толькі сем жыхароў, таму снеданне мела выгляд сямейны. Усе спускаліся ў пантофлях, не ашчаджалі вострых заўваг наконт вопраткі і знешнасці тых, што прыходзілі харчавацца да мадам Ваке, пра падзеі ўчарашняга вечара, адным словам, ішла даверлівая гутарка блізкіх сяброў. Сямёра пансіянераў былі пестунамі мадам Ваке, якая адорвала іх клопатамі адпаведна памеру платы за пансіён з дакладнасцю астранома. Адною меркаю вызначалася, як трэба адносіцца да гэтых розных людзей, выпадкова сабраных разам. Жыхары трэцяга паверха плацілі толькі семдзесят два франкі за месяц. Гэткая таннасць, магчымая толькі ў прадмесці Сен-Марсо між Бурб ды Сальпетрыер[1] (адзіным выключэннем была мадам Куцюр), сведчыць аб тым, што кожны з пансіянераў нёс цяжар болей ці меней відавочных нягод. Вось чаму зношаныя касцюмы сталых пансіянераў мелі такі самы мізэрны выгляд, як і інтэр'ер дома. Колер мужчынскіх сурдутаў вызначыць было ўжо праблематычна, абутак, які насілі пансіянеры, у шыкоўных кварталах можна знайсці на сметніках, бялізна была латанаю і наогул, адзенне гэтае магло быць дарагім толькі як памяць. Жаночыя сукенкі былі старамоднымі, перафарбаванымі і зноў палінялымі, карункі старымі і цыраванымі, пальчаткі ільсніліся ад старасці, каўнерыкі зжаўцелымі, хусткі на плячах — дзіравымі. Калі адзенне такое, то целы амаль ва ўсіх былі дужыя, арганізмы перанеслі не адзін націск жыццёвых нягод, твары сталі халоднымі, суровымі і пацёртымі, як старыя манеты. Звялыя раты былі ўзброены прагнымі зубамі. Адчувалася, што гэтыя людзі перажылі або перажываюць драмы; не тыя драмы, што выконваюцца пры святле рампы між стракатымі палотнамі, драмы жывыя, нямыя, застылыя, бясконцыя, ад якіх сціскаецца сэрца.

Старая паненка Мішано хавала стомленыя вочы пад брудным брылём з зялёнай тафты на алавяным дроце, які

---

[1] *Сальпетрыер* — парыжская багадзельня, *Бурб* — назва аднаго з радзільных дамоў (la bourbe — гразь, твань).

мог спужаць нават анёла-захавальніка. Шаль з мізэрнымі ніцымі махрамі, здавалася, ахінала шкілет, такімі нязграбнымі былі формы, якія яна саграваля. Калісьці, напэўна, Мішано была прыгожаю і стройнаю. Што за кіслата стравіла жаночыя рысы ў гэтай асобы? Распуста, смутак, сквапнасць? Ці занадта аддавалася каханню? Ці была проста куртызанкай? За раскошу якіх уцехаў бурнае маладосці яна расплочвалася старасцю, ад якой адварочваліся прахожыя? Ад яе бясколернага позірку мароз прабягаў па скуры, агрубелы твар здаваўся злавесным. Пранізлівы галасок нагадваў стракатанне конікаў у кустах напярэдадні зімы. З яе слоў, яна клапацілася пра нейкага старога, хворага на катар мачавога пузыра, пра якога не дбалі дзеці, бо вырашылі, што ў бацькі няма грошай. Стары пакінуў ёй пажыццёвую рэнту, коштам у тысячу франкаў; яе час ад часу аспрэчвалі спадкаемцы, і тады на мадэмуазель Мішано ліліся патокі хлусні. Хаця перажытыя пачуцці і пакуты ад іх не злітаваліся над ейным тварам, колішняя бялюткая далікатнасць скуры яшчэ не згубілася цалкам і дазваляла меркаваць, што і цела яе захавала пэўныя рэшткі прыгажосці.

Месье Пуарэ нагадваў машыну-аўтамат. Вось ён шэрым ценем блукае па алеях Батанічнага саду, на ягонай галаве старая пакамечаная шапка, у руцэ ён ледзьве трымае кіёчак з булдавешкаю слановай косткі, лінялыя полы сурдута разлятаюцца, і з-пад іх бачны кароценькія панталоны і блакітныя панчохі на худых, як палкі, няўпэўненых, нібы ў п'яніцы, нагах; выглядвае таксама запэцканая белая камізэлька, на індычай шыі тапырыцца закарэлае муслінавае жабо, з-пад якога выбіўся скручаны ў вяроўку гальштук; амаль усе, сустрэўшыся з ім, задаюцца пытаннем: ці не належыць гэты кітайскі цень да мужнае расы сыноў Яфета[1], што пырхаюць па Італьянскім бульвары? Якая ж праца так скурчыла гэтае цела? Ад якіх пакутаў пацямнеў гэты шышкаваты твар, які нават на карыкатуры здаўся б нам неверагодным? Кім быў гэты чалавек? Можа, ён служыў у міністэрстве юстыцыі, у тым бюро, куды ка́ты дасылаюць каштарысы выдаткаў на чорныя радзюгі для бацьказабойцаў, на пілавінне, якое насыпаецца ў кошыкі пад гільяціны, на вяроўку да яе нажа? Можа, ён быў прыёмшчыкам ля брамы разніцы ці памочнікам санітарнага інспектара?

[1] *Яфет* — біблейскі персанаж, сын Ноя, брат Сіма і Хама.

Адным словам, гэты чалавек належаў да аднаго з рабочых аслоў на нашым вялікім сацыяльным млыне, адным з тых парыжскіх Ратонаў, якія нават не ведаюць сваіх Бертранаў[1], быў нейкім стрыжнем, на які нанізваліся няшчасці і брыдота, карацей, чалавекам, пра якіх мы кажам: «Трэба, каб і такія былі». Парыж шыкоўны глядзіць на такія бледныя ад маральных і фізічных пакутаў твары і не бачыць іх. Але Парыж — гэта сапраўдны акіян. Як бы вы яго не даследавалі, глыбіні вам ніколі не змераць. Абыдзіце яго, апішыце, але дзе б вы ні хадзілі, як бы вы ні апісвалі, колькі б цікаўных даследчыкаў гэтага мора ні сабралася разам, заўсёды застанецца куточак, куды нічые вочы не заглядалі, невядомая пячора, кветкі, пярліны, пачвары, нешта нечувалае, забытае літаратарамі-вадалазамі. Да такіх цікавых пачварнасцей можна залічыць і дом Ваке.

З усёй групы пансіянераў і людзей, якія прыходзілі сталавацца, вылучаліся дзве фігуры. Хаця мадэмуазель Віктарына Тайфэр выдавала хваравітаю бледнасцю на малакроўных дзяўчат, і схільнасць да смутку, сарамлівасць, беднасць і кволасць далучылі яе да агульнага пакутніцтва, асноўнага фону гэтай карціны, усё ж твар быў зусім не астраканаты, а рухі і голас — вельмі жвавымі. Маладую гарапаху можна было параўнаць з пажоўклым кусцікам, нядаўна перасаджаным у непрыдатную глебу. Жаўтлявы колер яе твару, рудавата-бялявыя валасы, празмерна тонкая талія злучаліся ў тую грацыю, якую сучасныя паэты знаходзілі ў сярэднявечных статуэтках. Чарнавата-шэрыя вочы свяціліся пяшчотай і хрысціянскай пакорай. Простае, недарагое адзенне не хавала дзявочых форм. Яна была прыгожаю ў параўнанні з суседзямі. Шчаслівая доля зрабіла б яе чароўнаю, паэзія жанчыны ў яе дабрабыце, гэтаксама як у аздобе — яе краса. Вось каб весялосць балю ружовым бляскам успыхнула на бледным тварыку; вось каб ад уцехаў шыкоўнага жыцця запалыя шчочкі пакруглелі і пачырванелі; каб каханне ажывіла гэтыя смутныя вочы — тады Віктарына падужалася б красою з першымі прыгажунямі. Бракавала таго, дзякуючы чаму жанчына

---

[1] *Ратон, Бертран* — персанажы байкі Лафантэна «Малпа і Кот». Хітрая малпа Бертран прымушае ката Ратона цягаць для яе смажаныя каштаны з агню. Лафантэн, Жан (1621—1695) — вялікі французскі байкапісец, адзін з тэарэтыкаў класіцызму.

нараджаецца другі раз: строяў і лістоў ад закаханага. Гісторыя жыцця Віктарыны магла б стаць сюжэтам цэлай кнігі. Яе бацька лічыў, што мае прычыну не прызнаваць дачкі, адмаўляўся жыць з ёй разам, адшкадоўваў не больш шасцісот франкаў у год, а сваю маёмасць ён абярнуў так, каб цалкам пакінуць усё сыну. Мадам Куцюр, далёкая сваячка маці Віктарыны, у чыім доме тая калісьці і памерла ад роспачы, апекавала сіротку, як сваё дзіця. На гора, удава інтэнданцкага камісара часоў Рэспублікі не валодала нічым, акрамя пенсіі і дапамогі на ўдаву; бедная дзяўчына аднойчы магла застацца без роднае душы, аніякага досведу і грошай, адданаю на волю лёсу. Штонядзелі добрая кабета вадзіла Віктарыну на абедню, штодватыдні — да споведзі, каб у любым выпадку дзяўчына была набожнаю. Мадам Куцюр мела рацыю. Рэлігійныя пачуцці рыхтавалі хоць нейкую пэўную будучыню гэтаму адкінутаму дзіцяці, якое любіла бацьку і штогод выпраўлялася да яго, каб перадаць дараванне ад сваёй маці, але штогод сутыкалася з замкнутымі дзвярыма бацькоўскага дома. Брат, адзіны пасрэднік між бацькам і дачкою, ні разу за чатыры гады не завітаў да сястры і не даслаў ні гроша. Яна кленчыла, каб Бог расплюшчыў бацькавы вочы, расчуліў братава сэрца і малілася за іх, не абвінавачваючы. Мадам Куцюр і мадам Ваке не знаходзілі слоў у лексіконе лаянкі, каб характарызаваць варварскія паводзіны яе сваякоў. Яны бязбожна клялі бессаромнага мільянера, ад Віктарыны ж людзі чулі адно словы спагады, падобныя на буркатанне параненага голуба, нават у тужлівым тоне якога гучыць любоў.

З аблічча Эжэн дэ Расціньяк выглядаў вылітым чалавекам з поўдня: белая скура, чорныя валасы, блакітныя вочы. Мова, манеры, пастава вызначалі нашчадка шляхетнага роду, дзе выхаванне ў малыя гады праводзілася па правілах добрага тону. Хоць ён і ашчаджаў сваю вопратку — у буднія дні ён насіў леташнія строі, — усё ж, калі трэба, ён выглядаў так, як мусіць выглядаць элегантны хлопец. Звычайна на ім быў стары сурдут, мізэрная камізэлька, танны чорны пакамечаны гальштук, па-студэнцку неахайна завязаны, таго самага кшталту порткі і задрыпаныя чаравікі з заменянаю падэшваю.

Саракагадовы Ватрэн уяўляў сабою пераходную ступень між двума папярэднімі жыхарамі і астатнімі. Ён быў з пароды тых мужчын з фарбаванымі бакамі, пра якіх

кажуць: «Вось слаўны хлапчына!» Плечы магутныя, грудзі шырокія, мускулы, як у волата, рукі вялізныя, квадратныя, на фалангах пальцаў — пучкі вогненных валасоў. На твары, пакрэсленым заўчаснымі зморшчынамі, праступалі рысы жорсткасці, што супярэчыла яго мяккім і прыязным манерам. Ягоны прыемны басавіты голас сумяшчаўся з грубаватаю весялосцю. Ватрэн любіў пасмяяцца, але ён быў чалавекам паслужлівым. Калі псаваўся замок, ён хуценька разбіраў яго, ладзіў, падточваў, змазваў, збіраў, прымаўляючы: «Штука знаёмая». Зрэшты, ён сапраўды ведаў пра ўсё: караблі, мора, Францыю, замежжа, справы, людзей, падзеі, законы, гатэлі і астрогі. Калі нехта надта журыўся, ён прапаноўваў яму дапамогу. Колькі разоў ён пазычаў грошай мадам Ваке ды некаторым з пансіянераў; але ягоныя даўжнікі хутчэй памёрлі б, чым не разлічыліся, бо, нягледзячы на знешнюю лагоднасць, нейкі асабліва глыбокі і поўны рашучасці погляд Ватрэна выклікаў страх. Манера сплёўваць даказвала непахісную спакойнасць чалавека таго кшталту, які не спыніцца нават перад злачынствам, каб выйсці з крытычнай сітуацыі. Як строгі суддзя, ягонае вока ўнікала ў глыбіню любых пытанняў, любога сумнення, любых пачуццяў. Ён звыкла трымаўся свайго распарадку: пасля снедання выходзіў, перад абедам вяртаўся, пасля знікаў на цэлы вечар і з'яўляўся ў доме блізка апоўначы, дзякуючы ключу, што даверыла яму мадам Ваке. Ён адзіны карыстаўся такою магчымасцю. Ён быў у найлепшых адносінах з кабетаю, зваў яе матухнаю і абдымаў за талію: незразумелая ліслівасць. Кабета лічыла ўсё гэта звычайнай ласкай, між тым Ватрэн быў адзіным, чыіх рук ставала, как ахапіць мажную акружнасць. Характэрнаю рысаю было тое, што ён плаціў па пятнаццаць франкаў у месяц за «глорыю»[1] і піў яе на дэсерт. Меней павярхоўныя людзі, чым гэтыя маладзёны, зацягнутыя ў вір парыжскага жыцця, ці гэтыя старыя, абыякавыя да ўсяго, што не датычыла іх наўпрост, напэўна, не задаволіліся б тым дваякім уражаннем, якое выклікаў Ватрэн. Сам ён ведаў ці здагадваўся пра справы людзей, з якімі жыў, між тым як яны не ўмелі спасцігнуць ні яго думак, ні заняткаў. Хаця ён паставіў у адносінах між ім і астатнімі асноўнай перашкодай уяўную лагоднасць, незменную ласкавасць і весялосць,

[1] *Глорыя* — салодкая кава (ці гарбата) з каньяком.

часта прарываліся наверх страшэнныя глыбіні характару гэтага таямнічага чалавека. Часта з ягоных вуснаў злятаў жарт, годны пяра Ювенала[1], у якім ён з задавальненнем кпіў з законаў, здзекаваўся з вышэйшых слаёў грамадства, выкрываючы іх нутраную непаслядоўнасць, усё гэта наводзіла на думку пра крыўду, схаваную ў сэрцы, і таямніцу, наўмысна згубленую ў цемры жыцця.

Моц аднаго і прыгажосць другога мужчыны вабілі мадэмуазель Тайфэр, і хоць, магчыма, сама таго не жадаючы, яна дзяліла на дваіх позіркі крадком і думкі ўпотай, ніводзін з іх, ні саракагадовы халасцяк, ні малады студэнт, здавалася, намераў на яе не мелі, хаця аднойчы гульня фартуны магла ўсё змяніць і зрабіць яе заможнай партыяй. Зрэшты, ніхто з гэтых асоб не ставіў сабе задачай праверыць, колькі праўды і колькі выдумкі ў тых няшчасцях, на якія нехта жаліцца. Кожны ставіўся да суседа з абыякавасцю, ці нават хутчэй з недаверам — вынік жыццёвага становішча. Яны ведалі, што дапамагчы адзін другому не могуць, што ўсю спагаду вычарпалі аповядамі пра ўласнае ліха, і, нібы стары муж з жонкаю, не мелі аб чым размаўляць. Між жыхарамі склаліся механічныя, падобныя скрыпучаму руху счэпленых і даўно не мазаных колаў дачыненні. Кожны з іх міне, не азірнуўшыся, сляпога жабрака на вуліцы, без спачування выслухае споведзь пра нечае няшчасце, а ў смерці пабачыць адно вызваленне ад галечы, якая зрабіла іх абыякавымі да самай жудаснай агоніі. Самаю шчаснаю з гэтых апустошаных душ была мадам Ваке, якая панавала ў гэтай прыватнай багадзельні. Ёй адзінай маленькі садок, бязлюдны ў холад, спякоту і халепу, пустынны, як стэп, быў мілейшы за шумлівы гай. Для яе адзінай гэты змрочны жоўты будынак, ад якога патыхала таннаю фарбаю, як ад прылаўка, меў свае чары. Гэтыя камеры належалі ёй. Яна карміла гэтых катаржнікаў, лёсам асуджаных на пажыццёвае зняволенне, і трымала іх у паважлівым падпарадкаванні. Дзе б яшчэ ў Парыжы гэтыя нябогі за такую цану знайшлі б здаровы харч і кватэру, якую маглі лёгка зрабіць калі не ўтульнаю, дык прынамсі чыстаю і не шкоднаю для здароўя? Дазволь сабе мадам Ваке адкрытую несправядлівасць, ахвяра сцерпіць без скаргі.

---

[1] *Ювенал*, Дэцым Юніюш (I—II стст.) — рымскі паэт-сатырык.

Падобны збор людзей мусіў уяўляць і ўяўляў адбітак цэлага чалавечага грамадства, і нібы ў школках ці ў гуртках, і тут, сярод васемнаццаці нахлебнікаў, знайшлося няшчаснае затурканае стварэнне, ахвярны казёл, на якога сыпаліся кпіны. На пачатку другога года жыцця ў доме мадам Ваке якраз гэты твар стаў Эжэну Расціньяку найбліжэйшым з усіх, побач з якімі ён змушаны быў мардавацца яшчэ два гады. Такою ахвяраю стаў былы вермішэльшчык бацька Гар'ё, і менавіта на ягоную галаву мастак, ды й гісторык таксама, скіравалі б усё святло сваёй карціны. Якім выпадкам знявага з нянавісцю, ганенне, перамяшанае са спагадаю, нядбайнасць да чужога няшчасця звaліліся на галаву найстарэйшага з пансіянераў? Можа, ён даў такую нагоду сваімі дзівацтвамі, смешнымі звычкамі, якія людзі не даруюць горай за заганы? Гэтыя пытанні маюць цесную сувязь з мноствам грамадскіх несправядлівасцей. Ці не ў самой чалавечай натуры закладзена прага выпрабоўваць цярпенне тых, хто па ціхмянасці, слабасці ці абыякавасці стрывае ўсё? Ці не падабаецца кожнаму з нас сцвярджаць уласную сілу на кім хочаце і чым хочаце? Самае кволае са стварэнняў, беспрытульнае хлапчанё, і тое мкнецца ў траскучы мароз празваніць ва ўсе званкі перад дзвярыма, ці караскаецца на новы помнік, каб накрэмзаць там сваё імя.

Бацька Гар'ё, прыкладна шасцідзесяцігадовы стары, атабарыўся ў мадам Ваке ў 1813 годзе, калі адышоў ад спраў. Спачатку ён заняў тую кватэру, дзе цяпер жыла мадам Куцюр, і, як чалавек, для якога сто франкаў туды, сто сюды — дробязь, плаціў тысячу дзвесце франкаў поўнага пансіёну. Атрымаўшы наперад грошы быццам бы за паднаўленне трох пакояў гэтае кватэры, мадам Ваке патрацілася на кепскую аздобу: на жоўтыя каленкоравыя фіранкі, лакіраваныя, абабітыя трыпам фатэлі, сякую-такую падмазку клеяваю фарбаю і шпалеры, ад якіх адмовіліся ўскраінныя кабарэ. Магчыма, менавіта, бесклапотная шчодрасць, у пастку якой трапіў бацька Гар'ё, тады яшчэ паважна званы месье Гар'ё, каштавала яму рэпутацыі ідыёта, які ў справах нічога не кеміць. Гар'ё прыехаў з поўным гардэробам. Як сапраўдны негацыянт, перад тым як пакінуць справы, ён не адказваў сабе ні ў чым. Мадам Ваке з захапленнем глядзела на паўтара тузіна кашуль з напаўгаландскага палатна, тонкасць і мяккасць якіх было тым ямчэй заўважыць, што на на-

крухмаленым жабо макароншчык насіў дзве шпількі, з'яднаныя ланцужком, кожная з якіх была аздоблена нядробнымі дыяментамі. Звычайна ён апранаў валошкавага колеру фрак, штодня мяняў пікейную белую камізэльку, пад якою калыхалася выпуклае ігрушападобнае пуза так, што важкі залаты ланцужок з бірулькамі ажно падскокваў. У табакерцы, таксама залатой, быў уштукаваны медальён з нечыімі валасамі, значыцца, за старым цягнуліся любоўныя прыгоды. Калі гаспадыня неяк назвала Гар'ё старым залётнікам, на ягоных вуснах заблукала задаволеная ўсмешка мешчаніна, захапленне якога атрымала прызнанне. Ягоныя «шкапы» (ён вымаўляў гэтае слова па-прастанароднаму) ламіліся пад цяжарам сталовага срэбра. Вочы мадам Ваке аж гарэлі, калі яна ветліва дапамагала новаму жыхару распакоўваць і расстаўляць чарпакі, лыжкі для рагу, талеркі, судкі, сподкі, прыборы, сервізы для сняданку, яшчэ нейкія больш ці менш прыгажэйшыя рэчы, пры гэтым даволі важкія. Ён прывёз іх з сабою, бо шкада было расставацца. Падарункі гэтыя нагадвалі яму ўрачыстасці сямейнага жыцця.

— Вось гэта, — паведаміў ён мадам Ваке, вымаючы сподак і кубак з накрыўкаю ў выглядзе двух туркавак у пацалунку, — першы падарунак, які зрабіла мне жонка да гадавіны вяселля. Няшчасная! Яна патраціла на гэта ўсе свае дзявочыя зберажэнні. Верыце, я хутчэй згаджуся капаць кіпцямі зямлю, чым развітацца з гэтым падарункам. Дзякуй Богу, я змагу да скону штораніцы піць каву з гэтага кубка. Мне журыцца няма чаго, кавалка хлеба мне не прыйдзецца пазычаць.

Апроч таго, сарочыя вочы мадам Ваке заўважылі аблігацыі дзяржаўнага казначэйства, якія, нават па прыкладным падліку, маглі прыносіць гэтаму цудоўнаму Гар'ё прыбытак ад васьмі да дзесяці тысяч франкаў. У той самы дзень у галаве мадам Ваке, у паненках дэ Канфлан, хоць ёй мінула сорак восем гадоў, праўда, па яе падліках толькі трыццаць дзевяць, нарадзіўся план. Нягледзячы на той факт, што ўнутраныя куточкі вачэй старога вывернуліся, набраклі і слязіліся, і гэта вымушала даволі часта выціраць іх, яна знайшла яго знешнасць прыемнаю і, наогул, падыходзячай для яе планаў. Да таго ж мясістыя, выпуклыя лыткі і доўгі шырокі нос абяцалі такія прыхаваныя вартасці, якімі ўдава, здавалася, не грэбавала, ды і твар у форме месяца, наіўна праставаты, пацвярджаў іх. На яе думку, Гар'ё быў істотаю моцнаю,

здольнаю ўсім духам аддацца пачуццю. Цырульнік Політэхнічнае школы шторaніцы прыходзіў і пудрыў валасы, расчасаныя на два «крылы»; пяццю фестонамі яны ляжалі на ілбе, прыгожа абрамляючы твар. Знешне ардынарны, ён быў такі зграбны, так шчодра даставаў табаку з табакеркі і зажываў з пэўнасцю чалавека, які ведаў, што макубай[1] ён напоўніць яе заўсёды. Дык вось тым вечарам, калі макароншчык уладкаваўся ў доме, мадам Ваке лягла спаць, разрумяніўшыся, як курапатка ў шпігу, на агні раптоўнага жадання развітацца з пасмяротнаю кашуляю Ваке і перарадзіцца ў жонку Гар'ё. Пабрацца шлюбам, прадаць пансіён і пайсці пад руку з лепшым прадстаўніком заможнага мяшчанства, стаць важнаю дамаю ў сваім квартале, збіраць ахвяраванні на бедных, па нядзелях выязджаць у Шуазі, Суазі, Жанціль[2]; хадзіць у тэатр, калі захочаш, браць ложу, а не чакаць кантрамарак, якія перападалі ёй ад таго-сяго з пансіянераў у ліпені месяцы; яна марыла пра Эльдарада[3] ва ўяўленні любой парыжскай небагатай сям'і. Яна нікому не казала, што сама назбірала па грошыку сорак тысяч франкаў. Што тычыцца багацця, яна лічыла сябе нябеднаю для замужжа.

— Па ўсім астатнім я, далібог, вартая старога! — сказала яна сама сабе і павярнулася на другі бок, быццам бы правяраючы, ці не згубіліся дзе тыя прывабнасці, след ад якіх тоўстая Сільвія шторaніцы знаходзіла ў выглядзе ўвагнутасці ў пярыне.

З гэтага дня пачынаючы і на працягу прыблізна трох месяцаў удава Ваке карысталася паслугамі цырульніка месье Гар'ё і патраціла трохі грошай на туалет, тлумачачы неабходнасцю надаць дому выгляд, годны шаноўных асоб, якія яго наведвалі. Яна старалася змяніць склад пансіянераў, падкрэсліваючы, што цяпер будзе даваць прытулак толькі людзям, беззаганным ва ўсіх сэнсах. Варта было зайсці каму-небудзь да яе, як яна пачынала хваліцца гонарам, які аказаў ёй месье Гар'ё, адзін з самых значных і паважаных негацыянтаў Парыжа. Яна распаўсюдзіла па горадзе праспекты, у загалоўку якіх было

---

[1] *Макуба* — табака вышэйшага гатунку, якую прывозілі з Макубы (востраў Мартыніка).

[2] Маляўнічыя мясціны пад Парыжам.

[3] *Эльдарада* — міфічная краіна, з велізарнымі запасамі золата; краіна мараў, сімвал бязмежнага багацця.

надрукавана: «ДОМ ВАКЕ». Яна пісала, што гэта «адзін са старадаўнейшых і лепшых сямейных пансіёнаў Лацінскага прадмесця», з акон якога відаць даліна Габленавай мануфактуры (з чацвёртага паверха) і *прыгожы садок*, а ў канцы яго *цягнецца* ліпавая алея. Не забыты былі добрае паветра і самота. Гэты праспект прывёў да яе графіню дэ ль'Амберменіль, трыццацішасцігадовую жанчыну; яна чакала заканчэння справы аб прызначэнні пенсіі, якая належала ёй як удаве генерала, што загінуў у *бітве*. Мадам Ваке сачыла, каб стол быў добрым, загадвала на працягу шасці месяцаў паліць у гасцёўнях і гэтак добра трымала абяцанні, дадзеныя ў праспекце, што яшчэ й *свайго перадала*. У выніку графіня паведаміла мадам Ваке, называючы яе дарагой прыяцелькай, што яна перацягне сюды баранесу дэ Вамерланд і ўдаву палкоўніка графа Пікуазо, дзвюх сваіх сябровак, якія дажывалі тэрмін у адным з даражэйшых пансіёнаў квартала Марэ, чым «Дом Ваке». Зрэшты, гэтыя дамы будуць мець вялікі дастатак, калі ваенныя канцылярыі скончаць іх справу.

— Але канцылярыі цягнуць і цягнуць, — дадала яна.

Пасля вячэры дзве ўдавы разам падняліся ў пакой Ваке і там тарабарылі, смакуючы парэчкавы лікёр і ласункі, прыхаваныя для гаспадыні. Графіня дэ ль'Амберменіль адобрыла намеры гаспадыні на Гар'ё, намеры добрыя, пра якія яна здагадалася з першага дня: выдатны мужчына, лічыла яна.

— Ах, даражэнькая мая, ён здаровы як дуб, — гаварыла мадам Ваке. — Гэты мужчына добра захаваўся і здольны даставіць кабеце шмат прыемнасці.

Графіня лагодна зрабіла некалькі заўваг наконт адзення мадам Ваке, якое не пасавала да яе намераў.

— Вам трэба добра падрыхтавацца да такой падзеі, — нібы падсумавала яна.

Пасля доўгіх разлікаў абедзве ўдавы накіраваліся ў Пале-Раяль і купілі ў Драўлянай галерэі капялюш з пер'ем і каптурык. Пасля графіня зацягнула прыяцельку ў краму «Маленькая Жанета», дзе яны выбралі сукенку і шалік. Калі ўвесь гэты баявы рыштунак пусцілі ў ход і ўдава з'явілася ў сваім узбраенні, падабенства з шыльдаю «Моднага быка»[1] было выдатным. Нават самой мадам

[1] *«Модны бык»* — парыжскі рэстаран, на шыльдзе якога быў намаляваны бык у дамскім каптуры і шалі.

Ваке перамена настолькі спадабалася, што яна палічыла сябе абавязанай падараваць графіні дваццаціфранкавы капялюшык, хаця шчодрай мадам Ваке ніхто не лічыў. На самой справе яна разлічвала на паслугі графіні, каб тая распытала Гар'ё і высока адазвалася аб гаспадыні. Графіня дэ ль'Амберменіль ахвотна адгукнулася на просьбу, пачала шукаць падыходаў да старога вермішэльшчыка і, нарэшце, змагла пагутарыць з ім, але паколькі ён сарамліва, калі не сказаць абурана, адхіліў спробы спакусіць яго з боку самой графіні, яна, узрушаная грубасцю старога, мусіла пайсці.

— Даражэнькая мая, — сказала яна сяброўцы. — З гэтага мужчыны вам нічым не пажывіцца! Гар'ё — да смешнага недаверлівае, сквапнае, дурное быдла, ад яго вам будуць адны непрыемнасці.

Між месье Гар'ё ды графіняю дэ ль'Амберменіль адбылося нешта такое, ад чаго яна не захацела заставацца нават у адным доме з ім. На наступны дзень яна выехала, забыўшыся заплаціць за шэсць месяцаў пражывання ў пансіёне і пакінуўшы хлам, ацэнены ў пяць франкаў. І як мадам Ваке ні шукала, ніякіх звестак пра графіню дэ ль'Амберменіль у Парыжы не знайшлося. Яна часта згадвала гэты варты жалю момант, скардзячыся на празмерную даверлівасць, хаця была асцярожнейшая за кошку; у гэтым выпадку яна нагадвала тых людзей, што падазрона адносяцца да блізкіх і кідаюцца ў абдымкі да першага сустрэчнага. Дзіўна, але псіхалагічны факт такі існуе, і прычыны яго тояцца ў чалавечым сэрцы. Можа, некаторым людзям цяжка знайсці прыхільнасць у тых, з кім жывуць: пераканаўшыся, што блізкія пабачылі пустату іх душы, адчуваюць, што ім вынесены суровы, але справядлівы прыгавор, і ў той жа час такія людзі маюць непераможную патрэбу ў падхвальваннях, а іх бракуе, ці з жадання паказаць якасці, якіх у іх няма, яны спадзяюцца заваяваць пашану альбо павагу чужых людзей, рызыкуючы ўпасці калі-небудзь і ў вачах новых знаёмых. Нарэшце, ёсць асобы карыслівыя, яны не робяць дабра ні сябрам, ні блізкім па той жа прычыне, што гэта іх абавязак; а вось аказваючы паслугу невядомаму, яны цешаць сваё самалюбства; таму чым бліжэйшы чалавек, тым менш яны любяць яго; чым ён далейшы — тым больш стараюцца ўслужыць. У мадам Ваке было нешта ад абедзвюх гэтых натур, дробязных, нікчэмных, хлуслівых.

— Быў бы я тут, — казаў пасля Ватрэн, — з вамі б такога ліха не здарылася. Я б гэтую прайдзісветку вывеў на чыстую ваду. Я ведаю іхнія штучкі!

Як усе абмежаваныя людзі, мадам Ваке мела звычку не пакідаць кола падзей і не ўваходзіць у іх прычыны. Свае памылкі яна ахвотна звальвала на другіх. Калі яе напаткала гэтая страта, яна палічыла сумленнага вермішэльшчыка першапрычынаю няшчасця і, як яна казала, з таго часу ў яе вочы расплюшчыліся. Усвядоміўшы, што яе залёты плёну не дадуць, а выдаткі ўжо выпалі з кішэні, яна хуценька скеміла, хто вінаваты. Яна заўважыла, што ў Гар'ё свае манеры. Нарэшце, было даказана, што надзея, якую яна гэтак песціла, ляжала на хімерычнай аснове, і што ад гэтага чалавека, як энергічна выказалася графіня, толку не дабіцца; а графіня ў такіх справах здавалася знаўцам. І ў сваёй непрыязі мадам Ваке зайшла намнога далей, чым у сяброўстве. Не каханне выклікала нянавісць, а падманутыя спадзяванні. Чалавечае сэрца робіць перадышкі на ўздыме да вышынь любві, але яно рэдка сцішае хаду на стромкім адхоне варожасці. Аднак жа месье Гар'ё — усё-такі яе жыхар, і таму ўдава да часу мусіла тушыць у сабе выбухі параненага самалюбства, моўчкі ўздыхаць ад расчаравання і стрымліваць жаданне адпомсціць, нібы манах, які змушаны цярпець крыўды ад ігумена. Дробязныя натуры задавальняюць уласныя высокія ці нізкія пачуцці бясконцымі дробязнымі дзеяннямі. Усю сваю жаночую хітрасць яна скіравала на тое, каб зрабіць сваёй ахвяры як мага больш тайных непрыемнасцей. Спачатку яна забрала з агульнага стала ўсё, што лічыла лішнім.

— Ніякіх больш карнішонаў ды анчоўсаў: адны страты ад іх! — загадала яна Сільвіі ў той дзень, калі вырашыла вярнуцца да колішняй сваёй праграмы.

Патрэбы месье Гар'ё былі сціплымі, ён, як і мусіць чалавеку, што сам нажыў сабе багацце, быў жміндаю, і гэта перайшло ў звычку. Суп, вараная ялавічына, гародніна — вось ягоная ўлюбёная ежа. Такім чынам, мадам Ваке было даволі цяжка даняць пансіянера, не закрануўшы ягоных густаў. У роспачы ад сутыкнення з няўразлівым чалавекам яна пачала выказваць непавагу ў ягоны адрас, тым самым перадаючы сваю варожасць іншым жыхарам, якія дзеля пацехі дапамагалі ёй у помсце. Пры канцы першага года ўдава так далёка зайшла ў сваім недаверы, што сама сябе пытала, чаму ж

негацыянт з сямю ці васьмю тысячамі ліўраў рэнты, у шафе якога поўна шыкоўнага срэбра, які мае каштоўнасці, як ва ўтрыманкі, жыве ў яе доме і траціць так мала ў параўнанні з багаццем на свой стол. Большую частку першага года Гар'ё зазвычай адзін ці два разы на тыдзень абедаў па-за домам; пасля паступова колькасць абедаў у горадзе звялася да двух разоў у месяц. Кароткія аддаленні месье Гар'ё пасавалі інтарэсам мадам Ваке, а калі жыхар стаў часцей і часцей абедаць дома, гэта не магло не выклікаць незадавальнення гаспадыні. Такія змены яна тлумачыла павольным змяншэннем яго багацця і жаданнем угнявіць гаспадыню. Адна з самых годных пагарды звычак ліліпуцкіх розумаў ёсць падазрэнне іншых у сваёй жа дробязнасці. На няшчасце, пры канцы другога года жыцця ў пансіёне, месье Гар'ё апраўдаў здагадкі на свой конт, папрасіўшыся ў мадам Ваке перайсці на трэці паверх і зменшыць плату за пансіён да дзевяцісот франкаў. Яму прыйшлося так строга ашчаджаць, што нават узімку ён не паліў агню. Удава Ваке запрасіла грошы наперад; месье Гар'ё ахвотна згадзіўся, але з таго часу гаспадыня пачала зваць яго бацькам Гар'ё. Кожны, кожны спрабаваў здагадацца аб прычынах такога заняпаду, але хто дазнаецца! Як казала тая несапраўдная графіня, бацька Гар'ё аказаўся скрытным і маўклівым. Згодна з логікаю людзей пустагаловых, заўсёды балбатлівых, бо акрамя глупства ім казаць няма чаго, той, хто не гаворыць аб сваіх справах, займаецца чымсьці дрэнным. Так негацыянт ператварыўся ў махляра, а залётнік — у старога блазна. Ватрэн, напрыклад, які пад гэты час ужо з'явіўся ў доме Ваке, лічыў бацьку Гар'ё чалавекам, які хадзіў на біржу, і там, карыстаючыся даволі энергічным выразам з мовы фінансістаў, *пашчыпваў на рэнце* пасля таго, як збяднеў. То казалі, што ён — дробны ігрок з тых, што выпрабоўваюць шчасце і выйграюць штовечар па дзесяць франкаў. То яго запісвалі ў шпіёны тайнай паліцыі, але Ватрэн сцвярджаў, што ён не такі хітры, *каб быць ім*. Бацька Гар'ё быў яшчэ скнараю — ліхвяром, што дае ў пазыку грошы на кароткі тэрмін, і ігракам у латарэю, які ставіць заўжды на адзін і той жа нумар. Ён ператварыўся ў нейкае таямнічае ганебнае стварэнне, хваравітае, распуснае. Аднак, якімі б гнюснымі не былі его заганы і паводзіны, варожасць не даходзіла да таго, каб яго прагнаць: грошы ж за пансіён ён плаціў. Да таго ж ён нават карысць прыносіў, бо калі

нехта быў не ў гуморы, спаганяў злосць кпінамі ды здзекамі з яго.

Думка мадам Ваке здавалася самаю праўдападобнаю, і яе прынялі ўсе. З яе слоў, гэты чалавек, які так добра захаваўся, здаровы як дуб, здольны даставіць жанчыне яшчэ шмат прыемнасці, быў проста распуснікам з дзіўнымі схільнасцямі. І вось чым мадам Ваке абгрунтоўвала сваю хлусню: праз некалькі месяцаў пасля ад'езду графіні, якая патрапіла пражыць паўгода за кошт гаспадыні, аднойчы раніцаю, яшчэ ў ложку, яна пачула шоргат ядвабнае сукенкі на лесвіцы і лёгкі тупат крокаў маладой жанчыны, якая праслізнула да Гар'ё ў загадзя расчыненыя дзверы. Неўзабаве тоўстая Сільвія прыйшла паведаміць гаспадыні, што маладая асоба, занадта прыгожая, каб быць прыстойных паводзін, апранутая, як багіня, у чысцюткіх прунелевых чаравічках прабралася з вуліцы на кухню і запытала, дзе знаходзіцца кватэра месье Гар'ё. Мадам Ваке і кухарка не пасаромеліся падслухаць і пачулі некалькі пяшчотных слоў, вымаўленых падчас даволі працяглага наведвання. Калі месье Гар'ё выйшаў правесці сваю даму, тоўстая Сільвія ўзяла кашолку і зрабіла выгляд, што ідзе на кірмаш, каб на самай справе прасачыць за каханкамі.

— Спадарыня, — паведаміла Сільвія па вяртанні, — а, мусібыць, месье Гар'ё дужа багаты, калі ён у стане так яе забяспечваць. Уявіце сабе, што на рагу Эстрапады чакаў шыкоўны экіпаж, і ў гэты экіпаж села *яна*.

У час абеду мадам Ваке пайшла зашмаргнуць фіранку, каб сонца не біла Гар'ё ў вочы.

— Вы падабаецеся красуням, месье Гар'ё, вам свеціць сонейка, — заўважыла яна, намякаючы на ранішні візіт. — Халера, у вас добры густ, яна — вельмі прыгожая.

— Гэта мая дачка, — адказаў ён з гонарам, які пансіянеры палічылі проста старэчаю пыхаю пры захаванні знешняй прыстойнасці.

Праз месяц пасля першага візіту да месье Гар'ё зноў завітала госця. Калі першы раз дачка была апранутая ў просты ранішні строй, дык цяпер яна з'явілася пасля абеду і ў выхадным уборы. Пансіянеры, якія гаманілі між сабою ў гасцёўні, мелі шанц палюбавацца красуняй бландзінкай з грацыёзнаю таліяй, занадта далікатнай, каб быць дачкою нейкага там бацькі Гар'ё.

— Ага, другая! — усклікнула, не пазнаўшы яе, тоўстая Сільвія.

Праз колькі дзён іншая дзяўчына, высокая брунетка з рухавымі вачыма, запыталася, дзе жыве месье Гар'ё.

— Ужо трэцяя! — канстатавала Сільвія.

Другая дачка першы раз прыходзіла раніцаю, а праз некалькі дзён прыехала вечарам у бальнай сукенцы і ў карэце.

— Ага, чацвёртая, — усклікнулі мадам Ваке і тоўстая Сільвія, якія не заўважылі ў вялікасвецкай пані ніякага следу сціпла апранутай дзяўчыны першага візіту.

У той час Гар'ё яшчэ плаціў тысячу дзвесце франкаў за пансіён. Мадам Ваке знаходзіла цалкам натуральнай сітуацыю, калі ў багатага чалавека чатыры ці пяць каханак, нават лічыла хітрамудрым старанне бацькі Гар'ё выдаваць іх за сваіх дачок і ніколькі не хвалявалася з нагоды іхніх наведванняў. Але паколькі гэтыя візіты тлумачылі абыякавасць пансіянера да яе намераў, яна дазволіла сабе на пачатку другога года даць Гар'ё мянушку «стары кот». Калі ж пансіянер скаціўся да дзевяцісот франкаў, яна беспардонна запытала ў яго, бачачы, што адна з дам спускаецца па ўсходах:

— У што вы хочаце ператварыць мой дом?

Бацька Гар'ё адказаў, што гэтая дама — ягоная старэйшая дачка.

— У вас што, тры тузіны дачок? — з'едліва пакпіла мадам Ваке.

— Не, усяго толькі дзве, — ціхмяна, як чалавек, чыё багацце пайшло прахам і які скарыўся нястачы, азваўся пансіянер.

У канцы трэцяга года бацька Гар'ё зноў скараціў выдаткі, перабраўшыся на чацвёрты паверх і абмежаваўшы расходы на сваё ўтрыманне сарака пяццю франкамі ў месяц. Ён кінуў нюхаць табаку, развітаўся з цырульнікам і перастаў пудрыць валасы. Калі бацька Гар'ё ўпершыню з'явіўся ненапудраным, гаспадыня пансіёна аж усклікнула ад здзіўлення: валасы ў яго былі не то брудна-шэрыя, не то зеленаватыя. Невядомыя турботы рабілі ягонае аблічча з дня на дзень усё больш сумным, яно здавалася самым журботным з усіх твараў, якія былі за сталом. Сумненняў болей не заставалася: бацька Гар'ё быў старым распуснікам, і толькі дзякуючы майстэрству доктара, вочы старога ўтрывалі ад шкоднага ўздзеяння

лекаў, неабходных пры ягоных хваробах. А вось валасы сталі такога агіднага колеру з-за неўмеркаванасці ў каханні і з-за зелля, якім ён сябе нашпігоўваў, каб падтрымліваць здольнасць быць неўмеркаваным і надалей. Фізічны і маральны стан старога, здавалася, пацвярджаў гэтую лухту. Калі тонкая бялізна знасілася, бацька Гар'ё купіў каленкору па чатырнаццаць су за локаць на змену сваёй цудоўнай бялізне. Адны за адным знікалі дыяменты, залатая табакерка, ланцужок, іншыя каштоўнасці. Ён развітаўся з валошкавым фракам, з усімі сваімі ўборамі і пачаў насіць узімку ды ўлетку сурдут з гаматнага сукна каштанавага колеру, камізэльку з казінай воўны і шэрыя порткі з тоўстага буксіну. Гар'ё паступова худзеў; лыткі сталі зусім не такімі моцнымі, як раней; твар страціў колішнюю шчаслівую мяшчанскую пульхнасць і незвычайна зморшчыўся, на лбе ўтварыліся складкі, рэзка азначыліся сківіцы. На чацвёртым годзе жыцця ў пансіёне мадам Ваке ён перастаў быць падобным на самога сябе. Прывабны шасцідзесяцідвухгадовы вермішэльшчык, які выглядаў гадоў на сорак, высокі, тоўсты буржуа, надзіва маладжавы, які вясёлым выглядам, юнацкаю ўсмешкаю цешыў прахожых, ператварыўся ў забітага, дрыжачага, бледнага сямідзесяцігадовага старога. Рухавыя блакітныя вочы згаслі, пабляклі, выцвілі, сталі жалезна-шэрага колеру; болей не слязіліся, затое здавалася, што чырвоныя закрайкі векаў нібы крывавяцца. Адных ён палохаў, у іншых выклікаў спагаду. Маладыя студэнты-медыкі, заўважыўшы абвісанне ніжняй губы, змералі ў Гар'ё кут твару і, пасля доўгіх беспаспяховых спроб разварушыць старога, абвясцілі, што ён хворы на крэтынізм.

Аднойчы пасля вячэры мадам Ваке нібы жартам спытала: «Ну дык што, дочкі вашыя вас выракліся?», відавочна ставячы пад сумненне яго бацькоўства. Бацька Гар'ё скалануўся так, нібы гаспадыня ўкалола яго чымсьці вострым.

— Яны час ад часу прыходзяць,— усхваляваным голасам адказаў ён.

— Ага, ага, вы час ад часу сустракаецеся з імі? — усклікнулі студэнты. — Брава, бацька Гар'ё!

Але стары не чуў жартаў, выкліканых ягоным адказам: ён зноў задумаўся; а тыя, хто назіраў за ім, прымалі маўклівасць за старэчую атупеласць чалавека, слабаватага розумам. Калі б яны добра ведалі Гар'ё, яны б сапраўды

зацікавіліся яго маральным і фізічным станам, хоць цяжка ўявіць рэчы больш складаныя, чым стан душы і цела бацькі Гар'ё. Даведацца ж пра тое, ці быў Гар'ё на самай справе вермішэльшчыкам і колькі грошай ён зарабіў на сваім гандлі, было няцяжка, але цікаўныя старыя не выходзілі за межы квартала і сядзелі ў пансіёне нібы вустрыцы, што прыраслі да сваёй скалы, а маладыя, пакідаючы вуліцу Сент-Жэнеўеў, траплялі ў непараўнаны ні з чым вір парыжскага жыцця, у якім адразу забывалі нябогу, з якога кпілі. Для ўсіх гэтых істот з абмежаваным розумам, для бесклапотных маладзёнаў чорная галеча, тупасць бацькі Гар'ё былі несумяшчальнымі ні з заможнасцю, ні з якой-небудзь дзеяздольнасцю. Што ж тычыцца жанчын, якіх ён зваў сваімі дочкамі, то тут ніхто не аспрэчваў думку мадам Ваке, выказаную з жорсткаю безапеляцыйнасцю старой кабеты, якая за доўгімі вечаровымі гамонкамі ўзяла звычку гаварыць уголас усё, што ў галаву прыходзіць:

— Калі б у бацькі Гар'ё дочкі былі такія ж багатыя, як тыя наведвальніцы, ён бы не марнеў на чацвёртым паверсе майго дома за сорак пяць франкаў у месяц і не апранаўся б жабраком.

Чым абвергнеш гэткія довады? Вось так і здарылася, што пры канцы лістапада 1819 года, калі адбылася гэтая драма, кожны пансіянер меў пра старога нябогу думку пэўную, а менавіта: ні дачок, ні жонкі ў яго ніколі не было; неўмеркаванасць у пошуках задавальненняў зрабіла яго смаўжом, антрапаморфным малюскам з атрада шапканосных, як пажартаваў чыноўнік з Музея гісторыі прыроды, адзін з тых, што прыходзілі на вячэру. Побач з Гар'ё нават Пуарэ здаваўся сокалам, джэнтльменам. Пуарэ размаўляў, меркаваў, адказваў, хаця, на самой справе, размаўляючы, мяркуючы, адказваючы, ён нічога свайго не выказваў, бо меў звычку іншымі словамі паўтараць чужыя думкі, але ўсё ж гутарку падтрымліваў, быў жывым, здавалася, што ў яго ёсць нават нейкія пачуцці, тады як бацька Гар'ё, зноў жа са слоў чыноўніка з Музея гісторыі прыроды, заўжды знаходзіўся на пункце замярзання.

Эжэн Расціньяк вярнуўся з дому ў тым стане, што, напэўна, знаёмы ўсім здольным маладым ці тым, у каго пад уплывам цяжкіх абставін на кароткі час адкрываюцца незвычайныя таленты. У самым пачатку яго знаходжання ў Парыжы, дзякуючы таму, што першыя універ-

сітэцкія ступені можна адолець без асаблівых намаганняў, Эжэну хапала вольнага часу на тое, каб нацешыцца ўсімі спакусамі Парыжа. Студэнту бракуе часу на тое, каб азнаёміцца з рэпертуарам кожнага тэатра, вывучыць усе хады ў парыжскім лабірынце, спазнаць звычаі, пераняць мову і звыкнуцца са сталічнымі ўцехамі, наведаць усе прыстойныя і распусныя мясціны, паслухаць цікавыя лекцыі і агледзець музейныя багацці. Студэнт у гэты час захапляецца ўсялякімі дробязямі, мае свайго куміра, прафесара з Калеж дэ Франс, якому, зрэшты, за тое і грошы плацяць, каб ён трымаўся на ўзроўні сваёй аўдыторыі. Студэнт завязвае вышэй гальштук і стараецца прыняць прыгажэйшую позу, каб звярнуць увагу хоць адной з жанчын, што купляюць білеты ў першы ярус Камічнай оперы. Вось так паступова ён абціраецца, пашырае далягляды жыцця і, нарэшце, пачынае разумець суадносіны розных слаёў у структуры чалавечага грамадства. Пачаўшы з захаплення карэтамі, што ясным сонечным днём прыгожай чарадой каціліся па Елісейскіх палях, хутка ён будзе марыць сам набыць такую. Не ўсведамляючы ўсяго гэтага, Эжэн прайшоў такую школу яшчэ перад вакацыямі, атрымаўшы ступень бакалаўра філалогіі і права. Развеяліся як дым дзіцячыя ілюзіі, правінцыяльныя погляды, змяніўся ягоны розум, а прагнасць да славы павялічылася, таму ва ўлонні сям'і, на роднай сядзібе, усё пачало бачыцца яму ў другім святле. Бацька, маці, два браты, дзве сястры, цётка, усё багацце якой абмяжоўвалася пенсіяй, жылі на маленькім кавалачку зямлі Расціньякаў. Фальварак гэты прыносіў прыкладна тры тысячы франкаў няпэўнага даходу, ад чыста прамысловага вырошчвання вінаграду, і, тым не менш, з гэтай сумы бацькі мусілі выдаткоўваць тысячу дзвесце франкаў на Эжэна. Ён бачыў гэтую пастаянную нястачу, якую ад яго высакародна хавалі; міжволі параўноўваў сясцёр — у дзяцінстве яны здаваліся яму ўзорамі прыгажосці — з парыжскімі жанчынамі, чые кшталты ўвасобілі яго мроі; усведамляючы туманную будучыну гэтай шматлюднай сям'і, якая залежыла ад яго, бо на яго ўскладаліся спадзяванні; заўважаў, з якой скрупулёзнай увагай ашчаджалі самыя танныя прадукты; піў разам з усімі напой з вінаградных жамерын, словам, мноства абставін, няма сэнсу пералічваць іх, удзесяцярылі ягонае жаданне зрабіць сабе кар'еру, вылучыцца, дабіцца поспеху. Як і ўсе велікадушныя людзі, ён хацеў поспехі

заслужыць сам, быць абавязаны толькі сваім якасцям. Але будучы чалавекам з поўдня, ён і дзейнічаў як чалавек з поўдня. Усе яго рашэнні на справе выпрабоўваліся ваганнямі, сумненнямі; так здараецца з усімі хлопцамі, якія, апынуўшыся ў адкрытым моры, не ведаюць, ні ў які бок накіраваць сілы, ні пад якім вуглом узняць ветразь. Спачатку Эжэну карцела з галавою кінуцца ў працу, але неўзабаве ён замест гэтага стаў рупіцца пра завядзенне патрэбных яму сувязей; заўважыўшы, як уплываюць на грамадскае жыццё жанчыны, ён адразу задумаў прабіцца ў свецкія колы і заваяваць сэрцы тых, хто пасля зробіць яму пратэкцыю: хіба не знойдзе такіх жанчын дасціпны, палкі хлопец, які звыш дасціпнасці і палкасці яшчэ адораны цудоўнаю паставаю і тою тонкаю прыгажосцю, на якую ласы жанчыны? Такія вось думкі апанавалі Расціньяка, калі ён шпацыраваў разам з сёстрамі сярод палёў. Раней такія прагулянкі яму падабаліся, ён быў вясёлы, цяпер сёстры заўважылі, што ён моцна змяніўся. Цётка ягоная, мадам дэ Марсіяк, калісьці жыла пры двары і мела знаёмых у арыстакратычных вярхах. У яе ўспамінах, якімі цётка часта дзялілася з ім, юны славалюб раптам угледзеў зыходныя пазіцыі для сваіх перамог у грамадстве, не меней значных, чым поспехі яго ў Школе правазнаўства. Ён распытаў у цёткі, якія сваяцкія сувязі магчыма аднавіць. Зварухнуўшы галіны генеалагічнага дрэва, старая дама вырашыла, што з усяго эгаістычнага племя багатых сваякоў, пані вікантэса дэ Басэан, напэўна, будзе самая чулая. Яна напісала ліст у старадаўнім стылі гэтай маладой кабеце і аддала яго Эжэну, зазначыўшы, што калі ён даб'ецца поспеху ў вікантэсы, дык з яе дапамогаю адродзіць таксама іншыя сваяцтвы. Праз некалькі дзён пасля прыезду ў Парыж Расціньяк даслаў мадам дэ Басэан ліст ад цёткі. Вікантэса адказала запрашэннем на баль, што меў адбыцца наступным днём.

Такім было агульнае становішча ў сямейным пансіёне пры канцы лістапада 1819 года. Пабыўшы на балі ў мадам дэ Басэан, Эжэн вярнуўся дадому каля другой гадзіны папоўначы праз некалькі дзён. Каб нагнаць страчаны час, студэнт яшчэ падчас танцаў паабяцаў сабе, што будзе працаваць да раніцы. Ён вырашыў упершыню правесці ноч без сна ў цішыні свайго маўклівага квартала, паддаўшыся чарам ілжывай энергіі, якую разварушыў у ім бляск свецкага жыцця. Паколькі ён не вячэраў у пансі-

ёне, там маглі палічыць, што ён вернецца з балю толькі раніцай, на золку, так, як некалі ён вяртаўся з баляў у Прада ці ў Адэоне[1], запэцкаўшы граззю шаўковыя панчохі і стаптаўшы бальныя туфлі. Перш чым зачыніць дзверы на засаўку, Крыстоф выглянуў на двор. Якраз у гэты момант з'явіўся Расіньяк, таму ён змог узняцца ў свой пакой бясшумна; Крыстоф жа цягнуўся следам з грукатам. Эжэн распрануўся, сунуў ногі ў пантофлі, апрануў зношаны сурдут, распаліў торф у печцы і так хуценька падрыхтаваўся да працы, што тупат цяжкіх Крыстофавых чаравікаў заглушыў амаль бясшумныя гатаванні студэнта. Эжэн задумаўся на некалькі хвілін, перш чым засесці за чытанне падручнікаў па праваznаўству. У асобе мадам дэ Басэан ён толькі што ўбачыў адну з царыц парыжскага свету, а яе дом належаў да шэрагу наслаўнейшых у прадмесці Сен-Жэрмен. І па сваім тытуле, і па багацці яна належала да вяршыняў сталічнай арыстакратыі. Дзякуючы цётцы, мадам дэ Марсіяк, беднага студэнта добра прынялі ў гэтым шыкоўным доме, і, трэба зазначыць, ён яшчэ не адчуваў усяе важнасці гэтай ласкі. Уваход у пазалочаныя гасцёўні яе палаца можна было параўнаць з граматаю на магнацтва. Адна прысутнасць у гэтым выключна вузкім коле грамадства давала яму права на ўваход паўсюль. Бляск балю асляпіў Эжэна, ён ледзьве здолеў абмяняцца некалькімі словамі з вікантэсай, бо ў натоўпе парыжскіх багінь, якія цясніліся на рауце, ён заўважыў адну з тых, у каго адразу ж павінен закахацца любы юнак. Высокая, з ладнаю фігураю графіня Анастазі дэ Рэсто славілася на ўвесь Парыж прыгажосцю свайго стану. Уявіце сабе вялікія чорныя вочы, далікатныя рукі, ногі, нібы вытачаныя, парывістасць рухаў, і вы атрымаеце жанчыну, якую маркіз дэ Ранкероль параўноўваў з чыстакроўнаю жаробкаю. Нервовая элегантнасць зусім яе не псавала, формы цела вызначаліся акругласцю, хаця пульхнаю назваць яе было нельга. «Чыстакроўная жаробка», «пародзістая жанчына» — такія выразы прыйшлі на змену «анёлам нябесным», «асіянаўскім тварам»[2], усёй старадаўняй лю-

---

[1] *Прада* — парыжскі дом для розных забаўляльных мерапрыемстваў; *Адэон* — парыжскі драматычны тэатр.

[2] Творы ў стылі «Песень Асіяна», твора шатландскага паэта Джэмса Макферсона (1736—1796), напісанага па матывах шатландскай народнай творчасці. Макферсон прадставіў чытачам свой твор як англійскі пераклад песень шатландскага спевака Асіяна, які жыў у III ст. н. э.

боўнай міфалогіі, якую дэндзізм[1] адкінуў прэч. Для Расціньяка мадам Анастазі дэ Рэсто была проста жаданаю. У спісе кавалераў, адзначаных на вееры, ён замовіў сабе два танцы і змог падчас першага контрданса пагаварыць з ёй.

— Дзе я змагу сустрэць вас, мадам? — адкрыта і нечакана спытаў ён, уклаўшы ў голас той імпэт страсці, які так даспадобы жанчынам.

— Як дзе?.. У Буфонаў, у Булонскім лесе, у мяне дома, усюды.

І паўднёвы рызыкант паспяшаўся сысціся бліжэй з чароўнаю графіняю, наколькі гэта магчыма за тур контрданса ды тур вальса. Ён назваўся кузенам мадам дэ Басэан, і быў запрошаны прыходзіць у госці калі захоча. Расціньяк прыняў жанчыну за «знатную даму» і з падоранай яму ўсмешкі на развітанне зрабіў вывад, што варта запрашэнне скарыстаць: тут яму пашэнціла яшчэ раз: ён сустрэў чалавека, які не пасмяяўся з наіўнай недасведчанасці юнака, што лічылася смяротным грахом у асяроддзі славутых вісусаў эпохі, усіх гэтых фарсістых Маленкураў, Ранкероляў, Максімаў дэ Траяў, дэ Марсэ, Ажуда-Пінта, Вандэнесаў, якія бывалі ў кампаніі самых элегантных жанчын: ледзі Брандон, герцагіні дэ Ланжэ, графіні дэ Кергаруэт, мадам дэ Сэрызі, герцагіні дэ Карыльяна, графіні Фэро, мадам дэ Ланці, маркізы д'Эглёман, мадам Фірліяні, маркізы дэ Лістамер і маркізы д'Эспар, герцагіні дэ Мафрыньёз і дэ Гранльё. На шчасце для сябе, наіўны студэнт натрапіў на маркіза дэ Манрыво, каханка герцагіні дэ Ланжэ, хоць і генерала, але чалавека прастадушнага, як дзіця, які паведаміў юнаку, што графіня дэ Рэсто жыве на вуліцы Эльдэр. Быць маладым, прагнуць свету, марыць пра жанчыну — і бачыць, як перад табой адчыняюцца дзверы двух палацаў! Цвёрда стаяць у доме вікантэсы дэ Басэан у прадмесці Сен-Жэрмен і схіляць галаву ў доме графіні дэ Рэсто на Шасэ-д'Антэн! З першага заходу пабачыць анфіладу парыжскіх салонаў і лічыць сябе досыць прыгожым, каб знайсці там апекаванне і падтрымку ў жаночых сэрцах! Адчуваць сябе настолькі ўпэўнена, каб адным непаўторным скачком узляцець на туга напяты канат, крочыць па ім са смеласцю акрабата, які ніколі не падае, і знайсці найлеп-

[1] *Дэндзізм* (ад англ. dandy) — імкненне да вытанчаных манер і знешняга выгляду.

шы балансір у выглядзе цудоўнае жанчыны! Калі ў галаве мільгаюць такія думкі, калі боскі сілуэт гэтае жанчыны мроіцца перад табой тут, побач з тарфяною грубкаю, між галечай і зводам законаў, хто б не стаў, як Эжэн, сягаць надзеяй у будучыню, хто б не згадваў удачы? Вольныя думкі гэтак шчодра раздавалі вэксалі пад будучыя радасці, што ён ужо ўяўляў сябе побач з мадам дэ Рэсто, але ў гэты час стогн, падобны на стогн святога Язэпа, парушыў начную цішыню і нібы нечым смяротны хрып адгукнуўся ў сэрцы маладога чалавека. Ён ціхенька адчыніў дзверы і, апынуўшыся на калідоры, заўважыў палоску святла пад дзвярыма бацькі Гар'ё. Баючыся, што ягонаму суседу стала блага, Эжэн прыпаў вокам да шчыліны ад ключа, зазірнуў у пакой і ўбачыў старога за заняткам, які здаўся Эжэну настолькі падазроным, што ён вырашыў не вяртацца ў свой пакой, а прынесці карысць грамадству, высачыўшы начныя махінацыі так званага вермішэльшчыка. Было відаць, што бацька Гар'ё перавярнуў стол дагары нагамі яшчэ раней, прывязаў да папярочкі кубак і сподак з пазалочанага серабра і цяпер абвіваў іх нечым накшталт каната з такою сілаю, што гэтыя прадметы, аздобленыя багатаю чаканкаю, згіналіся ў трубку; стары, відаць, хацеў ператварыць іх у зліткі.

— Ого! Вось дык чалавеча! — здзівіўся Расціньяк, назіраючы, як жылістыя рукі старога з дапамогаю вяроўкі бясшумна мялі пазалочанае серабро, нібы цеста. Няўжо бацька Гар'ё быў злодзеем ці перакупшчыкам крадзенага, які прытворна здзяцініўся і жыве жабраком, каб надзейней было займацца процізаконным промыслам?— думаў Эжэн, разагнуўшыся на хвіліну, а пасля зноў прыпаў да шчыліны.

Бацька Гар'ё разматаў канат, разаслаў на стале коўдру, паклаў на яе камяк срэбра і пачаў качаць яго, прыдаючы форму круглай цуркі. Гэтую аперацыю ён выканаў надзіва лёгка.

«Ды сілы ў яго, відаць, не меней, чым у польскага караля Аўгуста», — разважаў у думках Эжэн, калі цурка стала амаль круглая.

Журботна паглядзеў на сваю работу бацька Гар'ё, на вачах яго заблішчэлі слёзы, ён дзьмухнуў на вітую свечку, пры святле якой згінаў пазалачонае серабро, і Эжэн ужо толькі чуў, як стары са стогнам лёг у ложак.

«Вар'ят»,— вырашыў студэнт.

— Беднае дзіцятка! — голасна вымавіў бацька Гар'ё .

Пачуўшы гэтыя словы, Расціньяк палічыў лепш маўчаць пра ўбачанае і не абвінавачваць суседа гэтак легкадумна. Ён ужо збіраўся вярнуцца ў свой пакой, калі раптам данёсся гук, які цяжка апісаць словамі; так маглі красціся па ўсходах людзі, абутыя ў мяккія паскавыя туфлі. Эжэн прыслухаўся і сапраўды пачуў подых дваіх чалавек. Дзверы нават не рыпнулі, не раздалося ніякага шолаху, а ён ужо раптам пабачыў праблісk святла на трэцім паверсе, у пакоі месье Ватрэна.

«Колькі таямніц хаваецца ў адным сямейным пансіёне!» — моўчкі здзівіўся ён.

Ён спусціўся некалькімі прыступкамі ніжэй, прыслухаўся, і да ягоных вушэй даляцеў звон золата. Неўзабаве святло згасла, зноў пачуўся подых людзей, хаця дзверы, як і раней, не рыпнулі. Подых стаў аддаляцца.

— Хто там ходзіць? — крыкнула мадам Ваке, адчыняючы акно спальні.

— Гэта я, матухна, дадому вяртаюся, — адказаў ціхі бас Ватрэна. «Вось дзіва! Крыстоф жа засунуў дзверы,— разважаў Эжэн, вяртаючыся ў свой пакой.— У Парыжы, каб ведаць, што робіцца вакол цябе, трэба ахвяраваць сном».

Гэтыя дзве невялікія падзеі адарвалі яго ад узнёслапачуццёвых летуценняў, і ён сеў за працу. Аднак падазрэнні наконт бацькі Гар'ё блыталі ягоныя думкі; яшчэ мацней іх блытаў твар мадам дэ Рэсто, які час ад часу прадвеснікам бліскучага лёсу паўставаў перад вачыма юнака. У рэшце рэшт ён лёг спаць і заснуў як пшаніцу прадаўшы. З дзесяці начэй, якія маладыя людзі абяцаюць прысвяціць працы, сем яны аддаюць сну. Толькі калі чалавеку споўніцца дваццаць гадоў, ён зможа трымаць сваё слова і абыходзіцца без сну.

Наступнаю раніцаю Парыж ахінуў адзін з тых густых туманаў, якія гэтак шчыльна захутваюць, засцілаюць горад, што ў выніку самыя пунктуальныя людзі памыляюцца ў часе. Зрываюцца важныя сустрэчы. Гадзіннік б'е поўдзень, а здаецца, што яшчэ восьмая раніцы. Была палова дзесятай, а мадам Ваке яшчэ не ўставала з ложка. Крыстоф і Сільвія спакойна, таксама са спазненнем, пілі каву з вяршкамі, знятымі з малака, прызначанага пансіянерам. Сільвія доўга кіпяціла гэтае малако, каб гаспадыня не заўважыла незаконнага набору.

— Сільвія,— звярнуўся Крыстоф, макаючы першую грэнку.— Месье Ватрэн — добры чалавек. Да яго зноў

сёння ноччу прыходзілі двое: калі спадарыня будзе нешта пытацца, нічога ёй не кажы.

— Ён табе нешта даў?

— Сто су за месяц, усё роўна што сказаць: «Маўчы».

— Толькі ён ды мадам Куцюр не квапяцца, іншыя хацелі б леваю рукою забраць тое, што праваю даюць на Каляды,— заўважыла Сільвія.

— Ты скажы яшчэ, колькі яны даюць? — заўважыў Крыстоф. — Нейкіх няшчасных сто су. Вось ужо два гады, як бацька Гар'ё сам ваксуе свае чаравікі. Гэтая жмінда Пуарэ абыходзіцца без ваксы: ён хутчэй выліжа яе, чым пачысціць свае шлёпанцы. А гэты мізэрны студэнт мне адшкадоўвае сорак су. За сорак су шчоткі не купіш, дык у дадатак ён яшчэ й прадае сваё старое адзенне. Не пансіён, а нейкая халупа!

— Гэта яшчэ нічога, — адгукнулася Сільвія, маленькімі глыткамі п'ючы каву. — Наша месца як-ніяк лепшае ў квартале, а ты мне скажы, Крыстоф, з табою наконт дзядзькі Ватрэна не размаўлялі?

— О так. Колькі дзён таму на вуліцы мяне сустрэў нейкі пан і кажа: «Ці не з вамі жыве тоўсты спадар, які фарбуе бакі?» А я і адказваю: «Не, пане, ён іх не фарбуе. Такому веселуну, як ён, на гэта бракуе часу». Пра ўсё гэта я расказаў месье Ватрэну, і ён мне падзякаваў: «Малайчына, хлопча, так заўжды і адказвай. Няма нічога больш непрыемнага, чым калі дазнаюцца пра твае слабасці. Ад гэтага, бывала, нават вяселлі адмянялі».

— Дык і ў мяне на кірмашы выпытвалі, ці не бачыла я, як ён апранае рубашку: і смех, і грэх... Чуеш, — звярнулася яна да Крыстофа, — на Валь-дэ-Грас прабіла без чвэрці дзесяць, а хоць бы табе хто варухнуўся.

— Ты што, усе ўжо разышліся. Мадам Куцюр і дзяўчо пайшлі прычашчацца да святога Эцьена. Бацька Гар'ё папёр некуды нейкі пакунак. Студэнт вернецца толькі пасля лекцый а дзесятай гадзіне. Я бачыў іх, як падмятаў лесвіцу, а бацька Гар'ё нават зачапіў мяне сваім пакункам... Цяжкі нейкі, як камень. Чым займаецца гэты стары, невядома. Іншыя яго і ў грош не ставяць, а ўсё ж чалавек ён някепскі, лепшы, чым яны ўсе разам. Грошай ён дае няшмат, затое дамы, да якіх ён мяне зрэдку адсылае, не скупяцца на добрыя гасцінцы, а ўжо апранаюцца — загледзецца можна.

— Тыя, каго ён называе сваімі дочкамі? Дык іх цэлы тузін.

— Я хадзіў толькі да дзвюх, тых самых, што прыходзілі сюды.

— А вось і гаспадыня заварушылася, зараз наробіць ляманту, трэба ісці. Пільнуй малако, Крыстоф, каб кот не паласаваўся.

Сільвія паднялася да мадам Ваке.

— Як? Ужо без чвэрці дзесяць, я сплю як суслік, а вам нішто? Ніколі такога не здаралася.

— Гэта ўсё туман, такі густы, хоць нажом яго рэж.

— А сняданак?

— Які сняданак? Вашых пансіянераў, мусіць, д'ябал носіць: яшчэ дзень не забраўся, а яны ўжо зніклі.

— Гавары правільна, Сільвія, — зрабіла заўвагу служанцы гаспадыня. — Яшчэ дзень не заняўся.

— Добра, спадарыня, буду гаварыць па-вашаму. А паснедаць можаце а дзесятай гадзіне. Мішанетка і Пуарэ яшчэ не варушыліся. Ва ўсім доме яны адны, і тыя спяць як калоды. Калоды яны і ёсць.

— Але, Сільвія, ты паруеш гэтых двух, нібы...

— Нібы, што? — з недарэчным рогатам спытала служанка. — Два — лічба парная.

— Дзіўна, Сільвія: як змог Ватрэн вярнуцца сёння ўначы, пасля таго як Крыстоф засунуў дзверы?

— Наадварот, спадарыня. Ён пачуў, што прыйшоў Ватрэн, і спусціўся адчыніць яму дзверы. А вы ўжо вырашылі...

— Дай мне кофту і хуценька займіся снеданнем. Пакладзі трохі бараніны ў бульбу ды падай вараных груш, тых, што каштуюць па два ліяры за штуку.

Калі праз некалькі хвілін мадам Ваке ўваходзіла ў кухню, кот якраз лапай ссунуў талерку, што накрывала кубак з малаком, і борзда хлябтаў яго.

— Місцігры! — усклікнула гаспадыня.

Кот уцёк, пасля вярнуўся і пачаў лашчыцца, выціраючыся аб ногі.

— Так, так, падлізвайся, стары лайдак, — папракнула яна хітруна. — Сільвія! Сільвія!

— Ну што там, гаспадыня?

— Глянь, колькі выжлукціў кот!

— Вінавата гэтае быдла, Крыстоф. Я казала яму папільнаваць. Дзе ён падзеўся? Не хвалюйцеся, спадарыня, малако выкарыстаем у каву для бацькі Гар'ё. Я развяду малако вадою, ён нічога не прыкмеціць. Ні на што не звяртае ўвагі стары, нават на ўласную ежу.

— Куды ж гэты блазен пасунуўся? — запытала мадам Ваке, расстаўляючы талеркі.

— Хто яго ведае, дзе яго носіць.

— Ах, я праспала, — заўважыла мадам Ваке.

— Затое спадарыня выглядае свежаю, як ружа...

У гэты момант зазвінеў званочак, і ў сталовую, напяваючы баском, увайшоў Ватрэн.

У вандроўках пабачыў я свет,
На залёты паўсюль шанцавала...

— Хо-хо! Добры дзень, матухна Ваке, — сказаў ён, заўважыўшы гаспадыню, і гулліва абняў яе.

— Ну, ну, будзе з вас...

— Скажыце: «Лайдак!» — падхапіў ён. — Ну, скажыце ж, вам жа хочацца сказаць гэтае слова! Чакайце, я дапамагу вам накрыць стол. Ах, хіба я не мілы чалавек?

І прыгожых бландзінак, брунетак
Пакахаць мне заўжды...

— Я толькі што стаў сведкаю нечага дзіўнага...

...выпадала...

— Чаго? — спытала ўдава.

— А палове дзевятай бацька Гар'ё знаходзіўся на вуліцы Дафін у краме ювеліра, які купляе старое сталовае серабро ды галуны. Ён прадаў яму за круглую суму нешта з пазалочанага серабра, добра спляскanага, калі ўлічыць, што рабіў гэта чалавек без асаблівага спруту.

— Што вы кажаце!

— Так. Я вяртаўся дадому, пасля таго як праводзіў аднаго свайго сябра, які назаўжды пакідае Францыю праз Каралеўскія паштовыя сувязі, і дачакаўся бацькі Гар'ё, каб дзеля жарту прасачыць за ім. Ён вярнуўся ў наш квартал, на вуліцу дэ-Грэ, зайшоў да вядомага ліхвяра Габсэка, круцяля першай гільдыі, здольнага з бацькавых касцей зрабіць косткі для даміно; ён — габрэй, араб, грэк, цыган адначасова, яго не абкрадзеш: грошы ён трымае ў банку.

— І што ж робіць наш бацька Гар'ё?

— Нічога не робіць, — працягваў Ватрэн. — Ён толькі ўсё больш бяднее. Гэты ёлуп настолькі дурны, што даходзіць да галечы з-за жанчын, якія...

— А вось і ён! — сказала Сільвія.

— Крыстоф, — паклікаў бацька Гар'ё, — падніміся да мяне.

Крыстоф паспяшаўся за старым і хутка вярнуўся.

— Ты куды? — запытала слугу мадам Ваке.

— Па даручэнні месье Гар'ё.

— А што гэта такое? — спытаў Ватрэн і вырваў з рук Крыстофа ліст, на якім было напісана: «Графіні Анастазі дэ Рэсто». — Куды ідзеш? — перапытаў ён, вяртаючы ліст Крыстофу.

— На вуліцу Эльдэр. Мне загадана аддаць яго графіні.

— А што там усярэдзіне? — цікавіўся Ватрэн, разглядаючы ліст на святло. — Банкнота? Не. — Ён разгарнуў канверт і ўсклікнуў: — Скасаваны вэксаль. Вось дык штука! Што і казаць, галантны стары дурань. Ну, ідзі, спрытнюга, — сказаў ён, накрыўшы сваёю вялізнаю рукою галаву Крыстофа і крутнуўшы яго, як ваўчка. — Ідзі, і будзеш мець на гарэлку.

На стале ўжо ўсё было падрыхтавана. Сільвія кіпяціла малако. Мадам Ваке распальвала печку з дапамогаю Ватрэна, які ўсё яшчэ напяваў:

У вандроўках пабачыў я свет,
На залёты паўсюль шанцавала...

Сняданак быў гатовы, калі вярнуліся мадам Куцюр і мадэмуазель Тайфэр.

— Адкуль вы так рана, даражэнькая мая? — запыталася ў мадам Куцюр гаспадыня.

— Мы хадзілі маліцца ў Сент-Эцьен дзю Мон, хіба вы забылі, што сёння мы пойдзем да месье Тайфэра? Беднае дзіця, дрыжыць як асінавы ліст, — паведамляла мадам Куцюр, сядаючы каля грубкі і працягваючы ногі да агню; ад чаравікаў ішла пара.

— Пагрэйцеся і вы, Віктарына, — прапанавала мадам Ваке.

Ватрэн падсунуў сіротцы крэсла.

— Прасіць Бога, каб улагодзіў бацькоўскае сэрца, — справа добрая, але гэтага мала. Вам патрэбны сябар, які мог бы проста выказаць усё гэтаму шэльму, гэтаму дзікуну, які мае, кажуць, тры мільёны і шкадуе вам пасагу. У наш час нават прыгожым дзяўчынам без пасагу не абысціся.

— Беднае дзіця! — падхапіла мадам Ваке. — Ведаеце, даражэнькая мая, ваш бацька — сапраўдная пачвара, і ён не можа не наклікаць бяды на ўласную галаву.

Пры гэтых словах вочы Віктарыны напоўніліся слязамі, і ўдава змоўкла, заўважыўшы знак, які зрабіла ёй мадам Куцюр.

— Каб толькі нам удалося яго пабачыць, каб я змагла паразмаўляць з ім, перадаць яму развітальны ліст жонкі, — зноў загаварыла ўдава інтэнданцкага камісара. — Я так і не адважылася адаслаць яго з поштаю; ён ведае мой почырк...

— «О гнаныя, няшчасныя, цнатлівыя жанчыны! — перапыняючы ўдаву, прадэкламаваў Ватрэн. — Вось да чаго вас давялі!» На днях я займуся вашымі справамі, і ўсё будзе добра.

— О, месье, — усклікнула Віктарына, звяртаючы да Ватрэна свой адначасова гарачы і волкі погляд (Ватрэн, аднак, не сумеўся), — калі ў вас знойдзецца мажлівасць пабачыцца з маім татам, скажыце яму, што за ўсе скарбы на свеце мне даражэйшыя любоў бацькі і гонар маёй маці. І калі вы здолееце хоць трошкі змякчыць ягоную суровасць, я буду маліцца Богу за вас. Ведайце, што мая ўдзячнасць...

«У вандроўках пабачыў я свет», — іранічна заспяваў Ватрэн. У гэты момант спусціліся Гар'ё, мадэмуазель Мішано, Пуарэ; трэба меркаваць, іх спакусіў водар падліўкі, якую рыхтавала Сільвія да рэшткаў бараніны. У тую самую хвіліну, калі сем жыхароў дома паселі за стол, вітаючы адзін другога, прабіла дзесятая гадзіна, і з вуліцы данесліся крокі студэнта.

— Вось добра, месье Эжэн, сёння вы паснедаеце разам з усімі, — сказала Сільвія.

Студэнт павітаўся з пансіянерамі і сеў побач з бацькам Гар'ё.

— Са мною здарылася дзіўная прыгода, — паведаміў ён, паклаўшы на талерку сабе бараніны і адразаючы акраец хлеба, які мадам Ваке, як заўжды, прыкінула на вока.

— Прыгода? — перапытаў Пуарэ.

— А чаму вы здзіўляецеся, старая шапка? — сказаў Ватрэн, звяртаючыся да Пуарэ. — Месье Эжэн створаны для прыгодаў.

Мадэмуазель Тайфэр нясмела зірнула на маладога студэнта.

— Раскажыце нам пра вашу прыгоду, — папрасіла мадам Ваке.

— Учора я хадзіў на баль да маёй кузіны, вікантэсы дэ Басэан, у яе цудоўны дом з пакоямі, абабітымі шоўкам, карацей, яна наладзіла шыкоўнае свята, і я павесяліўся, як кароль...

— Ёк, — перабіў яго Ватрэн.

— Я не разумею вас, — успыхнуў Эжэн.

— Я кажу «ёк», бо каралькі весяляцца лепей, чым каралі.

— Так, маеце рацыю: я б лепш быў бесклапотным птушанём, чым каралём, бо... — Пуарэ ніколі не прапускаў выпадку падтакнуць чужой думцы, але студэнт не дазволіў перапыніць сябе.

— Адным словам, я танцаваў з адной з найпрыгажэйшых дам, з чароўнаю графіняю, прывабнейшых за якую я ў жыцці не сустракаў. Кветкі персіка аздаблялі яе валасы, збоку быў прышпілены цудоўны букет жывых кветак, ад водару якіх кружылася галава, але што я кажу! Яе трэба бачыць, немагчыма апісаць жанчыну, зачараваную танцам. Дык вось, сёння раніцою, пад дзевятую гадзіну, я сустрэў гэтую багіню на вуліцы дэ-Грэ, яна ішла пехатою. Ах, як затрапятала маё сэрца, я ўявіў сабе...

— Што яна ішла сюды, — працягваў Ватрэн, пранізаўшы студэнта глыбокім позіркам. — Яна, несумненна, ішла да татачкі Габсэка, ліхвяра. Калі вам надарыцца пакапацца ў сэрцах парыжанак, перш за каханкаў вы там знойдзеце ліхвяроў. Вашу графіню завуць Анастазі дэ Рэсто, яна жыве на вуліцы Эльдэр.

Пачуўшы гэтае імя, студэнт пільна паглядзеў на Ватрэна. Бацька Гар'ё рэзка ўзняў галаву, кінуў на субяседніка позірк, поўны святла і хвалявання, і здзівіў прысутных, з болем у голасе ўсклікнуўшы:

— Крыстоф прыбудзе занадта позна, яна ўжо адправілася туды!

— Я здагадаўся, — сказаў Ватрэн, нахіліўшыся да вуха мадам Ваке.

Гар'ё еў машынальна, не зважаючы на тое, што ляжыць у яго на талерцы. Ніколі ён не меў такога дурнаватага і засяроджанага выгляду, як цяпер.

— Які д'ябал паведаміў вам яе імя, месье Ватрэн? — запытаўся Эжэн.

— Усё вельмі проста. Бацька Гар'ё добра ведае яго, чаму б і мне не ведаць?

— Месье Гар'ё! — усклікнуў студэнт.

— Га? Што? — азваўся няшчасны стары. — Дык учора яна была вельмі прыгожаю?

— Хто?

— Мадам дэ Рэсто.

— Гляньце на старога скнару, вочы яго так і палаюць, — сказала Ватрэну мадам Ваке.

— Выходзіць, што ён яе ўтрымлівае? — шапнула студэнту мадэмуазель Мішано.

— О так, яна была вельмі прыгожаю, — расказваў Эжэн пад прагным позіркам бацькі Гар'ё. — Калі б там не было самой мадам дэ Басэан, мая чароўная графіня стала б каралеваю балю; мужчыны не адрывалі ад яе вачэй, я быў дванаццатым у спісе жадаючых танцаваць з ёю, яна танцавала ўсе контрдансы. Астатнія жанчыны ажно шалелі. Калі ўчора нехта і быў шчаслівы, дык гэта яна. Нездарма кажуць, што няма нічога прыгажэйшага за фрэгат пад ветразем, каня ў галопе і жанчыны ў танцы.

— Учора — наверсе кола фартуны, у герцагіні, а сёння раніцаю на ніжняй прыступцы беднасці, у ліхвяра — вось яны, парыжанкі, — сказаў Ватрэн. — Калі муж не здольны забяспечваць нястрымную прагу да раскошы, яна гандлюе сабою. Калі яна не ўмее прадаць сябе, яна растрыбушыць родную маці, абы толькі знайсці чым вызначыцца. Карацей, яны гатовыя на ўсё. Вядомая, вядомая рэч!

Твар бацькі Гар'ё, які свяціўся сонейкам пры словах студэнта, пасля жорсткай заўвагі Ватрэна стаў змрочным.

— Ну дык дзе ж ваша прыгода? — спытала мадам Ваке. — Вы з ёю загаварылі? Даведаліся, можа, яна хоча вывучаць права?

— Яна мяне не бачыла, — сказаў Эжэн. — Але хіба не дзіва сустрэць адну з найпрыгажэйшых парыжскіх жанчын на вуліцы дэ-Грэ а дзевятай гадзіне раніцы, хаця з балю яна вярнулася дамоў не раней, чым а другой гадзіне ночы? Такія прыгоды здараюцца толькі ў Парыжы.

— Ну, ведаеце, здараюцца і больш дзіўныя рэчы, — заўважыў Ватрэн.

Мадэмуазель Тайфэр размовы амаль не слухала, яе хвалявaў маючы адбыцца візіт да бацькі. Па знаку мадам Куцюр яна ўстала і пайшла апранацца. Калі абедзве дамы пакінулі сталовую, бацька Гар'ё таксама адправіўся наверх.

— Ну што, бачылі? — сказала мадам Ваке Ватрэну і астатнім пансіянерам. — Усё зразумела. Ён давёў сябе да галечы з-за гэтых жанчын.

— Ніколі не паверу, што прыгажуня графіня дэ Рэсто належыць бацьку Гар'ё! — усклікнуў студэнт.

— Нам і не трэба, каб вы паверылі, — перабіў яго Ватрэн. — Вы яшчэ занадта малады, дрэнна ведаеце Парыж, але аднойчы вы ўбачыце, што сустракаюцца людзі, якіх мы называем апантанымі...

Пры гэтых словах мадэмуазель Мішано з разуменнем зірнула на Ватрэна. У яе позірку было падабенства з хваляваннем палкавога каня пры гуках трубы.

— Ах, ах, а ці не былі і мы трошкі апантанымі?

Глыбокі позірк Ватрэна прымусіў сумецца мадэмуазель Мішано. Старая дзеўка апусціла вочы долу, нібы манашка перад голымі статуямі.

— Дык вось, — працягваў ён, — такія людзі, зачапіўшыся за нейкую думку, не хочуць развітацца з ёю. Смягнуць яны без пэўнай вады з пэўнага калодзежа, часцей за ўсё тухлага; і дзеля гэтай вады яны гатовы прадаць жонку, дзяцей, нават уласную душу д'яблу. Для адных такім калодзежам з'яўляецца азартная гульня, біржа, калекцыяніраванне жывапісу ці насякомых, музыка; для іншых — гэта жанчына, што ўмее спакусіць. Апошнім вы можаце прапанаваць усіх жанчын свету, яны і вокам не міргнуць, яны хочуць мець толькі тую, што задаволіць іх палкасць. Часта гэтая жанчына зусім абыякавая да іх, амаль пагарджае імі, але дорага прадае хвіліны задавальнення; а нашы гарэзы не стамляюцца ад такога жыцця і гатовы закласці ў ламбард апошнюю кашулю, каб прынесці даме апошні экю. Бацька Гар'ё адзін з такіх. Графіня эксплуатуе яго, таму што ён скрытны: вось ваш вышэйшы свет. Нябога ні пра каго, апрача яе, не думае. Ва ўсім, што не датычыць кахання, ён — быдла быдлам. А калі раптам загаворыце на гэтую тэму, твар старога пачынае ззяць мацней за дыяменты. Разгадаць ягоныя сакрэты няцяжка. Сёння раніцою ён насіў пазалочанае срэбра на пераліў, пасля заходзіў да дзядзькі Габсэка на вуліцы дэ-Грэ. Сачыце ўважліва! Вярнуўшыся, ён адправіў да графіні Рэсто дурніцу Крыстофа, які паказаў нам адрас, у канверце ляжаў скасаваны вэксаль. Зразумела, што справа была тэрміновая, бо графіня збіралася ісці да старога ліхвяра сама. Бацька Гар'ё міла заплаціў за графіню. Тут неабавязкова мець

светлую галаву, каб скеміць, што да чаго. Я даказаў вам, мой юны студэнт, што ваша графіня, смеючыся, танцуючы, крыўляючыся, спакушаючы вас персікавымі кветкамі і падбіраючы сукенку пальчыкамі, у сэрцы не мела спакою, бо хвалявалася аб пратэрмінаваных вэксалях, сваіх ці каханкавых.

— Пасля вашых слоў мне страшэнна карціць даведацца праўду. Заўтра пайду да мадам дэ Рэсто, — усклікнуў Эжэн.

— Так, — сказаў Пуарэ, — заўтра трэба пайсці да мадам дэ Рэсто.

— Магчыма, вы там сустрэнеце і старога Гар'ё, які прыйдзе атрымаць прэмію за сваю ласку.

— Дык ваш Парыж — такая багна? — з агідаю запытаўся Эжэн.

— Багна і дзіўная-дзіўная, — адказаў Ватрэн. — Тыя, хто плюхаецца ў ёй, ездзячы на фурманках — прыстойныя людзі, а тыя, хто ходзіць па ёй пехатою — махляры. Украдзіце якую драбніцу сабе на ліха — і вас выставяць на пляцы Палаца юстыцыі, нібы дзіва заморскае. Украдзіце мільён, і вы станеце жывой дабрадзейнасцю для ўсіх салонаў. І каб падтрымаць гэткую маральнасць, вы плаціце жандармерыі і юстыцыі трыццаць мільёнаў у год... Цудоўна!

— Як, бацька Гар'ё прадаў на пераліў свой пазалочаны сярэбраны кубак? — усклікнула мадам Ваке.

— Той, дзе на вечку былі дзве туркаўкі? — пацікавіўся Эжэн.

— Менавіта той.

— Значыць, ён вельмі даражыў ім, бо спляскаўшы серабро, плакаў над ім. Я выпадкова стаў сведкам гэтага, — паведаміў Эжэн.

— Гэты кубак са сподкам былі яму даражэйшыя за жыццё, — адказала ўдава.

— Бачыце, якія гарачыя пачуцці ў нашага дзівака! — усклікнуў Ватрэн. — Гэтая кабета ўмее распаліць чалавеку сэрца.

Студэнт падняўся да сябе ў пакой. Ватрэн пайшоў у горад. Праз некалькі хвілін Сільвія знайшла фіякр, мадам Куцюр і Віктарына селі ў яго і паехалі. Пуарэ прапанаваў руку мадэмуазель Мішано, і яны ўдвух пайшлі на шпацыр у Батанічны сад — збіраліся правесці там дзве самыя лепшыя гадзіны дня.

— Ну вось, яны рыхтык пабраліся, — сказала тоўстая Сільвія. — Сёння яны ўпершыню выходзяць разам. Што адна, што другі, два сухія сухары. Стукнуцца адно аб адно — іскры пасыплюцца, як ад крэсіва.

— Шкада шалі мадэмуазель Мішано, загарыцца, як цэра, — засмяялася мадам Ваке.

Калі а чацвёртай гадзіне вечара Гар'ё вярнуўся, ён убачыў пры святле закураных лямп пачырванелыя вочы Віктарыны. Мадам Ваке слухала аповяд пра няплённы ранішні візіт да месье Тайфэра. Тайфэру надакучылі наведванні дачкі і гэтай пажылой кабеты, і ён вырашыў прыняць, каб высветліць адносіны.

— Даражэнькая мая, — казала мадам Куцюр удаве Ваке, — уявіце сабе, што ён нават не прапанаваў Віктарыне сесці, яна так і засталася стаяць. А мне ён холадна, без злосці, сказаў, што нам не варта марнаваць час на наведванні: мадэмуазель, маўляў, (не называючы яе дачкою) сапсавала сабе рэпутацыю, назаляючы візітамі (гэта калі дачка раз у год прыходзіць да бацькі, пачвара); паколькі маці Віктарыны выходзіла замуж без пасагу, дачка не мае на што прэтэндаваць, — і гэта яшчэ не ўсё, яго далейшыя словы былі такімі жорсткімі, што няшчаснае дзяўчо залілося горкімі слязамі. Яна кінулася ў ногі да бацькі і мужна адказала, што рабіла гэта толькі дзеля памяці маці, што яна гатова без нараканняў скарыцца бацькавай волі, але заклінае яго прачытаць завяшчанне нябожчыцы; яна дастала ліст і падала яму, з яе вуснаў зляталі самыя чулыя, самыя цудоўныя словы, не ведаю, адкуль яна іх брала, напэўна, ёй дыктаваў Бог, да таго натхнёна яна прамаўляла! Нават я, слухаючы, плакала як дурніца. А ведаеце, чым займаўся гэты жудасны чалавек? Ён стрыг пазногці! Ліст, які калісьці быў мокры ад слёз няшчаснай мадам Тайфэр, ён кінуў на камін са словамі: «Ну, добра». Ён хацеў узняць дачку з падлогі, тая схапіла яго рукі, каб пацалаваць, дык ён вырваўся. Хіба ён пасля гэтага не злодзей? Бамбіза-сын увайшоў і нават не павітаўся з сястрою.

— Яны проста пачвары! — сказаў бацька Гар'ё.

— А пасля, — працягвала мадам Куцюр, не зважаючы на вокліч старога, — бацька і сын пайшлі, развітаўшыся і папрасіўшы ў мяне прабачэння: іх чакалі неадкладныя справы. Вось такі атрымаўся візіт. Прынамсі, дачку ён пабачыў. Не разумею, як можна яе не прызнаваць? Яны з бацькам падобныя, як дзве кроплі вады.

Адзін за другім прыходзілі пансіянеры, віталіся, гутарылі пра ўсякія дробязі. Такія гутаркі ў пэўных слаях парыжскай грамады лічацца вяршыняй дасціпнасці, прычым соллю гэтых заснаваных на глупстве размоў з'яўляюцца жэсты і вымаўленне. Гэты арго ўвесь час мяняецца. Жарт, які ляжыць у яго аснове, больш месяца не жыве. Палітычная падзея, крымінальны судовы працэс, вулічная песня, выбрыкі актораў — усё дапамагае падтрымліваць гэтую гульню розуму, сутнасць якой падобна на гульню ў бадмінтон: суразмоўцы перакідваюцца словамі, адбіваючы іх адзін другому, як валан. Пасля нядаўняга стварэння дыярамы, якая дасягнула больш высокай ступені аптычнай ілюзіі, чым панарама, у некаторых майстэрнях жывапісу нарадзілася бязглуздая манера размаўляць, дадаючы да слоў канчатак «рама». Жыхарам пансіёна гэтая звычка перадалася ад маладога мастака, што прыходзіў вячэраць да Ваке.

— Ну, месье Пуарэ, як ваша здароўерама? — запытаўся служачы музея і, не чакаючы адказу, павярнуўся да мадам Куцюр і Віктарыны. — У вас гора, мілыя пані?

— А мы абедаць будзем? — усклікнуў Арас Б'яншон, студэнт медычнага факультэта, сябар Расціньяка. — Мой страўнік праваліўся usque ad talones[1].

— Ну ж і сцюдзерама сёння! — сказаў Ватрэн. — Гэй, бацька Гар'ё, пасуньцеся. Халера ясная, ваша нага закрывае ўсе чалеснікі.

— Вашамосць, спадар Ватрэн, — сказаў Б'яншон, — чаму вы кажаце сцюдзерама? Гэта памылка, трэба казаць сцюжарама.

— Не, — запярэчыў служачы музея, — лепш за ўсё студзерама, таму што гэта больш падобна на «студзень».

— Ха-ха!

— А вось і яго высокасць маркіз дэ Расціньяк, доктар крыўды, — закрычаў Б'яншон, хапаючы Эжэна за шыю і сціскаючы, нібы хацеў задушыць. — Гэй-гэй, людзі, гэй!

Ціхенька ўвайшла мадэмуазель Мішано, моўчкі прывіталася з прысутнымі паклонам і села з трыма жанчынамі.

— Ад гэтай кажаніхі мяне мароз па скуры прабірае, — прашаптаў Ватрэну Б'яншон, ківаючы на мадэмуазель

---

[1] *Usque ad talones* — да пятак *(лац.)*.

Мішано. — Я вывучаю сістэму Галя[1] і знайшоў у яе шышкі Юды.

— А вы былі з ім знаёмы? — спытаў Ватрэн.

— А хто з ім не сустракаўся! — адказаў Б'яншон. — Слова гонару, гэтая бялявая старая дзеўка нагадвае мне доўгіх чарвякоў, якія ў рэшце рэшт згрызаюць цэлую бэльку.

— Вось што гэта такое, малады чалавек, — сказаў саракагадовы халасцяк Ватрэн, разгладжваючы бакі:

А ружа пражыла век ружаў
За раніцу адну[2].

— Ах, нясуць цудоўны суп з чагосьцірамай, — сказаў Пуарэ, пабачыўшы Крыстофа, які пачціва трымаў каструлю.

— Прабачце, панове, але гэта капуста, — заявіла мадам Ваке.

Хлопцы ажно зарагаталі.

— Пагарэў, Пуарэ!

— Пуаррррэў пагарэў!

— Запішыце два ачкі на карысць матухны Ваке, — сказаў Ватрэн.

— Хто-небудзь з вас звярнуў увагу на ранішні туман? — запытаўся служачы.

— Гэта быў утрапёны і ўнікальны туман, — адказаў Б'яншон, — туман змрочны, меланхалічны, сумны, задушны, як бацька Гар'ё.

— Гар'ёрама, бо сваіх халяў не было відаць.

— Гэй, мілорд Гарыёт, размова ідзе пра вас.

Гар'ё сядзеў з краю стала, ля дзвярэй, праз якія ўваходзіла прыслуга, ён прыўзняў галаву, нюхаючы акрайчык хлеба, які дастаў з-пад сурвэткі — старыя звычкі час ад часу нагадвалі пра сябе.

— Ну, дык што, — крыкнула яму мадам Ваке, заглушаючы сваім голасам бразгат лыжак, талерак і размову, — вам ужо і хлеб недаспадобы?

— Наадварот, спадарыня, — адказаў ён, — хлеб спечаны з этампскае[3] мукі першага гатунку.

— Па чым вы гэта бачыце? — пацікавіўся Эжэн.

— Па бялюткасці, па смаку.

---

[1] *Галь*, Франц-Іосіф (1755—1828) — аўстрыйскі ўрач і анатам.

[2] Вершы французскага паэта Франсуа дэ Малерба (1555—1628).

[3] Вышэйшы гатунак мукі з Этампа, сельскагаспадарчага раёна паблізу Парыжа.

— На смак носа, бо вы ж яго нюхаеце, а не ясцё, — пажартавала мадам Ваке. — Вы робіцеся такім ашчадным, што ў рэшце рэшт знойдзеце спосаб харчавацца пахамі з кухні.

— Тады запатэнтуйце сваё вынаходніцтва, — закрычаў служачы музея, — заробіце немалыя грошы.

— Кіньце, ён робіць гэта, каб пераканаць нас у тым, што калісьці быў вермішэльшчыкам, — сказаў мастак.

— Выходзіць, над вашым носам прырода папацела! — заявіў служачы музея.

— Што ў папа? — недачуў Б'яншон.

— Папа-раць.

— Папа-ў-дні.

— Папа-ўся.

— Папа-ліць.

— Папа-ддзя.

— Папа-роў.

— Папа-р.

— Папа-рама.

З хуткасцю беглага агню прагучалі з розных канцоў гасцёўні гэтыя адказы і выклікалі тым болей смеху, што бацька Гар'ё бязглузда ўтаропіўся ў суразмоўцу, нагадваючы чалавека, які імкнецца зразумець замежную мову.

— Папа?.. — перапытаў ён у Ватрэна, які сядзеў з ім побач.

— Папаха, старычына! — сказаў Ватрэн і насунуў шапку бацьку Гар'ё на лоб, пляснуўшы далоняй па галаве.

Шапка з'ехала на самыя вочы; стары, ашаломлены нечаканым нападам, на хвіліну знерухомеў. Тым часам Крыстоф забраў талерку старога, мяркуючы, што той ужо даеў капусту; такім чынам, калі стары прыўзняў шапку і ўзяў лыжку, яна бразнула па стале. Усе пансіянеры зарагаталі.

— Месье, — сказаў стары, — вы злосна жартуеце, і калі вы зноў дазволіце сабе так насоўваць...

— Што тады, татачка? — перабіў яго Ватрэн.

— Тады вы некалі дорага за гэта заплаціце...

— У пекле, ці не так? — спытаў жывапісец. — У тым цёмным кутку, куды трапляюць непаслухмяныя дзеці...

— Мадэмуазель, — звярнуўся Ватрэн да Віктарыны, — што ж вы не ясцё? Татачка аказаўся занадта ўпартым?

— Проста жах! — сказала мадам Куцюр.

— Трэба навучыць яго розуму, — сказаў Ватрэн.

— Але паколькі мадэмуазель не есць, — сказаў Расціньяк, які сядзеў побач з Б'яншонам, — яна магла б пачаць судовы працэс наконт вяртання грошай за харчаванне. Э-э, глядзіце, як бацька Гар'ё ўзіраецца ў мадэмуазель Віктарыну.

Стары забыўся на ежу, адно сачыў за няшчаснаю дзяўчынаю, твар якой хмурнеў шчырым болем, болем дзіцяці, улюбёнага ў бацьку і адкінутага ім.

— Даражэнькі, — ціха сказаў суседу Расціньяк, — мы памыліліся наконт бацькі Гар'ё. Перад намі не дурань і не чалавек без нерваў. Вывучы яго па сістэме Галя і тады скажаш, што ты аб ім думаеш. Я бачыў, як сёння ноччу ён гнуў сподак з пазалочанага срэбра, нібы воск, і зараз таксама на яго твары можна прачытаць незвычайныя пачуцці. Жыццё старога мне здаецца надта таямнічым, а значыцца, вартым вывучэння. Так, Б'яншон, дарма ты смяешся, я не жартую.

— Што бацька Гар'ё — медычны феномен, я згодны, — сказаў Б'яншон. — І калі ён захоча, я зраблю секцыю яго цела.

— Не, ты абмацай спачатку галаву.

— А раптам яго глупства заразнае?

На наступны дзень элегантна апрануты Расціньяк гадзіны ў тры дня выправіўся да мадам дэ Рэсто, дарогаю аддаючыся тым легкадумна-шалёным спадзяванням, ад якіх жыццё юнакоў робіцца поўным чароўных эмоцый: іх не турбуюць ніякія перашкоды ды небяспекі, паўсюль мроіцца толькі поспех, сама гульня ўяўлення паэтызуе іх жыццё, а крах пражэктаў, якія існавалі толькі ў неўтаймаваных жаданнях, наводзіць смутак і роспач; добра, што юнакі — нявопытныя сарамліўцы, інакш бы грамадскі лад стаў немагчымым. Эжэн дыбаў з вялізнай асцярожнасцю, каб не запэцкацца; па дарозе ён думаў, што скажа мадам дэ Рэсто, назапашваў дасціпнасць, выдумляў спрытныя адказы ва ўяўнай размове, рыхтаваў выкшталцоныя словы, фразы ў духу Талейрана, чакаў, што абставіны паспрыяюць прызнанню, на якім ён грунтаваў свае планы. І ўсё ж, як ні асцерагаўся, запыліўся і мусіў чысціць боты і штаны ў Пале-Раялі.

«Калі б я быў багатым, — думаў ён, разменьваючы манету ў сто су, якую ўзяў на ўсякі выпадак, — я ехаў бы на фурманцы, і мне б нішто не замінала думаць».

Нарэшце ён дабраўся да вуліцы Эльдэр і спытаў графіню дэ Рэсто. З халоднаю злосцю чалавека, упэўненага ў тым, што некалі прыйдзе і на яго вуліцу свята, ён вытрымаў зняважлівыя позіркі прыслугі, якая бачыла, што ён прайшоў праз двор пехатою і не чула грукату фурманкі. Гэтыя позіркі закранулі яго за жывое яшчэ болей, калі ён пры ўваходзе ўбачыў прыгожага каня ў багатым рыштунку, запрэжанага ў шыкоўны кабрыялет, які сведчыў аб раскошы жыцця і наводзіў на думку аб звычцы да ўсіх парыжскіх даброт. У яго сапсаваўся настрой, усё пераблыталася ў галаве, забыліся жарты, якімі ён збіраўся весяліць графіню, дасціпнасць знікла; ён ураз атупеў. Чакаючы лёкая, які павінен быў прынесці адказ ад графіні, Эжэн стаяў ля акна, абапіраючыся локцем на зашчапку, і бессэнсоўна глядзеў на двор. Час цягнуўся паволі, ён даўно пайшоў бы, калі б не меў паўднёвай упартасці, здольнай рабіць цуды, калі яна дзейнічае без аглядкі.

— Пане, — сказаў лёкай, — спадарыня зараз у будуары, яна дужа занятая і мне не адказала, калі пан жадае прайсці ў гасцёўню, то, калі ласка, там ужо чакае госць.

Здзіўляючыся ўладзе прыслугі, якая адным словам можа вынесці прысуд сваім гаспадарам, Расціньяк, з намерам прадэманстраваць гэтым лайдакам, што ён ведае дом, смела адчыніў дзверы, праз якія выходзіў лёкай, але трапіў у пакой, дзе знаходзіліся лямпы, буфеты, прылада для падагравання купальных рушнікоў, і з якога можна было прайсці ў змрочны калідор і на ўнутраныя ўсходы. У прыхожай прыглушана засмяяліся, і тады замяшанне Эжэна дасягнула мяжы.

— Трэба ісці сюды, пане, — звярнуўся лёкай, і ў яго голасе гучала тая фальшывая павага, якая зневажае яшчэ болей.

Эжэн кінуўся назад так паспешліва, што наткнуўся на ванну, але, на шчасце, утрымаў капялюш на галаве, які ледзь не зваліўся ў ваду. У гэты момант у канцы доўгага калідора, асветленага маленькаю лямпачкаю, адчыніліся дзверы, і Расціньяк пачуў галасы графіні дэ Рэсто і бацькі Гар'ё, а пасля гук пацалунка. Эжэн увайшоў у сталовую, а праз яе ў суправаджэнні лёкая трапіў нарэшце ў першую гасцёўню. Там ён спыніўся ля акна, заўважыўшы, што яно выходзіць у двор. Яму карцела пераканацца, ці бацька Гар'ё сапраўды быў бацькам Гар'ё. Яго сэрца дзіўна білася ў грудзях, згадваліся развагі Ватрэна. Лё-

кай чакаў Расціньяка ля дзвярэй другой гасцёўні, як раптам яны расчыніліся, і з'явіўся элегантны малады чалавек. Ён нецярпліва сказаў:

— Марыс, я пайшоў. Скажаце спадарыні графіні, што я чакаў больш за паўгадзіны.

Гэты нахабнік, відаць, карыстаўся тут нейкім асаблівым правам, бо адчуваў сябе вельмі ўпэўнена. Ён наблізіўся да акна, дзе стаяў Эжэн, напяваючы італьянскую руладу, каб угледзецца ў твар Эжэна і зазірнуць у двор.

— Але, спадар граф, лепш было б, каб пачакалі яшчэ хвіліначку; графіня ўжо вольная, — сказаў Марыс, вяртаючыся ў прыхожую.

Якраз у гэты момант бацька Гар'ё па кухонных усходах спусціўся да брамы. Стары расправіў парасон і збіраўся раскрыць яго, не заўважаючы, што брама адчынілася і малады чалавек з ордэнам у пятліцы кіруе ў двор цільбюры. Бацька Гар'ё ледзьве паспеў адскочыць назад, бо яго б раздушыў конь, які, зрэшты, спалохаўшыся тафцянога парасона, панёсся да пад'езда. Малады чалавек павярнуўся, пабачыў бацьку Гар'ё і прывітаўся з ім паклонам, якім вітаюць патрэбнага вам ліхвяра, з ветлівасцю, неабходнай пры сустрэчы нават з чалавекам заганным, але аб якой пасля прыйдзецца чырванець. Бацька Гар'ё дабрадушна адказаў сяброўскім кіўком. Усе гэтыя падзеі адбыліся вокамгненна. Эжэн занадта засяродзіўся на ўбачаным і нават не заўважыў, што ён не адзін у гасцёўні, калі раптам раздаўся голас графіні:

— Ах, Максім, вы намерыліся пайсці? — з папрокам і пэўнаю дасадаю спытала яна.

Графіня не заўважыла прыезда цільбюры. Расціньяк рэзка павярнуўся. Графіня выйшла апранутаю ў белы кашміровы пеньюар з ружовымі стужкамі, прычасанаю нядбайна, як і ўсе парыжанкі раніцаю; яна прынесла з сабою водар парфумы, мусіць, яна прымала ванну, і яе прыгажосць, так бы мовіць, мякчэйшая, здавалася яшчэ болей чароўнаю; вочы яе звільгатнелі. Маладыя людзі ўмеюць бачыць усё: іх пачуцці прыцягваюць усе выпраменьванні жанчыны, як расліна ўцягвае з паветра патрэбныя ёй рэчывы; так і Эжэн адчуў свежасць рук графіні, не дакранаючыся да іх. Праз белы пеньюар ружавелі жаночыя грудзі, погляд Эжэна асабліва вабіла тое іх месца, дзе яны прыадкрываліся. Гарсэт графіні можна было не насіць, пояс толькі падкрэсліваў зграбную талію;

шыя чакала, нібы зазывала да кахання, а якімі пекнымі былі ножкі ў начных туфельках! Калі Максім узяў яе руку, каб пацалаваць, Эжэн нарэшце яго заўважыў, а графіня заўважыла Эжэна.

— Ах, гэта вы, месье Расціньяк! Вельмі рада бачыць вас, — сказала яна такім тонам, што разумны чалавек адразу б зразумеў, што трэба зрабіць.

Дэ Трай пазіраў то на Эжэна, то на графіню, нібы казаў: «Адкуль гэты няпрошаны госць? Даражэнькая, спадзяюся, ты выправіш яго за дзверы».

Толькі так можна было б растлумачыць недвухсэнсоўныя позіркі маладога фанабэрыстага ганарліўца, якога графіня Анастазі назвала Максімам і на якога паглядала з такім паслушэнствам, што, сама не падазраючы, выдавала ўсе свае жаночыя сакрэты. Расціньяк адразу ж зненавідзеў гэтага маладзёна. Па-першае, гледзячы на прыгожыя бялявыя, добра завітыя валасы Максіма, ён зразумеў, наколькі жахлівая фрызура ў яго самога; да таго ж Максім быў абуты ў далікатныя і чысцюткія боты, а боты Эжэна, нягледзячы на ўсе яго старанні, пакрыліся тонкім налётам пылу; і, нарэшце, талію Максіма элегантна ахінаў сурдут, прыпадабняючы яго да гожае кабеты, а Эжэн удзень, а палове трэцяй, усё яшчэ быў апрануты ў чорны фрак. Разумны юнак з берагоў Шаранта[1] адчуў, якую перавагу даваў касцюм гэтаму хударляваму, высокаму, яснавокаму, беласкураму дэндзі з пароды людзей, здольных давесці да жабрацкай торбы нават сірату. Не чакаючы адказу Эжэна, мадам дэ Рэсто пырхнула ў другую гасцёўню, быццам на крылах, распусціўшы лёгкае крыссе пеньюара так, што стала падобнай на матылька; Максім адправіўся следам. Разлаваны Эжэн накіраваўся за Максімам і графіняю. Усе трое сышліся ў цэнтры вялікай гасцёўні, насупраць каміна. Студэнт цудоўна ведаў, што замінае зненавіднаму Максіму, але, рызыкуючы наклікаць нямілась мадам Рэсто, ён вырашыў стаць замінкаю гэтаму франту. Эжэн успомніў, што бачыў Максіма на балі ў мадам дэ Басэан, і зразумеў, кім прыходзіўся Максім для графіні дэ Рэсто, але з юнацкаю адвагаю, прычынаю вялікіх глупстваў, альбо вялікіх поспехаў, сказаў сабе: «Вось мой сапернік, і я перамагу яго». Неабачлівы! Ён яшчэ не ведаў, што граф Максім дэ

---

[1] *Шарант* — рака, на беразе якой знаходзіцца горад Ангулем; недалёка ад яго месціцца маёнтак Расціньякаў.

Трай, дазволіўшы зняважыць сябе, страляе першым і забівае праціўніка. Эжэн паляваў спраўна, але ў ціры ён пакуль не збіваў дваццаць лялек-мішэняў з дваццаці дзвюх.

Малады граф сеў на канапу, што стаяла ля каміна, схапіў абцугі і ўзяўся так люта, з такім непрыхаваным раздражненнем варушыць жар, што прыгожанькі тварык Анастазі ўмомант засмуціўся. Маладая жанчына павярнулася і зірнула на Эжэна настолькі холадна і запытальна, што няцяжка было прачытаць у яе вачах: «Ну, чаму ж вы ніяк не пакінеце нас?»

Добра выхаваныя людзі ў такіх выпадках умеюць знайсці фразы, якія з поўным правам можна назваць развітальнымі.

Эжэн ветліва ўсміхнуўся і сказаў:

— Мадам, я спяшаўся пабачыць вас, каб...

Ён запнуўся на паўслове, бо адчыніліся дзверы і ўвайшоў, не вітаючыся з графіняю, чалавек без капелюша, які кіраваў цільбюры. На Эжэна ён глянуў панура, Максіму працягнуў руку і сказаў «добры дзень» нейкім брацкім тонам, што асабліва здзівіла Эжэна. Маладыя правінцыялы не ведаюць, колькі прыемнасці можна знайсці ў жыцці трохвугольнікам.

— Месье дэ Рэсто, — прадставіла графіня свайго мужа Эжэну.

Эжэн прывітаўся нізкім паклонам.

— Месье дэ Расіньяк, — працягвала яна, прадстаўляючы Эжэна графу дэ Рэсто, — сваяк спадарыні вікантэсы дэ Басэан праз Марсіякаў, я мела задавальненне пазнаёміцца з ім на апошнім балі ў доме дэ Басэанаў.

«Сваяк спадарыні вікантэсы дэ Басэан праз Марсіякаў!» Графіня вымавіла гэтыя словы падкрэслена напышліва, з гонарам, уласцівым гаспадыні дома, якая ў чарговы раз даказвае, што тут бываюць толькі знатныя людзі, і гэтыя словы магічна паўплывалі на абстаноўку. Граф скінуў маску халоднай цырыманіяльнасці і прывітаў студэнта.

— Вельмі прыемна пазнаёміцца з вамі, пане, — сказаў ён.

Нават граф Максім дэ Трай хоць і неспакойна зірнуў на Эжэна, але ўжо без нахабства, нібы чараўнік сваім кіёчкам дакрануўся да кожнага з удзельнікаў гэтай сцэны. У галаве Эжэна адкрыліся ўсе трыццаць закутачкаў з назапашаным досціпам. Нібы святло раптоўна ўспых-

нула перад юнаком з Поўдня, асвяціўшы атмасферу парыжскага вышэйшага свету, дагэтуль няясную. Дом Ваке, бацька Гар'ё засталіся недзе далёка-далёка.

— А я лічыў, што род Марсіякаў згас, — звярнуўся да Эжэна граф дэ Рэсто.

— Так, пане, — адказаў Расціньяк. — Мой стрыечны дзядуля, шэвалье дэ Расціньяк, пабраўся шлюбам з апошняй прадстаўніцай сям'і дэ Марсіякаў. У іх нарадзілася адзіная дачка, якая выйшла замуж за маршала дэ Кларэмба, продка мадам дэ Басэан па мацярынскай лініі. Мы з'яўляемся малодшым адгалінаваннем, бяднейшым, тым больш што мой стрыечны дзед, віцэ-адмірал, страціў усё на каралеўскай службе. Рэвалюцыйны ўрад, ліквідуючы Ост-Індскую кампанію, адмовіўся прызнаць яе даўгавыя абавязкі да нас.

— Ці не камандаваў ваш стрыечны дзед караблём «Ванжэр» да 1789 года?

— Менавіта.

— У такім выпадку ён ведаў майго дзеда, які камандаваў «Варвікам».

Максім глянуў на мадам дэ Рэсто і лёгенька паціснуў плячыма, быццам жадаючы сказаць: «Калі яны возьмуцца гутарыць пра флот, мы прапалі». Анастазі зразумела погляд месье дэ Трая і, усміхнуўшыся, з пачуццём жаночай усемагутнасці сказала:

— Пойдзем, Максіме, у мяне ёсць да вас пытанне. Спадарства, мы не будзем замінаць вам разам плаваць на «Варвіку» ды «Ванжэры».

Яна ўсхапілася з той жа вясёлай хітраватай усмешкай, падала Максіму знак, і яны ўдвух памкнуліся да будуара. Як толькі гэтая *марганатычная* (цудоўны нямецкі выраз, якому няма аналага ў французскай мове) пара дайшла да дзвярэй, граф перапыніў сваю размову з Эжэнам.

— Анастазі, дарагая, застаньцеся, вы добра ведаеце... — незадаволена пачаў ён.

— Хвілінку, хвілінку, — не даслухала яна мужа, — мне трэба даць Максіму адно даручэнне.

Неўзабаве яны вярнуліся. Як і ўсе жанчыны, вымушаныя падладжвацца пад характар мужа, каб мець магчымасць паводзіць сябе як заўгодна, графіня ведала межы, якія нельга пераходзіць, каб не згубіць такога неабходнага даверу і пазбегнуць разладу з-за дробязей; яна добра зразумела па адценнях голасу графа, што бяспека не гарантаваная, калі яна застанецца ў будуары. І ўся гэтая

няёмкасць узнікла з-за Эжэна. З прыкрасцю знакам паказала яна Максіму на студэнта, і ён даволі кпліва заўважыў:

— У вас тут сур'ёзныя справы, не буду вам перашкаджаць, бывайце. — І ён пайшоў.

— Заставайцеся, Максім! — крыкнуў граф дэ Траю.

— Прыходзьце на вячэру, — сказала графіня, зноў пакідаючы мужа і Эжэна, каб правесці Максіма ў першую гасцёўню, дзе яны размаўлялі яшчэ досыць доўга ў спадзяванні, што месье дэ Рэсто выправадзіць Эжэна.

Расціньяк чуў, як яны смяяліся, гутарылі, змаўкалі, але хітрун-студэнт вырашыў пахваліцца дасціпнасцю перад графам дэ Рэсто, спадабацца яму, выклікаў на спрэчкі, спадзеючыся зноў пабачыцца з графіняю і даведацца пра яе дачыненні да бацькі Гар'ё. Жанчына, відавочна закаханая ў Максіма, жанчына, якая папіхала ўласнага мужа і мела тайныя стасункі са старым вермішэльшчыкам, здавалася яму таямніцаю. Яму карцела разблытаць гэтую таямніцу і такім чынам дасягнуць улады над ёю, парыжанкаю з ног да галавы.

— Анастазі! — зноў паклікаў жонку граф.

— Ну, няшчасны мой Максіме, трэба змірыцца. Да вечара...

— Я спадзяюся, Назі, — шапнуў ён на вуха ў адказ, — што вы болей не пусціце да сябе гэтага малойчыка; яго вочы гарэлі нібы вугалі, калі прыадкрываўся ваш пеньюар. Ён прызнаецца вам у каханні, скампраметуе вас і прымусіць мяне забіць яго.

— Вы звар'яцелі, Максім! Наадварот, такія студэнты могуць паслужыць добрымі громаадводамі. Будзьце пэўным, я пастараюся, каб графу дэ Рэсто ён прыйшоўся недаспадобы.

Максім зарагатаў і выйшаў у суправаджэнні графіні, якая праз акно сачыла за тым, як ён сядае ў экіпаж, разгравае каня і памахвае бізуном. Яна вярнулася толькі пасля таго, як галоўная брама зачынілася.

— Вы чулі, дарагая, — усклікнуў граф, калі жонка вярнулася, — маёнтак сям'і месье дэ Расціньяка знаходзіцца непадалёку ад Вертэй, на рацэ Шарант. Стрыечны дзед месье і мой дзед былі знаёмы.

— Прыемна, што ў нас ёсць агульныя знаёмыя, — няўважліва зазначыла графіня.

— І іх больш, чым вы мяркуеце, — панізіўшы голас, заявіў Эжэн.

— Як гэта? — пацікавілася яна.

— Надоечы я бачыў, як ад вас выходзіў адзін спадар, з якім я жыву дзверы ў дзверы ў пансіёне, яго завуць бацькам Гар'ё.

Пачуўшы гэтае імя ў суправаджэнні слова «бацька», граф шпурнуў абцугі, якімі варушыў жар, у камін, нібы яны апяклі яму далоні, і ўстаў.

— Пане, вы маглі б назваць яго і месье Гар'ё, — усклікнуў ён.

Графіня, заўважыўшы, як узлаваўся яе муж, спачатку збялела, пасля пачырванела, відавочна, збянтэжылася, але ўмела хавала свой стан, бо, адказваючы, яна імкнулася надаць голасу як мага больш натуральнасці, а выгляду — абыякавасці.

— На ўсім свеце не знойдзеш чалавека, якога б мы любілі болей...

Не скончыўшы фразы, яна зірнула на фартэп'яна, нібы інструмент абудзіў у ёй нейкую думку, і спытала:

— Вы любіце музыку, месье дэ Расціньяк?

— Вельмі, — адказаў Эжэн, пачырванеўшы і разгубіўшыся ад таго, што ўчыніў страшэнную дурасць.

— Вы спяваеце? — для прыліку зацікавілася яна, кіруючыся да фартэп'яна і, моцна націскаючы на клавішы, прабегла іх ад ніжняга *до* да верхняга *фа*... Рррра!

— Не, мадам.

Граф дэ Рэсто хадзіў па пакоі туды-сюды.

— Шкада, вы пазбаўлены вялікай дапамогі на шляху да поспеху. Ca-ro, ca-a-a-ro, ca-a-a-aro, non dubitare[1]... — праспявала графіня.

Вымавіўшы імя бацькі Гар'ё, Эжэн другі раз узмахнуў чароўным кіечкам, але з вынікам, адваротным таму, што зрабілі словы «сваяк вікантэсы дэ Басэан». Ён апынуўся ў становішчы чалавека, што, займеўшы гонар наведаць аматара рэдкіх каштоўнасцей, незнарок кранае шафу, поўную статуэтак, з-за чаго ў трох ці чатырох з іх падаюць дрэнна прымацаваныя галовы. Ён гатовы быў пад зямлю праваліцца.

Твар графіні дэ Рэсто заставаўся сухім і халодным, а вочы — цяпер абыякавыя, пазбягалі сустрэч з вачыма студэнта.

— Мадам, вам трэба пагаварыць з месье дэ Рэсто, прашу быць пэўнаю ў шчырай пашане і дазволіць...

---

[1] *Caro, non dubitare* — дарагі, не сумнявайся *(італ.)*.

— Калі б вы не прыходзілі, — паспешліва загаварыла графіня, спыніўшы Эжэна жэстам, — не сумнявайцеся, што даставіце і мне, і майму мужу вялізнае задавальненне.

Эжэн нізка пакланіўся мужу і жонцы і выйшаў у суправаджэнні месье дэ Рэсто, які, нягледзячы на просьбы маладога чалавека не рабіць гэтага, давёў яго ажно да прыхожай.

— Калі б не прыходзіў спадар дэ Расціньяк, — сказаў граф Марысу, — ні мяне, ні графіні дома няма.

Выйшаўшы на ганак, Эжэн убачыў, што ідзе дождж.

«Ну вось, — падумаў ён, — мала таго, што я зрабіў нейкую прамашку, прычыну і важнасць якой і сам не разумею, дык яшчэ сапсую фрак і капялюш. Трэба было сядзець у сваім куточку, зубрыць права і марыць толькі аб тым, каб стаць старанным суддзёй. Ці мне бываць у свеце! Каб адчуваць сябе адпаведна, для гэтага трэба мець процьму ўсялякіх рэчаў: кабрыялетаў, бліскучых ботаў, абавязковых дробязей накшталт залатых ланцужкоў, белых замшавых пальчатак з раніцы па шэсць франкаў пара, лайкавых, абавязкова жоўтых, увечары. Эх, стары дзівак бацька Гар'ё!»

Калі ён апынуўся пад брамаю, рамізнік наёмнага экіпажа, які толькі што вазіў маладых пасля вянчання і не адмовіўся б падзарабіць употай ад гаспадара, зрабіў Эжэну знак, запрашаючы гэтага маладога чалавека ў чорным фраку, белай камізэльцы, жоўтых пальчатках, чыстых ботах, але без парасона да сябе. Эжэна апанавала глухое шаленства, якое звычайна прымушае юнака ўсё глыбей і глыбей апускацца ў тую бездань, куды ён трапіў, нібы спадзеючыся знайсці там шчаслівае выйсце. Кіўком галавы ён згадзіўся з прапановаю рамізніка і сеў у экіпаж, дзе некалькі кветачак флёрдаранжу і абрыўкі каніцелі напаміналі пра маладых.

— Куды загадаеце? — спытаў рамізнік, які паспеў ужо зняць белыя пальчаткі.

«А, калі гінуць, дык з толкам», — вырашыў Эжэн.

— Едзь да дэ Басэанаў! — сказаў ён.

— Да каторых?

Далікатнае пытанне збіла Эжэна з панталыку. Гэты яшчэ зялёны фарсун не ведаў, што ў Парыжы два асабнякі Басэанаў, ён нават не падазраваў, колькі ў яго тут радні, якая і ведаць не ведала пра яго.

— Віконт дэ Басэан, вуліца...

— Грэнэль, — падхапіў рамізнік, ківаючы галавой. — А то, ведаеце, ёсць другі асабняк, там жывуць граф і маркіза дэ Басэан, на вуліцы Сен-Дамінік, — дадаў ён, паднімаючы падножку.

— Я гэта ведаю, — суха адказаў Эжэн.

«Усе сёння кпяць з мяне, — падумаў ён, шпурляючы капялюш на пярэдняе сядзенне. — А сённяшні мой выбрык абыдзецца мне дорага. Але затое, прынамсі, візіт да так званай кузіны адбудзецца ў надзвычай арыстакратычнай манеры. Стары ліхадзей Гар'ё мне ўжо каштуе сама мала дзесяць франкаў. Далібог, раскажу пра свае прыгоды мадам дэ Басэан, можа, яна хоць пасмяецца. Безумоўна, ёй вядома таямніца злачынных стасункаў між старым бясхвостым пацуком і прыгажуняй графіняй. Лепш спадабацца кузіне, чым разбіваць сабе лоб аб гэтую распусную жанчыну; да таго ж, падобна, што каштуе яна добрых грошай. Калі такую магутную сілу мае імя прыгожай вікантэсы, то якую вагу мусіць мець яна сама? Рызыкнём у вышэйшых сферах. Калі атакуеш кагосьці на небе, трэба браць на прыцэл самога Бога!»

Гэтыя развагі коратка перадаюць змест тысячы і адной думкі, якія мітусіліся ў яго галаве. Гледзячы на дождж, ён крыху супакоіўся і адчуў сябе болей упэўнена. Ён вырашыў, што калі і патраціць дзве апошнія манеты па сто су, затое цалюткімі застануцца фрак, боты і капялюш. А калі ён пачуў, як рамізнік крычыць: «Адчыніце браму, калі ласка!» — ён наогул не ўтрымаўся ад радасці. Чырвоны з золатам швейцар піхнуў браму, завесы зарыпелі, і Расціньяк з асалодаю праехаў на экіпажы весніцы, двор і спыніўся пад дашкам ганка. Рамізнік у гаматным сінім балахоне, аблямаваным чырвонай бейкай, спусціўся, каб адкінуць падножку. Выходзячы з карэты, Эжэн пачуў прыглушаны смех за калонамі асабняка. Тры ці чатыры лёкаі ўжо жартавалі над мяшчанскім вясельным экіпажам. Іх смех зразумеў студэнт толькі тады, калі ён параўнаў рыдван, на якім прыехаў, з самым шыкоўным двухмесным экіпажам Парыжа: пара лётных коней з ружамі на вушах у запрэжцы грызлі цуглі; фурман, напудраны, у цудоўным гальштуку, нацягваў лейцы, нібы коні хацелі вырвацца. На Шасэ-д'Антэн, у дварыі мадам дэ Рэсто, стаяў прыгожы кабрыялет дваццаціпшасцігадовага маладога чалавека; у прадмесці Сен-Жэрмен нейкага яснавяльможнага пана чакаў цудоўны экіпаж, які нават за трыццаць тысяч франкаў не купіш.

«Хто ж гэта прыехаў? — думаў Эжэн, з некаторым спазненнем усведамляючы, што ў Парыжы няшмат незанятых жанчын, і што заваёва адной з гэтых каралеў будзе каштаваць не толькі крыві. — Халера, напэўна, і мая кузіна мае свайго Максіма».

З трымценнем у сэрцы ўздымаўся ён на ганак. Толькі падышоў, адчыніліся шкляныя дзверы; лёкаі выглядалі сур'ёзна, як аслы, калі іх чысціць гаспадар. Баль, на якім ён прысутнічаў, адбываўся ў вялікіх прыёмных апартаментах, што знаходзіліся на першым паверсе палаца дэ Басэанаў. Студэнт не паспеў нанесці візіт кузіне між запрашэннем і балем, такім чынам, ён трапіў у пакоі мадам дэ Басэан упершыню; упершыню ён змог пабачыць і цуды той асабістай элегантнасці, што сведчыць аб душы і звычках знатнай жанчыны. Знаёмства з ёй абяцала быць тым цікавейшым для Эжэна, што юнаку было з чым параўноўваць: ён толькі што пакінуў гасцёўню графіні дэ Рэсто.

А палове пятай вікантэса прымала. З'явіся кузен пяццю хвілінамі раней, яго б не прынялі. Эжэна, які не ведаў анічога пра парыжскі этыкет, правялі белымі парадным шырокімі ўсходамі з пазалачонымі парэнчамі, застаўленымі кветкамі паўсюль, засланымі чырвоным дываном... Эжэн ішоў да мадам дэ Басэан, а сам не ведаў нічога з яе біяграфіі, адной з тых аповесцей, што, мяняючыся, кожны вечар перадаюцца на вушка адзін аднаму ў салонах Парыжа.

Вось ужо тры гады вікантэса мела сувязь з адным з самых слынных і багатых партугальскіх вяльможаў, маркізам д'Ажуда-Пінта. Іх сувязь належала да ліку тых беззаганных, у якіх крыецца столькі асалоды для дваіх, што трэцяму побач проста няма месца. Воляй-няволяй віконт дэ Басэан сам даў прыклад усёй грамадзе, заплюшчыўшы вочы на гэты марганатычны саюз. На першым часе гэтага сяброўства госці, якія прыязджалі да дэ Басэанаў а другой гадзіне дня, знаходзілі там таксама маркіза д'Ажуда-Пінта. Зачыніць дзверы перад імі мадам дэ Басэан, вядома ж, не магла, гэта было б непрыстойна, затое яна прымала сваіх гасцей вельмі холадна і так старанна разглядала карніз пад столлю, што кожнаму было ясна, наколькі ён замінае. Калі ў Парыжы даведаліся, што наведванні з другой да чацвёртай гадзіны мадам дэ Басэан не падыходзяць, яна засталася ў поўнай адзіноце. Разам з месье дэ Басэанам і маркізам д'Ажуда-

Пінта яна ездзіла ў Оперу ці да Буфонаў, але месье дэ Басэан умеў сябе паводзіць і, пасадзіўшы ў крэслы, кідаў жонку з партугальцам адных. Цяпер месье д'Ажуда-Пінта збіраўся ажаніцца з нейкай мадэмуазель дэ Рошфід. Ва ўсім вышэйшым свеце пра гэты шлюб не ведала адна мадам дэ Басэан. Калі некаторыя сяброўкі смутна намякалі, яна толькі смяялася, вырашыўшы, што сваёй зайздрасцю яны хочуць пахіснуць чужое шчасце. Між тым вось-вось павінны былі надрукаваць абвестку. Хаця прыгожы партугалец прыехаў, каб паведаміць вікантэсе пра маючае адбыцца вяселле, ён ніяк не асмельваўся вымавіць жорсткія словы здрады. Чаму так? Няма на свеце нічога цяжэйшага, чым абвяшчаць жанчыне нешта падобнае на прысуд. Некаторым мужчынам ямчэй стаяць у паядынку перад другім мужчынам са шпагаю, чым перад кабетаю, якая пасля двух гадзін плаксівых нараканняў робіць выгляд, што памірае, і патрабуе, каб прынеслі нюхальнай солі. Такім чынам, у той час, калі прыехаў Эжэн, месье д'Ажуда-Пінта сядзеў як на іголках, збіраючыся пайсці, апраўдваючыся ў душы тым, што мадам дэ Басэан і так даведаецца, а лепш за ўсё паслаць ёй ліст: ямчэй нанесці такі ўдар у пісьмовай форме, чым жывым голасам. Калі лёкай вікантэсы аб'явіў пра месье Эжэна дэ Расціньяка, маркіз д'Ажуда-Пінта аж затрымцеў ад радасці. Трэба адзначыць, што закаханая жанчына ўмее стварaць падазрэнні лепш, чым уцехі, кожны раз удасканальваючы іх. А калі яе збіраюцца пакінуць, яна здагадваецца пра сэнс нейкага жэста хутчэй, чым конь, апісаны Вергіліем, дачуваецца да далёкага паху, які любоўна зазывае яго. Таму будзьце пэўнымі, што мадам дэ Басэан заўважыла міжвольнае, але страшнае сваёй непасрэднасцю трымценне. Эжэн не ведаў, што ў Парыжы не ходзяць у госці, не выслухаўшы перш з вуснаў сяброў дома гісторыі жыцця мужа, жонкі, нават дзяцей, бо інакш можна даць маху альбо трапіць у становішча, пра якое ў Польшчы трапна гавораць «Запрагай пяць валоў у калёсы!» для таго, зразумела, каб выцягнуць вас з тае калюжыны, дзе вы загрузлі. Калі ў французскай мове такім размовам неўпапад яшчэ не падабралі назвы, дык толькі таму, што яны лічацца немагчымымі ў краіне, дзе кожная плётка маланкаю разлятаецца па горадзе. Толькі Эжэн пасля калюжыны ў доме мадам дэ Рэсто, калі яму нават не далі часу «запрэгчы ў яго калёсы пяць валоў», мог зноў апынуцца ў стане паганятага валоў, прыехаўшы

да мадам дэ Басэан. Але, страшэнна нашкодзіўшы графіні дэ Рэсто і месье дэ Траю, цяпер ён ратаваў з нявыкруткі маркіза д'Ажуда-Пінта.

— Бывайце, — сказаў партугалец, спяшаючыся да дзвярэй у той момант, калі Эжэн уваходзіў у невялічкую, шыкоўную, з густам мэбляваную, шэрую з ружовым гасцёўню, дзе раскоша была проста прыгажосцю.

— Але да вечара? — спытала мадам дэ Басэан, павярнуўшы галаву і ўглядаючыся ў твар маркіза. — Хіба вы не паедзеце да Буфонаў разам з намі?

— Я не змагу, — сказаў ён, трымаючыся за ручку дзвярэй.

Мадам дэ Басэан узнялася, паклікала маркіза да сябе, не звяртаючы аніякае ўвагі на Эжэна, які стаяў збянтэжаны бляскам дзівоснага багацця, пачынаючы верыць у сапраўднасць арабскіх казак; ён не ведаў, куды схавацца, саромеючыся жанчыны, што яго не заўважала. Вікантэса ўзняла ўказальны палец правай рукі і прыгожым жэстам паказала маркізу на месца перад сабою. У гэтым руху змяшчалася столькі палкага дэспатызму кахання, што маркіз адпусціў дзверы і вярнуўся. Эжэн з зайздрасцю сачыў за ім, думаючы: «Вось ён, уладар карэткі! Дык няўжо дзеля таго, каб завалодаць позіркам парыжанкі, трэба мець лётных коней, ліўрэі і залатыя рэкі?» Дэман раскошы пальнуў яму ў сэрца, ліхаманка нажывы ахапіла яго, прагаю золата засмягла горла. На тры месяцы ён атрымліваў сто трыццаць франкаў. Бацька, маці, браты, сёстры і цётка абмяжоўваліся ўсе разам дзвюма сотнямі франкаў у месяц. Вокамгненнае параўнанне сённяшняй сітуацыі і мэты, якой ён хацеў дасягнуць, яшчэ болей павялічыла разгубленасць.

— Чаму ж вы не зможаце прыехаць да італьянцаў сёння? — смеючыся, запыталася вікантэса ў партугальца.

— Справы! Я вячэраю ў англійскага пасла.

— Кіньце справы.

Калі чалавек зманіў раз, пасля ён непазбежна мусіць грувасціць хлусню на хлусню. Таму месье д'Ажуда, усміхнуўшыся, сказаў:

— Вы патрабуеце?

— Так, безумоўна.

— Вось гэта я і хацеў пачуць, — адказаў ён, кідаючы адзін з тых пяшчотных позіркаў, якія супакоілі б любую іншую жанчыну.

Ён пацалаваў вікантэсе руку і пайшоў.

Эжэн прыгладзіў рукою валасы і сагнуўся ў паклоне, мяркуючы, што цяпер мадам дэ Басэан успомніць пра яго. Яна ж раптам зрываецца з месца, імчыцца ў галерэю, падбягае да акна і назірае за тым, як месье д'Ажуда сядае ў экіпаж, прыслухоўваецца да загаду і чуе, як выязны лёкай паўтарае фурману:

— Да месье дэ Рошфіда.

Гэтыя словы і хуткасць, з якою месье д'Ажуда нырнуў у карэту, палыхнулі маланкаю, перуном ударылі жанчыну. Смяротны жах зноў завалодаў ёю. Вось так здараюцца страшэнныя катастрофы ў вышэйшым свеце. Вікантэса пайшла ў спальню, села за столік, узяла прыгожую паперу і напісала:

«Паколькі вы вячэраеце ў Рошфідаў, а не ў ангельскай амбасадзе, майце гонар усё растлумачыць. Я чакаю».

Яна паправіла колькі літар, скажоных сутаргавым дрыжаннем рукі, паставіла ўнізе «К», што павінна было азначаць «Клара Бургундская», і пазваніла.

— Жак, — загадала яна лёкаю, які з'явіўся амаль у той жа момант, — а палове восьмай вы выправіцеся да месье дэ Рошфіда і спытаеце, ці там маркіз д'Ажуда. Калі маркіз будзе там, папрасіце перадаць яму гэтую запіску, адказу чакаць не трэба. Калі ж месье д'Ажуда там не будзе, вяртайцеся і вязіце ліст мне назад.

— У гасцёўні спадарыню вікантэсу чакае госць.

— Ах, сапраўды, — сказала яна, адчыняючы дзверы.

Эжэну было дужа няёмка; але нарэшце з'явілася вікантэса, і першая ж вымаўленая ёю фраза закранула юнацкае сэрца шчырым хваляваннем у голасе:

— Прабачце, калі ласка, мне трэба было напісаць два словы; цяпер я ў вашым распараджэнні.

Яна сама не ведала, што гаворыць, адна думка стаяла ў яе галаве: «Ах, ён хоча ажаніцца з мадэмуазель дэ Рошфід! Але хіба ён вольны? Сёння ж увечары гэты шлюб будзе скасаваны, ці я... Так, заўтра пра гэта нават намёку не будзе».

— Кузіна, — азваўся Эжэн.

— Што? — перапытала вікантэса, пазіраючы на студэнта так няветліва, што ён пахаладзеў.

Эжэн зразумеў гэтае «што?». За тры гадзіны ён крыху паразумнеў і таму трымаўся больш упэўнена.

— Спадарыня... — пачаў ён, чырванеючы, павагаўся хвіліну, пасля дадаў: — Даруйце мне, мне так патрэбна

апекаванне, што нават невялічкая сваяцкая дапамога не зашкодзіла б.

Мадам дэ Басэан сумна ўсміхнулася; на яе даляглядзе ўжо чуўся грукат навальніцы.

— Каб вы ведалі, у якім становішчы апынулася мая сям'я, — працягваў ён, — вы не адмовіліся б ад ролі добрай феі, якая лёгка здымае ўсе перашкоды на шляху сваіх хроснікаў.

— Ну, добра, кузен, чым жа я магу вам дапамагчы?

— Хто яго ведае? Нават простая далучанасць да вас тоненькаю нітачкаю сваяцтва — і то шчасце. Вы мяне збянтэжылі, і я ўжо не помню, што збіраўся сказаць вам. Вы — адзіны чалавек у Парыжы, з якім я знаёмы. Ах, як мне хацелася б параіцца з вамі, прасіць вас прыкрыць мяне, няшчаснае дзіця, якое рада было б схавацца пад вашым крылом і нават памерці за вас.

— А чалавека вы забілі б дзеля мяне?

— Хоць двух.

— Так, вы сапраўды яшчэ дзіця, — сказала яна, стрымліваючы слёзы. — Вось вы, напэўна, маглі б кахаць шчыра.

— О, так! — уздыхнуў ён, ківаючы.

За годны адказ вікантэса сапраўды праніклася спагадай да студэнта. Сын поўдня ўпершыню дзейнічаў па разліку. За той час, што ён знаходзіўся між блакітным будуарам графіні дэ Рэсто і ружоваю гасцёўняю мадам дэ Басэан, студэнт прайшоў трохгадовы курс парыжскага права, пра якое ўслых не гавораць, але вышэй якога грамадскае юрыспрудэнцыі няма; той, хто добра засвоіць гэтую навуку і будзе ўмела ўжываць яе на практыцы, даб'ецца ў жыцці ўсяго.

— Ага, успомніў! На вашым балі мне спадабалася мадам дэ Рэсто, і сёння раніцай я адпраўлюся да яе.

— Напэўна, вы перашкодзілі ёй, — з усмешкаю заўважыла мадам дэ Басэан.

— Я невук, і я магу настроіць супраць сябе ўсіх, калі вы мне не дапаможаце. Я думаю, што ў Парыжы цяжка знайсці маладую, прыгожую, багатую, элегантную жанчыну, сэрца якой нікім не занята, а мне яна так патрэбна, каб навучыла мяне таму, у чым вы, жанчыны, умееце лепш разабрацца: жыццю. Мне здаецца, што заўсёды перада мной будзе ўзнікаць новы Максім дэ Трай. Вось я і прыйшоў да вас з просьбай памагчы вырашыць маю

загадку і растлумачыць, што за прамашку я зрабіў. Я завёў размову пра нейкага бацьку...

— Пані герцагіня дэ Ланжэ, — сказаў Жак, перапыняючы студэнта. Прыкрае нездавальненне адбілася на твары Эжэна.

— Калі вы хочаце дасягнуць поспеху, — прашаптала яму вікантэса, — перш за ўсё не будзьце такім непасрэдным... Добры дзень, даражэнькая. — Яна пайшла насустрач герцагіні і паціснула ёй рукі так сардэчна, нібы вітала сваю сястру; герцагіня таксама адказала ёй самай ветлівай пяшчотай.

«Відаць, яны сапраўдныя сяброўкі, — падумаў Расціньяк. — Такім чынам, з сённяшняга дня пачынаючы, у мяне будуць дзве апякункі; іх густы павінны сыходзіцца, таму герцагіня проста не можа не зацікавіцца мною».

— Якой шчаслівай думцы абавязана я тым, што вы прыехалі, мілая Антуанета? — спытала мадам дэ Басэан.

— Проста я бачыла, як маркіз д'Ажуда ўваходзіў да месье дэ Рошфіда, і вырашыла, што застану вас адну.

Мадам дэ Басэан нават і вокам не павяла, не пачырванела, не змянілася з выгляду, не нахмурыла лба, пачуўшы фатальныя словы герцагіні.

— Калі б я ведала, што вы не адна... — дадала герцагіня, павярнуўшыся да Эжэна.

— Гэта мой кузен, спадар Эжэн дэ Расціньяк, — сказала мадам дэ Басэан. — А ў вас ёсць звесткі пра генерала дэ Манрыво? Серызі казала мне ўчора, што ён некуды знік. Ён быў у вас сёння? — спытала яна.

Вікантэса пацэліла стралу проста ў сэрца герцагіні; мадам дэ Ланжэ была без памяці ад месье дэ Манрыво, але хадзілі чуткі, што ён яе пакінуў.

— Учора ён быў у Елісейскім палацы, — адказала тая, пачырванеўшы.

— На дзяжурстве?

— Клара, вы, напэўна, ведаеце, — перахапіла ініцыятыву герцагіня, і ў яе вачах занялося полымя злараднасці, — што заўтра будзе надрукавана абвестка аб шлюбе месье д'Ажуда-Пінта і мадэмуазель дэ Рошфід?

Удар быў занадта жорсткім. Вікантэса збялела, але адказала смеючыся:

— Такімі чуткамі толькі дурні цешацца. Чаму месье д'Ажуда будзе дарыць Рошфідам адно з лепшых імён Партугаліі? Рошфіды сталі магнатамі зусім нядаўна.

— Але кажуць, што ў Берты будзе дзвесце тысяч ліўраў даходу.

— Месье д'Ажуда занадта багаты, каб кіравацца такімі разлікамі.

— Але, даражэнькая, мадэмуазель дэ Рошфід вельмі прыгожая дзяўчына.

— Вось як!

— Адным словам, ён вячэрае сёння ў Рошфідаў, шлюбны кантракт ужо заключаны. Мяне здзіўляе ваша недасведчанасць.

— Ну дык якую ж прамашку вы зрабілі, шаноўны пане? — спытала мадам дэ Басэан у Эжэна. — Беднае дзіця зусім нядаўна трапіла ў парыжскі свет, яно яшчэ нічога не разумее ў нашай гаворцы, дарагая Антуанета. Злітуйцеся над ім, давайце адкладзем нашу гутарку на заўтра. Заўтра, напэўна, усё будзе абвешчана афіцыйна, тады і вы зможаце паведамляць усім, абапіраючыся на факты.

Герцагіня акінула Эжэна такім пагардлівым позіркам, якім мераюць чалавека з ног да галавы, прыгінаюць яго да зямлі і ператвараюць у поўны нуль.

— Сам таго не ведаючы, я параніў кінжалам сэрца мадам дэ Рэсто. Мая правінка ў маім няведанні, — сказаў студэнт, які, дзякуючы сваёй кемлівасці, адразу зразумеў, куды былі скіраваны ўдары, якія хаваліся пад прачулымі словамі абедзвюх кабет. — Звычайна людзі працягваюць сустракацца з тымі, хто робіць балюча знарок, хоць, магчыма, і пабойваюцца іх, але калі чалавек параніць другога, нічога не ведаючы пра гэта, такога лічаць дурнем і разявакаю, не здольным атрымаць ніякай карысці, і пагарджаюць ім.

Мадам дэ Басэан падзякавала студэнту цёплым позіркам, уклаўшы ў яго адначасова і пачуццё сваёй годнасці, як гэта ўмеюць рабіць людзі велікадушныя. Позірк гэты быў бальзамам на свежую рану, нанесеную сэрцу студэнта герцагіняю яе вокам прысяжнага ацэншчыка.

— Уявіце сабе, — сказаў Эжэн, — я патрапіў заваяваць прыхільнасць графа дэ Рэсто, — звярнуўся ён да герцагіні пакорліва, але не без хітрасці, — хоць мушу прызнацца вам, мадам, што я пакуль толькі студэнт, самотны, бедны...

— Не кажыце так, месье дэ Расціньяк. Мы, жанчыны, зусім не прагнем таго, ад чаго адмаўляюцца іншыя...

— Што зробіш! — усклікнуў Эжэн. — Мне толькі дваццаць два гады, трэба ўмець трываць беды такога ўзросту. Зрэшты, раз ужо я пачаў спавядацца, хачу заўважыць, што, мусіць, на ўсім свеце не знойдзеш спавядальні прыгажэйшай за гэтую. У такіх спавядальнях робіш адны грахі, а каешся за другія.

Герцагіня холадна выслухала ўсю гэту балбатню, асудзіла кепскі густ Расціньяка і сказала вікантэсе:

— Кузен ваш зусім яшчэ навічок...

Мадам дэ Басэан шчыра рассмяялася і з кузена, і з герцагіні.

— Так, ён сапраўды навічок, даражэнькая, і шукае настаўніцу, каб навучыла яго добраму густу.

— Спадарыня герцагіня, — зноў звярнуўся да яе Эжэн, — мне здаецца, што жаданне прычыніцца да сакрэтаў таго, што нас ачароўвае, цалкам натуральнае?

Пры гэтым ён падумаў, што для размовы з дамамі знаходзіць фразы, годныя любога цырульніка.

— Але мадам дэ Рэсто, на маю думку, сама вучыцца ў месье дэ Трая, — заўважыла герцагіня.

— Я пра гэта нічога не ведаў, пані, і таму так бязглузда ўварваўся ў іх жыццё. З мужам я паладзіў і бачыў, што пакуль яшчэ не быў у цяжар і яго жонцы, калі мяне пацягнула за язык сказаць, што ведаю чалавека, які на хвіліну раней выйшаў кухоннымі ўсходамі, пацалаваўшы перад гэтым графіню ў калідоры.

— Хто ж гэта? — спыталі абедзве жанчыны.

— Адзін стары, ён жыве за два луідоры ў месяц у глыбіні прадмесця Сен-Марсо, там, дзе жыву і я, бедны студэнт. Стары — напраўду няшчасны чалавек, з яго ўсе кпяць; мы празвалі яго «бацька Гар'ё».

— О, вы і сапраўды яшчэ дзіця, — усклікнула вікантэса. — Мадам дэ Рэсто ў паненках была мадэмуазель Гар'ё.

— Дачка вермішэльшчыка, — падхапіла герцагіня, — мяшчаначка, каралю яе прадставілі ў адзін дзень з дачкою прыдворнага пірожніка. Памятаеце, Клара? Кароль яшчэ рассмяяўся, і неяк нават пажартаваў на латыні наконт мукі. Людзі... як там? Людзі...

— Ejusdem farinae[1], — падказаў Эжэн.

— Так, так, — пацвердзіла герцагіня.

---

[1] *Ejusdem farinae* — літаральна: «З той жа мукі», г. зн. «З аднаго цеста» *(лац.)*.

— Дык ён яе бацька! — жахнуўся студэнт.

— Так, у гэтага дзівака дзве дачкі, і ён душы не чуе ў іх, хаця і адна, і другая амаль выракліся яго.

— Другая дачка — гэта не тая, што выйшла замуж за банкіра з нямецкім прозвішчам, барона дэ Нусінгена? — спытала вікантэса, гледзячы на мадам дэ Ланжэ. — Здаецца, яе завуць Дэльфіна? Гэткая бландзінка, у яе бакавая ложа ў оперы, да Буфонаў прыходзіць таксама, смяецца голасна-голасна, каб прыцягнуць да сябе ўвагу?

Герцагіня ўсміхнулася, гаворачы:

— Дзівуюся я на вас, даражэнькая. Чаму вас так цікавяць усе гэтыя людзі? Трэба было зусім страціць галаву ад кахання, як Рэсто, каб выкачацца ў муцэ мадэмуазель Анастазі. Ой, не скончыцца дабром гэты шлюб! Трапіла графіня ў лапы месье дэ Трая, ён яе і загубіць.

— Дык яны выракліся свайго бацькі? — паўтарыў Эжэн.

— Выходзіць, што так, свайго бацькі, бацькі, які ён ёсць, да таго ж добрага бацькі, які даў кожнай, кажуць, — працягвала вікантэса, — па пяцьсот ці шэсцьсот тысяч франкаў пасагу, каб ашчаслівіць кожную добрым шлюбам, пакінуўшы сабе толькі восем ці дзесяць тысяч ліўраў рэнты. Ён лічыў, што дочкі застануцца яго дочкамі, што ён наладзіць сабе праз іх два жыцці, што ў абодвух дамах яму будуць рады, яго будуць любіць. За два гады зяці выгналі яго са свайго кола, быццам апошняга жабрака...

У вачах Эжэна бліснулі слёзы: зусім нядаўна ён асвяжыў душу чыстымі, светлымі сямейнымі пачуццямі, ён быў яшчэ ў тым узросце, калі вераць у дабрыню, і толькі тут упершыню сутыкнуўся з парыжскаю цывілізацыяй на полі яе бітвы. Шчырыя пачуцці так лёгка перадаюцца ад чалавека да чалавека, што з хвіліну трое суразмоўцаў моўчкі пераглядаліся між сабой.

— Ах, божа мой, — сказала мадам дэ Ланжэ, — так, гэта здаецца жахлівым, між тым падобныя выпадкі адбываюцца штодзённа. І хіба няма гэтаму прычыны? Скажыце, даражэнькая, ці вы калі-небудзь задумваліся над тым, хто такі зяць? Зяць — гэта мужчына, для якога мы з вамі гадуем маленькую цудоўную істоту, звязаную з намі тысяччу сувязей, якая на працягу семнаццаці год з'яўляецца радасцю сям'і, нашай незаплямленай душой, сказаў бы Ламарцін, а пасля становіцца ліхам для сям'і.

Калі мужчына забірае ад нас гэтую істоту, дык ён самаперш карыстаецца яе каханнем, як сякераю, каб высекчы з сэрца, з жывой душы ўсе пачуцці, якія прывязвалі гэтага анёла да сям'і. Учора наша дачка была ўсім для нас, а мы — усім для яе; заўтра яна зробіцца нашым ворагам. Хіба падобныя трагедыі не здараюцца штодзённа? У адным месцы нявестка занадта дзёрзка паводзіць сябе са свёкрам, які ўсё ахвяраваў сыну, у другім месцы зяць выкідае на двор цешчу. Часта даводзілася чуць такое пытанне: што, маўляў, драматычнага ў сённяшнім грамадстве? Але хіба зяць — не драма? Драма, і драма страшэнная. А нашы шлюбы, якія сталі суцэльным глупствам? Я вельмі добра ўяўляю, што здарылася са старым вермішэльшчыкам. Я памятаю, што гэты Фар'ё...

— Гар'ё, мадам.

— Так, гэты Мар'ё падчас рэвалюцыі быў старшынёю аднае з секцый; ён ведаў прычыны таго славутага голаду, і пачаткі яго багацця былі закладзены тады, калі ён перапрадаваў муку ў дзесяць разоў даражэй, чым купляў. Ён зарабіў столькі, колькі захацеў зарабіць. Мукі ў яго было ўволю. Цівун маёй бабулі пастаўляў яму муку на вялізныя сумы. Вядома, што гэты Нар'ё, як вядзецца між такімі людзьмі, дзяліўся з Камітэтам грамадскага выратавання[1]. Помню, як бабулін цівун казаў, што бабуля можа без аніякае рызыкі заставацца ў Гранвілье, бо яе збожжа з'яўляецца лепшым сведчаннем надзейнасці яе жыцця. Дык вось, гэты Лар'ё, што прадаваў збожжа галавасекам, меў і мае адзінае захапленне: кажуць, што ён без памяці любіць дочак. Старэйшую ён аддаў у дом Рэсто, а малодшую прыладзіў да барона дэ Нусінгена, багатага банкіра, які выдае сябе за раяліста. Вы разумееце, што ў часы Імперыі зяцям нават гонар быў прымаць цесця ўзору дзевяноста трэцяга года ў сябе дома: пры *Буанапарце* гэта яшчэ куды ні йшло. Але пасля вяртання Бурбонаў стары пачаў замінаць дэ Рэсто і, асабліва, банкіру. Дочкі, магчыма, яшчэ любілі свайго бацьку, таму і рабілі так, каб і козы былі сытыя, і сена цэлае: яны прымалі Гар'ё, калі нікога больш не было, пад выглядам самых лепшых пачуццяў: «Прыходзьце, тата, нам будзе лепш, бо мы будзем адны» ці нешта падобнае. Асабіста я лічу, што і шчырыя пачуцці маюць свае вочы і розум, і сэрца нябогі, вядома, сцякала крывёю. Ён

[1] Орган дзяржаўнай улады ў Францыі, створаны ў 1793 г.

бачыў, што дочкі саромеюцца яго, і паколькі яны любяць сваіх мужоў, то ён перашкода для зяцёў. Значыцца, трэба было ахвяраваць сабою, і ён ахвяраваў, на тое ён і бацька. Ён сам выракся зяцевых дамоў. Бачачы задавальненне дачок, ён зразумеў, што зрабіў добра. Бацька і дочкі сталі хаўруснікамі ў сямейным злачынстве, і такое мы назіраем паўсюль. Хіба бацька Дар'ё не здаваўся б алейнаю плямаю ў гасцёўнях дачок? Ён бы ўсім замінаў і сам нудзіўся. Тое, што здарылася з гэтым бацькам, можа здарыцца з найпершаю прыгажуняю: яна будзе любіць мужчыну, дакучаць яму сваёй любоўю, ён жа будзе нудзіцца і, каб кінуць яе, гатовы будзе пайсці на подласці. Такі лёс усіх пачуццяў. Наша сэрца — сапраўдны скарб, раскідайце ўсе пачуцці адразу, і вы — жабрак. Мы не даруем чалавеку, які не мае граша за душою, і мы не шкадуем пачуцця, калі яно раскрылася дарэшты. Гэты бацька аддаў усё. Сваю любоў, сваю душу ён аддаваў на працягу дваццаці год, а сваё багацце аддаў за адзін дзень. Выціснуўшы з лімона ўсё, што маглі, дочкі пакінулі рэшткі валяцца на двары.

— Як паскудна наладжаны свет, — сказала вікантэса, скубучы махры сваёй шалі і не ўздымаючы вачэй: апошнія словы мадам дэ Ланжэ прызначаліся ёй і закранулі жывое.

— Паскудна? Не, — працягвала герцагіня, — проста ў свеце ўсё ідзе сваёй чарадой. Гэтымі словамі я хачу паказаць, што не падманваюся ў свеце. А ўвогуле нашы погляды супадаюць, — сказала яна, паціскаючы вікантэсе руку. — Свет — гэта багна, таму давайце будзем старацца трымацца на высокім месцы.

Яна ўстала і, цалуючы ў лоб мадам дэ Басэан, сказала:

— У гэты момант вы — найпрыгажэйшая, дарагая мая. Колер твару яшчэ ніколі не быў такі свежы, як зараз, — яна глянула на Расціньяка, ледзь прыкметна кіўнула яму і пайшла.

— Бацька Гар'ё — цудоўны чалавек! — сказаў Эжэн, згадаўшы, як стары гнуў серабро ўначы.

Мадам дэ Басэан задумалася і не чула ягонай заўвагі. Цішыня цягнулася ўжо некалькі хвілін, і нябога-студэнт у сарамлівай разгубленасці не наважваўся ні пайсці, ні заставацца, ні вымавіць слова.

— Свет злы і благі, — сказала нарэшце вікантэса. — Няхай толькі з табою здарыцца няшчасце, заўжды знойдзецца сябар, гатовы прыйсці і паведаміць табе аб гэтым,

прычым, усадзіўшы кінжал табе ў сэрца, ён прымусіць цябе ж любавацца яго тронкамі. І вось пайшлі ўжо сарказмы, і вось пачаліся кпіны! Ах, не, я сябе абараню!

Яна ўзняла галаву так, як і належыць яснавяльможнай пані яе рангу, і нібы маланкі заззялі ў яе ганарыстым позірку.

— Ой, вы яшчэ тут? — усклікнула яна, заўважыўшы Эжэна.

— Яшчэ тут, — жаласліва адказаў ён.

— Дык вось, месье дэ Расціньяк, чыніце з гэтым светам усё, што ён заслугоўвае. Калі вы хочаце дабіцца поспеху, я вам дапамагу. Спазнайце глыбіню разбэшчанасці жанчын і змерайце шырыню мізэрнае мужчынскае пыхі. Хоць я ўважліва чытала кнігу жыцця ў свеце, усё ж такі некаторыя старонкі яе я прапусціла. Цяпер я ведаю ўсё: чым халаднейшымі будуць вашы разлікі, тым далей вы пойдзеце. Біце бязлітасна, і вас будуць баяцца. Глядзіце на мужчын і жанчын, як на паштовых коней: паганяйце, не шкадуючы, няхай канаюць на кожным прыпынку, і вы дасягнеце мяжы ў ажыццяўленні жаданняў. Запомніце, што вы будзеце нічым, калі ў вас не будзе жанчыны, якая возьме ваш лёс у свае рукі. І вам трэба яе знайсці: маладую, багатую, элегантную. Але, калі вы адчуеце сапраўднае каханне, схавайце яго, як найвялікшы скарб, і не дай божа, калі нехта пра яго здагадаецца — тады вы загінулі. З кіта вы ператворыцеся ў ахвяру. Калі вам здарыцца пакахаць, трымайце гэта ў сакрэце! Не прызнавайцеся, пакуль добра не зведаеце выбранніцу.

Вучыцеся наперад берагчы каханне, якога ў вас яшчэ няма, вучыцеся не давяраць гэтаму свету. Паслухайце, Мігель. (Яна памылілася, нават не заўважыўшы гэтага.) Здараюцца выпадкі, страшнейшыя за той, калі дзве дачкі закінулі бацьку, і, можа, нават яго смерці чакаюць: гэта саперніцтва сяцёр між сабою. Рэсто належыць да ліку магнатаў, яго жонку свет прыняў, не адкінуў, а яе сястра, багатая прыгажуня мадам Дэльфіна дэ Нусінген, жонка фінансавага дзялка, памірае ад засмучэння; яе разбірае зайздрасць, што графіня дэ Рэсто ўзнялася вышэй за яе на сто галоў, сястра ёй болей не сястра, дзве жанчыны адракліся адна ад другой, як абедзве адракліся ад бацькі. Менавіта таму мадам дэ Нусінген выхлебтала б увесь бруд між вуліцаю Сен-Лазар і вуліцаю дэ Грэнель, каб трапіць у маю гасцёўню. Дэльфіна разлічвала, што дэ Марсэ

дапаможа ёй дайсці да запаветнай мэты, і зрабілася рабыняю дэ Марсэ. Але ён на яе глядзець не хоча. Калі Дэльфіну прадставіце мне вы, то станеце яе кумірам, яна будзе маліцца на вас. А пасля, калі зможаце, пакахайце, калі ж не, скарыстайце яе як захочаце. Я прыму яе два ці тры разы падчас вялікіх прыёмаў, у мітусні, але днём я яе прымаць не буду. Буду вітацца з ёю, і гэтага хопіць. Дзверы графіні вы самі сабе зачынілі, згадаўшы імя бацькі Гар'ё. Так, так, даражэнькі мой, хоць дваццаць разоў ідзіце да мадам дэ Рэсто, яе дваццаць разоў не будзе дома. Вас загадалі не прымаць. Дык няхай бацька Гар'ё пазнаёміць вас з Дэльфінай дэ Нусінген. Прыгожая мадам дэ Нусінген стане для вас шыльдаю. Зрабіцеся яе абраннікам, і жанчыны будуць шалець па вас. Яе саперніцам, сяброўкам, нават самым лепшым, будзе карцець пераманіць вас. Шмат жанчын аддаюць перавагу чужому абранніку, так як і некаторыя мяшчанкі носяць капялюшыкі кшталту тых, што носім мы, знатныя дамы, спадзеючыся займець нашы манеры. Поспех прыйдзе да вас. У Парыжы поспех азначае ўсё, гэта ключ да ўлады. Калі жанчыны палічаць вас дасціпным, таленавітым, мужчыны гэтаму павераць, толькі вы іх не расчароўвайце. Тады вы зможаце многага дасягнуць, перад вамі адкрыюцца ўсе дзверы. Тады вы зразумееце, як наладжаны свет, што ў ім адны махляры і разявакі. Не далучайцеся ні да першых, ні да другіх. Я даю вам сваё імя замест ніці Арыядны, і няхай яно ўвядзе вас у гэты лабірынт. Толькі не заплямце яго, — сказала яна, кідаючы на студэнта каралеўскі позірк, — вярніце мне яго чыстым. А цяпер бывайце, пакіньце мяне адну. У нас, у жанчын, таксама бываюць свае бітвы.

— І калі вам спатрэбіцца чалавек, каб узарваць падкоп... — перапыніў Эжэн кузіну.

— Дык што? — спытала вікантэса.

Ён стукнуў сябе па грудзях, усміхнуўся ў адказ на ўсмешку кузіны і выйшаў. Была пятая гадзіна. Эжэну хацелася есці, і ён баяўся, што спозніцца на вячэру. Дзякуючы гэтаму ён зведаў, як прыемна шпарка імчацца па Парыжы. Фізічнае задавальненне не замінала палёту думак. Калі маладога чалавека яго ўзросту абразіць пагардаю, ён пачынае злавацца, больш таго, звярэе, пагражае кулаком усяму грамадству, хоча адпомсціць і сам у сабе сумняваецца. Расціньяка ў гэты момант прыгняталі словы: «Дзверы ў дом графіні вы самі сабе зачынілі».

«А я туды пайду! — вырашыў ён. — І калі мадам дэ Басэан мае рацыю, калі мне адмоўлена ад дома, тады... Мадам дэ Рэсто знойдзе мяне ва ўсіх салонах, якія наведвае. Я навучуся валодаць шпагаю, страляць з пісталета і заб'ю яе Максіма!»

«А грошы, дзе ты возьмеш грошы?» — крычаў яму розум.

У тую ж хвіліну рассыпанае як на паказ багацце графіні дэ Рэсто ўспыхнула ў яго перад вачыма. Ён паспеў заўважыць раскошу, якая, напэўна, так падабалася паненцы Гар'ё: кругом пазалота, дарагія рэчы, адным словам, безгустоўная раскоша чалавека, які нядаўна стаў багатым, марнатраўства ўтрыманкі. Аднак гэтую чароўную мрою раптам сцёр успамін пра грандыёзны палац дэ Басэанаў. Мары Эжэна, прыкаваныя да вышэйшых сфер парыжскага грамадства, цягнулі за сабою тысячы благіх думак, якія пранікалі ў яго сэрца, рассоўваючы межы розуму і сумлення. Свет паўстаў перад ім такім, які ён ёсць, і Эжэн зразумеў, што законы і мараль бяссільныя перад багаццем; ultima ratio mundi[1] ён бачыў толькі ў грошах.

«Ватрэн меў рацыю, багацце — вось дабрадзейнасць», — сказаў сам сабе Эжэн.

Прыехаўшы на вуліцу Нёў-Сент-Жэнеўеў, ён хуценька збегаў наверх і вярнуўся назад, каб аддаць дзесяць франкаў рамізніку, затым падаўся ў мярзотную сталовую, дзе ўжо елі, як быдла ля ясляў, васемнаццаць пансіянераў. Ён не мог стрываць відовішча гэтага пакоя і гэтых нябогаў. Пераход быў занадта рэзкі, кантраст занадта выразны, і, як вынік, яго прагныя імкненні да багацця, славы яшчэ больш узмацніліся. З аднаго боку, свежыя, абаяльныя вобразы з самых прыгожых слаёў грамадства, рухомыя, маладыя твары, акружаныя цудамі мастацтва, рэдкай раскошай, закаханыя, паэтычныя асобы; з другога боку — змрочныя карціны ў абрамленні галечы, твары, на якіх ад слядоў кахання засталіся толькі вяровачкі ды пралады, якімі яно калісьці кіравала. Парады мадам дэ Басэан, падказаныя ёй абурэннем пакінутай жанчыны, яе заманлівыя прапановы ўваскрэслі ў галаве Эжэна, а яго нястача растлумачыла іх па-свойму. Расціньяк вырашыў ісці да багацця двума шляхамі адначасова: абапірацца і на навуку, і на каханне, стаць доктарам юрыдыч-

[1] *Ultima ratio mundi* — першааснова свету *(лац.)*.

ных навук і свецкім чалавекам. Якім дзіцём заставаўся ён па-ранейшаму! Два гэтыя шляхі, нібы асімптатычныя[1] лініі, ніколі не перасякуцца.

— Нешта вы не ў гуморы, спадар маркіз, — сказаў Ватрэн, пазіраючы на студэнта асаблівым, аднаму яму ўласцівым чынам, калі здаецца, што ён пранікае ў самыя патаемныя сакрэты душы.

— Я не маю намеру трываць жарты з боку тых, хто кліча мяне «спадаром маркізам», — адказаў ён. — Каб быць сапраўдным маркізам у Парыжы, трэба мець сто тысяч ліўраў гадавога даходу, а калі чалавек жыве ў «Доме Ваке», дык ён, напэўна, не з'яўляецца пестуном фартуны.

Ватрэн паглядзеў на Расціньяка па-бацькоўску і неяк з пагардаю, нібы кажучы: «Хлапчук, ды я з табой магу расправіцца так, што мокрага месца не застанецца». Потым адказаў:

— Вы не ў гуморы, бо, мусіць, вы не займелі поспеху ў прыгожай графіні дэ Рэсто.

— Мне адмоўлена ад дома, бо я сказаў, што ем за адным сталом з яе бацькам! — усклікнуў Расціньяк.

Усе жыхары пераглянуліся. Бацька Гар'ё апусціў вочы і павярнуўся, каб выцерці іх.

— Вы папалі мне табакаю ў вока, — сказаў ён свайму суседу.

— Хто пакрыўдзіць бацьку Гар'ё, цяпер будзе мець справу са мною, — заявіў Эжэн, гледзячы на суседа былога вермішэльшчыка, — Гар'ё варты большага, чым мы ўсе разам. Дам я на ўвазе не маю, — дадаў ён, павярнуўшыся да мадэмуазель Тайфэр.

Гэтаю фразаю быў пакладзены канец усім размовам, бо Эжэн выказаў яе з такім выглядам, што прымусіў усіх пансіянераў маўчаць. Адзін Ватрэн з'едліва заўважыў:

— Каб браць бацьку Гар'ё пад сваю абарону і абвяшчаць, што вы ягоны адказны рэдактар, трэба добра валодаць шпагаю і метка страляць з пісталета.

— Менавіта так і ёсць, — адказаў Эжэн.

— Такім чынам, з сённяшняга дня вы пачынаеце вайну?

— Магчыма, што і так, — не здаваўся Расціньяк. — Але я не мушу даваць камусьці справаздачу ў сувязі з

---

[1] *Асімптота* — лінія, «якая не супадае» *(грэч.)*. Прамая лінія, якая набліжаецца да бесканечнай крывой, але не перасякаецца з ёю.

тым, што і сам не імкнуся здагадацца, чым іншыя займаюцца па начах.

Ватрэн паглядзеў на Расціньяка скоса.

— Хлопча, той, хто, не хоча аказацца падманутым гульнёю марыянетак, заходзіць у балаган, а не сочыць праз дзіркі ў парусінавых занавесках. Досыць размоў, — спыніў ён Эжэна, які гатовы быў зноў расхадзіцца. — Мы з вамі пагутарым другім разам, калі хочаце.

Вячэралі ў змрочным маўчанні. Бацька Гар'ё, збіты з панталыку першай заўвагай студэнта, не зразумеў, што настрой ва ўсіх змяніўся на яго карысць, што малады чалавек здольны абараніць яго, прымусіць злыя языкі замаўчаць.

— Выходзіць, што спадар Гар'ё — бацька графіні? — шэптам перапытала мадам Ваке.

— І баранэсы таксама, — адказаў Расціньяк.

— Ён толькі бацькам і здольны быць, — сказаў Б'яншон Расціньяку, — я абмацаў яго галаву і знайшоў толькі адну шышку — якраз бацькоўства; быць яму вечным бацькам.

Эжэн быў занадта сур'ёзны ў той вечар, каб рассмяяцца з жарта Б'яншона. Яму карцела скарыстаць парады мадам дэ Басэан, і ён разважаў, дзе і як можна дастаць грошай. Перад яго вачыма прайшлі свецкія абшары, пустынныя і ўрадлівыя адначасова, і ці не ад гэтага відовішча ён зрабіўся трывожна заклапочаным. Адзін за другім пакідалі сталовую пансіянеры пасля вячэры, а Расціньяк усё сядзеў.

— Значыцца, вы бачыліся з маёй дачкой? — усхваляванa спытаў яго Гар'ё.

Адарваны ад роздуму, Эжэн узяў старога за руку і, узіраючыся ў яго з нейкім замілаваннем, сказаў:

— Вы — цудоўны, годны чалавек. Пасля мы пагаворым пра вашых дачок.

І, не жадаючы больш слухаць бацьку Гар'ё, ён узняўся і пайшоў да сябе ў пакой, напісаў маці наступны ліст:

«Дарагая маці, ці не знойдзецца яшчэ што-небудзь у тваіх грудзях, каб падкарміць мяне? У мяне з'явіўся шанц хутка разбагацець. Мне любою цаною патрэбна тысяча франкаў. Бацьку пра маю просьбу нічога не кажы, ён можа запярэчыць, але калі я не атрымаю гэтых грошай, я западу ў роспач, здольную давесці мяне да самагубства. Пры сустрэчы я растлумачу табе сваю задуму, бо каб апісаць становішча, у якім я апынуўся, спа-

трэбіліся б цэлыя тамы. Я не прайграўся, мілая матухна, я нікому нічога не павінны, але, калі табе маё жыццё нечага вартае, табе, каторая мне яго падаравала, паспрабуй знайсці мне гэтыя грошы. Я бываю ў доме вікантэсы дэ Басэан, якая ўзяла мяне пад сваё апякунства. Мне трэба бываць у свеце, а ў мяне няма ні аднаго су на новыя пальчаткі. Я магу харчавацца адным хлебам, піць толькі ваду, спатрэбіцца — буду галадаць, але без прылад, неабходных для апрацоўкі парыжскага вінаградніка, я не абыдуся. Пытанне стаіць так: або я зраблю кар'еру, або застануся калупацца ў смецці. Я ведаю, якія спадзяванні вы на мяне ўсклалі, і хачу ажыццявіць іх найхутчэйшым чынам. Мамачка, любімая, прадай што-небудзь са сваіх спадчынных каштоўнасцей, а я неўзабаве куплю табе ўзамен. Я добра ведаю становішча нашай сям'і, разумею, на якія ахвяры ты мусіш пайсці, але павер: я недарэмна прашу грошы, я не пачвара. У маёй просьбе ты не павінна бачыць нічога, апрача крыка пільнай неабходнасці. Наша будучыня залежыць ад гэтых грошай, дзякуючы якім я пачну вайну, бо парыжскае жыццё — гэта вечная бітва. Калі ты не здолееш сабраць усіх грошай сама і не будзе іншага выйсця, як прадаць цёткчыны карункі, скажы ёй, што я прышлю ёй яшчэ прыгажэйшыя...» і г. д.

Эжэн напісаў лісты сёстрам, просячы іх ахвяраваць зберажэннямі, і, каб дасягнуць мэты, пазбегнуўшы сямейнага абмеркавання, а ён ведаў, што сёстры з радасцю пойдуць на ахвяры дзеля брата, ён падкрэсліваў далікатнасць справы і закранаў струны гонару, добра напятыя і такія гучныя ў маладых сэрцах. Напісаўшы лісты, міжволі разгубіўся: ён хваляваўся, трымцеў. Юны славалюб добра ведаў бездакорную чысціню гэтых душ, якія марнелі ў глушы, ведаў, колькі цяжкасцей прынясе сёстрам яго просьба і колькі радасці будзе ў гэтым для іх, з якім задавальненнем будуць размаўляць яны пра любімага брата ў патаемным куточку сядзібы. Ён уявіў сясцёр у той момант, калі яны крадком падлічваюць сваё мізэрнае багацце, як яны прыкладаюць усю сваю дзявочую хітрасць, каб даслаць грошы ў сакрэце, і ўпершыню ў жыцці спрабуюць падманваць, каб даказаць веліч сваёй душы. «Сястрынскае сэрца — гэта дыямент чысціні, мора пяшчоты», — падумаў студэнт. Ён пачаў саромецца таго, што напісаў. Якімі моцнымі будуць маленні, якімі чыстымі будуць парыванні іх сэрцаў да неба! З якой радасцю

пагодзяцца яны на любыя ахвяры! Як будзе пакутаваць маці, калі не зможа даслаць усіх грошай! І ўсе гэтыя самыя лепшыя пачуцці, гэтыя ахвяры будуць служыць толькі прыступкай, якая наблізіць яго да Дэльфіны дэ Нусінген. З яго вачэй скацілася некалькі слязінак, нібы апошнія крупінкі фіміяму, кінутыя на святы сямейны алтар. Эжэн тупаў па пакоі з хваляваннем, блізкім да роспачы. Дзверы заставаліся прыадчыненымі, таму бацька Гар'ё заўважыў неспакой студэнта, увайшоў і спытаў:

— Што з вамі, пане?

— Ах, добры суседзе, вы — бацька, а я дагэтуль сын і брат. Вы маеце рацыю, баючыся за Анастазі; яна папала пад уладу нейкага Максіма дэ Трая, і ён яе загубіць.

Бацька Гар'ё выйшаў, мармычучы нейкія словы, сэнс якіх Эжэн не разабраў.

Назаўтра Эжэн панёс лісты на пошту. Да апошняй хвіліны ён вагаўся, але нарэшце са словамі: «Мне пашчасціць!» кінуў іх у паштовую скрынку. Так кажуць ігракі, вялікія военачальнікі, але гэта фатальныя словы: часцей яны вядуць да пагібелі, а не да выратавання.

Праз некалькі дзён Эжэн выправіўся да мадам дэ Рэсто і не быў прыняты. Яшчэ тройчы спрабаваў ён пабачыцца з прыгожаю графіняю, і кожны раз дзверы зачыняліся перад ім, хаця студэнт выбіраў гадзіны, калі Максіма дэ Трая ў доме дэ Рэсто не было. Вікантэса мела рацыю. Студэнт перастаў вучыцца. На лекцыі ён прыходзіў толькі дзеля таго, каб засведчыць сваю прысутнасць, а пасля пераклічкі знікаў. Ён разважаў гэтаксама, як большая частка студэнтаў. Свае заняткі ён адклаў да часу, калі трэба будзе здаваць іспыты; ён вырашыў запісацца на лекцыі другога і трэцяга курсаў адразу, але засесці за права па-сапраўднаму толькі ў апошнюю хвіліну і авалодаць прадметам ледзь не за адзін дзень. Такім чынам, ён мог на працягу пятнаццаці месяцаў вольна плаваць па акіяне пад назваю Парыж, расстаўляць нераты на жанчын ці лавіць залатую рыбку. Ён двойчы на апошнім тыдні бачыўся з мадам дэ Басэан, прычым візіты ён наносіў толькі пасля таго, як экіпаж маркіза д'Ажуда ад'язджаў з двара. Гэтая слаўная жанчына, самая паэтычная асоба прадмесця Сен-Жэрмен, яшчэ на некалькі дзён змагла ўтрымаць поле бітвы за сабой, бо здолела адкласці шлюб мадэмуазель дэ Рошфід і маркіза д'Ажуда-Пінта. Але гэтыя апошнія дні, з-за боязі блізкага развітання са шчасцем, напоўненыя самымі палкімі па-

чуццямі, няўхільна набліжалі да катастрофы. Маркіз д'Ажуда разам з Рошфідамі радаваліся сварцы і прымірэнню з вікантэсай як удаламу збегу абставін: яны спадзяваліся, што мадам дэ Басэан звыкнецца з думкаю пра шлюб і ахвяруе сваімі раніцамі, каб дазволіць маркізу перайсці ў стан, у які мужчына рана ці позна мусіць перайсці. Атрымліваецца, што маркіз д'Ажуда маніў, штодзённа паўтараючы самыя святыя абяцанкі, а вікантэса ахвотна паддавалася падману. «Замест таго каб шляхетна выскачыць праз акно, яна бязвольна пакацілася па ўсходах», — заўважыла яе лепшая сяброўка, герцагіня дэ Ланжэ. Аднак апошнія сполахі ззялі яшчэ даволі доўга, вікантэса заставалася ў Парыжы і паспела аказаць не адну паслугу маладому сваяку. Яна адчувала нейкую прымхлівую сімпатыю да Эжэна, які засведчыў сваю адданасць і спагаду пры абставінах, калі жанчына ні ў чыіх вачах не сустракае ні літасці, ні сапраўднага спачування. А калі здараецца, што ў такі час мужчына і звяртаецца да яе з чулымі словамі, дык адно з разліку.

Перш чым пачынаць атаку на дом Нусінгенаў, Расціньяк вырашыў вывучыць распалажэнне фігур на шахматнай дошцы, а заадно ўвайсці ў курс колішняга жыцця бацькі Гар'ё і сабраў пэўныя факты, якія можна звесці да наступнага.

Жан-Жаашэн Гар'ё да рэвалюцыі працаваў простым рабочым-вермішэльшчыкам, чалавекам ён быў спраўным, ашчадным і досыць прадпрымальным, бо змог купіць у 1789 годзе справу свайго гаспадара, які стаў ахвяраю першага паўстання. Ён атабарыўся на вуліцы Жусьен, непадалёк ад Хлебнага рынку, і са спрытнай кемлівасцю ўзначаліў сваю секцыю, тым самым забяспечыўшы ўласнаму гандлю заступніцтва самых уплывовых асоб тае небяспечнае эпохі. Яго хітрая палітыка і лягла ў падмурак багацця, што склалася падчас голаду, які ці то ўзнік сам па сабе, ці то быў справакаваны знарок, — у той час збожжа ў Парыжы каштавала страшэнныя грошы. Людзі прыступам бралі дзверы пекарскіх лавак, тады як некаторыя асобы ціхенька куплялі сабе макароны ў бакалейных лаўках. За гэты год грамадзянін Гар'ё назбіраў такі капітал, які пазней дазволіў яму разгарнуць гандаль з усімі выгодамі ўладальніка вялізнага капіталу; з ім здарылася тое, што здараецца з усімі людзьмі аднос-ных здольнасцей: яго выратавала ўласная пасрэднасць. Зрэшты, пра багацце Гар'ё стала вядома толькі тады, калі

яно ўжо не выклікала нічыёй зайздрасці і лічыцца багатым не было небяспечна. Здавалася, што хлебны гандаль паглынуў увесь розум Гар'ё. Калі гаворка вялася пра збожжа, муку, крупы, вызначэнне іх якасці, паходжанне, умоў захавання, прадказанне коштаў, высокіх ці нізкіх ураджаяў, калі трэба было дастаць таннае зерне, запасціся ім на Сіцыліі, на Украіне, Гар'ё мог абставіць усіх да аднаго. Назіраючы за тым, як ён вядзе справы, тлумачыць законы аб экспарце ды імпарце збожжа, пранікае ў іх дух, заўважае недахопы, можна было падумаць, што ён варты быць міністрам. Цярплівы, актыўны, энергічны, настойлівы, хуткі на рашэнні, ён меў вочы арла, бо прадбачыў і апярэджваў усё, што магло здарыцца, ведаў усё і ўсё ўтойваў, ён быў дыпламатам у задумах і салдатам у паходах. Па-за межамі сваёй немудрагелістай, цёмнай лаўкі, калі ён выходзіў у вольную часіну і сядзеў на ганку, абапіраючыся плячом на вушак, ён ператвараўся зноў у недалёкага, грубаватага чалавека, няздольнага зразумець простых разважанняў, абыякавага да ўсіх уцех, чалавека, які засынае ў тэатры, аднаго з парыжскіх Далібанаў[1], моцных толькі сваёй тупасцю. Такія людзі заўжды падобныя між сабою, але сэрца кожнага з іх адорана найвышэйшымі пачуццямі. Два такія пачуцці перапаўнялі вермішэльшчыка, паглыналі ўсю сардэчную цеплыню, як мучны гандаль праглынуў яго мозг. Яго жонка, адзіная дачка багатага фермера з Бры, з'яўлялася для яго аб'ектам нейкага рэлігійнага пакланення, бясконцага кахання. Вермішэльшчык быў у захапленні ад яе, крохкай і моцнай, спагадлівай і мілай натуры, такой непадобнай да яго ўласнага характару. Калі ў мужчынскім сэрцы і ёсць нейкае прыроджанае пачуццё, дык гэта гонар адчування, што пад тваёю штохвіліннаю апекаю жыве слабая істота. Дадайце сюды каханне і гарачую ўдзячнасць усіх шчырых душ да крыніцы іх уцех і вы зразумееце мноства дзівацтваў, якія мы назіраем у галіне маральнасці. Пасля сямі гадоў бесклапотнага шчасця Гар'ё, на жаль, застаўся без жонкі, а тая пачынала ўжо браць уладу над мужам не толькі ў сферы пачуццяў. Можа ёй і ўдалося б перавыхаваць закаснелую натуру,

---

[1] *Далібан* — бацька, які моцна любіць і клапоціцца пра дачку; персанаж камедыі «Глухі, ці Перапоўненая гасцініца» французскага драматурга Жана-Баціста Шудара (1746—1806), які выступаў пад псеўданімам Дэфорж.

можа, яна пасеяла б у гэтай душы зерне разумення свету і жыцця. Са смерцю жонкі бацькоўскія пачуцці Гар'ё перайшлі межы. Усю цеплыню ён перанёс на дачок, і на першым часе яны поўнасцю задавальнялі бацькоўскія пачуцці. Якіх бы бліскучых прапаноў ні рабілі розныя негацыянты ці фермеры, якім карцела ажаніць Гар'ё са сваімі дочкамі, ён вырашыў застацца ўдаўцом. Цесць, адзіны мужчына, на якога распаўсюджваліся сімпатыі вермішэльшчыка, упэўнена сцвярджаў, што Гар'ё пакляўся не здраджваць жонцы, нават нябожчыцы. Гандляры на Хлебным рынку, няздольныя ацаніць гэтае найвысакароднейшае вар'яцтва, звялі ўсё да жартаў і ўзнагародзілі Гар'ё нейкай недарэчнаю мянушкай. Але калі аднойчы, падчас барышу, нехта неасцярожна абмовіўся пра гэта, дык атрымаў ад Гар'ё такога кухталя ў плячо, што ляцеў кулем да межавой тумбы на рагу вуліцы Аблен. Усім была добра вядома самаадданая баязлівая і пяшчотная любоў Гар'ё да сваіх дачок. І вось аднойчы адзін з яго канкурэнтаў з мэтаю адправіць яго з кірмашу, каб аднаасобна ўплываць на цэны, паведаміў Гар'ё, што Дэльфіну толькі што збіў кабрыялет. Вермішэльшчык збялеў, як палатно, і адразу ж паехаў дахаты. З-за сутыкнення супрацьлеглых пачуццяў, выкліканых ілжывай трывогаю, ён прахварэў некалькі дзён. Магутны кулак Гар'ё не крануў пляча ашуканца, але выгнаў з гандлю назаўжды, давёўшы да банкруцтва ў крытычны для яго момант. Натуральна, дочкі выхоўваліся без толку. Гар'ё меў болей шасцідзесяці тысяч франкаў даходу ў год, на сябе не траціў нават тысячы двухсот франкаў, а знаходзіў шчасце ў задавальненні фантазій дачок: найлепшыя настаўнікі павінны былі прывіць ім усе таленты, якія сведчылі б пра добрае выхаванне; згадзілі таксама кампаньёнку, і, на шчасце, яна аказалася жанчынаю, надзеленаю розумам і густам; яны каталіся вярхом на конях, мелі карэту, жылі не горш, чым каханкі багатага старога пана; варта было толькі пра што-небудзь заікнуцца, як бацька хуценька выконваў усе жаданні, не просячы за сваю шчодрасць нічога, акрамя ласкі. Для Гар'ё дочкі былі анёламі, ён ставіў іх вышэй за сябе, небараку; бацька любіў у дочках усё, нават зло, якое яны яму чынілі. Калі дочкі дасягнулі шлюбнага ўзросту, яны маглі выбраць сабе жаніхоў па густу: абедзве атрымалі ў пасаг палову бацькавага багацця. Анастазі мела схільнасці арыстакратычныя і, зачараваўшы сваёй прыгажос-

цю графа дэ Рэсто, вырашыла пакінуць бацькоўскі дом, каб памкнуцца ў вышэйшыя сферы грамадства. Дэльфіна любіла грошы і выйшла замуж за Нусінгена, банкіра нямецкага паходжання, які стаў баронам Свяшчэннай Рымскай імперыі[1]. Гар'ё застаўся вермішэльшчыкам. Але дочкі і зяці неўзабаве пачалі сердаваць на бацьку, які працягваў свой гандаль, хаця ў ім заключалася ўсё жыццё старога. На працягу пяці год ён вытрымліваў націск маладых, але, нарэшце, згадзіўся прадаць сваю справу і пайсці на адпачынак, забяспечыўшы сябе даходамі, сабранымі за апошнія гады, тым самым капіталам, які мадам Ваке ацаніла ў восем ці дзесяць тысяч ліўраў рэнты, калі месье Гар'ё атабарыўся на вуліцы Сент-Жэнеўеў. Ён зашыўся ў гэты пансіён ад адчаю, калі ўбачыў, што дочкі (пад мужавым прымусам) не толькі адмаўляюцца даць бацьку прытулак пад сваім дахам, але нават прымаць яго адкрыта.

Вось і ўсё, што ведаў наконт бацькі Гар'ё месье Мюрэ, які перакупіў справу старога вермішэльшчыка. Такім чынам, пацвярджаліся ўсе здагадкі герцагіні дэ Ланжэ. На гэтым мы і скончым уводзіны да трагедыі з парыжскага жыцця, трагедыі цьмянай, але страшнай.

У канцы першага тыдня снежня Расціньяк атрымаў два лісты: адзін ад маці, другі ад старэйшай сястры Лоры. Убачыўшы знаёмыя почыркі, ён затрымцеў адначасова ад радасці і ад жаху. Два танюсенькія аркушыкі паперы змяшчалі прысуд яго спадзяванням: жыць ім ці памерці. Хаця ён адчуваў нешта блізкае да жаху, калі згадваў беднае становішча сваякоў, ён быў пераканаць ў непахіснасці іх любві і ведаў, што можа высмактаць з іх апошнія кроплі крыві. Вось што пісала ў сваім лісце маці:

«Дарагое дзіця, дасылаю табе тое, што ты прасіў. Знайдзі гэтым грашам добры ўжытак, бо калі яшчэ раз спатрэбяцца сродкі, нават каб выратаваць табе жыццё, я не змагу сабраць такую значную суму ўпотай ад бацькі, гэта пахіснула б тую згоду, у якой жыве наша сям'я. Каб знайсці столькі новых грошай, мы будзем вымушаны закласці нашу зямлю. Я не магу рабіць нейкія вывады аб вартасці невядомых мне праектаў, але што ж гэта яны за

[1] Назва, прысвоеная германскай дзяржаве ў X ст. Захавалася яна да заваявання Германіі войскамі Напалеона I. Шляхам розных здзелак з уладамі германскіх княстваў нямецкія і іншаземныя буржуа станавіліся «тытулаванымі асобамі».

такія, калі ты баішся расказаць мне пра іх? Ніякіх тамоў для гэтага пісаць не трэба, нам, мамам, досыць аднаго слова, і яно як рукою зняло б трывогу няўпэўненасці. Не буду ўтойваць, што твой ліст выклікаў у мяне непрыемнае ўражанне. Дарагі сыне, што ж прымусіла цябе так палохаць маё сэрца? Напэўна, ты моцна пакутаваў, пакуль пісаў свой ліст, бо і я моцна пакутавала, пакуль чытала яго. На якую ніву ты ступаеш? Ці не будзе тваё жыццё, тваё шчасце абумоўлена неабходнасцю выглядаць не тым, кім ты з'яўляешся, і наведваць той круг людзей, дзе ты бываць не можаш, існаваннем у свеце, якое будзе вымагаць непасільных табе грашовых затрат і часу, патрэбнага на вучэнне? Добры мой Эжэн, павер мацярынскаму сэрцу, крывыя сцяжыны да дабра не вядуць. Цярпенне і пакора — вось што патрэбна маладым людзям, якія знаходзяцца ў тваім становішчы. Я цябе не папікаю і не хачу дамешваць аніякай горычы да нашага дарунка. Любая даверлівая і прадбачлівая маці сказала б тое, што кажу я. Калі ты ведаеш, у чым заключаюцца твае абавязкі, то я, я ведаю чысціню твайго сэрца, вышыню тваіх памкненняў. Таму я магу без боязі сказаць: «Любы мой сыне, дзейнічай». А хвалююся я таму, што я маці, але кожны твой крок будуць суправаджаць нашы пяшчотныя маленні і блаславенні. Будзь асцярожны, дзіця маё. Будзь мудры, як дарослы мужчына, у тваіх руках знаходзяцца лёсы пяці дарагіх табе асоб. Ты — усё наша багацце, тваё шчасце — наша шчасце. Мы ўсе молім Бога памагчы табе ў тваіх задумках. У акалічнасцях, якія склаліся, твая цётачка Марсіяк праявіла нязмерную дабрыню: яна сама здагадалася пра тое, што ты пісаў мне пра пальчаткі. «У мяне слабасць да старэйшага пляменніка», — радасна казала яна. Эжэн, любі цётку; пакуль ты не даб'ешся поспеху, я не скажу, што яна зрабіла дзеля цябе, бо, калі даведаешся, грошы апякуць табе пальцы. Вы, дзеці, не ўяўляеце, што значыць страціць памятныя рэчы! Але чаго б мы толькі не ахвяравалі дзеля вас? Цётка прасіла напісаць, што цалуе цябе ў лоб і хацела б перадаць гэтым пацалункам здольнасць заўжды быць шчаслівым. Калі б не хірагра[1], добрая, цудоўная жанчына сама б табе напісала. У твайго бацькі ўсё добра. Ураджай гэтага, 1819 года, апраўдаў усе надзеі. Бывай, дарагое дзіця, пра сясцёр я нічога казаць не буду, Лора табе сама піша. Не хачу

[1] Падагра рук.

пазбаўляць яе задавальнення пераказаць усе нашы малыя сямейныя падзеі. Дапамажы табе, Божа, дабіцца поспеху! О, так, дабівайся поспеху, Эжэн: боль за цябе занадта пякучы, каб я магла вытрымаць яго другі раз. Я зведала, што азначае беднасць, калі хочацца мець багацце, якое можна было б аддаць свайму сыну. Ну, бывай. Не пакідай нас без навін, па-мацярынску горача цалую цябе».

Калі Эжэн скончыў чытаць ліст, яго шчокі былі мокрымі ад слёз, ён думаў пра тое, як бацька Гар'ё скручваў серабро і прадаваў, каб выкупіць вэксаль сваёй дачкі. «Твая маці таксама «скруціла», можна сказаць, свае каштоўнасці, — думаў ён. — І цётка, пэўна, плакала, прадаючы сямейныя рэліквіі. Ці маеш ты цяпер права абвінавачваць Анастазі? Дзеля эгаістычнай будучыні ты паўтарыў тое самае, што зрабіла дзеля свайго каханка яна. Хто лепшы: ты ці яна?»

Невыносна пякло ў душы студэнта, яго нутро гарэла. Яму хацелася адмовіцца ад свецкага жыцця, не браць гэтых грошай. Ён пакутаваў ад тых высакародных, цудоўных згрызот сумлення, якія так рэдка цэняцца людзьмі, калі тыя судзяць сваіх блізкіх, але за якія анёлы нябесныя адпушчаюць грахі злачынцам, абвінавачаным судом зямным. Расціньяк адкрыў ліст сястры, і цнатліва-далікатныя сказы адразу асвяжылі яму сэрца:

«Твой ліст прыйшоў вельмі дарэчы, мілы браце. Я і Агата збіраліся патраціць грошы, але нашы погляды разышліся, і мы не ведалі, што купіць. Ты зрабіў тое самае, што слуга іспанскага караля, калі той скінуў на падлогу ўсе кішэнныя гадзіннікі свайго гаспадара; ты дапамог нам прыйсці да згоды. Сапраўды, мы ўсё спрачаліся, якому з нашых жаданняў аддаць перавагу, і не здагадваліся, што грашам знойдзецца ўжытак, які пераўзыдзе ўсе нашы жаданні. Агата нават заскакала ад радасці. Адным словам, цэлы дзень мы былі самі не свае, і гэта было так прыкметна (цётчын стыль), што маці строга спытала: «Што з вамі, паненкі?» Калі б яна нас яшчэ крышачку падакарала, я думаю, мы былі б яшчэ больш задаволеныя. Мусіць, жанчыне надта прыемна пацярпець за любімага чалавека! Адна я была задуменнаю і маркотнаю пры ўсёй маёй радасці. Напэўна, з мяне атрымаецца кепская жонка, я занадта мантачу. Я купіла сабе два паясы, прыгожанькі пунсон, каб прабіваць дзірачкі ў гарсетах, непатрэбшчыны, адным словам, у выніку ў мяне аказалася менш грошай, чым у таўстухі Агаты,

ашчаднай сарокі, якая збірае манеткі ў адну кучку. Яна мела дзвесце франкаў, а я толькі сто пяцьдзесят. Вось кара!

Я хацела шпурнуць гэты пояс у калодзеж, мне будзе непрыемна насіць яго. Я абакрала цябе. Агата проста малайчына, яна прапанавала адаслаць табе трыста пяцьдзесят франкаў ад нас абедзвюх. А я не змагла ўтрымацца і расказваю, як усё было на самай справе. Ведаеш, што мы рабілі, каб не парушыць твой наказ? Мы ўзялі нашы грошы і пайшлі на шпацыр разам, але як толькі выбраліся на гасцінец, бягом кінуліся ў Руфэк, дзе проста аддалі грошы месье Грымберту, загадчыку аддзялення Каралеўскай пошты. Назад мы ляцелі, як на крылах, быццам ластаўкі. «Можа, ад шчасця ў нас такая лёгкасць?» — сказала Агата. Мы нагаварылі адна другой тысячы слоў, але вы, месье парыжанін, іх не прачытаеце, бо размова вялася пра вас. Ах, мілы браце, мы любім цябе — вось як коратка можна пераказаць сутнасць нашай гутаркі. Што ж тычыцца сакрэта, дык, па словах цёткі, такія сакрэтніцы, як я з Агатаю, здольныя на ўсё, нават на маўчанне. Маці з цёткай таямніча ездзілі ў Ангулем, прычым ні словам не абмовіліся пра вышэйшыя палітычныя мэты іхняй паездкі, якой папярэднічалі доўгія нарады, куды ні мы, ні спадар барон дапушчаны не былі. Вялікія здагадкі займаюць галовы ў дзяржаве Расціньякаў. Інфанты таямніча працягваюць вышываць ажурнымі кветачкамі муслінавую сукенку для Яе Вялікасці Каралевы; засталося вышыць у двух месцах. Было вырашана, што з боку Вертэя сцяну будаваць не будуць, там будзе толькі агароджа. Ад гэтага мясцовае насельніцтва страціць і садавіну, і шпалеры, затое чужаземцы змогуць захапляцца цудоўнаю панарамаю. Калі наследнаму прынцу спатрэбяцца насоўкі, маем гонар паведаміць, што каралева-ўдава дэ Марсіяк парылася ў сваіх скарбніцах і сундуках, вядомых пад назваю Пампеі ды Геркуланума, і сутыкнулася з наяўнасцю штукі цудоўнага галандскага палатна, пра існаванне якога яна забылася; прынцэсы Агата і Лора прапанавалі ў распараджэнне каралевы ніткі, іголкі і свае рукі, па-ранейшаму чырванаватыя. Юныя прынцы, дон Анры і дон Габрыэль, упарта трымаюцца вартых жалю звычак аб'ядацца вінаградным варэннем, дражніць сясцёр, ленавацца вучыцца, разбураць птушыныя гнёзды, шумець і, папіраючы дзяржаўныя законы, рэзаць вербалоз сабе на фехтавальныя

трысцінкі. Папскі нунцый, на простай мове названы святаром, пагражае ім адлучэннем ад царквы, калі яны і далей збіраюцца грэбаваць найсвяцейшымі канонамі граматыкі на карысць гульні ў вайну ў бузінавым гушчары. Бывай, мілы браце, ніводзін ліст ніколі не змяшчаў яшчэ столькі маленняў за тваё шчасце, столькі радаснай любасці. Табе давядзецца шмат чаго расказаць нам, калі прыедзеш. Мне, як старэйшай, ты раскажаш усё. Цётка дала нам зразумець, што ты маеш поспех у свеце.

Расказваюць усё пра даму, а пра астатняе — маўчок...

Пры нас, вядома! Напішы, Эжэне, калі хочаш, мы можам абысціся без насовак, а замест іх пашыем табе кашулі. Хутчэй адкажы на гэтае пытанне. Калі табе неабходны прыгожыя, добра пашытыя кашулі, дык мы мусім узяцца за працу зараз жа; калі ў Парыжы носяць фасоны, нам невядомыя, дашлі нам узор, асабліва для манжэт. Бывай, бывай! Цалую цябе ў лоб з левага боку, у скроню, якая належыць выключна мне. Чысты аркуш пакідаю Агаце, якая паабяцала мне не чытаць напісанага. Але для пэўнасці я застануся каля яе, пакуль яна будзе пісаць. З любоўю, сястра

Лора дэ Расціньяк».

«О, так, так, — паўтараў Эжэн, — багацце любою цаной! Ніякія скарбы не адплацяць за гэтую шчырую адданасць. Я хацеў бы падарыць ім усё шчасце адразу. Тысяча пяцьсот пяцьдзесят франкаў! — зноў сказаў сабе ён пасля хвіліннай паўзы. — Трэба, каб кожная манета ператварылася ў прыступку! Лора мае рацыю, далібог! У мяне толькі некалькі кашуль з простага палатна. Калі справа кранае чужое шчасце, дзяўчына робіцца хітрэйшаю за злодзея. Прасцячка для сябе, але прадбачлівая для мяне, яна як анёл нябесны, што даруе памылкі зямныя, не разумеючы іх».

Свет належаў яму! Краўца паклікалі, распыталі, прычаравалі. Пабачыўшы месье дэ Трая, Расціньяк адразу зразумеў, якую ролю мае ў жыцці маладых людзей кравец. На жаль, не можа быць сярэдзіны між двума разуменнямі важнасці краўца: альбо ён — смяротны вораг, альбо — сябар, гэта залежыць ад якасці пашыву. У сваім краўцы Эжэн сустрэў чалавека, які зразумеў усю значнасць свайго рамяства і лічыў сябе звяном паміж цяперашнім і будучым станамі маладых людзей. Нездарма ўдзячны Расціньяк дапамог яму стаць багатым толькі

адной трапнай фразай, на якія ён з цягам часу стаў вялікім майстрам.

— Я ведаю, што двое штаноў ягонай работы, — казаў ён, — садзейнічалі заключэнню двух шлюбаў, кожны з якіх прынёс дваццаць тысяч даходу ў год.

Паўтары тысячы франкаў і колькі хочаш фракаў! Бедны сын поўдня больш не вагаўся. Спускаючыся на снеданне, ён меў выгляд, які немагчыма апісаць на паперы. Такі выгляд характэрны для маладога чалавека, які валодае пэўнаю сумаю грошай. У той самы момант, калі ў кішэню студэнта трапляюць грошы, яго настрой узнімаецца нібы фантастычная калона, і ён узносіцца на гэты п'едэстал. Ён ходзіць больш упэўнена, чым раней, пачуваецца так, нібы з'явілася надзейная апора для яго дзеянняў, пазірае смела, адкрыта, рухі робяцца спраўнымі; учора ён паводзіў сябе сціпла, асцярожна, зносіў выспяткі, як сабака, сёння ён сам вытне хоць міністра. З ім творыцца нешта нечуванае: ён усё хоча і ўсё можа, у яго жаданнях поўны сумбур, ён вясёлы, высакародны і таварыскі. Карацей кажучы, бяскрылай птушцы далі вялікія крылы. Безграшовы студэнт толькі зрэдку ўрывае крышачку ўцехі, нібы сабака, які, нягледзячы на небяспеку, украдзе костку, разгрызе яе, высмакча шпік і хутчэй бяжыць далей; але калі ў кашальку маладзёна пазвоньваюць манеты, ён смакуе ўцехі, расцягвае іх; у такія моманты ён сам сабе даспадобы, лятае ў аблоках, забыўшыся, што значыць слова «галеча». Увесь Парыж да яго паслуг. Ах, узрост бляску, зіхацення, полымя! Узрост радаснай сілы, якая марна прападае і ў мужчын, і ў жанчын! Узрост даўгоў і моцных трывог, якія толькі ўзмацняюць уцехі! Той, хто не спазнаў левага берага Сены, кварталаў між вуліцамі Сен-Жак і Сен-Пер[1], той нічога не разумее ў жыцці чалавека!

«Калі б парыжанкі толькі ведалі, яны прыйшлі б сюды за каханнем», — падумаў Расціньяк, паглынаючы вараныя грушкі мадам Ваке, коштам па адным ліяры за штуку.

У гэты момант у сталовай пачуўся званок ад брамкі, і ўвайшоў паштальён Каралеўскай пошты. Ён спытаў месье Эжэна дэ Расціньяка і працягнуў яму два мяшэчкі і рэгістрацыйную кнігу для подпісу. Ватрэн зірнуў на

[1] Маецца на ўвазе Лацінскі квартал, дзе здаўна знаходзяцца навучальныя ўстановы, музеі і бібліятэкі.

студэнта сваімі праніклівымі вачыма, нібы пугаю сцебануў.

— Вам хопіць грошай на ўрокі фехтавання і на стральбу ў ціры, — заўважыў гэты чалавек.

— Нарэшце прыбылі галіёны[1], — сказала, гледзячы на мяшэчкі, мадам Ваке. Мадэмуазель Мішано не адважвалася зірнуць на грошы, баючыся, што яе сквапнасць стане відавочнай.

— У вас добрая маці, — заўважыла мадам Куцюр.

— У яго добрая маці, — паўтарыў Пуарэ.

— Так, мамачка са скуры вылузвалася, — сказаў Ватрэн. — Цяпер вы зможаце ажыццявіць свае планы, быць у свеце, паляваць на пасагі і запрашаць на танцы графінь з кветкамі персіка на галаве. Але, паслухайце мяне, малады чалавек, часцей заходзьце ў цір.

Ватрэн зрабіў жэст, нібы цэліць у праціўніка. Расціньяк хацеў даць гасцінца паштальёну, але ў кішэнях было пуста. Ватрэн дастаў свае дваццаць су і кінуў манету мужчыну.

— Вы можаце заўсёды разлічваць на крэдыт, — сказаў ён, пазіраючы на студэнта.

Расціньяк мусіў падзякаваць, хаця з часу іх непрыемнай сутычкі, што адбылася пасля балю ў мадам дэ Басэан, гэты чалавек стаў яму нясцерпным. Цэлы тыдзень Эжэн і Ватрэн упарта маўчалі і назіралі адзін за другім. Дарма студэнт пытаў сябе, чаму між імі ўзніклі такія стасункі. Вядома, што думкі ўздзейнічаюць у простай залежнасці ад сілы, што іх спарадзіла, і б'юць туды, куды накіруе іх мозг, згодна з нейкім матэматычным законам, накшталт таго, які абумоўлівае траекторыю палёту бомбы, пушчанай з марціры. Рознымі могуць быць эфекты іх уздзеяння. Ёсць натуры далікатныя, у якіх чужыя думкі лёгка ўкараняюцца і маюць разбуральнае ўздзеянне, але ёсць і натуры моцныя, нібы ўзброеныя, здаецца, што такія чарапы закаваны бронзаю, аб іх расплюшчваюцца думкі іншага чалавека і тут жа адскокваюць, нібы куля ад каменнай сцяны; апрача іх ёсць натуры млявыя, ватныя, дзе чужыя думкі згасаюць, нібы ядры ў мяккім насыпе рэдута. Галаву Расціньяка можна было аднесці да ліку галоў, нашпігаваных порахам, гатовых узарвацца ад маленькай іскрынкі. Яго маладосць была занадта гарачаю, каб супрацьстаяць сіле думак, гэтай заразлівасці пачуц-

[1] Іспанскія паруснікі.

цяў, дзіўныя з'явы якіх чаруюць нас супроць нашае волі. Маральны зрок Расціньяка пільнасцю сваёй не саступаў зроку яго рысіных вачэй. Кожнае з яго падвойных успрыманняў рэчаіснасці (розумам і пачуццямі) было надзелена той таямнічай глыбінёй, той гібкасцю, якімі зачароўваюць нас людзі надзвычайнага таленту, якія, нібы рыцары, з першага позірку заўважаюць прыступныя месцы любога рыштунку праціўніка. Зрэшты, за месяц у Эжэне ўзбуйнела столькі ж заган, колькі і добрых якасцей. Патрабаванні свету, здзяйсненне ўсё большых жаданняў вымагалі нараджэння заган. Да ліку яго добрых якасцей адносілася тая паўднёвая жвавасць, якая дапамагае ісці напрасткі да цяжкасцей, каб іх пераадолець, і не дазваляе народжанаму на поўдзень ад Лауры стаяць на месцы ў няўпэўненасці; гэтую якасць лічаць заганаю тыя, хто нарадзіўся на поўначы. Па іх словах, дзякуючы ёй Мюрат[1] узвысіўся, але з-за яе ён таксама і памёр. Адсюль мы можам зрабіць выснову: калі чалавек з поўдня здолее спалучыць паўночную хітрасць і адвагу выхадца са спякотных краёў, ён будзе дасканалым і карона не пакіне яго. Такім чынам, Расціньяк не мог доўга заставацца пад абстрэлам батарэй Ватрэна, не ведаючы, што ён за чалавек: сябар ці вораг. Час ад часу студэнту здавалася, што гэты незвычайны чалавек здагадваецца пра ўсе яго захапленні, чытае ў маладым сэрцы, а між тым у самога Ватрэна ўсё замкнёна так моцна, нібы ён валодае непарушнай глыбінёй сфінкса, які ўсё бачыць, усё ведае, але нічога не кажа. Цяпер, маючы поўную кішэню грошай, Эжэн узбунтаваўся.

— Будзьце ласкавы, пачакайце мяне, — сказаў ён Ватрэну, які ўжо ўстаў з намерам выйсці, дапіваючы апошнія глыткі кавы.

— Нашто? — азваўся гэты саракагадовы мужчына, напінаючы шыракаполы капялюш і беручы жалезную палку, якой ён часта рабіў фехтавальны прыём — круціў «млыном»: ён, маўляў, не спалохаецца нападу нават чатырох злодзеяў.

— Я аддам вам грошы, — адказаў Расціньяк, порстка развязваючы адзін з мяшэчкаў і адлічваючы мадам Ваке сто сорак франкаў. — Што вінен, аддаць павінен, —

---

[1] *Мюрат*, Іахім (1767—1815) — маршал Напалеона, яго зяць, удзельнік напалеонаўскіх паходаў, кароль непалітанскі (1808—1814 г.), быў звергнуты і за спробу вярнуцца да ўлады пакараны смерцю.

сказаў ён кабеце. — Цяпер мы ў разліку ажно да дня Святога Сільвестра[1]. Размяніце мне, калі ласка, сто су.

— Што вінен, аддаць павінен, — паўтарыў Пуарэ, гледзячы на Ватрэна.

— Вось вашы дваццаць су, — сказаў Расціньяк, падаючы манетку сфінксу ў парыку.

— Складваецца ўражанне, што вы баіцеся застацца мне вінным, — усклікнуў Ватрэн, пранікаючы сваім позіркам у душу маладога чалавека і суправаджаючы яго іранічнаю дыягенаўскаю ўсмешкай, якая ўжо не раз злавала студэнта.

— Але... так, — пацвердзіў Эжэн, узнімаючыся з крэсла з двума мяшэчкамі ў руках, каб пайсці да сябе наверх.

Ватрэн выходзіў праз дзверы гасцёўні, студэнт меркаваў прайсці праз дзверы, што вялі на пляцоўку перад ўсходамі.

— А ці ведаеце вы, спадар маркіз дэ Расціньякарама, што вашы словы прагучалі не надта пачціва? — заўважыў Ватрэн, ударыўшы палкай па дзвярах, і падышоў да студэнта, які холадна пазіраў на яго.

Расціньяк зачыніў дзверы сталовай і адвёў Ватрэна да першых прыступак лесвіцы, у закутак, што аддзяляў сталовую ад кухні, дзе былі дзверы ў сад, а над імі прадаўгаватае акенца з кратамі з жалезных пруткоў. У гэты час Сільвія выскачыла з кухні і студэнт пры ёй сказаў:

— Месье Ватрэн, я не маркіз, і мяне завуць не Расціньякарама.

— Яны пастраляюцца, — абыякава заявіла мадэмуазель Мішано.

— Пастраляюцца, — паўтарыў Пуарэ.

— Ды не, — адказала мадам Ваке, пагладжваючы купку манет пальцамі.

— Але паглядзіце, яны кіруюцца пад ліпы, — закрычала мадэмуазель Віктарына, усхапіўшыся, каб паглядзець у сад. — Бедны студэнт, ён жа мае рацыю.

— Пайшлі наверх, мілачка, гэтыя справы нас не датычаць, — паклікала яе мадам Куцюр.

Але тоўстая Сільвія ў дзвярах перагарадзіла дарогу мадам Куцюр і Віктарыне, якія ўжо збіраліся пайсці.

---

[1] *Дзень св. Сільвестра* — 31 снежня.

— Гэтага яшчэ не хапала! — заявіла яна. — Месье Ватрэн сказаў месье Эжэну: «Пагутарым!», узяў яго пад руку, і зараз яны совaюцца па нашых артышоках.

У гэты момант з'явіўся Ватрэн і з усмешкай сказаў:

— Матухна Ваке, не палохайцеся, я выпрабую свае пісталеты пад ліпамі.

— Ах, спадар, — сказала Віктарына, пляснуўшы ў далоні, — за што вы хочаце забіць Эжэна?

Ватрэн адступіў на два крокі і ўтаропіўся ў Віктарыну.

— Вось дык гісторыя! — кплівым тонам закрычаў ён, прымусіўшы пачырванець няшчасную дзяўчыну. — Гэты малады чалавек вельмі мілы, ці не так? О, вы навялі мяне на думку, — дадаў ён. — Я зраблю вас шчаслівымі абодвух.

Мадам Куцюр узяла сваю выхаванку пад руку і павяла яе, шапнуўшы на вуха:

— Віктарына, сёння я вас не пазнаю.

— Я не хачу, каб у маім доме стралялі, — заявіла мадам Ваке. — У такі час вы перапалохаеце ўсё наваколле і прыцягнеце паліцыю.

— Спакойна, мадам Ваке, — адказаў Ватрэн. — Ля-ля, цудоўна, мы ідзём у цір.

Ён далучыўся да Расціньяка і фамільярна ўзяў маладога чалавека пад руку.

— Нават калі я дакажу вам, што магу пяць разоў запар трапіць дакладна ў віновага туза, вашай смеласці не паменее? Вы выглядаеце чалавекам трошкі апантаным, і, трэба думаць, дасцё забіць сябе, як дурань.

— Вы адступаецеся?

— Не выпрабоўвайце майго цярпення, — адказаў Ватрэн. — Сёння не холадна, давайце прысядзем вунь там, — і ён паказаў на пафарбаваныя ў зялёны колер лаўкі. — Там нас ніхто не пачуе. Я хачу пагаварыць з вамі. Вы хлопец добры, і благога я вам не зычу. Я люблю вас, слова Падма... (халера ясная!), слова Ватрэна. Зараз скажу, за што я вас люблю. Але перш знайце, што я ведаю вас, як ліхога шэлега, і дакажу вам гэта. Пакладзіце свае мяшкі, — прапанаваў ён, паказваючы на круглы стол.

Расціньяк паклаў грошы на стол і сеў, поўны цікаўнасці, якая яшчэ болей разгаралася з-за нечаканых змен у манерах гэтага чалавека: спачатку хацеў забіць, цяпер ставіць сябе гэтак паблажліва.

— Вам карціць даведацца, хто я, чым займаўся ці чым займаюся цяпер, — зноў загаварыў Ватрэн. — Вы занадта

цікаўны, хлопча. Не хвалюйцеся, вы пачуеце шмат чаго! Са мною здараліся няшчасці. Спачатку паслухайце, адказваць будзеце пасля. Калі ласка, вось вам некалькі слоў пра маё папярэдняе жыццё. Хто я? Ватрэн. Чым я займаюся? Тым, што мне даспадобы. Што далей? Хочаце даведацца пра мой характар? Я добры да тых, хто робіць мне дабро, хто цягнецца да мяне. Ім дазволена ўсё: хай хоць наступіць мне на ногі, я не скажу: «Беражыся». Але я злы, як чорт, і не цырымонюся з тымі, хто мне назаляе ці проста не падабаецца. І трэба вам сказаць, што мне чалавека забіць як раз плюнуць. Аднак раблю я гэта толькі ў выпадку пільнай патрэбы і чыста. Калі хочаце, я артыст. Мала таго, перад вамі чалавек, які прачытаў «Мемуары Бенвэнута Чэліні», да таго ж на італьянскай мове! Вісус першай гільдыі, гэты Чэліні, і ў яго я навучыўся любіць прыгожае ва ўсіх яго праявах. Зрэшты, хіба не ганаровая роля ісці аднаму супраць усіх і ведаць, што табе шанцуе? Я нямала разважаў пра сучасны стан нашага грамадскага бязладдзя. Дуэль, хлопча — глупства, дзіцячая забаўка. Калі з двух жывых людзей адзін павінен знікнуць, неразумна разлічваць на выпадак. А дуэль? Гэта арол ці рэшка! Я пададу ў віновага туза пяццю кулямі запар, прычым у адну і тую ж кропку ды яшчэ з трыццаці пяці крокаў! Калі ў вас ёсць такі талент, вось тады можаце быць пэўным, што заб'еце праціўніка. Я страляў у аднаго чалавека з дваццаці крокаў і прамахнуўся. А мой дзівак першы раз у жыцці трымаў пісталет. Памацайце, — прапанаваў гэты незвычайны чалавек, расшпільваючы камізэльку і паказваючы грудзі, валасатыя, як спіна мядзведзя, пакрытыя нейкім брыдкім рудым валассём. — Гэты блазнюк падсмаліў мне шчэць, — ён прыклаў палец Расціньяка да ямкі на грудзях. — Але ў той час я быў яшчэ дзіцём вашага ўзросту, мне было дваццаць адзін год, і я яшчэ ў нешта верыў: у каханне жанчыны, у процьму глупстваў, сярод якіх вы яшчэ паблукаеце. Магло здарыцца, што мы б з вамі страляліся. Вы маглі мяне забіць. Уявіце, што я ляжу ў зямлі, а дзе вы? Уцякаеце, хаваецеся ў Швейцарыі, праядаеце бацькавы грошы, а грошай тых — з жабіны прыгаршчы. Я растлумачу вам ваша становішча ясней, але зраблю гэта з вышыні чалавека, які ведае, што да чаго ў жыцці, і бачыць у ім толькі два шляхі: тупое паслушэнства ці бунт. Я асабіста не падпарадкоўваюся нікому, зразумела? А ці ведаеце вы, што вам трэба, каб

жыць з вашым цяперашнім размахам? Мільён, і неадкладна. Інакш вы з вашаю галоўкай трапіце ў сетку ў Сен-Клу[1], шукаючы найвышэйшую сутнасць. І я вам дам гэты мільён.

Ён вытрымаў паўзу, назіраючы за Эжэнам.

— Эге, ужо вы паглядаеце на дзядзьку Ватрэна прыветней. Пачуўшы слова «мільён», вы сталі нібы дзяўчына, якой сказалі: «Да вечара». Яна прыхарошваецца, аблізваецца, як кот на малако. Вельмі добра. Ну, хадзем! Вось так, удвох! Цяпер ваш рахунак, малады чалавек. Там, у правінцыі, вы маеце тату, маму, цётку, дзвюх сясцёр (васемнаццаці і семнаццаці год), двух братоў (пятнаццаці і дзесяці год) — спіс усёй каманды. Цётка выхоўвае сясцёр. Кюрэ навучае братоў латыні. Сям'я часцей харчуецца поліўкаю з каштанаў, чым белым хлебам, тата шануе штаны, мама абмяжоўваецца адной зімовай і адной летняй сукенкамі, сёстры апранаюць што пападзе. Я ўсё ведаю, я быў на поўдні. Так жыве і ваша сям'я; калі вам дасылаюць тысячу дзвесце франкаў у год, значыць, маёнтак ваш дае не больш трох тысяч франкаў прыбытку. Вы трымаеце кухарку і слугу — трэба захоўваць знешнюю прыстойнасць: ваш тата ўсё-такі барон. Што датычыць асабіста вас, то амбіцыі вам не бракуе, бо ёсць сваякі Басэаны, ходзіце вы пешкі, марыце пра багацце і не маеце гроша ў кішэні, сёрбаеце ежу матухны Ваке, хаця любіце багатыя вячэры ў прадмесці Сен-Жэрмен, спіце на пансіённым ложку, а мроіце пра палац! Не асуджаю вашых жаданняў, не, бо кожны чалавек імкнецца да славы. Спытайце жанчын, якім мужчынам аддаюць яны перавагу? Менавіта тым, хто цягнецца да славы, бо ў такіх спіна мацнейшая, кроў багацейшая жалезам, сэрца больш палкае, чым у іншых мужчын. У росквіце сіл жанчына адчувае сябе шчаслівай, прыгожай і таму шукае мужчыну дужага, сапраўднага волата, і не баіцца, што ён яе зломіць. Я пералічыў вашыя жаданні з мэтаю спытаць наступнае: вы галодны як воўк, вы маеце вострыя зубкі; як жа здабыць харчоў у чыгунок? Перш за ўсё трэба праглынуць «Звод законаў»; радасці мала, толку столькі ж, але трэба, значыць, трэба. Няхай будзе так. Рыхтуем сябе ў адвакаты, каб стаць старшынёю крымінальнага суда, адсылаць на катаргу нябог,

---

[1] *...у сетку ў Сен-Клу...* — каля мястэчка Сен-Клу (цяпер фешэнебельны парыжскі раён) стаялі сеці, каб перахопліваць целы тапельцаў.

лепшых за нас, выпальваць на іх плячах T.F.[1], каб даказаць багацеям, што яны могуць спаць спакойна. Задавальнення мала, і надта марудна. Нудзіся спачатку два гады ў Парыжы, пазіраючы на ласункі, да якіх мы такія ахвотнікі, і не крані іх. Калі ўвесь час жадаеш і ніколі не задавальняеш сваіх жаданняў, стамляешся. Былі б вы малакроўным чалавекам з пароды малюскаў, вам не было б чаго баяцца, але ў вашых жылах цячэ гарачая кроў ільва, і пажадлівасць такая, што хопіць на дваццаць глупстваў у дзень. Вы станеце ахвяраю самай жахлівай з пытак, якія толькі ёсць у пекле. Дазволім меркаванне, што вы — разумны чалавек, п'яце малако ды складаеце элегіі: тады вам, як чалавеку высакароднаму, пасля гэтулькіх турбот і нястач, што і свіння завые, прыйдзецца пачаць з пасады намесніка нейкага нягодніка-пракурора ў занядбаным мястэчку. Урад кіне вам тысячу франкаў утрымання ў год, а гэта ўсё роўна, што мяснік плісне супу сабаку. Брашы на злодзеяў, абараняй багатых у судах, пасылай смелых духам на гільяціну. Дзякую шчыра і моцна! Без пратэкцыі вы так і згніеце ў правінцыйным трыбунале. Гадоў пад трыццаць вы зробіцеся суддзёй за тысячу дзвесце франкаў у год, калі яшчэ перш не зашпурнеце ў гарод сваю мантыю. Дасягнуўшы саракагадовага ўзросту, вы ажэніцеся з якой-небудзь мельнікавай дачкой, якая забяспечыць шэсць тысяч ліўраў прыбытку. Дзякуй! З пратэкцыяй вы ў трыццаць год атрымаеце пасаду правінцыйнага пракурора, будзеце зарабляць тысячу экю і ажэніцеся з дачкою мэра. Асмеліўшыся на маленькія палітычныя подласці, накшталт таго, каб чытаць у выбарчым бюлетэні Вілель замест Манюэль[2] (сумленне супакойвае рыфма), у сорак год вы ўздымецеся да генерал-пракурора і зможаце разлічваць на дэпутацтва. Заўважце, хлопча, што ў сумленні з'явяцца дзіркі, што дваццаць год прыйдзецца нудзіцца, хаваць галечу, а сёстры застануцца старымі дзеўкамі. Маю гонар нагадаць вам, апрача таго, што ў Францыі толькі дваццаць генерал-пракуроraў, а жадаючых дабіцца гэтай пасады — дваццаць тысяч, сярод якіх знойдуцца круцялі,

---

[1] *T.F.* — гэтыя літары выпальвалі ў Францыі асуджаным на катаргу, што азначае «ссыльнакатаржны».

[2] *Вілель замест Манюэль...* — прозвішча лідэра крайніх раялістаў-кансерватараў замест прозвішча ліберала. Прачытаць на выбарчым бюлетэні імя «Вілель» замест «Манюэль» — значыць учыніць палітычнае махлярства.

гатовыя прадаць сваіх родных, каб узняцца на адну зарубку. Калі такое рамяство вам не да густу, разгледзім іншы шлях. Ці не хоча барон дэ Расціньяк стаць адвакатам? Ах, цудоўна! Спачатку дзесяць год мардавацца, траціць штомесяц па тысячы франкаў, мець бібліятэку, кабінет, бываць у свеце, цалаваць мантыю якому-небудзь клерку, каб мець справы, языком круціць млын Палаца юстыцыі. Я і слова б не сказаў, калі б гэты занятак падышоў вам, але ці знойдзем у Парыжы пяць адвакатаў, якія ў пяцьдзесят год зарабляюць болей пяцідзесяці тысяч франкаў у год? Ведаеце, чым паскудзіць душу такім жыццём, я лепей бы зрабіўся піратам. Дык дзе ўзяць грошы? Сродкаў мала, ды што там, адзіны сродак — жончын пасаг. Вы ажаніцца не збіраецеся? Ах, гэта ўсё роўна, што павесіць камень сабе на шыю, і потым, што застанецца ад нашага пачуцця гонару, высакароднасці пасля шлюбу дзеля грошай? Лепш сёння ж пачаць бунт супраць грамадскіх умоўнасцей. Ажаніцца з разлікам — значыць поўзаць перад жонкаю, цалаваць пантофлі маці, апускацца да подласцей, ад якіх нават свіння ўцякла б, цьфу! Добра, калі б яшчэ знайшлі сваё шчасце, але ў такім шлюбе вы будзеце адчуваць сябе трубой для сцёку нечыстот. Лепш весці бітву з мужчынамі, чым змагацца з уласнаю жонкай. Перад вамі жыццёвыя ростані, малады чалавек, выбірайце. Але выбар ужо зроблены: вы наведалі кузіну, мадам дэ Басэан, і адчулі смак раскошы; вы наведалі дачку бацькі Гар'ё мадам дэ Рэсто і адчулі пах парыжанкі. У той дзень вы вярнуліся з адзінай думкай, якую мне было вельмі лёгка прачытаць на вашым ілбе: «Поспех! Дабіцца поспеху любой цаной». І я сказаў сабе: «Малайчына гэты хлопец, падабаецца ён мне». Вам спатрэбіліся грошы, што рабіць? Вы патрэслі сяцёр. Усе браты больш ці менш абабіраюць сяцёр. Бог святы ведае, як вы змаглі вырваць паўтары тысячы франкаў з зямлі, на якой каштанаў болей, чым дзесяціфранкавых манет, але гэтыя грошы расцякуцца, як вада праз пальцы, і што пасля? Можа, вы будзеце працаваць? Праца ў вашым сённяшнім разуменні дае людзям кшталту Пуарэ закутак пансіёна Ваке на схіле веку. Хуткае ўзбагачэнне — вось праблема, якую зараз вырашаюць пяцьдзесят тысяч маладых людзей у вашым становішчы. Вы — адзін з такіх. Самі ацаніце, колькі намаганняў спатрэбіцца і якім бязлітасным будзе бой. Паколькі пяцідзесяці тысяч добрых месц няма, трэба, каб

вы жэрлі адзін аднаго, як павукі ў слоіку. Ці вядома вам, як прабіваецца дарога ў гэтым свеце? Бляскам генія ці спраўным хабарам, распустай трэба ўрывацца ў чалавечую масу нібы пушачнае ядро, альбо ўчапіцца за яе, як бацылы чумы. Сумленны не дасягне нічога. Перад сілай генія схіляюцца і яго ж ненавідзяць, спрабуюць абылгаць за тое, што ён бярэ ўсё, не дзелячыся, але пакуль ён стаіць цвёрда, перад ім схіляюцца з глыбокай пашанай. Карацей, калі генія не патрапілі знодаць з зямлёю, перад ім кленчаць, як перад богам. Прадажнасць усюды, талент — рэдкасць. Таму прадажнасць стала галоўнай зброяй пасрэднасцей, а іх — хоць гаць гаці, і на вастрыё гэтай зброі вы будзеце натыкацца ўвесь час. Вы ўбачыце, што жанчыны толькі на строі выдаткоўваюць болей дзесяці тысяч франкаў, хаця іх мужы зарабляюць на ўсё пра ўсё шэсць тысяч. Вы пабачыце, як чыноўнікі з заробкам тысяча дзвесце франкаў купляюць зямлю. Вы пабачыце, як жанчыны прадаюць сябе дзеля таго, каб сесці ў экіпаж сына пэра Францыі, бо той у Лоншане можа ездзіць па сярэдняй шашы. Вы ўжо бачылі, як дурны бацька Гар'ё мусіў плаціць па вэксалі, падпісаным дачкой, хаця муж графіні мае пяцьдзесят тысяч ліўраў даходу ў год. Я магу пайсці ў заклад, што ў Парыжы двух крокаў не зробіш, не сутыкнуўшыся з д'ябальскімі махінацыямі. Стаўлю галаву супраць храпкі гэтай салаты, што, закахаўшыся ў першую жанчыну, якая вам спадабаецца, багатую, маладую, прыгожую, — вы трапіце ў асінае гняздо. Усе яны не ў злагадзе з законам і вядуць вайну з мужамі на ўсіх франтах. Я не здолею скончыць, калі пачну апавядаць вам пра ўсе гешэфты, якія заключаюцца дзеля каханкаў, шмотак, дзяцей, сямейных патрэб, фанабэрыі і вельмі рэдка з добрымі намерамі. Вось чаму сумленны чалавек — агульны вораг. Але хто такі, па-вашаму, сумленны? У Парыжы сумленны чалавек — гэта той, хто дзейнічае моўчкі і не дзеліцца ні з кім. Няшчасных ілотаў[1], якія паўсюль цягнуць лямку, ніколі не атрымліваючы ўзнагароды, я называю іх брацтвам боскіх прастакоў, я на ўвазе не маю. Пэўна, што яны — яскравы ўзор дабрадзейнасці, шчодра прыпраўленай глупствам, але там, дзе яны, там і галеча. Я адсюль бачу, якія будуць твары ў гэтых праведных людзей, калі Бог злосна пажартуе і не з'явіцца на Страшны суд. Такім чынам, калі вам

[1] *Ілоты* — рабы ў старажытнай Спарце (Грэцыя).

хочацца хутка разбагацець, трэба або ўжо быць заможным або здавацца ім. Каб разбагацець, трэба весці гульню вялікімі кушамі, а калі ты будзеш сквапнічаць, дрэнь твая справа. У сотні прафесій, па якіх вы змаглі б працаваць, знойдзецца хіба дзесятак чалавек, што здолелі хутка дабіцца поспеху, прычым для публікі ўсе яны — злодзеі. Зрабіце адсюль вывад. Вось жыццё, якое яно ёсць. Жыццё не лепшае за кухню: смурод, мусіш рукі запэцкаць, калі хочаш, каб сытым быць, здолей толькі пасля запэцканыя рукі добра адмыць. У гэтым уся мараль нашай эпохі. Я ведаю свет, ён даў мне права так адгукацца аб ім. Думаеце, я яго ганьбую? Ані. Ён так наладжаны спакон вякоў, і маралісты ніколі яго не зменяць. Чалавек зусім не такі дасканалы, як здаецца. Некалі ён болей, некалі меней крывадушны, а дурні хутчэй крычаць: адзін — высокай маралі, а другі не такі. Не асуджаю багацеяў, выхваляючы просты народ, бо чалавек усюды аднолькавы, што наверсе, што ўнізе, што ў сярэдзіне. На кожны мільён людской грамады знойдзецца дзесяць зухаў, якія ставяць сябе вышэй усяго, нават вышэй законаў; я належу да іх ліку. Калі вы — чалавек такога кшталту, крочце проста, з высока ўзнятаю галавой. Але вам прыйдзецца змагацца з зайздрасцю, хлуснёй, пасрэднасцю, ісці супраць усяго грамадства. Напалеон сутыкнуўся з ваенным міністрам Абры, які ледзь не саслаў яго ў калоніі. Праверце самога сябе! Сачыце, ці мацнее ваша воля штораніцы ў параўнанні з учарашнім днём. Беручы ўсё гэта пад увагу, я зраблю вам прапанову, ад якой ніхто не адмовіцца. Слухайце ўважліва. У мяне, скажу я вам, выспела ідэя. Я задумаў пажыць патрыярхальным жыццём у вялізным, тысяч на сто арпанаў, маёнтку недзе на поўдні Злучаных Штатаў. Я хачу зрабіцца плантатарам, займець рабоў, зарабіць пару мільёнчыкаў на продажы валоў, тытуню, лесу, жыць па-княску, робячы, што ўздумаецца, адным словам, наладзіць жыццё, якое тут, дзе людзі туляцца ў каменных норах, сабе нават уявіць нельга. Я — вялікі паэт. Але вершаў я не пішу: мая паэзія знаходзіць выяўленне ў пачуццях і дзеяннях. У мяне ёсць пяцьдзесят тысяч франкаў, але іх мне хопіць толькі на нейкіх там сорак неграў. Мне патрэбны дзвесце тысяч франкаў, бо я хачу набыць дзвесце неграў, каб задаволіць сваю цягу да патрыярхальнага жыцця. Чаму неграў? Негры, скажу я вам, гэта нібы дарослыя дзеці; з імі можна рабіць усё, што хочаш, і ніводзін цікаўны праку-

рор не прыедзе і не запатрабуе справаздачы. Валодаючы такім чорным капіталам, праз дзесяць год я буду мець тры ці чатыры мільёны. Калі ж я разбагацею, ніхто не будзе пытаць у мяне: «Хто ты такі?» Я буду пан Чатыры Мільёны, грамадзянін Злучаных Штатаў, мне будзе пяцьдзесят год, я яшчэ не струхнею і нацешуся на свой смак і густ. Карацей кажучы, калі я забяспечу вас мільённым пасагам, вы дасцё мне дзвесце тысяч? Дваццаць працэнтаў камісійных, га? Хіба гэта многа? Вы пастараецеся, каб ваша нарачоная пакахала вас, ажаніўшыся, вы зробіце заклапочаны выгляд, што вы пакутуеце ад згрызот сумлення, тыдні з два пасумуеце. Аднойчы ноччу, пасля невялічкага спектакля, вы між пацалункамі аб'явіце жонцы, называючы яе «каханаю», што маеце дзве сотні тысяч франкаў доўгу. Самыя выкшталцоныя маладыя людзі разыгрываюць гэткі вадэвіль штодзённа. Маладая жанчына аддасць свой кашалёк чалавеку, які валодае яе сэрцам. Няўжо вы лічыце, што нешта на нашым гешэфце страціце? Сродак выйграць дзвесце тысяч у якой-небудзь справе вы знойдзеце. З вашымі грашыма і розумам вы створыце якое захочаце багацце. Ergo[1], за шэсць месяцаў вы забяспечыце шчасце сабе, любімай жонцы і вашаму Ватрэну, не гаворачы пра шчасце вашай сям'і, што ўзімку з-за недахопу дроў хукае на пальцы, каб сагрэць іх. Не здзіўляйцеся ні маёй прапанове, ні маім умовам. З шасцідзесяці бліскучых парыжскіх шлюбаў сорак сем засноўваюцца на падобных гешэфтах. Натарыяльная кантора прымусіла спадара...

— Што ад мяне патрабуецца? — прагна спытаў Расціньяк, перабіваючы Ватрэна.

— Амаль нічога, — адказаў гэты чалавек, выдаючы сваю радасць міжвольным рухам, у якім было нешта, падобнае на задавальненне рыбака, які адчуў, што рыба клюнула. — Слухайце мяне ўважліва! Сэрца няшчаснай, беднай дзяўчыны — губка, якая прагна ўбірае ў сябе каханне, і да таго сухая, што набракае зараз жа, як толькі на яе падае кропля пачуцця. Заляцацца да самотнай маладой асобы, калі яна бедная, у роспачы і нават не здагадваецца пра будучую спадчыну! Халера, гэта ўсё адно, што ведаць усе выйгрышныя нумары латарэі, мець усе казыры, гуляць на біржы, карыстаючыся доступам да крыніц інфармацыі; вы адразу створыце непарушны

[1] *Ergo* — такім чынам, значыць *(лац.)*.

шлюб на моцным падмурку. Няхай на дзяўчыну абрынуцца хоць мільёны, яна ўсё да гроша, нібы друз, высыпле да вашых ног. «Бяры, любы мой, бяры, Адольфе, бяры Альфрэдзе, бяры, Эжэне!» — скажа яна, калі Альфрэд ці Эжэн скемілі і ахвяравалі чымсьці дзеля яе. Пад ахвярай я разумею прадаць стары фрак і за выручаныя грошы з'есці з ёю крутоны[1] з шампіньёнамі ў рэстаране «Кадран блё», а адтуль увечары адправіцца ў тэатр «Амбігю-Камік» альбо яшчэ пайсці ў ламбард, закласці гадзіннік і купіць ёй шаль. Я ўжо маўчу пра любоўную лухту і розныя пісулькі, на якія жанчыны ласыя: напрыклад, пра пырсканне вадою на ліст, каб атрымліваліся плямы, быццам сляды слёз, калі каханы далёка: мне здаецца, вы выдатна ведаеце мову пяшчоты. Парыж, скажу я вам, як некрануты лес Паўночнай Амерыкі, дзе блукаюць дваццаць плямён розных дзікуноў, ілінойцаў, гуронаў. Усе яны займаюцца паляваннем у грамадскіх угоддзях. Асабіста вы, напрыклад, палюеце на мільёны, каб здабыць іх, выкарыстоўваеце пасткі, сілы, вабікі. Паляванне мае свае варыянты. Адны палююць на пасаг, другія на ліквідацыю прадпрыемства; адны ловяць душы, другія прадаюць сваіх даверніка ў, звязаўшы іх па руках і нагах. Хто вяртаецца з палявання з поўнай торбай трафеяў, таго вітаюць, ушаноўваюць, прымаюць у высокім свеце. Мушу аддаць належнае гэтай гасціннай зямлі: вы маеце дачыненне да самага хаўрусніцкага ў свеце горада. У той час, як ганарлівыя арыстакраты ўсіх еўрапейскіх сталіц не падпускаюць у сваё асяроддзе злодзея-мільянера, Парыж сустракае яго з абдымкамі, бяжыць на яго балі, вячэры і цягне чарку, каб выпіць за злачынствы.

— Дзе ж знайсці такую дзяўчыну? — спытаў Эжэн.

— Яна поруч з вамі.

— Мадэмуазель Віктарына?

— Менавіта.

— Як гэта?

— Будучая баранэса дэ Расціньяк ужо кахае вас.

— Яна ж шэлега нават не мае, — здзіўлена заўважыў Эжэн.

— Ага, нарэшце! Яшчэ два словы, і ўсё стане зразумела. Бацька Тайфэр — стары нягоднік, кажуць, што падчас рэвалюцыі ён застрэліў аднаго свайго сябра. Гэты чалавек — зух накшталт мяне ў тым сэнсе, што ў погля-

---

[1] *Крутоны* — грэнкі, падсмажаныя лустачкі хлеба *(франц.)*.

дах незалежны. Ён банкір, галоўны пайшчык таварыства «Фрэдэрык Тайфэр і кампанія», мае сына, якому хоча пакінуць усю маёмасць, занядбаўшы Віктарыну. Мне такая несправядлівасць не падабаецца, я, як Дон-Кіхот, абараняю слабога ад моцнага. Калі з волі боскай сын знікне, Тайфэр возьме дачку да сябе, бо яму захочацца мець спадчынніка: такое глупства закладзена ў чалавека прыродаю, а дзяцей банкір больш мець не можа, наколькі я ведаю. Віктарына — пяшчотная, мілая дзяўчына, бацьку яна прычаруе хутка і будзе круціць ім як ваўчком, карыстаючыся пугаю пачуцця. Ваша каханне моцна закране яе, яна вас не забудзе і выйдзе за вас замуж. Я бяру на сябе ролю боскага наканавання, дакладней, я зраблю так, каб Бог забраў яго. У мяне ёсць адзін адданы мне сябар, палкоўнік Луарскай арміі[1], якога нядаўна ўзялі на службу ў каралеўскую гвардыю. Ён прыслухоўваецца да маіх парад і стаў ультрараялістам; ён не з тых дурняў, што даражаць сваімі перакананнямі. Вось вам яшчэ адна парада, анёлачак: ніколі не трымайцеся за вашы перакананні ці словы. Калі будзе попыт, прадавайце іх. Пахваляючыся тым, што ніколі не адрачэцца ад сваіх перакананняў, чалавек абавязуецца заўжды крочыць па прамой лініі. Такі чалавек — боўдзіла з веру ў непарушнасць. Прынцыпаў няма, ёсць толькі падзеі; законаў няма, ёсць толькі абставіны. Чалавек вышэйшага кшталту прыстасоўваецца да падзей і абставін, каб кіраваць імі. Калі б прынцыпы і законы былі вечныя, народы не змянялі б іх, як мы — кашулю. Адзін чалавек неабавязкова павінен быць разумнейшы за цэлую нацыю. Чалавек, які для Францыі зрабіў менш за ўсіх, цяпер ушаноўваецца нібы нейкі фетыш, бо за ўсё хапаўся з вялікім запалам, а самае большае, на што ён здольны — гэта стаяць сярод станкоў у Прамысловым музеі з этыкеткаю «Лафайет»[2]; тым часам кожны лічыць за гонар шпурнуць камень у князя[3],

---

[1] *Луарская армія* — частка войска Напалеона, якая ўцалела пасля разгрому пры Ватэрлоо (1815). Па згодзе з пераможцамі адышла на поўдзень ад Луары і была расфарміравана.

[2] *Лафайет*, Мары-Жан-Поль, маркіз (1757—1834) — французскі палітычны дзеяч,ваеначальнік, дапамагаў амерыканцам у барацьбе за незалежнасць (1775—1783), камандаваў нацыянальнай гвардыяй на пачатку Вялікай французскай рэвалюцыі, разышоўся ў поглядах з якабінцамі і эмігрыраваў. У 1830 годзе садзейнічаў падзенню Бурбонаў і поспеху Ліпеньскай рэвалюцыі 1830 года.

[3] *Князя... які не дапусціў падзелу Францыі...* — маецца на ўвазе Шарль-Марыс Талейран (1754—1838), французскі дыпламат.

які пагарджае чалавецтвам у такой меры, каб пляваць яму ў твар столькі клятваў, колькі яно патрабуе, але князь не дазволіў падзелу Францыі на Венскім кангрэсе; і што ж, замест вянкоў у яго цэляць брудам. О, мне гэтыя справы вядомыя! Мне вядомы сакрэты шматлікіх людзей! Але годзе. Вось калі я сустрэну трох чалавек, згодных з ужываннем таго ці іншага прынцыпа, толькі тады паверу ў непахіснасць меркавання, а чакаць гэтага мне прыйдзецца вельмі доўга! Ва ўсіх судах не знойдзеш трох суддзяў, якія б мелі аднолькавае меркаванне па адным і тым жа артыкуле закона. Вяртаюся да майго надзейнага чалавека. Варта мне толькі папрасіць, ён Ісуса Хрыста зноў укрыжуе. Даволі аднаго слова, і ён знойдзе прычыну, як пасварыцца з тым лайдаком, які дзесяці франкаў шкадуе даслаць беднай сястрычцы, і...

У гэтым месцы Ватрэн узняўся, выцягся ў пазіцыю і зрабіў выпад наперад, быццам настаўнік фехтавання.

— І бывай, — дадаў ён.

— Які жах! — сказаў Эжэн. — Вы жартуеце, месье Ватрэн?

— Ля-ля-ля, спакой! Не прыкідвайцеся дзіцём; зрэшты, калі вам падабаецца, абурайцеся, сярдуйце. Кажыце, што я злодзей, паскуднік, лайдак, бандыт, але не называйце мяне ні махляром, ні шпіёнам. Ну, давайце мне перцу з імберцам, ганьце. Я вам дарую, у вашым узросце гэта натуральна, і я быў такім самым. Але падумайце. Аднойчы вы паступіце яшчэ горш. Вы будзеце заляцацца да прыгожай кабеткі і будзеце браць ад яе грошы. Вы ўжо думалі аб гэтым! — сказаў Ватрэн. — Бо як вам інакш дабіцца поспеху, калі не спекуляваць сваім каханнем? Дабрадзейнасць, мілы мой студэнт, на часткі не падробіш: ці яна ёсць, ці яе няма. Нам прапаноўваюць пакаяцца ў грахах. Нішто сабе сістэма: пашкадуеш аб злачынстве і яго табе даруюць! Спакусіць жанчыну, каб узняцца на вышэйшую ступеньку сацыяльнай лесвіцы, пасеяць звады між дзецьмі ў сям'і, карацей, пайсці на ўсе тыя брыдоты, што робяцца ціхма, але заўжды з мэтаю асабістых выгод. Што ж гэта па-вашаму? Хіба ўсё гэта робіцца дзеля веры, надзеі і дабрачыннасці? Чаму дэндзі, які за ноч пазбавіць дзіця паловы спадчыны, атрымае за гэта толькі два месяцы турмы, а небараку, які ўкрадзе тысячу франкаў «пры абцяжарваючых абставінах», упякуць на катаргу? Вось яны — законы. Няма ў іх ніводнага артыкула, які б не ўпіраўся ў бязглуздзіцу. Чалавек у

модных пальчатках і з хлуснёю на вуснах забівае, не праліваючы крыві, а з дапамогаю падману; забойца адамкнуў дзверы адмычкаю. І першае, і другое начныя злачынствы. Між тым, што я прапаноўваю вам зараз, і тым, што вы зробіце ў будучым, няма розніцы, акрамя пралітай крыві. А вы верыце ў нешта непахіснае на гэтым свеце! Трэба пагарджаць людзьмі і знаходзіць дзіркі ў сетцы зводу законаў, праз якія можна праслізнуць. Таямніца вялікіх багацця ў, набытых невядома як, схавана ў забытым, але чысцютка выкананым злачынстве.

— Ні слова болей, пане! Я не хачу вас слухаць, бо пачну сумнявацца нават у сабе самім. Пачуцці — вось мой адзіны настаўнік зараз.

— Як вам заўгодна, хлопча, але я лічыў вас мацнейшым. Болей я вам нічога не скажу. Зрэшты, апошняе слова. — Ён паглядзеў студэнту ў вочы і сказаў: — Вы ведаеце маю таямніцу.

— Малады чалавек, які адмаўляецца ад вашых паслуг, здолее забыцца пра яе.

— Добра сказалі, мне падабаецца. Не кожны быў бы такі далікатны. Не забывайце пра тое, што я магу для вас зрабіць. Даю вам два тыдні, каб прыняць або адхіліць маю прапанову.

«Якая жалезная логіка ў гэтага чалавека! — падумаў Расціньяк, назіраючы за тым, як Ватрэн спакойна адыходзіць, трымаючы палачку пад пахаю. — Ён у грубай форме сказаў мне тое ж самае, аб чым мадам дэ Басэан апавядала фігуральна. Сталёвымі кіпцюрамі ён ірваў мне сэрца. Не паспеў я ўсвядоміць, чаму я хачу трапіць да мадам дэ Нусінген, як ён ужо разгадаў матывы, якія мною рухаюць. Адным словам, гэты разбойнік двума словамі паведаміў мне пра дабрадзейнасць больш, чым усе іншыя людзі ды кнігі. Калі дабрадзейнасць несумяшчальная з адступленнямі ад сумлення, значыць, я абакраў сваіх сясцёр?» — нерваваўся ён, шпурляючы мяшкі на стол. Затым у яго галаве закруціліся вірам развагі: «Вернасць дабрадзейнасці — гэта нябеснае пакутніцтва. Так, усе вераць у дабрадзейнасць, але хто ж дабрадзейны? Народы зрабілі свабоду сваім кумірам, але дзе вы бачылі на зямлі свабодны народ? Мая маладосць яшчэ чыстая, як неба без аблачынкі, але хіба жаданне быць вялікім, багатым не вызначае неабходнасці лгаць, скарацца, поўзаць, зноў уздымаць галаву, ліслівіць, прыкідвацца? Хіба не з'яўляецца яно згодаю зрабіцца лёкаем у тых, хто сам

ілгаў, скараўся, поўзаў? Перш чым стаць іх хаўруснікам, трэба пабыць у іх служкаю. Дык не, я хачу працаваць сумленна, свята, хачу працаваць дзень і ноч і толькі працы быць абавязаным сваім багаццем. Хай маё багацце прыйдзе няхутка, але штовечар галава будзе спакойная, без адзінай благой думкі спачываць на падушцы. Што можа быць лепш, чым глядзець на сваё жыццё і бачыць, што яно незаплямленае, чыстае, як лілея. Я і маё жыццё — гэта як хлопец з маладою. Ватрэн прадэманстраваў мне, што здараецца праз дзесяць год шлюбу. Халера, аж галава закруцілася. Ні аб чым думаць не хачу, сэрца — найлепшы павадыр».

Голас таўстухі Сільвіі адарваў Эжэна ад мрояў. Яна паведаміла, што прыйшоў кравец, і студэнт так і з'явіўся перад ім, трымаючы ў руках два мяшэчкі з грашыма, прычым гэтая акалічнасць ніколькі яго не засмуціла. Эжэн прымерыў фракі, пашытыя для вечароў, а затым апрануў новы дзённы касцюм; адзенне цалкам змяніла яго. «Цяпер я не саступлю месье дэ Траю, — падумаў ён. — Нарэшце я маю шляхецкі выгляд!»

— Месье, — звярнуўся бацька Гар'ё, уваходзячы да Эжэна, — вы пыталіся, ці не ведаю я дамы, дзе бывае мадам дэ Нусінген...

— Так.

— Дык вось, у наступны панядзелак яна едзе на баль да маршала Карыльяна. Калі вы зможаце трапіць туды, раскажаце мне, ці добра павесяліліся мае дочкі, як яны былі апранутыя, зрэшты, усё.

— Як удалося вам даведацца аб гэтым, татачка Гар'ё? — пацікавіўся Эжэн, прапаноўваючы старому сесці ля каміна.

— Мне сказала яе пакаёўка, праз Тэрэзу і Канстанцу я ведаю ўсё, што робяць мае дочкі, — радасна адказаў ён.

Стары нагадваў юнага каханка, радаснага ад таго, што прыдумаў хітрую камбінацыю, якая дазволіла яму спрычыніцца да жыцця сваёй палюбоўніцы ўпотай ад яе.

— Вы іх пабачыце! — уздыхнуў ён, прастадушна выяўляючы сваю зайздрасць.

— Яшчэ невядома, — адказаў Эжэн. — Я зараз паеду да мадам дэ Басэан, спытаю, ці зможа яна прадставіць мяне жонцы маршала.

Усцешаны Эжэн марыў пра магчымасць з'явіцца ў палацы вікантэсы апранутым так, як цяпер, як будзе апранацца заўсёды. Тое, што маралісты называюць «бяз-

доннямі чалавечага сэрца», не ёсць што іншае як нянэўныя думкі, міжвольныя парыванні ўласнага інтарэсу. Усе гэтыя нечаканыя павароты — тэма для напышлівых разважанняў, усе гэтыя раптоўныя перамены разлічаны на лепшае задавальненне жаданняў. Убачыўшы сябе прыгожа апранутым, абутым, у модных пальчатках, Расціньяк забыўся на рашучасць заставацца верным дабрадзейнасці. Схіляючыся да несправядлівасці, маладосць не наважваецца глядзецца ў люстэрка сумлення, тады як сталы ўзрост ужо бачыў сябе ва ўсялякім выглядзе: вось і ўся розніца між двума перыядамі жыцця.

За некалькі дзён два суседы, Эжэн і бацька Гар'ё, сталі добрымі сябрамі. Іх патаемнае сяброўства вынікала з тых самых псіхалагічных прычын, якія спарадзілі супрацьлеглыя пачуцці ў дачыненнях студэнта да Ватрэна. Дзёрзкі філосаф, задумаўшы вывучыць уздзеянне нашых пачуццяў на фізічны свет, знойдзе не адзін доказ матэрыяльнаму існаванню гэтага ўздзеяння ў дачыненнях між людзьмі і жывёламі. Які фізіянаміст хутчэй разгадае характар чалавека, чым сабака: ён адразу адчувае, любіць яго чалавек ці не любіць. *Цэпкія атамы* — гэты выраз увайшоў ва ўсе мовы і застаецца ўжывальным, тым самым абвяргаючы філасафічныя недарэчнасці аматараў адвейваць, нібы мякіну, простыя словы. Любоў перадаецца. Пачуццё на ўсё накладае свой адбітак і мінае прастору. Ліст — гэта сама душа, настолькі дакладнае рэха жывога голаса, што далікатныя душы адносяць яго да найдаражэйшых скарбаў кахання. Несвядомае пачуццё бацькі Гар'ё дасягала вышэйшых ступеняў сабачага нюху, і ён умомант адчуў спагаду, дабрыню, юнацкія сімпатыі да сябе, якія ўзніклі ў душы Эжэна. Хаўрус нараджаўся, але яшчэ не прывёў да шчырасці. Выказваючы жаданне ўбачыць мадам дэ Нусінген, Эжэн не разлічваў на тое, што трапіць да яе праз старога, але спадзяваўся, што той можа прагаварыцца і гэтым паспрыяць поспеху. Бацька Гар'ё расказваў пра дачок толькі тое, аб чым Эжэн сам апавядаў за сталом у дзень, калі зрабіў два візіты.

— Даражэнькі пане, — сказаў стары на наступны дзень, — як вы маглі падумаць, што мадам дэ Рэсто прагневалася на вас за тое, што вы згадалі маё імя? Мае дочкі моцна любяць мяне. Я — шчаслівы бацька. Вось толькі абодва зяці да мяне паставіліся блага. Я не хацеў, каб дарагія для мяне істоты пакутавалі ад маіх неладоў

з іх мужамі, і вырашыў надалей бачыцца з імі толькі ўпотай. Гэтая таямнічасць дае мне многа радасці, невядомай іншым бацькам, тым, хто можа бачыць сваіх дачок у любы час. А я, як вы разумееце, такой магчымасці не маю. Таму, калі надвор'е добрае, я адпраўляюся на Елісейскія палі, папярэдне спытаўшыся ў пакаёвак, ці збіраюцца мае дочкі выязджаць. Я чакаю там, дзе яны маюць праехаць, а калі набліжаюцца карэты, у мяне сэрца мацней б'ецца; я любуюся імі, апранутымі святочна і ўрачыста. Праязджаючы побач, яны вітаюць мяне ўсмешкай, нібы яснае сонейка дорыць прамень. Я застаюся чакаць, а яны мусяць вяртацца. Я іх пабачу яшчэ раз: паветра ім карыснае, яны заружавеюцца, і я чую, як вакол мяне кажуць: «Якая прыгажуня!» Маё сэрца радуецца; ці ж не мая кроў! Я люблю тых коней, якія іх возяць, мне хацелася б стаць тым маленькім сабачкам, што трымаюць мае дочкі на каленях. Я жыву іх уцехамі. Кожны любіць на свой манер, ад майго манеру нікому кепска не робіцца, чаму людзі турбуюцца за мяне? Я па-свойму шчаслівы. Хіба я парушаю закон тым, што хаджу да дачок штовечар, каб пабачыць, як яны выязджаюць з дому на баль? Як бывае мне сумна, калі я прыязджаю запозна і чую: «Спадарыня паехала». Аднойчы я прачакаў да трэцяй гадзіны ночы, каб пабачыць Назі, бо не бачыў яе два дні. Ад радасці я ледзь не памёр! Прашу вас, калі гаворка зойдзе пра мяне, кажыце толькі, якія добрыя мае дочкі. Яны гатовы заваліць мяне ўсялякімі дарункамі, я іх спыняю, кажу: «Не трацьце свае грошы, што я буду рабіць з падарункамі? Мне нічога не трэба». І сапраўды, хто я такі? Бяздольны нябожчык, цягаюся душою паўсюль за сваімі дочкамі. Калі пабачыце мадам дэ Нусінген, скажаце, якая з іх вам спадабаецца болей, — дадаў стары пасля паўзы, заўважыўшы, што Эжэн збіраецца пайсці на шпацыр у сад Цюільры[1], чакаючы часу, калі можна будзе з'явіцца да мадам дэ Басэан.

Шпацыр стаўся для студэнта фатальным. Некалькі жанчын заўважылі яго. Ён быў такім прыгожым, маладым, апранутым з густам і элегантна! Адчуваючы, што на яго глядзяць ледзь не з замілаваннем, ён забыўся на абабраных сясцёр і цётку, забыўся на дабрадзейную грэблівасць. Ён бачыў, што над яго галавой праляцеў

---

[1] *Сад Цюільры* — старая рэзідэнцыя французскіх каралёў у Парыжы.

дэман, якога лёгка прыняць за анёла, той сатана на стракатых бліскучых крылах, які абсыпае рубінамі, абстрэльвае залатымі стрэламі франтоны палацаў, барвовіць жанчын, асвятляе дурным бляскам троны, такія сціплыя напачатку, і ён паслухаўся бога балбатлівай пыхі, бразгат якога мы прымаем за сведчанне магутнасці. Якімі бы цынічнымі не былі словы Ватрэна, яны запалі яму ў душу, нібы ў памяці старой дзеўкі захоўваецца гнюсны профіль зводніцы і яе словы: «Кахання, золата па завязку».

Бяздумна прабадзяўшыся некаторы час, Эжэн з'явіўся недзе каля пяці гадзін да мадам дэ Басэан, і яго юнае безабароннае сэрца атрымала страшэнны ўдар. Дагэтуль вікантэса трымалася з пачцівай ветлівасцю, гасціннай прыязнасцю, прывітымі арыстакратычным выхаваннем, але бездакорнымі толькі ў тым выпадку, калі яны ідуць ад сэрца.

Калі Эжэн увайшоў, мадам дэ Басэан холадна прывіталася і суха сказала:

— Месье дэ Расціньяк, я не магу прыняць вас, прынамсі зараз, я занята справамі...

Для назіральнага чалавека, а Расціньяк вельмі хутка стаў ім, фраза, жэст, позірк, тон голаса — усё сведчыла аб характары і каставых звычках. Пад аксамітнаю пальчаткаю ён убачыў жалезную руку; пад манерамі — культ асобы і эгаізм; пад лакам — дрэва. Нарэшце ён зразумеў словы «мы, кароль», якія бяруць пачатак пад плюмажам трона, а канец можна знайсці пад шышкаю шлема апошняга шляхціча. Эжэн занадта давяраўся словам, па іх мяркуючы аб высакароднасці жанчыны. Як і ўсе няшчасныя, ён з добрай волі падпісаў цудоўную дамову, якая мае злучыць дабрачынца з падапечным, дзе ў першым пункце ўсталёўваецца поўная роўнасць паміж людзьмі вялікай душы. Дабрачыннасць, якая б паяднала дзве істоты ў адно — небяспечнае пачуццё, такое ж рэдкае, як сапраўднае каханне. Абодва гэтыя пачуцці могуць нараджацца толькі ва ўзвышаных душах. Расціньяк дужа хацеў трапіць на баль да герцагіні дэ Карыльяно, таму ён праглынуў знявагу і дрыжачым голасам адказаў:

— Мадам, калі б размова не ішла пра патрэбы першараднай важнасці, я не адрываў бы вас ад спраў; будзьце ласкаваю, дазвольце мне зайсці да вас пазней, я пачакаю.

— Ну, добра, прыходзьце да мяне вячэраць, — адказала яна крыху сканфужана, усвядоміўшы, як жорстка прагучалі яе словы.

У гэтай жанчыне дабрыні было не менш, чым высакароднасці.

Эжэна кранула раптоўная змена настрою, але ўсё роўна ён падумаў адыходзячы: «Паўзі, трывай. Якімі ж бываюць астатнія, калі лепшая з жанчын у адзін момант здольна сцерці са сваёй памяці абяцанні дружбы і адшпурнуць цябе, быццам стары чаравік? У такім разе выходзіць, што кожны клапоціцца толькі пра сябе? Праўда, яна не вінавата, што мне патрэбна яе дапамога, і дом яе — не лавачка, дарма я кідаюся да яе. Трэба, як кажа Ватрэн, зрабіцца пушачным ядром».

Але горкія развагі студэнта хутка былі выціснуты думкамі пра вячэру ў вікантэсы. Так, быццам фатальны збег абставін, самыя нязначныя падзеі жыцця, нібы змовіўшыся, вялі Эжэна да таго шляху, які вымагаў ад маладога чалавека, па слушнай заўвазе жудаснага сфінкса з пансіёна Ваке, забіваць, каб самога не забілі, падманваць, каб яго не падманулі, пакінуць на мяжы сумленне, сэрца, нацягнуць маску, бязлітасна гуляць людзьмі і, як у Лакедэмоне[1], рыхтавацца да поспеху непрыкметна, каб заслужыць вянок.

Калі Эжэн вярнуўся, вікантэса сустрэла яго ласкава як заўсёды. З гасцёўні яны накіраваліся ў сталовую, дзе чакаў ужо віконт дэ Басэан. Стол ззяў раскошаю, якая ў часы Рэстаўрацыі, як вядома, дасягнула вышыні. Месье дэ Басэан, падобна большасці задаволеных людзей, мог цешыцца ўжо толькі прыгожым сталом, а што датычыць гурманства, то ён належаў да школы Людовіка XVIII і герцага д'Эскара[2].

Вось чаму яго стол ззяў двайной раскошаю: для смаку і для вока. Ніколі раней падобнага відовішча не бачылі здзіўленыя вочы Эжэна, упершыню малады чалавек вячэраў у адным з тых дамоў, дзе арыстакратычнасць перадавалася па спадчыне. Толькі што выйшлі з моды начныя вячэры, якімі заканчваліся балі ў часы імперыі, калі ваенныя мусілі падсілкоўвацца да будучых баёў і на

---

[1] *Лакедэмон* — горад у Грэцыі, вядомы як Спарта. Там удзельнікі алімпійскіх гульняў рыхтаваліся да спаборніцтваў.

[2] *...да школы Людовіка XVIII ды герцага д'Эскара...* — кароль з дынастыі Бурбонаў і яго набліжаны любілі добра паесці.

чужыне і на радзіме. Да гэтага часу Эжэн быў толькі на балях. Пазней ён будзе славіцца сваёй упэўненасцю, паступова ён набіраў яе і цяпер і таму не разгубіўся. Але калі чалавек з багатай фантазіяй бачыць чаканны срэбраны посуд, мноства вытанчанай аздобы на прыгожа прыбраным бяседным стале, калі ўпершыню захапляецца бязгучнымі рухамі прыслугі, яму, вядома, цяжка не аддаць перавагу гэтаму заўжды элегантнаму жыццю перад іншым жыццём, поўным нястач, якое ён збіраўся выбраць яшчэ сёння раніцай. Думка на хвіліну перанесла Эжэна назад, у сямейны пансіён, і яго ахапіла такая моцная жуда, што ён пакляўся сабе ў студзені перабрацца адтуль у лепшае месца, дарэчы, заадно збегчы ад Ватрэна, шырокую далонь якога ён адчуваў на сваім плячы. Калі прыстойны чалавек задумаецца пра ўсе тыя прыхаваныя ці адкрытыя формы распусты, узгадаваныя ў Парыжы, яму давядзецца задаць сабе пытанне: за якім зманам дзяржава адкрывае ў Парыжы навучальныя ўстановы, збірае там маладых людзей? І як яшчэ толькі ў гэтым горадзе не знікае павага да жанчын, як золата, выстаўленае ў драўляных чашах мянял, не знікае з гэтых чашаў? Але калі ўспомніць, што злачынстваў і парушэнняў у Парыжы амаль не чыніцца нават маладымі, пачынаеш паважаць цярплівых Танталаў[1], якія вядуць барацьбу з сабою і перамагаюць у гэтай барацьбе!

Узяць хаця б, да прыкладу, нябогу студэнта ды апісаць яго барацьбу з Парыжам, атрымаўся б адзін з самых драматычных эпізодаў для кнігі пра сучасную цывілізацыю. Дарма пазірала на Эжэна мадам дэ Басэан, ён нічога не хацеў казаць у прысутнасці віконта.

— Вы правядзеце мяне сёння да італьянцаў? — спытала вікантэса мужа.

— Вы і ўявіць не можаце, колькі прыемнасці прынесла б мне падпарадкаванне вашым жаданням, але мне трэба сустрэцца з тым-сім у тэатры «Вар'етэ», — адказаў віконт з іранічнай вежлівасцю, якая падманула студэнта.

«Са сваёй каханкай», — падумала вікантэса.

— А што, д'Ажуда сёння ўвечары да вас не прыедзе? — спытаў віконт.

— Не, — незадаволена адказала яна.

---

[1] *Тантал* — герой, асуджаны багамі на вечныя мукі голаду і смагі, нягледзячы на тое, што блізка была вада і садавіна *(грэч. міф.)*.

— Дык, калі вам абавязкова патрэбен кавалер, вазьміце з сабою месье дэ Расціньяка.

Вікантэса з усмешкаю зірнула на Эжэна.

— Гэта надта скампраметуе вас.

— «Француз любіць небяспеку, бо праз яе ён здабывае славу», сказаў месье дэ Шатабрыян[1], — адказаў Расціньяк, схіляючы галаву ў паклоне.

Праз некалькі хвілін ён ужо імчаўся разам з мадам дэ Басэан на двухмеснай карэце ў модны тэатр. Калі яны ўвайшлі ў ложу, размешчаную насупраць сцэны, і ўсе ларнеты былі накіраваны на яго цудоўна апранутую спадарожніцу і на яго самога, усё Эжэну здалося нейкай феерыяй. Адно зачараванне ішло за другім. Чароўнасць чароўнасцю паганяла.

— Вы хацелі пагаварыць са мной, — сказала мадам дэ Басэан. — Ах, дарэчы, глядзіце, праз тры ложы ад нас — мадам дэ Нусінген. Яе сястра і месье дэ Трай з другога боку.

Пры гэтых словах вікантэса паглядзела на ложу мадэмуазель Рошфід. Калі яна пераканалася, што маркіза д'Ажуда там няма, яе твар адразу заззяў.

— Яна чароўная, — сказаў Эжэн, паглядзеўшы на мадам дэ Нусінген.

— У яе вейкі светлаватыя.

— Так, але да чаго прыгожы зграбны стан!

— А рукі тоўстыя.

— Прыгожыя вочы!

— Задоўгі твар.

— Доўгі твар — прыкмета высакародства.

— Яе шчасце, што ёсць хоць такі. Зірніце, як яна бярэ і кладзе свой ларнет. Гар'ё была, Гар'ё і засталася ва ўсіх рухах, — сказала вікантэса, здзіўляючы Эжэна.

Сапраўды, мадам дэ Басэан разглядвала залу праз ларнет і, здавалася, не звяртала ніякай увагі на мадам дэ Нусінген, хаця не выпускала з віду ніводнага яе жэста. Публіка з'ехалася выключна прыгожая. Дэльфіну дэ Нусінген цешыла ўвага маладога, прыгожага, элегантнага кузена мадам дэ Басэан, які не зводзіў ларнета з яе ложы.

---

[1] *Шатабрыян*, Франсуа-Рэнэ дэ — (1768—1848) французскі пісьменнік, аўтар узнёсла-сентыментальнага рамана «Геній хрысціянства», адной з вяршынь рамантызму.

— Калі вы і далей будзеце ўвесь час углядацца толькі ў яе, вы наробіце скандалу, месье дэ Расціньяк. Назаляючы, яшчэ ніхто ніколі поспеху не дабіваўся.

— Дарагая кузіна, вы мне ўжо шмат у чым дапамаглі, калі вы хочаце давесці вашу добрую справу да канца, прашу вас, акажыце яшчэ адну паслугу; для вас гэта няцяжка, для мяне — вельмі неабходна. Я закахаўся.

— Ужо?

— Так.

— У гэтую жанчыну?

— А хіба мае дамаганні ў іншым месцы маглі б атрымаць поспех? — сказаў ён, пранікліва пазіраючы на кузіну. — Спадарыня герцагіня дэ Карыльяна сябруе са спадарыняй герцагіняй Берыйскай, — працягваў ён пасля паўзы, — і, напэўна, вы з ёю бачыцеся, будзьце так ласкавы, пазнаёмце мяне з ёю і вазьміце мяне з сабою да яе на баль у панядзелак. Там я сустрэну мадам дэ Нусінген і пачну сваю першую атаку.

— Ахвотна, — сказала вікантэса. — Вашы сардэчныя справы пойдуць цудоўна, калі вы ўпадабалі яе. Бачыце, у ложы прынцэсы Галатыён сядзіць дэ Марсэ. Для мадам дэ Нусінген гэта пакута, яна пакутуе ад рэўнасці. Лепшага моманту, каб падысці да жанчыны, асабліва да жонкі банкіра, не знойдзеш. Усе гэтыя дамы з Шасэ д'Антэн любяць помсціць.

— А што зрабілі б вы ў падобным выпадку?

— Я? Пакутавала б моўчкі.

У гэты момант у ложы мадам дэ Басэан з'явіўся маркіз д'Ажуда.

— Я перапыніў усе справы дзеля таго, каб зноў пабачыць вас, — сказаў ён, — і паведамляю вам пра гэта са спадзяваннем, што мая ахвяра недарэмная.

Твар вікантэсы так зззяў, што Эжэн адразу зразумеў розніцу між выразам шчырага кахання і крыўляннямі парыжскага какецтва. У захапленні сачыў Эжэн за кузінаю, моўчкі саступіўшы месца месье д'Ажуда.

«Жанчына, якая кахае так моцна — высакароднейшае, нябеснае стварэнне! — падумаў ён. — А гэты чалавек мяняе яе на нейкую ляльку. Як можна ёй здраджваць?»

Ён адчуў, як у сэрцы ўскіпае дзіцячая злосць. Яму карцела схіліцца да ног мадам дэ Басэан, ён хацеў бы валодаць дэманічнай сілай, каб панесці вікантэсу ў сваім сэрцы так, як арол узносіць з даліны ў неба белую козачку-сысунка. Пачуццё знявагі апанавала яго, бо ў

гэты вялізны музей прыгажосці ён прыйшоў без уласнай карціны — уласнай каханкі. «Калі маеш каханку і добрае месца, ты — кароль», — думаў ён. І ён паглядзеў на мадам дэ Нусінген, як зняважаны чалавек глядзіць на свайго крыўдзіцеля. Вікантэса павярнула да яго галаву і вачыма падзякавала студэнту за яго сціпласць. Першы акт скончыўся.

— Вы дастаткова ведаеце мадам дэ Нусінген, каб прадставіць ёй месье дэ Расціньяка? — спытала вікантэса ў маркіза д'Ажуда.

— Ёй будзе вельмі прыемна бачыць пана дэ Расціньяка ў сваёй ложы, — сказаў маркіз.

Прыгожы партугалец узняўся, узяў студэнта пад руку, і праз хвіліну яны ўжо стаялі побач з мадам дэ Нусінген.

— Спадарыня баранэса, — звярнуўся да яе маркіз д'Ажуда, — маю гонар прадставіць вам шэвалье Эжэна дэ Расціньяка, кузена вікантэсы дэ Басэан. Вы так зачаравалі пана Эжэна, што я захацеў ашчаслівіць яго, набліжаючы да вас.

Маркіз сказаў гэтыя словы з пэўнай жартаўлівасцю, пад якой хавалася грубаватая сутнасць. Зрэшты, яна заўсёды нават падабаецца жанчынам, калі, зразумела, гучыць у належнай форме. Мадам дэ Нусінген усміхнулася і прапанавала Эжэну сесці на месца мужа, які толькі што выйшаў.

— Я не асмельваюся прапанаваць вам застацца поруч, — сказала яна. — Калі маюць шчасце сядзець побач з мадам дэ Басэан, яе не пакідаюць.

— Але мне здаецца, мадам, — шапнуў Эжэн, — што, каб задаволіць кузіну, мне лепей застацца з вамі. — Пасля ён голасна дадаў: — Да прыхода спадара маркіза мы размаўлялі пра вас і вашу прыгажосць.

Месье д'Ажуда пакланіўся і выйшаў.

— Вы сапраўды намерыліся застацца са мной? — спытала баранэса. — Тады мы зможам бліжэй пазнаёміцца: пасля гутаркі з мадам дэ Рэсто мне захацелася ўбачыць вас.

— У такім разе графіня вельмі няшчырая, бо яна забараніла прымаць мяне.

— Чаму?

— Мне сорамна расказваць вам пра прычыны, але я разлічваю на вашу паблажлівасць, раскрываючы гэтую таямніцу. Справа ў тым, што я — сусед вашага бацькі. Я не ведаў, што графіня дэ Рэсто — яго дачка і меў

неасцярожнасць незнарок завесці аб ім размову і гэтым угнявіў вашу сястру і яе мужа. Не паверыце, якой ганебнай здалася даччына няўдзячнасць герцагіні дэ Ланжэ і маёй кузіне. Я расказаў ім, што адбылося са мной у доме Рэсто, і яны за жываты браліся ад смеху. Вось тады мадам дэ Басэан упершыню згадала вас, адзначыўшы, што вы вельмі чула адносіцеся да майго суседа, месье Гар'ё. Ды і чаму б, сапраўды, вам яго не любіць? Ён вас абагаўляе ды так палка, што я нават пачаў раўнаваць. Сёння раніцай мы з ім дзве гадзіны гутарылі пра вас, а ўвечары, пад уплывам размовы з вашым бацькам, я распытваў кузіну, ці вы такая ж прыгожая, як і чулая. Жадаючы паспрыяць майму шчыраму захапленню, мадам дэ Басэан прывезла мяне сюды і з уласціваю ёй ласкаю паведаміла, што я вас пабачу.

— Як, пане, — спытала жонка банкіра, — я ўжо мушу быць вам удзячнаю? Яшчэ трошкі, і мы станем старымі сябрамі.

— Сяброўства з вамі, напэўна, было б незвычайным, — сказаў Расціньяк, — але я ніколі не захачу стаць вашым сябрам.

Банальная лухта, якую плятуць дэбютанты ў свеце, халоднаму воку чытача здаецца бяздарнаю, але жанчынам яна падабаецца. Жэст, тон, позірк маладога чалавека прыдаюць усяму гэтаму мноства адценняў. Расціньяк здаўся мадам дэ Нусінген цудоўным. Потым, як і ўсе жанчыны, калі яны не могуць адказаць на смелыя пытанні, баранэса перавяла размову на іншую тэму.

— Так, мая сястра наклікае нараканні сваімі адносінамі да беднага бацькі. Бацька быў для нас сапраўды богам. Я саступіла рашучаму загаду месье дэ Нусінгена і стала бачыцца з бацькам толькі раніцамі. Я доўга адчувала сябе няшчаснаю, я плакала. Гвалт над маімі пачуццямі пасля моцных шлюбных звадаў яшчэ болей пахіснуў устоі сямейнага жыцця. У вачах свету я, пэўна, самая шчаслівая жанчына ў Парыжы, аднак, я самая няшчасная. Вы можаце палічыць безразважным, што я так разгаварылася. Але вы — знаёмы майго бацькі і, значыць, вы не можаце быць мне чужым.

— Вы ніколі не сустрэнеце чалавека, — сказаў Эжэн, — які гарэў бы такім жаданнем належаць вам, як я. Чаго вы, жанчыны, шукаеце? Шчасця, — адказаў ён сам сабе пранікнёным голасам. — Так, сапраўды, каб жанчына была шчасліваю, яе павінны любіць, абагаў-

ляць, ёй патрэбны сябра, каб было каму паверыць жаданні, усе яе фантазіі, турботы, радасці, раскрыць душу з яе мілымі заганамі і цудоўнымі якасцямі і не баяцца, што табе здрадзяць; паверце, адданае, заўжды палкае сэрца знойдзеце толькі ў маладога чалавека, поўнага ілюзій, які гатовы загінуць па адзінаму вашаму слову, які яшчэ зусім не ведае свет, і не хоча яго ведаць, бо вы для яго — увесь свет. Я вам скажу, і вы пасмяецеся з маёй наіўнасці, я прыехаў з глухой правінцыі, мая душа чыстая, на сваім шляху я сустракаў толькі людзей са шчырым сэрцам. Я не чакаў, што знайду каханне. Я выпадкова сустрэўся з кузінай, і яна прыняла ў маім лёсе самы сардэчны ўдзел. Назіраючы за ёй, я зразумеў, якім вялізным скарбам адорвае чалавека любоў, і цяпер я, як Керубіна[1], кахаю ўсіх жанчын і чакаю, калі змагу стаць адданым адной з іх. Калі я ўвайшоў у тэатр і пабачыў вас, нібы ветрам падхапіла мяне і панесла да вас. Я ўжо столькі думаў пра вас да гэтага! Але я нават не сніў, што вы такая прыгожая. Мадам дэ Басэан забараніла мне глядзець на вас так часта: яна не ведае, якая вялікая спакуса бачыць вашы пунсовыя вусны, беласнежны твар, пяшчотныя вочы... Можаце лічыць мяне безразважным таксама, але не спыняйце мяне.

Няма жанчынам большай уцехі, чым чуць, як бруіцца крыніца пяшчотных слоў. Нават калі яна адказаць на іх ніяк не можа, нават самая вялікая святоша будзе ўважліва слухаць. Пачаўшы з гэтага, Расціньяк высцілаў словы, як пер'е. Яго голас стаў вабна ціхім. Мадам дэ Нусінген, час ад часу пазіраючы на дэ Марсэ, заахвочвала Эжэна ўсмешкамі. Дэ Марсэ не пакідаў ложы княгіні Галатыён. Расціньяк заставаўся побач з мадам дэ Нусінген да таго моманту, калі вярнуўся барон, каб правесці жонку дадому.

— Мадам, — звярнуўся да яе Эжэн, — я спадзяюся ўбачыць вас яшчэ на балі ў герцагіні дэ Карыльяна.

— Паколькі спатарыня фас сапрашае, — сказаў барон, мажны эльзасец, круглы твар якога сведчыў пра небяспечную і хітрую празарлівасць, — фы мошаце пыць пэўным, што фам заўсёды пудуць рады.

«Справы мае пайшлі як па масле, калі яна не спалохалася маіх слоў: «Маглі б вы пакахаць мяне?» Конік

---

[1] Юны паж, адна з дзеючых асоб камедыі Бамаршэ (1732—1799) «Жаніцьба Фігаро».

мой зацугляны, застаецца ўскочыць у сядло і ўзяць павадок у рукі», — думаў Эжэн, накіроўваючыся да мадам дэ Басэан і месье д'Ажуда, каб адвітацца.

Нябога студэнт не ведаў, што баранэсу хвалявала зусім іншае: яна чакала апошні ліст ад дэ Марсэ, адзін з тых лістоў, якія рвуць сэрца на часткі. Шчаслівы ад уяўнага поспеху, Эжэн правёў вікантэсу да знешняй каланады, дзе ўсе чакалі свае карэты.

— Ваш кузен сам на сябе не падобны, — са смехам сказаў партугалец вікантэсе, калі Эжэн іх пакінуў. — Ён сарве банк. Ён спрытны, як уюн, і я думаю, што ён далёка пойдзе. Толькі вы маглі падабраць яму якраз тую жанчыну, якая адчувала б патрэбу ў суцяшэнні.

— Але, — заўважыла мадам дэ Басэан, — трэба яшчэ ведаць, ці кахае яна яшчэ таго, хто яе пакідае.

З Італьянскага тэатра на вуліцу Нёў-Сент-Жэнеўеў студэнт вяртаўся пешкі, і ў яго галаве вірыліся самыя салодкія мары. Ён не праміну ў заўважыць, з якой увагай сачыла за ім мадам дэ Рэсто, калі ён сядзеў у ложы вікантэсы і калі гутарыў з мадам дэ Нусінген, і ён зрабіў выснову, што дзверы графскага дома зноў адчыняцца перад ім. Такім чынам, ён ужо меў чатыры знаёмствы ў вышэйшым свеце; да ліку знаёмых ён прылічваў таксама ўжо і жонку маршала Карыльяна, перакананы ў тым, што спадабаецца ёй. Расціньяк здагадваўся наперад, хаця не ўсведамляў ясна да канца, як гэта зрабіць, што ў складаным механізме гульні ўсеагульных інтарэсаў трэба схапіцца за якое-небудзь кола, каб апынуцца наверсе машыны; Эжэн адчуваў у сабе сілу стаць спіцай у яе вядучым коле.

«Калі мадам дэ Нусінген мною зацікавіцца, я навучу яе кіраваць мужам, які варочае мільёнамі, ён дапаможа мне ўмомант стаць багатым». Адкрыта ён сабе гэтага не казаў, бо быў яшчэ не настолькі дасведчаным, каб аналізаваць, ацэньваць сітуацыю і пралічваць варыянты; яго думкі бялелі недзе на далягляд зе ў форме няясных хмарак, і хаця па цынічнасці Эжэну яшчэ было далёка да Ватрэна, але калі пракаліць яго спадзяванні ў гарніле сумлення, аснова атрымалася б не намнога чысцейшая. Шляхам такіх гешэфтаў са сваім сумленнем людзі коцяцца да маральнай разбэшчанасці, у такой ступені характэрнай для сучаснай эпохі, калі радзей, чым у іншы час, сустракаюцца людзі шчырыя, добрасардэчныя, якія ніколі не скараюцца злу і самае нязначнае адхіленне з

сумленнага шляху лічаць злачынствам, — цудоўныя вобразы сумленнасці, дзякуючы якім мы можам захапляцца двума шэдэўрамі: Альцэстам у Мальера ды нядаўна — Джэні Дынс і яе бацькам у рамане Вальтэра Скота[1]. Але можа здарыцца і так, што процілеглы твор, малюнак крывых сцяжын, на якія заганяў сваё сумленне чалавек свецкі, амбіцыйны, рупячыся аб тым, каб знешнія прыстойнасці не парушаліся, спрабуючы абысці зло, таксама атрымаецца прыгожы і драматычны. Да пансіёна Расціньяк падышоў ужо з галавою закаханым у мадам дэ Нусінген. Яна здавалася яму зграбнай, лёгкай, быццам ластаўка. Пяшчотныя вочы, далікатная і шаўкавістая скура, такая тонкая, што відно было, як пад ёй пульсуе кроў, чароўны голас, бялявая галоўка — усё ўзнікала ў яго ўспаміне. Студэнт моцна пастукаў у дзверы бацькі Гар'ё.

— Суседзе, я бачыў мадам Дэльфіну, — паведаміў Эжэн.

— Дзе?

— У Італьянскім тэатры.

— Яна добра бавілася?.. Заходзьце ж.

Стары ўстаў у адной кашулі, адамкнуў дзверы і зноў лёг у ложак.

— Раскажыце мне пра Дэльфіну, — папрасіў ён.

Эжэн упершыню апынуўся ў пакоі, дзе жыў бацька Гар'ё і не мог схаваць здзіўлення: такая галеча ў параўнанні з каралеўскім строем дачкі. Акно без фіранак, шпалеры месцамі з-за вільгаці адсталі ад сцяны і пакарабаціліся, агаліўшы пажаўцелую ад дыму тынкоўку. Стары ляжаў на лядашчым ложку пад вынашанай коўдрай і ватовым кароткім пакрывалам на нагах, сшытым з ласкутоў старых сукенак мадам Ваке. Падлога сырая, паўсюль ляжаў пыл. Насупраць акна стаяў стары пузаты з ружовага дрэва камод, з выгнутымі ручкамі ў форме вінаграднай лазы і аздоблены меднымі галінкамі і лісцем; стары ўмывальнік з драўлянаю дошкаю, на якой стаяў гляк з вадою ў тазіку і прыборы для галення. У кутку стаялі чаравікі, каля ложка — тумбачка без дзверцаў, без мармуровай дошкі зверху; у каміне не было нават следу

---

[1] *Альцэст* — герой камедыі Мальера «Мізантроп», ён адкрыта выказвае сваё незадавальненне грамадствам, якое яго акружае; *Джэні Дынс* — самаахвярная гераіня рамана Вальтэра Скота «Эдынбургская цямніца».

прыску, побач з камінам — квадратны стол з арэхавага дрэва, папярочкай якога бацька Гар'ё карыстаўся, каб пагнуць срэбны посуд. Агульную мізэрную карціну дапаўнялі трухлявая канторка, на якой ляжаў капялюш старога, фатэль з саламяным сядзеннем і два крэслы. Біла полага было прымацавана да столі нейкай анучкай, але замест полага з яго звісаў якісьці ласкут тканіны ў белую і чырвоную клетку. Самы бедны рассыльны жыў у сябе на гарышчы не так бедна, як бацька Гар'ё ў пансіёне Ваке. Ад аднаго выгляду гэтай каморы сціскалася сэрца, пакой выдаваў на самы змрочны турэмны каземат. На шчасце, Гар'ё не бачыў выразу твару Эжэна, калі той ставіў свечку на начны столік. Стары павярнуўся да студэнта, па-ранейшаму захутаны ў коўдру да падбародка.

— Ну, і хто вам падабаецца больш, мадам дэ Рэсто ці мадам дэ Нусінген?

— Я аддаю перавагу мадам Дэльфіне, — адказаў студэнт, — бо яна вас любіць болей.

Адчуўшы цеплыню, з якой Эжэн вымавіў гэтыя словы, стары адхінуў коўдру і паціснуў студэнту руку.

— Дзякуй, дзякуй, — усхвалявана адказаў Гар'ё. — А што яна сказала пра мяне?

Расціньяк паўтарыў словы баранэсы, надаючы ім дадатковай прыгажосці. Стары слухаў так уважліва, нібы прамаўляліся словы божыя.

— Мілае дзіця, так, яна вельмі любіць мяне. Але не верце таму, што яна казала пра Анастазі. Сёстры раўнуюць мяне адна да другой, скажу я вам, і ў гэтым яшчэ адзін доказ іх чуласці. Мадам дэ Рэсто таксама мяне любіць, я гэта ведаю. Бацька ведае сваіх дзяцей, як Бог усіх людзей: ён бачыць, што робіцца ў іх сэрцах і судзіць аб іх намерах. Абедзве дачкі аднолькава чулыя да мяне. Ах, каб мне яшчэ добрых зяцёў, я быў бы бязмежна шчаслівым, хаця, напэўна, поўнага шчасця на свеце не існуе. Калі б я жыў з дочкамі, чуў іх галасы, ведаў, што яны побач, бачыў, як яны ад'язджаюць, прыязджаюць, каб жыццё ішло так, як у той час, калі дочкі жылі са мною, маё сэрца заскакала б з радасці... А ці прыгожа былі яны апрануты?

— Так, — сказаў Эжэн. — Але, месье Гар'ё, чаму вы жывяце ў гэтай каморцы, маючы дачок, якія амаль купаюцца ў раскошы?

— Далібог, нашто мне лепшы пакой? — са знешняй бесклапотнасцю адказаў стары. — Мне цяжка тлумачыць

вам такія рэчы; я двух слоў не звяжу як трэба. Прычына — тут, — дадаў ён, стукаючы сябе па той частцы грудзей, дзе б'ецца сэрца. — Маё жыццё — гэта жыццё маіх дачок. Калі ім добра, шчаслівыя яны, прыгожа ўбраныя, ходзяць па дыванах — тады хіба мае значэнне, што за рызман прыкрывае маё цела і ў якім кутку я сплю? Калі ім цёпла, мне не можа быць зімна, калі ім весела, то і я ніколі не зануджуся. Мае адзіныя турботы — гэта іх турботы. Калі вы станеце бацькам, калі пачуеце лепятанне вашых дзяцей і скажаце сабе: «Гэта часцінка мяне», калі адчуеце, што гэтыя малюткі — ваша крывінка, што ў іх — лепшае, што было ў вас, бо так яно і ёсць, то вам будзе здавацца, што вы зрасліся з імі ў адно цела, вам будзе мроіцца, што вы рухаецеся, калі крочаць яны. Адусюль мне чуюцца іх галасы. Ад іх сумнага позірку стыне мая кроў. Аднойчы вы самі ўбачыце, што шчасце дзяцей даражэйшае за ваша ўласнае шчасце. Я не здолею вам растлумачыць усяго: гэта ўнутраныя пачуцці нібы напаўняюць чалавека шчасцем. Карацей кажучы, я жыву трайным жыццём. Хочаце, я раскажу вам нешта цікавае? Ведаеце, стаўшы бацькам, я зразумеў Бога. Усё сутнае пайшло ад яго, таму ён усюдыісны. Таксама і я з маімі дочкамі, толькі я іх люблю мацней, чым Бог любіць свет, бо свет сваёй прыгажосцю не роўны Богу, а мае дочкі прыгажэйшыя за мяне. Яны заўсёды ў маёй душы, і я ўсё думаў: сёння ўвечары вы пабачыцеся з імі. Божа мой, я гатовы чысціць боты, бегаць па даручэннях у таго мужчыны, які мог бы зрабіць Дэльфіну шчаслівай, бо жанчына шчаслівая, калі яе кахаюць. Пакаёўка паведаміла мне, што гэты панок дэ Марсэ — сапраўдны сабака. У мяне аж рукі свярбяць, каб скруціць яму шыю. Не кахаць такую жанчыну, такую прыгажуню, з яе салаўіным голасам! Дзе былі яе вочы, калі яна выходзіла замуж за гэтага тоўстага эльзаскага цурбана? Трэба было абедзвюм знайсці сабе ласкавых прыгожых маладых людзей. А выйшла інакш. Зрэшты, яны выбіралі самі.

Бацька Гар'ё быў непараўнальны. Упершыню Эжэн пабачыў старога ў бляску бацькоўскай любові. Сіла натхнення, чалавечых пачуццяў — рэч, вартая асаблівай увагі. Якой бы грубай не была асоба, як толькі ў яе сэрцы загараецца пачуццё моцнай, сапраўднай любові, яна адразу ж пачынае выпраменьваць асаблівыя флюіды, якія змяняюць выраз твару, ажыўляюць рухі, прыдаюць голасу афарбоўку. Дзякуючы сіле гэтага пачуцця нават

самае тупое стварэнне здольна здзівіць неверагодным красамоўствам, калі не складам гутаркі, дык хоць яе думкамі, і нібы ўзнімаецца на светаносных крылах. Так і ў гэтую хвіліну: у рухах, у голасе старога адчувалася прыцягальная сіла, па якой мы пазнаём вялікіх акцёраў. Але хіба высокія пачуцці не з'яўляюцца паэтычным выяўленнем нашай волі?

— Дык вас, значыць, не засмуціць вестка аб тым, што яна, напэўна, парве з дэ Марсэ? — сказаў Эжэн. — Гэты хлюст прамяняў яе на княгіню Галатыён. Што датычыць мяне, то я сёння ўвечары закахаўся ў мадам Дэльфіну.

— Вось як! — усклікнуў бацька Гар'ё.

— Так, і нібыта я ёй спадабаўся. Цэлую гадзіну мы размаўлялі пра каханне, а паслязаўтра, у суботу, я пайду да яе.

— Ох, як жа я буду любіць вас, мой даражэнькі, калі вы ёй спадабаецеся. Вы добры чалавек, і праз вас яна не будзе пакутаваць. А калі вы ёй здрадзіце, я пачну з таго, што перарэжу вам горла. Жанчына два разы не кахае, скажу я вам. Але, Божа, што за лухту я пляту, пане Эжэне! Тут для вас зімна. Божа, значыцца, вы размаўлялі з ёй. Можа, яна нешта прасіла перадаць мне?

«Нічога», — падумаў Эжэн і адказаў старому:

— Яна сказала, што пасылае вам моцны, даччын пацалунак.

— Бывайце, суседзе, добрай ночы вам, сніце прыемныя сны. Мне пасля вашых слоў прыемны сон забяспечаны. Няхай Бог дае вам спору ва ўсіх жаданнях. Сёння ўвечары вы былі маім добрым анёлам, вы прынеслі з сабою вобраз маёй дачкі.

«Нябога, — падумаў Эжэн, кладучыся ў ложак, — яго любоў растопіць нават каменнае сэрца. Ягоная дачка столькі ж думае пра яго, колькі пра турэцкага султана».

Пасля гэтай размовы Эжэн стаў нечаканым павераным, сябрам бацькі Гар'ё. Між імі ўсталяваліся тыя адзіныя стасункі, якія толькі і маглі прывязаць старога да другога чалавека. Гарачыя пачуцці ніколі не зробяць памылковага разліку. Раз Эжэн станавіўся для баранэсы блізкім сябрам, то бацька Гар'ё ўявіў, што гэта нейкім чынам наблізіць яго да дачкі. Акрамя таго, ён даверыў Эжэну прычыну свайго болю. Мадам дэ Нусінген, шчасця якой ён зычыў па сто разоў штодня, яшчэ не зведала слодычы кахання. Вядома, Эжэна стары ўявіў адным з самых мілых маладых людзей, якіх ён калі-небудзь ба-

чыў, і нібы прадчуваў, што ён зможа прынесці баранэсе ўсе тыя задавальненні, якіх ёй бракавала. Такім чынам сэрца старога прасціралa дарогу да сяброўства, якое мацнела з кожным днём і без якога незразумелай была б і развязка гэтай аповесці.

Назаўтра раніцай, за снеданнем, пансіянеры здзівіліся сімпатыі, з якой глядзеў на Эжэна бацька Гар'ё, дарэчы, ён і сеў побач з ім, словам, сказаным студэнту, выразу твару, які звычайна выдаваў на гіпсавую маску. Ватрэн бачыў студэнта пасля памятнай гутаркі ўпершыню і, здавалася, імкнуўся вычытаць нешта ў душы маладога чалавека. Гэтай ноччу, перш чым заснуць, Эжэн змераў усю прастору жыццёвага поля, што адкрылася перад ім, і цяпер, сустрэўшыся з Ватрэнам, ён адразу ўспомніў пра план гэтага чалавека і падумаў пра пасаг мадэмуазель Тайфэр, не стрымаўся і глянуў на Віктарыну, як глядзіць на багатую спадкаемніцу самы дабрадзейны малады чалавек. Іх вочы выпадкова сустрэліся. Зразумела, што Эжэн у новым уборы здаўся беднай дзяўчыне чароўным прыгажуном. Позірк, якім яны абмяняліся, быў досыць шматзначным, каб у Расціньяка зніклі ўсялякія сумненні наконт таго, што ён стаў прадметам тых трывожных пачуццяў, якія хвалююць усіх маладых дзяўчат. Нечы голас нібы крычаў Расціньяку: «Восемсот тысяч франкаў!» Але раптам ён успомніў падзеі пярэдадня і вырашыў, што задуманае каханне да мадам дэ Нусінген паслужыць яму сродкам ад міжвольных благіх думак.

— Учора ў Італьянскім тэатры давалі «Севільскага цырульніка» Расіні. Я ніколі не чуў такой чароўнай музыкі, — сказаў ён. — Божа, якое шчасце мець ложу ў Італьянскім тэатры!

Бацька Гар'ё з лёту зразумеў сэнс гэтых слоў, як сабака разумее рух гаспадара.

— Вы, мужчыны, жывяце як сыр у масле, — заўважыла мадам Ваке, — робіце, што вам даспадобы.

— А як вы вярталіся дадому? — спытаў Ватрэн.

— Пешкі, — адказаў Эжэн.

— А я, — уставіў спакуснік, — не прызнаю палавінчатых задавальненняў. Я хацеў бы ехаць у тэатр на карэце, мець сваю ложу і вяртацца дадому з усімі выгодамі. Усё або нічога — вось мой дэвіз.

— Добры дэвіз, — зазначыла мадам Ваке.

— Магчыма, вы пойдзеце наведаць мадам дэ Нусінген, — шапнуў Эжэн Гар'ё. — Вядома, яна прыме вас

сардэчна і захоча даведацца пра мяне. Я ведаю, што ёй больш за ўсё хочацца трапіць у дом маёй кузіны, вікантэсы дэ Басэан. Не забудзьце сказаць ёй, што я вельмі люблю яе і ўвесь час думаю аб тым, якім чынам дапамагчы ёй у гэтым.

Расціньяк неўзабаве накіраваўся ў Школу праваznаўства. Яму хацелася як мага менш заставацца ў ненавісным доме. Амаль цэлы дзень студэнт бадзяўся па горадзе, яго галава ліхаманкава палала, — стан, добра вядомы ўсім маладым людзям, ахопленым занадта смелымі спадзяваннямі. Заявы Ватрэна навялі яго на думкі пра грамадскае жыццё, і якраз у гэты момант пры ўваходзе ў Люксембургскі сад ён сустрэў свайго сябра Б'яншона.

— Чаму гэта ты такі сур'ёзны? — спытаў студэнт-медык, беручы Эжэна пад руку, каб разам пашпацыраваць перад Люксембургскім палацам.

— Мяне даймаюць благія думкі.

— Што за думкі? Іх ёсць чым палячыць.

— Чым гэта?

— Трэба зрабіць тое, што яны падказваюць.

— Ты жартуеш, бо не ведаеш, у чым справа. Ты чытаў Русо?

— Так.

— Памятаеш тое месца, дзе ён пытаецца ў свайго чытача, што б той зрабіў, калі б мог стаць багатым, сілаю волі забіўшы якога-небудзь старога кітайскага мандарына, не пакідаючы Парыжа?

— Так.

— Ну дык што?

— Авохці, я ўжо трыццаць трэцяга мандарына дабіваю.

— Не жартуй. Дык усё ж, калі б табе даказалі, што ўсё гэта рэальна і табе застаецца толькі кіўнуць галавой у знак згоды, ты пайшоў бы на гэта?

— А ён стары, твой мандарын? Хаця, што я кажу, незалежна ад таго, малады ён ці стары, паралітык ці здаровы... Не, крый божа, не.

— Ты цудоўны хлопец, Б'яншон. Ну, а калі б ты закахаўся ў жанчыну так моцна, што гатовы быў душу вывернуць навыварат і табе спатрэбіліся б грошы, шмат грошай на яе строі, экіпаж, нарэшце, усялякія капрызы?

— Ну вось! Спачатку ты збіваеш з панталыку, а потым патрабуеш, каб я разважаў!

— Б'яншон, я вар'яцею, вылечы мяне. У мяне дзве сястры — два анёлы прыгажосці, чысціні, і я хачу, каб яны былі шчаслівымі. Дзе за бліжэйшыя пяць гадоў знайсці мне дзвесце тысяч франкаў на пасаг для іх? У жыцці, скажу я табе, абставіны часам складаюцца так, што неабходна весці буйную гульню і не марнаваць шчаслівага часу на дробныя набыткі.

— Ты ставіш перада мной пытанне, якое паўстае перад кожным чалавекам, які ўваходзіць у жыццё, і хочаш рассячы гэты гордзіеў вузел[1] адным узмахам мяча. Для гэтага трэба быць Аляксандрам, даражэнькі, а інакш ты проста трапіш на катаргу. Я буду шчаслівы і ад таго сціплага існавання, якое чакае мяне ў правінцыі, дзе я проста атрымаю ў спадчыну месца свайго бацькі. Чалавечыя схільнасці знаходзяць аднолькава поўнае задавальненне як у маленькім коле, так і ў межах агромністай акружнасці. Напалеон не з'ядаў двух абедаў і не меў больш каханак, чым студэнт-медык, які жыве пры шпіталі капуцынаў. Наша шчасце, даражэнькі, заўсёды будзе заключацца ў межах між падэшвамі нашых ног і нашым цемем; і ці будзе каштаваць яно нам мільён ці толькі сто луідораў у год, нашы ўнутраныя пачуцці ад гэтага не зменяцца. Таму мая выснова: няхай твой кітаец жыве.

— Дзякуй, ты аблегчыў мне сэрца, Б'яншон! Мы застанемся сябрамі назаўсёды.

— Чуеш, — працягваў студэнт-медык, — калі я пасля лекцыі Кюўе[2] выходзіў у Батанічны сад, я заўважыў Мішано і Пуарэ на лавачцы з нейкім спадаром, якога я бачыў ля Палаты дэпутатаў падчас леташніх беспарадкаў. Ён здаўся мне паліцыянтам, пераапранутым у паважанага буржуа-ранцье. Яны размаўлялі. Давай паназіраем за гэтай парачкай, пасля я скажу табе навошта. А пакуль бывай, мне трэба адзначыцца а чацвёртай гадзіне.

Калі Эжэн вярнуўся ў пансіён, яго ўжо чакаў бацька Гар'ё.

— Трымайце, — сказаў стары, — вам ад яе ліст. Прыгожы почырк, праўда?

---

[1] Паводле старажытнагрэчаскай легенды, ніхто не мог развязаць вузел, якім было прывязана ярмо да павозкі фрыгійскага цара Гордзія. Цар Аляксандр Македонскі рассек мячом гэты «гордзіеў вузел».

[2] *Кюўе*, Жорж (1769—1832) — вучоны, натураліст і палеантолаг, прыхільнік тэорыі нязменнасці біялагічных відаў.

Эжэн распячатаў канверт і прачытаў:

«Шаноўны пане, бацька паведаміў мне, што вам падабаецца італьянская музыка. Я буду вельмі рада, калі вы згодзіцеся заняць месца ў маёй ложы. У суботу спяваюць Фадор і Пелегрыні; упэўнена, што вы не адмовіцеся. Месье дэ Нусінген далучаецца да маёй просьбы прыйсці да нас на вячэру без усялякіх цырымоній. Калі вы прымеце запрашэнне ў тэатр, вы зробіце майго мужа шчаслівым ад таго, што вызваліце яго ад цяжкага сямейнага абавязку суправаджаць мяне. Не адказвайце на ліст, прыходзьце і прыміце мае найлепшыя пажаданні.

Д. дэ Н.»

— Пакажыце мне ліст, — папрасіў Эжэна стары. — Вы, вядома, пойдзеце? — спытаў ён, нюхаючы паперу. — Які водар! Яе пальцы краналі гэты аркуш.

«Так проста жанчына не кідаецца на шыю мужчыны, — падумаў студэнт. — Яна хоча скарыстаць мяне, каб вярнуць дэ Марсэ, такія захады робяцца толькі са злосці».

— Дык што, — сказаў бацька Гар'ё, — што вы думаеце?

Эжэн не ведаў, якой маніяй фанабэрыстасці ахоплены зараз многія жанчыны, і не здагадваўся, на якія ахвяры здольная жонка банкіра дзеля таго, каб толькі трапіць у Сен-Жэрменскае прадмесце. Гэта быў час, калі ўваходзіла ў моду адзначаць жанчын, прынятых у Сен-Жэрменскім прадмесці, у так называемых статс-дам Малога палаца, сярод якіх, вядома ж, мадам дэ Басэан, яе сяброўкі герцагіня дэ Ланжэ і герцагіня дэ Мафрыньёз. Адзін Расціньяк не ведаў, як апантана імкнуліся жанчыны з Шасэ-д'Антэн трапіць у вышэйшае арыстакратычнае кола, дзе ззяла такое сузор'е выдатных жанчын. Але на гэты раз падазронасць Эжэну дапамагла, забяспечыўшы яму стрыманасць і сумныя выгоды чалавека, які толькі ставіць, а не прымае ўмовы.

— Так, я пайду, — адказаў ён бацьку Гар'ё.

Такім чынам, Эжэна да мадам дэ Нусінген вяла проста цікаўнасць, а калі б жанчына ім пагарджала, магчыма, яго вяло б туды пачуццё. Ва ўсялякім разе, ён з нецярплівасцю чакаў наступнага дня і часу, каб выправіцца да мадам дэ Нусінген. Для маладога чалавека ў першай інтрызе хаваецца не менш спакусы, чым у першым каханні. Упэўненасць у поспеху спараджае мноства ўцех, у якіх мужчыны не прызнаюцца, хаця менавіта яны заклю-

чаюць у сабе чары некаторых жанчын. Жаданне нараджаецца не толькі ад цяжкасці, але і ад лёгкасці перамогі. Увогуле ўсе чалавечыя пачуцці ўзнікаюць і трымаюцца на гэтых двух пачатках і падзяляюцца ў залежнасці ад гэтага на дзве розныя сферы. Можа, такі падзел ёсць наступства складанага пытання тэмпераментаў, якое, што б там ні казалі, кіруе грамадствам. Калі меланхолікам патрабуецца пэўная ўзбуджальная доза какецтва, то людзі нервовыя, сангвінікі, палохаюцца празмерна ўпартага супраціўлення. Іншымі словамі, у аснове элегій ляжыць ураўнаважанасць, у аснове дыфірамбаў — непакой. Рыхтуючыся да вечара, Эжэн не пазбавіў сябе задавальнення паказытаць сваё самалюбства тымі маленькімі радасцямі, пра якія саромеюцца гаварыць маладыя людзі, баючыся кпінаў. Эжэн укладваў свае валасы, уяўляючы наперад, што позірк прыгожай жанчыны абавязкова спыніцца на яго чорных кучарах. Ён дазволіў сабе нават крыху пакрыўляцца, ну, зусім, як дзяўчына, апранаючыся на баль. Папраўляючы фрак, ён у захапленні паглядзеў на сваю талію: «Безумоўна, не ўсе змогуць пахваліцца такой фігурай!» Затым ён спусціўся ўніз — у той час ужо ўсе жыхары сядзелі за сталом — і весела вытрымаў град жартаў, выкліканых яго элегантным строем. Характэрнай рысай сямейных пансіёнаў з'яўляецца разгубленасць пры з'яўленні модна адзетага чалавека. Не бывае, каб нехта апрануў новы фрак, і хоць адзін чалавек не выказаў сваёй думкі на гэты конт.

— Ц-ц-ц! — зацмокаў языком Б'яншон.

— Выліты герцаг ці пэр! — абвясціла мадам Ваке.

— Пан выпраўляецца на заваёвы? — спытала мадэмуазель Мішано.

— Кукарэку! — закрычаў мастак.

— Прывітанне вашай жонцы, — сказаў служачы музея.

— А што, спадар Расціньяк ажаніўся? — спытаў Пуарэ.

— Жонка асаблівая, у вадзе не тоне, гарантыя добрай афарбоўкі, коштам ад дваццаці пяці да сарака, малюнак па апошняй модзе ў клетку, можна мыць, добра носіцца, напалову лён, напалову бавоўна, напалову воўна, дапамагае ад зубнога болю і іншых хвароб, зацверджаных Каралеўскай акадэміяй медыцыны! Зрэшты, цудоўны сродак для дзяцей, а яшчэ лепш ад мігрэняў, запораў і іншых хвароб страваводa, вачэй і вушэй! — закрычаў камічнаю

скарагаворкаю і з акцэнтам гандляра на кірмашы Ватрэн. — Вы спытаеце: «І колькі ж каштуе гэты цуд? Два су?» Не. Нічога. Гэта рэшткі, якія засталіся ад паставак Вялікаму Маголу[1], якія выказалі жаданне пабачыць усе еўрапейскія манархі, у тым ліку вялікі герррррцаг бадэнскі! Уваход проста перад вамі! Праходзьце праз касу. Дайце музыку! Брум, ля-ля, трынь, ля-ля, бум-бум! Гэй, кларнет, — перайшоў ён на хрыплы голас, — фальшывіш, чакай, заробіш па пальцах.

— Божа мой, да чаго прыемны чалавек! — усклікнула мадам Ваке. — З ім ніколі не занудзішся!

Сярод смеху і жартаў, выкліканых вясёлай камедыяй Ватрэна, Эжэн перахапіў нясмелы позірк мадэмуазель Тайфэр, якая нахілілася да мадам Куцюр і нешта шапнула ёй на вуха.

— А вось і кабрыялет прыехаў, — сказала Сільвія.

— Дзе ж ён вячэрае? — спытаў Б'яншон.

— У баранэсы дэ Нусінген, дачкі месье Гар'ё, — растлумачыў Эжэн.

Пры гэтым імені ўсе позіркі спыніліся на старым вермішэльшчыку, які з нейкай зайздрасцю сачыў за Эжэнам.

Расціньяк прыехаў на вуліцу Сен-Лазар да аднаго са звычайных дамоў з тонкімі калонамі, з таннымі порцікамі, з усім тым, што ў Парыжы лічыцца «міленькім». Гэта быў дом банкіра, поўны дарагіх задум, з гіпсавай лепкай, з мармуровымі мазаічнымі пляцоўкамі на лесвіцы. Мадам дэ Нусінген чакала Расціньяка ў маленькай гасцёўні, якая была ўпрыгожана на італьянскі манер і аздобай сваёй нагадвала нейкае кафэ. Баранэса сумавала. Намаганні, якія яна прыкладала, каб схаваць свае турботы, пагатоў зацікавілі Эжэна, бо яны былі шчырымі. Ён спадзяваўся, што жанчына ўзрадуецца яго прыходу, а заспеў яе ў роспачы. Расчараванне закранула яго самалюбства.

Пажартаваўшы над яе заклапочанасцю, Эжэн сказаў:

— Я маю малое права на ваш давер, пані, але, калі я вам замінаю, дык будзьце шчырымі, скажыце мне аб гэтым адкрыта.

— Пабудзьце са мной, — адказала яна, — калі вы пойдзеце, мне пагражае самота. Барон дэ Нусінген

---

[1] *Вялікі Магол* — тытул мусульманскіх валадароў Індыі з дынастыі Бабура, ва ўладзе з 1526 да 1707 гг.

вячэрае не дома, а я не хачу быць адна, мне трэба развеяцца.

— Але што з вамі?

— Якраз вам я пра гэта сказала б апошняму з усіх, — усклікнула яна.

— Але я хачу ведаць, бо выходзіць, што ў гэтай таямніцы нейкая роля адводзіцца і мне.

— Магчыма, і так. Не, усё ж гэта сямейныя звады, і іх трэба хаваць у самым далёкім куточку сэрца. Хіба я вам не казала заўчора? Я зусім не шчаслівая жанчына. Залатыя ланцугі — самыя цяжкія.

Калі жанчына паведамляе маладому чалавеку, што яна — няшчасная, а малады чалавек — разумны, добра апрануты, і ў кішэні ў яго ляжаць паўтары тысячы франкаў, ён падумае тое самае, што і Эжэн, і стане самаздаволеным фатам.

— Чаго ж вам больш хацець? — адказаў ён пытаннем. — Вы прыгожая, маладая, багатая, вас кахаюць.

— Не будзем гаварыць пра мяне, — змрочна ўсміхнулася яна. — Павячэраем разам, паслухаем цудоўную музыку. Я падыходжу да вашага густу? — спытала яна, узнімаючыся і дэманструючы белую з вытанчанымі персідскімі ўзорамі кашміровую сукенку.

— Я б хацеў, каб вы сталі для мяне ўсім, — сказаў Эжэн. — Вы проста чароўная.

— Сумнае багацце хочаце вы сабе прыдбаць, — заўважыла яна, горка ўсміхаючыся. — Тут нішто не выдае на няшчасце, а між іншым, нягледзячы на гэты знешні спакой, я ў роспачы. Ад турботаў я не магу заснуць, маё гора адаб'ецца і на маёй прыгажосці.

— О, гэта немагчыма, — усклікнуў студэнт. — Мне цікава, што гэта за беды, якія не змагло б развеяць нават адданае каханне?

— Ах, калі б я даверыла вам прычыну маіх пакут, вы пакінулі б мяне. Гэта ў вас яшчэ не каханне да мяне, а звычайнае мужчынскае заляцанне; калі б вы мяне сапраўды кахалі, вы б і самі прыйшлі ў жахлівую роспач. Бачыце, я мушу маўчаць. Але богам прашу, зменім тэму размовы. Давайце пройдзем паглядзім мае пакоі.

— Не, пасядзім тут, — адказаў Эжэн, уладкоўваючыся на маленькай канапцы каля каміна побач з мадам дэ Нусінген і ўпэўнена трымаючы яе руку.

Яна не пярэчыла і нават сама паціснула руку юнака адным з тых поціскаў, што выдаюць вялікае хваляванне.

— Паслухайце, — сказаў Расціньяк, — калі вас нешта турбуе, даверцеся мне, і я дакажу вам, што я люблю вас дзеля вас. Ці вы працягваеце гутарку і раскажаце мне пра вашы беды, каб я мог іх развеяць, чаго б гэта мне не каштавала, нават калі да гэтага давядзецца забіць некалькі чалавек, ці я пайду і больш ніколі не вярнуся.

— Добра, — усклікнула яна, ахопленая нейкай адчайнай думкай, што нават стукнула сябе па лбе, — зараз я вазьму вас на выпрабаванне. «Так, — падумала яна, — іншага выйсця няма».

Яна пазваніла.

— Ці запрэжана карэта гаспадара? — спытала яна ў лёкая.

— Так, спадарыня.

— Я паеду на ёй. Вы пашліце за месье дэ Нусінгенам мой экіпаж. Вячэру накрывайце а сёмай гадзіне. Паехалі, — сказала яна Эжэну.

Юнаку здавалася, што ўсё гэта яму сніцца: двухмесная карэта месье дэ Нусінгена, поруч — такая жанчына...

— У Пале-Раяль, да Французскага тэатра.

Дарогаю яна, відаць, хвалявалася, таму адмаўлялася адказваць на Эжэнавы пытанні, які не ведаў, што думаць пра гэта немае, упартае, цвёрдае супраціўленне.

«Хвіліна — і яна ўжо ўцякла ад мяне», — думаў Расціньяк.

Калі карэта спынілася, баранэса так зірнула на студэнта, што яго празмернае выяўленне сяброўскіх пачуццяў умомант спынілася; ён занадта захапіўся.

— Вы сапраўды кахаеце мяне? — спытала яна.

— Так, — адказаў Эжэн, змагаючыся з усё большым непакоем.

— Вы не падумаеце пра мяне нічога благога, што б я ў вас не спытала?

— Не.

— Ці гатовы слухацца мяне?

— Слепа.

— Вы былі калі-небудзь у казіно? — дрыготкім голасам спытала яна.

— Ніколі.

— Ах, я магу вольна ўздыхнуць. Вам пашанцуе, вось мой кашалёк, бярыце ж, у ім ляжыць сто франкаў — усё, што мае такая шчаслівая жанчына. Схадзіце ў які-небудзь дом азартных гульняў, я не ведаю, дзе яны знаходзяцца, але ў Пале-Раялі яны ёсць. Рызыкніце на сто

франкаў у гульні, якая называецца рулеткай, і ці прайграеце ўсё да апошняга су, ці прынясеце мне шэсць тысяч франкаў. Калі вернецеся, я раскажу вам пра мае турботы.

— Каб мне так добра было, калі я нешта разумею ў тым, што збіраюся рабіць, але я слухаюся вас, — сказаў ён радасна і адначасова падумаў: «Яна кампраметуе сябе з маім удзелам і ні ў чым не зможа мне адмовіць».

Эжэн бярэ прыгожы кашалёк і, даведаўшыся ў краме гатовай вопраткі пра бліжэйшы дом азартных гульняў, бяжыць туды. Ён уваходзіць, аддае капялюш і пытаецца, дзе гуляюць у рулетку. Пад агульнае здзіўленне лёкай вядзе яго да доўгага стала. Эжэн, за якім сочаць усе гледачы, не саромеючыся цікавіцца, куды паставіць стаўку.

— Калі пакласці луідор на адзін з гэтых трыццаці шасці нумароў, і ён выпадзе, вы атрымаеце трыццаць шэсць луідораў, — растлумачыў яму паважны сівы спадар.

Эжэн кідае ўсе сто франкаў на лічбу яго ўзросту: дваццаць адзін, і не паспеў ён апомніцца, як раздаўся вокліч здзіўлення. Сам не ведаючы як, Эжэн выйграў.

— Забірайце грошы, — падказаў сівы мужчына, — тут такая сістэма, што два разы запар не выйграеш.

Эжэн бярэ грабок, працягнуты старым спадаром, забірае тры тысячы шэсцьсот франкаў і, анічога ў гульні не разумеючы, ставіць іх на чырвонае. Усе з зайздрасцю пазіраюць на яго, бачачы, што ён працягвае гульню. Кола круціцца, ён зноў выйграе, і банкір кідае яму яшчэ тры тысячы шэсцьсот франкаў.

— Вы выйгралі сем тысяч дзвесце франкаў, — шэпча яму на вуха стары спадар. — Раю вам, ідзіце, чырвонае трапляла ўжо восем разоў. Калі вы міласэрны чалавек, аддзячце мне за добрую параду, дайце што-небудзь на беднасць былому напалеонаўскаму прэфекту, які жыве ў нястачы.

Збіты з панталыку Расіньяк аддае сівому мужчыну дзесяць луідораў і спускаецца ўніз з сямю тысячамі франкаў, па-ранейшаму нічога не цямячы ў гульні, але ашаломлены сваім шчасцем.

— Вось вам, вазьміце, куды вы мяне цяпер павязеце? — сказаў ён мадам дэ Нусінген, аддаючы сем тысяч франкаў, калі дзверцы карэты зачыніліся.

Дэльфіна сціснула яго ў абдымках і моцна, але не палка пацалавала.

— Вы выратавалі мяне! — Слёзы радасці заблішчалі на яе шчоках. — Я ўсё раскажу вам, мой сябра. Вы станеце маім сябрам, праўда? На ваш погляд, я багатая, страшэнна багатая, у мяне ёсць усё ці здаецца, што ёсць усё! Дык ведайце, што месье дэ Нусінген не дазваляе мне распарадзіцца нават адным су: ён плаціць за ўтрыманне дома, за мае карэты, за ложы ў тэатрах; ён адшкадоўвае мізэрную суму на мае ўборы, знарок зводзячы мяне да непрыкметнай галечы. Гонар не дазваляе мне выпрошваць грошы. Я б стала апошняй дрэнню, калі б плаціла за яго грошы той цаной, якую ён хоча з мяне ўзяць! Як я, маючы семсот тысяч франкаў, дазволіла сябе абабраць? Праз гонар, ад абурэння. Мы яшчэ такія маладыя, такія наіўныя, калі ўступаем у шлюбнае жыццё! Мне здавалася, што ў мяне язык адсохне, калі я папрашу грошай у мужа; я не адважвалася нават падумаць пра гэта і траціла свае зберажэнні і грошы, а таксама тое, што даваў бедны бацька; пасля я стала пазычаць. Для мяне шлюб — найжахлівейшае з расчараванняў, я не магу размаўляць з вамі пра гэта; досыць таго прызнання, што я хутчэй выкінулася б з акна, чым жыць з Нусінгенам на адной, а не на розных палавінах. Калі давялося сказаць яму пра мае пазыкі, даўгі маладой жанчыны, пра выдаткі на ўпрыгожанні, на дробязі (бедны бацька прывучыў нас ні ў чым сабе не адмаўляць), я пакутавала; нарэшце, набралася мужнасці і паведаміла. Хіба я не мела ўласнага багацця? Нусінген раззлаваўся, сказаў, што я яму жабрацкую торбу на шыю накіну, жах! Я гатова была праваліцца скрозь зямлю. Паколькі ён забраў мой пасаг, ён заплаціў, але з таго часу прызначыў мне цвёрдую суму на асабістыя выдаткі, і я, дзеля прымірэння, згадзілася. А пасля мне захацелася пацешыць самалюбства аднаго вядомага вам чалавека. Хаця ён і падмануў мяне, але было б несправядліва не адзначыць высакароднасці яго характару. І ўсё ж расстаўся са мной не самым лепшым чынам. Калі ў дні нястачы мужчына адсыпаў жанчыне купу золата, то ён не мае права ёй здраджваць, ён павінен любіць яе заўжды! Вам дваццаць адзін год, у вас маладое і чыстае сэрца, і вы спытаеце, як жанчына магла прыняць грошы ад мужчыны? Божа, хіба не натуральным было жаданне ўсё дзяліць з чалавекам, якому мы павінны шчасцем? Аддаўшы ўсё, ці варта хвалявацца з-за часцінкі ад гэтага ўсяго? Грошы пачынаюць адыгрываць нейкую ролю толькі тады, калі пачуцце знікае. Калі давяраеш

свой лёс другому, то хіба не да скону? Хто з нас прадбачыць расстанне, калі яго моцна кахаюць? Вы, мужчыны, клянецеся нам у вечным каханні, хіба мы маем права згадваць пра нейкія іншыя, асаблівыя інтарэсы? Вы не можаце ўявіць сабе, колькі я выпакутавала сёння, калі Нусінген рашуча адмовіў мне ў шасці тысячах франкаў. І гэта пры тым, што сваёй палюбоўніцы, тэатральнай танцоркі, ён столькі дае штомесяц! Мне хацелася пакончыць з сабою, у галаву лезлі самыя вар'яцкія думкі. Часам я зайздросціла лёсу служанкі, маёй пакаёўкі. Пайсці да бацькі? Неразумна! Мы з Анастазі і так выцягнулі з яго ўсе сокі; бедны бацька, калі б мог, ён прадаў бы сябе, каб за яго далі шэсць тысяч франкаў. Ехаць да яго — толькі дарма даводзіць да адчаю. Вы выратавалі мяне ад смерці і ад сораму, я ледзь не звар'яцела з гора. Ах, пане, я павінна была растлумачыць усё вам: я вельмі легкадумна і безразважна вяла сябе з вамі. Калі вы адышліся ад мяне, і я згубіла вас з поля зроку, мне так карцела ўцячы... Куды? Не ведаю. Вось якое жыццё ў паловы парыжанак: знешняя раскоша, а ў сэрцы — жорсткія згрызоты. Я ведаю, што ёсць людзі яшчэ больш гаротныя, чым я. Ёсць жанчыны, якія просяць пастаўшчыкоў выпісваць ім несапраўдныя рахункі, некаторыя вымушаны красці ў сваіх мужоў; муж адной мяркуе, што кашміровы шаль за пяцьсот франкаў каштуе дзве тысячы, муж другой, наадварот, што шаль за дзве тысячы каштуе ўсяго пяцьсот. Знаходзяцца і такія няшчасныя жанчыны, якія ашчаджаюць на дзецях, каб выгадаць сабе на новую сукенку. Я такой гідкай хлуснёй сябе не запляміла. Цяпер скончыліся мае пакуты! Няхай другія прадаюць сябе сваім мужам, каб кіраваць імі, я, прынамсі, вольная! Я б, вядома, магла дабіцца таго, каб Нусінген азалаціў мяне, але я лічу лепей паплакаць на грудзях таго мужчыны, якога я магу паважаць. Ах, сёння вечарам месье дэ Марсэ больш не будзе мець права глядзець на мяне, як на жанчыну, якой ён заплаціў.

Дэльфіна закрыла твар далонямі, каб Эжэн не бачыў слёз, але той развёў яе рукі, каб палюбавацца яе прыгажосцю.

— Змешваць каханне і грошы, хіба не жудасна? Вы не зможаце пакахаць мяне, — сказала яна.

Мешаніна добрых пачуццяў, якія ўзнімаюць жаночую душу на пэўную вышыню, і недахопаў, выкліканых сучасным станам грамадства, уразіла Эжэна. Ён гаварыў

пяшчотныя, суцяшальныя словы захоплены гэтай кабетай, настолькі прастадушна неасцярожнай у крыку свайго болю.

— Паабяцайце мне, што вы не выкарыстаеце нічога з таго, што пачулі, супраць мяне.

— Ах, спадарыня, я на такое не здольны.

Поўная ўдзячнасці і ласкі, яна ўзяла руку Эжэна і прыціснула да сэрца.

— Дзякуючы вам я зноў зазнала волю і радасць. Дагэтуль мяне нібы душыла жалезная рука. Цяпер я хачу жыць сціпла, нічога не трацячы на сябе. Вам, мой дружа, я буду падабацца такой, якая я ёсць, праўда? Пакіньце гэта сабе, — сказала яна, забіраючы толькі шэсць банкнот па тысячы франкаў. — Калі па-шчырасці, дык я павінна вам тры тысячы, бо мы з вамі ігралі напалам.

Эжэн аднекваўся, як дзяўчына. Але баранэса настойвала: «Калі вы не мой хаўруснік, я буду разглядаць вас як ворага».

Ён узяў грошы і сказаў:

— Няхай застануцца запасным капіталам на выпадак пройгрышу.

— Гэтага я і баялася, — усклікнула яна, бляднеючы. — Калі вы хочаце, каб мы нешта значылі адзін для другога, пакляніцеся, што ніколі болей не пойдзеце ў дом азартных гульняў. Божа мой, не хапала, каб я вас разбэсціла! Я гэтага не вытрымаю.

Яны прыехалі дадому. Студэнт губляўся ад кантрасту між галечай Дэльфіны і багаццем дома, і зноў у яго вушах пачалі гучаць злавесныя словы Ватрэна.

— Сядзьце там, — сказала баранэса, увайшоўшы ў пакой і паказваючы на канапку, якая стаяла побач з камінам. — Мне трэба напісаць досыць цяжкі ліст, будзьце мне дарадцам.

— Не пішыце нічога, — прапанаваў Эжэн, — пакладзіце банкноты ў канверт, напішыце адрас і папрасіце пакаёўку аднесці.

— Вы проста цуд, а не чалавек. Вось што значыць добрае выхаванне! Амаль па-басэанаўску, — сказала яна, усміхаючыся.

«Чароўная жанчына», — падумаў Эжэн, усё больш захапляючыся ёю.

Ён абвёў вокам пакой, дзе ўсё дыхала элегантнасцю багатай куртызанкі.

— Вам падабаецца? — спытала баранэса, званочкам выклікаючы пакаёўку. — Тэрэза, занясіце гэты ліст месье

дэ Марсэ і аддайце асабіста ў рукі. Калі яго не будзе дома, прынясіце пісьмо назад.

Перш чым пайсці, Тэрэза не прамінула кінуць на Эжэна хітры позірк. Вячэра чакала. Расціньяк падаў руку мадам дэ Нусінген, і баранэса павяла яго ў прыгожую сталовую, дзе Расціньяк другі раз пасля вячэры ў кузіны сутыкнуўся з раскошаю стала.

— У дні прадстаўленняў Італьянскай оперы, — сказала яна, — вы будзеце вячэраць са мной і суправаджаць мяне ў тэатр.

— Я магу звыкнуцца з гэткім салодкім жыццём, калі яму будзе суджана доўжыцца, а я ўсяго толькі бедны студэнт, якому трэба працаваць, каб набыць хоць невялікае багацце.

— Яно прыйдзе само, — засмяялася баранэса. — Бачыце, як усё зладзілася добра, я нават не спадзявалася напаткаць такое шчасце.

Жанчынам уласціва даказваць немагчымае на аснове магчымага і разбураць факты прадчуваннямі. Калі мадам дэ Нусінген і Расціньяк уваходзілі ў ложу тэатра, баранэса ззяла непрыхаваным шчасцем, і гэта прыдавала ёй яшчэ больш вытанчанай прыгажосці. Таму кожны палічыў неабходным крыху папляткарыць наконт яе выгляду і паводзін, тым больш што жанчыны супраць гэтага зусім безабаронныя. Хто ведае Парыж, той не верыць ніводнаму слову, якое ў гэтым горадзе мовіцца адкрыта, бо ведае пра тое, што робіцца ў ім у сапраўднасці, ніхто нават не заікнецца. Эжэн узяў руку баранэсы, і яны пачалі размаўляць замест слоў поціскамі рук, перадаючы адзін аднаму пачуцці, навеяныя музыкай. Увесь гэты вечар быў напоўнены для іх чароўным захапленнем. З тэатра яны выйшлі разам, і мадам дэ Нусінген выказала жаданне давезці Эжэна да Новага моста, але ўсю дарогу адмаўлялася падарыць яму хоць адзін такі пацалунак, як пасля паездкі ў Пале-Раяль. Эжэн папракнуў баранэсу за гэтую непаслядоўнасць.

— То была проста ўдзячнасць за неспадзяваную адданасць, цяпер пацалунак значыў бы нейкае абяцанне.

— І вы, няўдзячная, нічога не хочаце мне паабяцаць?

Ён раззлаваўся. Капрызлівым рухам, якія звычайна зачароўваюць каханага, яна працягнула руку для пацалунка.

Эжэн узяў руку з неахвотай, што выключна спадабалася баранэсе.

— Да панядзелка, да сустрэчы на балі, — сказала яна.

Ідучы дадому пры святле месяца, Эжэн сур'ёзна задумаўся. Ён быў адначасова і шчаслівы, і незадаволены. Шчаслівы, што прыгода, верагодней за ўсё, падорыць яму адну з самых прыгожых і элегантных парыжанак, якая не выходзіла ў яго з галавы, а незадаволены крушэннем планаў набыць сабе багацце. Цяпер, нарэшце, ён адчуў рэальнасць смутных заўчарашніх думак. Няўдача заўсёды падкрэслівае сілу нашых памкненняў. Чым больш уцехаў парыжскага жыцця спазнаваў Эжэн, тым больш ён прагнуў беднага, сціплага існавання. Ён камячыў тысячафранкавую асігнацыю ў кішэні, выдумляючы мноства розных апраўданняў свайму валоданню ёю. Нарэшце ён прыйшоў на вуліцу Нёў-Сент-Жэнеўеў, і калі ўзняўся да сябе наверх, заўважыў святло. Бацька Гар'ё не зачыняў дзвярэй і пакінуў гарэць свечку, каб студэнт не забыў *пагутарыць пра дачку*, як казаў стары. Эжэн нічога не ўтойваў. Бацька Гар'ё бурна, роспачна ўсклікнуў, нібы зняважаны:

— Яны лічаць, што я зусім збяднеў, але я маю яшчэ тысячу трыста франкаў рэнты! Божа мой! Чаму ж яна не прыйшла да бацькі? Я прадаў бы паперы, гэтага капіталу хапіла б на яе патрэбы, а тое, што засталося б, я змясціў бы ў пажыццёвую рэнту. Дарагі суседзе, чаму вы не прыехалі і не расказалі пра яе цяжкасці? Як вы не збаяліся рызыкаваць у гульні яе няшчаснай сотняй франкаў? Сэрца рвецца на часткі ад усяго гэтага. Вось яны, зяці! О, трапілі б яны мне пад руку, я б ім горла здушыў. Божа, яна плакала, яна сапраўды плакала?

— Уткнуўшыся галавою мне ў камізэльку, — адказаў Эжэн.

— О, дайце мне вашу камізэльку. Як, на яе ліліся слёзы маёй дачкі, маёй дарагой Дэльфіны! Калі яна была маленькаю, яна ніколі не плакала. О, я куплю вам другую камізэльку, а гэтую аддайце мне, не насіце яе болей. Згодна са шлюбным кантрактам яна павінна мець права валодаць сваім багаццем. Заўтра ж пабачуся з павераным Дэрвілем і буду дамагацца, каб грошы Дэльфіны былі пакладзены ў банк. Я законы ведаю, я стары воўк, і зубы мае яшчэ на месцы.

— Вось, бацька, тысяча франкаў з выйгранай сумы. Дэльфіна хацела аддаць іх мне. Беражыце гэтыя грошы для яе, у маёй камізэльцы.

Гар'ё паглядзеў на Эжэна, узяў яго руку, і Эжэн адчуў, як на яе ўпала сляза.

— Вы даб'ецеся поспеху ў жыцці, — сказаў стары. — Бог усё бачыць. Я магу загадзя сказаць, сумленны чалавек побач са мной ці не, і магу вас заверыць, што роўных вам знойдзецца няшмат. Хочаце таксама стаць маім дарагім дзіцём? Ну, ідзіце спаць. Вы можаце спаць, вы яшчэ не бацька. Яна плакала! А я?.. Я даведваюся пра гэта ад другіх, і я спакойна, па-ідыёцку, ем? А яна ў гэты час пакутуе! І гэта я, я, які гатовы прадаць Бацьку, Сына і Святога Духа, каб ніводнай слязіны не ўпала з вачэй маіх дачок!

«Далібог, — думаў Эжэн, кладучыся ў ложак, — мусіць, я ўсё жыццё буду сумленным чалавекам. Як прыемна прыслухоўвацца да голасу свайго сумлення!»

Напэўна, толькі тыя, хто верыць у Бога, здольны рабіць дабро не напаказ, а Эжэн верыў у Бога. На наступны дзень, калі трэба было выпраўляцца на баль, Расціньяк прыйшоў да мадам дэ Басэан, і тая павезла яго з сабой, каб прадставіць герцагіні дэ Карыльяна. Жонка маршала прыняла яго самым ветлівым чынам, і тут Эжэн зноў сустрэў мадам дэ Нусінген. Дэльфіна выстраілася з намерам спадабацца ўсім, каб яшчэ болей спадабацца Эжэну, позірку якога яна нецярпліва чакала, хаця і думала, што ніхто гэтага не заўважае. Такія хвіліны прыемныя для таго мужчыны, хто ўмее ўгадваць жаночыя пачуцці. Каму не прыносіла задавальнення таміць другога чаканнем пахвалы, какетліва хаваючы радасць пад абыякавасцю, выклікаць трывогу, каб яшчэ раз пераканацца ў каханні, цешыцца з чужых апасенняў і, нарэшце, развеяць іх усмешкаю? Падчас гэтага свята студэнт раптам усвядоміў выгоды свайго становішча і зразумеў, што атрымаў сабе месца ў свеце, як улюбёны кузен мадам дэ Басэан. Заваёву баранэсы дэ Нусінген ужо заўважылі ў свецкіх колах, і гэта выгадна выдзяляла Расціньяка, усе маладыя людзі пачалі з зайздрасцю пазіраць на яго; Эжэн перахопліваў гэтыя позіркі і атрымліваў асалоду ад першага поспеху. Пераходзячы з гасцёўні ў гасцёўню, ад адной групы гасцей да другой, ён чуў прыемныя словы пра свае поспехі. Усе жанчыны прадказвалі яму шчаслівы лёс. Дэльфіна, баючыся страціць яго, паабяцала не адмовіць у пацалунку, якога заўчора Эжэн так і не дачакаўся. Расціньяк атрымаў на балі некалькі запрашэнняў. Кузіна прадставіла яго ўсім

дамам, яны ўсе прэтэндавалі на вытанчаны густ, а іх дамы лічыліся прыемнымі; Эжэн зразумеў, што трапіў у вышэйшы парыжскі свет, у кола абраных. Вечар быў поўны чароўнасці бліскучага дэбюту, і, напэўна, нават у старасці ён будзе згадваць гэты вечар, як дзяўчына згадвае першы баль першага свайго трыумфу. Наступным днём ён у прысутнасці пансіянераў расказаў аб сваім поспеху бацьку Гар'ё. На твары Ватрэна пры гэтым ззяла д'ябальская ўсмешка.

— І вы лічыце, — усклікнуў гэты суворы логік, — што свецкі малады чалавек можа жыць на вуліцы Нёў-Сент-Жэнеўеў, у пансіёне Ваке, безумоўна, неблагім ва ўсіх аспектах, аднак зусім не фешэнебельным? Пансіён наш заможны, вядомы сваім дастаткам, ён можа ганарыцца тым, што даў часовы прытулак аднаму з Расціньякаў, але ўсё роўна ён знаходзіцца на вуліцы Нёў-Сент-Жэнеўеў і не ведае, што такое раскоша, бо ён — сапраўдная *патрыярхалярама*. Мой юны сябра, — працягваў Ватрэн паблажліва-жартоўным тонам, — калі вы маеце намер стаць у Парыжы значным чалавекам, вам патрэбна мець цільбюры і тройку коней раніцай, двухмесную карэту ўвечары, усяго дзевяць тысяч франкаў толькі на выезд. Вы будзеце нягодным свайго прызначэння, калі не будзеце выдаткоўваць трох тысяч франкаў на краўца, шасцісот на парфумы, трохсот на шаўца і яшчэ трохсот — на капялюшніка. Прачка будзе каштаваць вам тысячу франкаў. Свецкія маладыя людзі не могуць абысціся без асаблівай увагі да сваёй бялізны, бо менавіта гэта ўважліва разглядаецца часцей за ўсё, ці не так? Каханне і царква вымагаюць прыгожых абрусаў на свае алтары. У выніку ў нас набегла чатырнаццаць тысяч. Тое, што вы страціце на гульні, падарункі і спрэчкі, я пад увагу не бяру, але не палічыць дзвюх тысяч на кішэнныя выдаткі немагчыма. Я жыў такім жыццём, я ведаю яго кошт... Дадайце да расходаў на прадметы першай неабходнасці яшчэ паўтары тысячы на ежу і тысячу на закутак. Вось бачыце, хлопча, у нас за душою павінна быць дваццаць пяць тысяч франкаў у год, калі не, вы зрынецеся ў бруд, з вас будуць кпіць, і бывайце ўсе планы на будучыню, усе поспехі, каханкі! Я забыўся яшчэ пра лёкая і грума. Не Крыстоф жа будзе разносіць вашы любоўныя запіскі! І няўжо вы будзеце пісаць на той паперы, якой карыстаецеся цяпер? Гэта ўсё роўна, што скончыць жыццё самагубствам. Паверце дасведчанаму старому! — сказаў ён

нізкім басам. — Альбо адасабляйцеся на дабрачынным гарышчы і бярыце сабе ў жонкі катаржніцу-працу, альбо рашайцеся на іншы палёт.

Ватрэн міргнуў, крадком зірнуўшы на мадэмуазель Тайфэр, нібы падсумоўваў такім чынам тыя спакусы, якія ён пасеяў у душы студэнта, каб збіць яго з добрага шляху. Вясёлае жыццё Расіньяка доўжылася даволі доўга. Амаль штодня ён абедаў у мадам дэ Нусінген і выязджаў разам з ёю ў свет. Вяртаючыся дадому а трэцяй, а чацвёртай гадзіне раніцы, ён уставаў апоўдні, апранаўся, ехаў з Дэльфінай у Булонскі лес, адным словам, транжырыў свой час, не ведаючы яму цаны, але засвойваў усе ўрокі, усе спакусы раскошы з такой жа прагнасцю, з якой падвяночак жаночай кветкі на фінікавай пальме нецярпліва чакае апладняючы шлюбны пылок. Ён шмат, на вялікія грошы, гуляў: то выйграе шмат, то шмат прайграе і, нарэшце, звыкся з бесшабашным жыццём маладых парыжан. З першых выйгрышаў ён адаслаў маці і сёстрам тысячу пяцьсот франкаў, далучыўшы да доўга прыгожыя падарункі. Хаця ён абвясціў, што збіраецца пакінуць дом Ваке, напрыканцы студзеня ён усё яшчэ жыў там і не ведаў, як адтуль выбрацца. Жыццё маладых людзей падпарадкоўваецца закону, які, на першы погляд, цяжка растлумачыць; яго аснова — у самой маладосці, у тым шаленстве, з якім юнакі накідваюцца на ўцехі. Багатыя ці бедныя, на жыццёвыя патрэбы яны грошай ніколі не маюць, а вось на выдвары — калі ласка. Яны шчодрыя, калі нешта можна набыць у крэдыт, затое скупыя там, дзе трэба плаціць адразу ж, і, здаецца, помсцяць за тое, што ім недаступна, мантачачы тое, што маюць. Прасцей кажучы, студэнт шануе свой капялюш куды болей, чым фрак. Кравец бярэ вялікія грошы, і таму кліенты плацяць, часцей за ўсё, у крэдыт, а вось з капялюшнікам, дзе сумы сціплыя, асабліва не патаргуешся, таму яго лічаць самым непадатлівым з людзей. Калі малады чалавек, седзячы на балконе тэатра, прыцягвае да сябе ларнеты маладых красунь фантастычнай сваёй камізэлькай, то гэта яшчэ не доказ таго, што на нагах у яго ёсць шкарпэткі: панчошнік таксама адносіцца да ліку даўганосікаў, якія дзіравяць кішэню. Так жыў і Расіньяк. Для мадам Ваке грошай у яго кашальку не знаходзілася ніколі, на патрэбы фанабэрыі заўсёды хапала, у кішэні назіраліся дзіўныя прылівы і адлівы, якія ніяк не спалучаліся з самымі надзённымі выдаткамі. Што

магло быць прасцей, чым кінуць гэты смярдзючы пансіён? Варта было заплаціць гаспадыні за месяц наперад, купіць мэблю для ўласнай кватэры, годнай незалежнага дэндзі, і болей нішто перыядычна не зневажала б яго вялікасвецкія прэтэнзіі. А якраз гэта па-ранейшаму аказвалася немагчымым. Каб мець для гульні грошы, Расціньяку хапала кемнасці пасля выйгрышу купляць у ювеліра кішэнныя гадзіннікі і залатыя ланцужкі, якія пры неабходнасці можна занесці ў ламбард, да гэтага змрочнага і маўклівага сябра маладосці, але калі размова ішла пра аплату за харчаванне, кватэру, прылады, абавязковыя для ўзняцця свецкай раллі, тут смеласць, вынаходлівасць знікалі. Будзённыя патрэбы, даўгі на іх задавальненне зусім не натхнялі Эжэна. Як і большая частка тых, хто зазнаў такое вясёлае жыццё, ён да апошняй хвіліны адцягваў выплату за святыя, з пункту гледжання мяшчан, даўгі, як і Мірабо, які плаціў пекару за хлеб толькі тады, калі гэты доўг прыходзіў у грознай форме вэксаля. Прыйшоў час, калі Расціньяк прайграў усе грошы і залез у доўг. Ён пачынаў усведамляць, што немагчыма існаваць далей так, як існаваў ён, не маючы ніякіх крыніц даходаў. Але, стогнучы пад балючымі ўдарамі, абумоўленымі няўстойлівасцю яго становішча, ён адчуваў, што не можа адмовіцца ад разгульнага жыцця, якое вёў, і хацеў любой цаной захаваць яго. Стала ясна, што мары аб шчаслівым выпадку, з дапамогай якога ён разлічваў нажыць багацце — хімера, затое рэчаіснасць падкрэслівала свае рэаліі. Даведаўшыся пра сямейныя таямніцы Нусінгенаў, ён зразумеў, што для таго, каб ператварыць каханне ў сродак абагачэння, трэба выпіць да дна кубак сораму і развітацца з высакароднымі ідэямі, дзеля якіх юнацтву адпускаюцца яго грахі. Ён згадзіўся жыць знешне бліскучым, але падточаным дакорамі сумлення жыццём, за мімалётныя ўцехі якога прыходзілася плаціць нязводнымі трывогамі, ён каціўся шляхам гэтага жыцця і качаўся ў яго ціне, нібы «Рассеяны» Лабруера[1], які зрабіў сабе ложак у прыдарожнай канаве, але, таксама як «Рассеяны», ён запляміў яшчэ толькі вопратку.

— Дык як, забілі мандарына? — спытаў у яго аднойчы Б'яншон, устаючы з-за стала.

— Яшчэ не, але ён ужо хрыпіць, — адказаў Эжэн.

---

[1] *Лабруер*, Жан дэ (1645—1696) — французскі пісьменнік.

Студэнт-медык палічыў адказ жартам, але то быў не жарт. Эжэн, які ўпершыню за доўгі час вячэраў у пансіёне, сядзеў за сталом у задуменні. Пасля дэсерту, замест таго каб пайсці, ён застаўся ў сталовай. Ён сядзеў поруч з мадэмуазель Тайфэр і час ад часу выразна пазіраў на яе. Некаторыя з пансіянераў яшчэ сядзелі за сталом і лушчылі арэхі, іншыя шпацыравалі па пакоі, працягваючы пачатыя дыскусіі. Вечарамі заўсёды было так, што кожны пакідаў сталовую тады, калі захоча, у залежнасці ад таго, цікавіць яго размова ці не і як адбываецца працэс стрававання. Узімку сталовая рэдка калі пусцела раней восьмай гадзіны, але, нарэшце, чатыры кабеты ўсё ж заставаліся адны і тады ўжо адводзілі душу пасля вымушанага ў суседстве з такім зборышчам мужчын маўчання. Заўважыўшы заклапочанасць Эжэна, Ватрэн застаўся ў сталовай, хаця спачатку рабіў выгляд, што спяшаецца, і трымаўся такім чынам, каб Эжэн яго не заўважаў і думаў, што той пайшоў. Не пайшоў Ватрэн і пазней, разам з апошнімі пансіянерамі, а затаіўся ў гасцінай, па суседству. Ён прачытаў усё у душы студэнта і чакаў рашучага пералому. Расціньяк і сапраўды знаходзіўся ў знаёмай усім маладым людзям нявыкрутцы. Кахала яна, ці толькі рабіла выгляд, але мадам дэ Нусінген выпрабавала Расціньяка ўсімі трывогамі шчырай жарсці, ужыўшы дзеля гэтага ўсе рэсурсы жаночай дыпламатыі, якімі карысталіся парыжанкі. Скампраметаваўшы сябе ў вачах свету, дзеля таго каб наблізіць да сябе кузена мадам дэ Басэан, яна не асмельвалася надзяліць яго правамі, якія, як здавалася ўсім, ён ужо атрымаў. Цэлы месяц яна гэтак умела падагравала пачуцці Эжэна, што, нарэшце, закранула яго сэрца. Калі ў першыя дні іх знаёмства студэнт адчуваў сябе гаспадаром становішча, цяпер валадарыла мадам дэ Нусінген, дзякуючы здольнасці ўзбуджаць у Эжэне ўсе і добрыя, і благія пачуцці тых двух ці трох чалавек, якія адначасова сужываюцца ў адным юнаку. Ці гэта быў разлік? Не, жанчыны заўсёды шчырыя, нават калі хлуснёй падмацоўваюць хлусню, бо заўсёды дзейнічаюць, падпарадкоўваючыся нейкаму натуральнаму пачуццю. Магчыма, Дэльфіна дазволіла маладому чалавеку ўзяць над сабой верх, не хаваючы вялізнай сімпатыі да яго, а цяпер, падпарадкоўваючыся пачуццю ўласнай годнасці, хацела або адмовіцца ад сваіх уступак, або адцягнуць іх на некаторы час. Гэта так натуральна для парыжанкі — вагацца, нават у той момант, калі каханне

ўцягвае яе ў свой вір. Яна нібы выпрабоўвае сэрца чалавека, якому збіраецца даверыць сваю будучыню. Гарачыя спадзяванні мадам дэ Нусінген былі падмануты ўжо адзін раз: на яе пачуцці малады эгаіст адказаў не самым лепшым чынам. Баранэса мела права не давяраць. Магчыма, імклівы поспех ператварыў Эжэна ў фата, поўнага фанабэрыі, і Дэльфіна заўважыла ў яго паводзінах адсутнасць належнай павагі; прычынай гэтаму была своеасаблівасць сітуацыі, у якой яны знаходзіліся. Вядома, Дэльфіне хацелася імкліва ўзвысіцца, стаць непараўнальнай у вачах маладога чалавека ва ўзросце Эжэна, асабліва пасля тых доўгіх прыніжэнняў перад тым, хто яе пакінуў. Яна не хацела, каб Эжэн лічыў, што заваяваць яе лёгка, менавіта таму, што яму было вядома пра сувязь з дэ Марсэ. Адным словам, зазнаўшы зневажальныя ўцехі з сапраўдным монстрам, маладым распуснікам, яна з пяшчотнай радасцю гуляла па квітнеючых гонях кахання; яна захаплялася кожнай дробяззю, гатова была вечна прыслухоўвацца да ледзь чутнага трымцення і аддавацца ласкам цнатлівага ветрыку. Шчырае каханне сплочвала віну за няшчырае. Гэтая бессэнсоўнасць, на жаль, будзе сустракацца часта да таго часу, пакуль мужчыны не зразумеюць, колькі кветак загіне ў маладой жаночай душы пад першымі ўзмахамі касы падману. Але якімі б не былі прычыны, Дэльфіна гуляла Расціньякам і сама сабе падабалася, бо адчувала, што яе кахаюць, і ведала, што валодае надзейным сродкам спыніць усе пакуты каханка, як толькі яе жаночая вялікасць пажадае. Пачуццё ўласнай годнасці не дазваляла Эжэну дапусціць яе перамогі ў іх першай бітве, і ён упарта працягваў паляванне, нібы паляўнічы, які хоча абавязкова падстрэліць курапатку ў дзень адкрыцця палявання.

Да гэтай жанчыны яго ўсё болей і болей прывязвалі трывогі, закранутае самалюбства, прыступы адчаю, шчырыя ці напускныя. Увесь Парыж ужо аддаваў мадам дэ Нусінген у рукі Эжэна, але на самай справе яго поспехі не прасунуліся ні на крок далей таго, што ён заваяваў у першы дзень іх знаёмства. Расціньяка апаноўвала беспрычынная злосць, ён яшчэ не ведаў, што жаночае какецтва часам тоіць больш радасцей, чым задавальнення ад яе кахання. Той час, калі жанчына змагаецца з каханнем, ужо прыносіў маладому чалавеку свае першыя плады, яшчэ зялёныя, кіславатыя, але затое непараўнальна смачныя і дарагія. Зрэдку, застаўшыся без граша і без

надзей на будучыню, Расціньяк, заглушаючы голас сумлення, думаў пра шанц узбагаціцца — пра шлюб з мадэмуазель Тайфэр, прапанаваны Ватрэнам. І вось прыйшоў момант, калі галеча так патрабавальна ўзвысіла голас, што ён амаль міжволі стаў паддавацца хітрыкам жудаснага сфінкса, перастаў супраціўляцца чарам гэтага позірку. Калі Пуарэ і мадэмуазель Мішано ўзняліся да сябе наверх, Расціньяк палічыў, што застаўся адзін між мадам Ваке і мадам Куцюр, якая, засынаючы ля печкі, вязала ваўняныя нарукаўнікі, і зірнуў на мадэмуазель Тайфэр так пяшчотна, што тая апусціла вочы долу.

— Вас нешта засмучае, месье Эжэн? — пасля хвіліннага маўчання спытала Віктарына.

— А ў каго няма смутку? — адказаў Расціньяк. — Калі б мы, маладыя людзі, ведалі, што нас сапраўды моцна любяць, узнагароджваючы за тыя ахвяры, якія мы заўсёды гатовы прынесці, магчыма, тады мы б забылі пра смутак.

Замест адказу мадэмуазель Тайфэр недвухсэнсоўна зірнула на Эжэна.

— Так, сёння вам здаецца, што вы ўпэўнены ў сваім сэрцы, але ці дасцё вы заруку, што вашы пачуцці ніколі не зменяцца?

Быццам прамень выслізнуў з сэрца беднай дзяўчыны, усмешка прабегла па яе вуснах, асвяціўшы твар такім зззяннем, што Эжэн нават спалохаўся такога моцнага выбуху пачуццяў.

— А калі б заўтра вы сталі багатай і шчаслівай, калі б на вас з неба звалілася вялізнае багацце, вы б працягвалі любіць таго беднага маладога чалавека, якога ўпадабалі ў дні вашай нястачы?

Яна міла кіўнула галавой.

— Зусім беднага маладога чалавека?

Яшчэ ківок.

— Што за глупства вы кажаце? — усклікнула мадам Ваке.

— Не перашкаджайце, мы ведаем, пра што гаворым, — адказаў Эжэн.

— Такім чынам, шэвалье Эжэн дэ Расціньяк і мадэмуазель Віктарына Тайфэр абменьваюцца шлюбнымі зарукамі? — сваім гучным басам спытаўся Ватрэн, нечакана з'явіўшыся ў дзвярах сталовай.

— Ах, як вы мяне напалохалі! — у адзін голас заявілі мадам Куцюр і мадам Ваке.

— Напэўна, лепш мне не выбраць, — смеючыся, адказаў Эжэн, якога да смерці, як ніколі ў жыцці, усхваляваў голас Ватрэна.

— Без непатрэбных жартаў, панове! — папярэдзіла іх мадам Куцюр. — Пайшлі, Віктарына, да сябе наверх.

Мадам Ваке пайшла за сваімі жыхаркамі, каб не паліць у сябе свечкі і дровы, правёўшы вечар у іх пакоі. Эжэн апынуўся сам-насам з Ватрэнам.

— Я ведаў, што вы прыйдзеце да гэтага рашэння, — сказаў ён, захоўваючы непарушную вытрымку. — Але, чуеце, ува мне таксама далікатнасці не менш, чым у кім. Зараз нічога не вырашайце, бо вы не ў сваёй талерцы. У вас даўгі, а я хачу, каб розум, а не пачуцці ці роспач прывёў вас да мяне. Магчыма, вам патрэбна некалькі тысяч? Калі ласка. Хочаце?

Дэман-спакуснік выняў з кішэні бумажнік, дастаў адтуль тры тысячы франкаў і пакруціў імі перад носам студэнта. Эжэн знаходзіўся ў жудасным становішчы. Ён прайграў на слова маркізу д'Ажуда і графу дэ Трай пяцьсот франкаў. Такіх грошай ён не меў, і таму не асмеліўся пайсці на вечарыну да мадам дэ Рэсто, дзе яго чакалі. Графіня ладзіла неафіцыйную вечарыну, на якой збіралася пачаставаць гасцей пірожнымі, гарбатай і на якой можна прайграць у віст шэсць тысяч франкаў.

— Спадар Ватрэн! Пасля таго што вы мне прапанавалі, вы павінны зразумець, што я не магу прыняць ад вас ніякіх пазык, — сказаў Эжэн, не без цяжкасці перасільваючы сутаргавыя дрыжыкі.

— Добра! Вы засмуцілі б мяне іншым адказам, — зноў загаварыў спакуснік. — Вы — прыгожы, далікатны, ганарысты, як леў, і чулы, як дзяўчына, малады чалавек. Д'яблу вы сталі б слаўнай здабычай. Мне падабаюцца такія маладыя людзі. Яшчэ пару разважанняў з вобласці высокай палітыкі, і вы пабачыце свет такім, якім ён ёсць. Разыгрываючы ў ім невялічкія сцэнкі дабрадзейнасці, чалавек высокага палёту можа задавальняць усе свае капрызы пад бурныя апладысменты дурняў у партэры. Пройдзе некалькі дзён — і вы наш. Ах, каб вы толькі згадзіліся стаць маім вучнем, то вы дасягнулі б усяго. Вы не змаглі б прыдумаць жадання, якое б не споўнілася ў тую ж хвіліну: пашана, багацце, жанчыны. Усё, што створана чалавецтвам, мы паднеслі

б вам, як амброзію. Вы сталі б нашым пестуном, нашым Веніямінам[1], дзеля вас мы ўсе гатовы пайсці ў агонь і ў ваду. Любую перашкоду, што ўзнімецца на вашым шляху, мы змяцем. Я спадзяюся, вы не лічыце мяне мярзотнікам, калі вы вагаецеся? Дык вось, такі ж сумленны чалавек, якім вы лічыце сябе, месье дэ Цюрэн[2] уваходзіў у невялікія здзелкі з разбойнікамі, але не лічыў, што гэта можа зганьбіць яго. Вы не хочаце быць абавязаным мне, ці не так? Дык у чым справа? — працягваў Ватрэн, не стрымаўшыся ад усмешкі. — Бярыце гэтую цыдулку і пішыце вось так, наўскос, — сказаў ён, працягваючы гербавы бланк: «Прыняты ў суме тры тысячы пяцьсот франкаў з выплатай на працягу года». Пастаўце дату! Працэнты вельмі высокія, каб вы вагаліся: называйце мяне ліхвяром і лічыце сябе вольным ад усялякай удзячнасці. Сёння я дазваляю вам пагарджаць мною, бо ведаю пэўна, што пасля вы мяне палюбіце. Ува мне вы можаце знайсці глыбокія бездані, моцныя, сканцэнтраваныя пачуцці, якія дурні празвалі заганамі; але ніколі вы не скажаце, што я — няўдзячны ці подлы. Карацей, я не пешка і не слон, я тура, хлопча.

— Што вы за чалавек? — усклікнуў Эжэн. — Няўжо вы існуеце для таго, каб мучыць мяне?

— Не, я проста добры чалавек, гатовы запэцкацца сам, каб вы да скону не бачылі бруду. Вам цікава, адкуль такая адданасць? Добра, калі-небудзь я вам ціхенька прызнаюся, каб ніхто не чуў. Спачатку я збіў вас з панталыку, растлумачыўшы вам механізм грамадскага ладу і рухавік гэтай машыны, але першы пярэпалах ваш міне, як боязь навабранца на полі бітвы, і вы прызвычаіцеся разглядаць людзей як салдат, якім наканавана гінуць дзеля карысці тых, хто сам сябе карануе ў каралі. Часы змяніліся. Раней казалі нейкаму зуху: «Вось табе сто залатых, забі такога і такога» — і можна было спакойна вячэраць, загнаўшы чалавека на той свет без дай прычыны. Сёння я прапаную вам цэлае багацце за адзін ківок галавы, які ніяк не можа скампраметаваць вас, а вы яшчэ вагаецеся. Вялы век!

Эжэн падпісаў тратту і атрымаў банкноты.

---

[1] *Веніямін* — паводле Старога Запавету малодшы сын Іакава, ужываецца ў пераносным сэнсе: любімец, пястун.

[2] *Цюрэн*, Анры дэ ля Тур д'Оверань (1611—1675) — французскі палкаводзец, на ліку якога перамогі пры Фрэйбургу ды Нёрлінгене.

— Выдатна! А цяпер давайце пагаворым сур'ёзна, — працягваў Ватрэн. — Праз некалькі месяцаў я збіраюся адправіцца ў Амерыку разводзіць тытунь. Па сяброўству буду дасылаць вам цыгары. Калі стану багатым, дапамагу вам. Дзяцей у мяне хутчэй за ўсё не будзе (бо не маю ахвоты пускаць атожылкі), я завяшчаю сваё багацце вам. Хіба гэта не сяброўства? Але я вас люблю. Мне падабаецца ахвяраваць сабой дзеля другога чалавека. Я так заўсёды рабіў. Рэч у тым, што я жыву ў сферы, скажу я вам, нашмат вышэйшай, чым іншыя людзі. Бачу я адну толькі мэту, а дзеянне разглядаю як сродак. Што для мяне чалавек? Вось што, — сказаў ён, пстрыкнуўшы пазногцем вялікага пальца сябе ў зуб. — Чалавек — гэта ці ўсё, ці нішто. Калі яму імя Пуарэ — дык гэта менш, чым нішто, ён пляскаты, смярдзючы, яго можна раздушыць як клапа. Але калі чалавек падобны на вас, ён — бог. Тады ён не механізм, пакрыты скурай, а тэатр, дзе разгортваюцца дзеі самых прыгожых пачуццяў, а я жыву толькі пачуццямі. Пачуццё! Ці не з'яўляецца яно цэлым светам у адзінай думцы? Зірніце на бацьку Гар'ё: дзве дачкі для яго — цэлы сусвет, тая ніць, па якой ён кіруецца ў жыцці. Дык вось, на маю думку, я глыбока зазірнуў у жыццё і прызнаю толькі адно сапраўднае пачуццё: сяброўства двух мужчын. Маё захапленне — П'ер і Джаф'ер. Я на памяць ведаю «Уратаваную Венецыю»[1]. Ці многа знойдзеце вы людзей такой загартоўкі, якія на словы таварыша: «Пайшлі, пахаваем мерцвяка» ўстануць і пойдуць, не прамовіўшы ні слова, не назаляючы маральнасцю? А я рабіў так. Не з кожным чалавекам магу я весці такія размовы. Але вы чалавек вышэйшага гатунку, вам можна казаць усё, вы ўсё зразумееце. Нядоўга будзеце вы боўтацца ў твані, дзе жывуць апалонікі. Мы, здаецца, прыйшлі да згоды. Вы ажэніцеся. Выцягнем шаблі і наперад! Мая шабля — стальная і ніколі не сагнецца! Вось так!

Ватрэн адразу ж выйшаў, каб не атрымаць адмоўнага адказу і даць магчымасць Эжэну трошкі апрытомнець. Мусіць, ён ведаў прычыну ўсёй гэтай слабай упартасці, усім гэтым пярэчанням, якімі чалавек імкнецца апраўдацца перад самім сабою за нягодныя ўчынкі.

---

[1] *П'ер і Джаф'ер* — два сябры, героі «Уратаванай Венецыі», трагедыі англійскага драматурга XVII ст. Томаса Отвея (1651—1685).

«Няхай робіць, што хоча, але я не ажанюся з мадэмуазель Тайфэр!» — сказаў сам сабе Эжэн.

Вытрымаўшы прыступ душэўнай ліхаманкі, што затрэсла яго ад адной толькі думкі аб дамове з гэтым жудасным чалавекам, які рос у вачах Эжэна дзякуючы цынічнасці сваіх думак і смеласці прысуда грамадству, Расціньяк апрануўся, паслаў за карэтай і паехаў да мадам дэ Рэсто. Вось ужо некалькі дзён гэтая жанчына з падвойнай цеплынёй адносілася да Эжэна, які з кожным крокам усё далей рухаўся да вышэйшага свету і чый уплыў мог аднойчы дасягнуць вялізных памераў. Ён расплаціўся з графам дэ Трай і д'Ажуда, усю ноч прагуляў у віст і выйграў страчаныя грошы. Прымхлівы, як і большасць маладых людзей, якія яшчэ толькі прабіваюць сабе дарогу і таму больш ці менш вераць у лёс, ён захацеў бачыць у сваім выйгрышы боскую ўзнагароду за выбар добрага шляху. Наступнаю раніцай ён перш за ўсё спытаў у Ватрэна, куды ён падзеў яго тратту. Пачуўшы адказ, што яна ў Ватрэна, Эжэн з відавочным задавальненнем аддаў яму тры тысячы франкаў.

— Усё добра, — сказаў Ватрэн.

— Але я не хаўруснік вам, — адказаў Эжэн.

— Ведаю, ведаю, — перабіў яго Ватрэн. — Вы паранейшаму паводзіце сябе як дзіця, спыняючыся на ганку з-за дробязяў.

Двума днямі пазней Пуарэ і мадэмуазель Мішано грэліся пад сонейкам на лаўцы ў бязлюднай частцы Батанічнага саду і размаўлялі з чалавекам, які нездарма здаўся падазроным Б'яншону.

— Мадэмуазель, — казаў месье Гандзюро, — не разумею прычыны вашых ваганняў. Яго Высокасць міністр дзяржаўнай паліцыі каралеўства...

— Ах, Яго Высокасць міністр дзяржаўнай паліцыі каралеўства!.. — паўтарыў Пуарэ.

— Так, Яго Высокасць зацікавіўся гэтай справай, — удакладніў Гандзюро.

Ну хто дасць веры таму, што Пуарэ, былы служачы і, несумненна, чалавек безумоўных мяшчанскіх якасцей, хаця і няздольны да мыслення, працягваў слухаць нібыта ранцье з вуліцы Бюффон, нават пасля таго як той згадаў «паліцыю», тым самым паказаўшы свой сапраўдны твар, твар агента з вуліцы Жэрузалем[1]? Між тым, няма нічога

[1] *...агента з вуліцы Жэрузалем* — агента сакрэтнай паліцыі.

натуральней. Пасля назірання, зробленага пэўнымі даследчыкамі, але да гэтых часоў не апублікаванага, вам стане зразумелым, да якога асаблівага *віду сямейства* прасцякоў належаў Пуарэ: існуе пераноснае племя, абмежаванае ў дзяржаўным бюджэце між першым градусам шырыні (накшталт адміністратыўнай Грэнландыі), дзе заробкі замярзаюць на тысячы дзвесце франкаў і трэцім градусам (умераны клімат), дзе заробкі трошкі цяплеюць, да трох, шасці тысяч франкаў, дзе добра растуць узнагародныя прэміі і нават квітнеюць, нягледзячы на цяжкія ўмовы. Адной з тыповых рысаў, якая найбольш яскрава перадае безнадзейную вузкасць гэтага падначаленага народа, з'яўляецца нейкая міжвольная, механічная, інстынктыўная павага да далай-ламы любога міністэрства, які вядомы чыноўнікам толькі па неразборлівым подпісу і пад імем «Яго высокасць міністр», тры словы, роўныя па значэнні «Bondo Cani» з «Багдадскага каліфа»[1]. Тры словы для прыбітага народа значаць святую, апошнюю інстанцыю ўлады; як папа для каталікоў, так і міністр у якасці адміністратара ў вачах бязгрэшных служачых; бляск яго асобы распаўсюджваецца на яго дзеянні, на яго словы, нават на тое, што сказана ад яго імя; яго расшыты золатам мундзір пакрывае ўсё і ўзаконьвае ўсё, што робіцца па ягоным загадзе; само яго званне «Высокасць» сведчыць пра чысціню намераў і святасць яго ўказанняў, служыць пропускам для самых недапушчальных ідэй. Ледзьве пачуўшы словы «Яго Высокасць», гэтыя нябогі спяшаюцца выканаць тое, што не зрабілі б нават дзеля ўласнай выгады. Як армія трымаецца на дысцыпліне, так і ў канцылярыях пануе пасіўная паслухмянасць; гэтая сістэма заглушае сумленне, сцірае ў чалавеку асобу і ўрэшце, з цягам часу, прыстасоўвае яго, як гайку ці шруб, да машыны дзяржаўнага кіравання. Вось чаму месье Гандзюро, чалавек, які разбіраўся ў людзях, адразу ж угледзеў у Пуарэ аднаго з бюракратычных дурняў і выпусціў у патрэбны момант Deus ex machina[2] — магічны выраз «Яго Высокасць», — вывеў з засады свае батарэі і асляпіў Пуарэ, які з'яўляўся,

---

[1] *«Багдадскі каліф»* — камічная опера Франсуа Буальдзье, (1775—1834).

[2] *Deus ex machina* — «Бог з машыны» *(лац.)*. У антычнай трагедыі акцёра, які іграў бога, апускалі на сцэну з дапамогай спецыяльных прылад.

як здавалася паліцэйскаму, палюбоўнікам Мішано, а яна — палюбоўніцай Пуарэ.

— Раз Яго Высокасць, ды яшчэ сам, яго высокасць мі... Ах, гэта мяняе справу, — сказаў Пуарэ.

— Вы чуеце думку спадара, а яму вы, здаецца, даваяраеце, — працягваў несапраўдны ранцье, звяртаючыся да мадэмуазель Мішано. — Дык вось, Яго Высокасць цяпер поўнасцю перакананы, што той, хто называе сябе Ватрэнам і жыве ў доме Ваке, на самай справе збеглы катаржнік. У тулонскім астрозе яго ведаюць пад іменем Падмані Смерць.

— Ах, Падмані Смерць! — паўтарыў Пуарэ. — Значыць, ён шчаслівы, калі сапраўды заслужыў гэтае імя.

— Дзіва што! Гэтаю мянушкаю ён абавязаны сваёй ўдачы: толькі дзякуючы лёсу ён не пайшоў на той свет у выключна смелых акцыях, ажыццёўленых ім. Ён небяспечны, скажу я вам, чалавек! За некаторыя якасці яго можна лічыць чалавекам незвычайным. Асуджэнне на катаргу нават зрабіла яму гонар у яго асяроддзі...

— Выходзіць, ён — чалавек паважаны? — спытаў Пуарэ.

— У пэўнай ступені. Ён згадзіўся прыняць на сябе чужое злачынства, падробку, якую ўчыніў прыгожы малады чалавек, яго пястун, італьянец, заўзяты ігрок, пазней ён перайшоў на ваенную службу, дзе, зрэшты, выдатна сябе зарэкамендаваў.

— Але калі Яго Высокасць міністр паліцыі ўпэўнены ў тым, што месье Ватрэн на самой справе Падмані Смерць, для чаго спатрэбілася я? — спытала мадэмуазель Мішано.

— Так, так, — паўтарыў Пуарэ, — калі, сапраўды, міністр, як вы мелі гонар нам паведаміць, у пэўнай ступені перакананы...

— Перакананасць — не зусім дакладнае слова; мы толькі падазраем. Зараз вам усё стане ясна: Жаку Калену, па мянушцы Падмані Смерць, цалкам даваяраюць тры катаржныя турмы, якія абралі яго сваім агентам ды банкірам. Ён зарабляе шмат займаючыся такімі справамі, бо тут патрэбны чалавек высокай пробы.

— Ха-ха, ці вы, мадэмуазель, зразумелі гэты каламбур? — спытаў Пуарэ. — Месье Гандзюро называе яго чалавекам «высокай пробы», таму што ён пазначаны кляймом.

— Так званы Ватрэн, — працягваў агент, — прымае капіталы ад катаржнікаў, размяшчае іх, захоўвае, каб

пасля перадаць ці самім катаржнікам, якія ўцяклі з катаргі, ці іх сем'ям, ці іх палюбоўніцам, калі яны пакінулі на гэты выпадак завяшчанне па пераводным вэксалі на імя Ватрэна.

— Палюбоўніцам? Вы маеце на ўвазе іх жонак? — заўважыў Пуарэ.

— Не, спадар. Звычайна ў катаржніка ёсць незаконная жонка, якую мы называем сужыцелькаю.

— Выходзіць, яны ўсе бываюць у сужыцці?

— Выходзіць, так.

— Я хачу сказаць, што міністр не павінен цярпець такі жах. Раз вы маеце гонар бачыцца з Яго Высокасцю, менавіта вам, паколькі вы робіце ўражанне чалавека станоўчага, варта растлумачыць яму, наколькі амаральныя паводзіны гэтых людзей, гэта ж вельмі кепскі прыклад для грамадства.

— Але ўрад садзіць іх у турму не дзеля таго, каб паказваць узор дабрадзейнасці.

— Гэта праўда! І ўсё ж, спадар, дазвольце...

— Мой мілы-дарагі, дайце месье Гандзюро сказаць, — хвалявалася мадэмуазель Мішано.

— Разумееце, мадэмуазель, — працягваў Гандзюро, — урад таксама зацікаўлены ў тым, каб завалодаць незаконнай касай, у якой, кажуць, немалыя сумы грошай: Падмані Смерць злучыў значныя багацці, прымаючы не толькі сродкі некаторых сваіх таварышаў, але і грошы «Таварыства дзесяці тысяч».

— Дзесяць тысяч злодзеяў! — спалохана ўсклікнуў Пуарэ.

— Не, «Таварыства дзесяці тысяч» — гэта суполка злодзеяў высокай маркі, людзей, якія працуюць з размахам і не блытаюцца ў справах, на якіх не заробіш дзесяці тысяч. Гэтае «Таварыства» складаецца з люду самага абранага, з тых малойчыкаў, якія накіроўваюцца адразу ў Вышэйшы крымінальны суд. Яны ведаюць законы і ніколі не дадуць падвесці сябе пад пакаранне смерцю, нават калі іх зловяць на гарачым учынку. Кален — іх давераны чалавек, іх дарадца. З дапамогаю вялізных сродкаў гэты чалавек стварыў уласную паліцыю, шырокую сетку знаёмстваў, ахутаную непадступнай таямніцай. Вось ужо год, як мы аблажылі яго шпіёнамі, і ўсё яшчэ не можам разабрацца ў яго гульні. Гэтая каса і яго таленты, такім чынам, працягваюць фінансаваць заганы, садзейнічаюць злачынствам і трымаюць у

баяздольнасці цэлае войска ліхадзеяў, якія ўвесь час ваююць з грамадствам. Арыштаваць Падмані Смерць і схапіць яго шайку — значыцца падсячы зло пад самы корань. Вось чаму гэтая аперацыя стала дзяржаўнай, палітычнай справай, здольнай прынесці гонар тым, хто паспрыяе яе поспеху. Вы, спадар, зможаце зноў паступіць на службу па адміністратыўнай частцы, стаць сакратаром паліцэйскага камісара, і гэта ніколькі не перашкодзіла б адначасова атрымліваць і вашу пенсію.

— Але чаму Падмані Смерць не ўцячэ, прыхапіўшы з сабой касу? — спыталася мадэмуазель Мішано.

— О, куды б ён ні падаўся, абкраўшы катаргу, яго ўсюды знойдзе чалавек, якому будзе даручана забіць падманшчыка! Акрамя таго, касу не ўкрадзеш гэтак жа лёгка, як паненку з добрага дома. Зрэшты, Кален — малайчына, ён няздольны на падобны крок, гонар для яго важнейшы.

— Вы маеце рацыю, спадар, ён бы зусім зняславіў сябе.

— Усе гэтыя словы не тлумачаць нам, чаму вы проста не арыштуеце яго? — заўважыла мадэмуазель Мішано.

— Добра, мадэмуазель, я адкажу вам, але, — шапнуў ён ёй на вуха, — не давайце вашаму кавалеру мяне перабіваць, бо гэтак мы ніколі не скончым. Каб старога слухалі, трэба яму стаць вельмі багатым чалавекам... Дык вось, прыехаўшы сюды, Падмані Смерць прыкінуўся сумленным чалавекам, ён зрабіўся сапраўдным парыжскім гараджанінам, атабарыўся ў несамавітым пансіёне, хітрун, як бачыце, неспадзеўкі такога ніколі не заспееш. Такім чынам, месье Ватрэн — чалавек значны, і справы яго — таксама значныя.

«Натуральна», — падумаў Пуарэ.

— Ну, а калі мы памыляемся і арыштуем сапраўднага Ватрэна? Супраць нас уздымуцца ўвесь камерцыйны свет Парыжа і грамадская думка, а міністр гэтага не хацеў бы. Пан прэфект паліцыі сам знаходзіцца ў няўстойлівым становішчы, у яго ёсць ворагі. І калі здарыцца памылка, усе, хто прагне атрымаць яго крэсла, скарыстаюць цяўканне і крыкі лібералаў, каб спіхнуць яго. Тут трэба дзейнічаць як у справе Куаньяра, самазванага графа дэ Сент-Элен. А калі б ён быў сапраўдным графам, нам бы не паздаровілася! Вось чаму праверка неабходна.

— Так, значыць, вам патрэбна красуня, — паспешліва заўважыла мадэмуазель Мішано.

— Падмані Смерць жанчынаю не спакусіш, — сказаў агент. — Адкрыю вам адну таямніцу: жанчын ён не любіць.

— Тады я не ўяўляю, як я змагу ажыццявіць праверку, калі нават згаджуся зрабіць гэта за дзве тысячы франкаў.

— Няма нічога прасцейшага, — адказаў Гандзюро. — Я забяспечу вас флаконам з вадкасцю, пасля якой адбудзецца прыліў крыві ў галаву і здарыцца нешта накшталт апаплексічнага ўдару. Але гэта не страшна. Гэтае зелле можна дабавіць у віно ці ў каву. Пасля вы хуценька пераносіце хворага ў ложак і распранаеце яго, нібыта каб пераканацца, ці не памірае ён. І як толькі вы застанецеся з ім адзін на адзін, вы плясніце яго далоняй па плячы — плясь! — і пабачыце, ці праступіць на ім кляймо ці не.

— Вельмі проста, — заўважыў Пуарэ.

— Дык як, вы згодны? — запытаўся Гандзюро ў старой дзеўкі.

— А ў тым выпадку, калі літар не знойдзецца, я атрымаю дзве тысячы франкаў?

— Не.

— А колькі ж мне тады заплаціце?

— Пяцьсот франкаў.

— Ці варта пачынаць такую справу амаль задарма! На сумленні будзе ляжаць камень, і нічым яго не супакоіш.

— Я мушу запэўніць вас, што мадэмуазель — жанчына тонкая і чулая, не кажучы пра тое, што яна — вельмі прыемная і кемлівая, — сказаў Пуарэ.

— Добра, — вырашыла мадэмуазель Мішано, — вы даяце мне тры тысячы франкаў, калі гэта сапраўды Падмані Смерць, і нічога, калі ён — звычайны чалавек.

— Згода, але пры ўмове, што справа будзе зроблена заўтра, — адказаў Гандзюро.

— Не так хутка, даражэнькі, яшчэ мне трэба парадзіцца з маім духоўнікам.

— Хітрая! — сказаў агент усміхаючыся. — Тады, да заўтра. А калі вам пільна спатрэбіцца пагаварыць са мной, прыходзьце на завулак Сент-Ан, у канец двара за Сент-Шапель. Пад аркай толькі адны дзверы, там спытаеце месье Гандзюро.

Даволі арыгінальнае імя «Падмані Смерць» уразіла вуха Б'яншона, які ў гэты час вяртаўся з лекцыі Кюўе. Ён пачуў таксама слова «згода» з вуснаў слыннага шэфа тайнай паліцыі.

— Чаму вы не бярэцеся за справу адразу? Вы маглі б атрымаць трыста франкаў пажыццёвай пенсіі, — спытаў Пуарэ, звяртаючыся да мадэмуазель Мішано.

— Чаму? Таму што гэту справу трэба яшчэ абмеркаваць. Калі месье Ватрэн сапраўды Падмані Смерць, магчыма, больш карысці будзе, калі я дамоўлюся з ім самім. Разам з тым, патрабаваць ад яго грошай — значыцца папярэдзіць яго, і ён знікне чаго добрага, не заплаціўшы. Атрымаецца толькі брыдкі пшык.

— Нават калі вы яго гэтым і папярэдзіце, — запярэчыў Пуарэ, — хіба вы забылі, што за ім будуць назіраць? А вы ўсё страціце.

«Дарэчы, — разважала мадэмуазель Мішано, — я зусім не люблю гэтага чалавека, ён мне гаворыць адны прыкрасці».

— Але вы зробіце добрую справу. Як казаў гэты, на мой погляд, прыстойны чалавек, ды і апрануты ён вельмі акуратна, што законапаслушэнства абавязвае пазбавіць грамадства ад злачынцы, якім дабрадзейным бы ён не здаваўся. П'яніца не перастане піць. А калі раптам яму стукне ў галаву ўсіх нас забіць? Мы ж, халера нас бяры, будзем у гэтых забойствах павіннымі, не кажучы ўжо пра тое, што мы станем іх першымі ахвярамі.

Заклапочанасць мадэмуазель Мішано перашкаджала ёй прыслухоўвацца да слоў, што адно за другім зляталі з вуснаў Пуарэ, як кроплі вады з кепска закручанага крана ў фантане. Калі стары пачынаў гаварыць і мадэмуазель Мішано яго не спыняла, ён бубнеў і бубнеў, як заведзеная машына. Закрануўшы адну тэму, ён з дапамогай розных пабочных сказаў пераходзіў да зусім супрацьлеглых, так і не зрабіўшы якой-небудзь высновы. На подступах да дома Ваке ён так заблытаўся ў сваіх пераходах і спасылках, што, нарэшце, узяўся за справу грамадзяніна Рагуло і грамадзянкі Марэн, дзе ён выступаў у якасці сведкі абароны. Калі яны ўвайшлі ў пансіён, яго спадарожніца, вядома, заўважыла Эжэна дэ Расціньяка і мадэмуазель Тайфэр, якія так захапіліся сардэчнай гутаркай, што не звярнулі ніякай увагі на двух пажылых пансіянераў, якія праходзілі праз сталовую.

— Гэтым і павінна было скончыцца, — заўважыла мадэмуазель Мішано. — Цэлы тыдзень яны паглядалі адно на аднаго як кот на сала.

— Так, — адказаў Пуарэ, — таму яе і асудзілі.

— Каго?

— Мадам Марэн.

— А я вам кажу пра мадэмуазель Віктарыну, — сказала Мішано і сама не заўважыла, як увайшла ў пакой да Пуарэ, — а вы пра мадам Марэн. Што гэта за жанчына, Марэн?

— У чым, у такім разе, віна мадэмуазель Віктарыны? — спытаў Пуарэ.

— У тым, што яна закахалася ў месье Эжэна дэ Расціньяка і лезе, наіўная небарака, сама не ведае куды.

Раніцай мадам дэ Нусінген давяла Эжэна да адчаю. У душы ён аддаў ужо свой лёс на волю Ватрэна, не думаючы ні пра матывы прыязнасці гэтага незвычайнага чалавека, ні пра будучыню іх хаўрусу. Толькі цуд мог адвесці яго ад бездані, над якой ён ужо з гадзіну як занёс нагу, абмяняўшыся самымі пяшчотнымі клятвамі з мадэмуазель Тайфэр. Віктарыне здавалася, што яна чуе анёльскія галасы, перад ёй адмыкаліся нябёсы, дом Ваке расквітнеў фантастычнымі колерамі, нібы тэатр пад пэндзлем дэкаратараў: яна кахала, яе кахалі, прынамсі, яна верыла гэтаму! А якая жанчына не паверыла б, гледзячы на Расціньяка, слухаючы яго на працягу цэлай гадзіны употай ад пансіённых аргусаў. Змагаючыся супраць уласнага сумлення, усведамляючы, што паступае дрэнна ды яшчэ з намерам, Эжэн заспакойваў сябе тым, што загладзіць свой даравальны грэх шчасцем жанчыны; у гэтым змаганні са сваім сумленнем ён ад роспачы нават папрыгажэў і заззяў тым пякельным агнём, якім гарэла яго сэрца. На шчасце для яго, цуд адбыўся: увайшоў вясёлы Ватрэн і адразу зразумеў, што робіцца ў душах маладых людзей, злучаных вынаходлівасцю яго д'ябальскага розуму. Гукі яго нізкага здзеклівага голасу раптоўна абарвалі іх радасны настрой:

Мая чароўная Фаншэта
Па прастаце сваёй...

Віктарына збегла, перапоўненая такім шчасцем, якое роўна па сваім памеры ўсім няшчасцям, што напаткалі яе ў жыцці. Бедная дзяўчына! Поціск рукі, валасы Расціньяка, што дакрануліся да яе шчакі, слова, вымаўленае так блізка на вуха, што адчулася цеплыня губ, трымценне рукі, што трымала яе за талію, пацалунак у шыю — усё гэта стала самымі лепшымі заручынамі кахання, і ад суседства тоўстай Сільвіі, гатовай увайсці ў гэтую прамяністую сталовую, яны зрабіліся палымяней, мацней і

чароўней за самыя яркія прыклады вернасці ў славутых апавяданнях пра каханне. Гэтыя нясмелыя залогі кахання, згодна вобразных выразаў нашых продкаў, здаваліся злачынствам маладой набожнай дзяўчыне, якая хадзіла да споведзі кожныя два тыдні. Зараз яна падаравала Эжэну больш скарбаў сваёй душы, чым зможа падараваць пасля, стаўшы жанчынай багатай і шчаслівай, аддаючы сябе цалкам.

— Справа зроблена, — сказаў Эжэну Ватрэн. — Нашыя дэндзі пасварыліся, усё здарылася вельмі прыстойна. Сварка з прычыны розніцы ў поглядах. Наш голуб зняважыў майго сокала. Дамовіліся сустрэцца заўтра, у рэдуце Клін'янкур. А палове дзевятай мадэмуазель Тайфэр, спакойна макаючы грэнкі ў каву, стане спадкаемніцай свайго бацькі, яго кахання і багацця. Гэта не жартачкі! Тайфэр-малодшы добра валодае шпагай, саманадзейнасці ў яго болей, чым у казырнага туза, але мною вынайдзены ўдар, пасля якога ён зальецца кроўю. Трэба толькі ведаць, як узняць шпагу і ўкалоць у лоб. Я вам пакажу гэтую па-д'ябальску карысную хітрасць.

Расціньяк тупа слухаў і быў не ў стане нешта адказаць. У гэты момант увайшлі бацька Гар'ё, Б'яншон і яшчэ некалькі пансіянераў.

— Вось такім я і хацеў вас бачыць, — сказаў Ватрэн. — Вы ведаеце, што робіце. Цудоўна, арляня! Вы будзеце кіраваць людзьмі, вы дужы, здаровы, зухаваты; я паважаю вас.

Ён хацеў паціснуць руку, але Расціньяк порстка адхапіў далонь і, збялелы, паваліўся на крэсла; яму здавалася, што перад вачыма разліваецца мора крыві.

— А, некаторыя пялюшкі яшчэ заплямлены дабрадзейнасцю, — ціха заўважыў Ватрэн. — Татуля Далібан валодае трыма мільёнамі, мне вядомы памер ягонага багацця. Такі пасаг дапаможа вам стаць бялейшым за вясельную сукенку нават ва ўласных вачах.

Расціньяк болей не вагаўся. Ён цвёрда вырашыў увечары папярэдзіць спадароў Тайфэраў, бацьку і сына. У гэты момант, паколькі Ватрэн адышоў ад яго, бацька Гар'ё шапнуў студэнту на вуха:

— Вы нешта засумавалі, дзіцятка маё, зараз я вас пацешу, хадзіце са мною!

І стары вермішэльшчык запаліў вітую свечку ад газніцы. Эжэн, усхваляваны і зацікаўлены, пайшоў следам за старым.

— Зойдзем да вас, — сказаў стары, загадзя ўзяўшы ў Сільвіі ключ ад пакоя студэнта. — Сёння раніцай вы ўявілі, што яна вас не кахае, хіба не так? Яна мусіла вас адправіць, а вы ў роспачы раззлаваліся. Дурненькі! Яна чакала мяне, зразумела? Мы меліся паехаць, каб давесці да ладу цуда-кватэрку, куды вы перабярэцеся праз тры дні. Не выдавайце мяне, яна хоча паднесці вам сюрпрыз, але няхай таямніца гэтая адкрыецца трошкі раней. Вы будзеце жыць, як кароль, на вуліцы д'Артуа, у двух крокаў ад вуліцы Сен-Лазар. Мы купілі мэблю, нібы для маладой. За апошні месяц мы шмат чаго зрабілі, толькі вам не казалі. Мой павераны пачаў вайну супраць яе мужа, хутка мая дачка будзе зноў валодаць трыццаццю шасцю тысячамі франкаў у год — працэнтамі ад яе пасагу, я запатрабую, каб яе восемсот тысяч франкаў былі ўнесены ў прыбытковую нерухомасць.

Эжэн моўчкі, склаўшы рукі на грудзях, шпацыраваў з кута ў кут па сваім бедным непрыбраным пакоі. Бацька Гар'ё ўлучыў момант, калі Эжэн павярнуўся да яго спіной, і паклаў на камін чырвоны саф'янавы футляр, на якім быў золатам ціснуты герб Расціньякаў.

— Дзіцятка маё, — казаў стары. — Я ўнік з галавой у вашы справы, але, скажу вам, ува мне шмат эгаізму. Я зацікаўлены ў вашых пярэбарах. Вы не адмовіце мне, калі я вас аб нечым папрашу?

— Што вы хочаце?

— Над вашай новай кватэрай, на шостым паверсе, ёсць пакойчык з уваходам ад вас. Я пасялюся там, добра? Я састарэў і жыву занадта далёка ад маіх дачок. Я вам замінаць не буду, проста буду жыць там. Штовечар вы будзеце расказваць мне пра яе. Вам гэта не перашкодзіць, а я пачую, калі вы будзеце вяртацца, і падумаю: «Толькі што ён бачыў маю Дэльфіначку, вазіў яе на баль, праз яго мая дачка шчаслівая». Калі я захварэю, гукі вашага вяртання, рухаў, крокаў стануць лепшымі лекамі для майго сэрца. У вас у душы так многа застанецца ад маёй дачкі! Мне будзе недалёка да Елісейскіх палёў, дзе штодня праязджаюць Дэльфіна і Анастазі: я заўсёды буду бачыць іх, а то цяпер іншы раз я спазняюся. І потым, магчыма, яна сама будзе прыходзіць да вас. Я буду чуць яе голас, пабачу, як яна ў ранішнім капоце ці бегае туды-сюды, ці рухаецца грацыёзна, нібы кошачка. За апошні месяц яна стала ранейшай: вясёлай, какетлівай дзяўчынай. Душа яе вылечваецца, і гэтым шчасцем яна

абавязана вам. О, я гатовы зрабіць немагчымае дзеля вас. Хвіліну назад, вяртаючыся, яна сказала: «Тата, я вельмі шчаслівая!» Калі яны цырымонна звяртаюцца да мяне: «Бацька!», мне робіцца холадна, калі ж яны клічуць мяне «татам», мне здаецца, што бачу іх маленькімі дзяўчаткамі, успаміны вяртаюцца да мяне. Тады я яшчэ выразней адчуваю сябе бацькам, быццам яны нікому болей не належаць. — Стары выцер вочы, ён плакаў. — Даўно я не чуў гэткіх слоў, даўно не брала яна мяне пад руку. Ох, так, вось ужо дзесяць год, як я ні разу не крочыў побач ні з адной дачкой. А якое шчасце дакранацца да яе сукенкі, падладжвацца пад яе хаду, адчуваць цеплыню яе цела. Адным словам, сёння раніцай я ўсюды суправаджаў Дэльфіну: разам з ёю мы хадзілі па лаўках, пасля я правёў яе дадому. О, дазвольце пажыць мне недалёка ад вас. Калі-небудзь вам спатрэбіцца дапамога, і я буду побач. Ах, каб гэты тлусты эльзаскі цурбан памёр, каб ягоная падагра здагадалася падняцца да яго жывата, якой бы шчаслівай стала мая дачка! Вы б зрабіліся маім зяцем, вы б не ўпотай, а адкрыта сталі б яе мужам. Яна такая няшчасная і яшчэ не зведала асалоды сапраўднага жыцця, што я дарую ёй усе грахі. Бог павінен быць на баку поўных любові бацькоў. — Ён памаўчаў, а затым, ківаючы галавой, дадаў: — Яна моцна кахае вас, аж занадта! Па дарозе яна размаўляла са мной пра вас: «Праўда, тата, ён добры, у яго добрае сэрца? Ці згадвае ён пра мяне?» Ад вуліцы д'Артуа да завулка Панарама чаго толькі яна не нагаварыла мне пра вас! Нарэшце, яна загаварыла са мной шчыра. Гэтай шчаслівай раніцай я болей не быў старым, я адчуваў сябе лёгкім, як пёрка. Я сказаў ёй, што вы аддалі мне тысячу франкаў. О, мілая мая! Яна ўсхвалявалася да слёз. А што гэта ў вас ляжыць на каміне? — нарэшце не вытрымаў бацька Гар'ё, бачачы, што Расціньяк стаіць на месцы.

Разгублены Эжэн глядзеў на суседа тупым позіркам. Дуэль, якая, па словах Ватрэна, павінна была адбыцца заўтра, ніяк не пасавала да яго самых запаветных спадзяванняў. Эжэн перажываў кашмар. Ён павярнуўся да каміна, заўважыў маленькі квадратны футарал, у якім пад паперкай ляжаў гадзіннік Брэгета[1]. На паперцы было напісана:

---

[1] *Брэгет*, Абраам Луі (1747—1823) — вядомы французскі майстар гадзіннікаў і дакладных механізмаў.

«Я хачу, каб вы кожную хвіліну думалі пра мяне, бо...
Дэльфіна».

Апошнімі словамі намякалася, напэўна, на нейкі эпізод у іх адносінах. Эжэна расчуліў падарунак. Выява яго герба была зроблена на золаце футарала эмаллю. Даўно жаданае ўпрыгожванне, ланцужок, ключ, форма, малюнак — усё адпавядала яго густу. Бацька Гар'ё ззяў ад радасці. Напэўна, ён паабяцаў дачцэ дэталёва перадаць уражанне, якое зробіць на Эжэна яе падарунак, тым больш што ён у ролі трэцяй асобы браў удзел у гэтых хваляваннях маладых пачуццяў і быў не менш шчаслівым, чым непасрэдныя іх удзельнікі. Ён палюбіў Расціньяка і за шчасце дачкі, і проста як чалавека.

— Сёння ўвечары схадзіце да яе, яна вас чакае. Тлусты эльзаскі цурбан вячэрае са сваёй танцоўшчыцай. Ён меў выгляд дурня, калі мой павераны азнаёміў яго з нашымі прэтэнзіямі. Хіба ён не сцвярджае, што кахае маю дачку мацней за ўсё на свеце? Ад адной думкі, што Дэльфіна яму... (ён уздыхнуў), я гатовы пайсці на злачынства. Але гэта не будзе забойствам чалавека, бо ён цялячая галава на тушы парсюка. Вы прымеце мяне да сябе жыць, праўда?

— Так, мой добры бацька Гар'ё, вы ж ведаеце, што я вас люблю...

— Я гэта бачу, вы адзін мяне не саромеецеся! Дазвольце вас пацалаваць. — І ён сціснуў студэнта ў абдымках. — Вы зробіце яе шчаслівай, паабяцайце мне! Сёння вечарам вы пойдзеце да яе, праўда?

— О, так. Мне толькі трэба зрабіць адну неадкладную справу.

— Ці магу я вам як-небудзь дапамагчы?

— Так, так! Тым часам, пакуль я буду ў мадам дэ Нусінген, вы наведайце месье Тайфэра-старэйшага і папрасіце прызначыць мне вечарам час, каб я мог пагутарыць з ім па адной вельмі важнай справе.

— Дык няўжо гэта праўда, малады чалавек, — усклікнуў, змяніўшыся ў твары, бацька Гар'ё, — што вы заляцаецеся да яго дачкі, як сцвярджаюць тыя дурні ў сталовай?.. О божа, вы яшчэ не ведаеце, якога кухталя вам можа даць Гар'ё. Калі вы нас падманваеце, то можаце пазнаёміцца з маім кулаком... Ах, гэта немагчыма.

— Я клянуся вам, што кахаю толькі адну жанчыну на свеце, — адказаў Расціньяк. — Проста да сённяшняга дня я гэтага не ўсведамляў.

— Ах, якое шчасце!

— Але справа ў тым, што сын Тайфэра заўтра б'ецца на дуэлі, і я чуў, што нібыта яго заб'юць.

— А вам што да гэтага? — спытаў Гар'ё.

— Трэба паведаміць бацьку, каб ён перашкодзіў сыну...

На гэтым слове яго перабіў голас Ватрэна, які спяваў за дзвярыма:

О, Рычард, мой кароль,
Цябе ўсе пакідаюць...
Брум! Брум! Брум! Брум! Брум!
У вандроўках аб'ехаў я ўвесь свет,
Ні для каго не стала тайнай... Тра-ля-ля-ля...

— Спадарства, суп чакае вас, усе ўжо за сталом, — крыкнуў Крыстоф.

— Паслухай, — сказаў Ватрэн. — Схадзі і вазьмі ў мяне бутэльку бардо.

— Гадзіннік падабаецца вам? — спытаў бацька Гар'ё. — Што і казаць, у яе добры густ.

Ватрэн, бацька Гар'ё і Расціньяк спусціліся разам і, з прычыны спазнення, за сталом апынуліся побач.

За вячэраю Эжэн дэманстраваў у адносінах да Ватрэна выключную халоднасць, хаця ніколі гэты мілы з пункту гледжання мадам Ваке чалавек не вылучаўся так дасціпнасцю, як сёння. Ён іскрыўся сам смехам і сумеў развесяліць усіх пансіянераў. Такая ўпэўненасць у сабе, такая вытрымка палохалі Эжэна.

— Якая муха вас сёння ўкусіла? Ото ж развесяліліся! — заўважыла мадам Ваке.

— Я заўсёды весялюся, калі раблю добрыя справы.

— Добрыя справы? — перапытаў Эжэн.

— Так, я паставіў партыю тавару і атрымаю за гэта добрыя камісійныя. Мадэмуазель Мішано, — сказаў Ватрэн, заўважыўшы, што яна разглядвае яго, — ці нешта ў маім твары вам не падабаецца, што вы так прыдзірліва пазіраеце на мяне? Дык скажыце! Каб зрабіць вам прыемнае, я памяняю... Мы не пасварымся з-за гэтага з вамі, Пуарэ? — падморгнуў ён старому служачаму.

— Халера, вам можна было б пазіраваць для Геркулеса-жартаўніка! — усклікнуў малады мастак.

— Згодзен, калі мадэмуазель Мішано будзе пазіраваць для Венеры з могілак Пэр-Лашэз, — адказаў Ватрэн.

— А Пуарэ? — запытаў Б'яншон.

— О, Пуарэ няхай пазіруе як Пуарэ. З яго атрымаецца бог садоў і агародаў! У яго нават імя па вымаўленні Сільвіі паходзіць ад парэю.

— Ад гнілой цыбуліны! — падхапіў Б'яншон. — Вось які гэта фрукт!

— Глупства ўсё гэта, — перапыніла яго мадам Ваке, — лепей бы вы пачаставалі нас вашым бардо з той пляшкі, што паказвае сваё рыльца. Гэта падтрымала б наш вясёлы настрой, да таго ж гэта карысна для жывата.

— Спадарства, — звярнуўся да ўсіх Ватрэн, — спадарыня старшыня заклікае нас да парадку. Мадам Куцюр і мадэмуазель Віктарына не пакрыўдзяцца за вашы вольныя размовы, але пашкадуйце цнатлівасць бацькі Гар'ё. Прапаную вам выпіць бутэлькарамачку бардо, удвая слыннейшую імем Лафіта[1], прашу не прымаць за палітычны намёк. Ну ж, дзівак! — крыкнуў ён, зірнуўшы на нерухомага Крыстофа. — Сюды, Крыстоф. Як гэта ты не адгукаешся на сваё імя? Давай, дзівак, выпіўку!

— Калі ласка, — адказаў Крыстоф і падаў бутэльку.

Напоўніўшы шклянкі Эжэна і бацькі Гар'ё, Ватрэн паволі наліў сабе некалькі кропель, пакаштаваў, пакуль суседзі пілі, і раптам скрывіўся:

— Чорт! Д'ябал! Пробкаю патыхае! Забірай гэтае віно сабе, Крыстоф, а нам прынясі другое. Направа, там, ты ж ведаеш? Нас шаснаццаць чалавек, нясі восем бутэлек.

— Калі вы такія шчодрыя, — сказаў мастак, — я плачу за сотню каштанаў.

— Ого!

— Бууу!

— Прррр!

Кожны ўсклікнуў па-свойму, крыкі ляцелі, як ракеты з жырандолі.

— Ну ж, матухна Ваке, пастаўце дзве бутэлькі шампанскага, — крыкнуў Ватрэн.

— Яшчэ чаго! Можа, цэлы дом? Дзве бутэлькі шампанскага! Гэта дванаццаць франкаў! Дзе я столькі зараблю? Не! Але, калі месье Эжэн заплаціць за шампанскае, я выстаўлю парэчкавы лікёр!

— Ад яе парэчкавага гоніць у прыбіральню, як ад крушыны, — ціха заўважыў Б'яншон.

---

[1] *...бардо...Лафіта* — гульня слоў, бальзакаўскі прыём. Лафіт — гатунак чырвонага віна, Лафіт Жак (1767—1844) — банкір і палітычны дзеяч, спрыяў поспеху Ліпеньскай рэвалюцыі.

— Маўчы, Б'яншон, — усклікнуў Расціньяк, — як толькі я чую слова «крушына», мяне хапае жывот... Добра, нясіце шампанскае, я заплачу! — дадаў студэнт.

— Сільвія, — звярнулася мадам Ваке, — падайце бісквіты і вафлі.

— Вашыя вафлі сталі як кафлі: ад старасці яны зусім зацвярдзелі. А бісквіты давайце на стол.

Бардо ўмомант разышлося па руках, усе ажывіліся, яшчэ болей павесялелі. Стаяў дзікі рогат, крыкі, некалькі чалавек спрабавалі пераймаць галасы розных жывёл. Служачы музея задумаў закрычаць па-парыжску, г. зн. перадаць мяўканне закаханага ката, і як бачыш восем галасоў пачалі выкрыкваць наступныя фразы:

— Тачыць нажы! Ножны!

— Птушкам дамашнім канарэечнае семя!

— Салодкія трубачкі, спадарыні, салодкія трубачкі!

— Папраўляю фаянс!

— Вустрыцы, каму свежыя вустрыцы!

— Б'е жанок і вопратку, выбівачка!..

— Купляю фракі, галуны, старыя шапкі і штаны!

— Вішня садовая, садовая вішня!

Пераможцам выйшаў Б'яншон, калі гамзатым голасам крыкнуў:

— Гандлюю парасонамі!

Некалькі хвілін стаяў такі гам, што галава трашчала, разносілася нейкая лухта несусветная, сапраўдная опера пад дырыжорскім кіраўніцтвам Ватрэна, які ўважліва сачыў за Эжэнам і бацькам Гар'ё: яны, відаць, паспелі ап'янець. Абодва пілі няшмат, сядзелі з сур'ёзным выглядам, абапіраючыся на спінкі крэслаў, і назіралі за нязвыклым бязладдзем; абодвух турбавалі справы, якія заставаліся на вечар, і ўсё ж ні Гар'ё, ні студэнт не мелі сілы ўзняцца. Ватрэн скоса паглядаў на іх, адзначаючы, як мяняюцца іх твары, і ў той момант, калі іх векі пацяжэлі і, здавалася, гатовы былі заплюшчыцца зусім, ён нахіліўся і сказаў Расціньяку на вуха:

— Вось так, хлопча, мы яшчэ недастаткова хітрыя, каб змагацца з дзядзечкам Ватрэнам, а ён вас занадта моцна любіць, каб дазволіць вам зрабіць глупства. Калі я нешта вырашу, у аднаго Бога хопіць сілы, каб збіць мяне з дарогі. Так, так! Мы збіраліся папярэдзіць Тайфэра-бацьку і зрабіць памылку, вартую школьніка! Печ напалілі, цеста замясілі, хлеб паклалі на лапату; заўтра

нас ад бохана за вушы не адцягнеш, дык нашто замінаць таму, каб хлеб пасадзілі ў печ?.. Не, не, ён спячэцца! А нашы маленькія згрызоты сумлення перамелюцца пры страваванні. Цяпер мы крышачку паспім, пакуль палкоўнік граф Франкесіні вастрыём сваёй шпагі вызваліць для нас спадчыну Мішэля Тайфэра. Віктарына, наследніца брата, будзе мець пятнаццаць тысяч франкаў у год. Я ўжо сёе-тое разведаў і магу сказаць, што спадчына маці складае болей трохсот тысяч...

Эжэн чуў гэтыя словы, але адказаць не мог: язык нібы прыліп да нёба, яго адольвала дрымота, стол і твары сужыхароў ён бачыў як праз бліскучы туман. Хутка шум суняўся, пансіянеры адзін за другім разышліся. Пасля, калі не засталося нікога, апрача мадам Ваке, мадам Куцюр, мадэмуазель Віктарыны, Ватрэна і бацькі Гар'ё, Расціньяк праз сон заўважыў, як мадам Ваке злівае астаткі віна з бутэлек у адну.

— Ах, зялёныя-шалёныя, юнакі, юнакі, — казала ўдава.

Гэта была апошняя фраза, якую Эжэн зразумеў.

— На такія штукі адзін месье Ватрэн здольны, — сказала Сільвія. — Чуеце, як Крыстоф храпіць нібы пшаніцу прадаўшы.

— Бывай, матухна, — сказаў Ватрэн. — Еду на бульвар палюбавацца на месье Марці[1] ў «Дзікай гары»[2], вялікай п'есе, перароблена з «Самотнага»... Хочаце, я вас і нашых дам зваджу туды?

— Дзякую вам, але мы не пойдзем, — адмовілася мадам Куцюр.

— Як, суседка?! — усклікнула мадам Ваке. — Вы не хочаце паглядзець п'есу, напісаную накшталт «Атала»[3] Шатабрыяна? А памятаеце, як мы мінулым летам любілі яго чытаць у засені ліп і плакалі, быццам Магдалена Эладыйская, — так гэта было цікава! Нарэшце, гэты высокамаральны твор можа аказацца карысным і для паненкі.

— Нам не да тэатраў, — адказала Віктарына.

— Ну вось і паснулі, зухі, — сказаў Ватрэн, камічна паварочваючы галовы Эжэна і бацькі Гар'ё.

---

[1] Акцёр тэатра «Гётэ».

[2] *«Дзікая гара, ці Герцаг Бургундскі»* — п'еса французскага драматурга Гільбера дэ Піксеракура (1773—1844).

[3] Аповесць французскага рамантыка Шатабрыяна (1768—1848).

Прыхінуўшы галаву студэнта да спінкі крэсла, каб яму было зручней спаць, ён пацалаваў яго ў лоб і праспяваў:

— Можаш спаць, харошы мой,
Я буду пільнаваць твой спакой.

— Баюся, што ён захварэў, — сказала Віктарына.

— Тады заставайцеся яго прыгледзець, — адказаў ёй Ватрэн. — Гэта ваш абавязак як вернай жонкі, — шапнуў Ватрэн ёй на вуха. — Гэты малады чалавек любіць вас, і вы станеце яго жонкай, прадказваю вам. Адным словам, — гучна сказаў ён, — «яны заслужылі ўсеагульную павагу, жылі шчасліва і займелі шмат дзяцей». Так канчаюцца ўсе сентыментальныя раманы. Пойдзем, матухна, — дадаў ён, павярнуўшыся да мадам Ваке і абдымаючы яе, — надзявай каптурык, прыгожую сукенку ў кветачкі і шалік графіні. Пайду за фіякрам для вас. — І ён выйшаў, прыпяваючы:

О сонца, сонца, боскае сонца,
Выспявае гарбуз праз цябе...

— Божачка! Ведаеце, мадам Куцюр, з такім чалавекам я б жыла шчасліва нават у галубятні! — сказала яна, а пасля, павярнуўшыся да вермішэльшчыка, дадала: — Вось і бацька Гар'ё заснуў. Гэты стары скупердзяй ні разу не падумаў куды-небудзь мяне звадзіць. Божачкі, ён жа на падлогу зараз зваліцца! Непрыстойна чалавеку ва ўзросце так напівацца! Вы можаце сказаць, што таго, чаго няма, не страціш... Сільвія, завядзіце яго наверх, у пакой...

Сільвія падхапіла старога пад пахі, завяла яго і кінула, як куль, апранутага, папярок ложка.

— Бедны хлопец, — сказала мадам Куцюр, папраўляючы Эжэну валасы, якія апалі на лоб, — ён нібы дзяўчына, не ведае, што такое лішак.

— Ах, я трыццаць адзін год трымаю пансіён, праз мае рукі, можна сказаць, прайшло шмат маладых людзей, але такога мілага, такога далікатнага, як месье Эжэн, я не бачыла. Да чаго ён прыгожы, калі спіць. Мадам Куцюр, пакладзіце яго галаву сабе на плячо. Э, яна хіліцца на плячо мадэмуазель Віктарыны. Нездарма кажуць, што дзецям Бог памагае. Яшчэ момант, і ён разбіў бы сабе галаву аб булавешку крэсла. Удваіх яны — цудоўная пара.

— Маўчыце, суседачка, вы прамаўляеце ўслых рэчы...

На вокліч мадам Куцюр мадам Ваке адказала:

— Ды ён не чуе. Хадзем, Сільвія, апранацца. Сёння я надзену свой гарсэт.

— Высокі гарсэт пасля вячэры, спадарыня? — здзівілася Сільвія. — Не, няхай хто іншы вас сціскае, я не стану вашым забойцам. Такое непрадуманае рашэнне можа каштаваць вам жыцця.

— Няхай так, але я павінна ўважыць месье Ватрэна.

— Выходзіць, вы вельмі любіце сваіх наследнікаў?

— Хадзем, Сільвія, будзе рот халадзіць.

— У яе ўзросце! — сказала Сільвія, паказваючы Віктарыне на сваю гаспадыню.

У сталовай засталіся толькі мадам Куцюр і яе гадаванка, на плячы якой спаў Эжэн. Сон маладога чалавека здаваўся ціхмяным і чароўным на фоне храпу Крыстофа, што раздаваўся ў цішыні дома. Эжэн у сне быў, як дзіця. Віктарына была шчаслівая ад магчымасці дазволіць сабе хоць крыху міласэрнасці, у якой праяўляюцца ўсе лепшыя пачуцці жанчыны, і ад адчування, што на яе грудзях б'ецца сэрца маладога чалавека; на яе твары было напісана нешта па-мацярынску клапатлівае і таму — ганарыстае. Праз сотні думак, якія перапаўнялі яе сэрца, прабівалася неўтаймаваная прага асалоды, абуджаная блізкасцю маладой і чыстай цеплыні.

— Бедная мая дзяўчыначка! — сказала мадам Куцюр, паціскаючы ёй руку.

Пажылая дама любавалася поўным чысціні і пакут тварам, асветленым у гэты час шчасцем. Віктарына была падобна на старадаўнюю ікону, дзе мастак, не ўдаючыся ў дэталі, усё майстэрства спакойнага і велічнага пэндзля збярог для твару, тонам нібы і жаўтаватага, але які ззяе ад адбіткаў залацістых адценняў неба.

— А ён жа выпіў не болей дзвюх шклянак, мама, — сказала Віктарына, перабіраючы валасы Эжэна пальцамі.

— Калі б ён быў гулякам, ён перанёс бы гэтае віно гэтаксама лёгка, як і іншыя. Ахмяленне сведчыць на яго карысць.

На вуліцы загрукатаў экіпаж.

— Мама, вось і месье Ватрэн прыехаў. Прытрымайце Эжэна: я не хачу, каб гэты чалавек бачыў мяне разам з месье Расціньякам. Месье Ватрэн можа так сказаць, што робіцца брыдка на душы, ды і ад позіркаў яго жанчына адчувае сябе няёмка, быццам ён вачыма яе распранае.

— Не, ты памыляешся, — сказала мадам Куцюр. — Месье Ватрэн — мілейшы чалавек, таго ж тыпу, што і нябожчык месье Куцюр, — рэзкаваты, але добры, вясёлы няўклюд.

У гэты момант Ватрэн ціхенька ўвайшоў і ўбачыў карціну: святло газніцы нібы ласкае два дзіцяці.

— Вось вам сцэна, — сказаў ён, складаючы рукі, — якая б натхніла слыннага Бернардэна дэ Сэн-П'ера, аўтара «Поля і Віржыні», на стварэнне прачулых старонак. Да чаго прыгожая маладосць, мадам Куцюр! Спі, беднае дзіця, — сказаў ён, любуючыся Эжэнам, — падчас дабро знаходзіць чалавека, калі ён спіць. Мадам, — павярнуўся ён да ўдавы, — да гэтага маладога чалавека мяне прыцягвае, мяне ўзрушае гармонія між прыгажосцю ягонай душы і прыгажосцю твару. Гляньце, хіба перад намі не херувім на плячы анёла? Гэты чалавек годны кахання. Быў бы я жанчынай, я хацеў бы памерці (не, гэта глупства!), жыць дзеля яго. Вось так, любуючыся імі, мадам, — сказаў ён шэптам, нахіліўшыся да вуха ўдавы, — я не магу адагнаць ад сябе думку, што Бог стварыў іх адно дзеля другога. Воля гасподня нам невядома, яна выпрабоўвае душу і пажаду, — гучна ўсклікнуў ён. — Калі бачу вас разам, дзеткі, з'яднаных адною чысцінёй і ўсімі чалавечымі пачуццямі, я кажу сабе, што немагчыма, каб вы некалі разлучыліся. Бог справядлівы. Але мне здаецца, — сказаў ён дзяўчыне, — што ў вас ёсць лініі багацця. Дайце мне руку, мадэмуазель Віктарына, я ведаю трошкі хірамантыю, мне часта даводзілася варажыць. Не бойцеся. Вох, што я бачу! Слова гонару, хутка вы станеце адной з самых багатых наследніц Парыжа. Вы адорыце шчасцем таго, хто вас кахае... Ваш бацька пакліча вас да сябе. Вы пабярэцеся шлюбам з маладым, прыгожым, тытулаваным хлопцам, які без вас жыцця не ўяўляе.

У гэты момант праройцтвы Ватрэна перабілі цяжкія крокі какетлівай удавы.

— А вось і мадам Вакерр, прррыгожая як зорррка, сціснутая ў чарку. Няўжо мы не задыхаемся? — спытаў ён, кладучы руку на планшэтку гарсэта. — Пад лыжачкай, матухна, занадта сціснута, не дай бог, мы заплачам, адбудзецца выбух; у такім выпадку я буду збіраць абломкі з руплівасцю антыквара.

— Гэты ведае мову французскай галантнасці! — сказала ўдава, нахіліўшыся да вуха мадам Куцюр.

— Бывайце, дзеці, — звярнуўся Ватрэн да Эжэна і Віктарыны, — бласлаўляю вас, — ён усклаў далоні на іх галовы. — Паверце мне, мадэмуазель, добрыя пажаданні сумленнага чалавека нешта павінны значыць, яны прыносяць шчасце, да іх прыслухоўваецца бог.

— Бывай, дарагая прыяцелька, — развіталася з пансіянеркаю мадам Ваке. — Як вы лічыце, — шэптам спытала яна, — у Ватрэна сур'ёзныя намеры ў адносінах да мяне?

Мадам Куцюр толькі развяла рукамі.

— Ах, дарагая маці, — паглядзела на свае рукі і ўздыхнула Віктарына, калі яны засталіся адны. — Вось каб месье Ватрэн казаў праўду!

— Для гэтага патрэбна адзінае, — адказала пажылая дама, — каб ваш пачварны брат звалiўся з каня...

— Ах, мама!

— Божа, мусіць, грэшна зычыць зла свайму ворагу, што рабіць, пакаюся ў гэтым. Але, праўду кажучы, я з задавальненнем занесла б кветкі на яго магілу. Бессардэчны чалавек! Яму бракуе смеласці замовіць слова за сваю маці, спадчыну якой ён прыбраў сабе з дапамогаю розных каверзаў, абяздоліўшы цябе. Мая кузіна валодала немалым багаццем. На тваю бяду, ніхто не заікнуўся пра тое, каб абумовіць яго ў шлюбным кантракце.

— Цяжкім будзе здавацца мне шчасце, калі яно дастанецца цаной чыйго-небудзь жыцця, — сказала Віктарына. — І я лепей застануся тут, чым згаджуся на смерць брата.

— Божа, як кажа добры месье Ватрэн, які верыць у бога, як ты магла сама пераканацца, — працягвала мадам Куцюр, — і мне было прыемна даведацца, што ён не бязбожнік, як іншыя, якія гавораць пра бога з меншай пашанай, чым пра д'ябла, хто ведае, якімі шляхамі вырашыць весці нас боская сіла?

З дапамогаю Сільвіі дзве жанчыны нарэшце перанеслі Эжэна ў яго пакой і паклалі на ложак; кухарка расшпіліла на юнаку адзенне, каб яму лягчэй дыхалася. Перад тым як выйсці, калі яе апякунка павярнулася спіною, Віктарына пацалавала Эжэна ў лоб, адчуўшы невымоўную асалоду ад гэтага злачыннага пацалунку. Яна абвяла позіркам яго пакой, адной думкай, так сказаць, падвяла вынік усім радасцям гэтага дня, і перад яе вачыма паўстала карціна, якой яна доўга любавалася. А пасля заснула самым шчаслівым чалавекам у Парыжы.

Наладжанае Ватрэнам свята, падчас якога ён падліў Эжэну ды бацьку Гар'ё ў віно снатворнага, прынесла згубу і самому Ватрэну. Напаўп'яны Б'яншон забыўся распытаць у мадэмуазель Мішано пра Падмані Смерць. Прагучы гэтая мянушка за сталом, і Ватрэн, ці лепш назваць яго сапраўдным імем, Жак Кален, адзін са славутых катаржнікаў, адразу б насцярожыўся. У дадатак, калі Ватрэн абазваў мадэмуазель Мішано Венерай з могілак Пэр-Лашэз, гэта зацвердзіла яе рашучасць выдаць катаржніка паліцыі, хаця спачатку яна, верачы ў Каленаву велікадушнасць, думала папярэдзіць яго, каб ён уначы ўцёк. Яна неадкладна ў суправаджэнні Пуарэ пайшла да славутага шэфа тайнай паліцыі ў завулак Сент-Ан, спадзеючыся, што ёй зноў давядзецца мець справу з чыноўнікам па імені Гандзюро. Але яе прыняў сам начальнік крымінальнай паліцыі. Пасля таго як усё было ўдакладнена, мадэмуазель Мішано папрасіла напой, з дапамогаю якога яна мелася праверыць наяўнасць кляйма. Па задаволеным твары вялікага чалавека з маленькага завулачка Сент-Ан у той момант, калі ён шукаў пляшачку з напоем у шуфлядзе свайго пісьмовага стала, мадэмуазель Мішано здагадалася, што ў рукі паліцыі трапіць не проста катаржнік. Раскінуўшы розумам, яна прыйшла да высновы, што паліцыя спадзяецца захапіць немалыя грошы, пра якія ўлады даведаліся з прызнанняў, зробленых катаржнікамі-здраднікамі. Калі яна падзялілася сваімі меркаваннямі з хітрым начальнікам, той заўсміхаўся і паспрабаваў развеяць апасенні старой дзеўкі.

— Вы памыляецеся. Кален — самы небяспечны кацялок, які калі-небудзь з'яўляўся ў злачынным свеце, вось і ўсё. Усе нягоднікі добра яго ведаюць: ён іх штандар, іх падтрымка, карацей, іх Банапарт. Яны ўсе любяць яго. Гэты спрытнюга ніколі не пакіне сваёй цуркі на Грэўскай плошчы[1]. — Паколькі мадэмуазель Мішано не разумела, Гандзюро растлумачыў словы з жаргону злодзеяў, якія ён ужыў: — «Кацялок» і «цурка» — гэта моцныя выразы ў мове злодзеяў; яны першыя адчулі неабходнасць разглядаць чалавечую галаву пад двума аспектамі. «Кацялок» — галава чалавека жывога, яго дарадца, яго думка. «Цурка» — пагардлівая адзнака чалавека нікчэм-

[1] Плошча ў Парыжы, на якой праходзілі публічныя пакаранні.

нага, у якую ператвараецца тая ж галава, калі яе адсякуць.

— Кален разыгрывае нас, — працягваў начальнік паліцыі. — Калі мы сустракаем чалавека, падобнага на сталёвы брус англійскай загартоўкі, мы маем магчымасць забіць яго, калі падчас арышту ён надумаецца аказаць нам супраціўленне. Вось мы і разлічваем, што Кален заўтра раніцай нам не скарыцца, і гэта дасць нам падставу забіць яго. Такім чынам можна будзе пазбегнуць працэсу, выдаткаў на ахову, харчаванне, і грамадству вальней стане дыхаць. Судовая працэдура, сведкі, аплата іх выдаткаў, смяротнае пакаранне — усе юрыдычныя фармальнасці, патрэбныя на тое, каб вызваліцца ад любога з гэтых мярзотнікаў, будуць нам каштаваць куды болей за вашу тысячу экю, якую вы атрымаеце ад нас, ды і час ашчадзім. Добры ўдар штыка ў жывот Падмані Смерці папярэдзіць сотню злачынстваў і адвядзе ад спакусы збіцца з правільнага шляху паўсотні нягоднікаў, якія будуць трымаць сябе асцярожна ў суседстве з папраўчай паліцыяй. Вось гэта і называецца добра арганізаваная паліцыя. Сапраўдныя філантропы лічаць, што дзейнічаць такім чынам — значыць папярэдзіць злачынства.

— І служыць на карысць сваёй краіне, — заўважыў Пуарэ.

— Сёння вы разважаеце вельмі слушна, — адказаў начальнік паліцыі. — Безумоўна, мы служым на карысць сваёй краіны, але людзі несправядліва адносяцца да нас. Мы робім грамадству вялікія паслугі, аб якіх яно не ведае. Таму я лічу, што разумны чалавек павінен узняцца над забабонамі, а хрысціянін пагадзіцца з тымі няшчаснымі вынікамі, магчымымі і ў добрай справе, калі яна робіцца не ў агульна прынятым парадку. Парыж ёсць Парыж, скажу я вам! Гэтым тлумачыцца і маё жыццё. Маю гонар развітацца з вамі, мадэмуазель. Я са сваімі людзьмі буду чакаць заўтра ў Каралеўскім садзе. Пашліце Крыстофа на вуліцу Бюффон да месье Гандзюро ў той дом, дзе вы мяне бачылі. Месье, я да вашых паслуг. Калі вас калі-небудзь абкрадуць, звяртайцеся да мяне па дапамогу, і вам вернуць тое, што ўкралі.

— Знаходзяцца ж дурні, якіх верне ад аднаго слова «паліцыя». Гэты начальнік вельмі прыемны чалавек, і тое, што ён ад вас патрабуе, прасцей за ўсё, — казаў Пуарэ мадэмуазель Мішано.

Наступнаму дню было наканавана стаць адным з самых незвычайных дзён у гісторыі дома Ваке. Да тых часоў самой значнай падзеяй у ціхім існаванні пансіёна лічылася метэарычнае з'яўленне самазванай графіні дэ ль'Амберменіль. Але той выпадак блякне перад здарэннямі вялікага дня, пра які мадам Ваке будзе згадваць у гутарках увесь час. Спачатку Гар'ё і Эжэн праспалі да адзінаццаці гадзін раніцы. Сама мадам Ваке, толькі апоўначы вярнуўшыся з тэатра «Гетэ», таксама да паловы адзінаццатай праляжала ў ложку. Доўгі сон Крыстофа, які дапіў бутэльку віна, што даў яму Ватрэн, выклікаў спазненні ў пансіённым распарадку. Пуарэ і мадэмуазель Мішано не выказалі незадавальнення затрымкай сняданя. Віктарына і мадам Куцюр, у сваю чаргу, таксама дазволілі сабе паспаць да позняй раніцы. Ватрэн пайшоў з дому раней восьмай гадзіны і вярнуўся, калі на стале ўжо стаяў сняданак. Такім чынам, ніхто не абураўся, што толькі ў пятнаццаць хвілін на дванаццатую Сільвія і Крыстоф пайшлі стукаць у дзверы, паведамляючы, што снеданне чакае. Пакуль Сільвіі і слугі не было ў сталовай, мадэмуазель Мішано спусцілася туды першая, падліла зелля ў срэбны кубак Ватрэна, у якім падагравалiся ў гарачай вадзе вяршкі для кавы разам з вяршкамі для астатніх жыхароў. Старая дзеўка выкарыстала гэтую асаблівасць у пансіённым ладзе, каб здзейсніць свае намеры. Сем пансіянераў сабраліся за сталом не адразу. У той момант, калі Эжэн, пацягваючыся, спускаўся апошнім, пасыльны перадаў яму ліст ад мадам дэ Нусінген. Там было напісана:

«Не адчуваю ні беспадстаўнай крыўды, ні нічым не апраўданай самалюбнасці, мой сябра. Я чакала вас да двух гадзін раніцы. Чакаць любімага чалавека? Той, хто зведаў гэтую муку, нікому яе не пажадае. Бачу, што вы любіце ўпершыню. Што здарылася? Я хвалююся. Калі б не боязь раскрыць сакрэты свайго сэрца, я б выправілася да вас, каб даведацца, што за бяда ці радасць вас затрымалі. Але пакінуць дом пешкі ці ў карэце ў такі час, гэта ўсё роўна што загубіць сябе. Я зразумела, якое няшчасце нарадзіцца жанчынай. Супакойце мяне, растлумачце, чаму вы не прыйшлі пасля таго, што расказаў вам мой бацька. Я пазлуюся, але дарую вам. Можа, вы захварэлі? Чаму вы жывяце так далёка? На прамілы бог, хоць адно слова. Да хуткай сустрэчы, праўда? Калі вы занятыя, мне хопіць аднаго слова. Напішыце: «Еду» ці «Захварэў».

Але, калі б вам нездаровілася, бацька прыехаў бы сказаць мне. Дык што ж здарылася?..»

— Так, што ж здарылася? — усклікнуў Эжэн і, не дачытаўшы ліст да канца, кінуўся ў сталовую. — Якая зараз гадзіна?

— Палова дванаццатай, — азваўся Ватрэн, салодзячы каву.

Беглы катаржнік зірнуў на Эжэна халодным заварожваючым позіркам; такі позірк бывае толькі ў людзей моцнай магнетычнай сілы, кажуць, што такі позірк здольны суцішыць нават шаленства хворага ў вар'яцкім доме. Эжэн аж скалануўся. На вуліцы загрукаталі колы фіякра, і ў пакой увайшоў напалоханы лёкай месье Тайфэра. Мадам Куцюр адразу яго пазнала.

— Мадэмуазель, — усклікнуў ён, — вас кліча бацька... здарылася вялікае гора. Месье Фрэдэрык біўся на дуэлі, атрымаў удар шпагі ў лоб, і дактары не спадзяюцца выратаваць яго; наўрад ці вы паспееце развітацца з ім, ён ляжыць непрытомны.

— Няшчасны хлопец! — усклікнуў Ватрэн. — Як можна сварыцца з людзьмі, калі маеш у кішэні добрых трыццаць тысяч гадавой рэнты. Не, сапраўды ў маладых вецер у галаве.

— Месье! — абарваў яго Эжэн.

— Ну што такое, дарослае дзіця? — азваўся Ватрэн, спакойна дапіваючы каву. — Дуэлі ў Парыжы адбываюцца кожны дзень.

Мадэмуазель Мішано назірала за ім настолькі ўважліва, што нават не пачула весткі, якая ўразіла ўсіх.

— Я паеду з вамі, Віктарына, — вырашыла мадам Куцюр.

Перш чым пайсці, Віктарына зірнула на Эжэна вачыма, поўнымі слёз, нібы кажучы: «Я не думала, што наша шчасце я буду аплакваць слязамі!»

— Выходзіць, вы прарок, месье Ватрэн? — спытала мадам Ваке.

— Я ўсё на свеце, — адказаў Жак Кален.

— Вось што дзіўна! — зноў пачала мадам Ваке, працягваючы размову наконт здарэння. — Смерць не пытае дазволу, маладыя часта ідуць на той свет раней за старых. На шчасце, нам, жанчынам, не прыходзіцца біцца на дуэлях, але нам наканаваны іншыя пакуты: мы нараджаем дзяцей, і мукі маці могуць зацягнуцца надоўга! А вось Віктарыне пашанцавала! Бацька мусіць прыняць яе.

— Вось як, — сказаў Ватрэн, гледзячы на Эжэна, — учора яна не мела ні шэлега, а сёння яна валодае не адным мільёнам.

— А вы ведалі, куды руку пакласці, месье, — звярнулася да Эжэна мадам Ваке.

Пры гэтых словах бацька Гар'ё зірнуў на студэнта і заўважыў у яго руцэ скамечаны ліст.

— Вы недачыталі яго, што гэта значыць? Няўжо вы такі самы, як і ўсе?

— Спадарыня Ваке, я ніколі не ажанюся з мадэмуазель Віктарынай, — сказаў Эжэн з такім пачуццём жаху ды агіды, што прысутныя здзівіліся.

Бацька Гар'ё схапіў руку студэнта і сціснуў. Яму хацелася нават пацалаваць яе.

— Ах, ах, — усклікнуў Ватрэн. — У італьянцаў ёсць добры выраз: col tempo[1]!

— Я чакаю адказу, — напомніў Расціньяку пасыльны ад мадам дэ Нусінген.

— Скажыце, што я прыйду.

Пасыльны знік. Эжэн так расхваляваўся, што нават забыўся на ўсялякую асцярожнасць.

— Што рабіць? — пытаў ён сам сябе ўголас. — Доказаў ніякіх!

Ватрэн заўсміхаўся. У гэты момант ён ужо адчуў уздзеянне выпітага напою. Але катаржнік аказаўся досыць моцным, каб узняцца, паглядзець на Расціньяка і глухім голасам сказаць:

— Малады чалавек, дабро знаходзіць нас, пакуль мы спім.

І ён кульнуўся як сноп, нібы памёр.

— Значыць, ёсць на свеце суд божы! — усклікнуў Эжэн.

— Што здарылася з нашым небаракам, месье Ватрэнам?

— Удар! — закрычала мадэмуазель Мішано.

— Сільвія, дачушка, паклічце доктара, — загадала ўдава. — А вы, месье Расціньяк, хуценька збегайце да Б'яншона, Сільвія можа размінуцца з нашым доктарам, месье Грэнпрэлем.

Шчаслівы тым, што знайшлася падстава пакінуць гэты жахлівы прытон, Расціньяк выбег на двор.

---

[1] *Col tempo* — з цягам часу *(ім.)*.

— Крыстоф, схадзі да аптэкара, прынясі што-небудзь ад удару!

Крыстоф выйшаў.

— Бацька Гар'ё, дапамажыце нам перанесці месье Ватрэна наверх.

Ватрэна падхапілі, сяк-так пранеслі па ўсходах і паклалі на ложак.

— З мяне карысці мала, пайду да дачкі, — сказаў месье Гар'ё.

— Стары эгаіст! Каб ты здох, як сабака! — усклікнула мадам Ваке.

— Мадам Ваке, гляньце, ці няма ў вас эфіру, — сказала мадэмуазель Мішано, якая з дапамогай Пуарэ расшпіліла гузікі на вопратцы Ватрэна.

Мадам Ваке спусцілася ўніз і пакінула мадэмуазель Мішано дзейнічаць на поле бітвы.

— Ну, хуценька сцягніце з яго кашулю і павярніце спіной! Няхай з вас хоць якая карысць будзе, збаўце мяне ад сузірання некаторых частак цела, — сказала яна Пуарэ. — Што вы стаіце як слуп?

Калі Ватрэна перавярнулі, Мішано моцна ляпнула па плячы хворага, і дзве фатальныя белыя літары з'явіліся на пачырванелым месцы.

— Ну і лёгка ж вы зарабілі тры тысячы франкаў узнагароды, — усклікнуў Пуарэ, падтрымліваючы Ватрэна, пакуль мадэмуазель Мішано надзявала на яго кашулю. — Ух, які цяжкі, — уздыхнуў ён, кладучы Ватрэна ў ложак.

— Маўчы! Можа, тут знаходзіцца каса? — замітусілася старая дзеўка, гатовая, здавалася, прасвідраваць сцены вачыма, так прагна разглядвала яна ўсе рэчы ў пакоі. — Ці нельга неяк адамкнуць гэты сэкрэтнік?

— Гэта, мусіць, будзе непрыгожа, — адказаў Пуарэ.

— Не, — заўважыла яна. — Грошы крадзеныя, належалі ўсім, цяпер яны — нічые. Але нам не паспець, ужо ідзе Ваке.

— Нясу эфір, — абвясціла мадам Ваке. — Сёння нейкі дзень прыгод, што і казаць. Божачкі, не можа быць, што гэты чалавек хворы, ён жа бялюткі, як куранятка.

— Як куранятка? — перапытаў Пуарэ.

— Сэрца б'ецца роўна, — прыкладаючы руку да грудзей, працягвала ўдава.

— Роўна? — здзівіўся Пуарэ.

— Ён зусім здаровы.

— Вы так лічыце? — спытаў Пуарэ.

— Праўда, ён нібы заснуў. Сільвія пайшла па доктара. Паглядзіце, мадэмуазель Мішано, ён хрыпіць ад эфіру. Далібог, ён проста самлеў. Пульс нармальны. Ды ён здаровы як бык. Бачыце, мадэмуазель, якія валасатыя ў яго грудзі: такі чалавек сто гадоў пражыве! А парык добра трымаецца. Ды ён у яго прыклеены. Ён носіць накладныя валасы, бо сам руды. Кажуць, што рудыя людзі ці вельмі добрыя, ці вельмі дрэнныя. Гэты хутчэй добры, праўда?

— Добры, калі павесіць, — адазваўся Пуарэ.

— Хочаце сказаць, павесіць на шыю прыгожай кабеты, — шпарка паправіла яго мадэмуазель Мішано. — Можаце ісці, месье Пуарэ. Калі нехта з мужчын хварэе, даглядаць мусім мы, жанчыны. Схадзіце, зрэшты, на шпацыр, толькі на гэта вы й вартыя. А мы з мадам Ваке паклапоцімся пра дарагога месье Ватрэна.

Пуарэ ціхенька, без нараканняў, пасунуўся, нібы сабака пасля выспятка гаспадара.

Расціньяк выйшаў з дому, каб развеяцца і падыхаць свежым паветрам, але і на вуліцы ён задыхаўся. Учора ён хацеў перашкодзіць гэтаму злачынству, якое адбылося дакладна ў прызначаны час. Што здарылася? Што рабіць? Яго трасло ад усведамлення, што ён стаў хаўруснікам. Акрамя таго, яго палохала Ватрэнава абыякавасць.

«А калі б Ватрэн памёр і нічога не сказаў?» — пытаў сам сябе Расціньяк.

Ён бегаў па алеях Люксембургскага саду, нібы яго гнала зграя сабак, яму нават мроіўся іхні брэх.

— Гэй, ты чытаў «Пілот»? — крыкнуў яму Б'яншон.

«Пілот» быў радыкальнай газетай пад рэдакцыяй месье Тысо, яна выходзіла праз колькі гадзін пасля ранішніх газет і даносіла ўсе навіны ў правінцыю на суткі раней за іншыя выданні.

— Там надрукавалі інфармацыю пра незвычайнае здарэнне, — сказаў практыкант пры шпіталі імя Кашэна. — Сын Тайфэра біўся на дуэлі з афіцэрам старой гвардыі графам Франкесіні, і той уваткнуў шпагу Тайфэру ў лоб на два дзюймы. Цяпер Віктарына стала адной з самых заможных дзяўчат Парыжа. Хто мог ведаць? Ах, смерць — рулетка... Праўда, што ты падабаўся Віктарыне?

— Маўчы, Б'яншон, я ніколі з ёй не ажанюся. Я кахаю чароўную жанчыну, а яна кахае мяне, я...

— Ты кажаш так, нібы з усіх сіл стараешся не здрадзіць ёй. Няўжо знойдзецца жанчына, вартая таго, каб дзеля яе адмовіцца ад багацця пана Тайфэра.

— Няўжо сёння на мяне напалі ўсе дэманы? — усклікнуў Расціньяк.

— Дзе ты іх бачыш? Ты звар'яцеў? Дай мне руку, — сказаў Б'яншон, — я памацаю пульс. У цябе гарачка.

— Паспяшайся ў пансіён, там гэты стары разбойнік Ватрэн толькі што грымнуўся на падлогу, нібы сноп.

— Вось як, ты пацвярджаеш мае падазрэнні, якія я хачу праверыць, — сказаў Б'яншон, пакідаючы Расціньяка ў адзіноце.

Урачыстым атрымаўся доўгі шпацыр студэнта-юрыста. Можна сказаць, што ён даследваў сваё сумленне з усіх бакоў. Хаця ён разважаў, прыглядаўся да сябе, вагаўся, але з гэтага жорсткага і страшнага выпрабавання яго сумленне выйшла загартаваным, як жалеза, гатовым супрацьстаяць любым спакусам. Ён успомніў пра ўчарашняе прызнанне бацькі Гар'ё, згадаў кватэру, выбраную паблізу ад дома Дэльфіны на вуліцы д'Артуа, выцягнуў з кішэні ліст, перачытаў яго і пацалаваў.

«Такое каханне — якар майго ратунку, — думаў ён. — Сэрца беднага старога занадта перахвалявалася. Ён пра свае беды маўчыць, але хто іх не бачыць? Дык вось, я буду клапаціцца аб ім, як аб бацьку, я буду стараццa дагадзіць яму і часам радаваць яго. Калі Дэльфіна любіць мяне, яна часта будзе прыходзіць і праводзіць дні побач з ім. А яснавяльможная графіня дэ Рэсто — мярзотніца, яна гатова бацьку зрабіць брамнікам. Мілая Дэльфіна! Яна добра ставіцца да старога і годна вялікага кахання. Ах, значыцца, сёння вечарам я, нарэшце, стану шчаслівы!»

Ён дастаў гадзіннік і палюбаваўся ім.

«Мне так шанцуе! Калі каханне — моцнае і назаўжды, можна дапамагаць адно аднаму, значыць, я маю права прыняць дарунак. Зрэшты, безумоўна, я даб'юся поспеху і пастараюся аддзячыць у сто разоў. У нашай сувязі няма нічога злачыннага, нічога такога, ад чаго б нахмурыла бровы самая суровая дабрадзейнасць. Колькі добрых людзей заключаюць падобныя саюзы! Мы нікога не падманваем, а прыніжае чалавека менавіта хлусня. Хіба хлусня не раўназначная адмаўленню ад сябе? Яна ўжо даўно аддзялілася ад мужа. Зрэшты, я сам прапаную зльзасцу

саступіць мне гэтую жанчыну, калі ён не здольны даць ёй шчасце».

Доўга цягнулася барацьба ў душы Эжэна. Хаця перамога засталася за лепшымі юнацкімі вартасцямі, усё ж непераможная цікаўнасць а палове пятай, у шарую гадзіну, пацягнула яго да дома Ваке, які ён пакляўся пакінуць назаўжды. Яму карцела даведацца, ці памёр Ватрэн ці не. Б'яншон вырашыў прызначыць хвораму Ватрэну рвотнае, пасля чаго загадаў занесці ў свой шпіталь ваніты для хімічнага даследавання. Ягоныя падазрэнні толькі ўмацаваліся ад настойлівасці, з якой мадэмуазель Мішано старалася выкінуць іх. Да ўсяго, Ватрэн занадта хутка паправіўся, і Б'яншон западозрыў нейкую змову супраць пансіённага веселуна. На той час, калі вярнуўся Расціньяк, Ватрэн стаяў ужо каля печкі ў сталовай. Звесткі пра дуэль сына Тайфэра, цікавасць да падрабязнасцей гэтай справы і ўплыву падзей на лёс Віктарыны прывяла пансіянераў на вячэру раней часу; сабраліся ўсе, апроч бацькі Гар'ё, і абмяркоўвалі падзеі дня. Калі ўвайшоў Эжэн, яго вочы сустрэліся з непарушна спакойным позіркам Ватрэна, які так глыбока пранік у сэрца юнака, так моцна ўдарыў па струнах благіх пачуццяў, што Эжэн ажно скалануўся.

— Ну што, мой хлопчык, кірпатай мяне яшчэ доўга не ўзяць? — звярнуўся да яго беглы катаржнік. — Са слоў нашых дам, я пераможна вытрымаў такі ўдар, які даканаў бы нават вала.

— Ах, можаце смела казаць — быка, — усклікнула ўдава Ваке.

— Ці, можа, вас засмучае, што я застаўся жывы? — шапнуў Ватрэн на вуха Расціньяку, думкі якога ён, здавалася, прачытаў. — Гэта было б годна дужа моцнага чалавека.

— Ах, далібог, пазаўчора мадэмуазель Мішано, — сказаў Б'яншон, — згадвала пра нейкага спадара па мянушцы Падмані Смерць; вам гэтае імя вельмі пасавала б.

Гэтае слова падзейнічала на Ватрэна, як гром. Ён збялеў і пахіснуўся, яго магнетычны позірк, як сонечны прамень, трапіў на мадэмуазель Мішано і літаральна збіў яе з ног плынню выпрамененай волі. Старая дзеўка звалілася на крэсла. Разумеючы, што ягоная сяброўка ў небяспецы, Пуарэ імкліва ўстаў між ёю і Ватрэнам; твар катаржніка зрабіўся проста драпежным, калі ён скінуў

маску лагоды, якая хавала сапраўдную натуру гэтага чалавека. Жыхары пансіёна аслупянелі, хаця яшчэ нічога не цямілі ў гэтай драме. І тут з вуліцы данёсся тупат ног некалькіх мужчын і бразгат апушчаных салдацкіх стрэльбаў аб вулічны брук. У той момант, калі Кален машынальна азіраў сцены і вокны ў пошуках выйсця, у дзвярах гасцёўні з'явіліся чатыры чалавекі. Першым ішоў начальнік тайнай паліцыі, за ім — тры паліцыянты.

— Імем закона і караля! — сказаў адзін з іх, але яго голас патануў у рокаце здзіўлення.

Хутка ў сталовай запанавала цішыня, і пансіянеры расступіліся, даючы дарогу тром паліцэйскім, якія трымалі рукі з зараджанымі пісталетамі ў кішэні. Следам за афіцэрамі паліцыі з'явіліся жандары: двое сталі каля дзвярэй гасцёўні, яшчэ двое — каля дзвярэй, што вялі на ўсходы. Крокі і бразгат ружжа салдат пачуліся на брукаванцы перад фасадам. Ніякай магчымасці ўцячы Падмані Смерці не заставалася, на ім міжвольна спыніліся ўсе позіркі. Начальнік паліцыі падышоў да Ватрэна і ўдарыў па галаве так моцна, што зляцеў парык і ўсе змаглі сузіраць галаву Калена ва ўсёй яе непрывабнасці. Ягоныя твар і галава ў аправе кароткіх цагляна-рудых валасоў стваралі жудасны вобраз спалучэння сілы і каварства, рудыя пасмы, нібы языкі пякельнага агню, выразна асвятлялі гэтае аблічча і магутныя грудзі. І кожнаму стаў зразумелы ўвесь Ватрэн, яго мінулае, сучасны стан і яго будучыня, яго бязлітасныя тэорыі, культ уседазволенасці, вяршынства над іншымі, ад якіх паходзіў цынізм яго думак, дзеянняў і моц здольнага на ўсё арганізма. Кроў кінулася ў твар катаржніка, а вочы блішчэлі, як у дзікага ката. Ён падскочыў на месцы са звярынай энергіяй і так завыў, што пансіянеры аж сумеліся ад жаху. Пры гэтым ільвіным руху паліцыянты выхапілі пісталеты, выкарыстаўшы агульны перапуд. Кален заўважыў бляск пісталетаў, зразумеў небяспеку і вокамгненна паказаў, наколькі моцнай бывае сіла волі чалавека. Жудасны і велічны спектакль! На твары Калена знайшла адлюстраванне дзіўная з'ява, параўнальная толькі з працэсам, які адбываецца ў паравым катле, калі сціснутая пара, здольная ўзняць горы, раптоўна асядае ад адной кроплі халоднай вады. Кропляю халоднай вады, якая астудзіла шаленства катаржніка, стала імгненная, нібы маланка, думка. Кален заўсміхаўся і паглядзеў на парык.

— Мінуў той час, калі ты ветлівым быў, — сказаў ён начальніку паліцыі.

І працягнуў рукі жандарам, падзываючы іх кіўком галавы.

— Спадары жандары, надзеньце мне наручнікі. Я не супраціўляюся, прысутныя — будзеце сведкамі.

Па зале прабег шэпт захаплення, выкліканы імгненнасцю, з якой лава і полымя вырваліся з гэтага чалавечага вулкана і зноў суцішыліся.

— Што, перабіваю планы, пане доўбня? — працягваў катаржнік, гледзячы на славутага шэфа крымінальнай паліцыі.

— Давай распранайся, — з пагардаю загадаў чалавек з вулічкі Сент-Ан.

— Нашто? Тут дамы. Я не ўпіраюся і здаюся.

Ён вытрымаў паўзу і агледзеў прысутных, нібы прамоўца, які збіраецца паведаміць дзіўныя рэчы.

— Пішыце, татачка Ляшапэль, — сказаў ён, звяртаючыся да сівога старога, які сеў у канцы стала і выцягнуў з партфеля пратакол арышту. — Я прызнаюся ў тым, што я — Жак Кален па мянушцы Падмані Смерць, асуджаны на дваццаць год зняволення ў кайданах, і я толькі што даказаў, што маю права на сваю мянушку. — Затым ён звярнуўся да пансіянераў: — Хай бы я толькі ўзняў руку, як тры гэтых шпегі запырскалі б маёй юшкай пансіённую маліну матухны Ваке. Дзівакі, а бяруцца ставіць мне пасткі!

Мадам Ваке стала блага пры гэтых словах.

— Божачкі мае, ад гэтага ўсяго захварэць можна! Яшчэ ўчора я з ім сядзела ў тэатры Гетэ, — сказала яна Сільвіі.

— Крыху філасофіі, матухна, — працягваў Кален. — Што за бяда — пасядзець у маёй ложы ў Гетэ? — усклікнуў ён. — Хіба вы лепшыя за нас? Не так ганебна мець кляймо на плячы, як мець яго на вашых душах, друзлых душах членаў счарнелага ад гангрэны грамадства: лепшы сярод вас скарыўся мне. — Ягоныя вочы спыніліся на Расціньяку, ён ласкава ўсміхнуўся хлопцу, што было асабліва прыкметна пры жорсткасці яго твару. — Наш маленькі гешэфт застаецца ў сіле, анёлачак, у выпадку згоды, вядома! Чыёй? Зразумела.

І ён заспяваў:

Мая чароўная Фаншэта...

— Не хвалюйцеся, — працягваў ён, — я здолею атрымаць тое, што мне належыць. Мяне баяцца і абкрасці не наважацца!

Катарга з яе норавамі і жаргонам, з яе рэзкімі пераходамі ад жартаўлівага да жудаснага, яе страшэнная веліч, яе бесцырымоннасць і подласць — усё разам знайшло адбітак у гэтых словах і ў гэтым чалавеку, які ўжо ўяўляў цяпер сабою не асобу, а тып, прадстаўніка вымерлага віду, нейкага дзікага і разумнага, драпежнага і спрытнага племені. Умомант Кален зрабіўся ўвасабленнем своеасаблівай паэзіі, у якой надзвычай яскрава выявілася ўся гама чалавечых пачуццяў, акрамя аднаго: раскаяння. Яго позірк быў позіркам паўшага анёла, утрапёнага ў сваёй зацятай барацьбе. Расціньяк апусціў вочы долу, прымаючы яго ганебнае сяброўства як збавенне ад сваіх нядобрых памкненняў.

— Хто мяне выдаў? — запытаўся Кален, абвёўшы прысутных грозным позіркам і спыніўшыся на мадэмуазель Мішано, прамовіў: — Гэта ты, старая вобла? Ты ўсё падладзіла, шпіёнка? Адно маё слова, і праз тыдзень табе перарэжуць глотку. Але я дарую табе, бо я хрысціянін. Ды й не ты мяне выдала. Хто ж тады?.. Гэй! Гэй! Што там за грукат наверсе? — усклікнуў ён, пачуўшы, што паліцэйскія ўзламваюць у пакоі шафы і забіраюць яго рэчы. — Птушаняты пакінулі гняздо яшчэ ўчора. І вам нічога не даведацца. Мае гандлёвыя кнігі тут, — сказаў ён, ляпнуўшы сябе па лбе. — Цяпер я ведаю, хто выдаў мяне. Няйначай, гэты нягоднік Ядваб. Я не памыляюся, татачка ўзломшчык? — спытаў Кален у начальніка паліцыі. — Усё гэта дужа супадае з тым, што там, наверсе, былі схаваныя нашы крэдыткі. Цяпер, шаноўныя шпегі, там нічога няма. А што датычыцца Ядваба, дык прыстаўце да яго аховы хоць усіх жандараў, не міне і двух тыдняў, як яго *прыкончаць*. Колькі ж вы далі Мішанетцы? — запытаў Кален у паліцэйскіх. — Некалькі тысяч? Я каштую больш. Эх ты, гнілая Нінон[1], Венера Цвінтарная, Пампадур[2] у рыззі! Каб ты папярэдзіла мяне, ты мела б шэсць тысяч! А-а! Старая гандлярка чалавечым мясам, табе было няўцям, а то б мы паразумеліся з табой. Я не пашкадаваў бы грошай, каб пазбегнуць непатрэбнага

---

[1] *Дэ Ланкло Нінон* (1620—1705) — куртызанка, адна з самых прыгожых і адукаваных жанчын Францыі.

[2] *Пампадур* маркіза дэ (1721—1764) — фаварытка Людовіка XV.

вандраванне, дый каштаваць яно мне будзе нямала, — казаў ён, пакуль надзявалі наручнікі. — Цяпер гэтыя малойчыкі пакуль нацешацца, будуць бясконца тузаць, цягнуць з мяне душу. Калі б яны адправілі мяне на катаргу адразу ж, я б хутка вярнуўся да свайго занятку, нягледзячы на шпіёнаў з Ювелірнай набярэжнай[1]. На катарзе ўсе будуць са скуры вылузвацца, каб толькі дапамагчы ўцячы свайму генералу, свайму Падмані Смерці! У каго з вас знойдзецца, як у мяне, больш дзесяці тысяч паплечнікаў, гатовых дзеля вас на ўсё? — спытаўся ён з гонарам. — Тут, значыцца, ёсць нешта вартае, — дадаў ён, ударыўшы сябе ў грудзі, — бо я ніколі і нікога не выдаваў! Гэй ты, вобла, — звярнуўся ён да старой дзеўкі, — зірні: на мяне ўсе глядзяць з жахам, а на цябе з агідаю. Атрымлівай тое, што заслужыла. — Ён змоўк, пазіраючы на пансіянераў. — Які ў вас дурнаваты выгляд! Вы што, ніколі не бачылі катаржніка? Катаржнік такой загартоўкі, як Кален, той, што зараз перад вамі, не такі баязлівец, як усе астатнія. Ён пратэстуе супраць карэнных парушэнняў грамадскай дамовы, аб якіх казаў Жан-Жак[2], а я ганаруся тым, што я адзін з яго вучняў. Я адзін супраць урада з усімі яго жандармамі, бюджэтамі і судамі...

— Вы толькі зірніце на яго! Ён так і просіцца на карціну, — заўважыў мастак.

— Паслухай ты, дзядзька яго высокасці ка́та, канцлер Удавы (такую мянушку, авеяную паэзіяй жудасці, катаржнікі далі гільяціне), — прамовіў Кален, звяртаючыся да начальніка паліцыі, — калі ласка, пацвердзі, што мяне выдаў Ядваб! Я не хачу, каб за яго паклаў галаву іншы, гэта было б несправядліва.

У гэты час паліцэйскія, перарыўшы ўвесь пакой і склаўшы пратакол, вярнуліся і пачалі шэптам дакладваць начальніку. Допыт скончыўся.

— Спадарства, — звярнуўся Кален да пансіянераў, — зараз мяне павядуць. Пакуль я тут жыў, вы ўсе былі ветлівыя са мною, і я захаваю ўдзячнасць за гэта. Прыміце маё развітальнае прывітанне. Дазвольце прыслаць вам з Праванса вінных ягад[3].

---

[1] На Ювелірнай набярэжнай знаходзіцца прэфектура паліцыі.

[2] Маецца на ўвазе Жан-Жак Русо (1712—1778), пісьменнік-сентыменталіст, філосаф, педагог.

[3] Маецца на ўвазе Тулонская катарга, якая знаходзіцца ў Правансе, на поўдні Францыі.

Ён зрабіў некалькі крокаў, але азірнуўся, каб паглядзець на Расціньяка.

— Бывай, Эжэне, — вымавіў ён пяшчотна і сумна, тонам, зусім непадобным на грубы тон яго папярэдніх прамоў. — На ўсялякі выпадак, калі табе раптам спатрэбіцца, я пакідаю табе адданага сябра.

Нягледзячы на наручнікі, ён стаў у пазіцыю, прытупнуў нагою, як настаўнік фехтавання, і, крыкнуўшы: «Раз, два!», зрабіў выпад.

— Трапіш у бяду, звяртайся *туды*. І ён сам, і грошы ў поўным тваім распараджэнні.

Гэты незвычайны чалавек уклаў у апошнія словы столькі артыстызму, што іх сэнс быў ясны толькі яму і Расціньяку.

Калі жандары, салдаты і паліцэйскія выйшлі з дому, Сільвія, націраючы воцатам скроні сваёй гаспадыні, зірнула на разгубленых пансіянераў.

— Што там ні кажыце, — заўважыла яна, — а чалавек ён быў добры.

Яе словы прымусілі ачуцца ўсіх прысутных, заварожаных наплывам розных уражанняў ад гэтай падзеі. Усе паглядзелі адзін на аднаго і адразу ж запрыкмецілі сухую, худую, задубелую, як мумія, мадэмуазель Мішано. Тая прыціснулася да печкі і стаяла, патупіўшы позірк, быццам баялася, што празрысты цень ад брыля не здолее схаваць выразу вачэй.

Гэтая жанчына, якая і раней не выклікала ні ў кога ніякай прыхільнасці, раптоўна раскрыла сваю сутнасць. Глухі гоман усіх прысутных дружна выказаў агульную пагарду.

Мадэмуазель Мішано чула ўсё, але заставалася ў пакоі. Б'яншон першы нахіліўся да свайго суседа і напаўголасу сказаў:

— Калі гэтая мярзотніца будзе па-ранейшаму абедаць разам з намі, я перабяруся ў іншае месца.

Адразу ж усе, акрамя Пуарэ, далучыліся да студэнта, і Б'яншон, абапіраючыся на агульную падтрымку, накіраваўся да старога жыхара.

— Вы ў самых блізкіх адносінах з мадэмуазель Мішано, — сказаў ён, — пагаварыце з ёю і пераканайце яе ў тым, што яна павінна пайсці адсюль зараз жа.

— Зараз жа? — здзіўлена паўтарыў Пуарэ.

Затым ён падышоў да старой дзеўкі і сказаў ёй на вуха некалькі слоў.

— Але ж я заплаціла за месяц наперад і жыву тут на свае грошы, як і ўсе астатнія, — адказала яна, пазіраючы на нахлебнікаў як гадзіна.

— Гэта нічога не значыць. Мы скінемся і вернем вам грошы, — запярэчыў Расціньяк.

— Спадар Расціньяк, вядома, на баку Калена, — адказала яна, з'едліва гледзячы на студэнта, — і няцяжка здагадацца чаму.

Эжэн ірвануўся, быццам хацеў схапіць старую дзеўку і задушыць яе. Ён зразумеў усё падступства гэтага позірку, які асвяціў жудасным святлом яго душу.

— Не звязвайцеся з ёю! — крыкнулі нахлебнікі.

Расціньяк склаў рукі на грудзях і змоўк.

— Давайце скончым з мадэмуазель Юдай, — звярнуўся мастак да ўдавы Ваке. — Калі вы не прагоніце Мішано, мы ўсе пойдзем адсюль і будзем расказваць паўсюль, што тут жывуць адны катаржнікі ды шпіёны. У выпадку вашай згоды мы будзем маўчаць аб гэтым здарэнні, бо ў рэшце рэшт яно магчыма і ў самым лепшым грамадстве, пакуль катаржнікам не будуць ставіць на лоб кляймо, не забароняць ім прымаць аблічча парыжан і дурыць людзей так, як яны гэта робяць.

Пачуўшы такое патрабаванне, спадарыня Ваке адразу ачуняла: яна выпрасталася, скрыжавала на грудзях рукі, шырока расплюшчыла свае шкляныя вочы, у якіх не было і намёку на слёзы.

— Вы што ж, даражэнькі, збіраецеся павесіць на мяне жабрацкую торбу? Вось ужо і спадар Ватрэн... Божа ж мой! — перапыніла яна сябе. — Не магу ўстрымацца, каб не назваць яго добрасумленным чалавекам. Вось ужо адзін пакой вызваліўся, а вы хочаце, каб у маім доме здаваліся яшчэ два, ды ў такі час, калі ўсе ўладкаваліся.

— Спадарства, бярыце вашы капелюшы, пойдзем абедаць на пляц Сарбоны, да Флікато, — прапанаваў Б'яншон.

Удава Ваке адразу сцяміла, што выгадней, і наблізілася да мадэмуазель Мішано.

— Паслухайце, мілая, вы ж не дазволіце загінуць маёй установе? Бачыце, да чаго прымушае мяне грамада... Ідзіце да сябе ў пакой на гэты вечар.

— Зусім не тое, не тое, — закрычалі пансіянеры. — Мы хочам, каб яна зараз жа і назаўжды з'ехала адсюль!

— Але ж бедная мадэмуазель яшчэ не абедала, — жаласліва прамовіў Пуарэ.

— Няхай абедае дзе хоча! — усклікнулі нахлебнікі.

— Прэч адсюль шпіёнку!

— Прэч шпіёнаў!

— Спадарства, — усклікнуў Пуарэ, раптам узняўшыся да той храбрасці, якая можа выклікаць павагу нават у баранаў, — майце ласку да яе полу.

— Шпегі не маюць полу, — запярэчыў мастак.

— Вось дык паларама!

— За дзверыраму!

— Спадарства! Гэта непрыстойна! Калі ўжо адмаўляць людзям ад дому, то трэба рабіць гэта цывілізавана. Мы заплацілі грошы, мы застаемся, — заявіў Пуарэ, насоўваючы шапку і займаючы месца побач з мадэмуазель Мішано, у той час як Ваке ўсё працягвала ўгаворваць яе.

— Ах ты, нягоднік, — камічна ўсклікнуў мастак, — ах, нягоднік!

— Добра, паколькі не хочаце ісці вы, пойдзем мы, — заявіў Б'яншон.

І ўсе пансіянеры рушылі гуртам да гасцёўні.

— Мадэмуазель, што вы робіце? — усклікнула Ваке. — Вы мяне давялі да галечы. Вам нельга тут больш заставацца: у рэшце рэшт яны выкарыстаюць сілу.

Мадэмуазель Мішано ўзнялася з крэсла.

— Пойдзе!

— Не пойдзе!

— Пойдзе!

— Не пойдзе!

Гэтыя воклічы, што чаргаваліся адзін за другім, а таксама варожыя заўвагі прымусілі мадэмуазель Мішано саступіць пасля непрацяглых перамоў шэптам з гаспадыняй.

— Я перабіраюся да спадарыні Бюно, — пагрозліва заявіла яна.

— Перабірайцеся куды хочаце, мадэмуазель, — адказала ўдава Ваке, зняважаная гэтым выбарам, паколькі пансіён Бюно супернічаў з «Домам Ваке» і, значыць, быў ёй ненавісны. — Перабірайцеся да Бюно, там вам будуць даваць такое віно, што твар скрывіць, а таксама будуць карміць рознай дрэнню.

Пансіянеры, захоўваючы магільнае маўчанне, сталі ў дзве шарэнгі. Пуарэ так пяшчотна зірнуў на мадэмуазель Мішано, так прастадушна праявіў нерашучасць, не ведаючы, ці ён павінен ісці з ёю ці застацца, што пансіянеры,

узрадаваныя ад'ездам старой дзеўкі, пачалі пераглядацца і смяяцца.

— Цю-цю-цю, Пуарэ! — крыкнуў яму мастак. — Ну, хутчэй — раз-два-тры!

Супрацоўнік музея камічна праспяваў пачатак вядомага раманса:

Калі сабраўся ў Сірыю
Малойчык Дзюнуа...

— Ну, давайце! Вам жа дужа хочацца, — trahit sua guemgue voluptas[1], — прамовіў Б'яншон.

— «Кожны бяжыць за сваёю сяброўкай», — такі вольны пераклад гэтых слоў Вергілія, — дадаў рэпетытар.

Мадэмуазель Мішано паглядзела на Пуарэ і жэстам паказала, быццам бярэ яго пад руку. Пуарэ не вытрымаў, наблізіўся да яе і прапанаваў сваю руку.

Грымнуў рогат і апладысменты.

— Брава, Пуарэ!

— Вось дык дзед Пуарэ!

— Апалон Пуарэ!

— Малайчына Пуарэ!

У гэту хвіліну ўвайшоў пасыльны і перадаў спадарыні Ваке ліст, прачытаўшы які, яна бяссільна апусцілася на крэсла.

— Застаецца толькі спаліць мой дом, на яго падаюць усе грымоты. А трэцяй гадзіне памёр сын Тайфэра. Я пакараная за тое, што зычыла дабра спадарыні Куцюр і Віктарыне за кошт няшчасця беднага маладога чалавека. Цяпер гэтыя дамы просяць вярнуць іх рэчы і застаюцца жыць у Тайфэра-бацькі. Ён дазволіў дачцэ пасяліць у сябе ўдаву Куцюр у якасці кампаньёнкі. Вызваляюцца чатыры пакоі, пяці жыхароў як не бывала! Адна бяда не ходзіць, другую за сабой водзіць! — ледзь не плачучы, усклікнула спадарыня Ваке.

Раптам побач з домам спыніўся экіпаж.

— Яшчэ нейкая непрыемнасць, — сказала Сільвія.

На парозе ўзнік Гар'ё. Яго твар ажно свяціўся ад шчасця, стары выглядаў памаладзелым.

— Гар'ё — у фіякры! — здзівіліся пансіянеры. — Ды гэта ж канец свету.

---

[1] *Trahit sua guemgue voluptas* — кожнага выдае ягонае захапленне *(лац.)*.

Стары адразу накіраваўся ў той кут, дзе стаяў задуменны Эжэн, узяў яго пад руку і весела вымавіў:

— Хадзем.

— Дык вы не ведаеце, што тут адбылося? — запытаўся Расціньяк. — Ватрэн аказаўся катаржнікам, яго толькі што арыштавалі, а сын Тайфэра памёр.

— А што нам да гэтага? — запярэчыў бацька Гар'ё. — Я з дачкой сёння вячэраю ў вас, вы гэта разумееце? Яна вас чакае, пойдзем!

Ён з такою сілай цягнуў Эжэна за руку, прымушаючы таго ісці, нібы выкрадаў сваю каханку.

— Давайце абедаць! — крыкнуў мастак.

Усе ўзялі крэслы ды паселі вакол стала.

— Вось не шанцуе, — сказала тоўстая Сільвія, — сёння адны няшчасці, і ў мяне бараніна з рэпай падгарэла. Ну, будзеце есці падгарэлае, нічога не зробіш!

Удава Ваке не магла вымавіць ні слова, бачачы за сталом замест васемнаццаці пансіянераў толькі дзесяць, але ўсе стараліся суцешыць яе і развесяліць. Спачатку гутарылі пра Ватрэна і пра падзеі дня, але паступова, кіруючыся пакручастай сцяжынай размовы, перайшлі да пытанняў, звязаных з дуэлямі, катаргай, турмамі, судамі, з недасканаласцю заканадаўчай краіны. Пад канец субяседнікі аддаліліся на тысячу лье ад Жака Калена, Віктарыны, яе брата і, хоць было іх толькі дзесяць, спрачаліся яны гучней, чым дваццаць чалавек: здавалася, што народу набралася больш, чым звычайна. У гэтым і заключалася ўся розніца паміж сённяшнім абедам і ўчарашнім. У гэтай эгаістычнай публікі, якая заўтра ж адшукае сабе новую пажыву сярод штодзённых парыжскіх прыгод, верх над усім узяла яе звычайная бесклапотнасць. Нават сама спадарыня Ваке паддалася надзеі, якая прагучала ў голасе тоўстай Сільвіі, і паступова супакоілася.

Увесь гэты дзень, з самага ранку да вечара, уяўляўся Расціньяку нейкай фантасмагорыяй. Нягледзячы на сілу свайго характару і ясную галаву, ён, нават седзячы ў фіякры побач з бацькам Гар'ё, усё яшчэ не мог упарадкаваць свае думкі, і пасля столькіх хваляванняў усе разважанні старога, прасякнутыя незвычайнай радасцю, даляталі да вушэй Эжэна як размовы, якія чуеш нібы праз сон.

— Усё скончана яшчэ раніцай. Мы будзем абедаць утрох, разам! Разумееце? Вось ужо чатыры гады, як я не

абедаў з Дэльфінай, з маёй Фіфінай. Цяпер яна будзе са мною ўвесь вечар. Мы з самага ранку займаемся вашай кватэрай. Зняўшы сурдут, я працаваў, як падзёншчык. Я дапамагаў насіць мэблю. О, вы не ведаеце, якою мілай бывае Фіфіна за сталом, як яна будзе ўважліва адносіцца да мяне: «Тата, пакаштуй вось гэта, вельмі смачна!» А калі яна такая — я не магу есці. Сапраўды, даўно мне не было з ёю так хораша, спакойна, як цяпер!

— Значыць, сёння ўвесь свет перавярнуўся? — сказаў яму Эжэн.

— Перавярнуўся? — здзівіўся бацька Гар'ё. — Ды ніколі яшчэ не было так хораша на свеце! На вуліцах я бачу адны радасныя твары, толькі людзей, якія паціскаюць адзін аднаму рукі і цалуюцца, такіх шчаслівых, быццам усе яны ідуць да сваіх дачок частавацца абедам, такім смачным, як і той, што заказала для мяне Фіфіна галоўнаму повару «Ангельскай кавярні». Ды пры ёй і рэдзька здасца саладзейшай за мёд.

— Я, здаецца, вяртаюся да жыцця, — прамовіў Эжэн.

— Рамізнік, ану, хутчэй! — крыкнуў бацька Гар'ё, узняўшы пярэдняе шкло. — Калі давязеш нас да месца за дзесяць хвілін, дам сто су на гарэлку.

Пачуўшы такое, рамізнік паскорыў хаду.

— Ды ён жа не рухаецца з месца! — абураўся бацька Гар'ё.

— А куды вы мяне вязеце? — запытаў Расціньяк.

— Да вас, — адказаў бацька Гар'ё.

Карэта спынілася на вуліцы д'Артуа. Стары сышоў першы і кінуў рамізніку дзесяць франкаў з выглядам аўдавелага марнатраўцы, якому не шкада грошай дзеля невялічкай асалоды.

— Ну, пойдзем, — сказаў ён Расціньяку і, абагнуўшы праз двор новы прыгожы дом з задняга фасаду, прывёў Эжэна да дзвярэй кватэры на чацвёртым паверсе.

Бацьку Гар'ё не прыйшлося званіць: пакаёўка спадарыні дэ Нусінген, Тэрэза, сама адчыніла дзверы. Эжэн апынуўся ва ўтульнай кватэры, якая складалася з пярэдняй, маленькай гасцёўні, спальні і кабінета, вокны якога выходзілі на нейкі садок. Невялікая гасцёўня па прыгажосці і ўтульнасці сваёй вытрымала б любое параўнанне, і там пры святле васковых свечак Эжэн убачыў Дэльфіну, якая сядзела на канапцы перад камінам. Яна ўстала, паклала ручны экран на палічку каміна і пяшчотна сказала Расціньяку:

— Дык за вамі яшчэ трэба пасылаць, шаноўны спадар Нездагадлівы!

Калі Тэрэза выйшла з гасцёўні, студэнт абняў Дэльфіну, прытуліў да сябе і заплакаў ад радасці. Пасля столькіх непрыемных хваляванняў за адзін дзень, якія стамілі розум і сэрца, рэзкі пераход ад відовішча ў «Доме Ваке» да гэтай карціны выклікаў у маладога чалавека прыступ нервовай слабасці.

— Я добра ведаў, што ён любіць цябе, — шэптам казаў дачцэ бацька Гар'ё, пакуль Эжэн, поўнасцю разбіты, лежачы на канапцы, быў яшчэ не ў стане ўсвядоміць, адкуль на яго звалiўся гэты цуд.

— Ну, хадземце зірнем, — сказала яму спадарыня дэ Нусінген і, узяўшы яго за руку, прывяла ў пакой, які сваёй мэбляй, дыванамі і нават дробязямі ўбрання нагадваў пакой Дэльфіны, але быў крыху меншы.

— Няма толькі ложка, — заўважыў Расціньяк.

— Але, — адказала яна яму, чырванеючы і паціскаючы руку.

Эжэн паглядзеў на яе: хоць ён быў яшчэ зусім малады, аднак адчуў, колькі сапраўднай сарамлівасці тоіцца ў душы закаханай жанчыны.

— Вы належыце да жанчын, вартых пакланення, — прамовіў Эжэн ёй на вуха. — Мы так добра разумеем адзін аднаго, што я наважваюся вам сказаць: чым каханне мацнейшае, чым яно шчырэй, тым больш неабходныя для яго таямнічасць і скрытнасць. Не выдадзім нашу таямніцу нікому.

— Я ж не ніхто, — прабурчаў бацька Гар'ё.

— Вы ж добра ведаеце, што вы — гэта мы...

— Вось чаго мне і хацелася: вы ж не будзеце звяртаць на мяне ўвагі? Я буду заходзіць і выходзіць, як добры дух, яго не бачаць, але ведаюць, што ён тут. Бачыш, Фіфіначка, Ніні, Дзідзі! Хіба я памыляўся, калі казаў: «На вуліцы д'Артуа здаюць цудоўную кватэрку, давай абставім яе для яго»? А ты ўсё не хацела. Я твой бацька, мне і ўладкоўваць тваё шчасце! Бацькі заўсёды павінны даваць, каб атрымліваць бацькоўскую асалоду. Рабі падарункі заўсёды! Вось твая справа, калі ты бацька.

— Няўжо Дэльфіна была супраць? — здзівіўся Эжэн.

— Так, так! Яна не хацела, баялася недарэчлівых плётак, як быццам меркаванне свету можа быць вартым шчасця! А ўсе жанчыны толькі й мараць аб тым, што зрабіла яна...

Бацька Гар'ё працягваў гаварыць адзін, бо Дэльфіна павяла Эжэна ў кабінет, адкуль адразу ж данёсся хоць і вельмі асцярожны, але ўсё ж чутны пацалунак. Гэты пакой сваім убранствам не саступаў іншым пакоям кватэры, дзе ўсё было гэтак жа бездакорна.

— Ці ўдалося дагадзіць вашым жаданням? — спытала Дэльфіна, вяртаючыся ў гасцёўню, дзе яны збіраліся вячэраць.

— І нават пераўзысці, — адказаў ён. — Усю гэтую раскошу, усю гэтую паэзію маладога прыгожага жыцця я ўспрымаю як чароўны сон і адчуваю настолькі тонка, што мог бы быць вартым гэтага... Але, на вялікі жаль, я не магу прыняць ад вас гэты падарунак, бо сам я пакуль што вельмі бедны, каб...

— А-а, вось як! Вы пачынаеце пярэчыць мне? — прамовіла яна ўладарна-жартаўлівым тонам з капрызлівым выразам на чароўным тварыку, як гэта звычайна робяць жанчыны, калі хочуць некага крыху паўшчуваць

Аднак Расціньяка гэта не супакоіла. Ён перажыў вельмі цяжкі дзень: свой уласны самааналіз, арышт Ватрэна, які раскрыў перад Эжэнам цэлую бездань, у якую ён быў амаль гатовы скаціцца; але ўсё гэта настолькі ўмацавала ў ім высакародныя пачуцці і маральную далікатнасць, што ён цяпер не мог саступіць Дэльфіне, якая пяшчотна абвяргала яго ўзвышаныя перакананні. Вялікая туга агарнула маладога чалавека.

— Дык што, вы адмаўляецеся? — пытала мадам дэ Нусінген. — Ці ўсведамляеце вы сэнс падобнай адмовы? Вы не верыце ў будучыню, вы не збіраецеся звязаць свой лёс з маім... Значыць, вы баіцёся, што падманеце мае пачуцці да вас? Калі вы сапраўды любіце, калі я... люблю вас, што ж тады забараняе вам прыняць ад мяне такую дробязную паслугу? Калі б вы ведалі, з якім задавальненнем я ўладкоўвала гэтую кватэру, вы б не вагаліся і папрасілі б у мяне прабачэння. У мяне былі вашы грошы, і я пусціла іх на справу, вось і ўсё. Вы ўяўляеце сябе велікадушным, а вы — проста дробязны чалавек. Вам хочацца значна большага... Ах! — уздыхнула яна, убачыўшы палкі позірк Эжэна. — Вы цырымоніцеся з-за дробязяў! Калі вы не кахаеце мяне, то тады, вядома, адмаўляйцеся. Мой лёс залежыць ад аднаго вашага слова. Скажыце!.. Тата, ну хоць вы пераканайце яго як-небудзь, — сказала яна, звяртаючыся пасля хвіліны маў-

чання да свайго бацькі. — Няўжо ён думае, што ў пытаннях гонару я разбіраюся горш, чым ён?

Бацька Гар'ё з застылай усмешкай наркамана назіраў за гэтай мілай спрэчкай дзяцей.

— Хлопча, вы толькі ўступаеце ў жыццё, — працягвала Дэльфіна, узяўшы за руку Эжэна, — перад вамі перашкода, непераадольная для многіх, і вось рука жанчыны здымае яе з вашага шляху, а вы адступаеце назад! У вас усё наперадзе, вы яшчэ разбагацееце, поспех напісаны на вашым гожым чале. Хіба вы тады не зможаце вярнуць мне тое, што я даю вам цяпер у пазыку? Хіба дамы ў былыя часы не дарылі сваім рыцарам мячы, кальчугі, рыштунак, шлемы і коней, каб пасля гэтыя рыцары маглі ў гонар сваіх дам змагацца на турнірах? Паслухайце, Эжэне, тое, што я вам зараз прапаную, і ёсць зброя нашай эпохі, неабходная кожнаму, хто хоча некім значыць. Я ўяўляю, як выглядае тое гарышча, дзе вы жывяце, калі яно нагадвае бацькаў пакой! Дык, значыць, абедаць мы не будзем? Вы хочаце сапсаваць мне настрой? Адказвайце! — усклікнула яна, тузануўшы Эжэна за руку. — Божа мой! Тата, паспрабуй пераканаць яго, інакш я пайду, і больш мы не ўбачымся з ім ніколі.

— Зараз я вас пераканаю, — прамовіў бацька Гар'ё, выходзячы з задумення. — Дарагі мой спадар Эжэне, наколькі мне вядома, вы займаеце грошы ў габрэяў?

— Даводзіцца, — неахвотна адказаў Расціньяк.

— Выдатна! — працягваў стары, дастаючы моцна абшарпаны скураны партманет. — У дадзеным выпадку габрэй — гэта я; вось рахункі — я аплаціў іх усе. За ўсё, што тут знаходзіцца, вы не павінны ні сантыма. Сума невялікая — самае большае — пяць тысяч франкаў, і я вам іх пазычаю, а паколькі я не жанчына, вы не адмовіцеся прыняць грошы ад мяне. Напішыце мне распіску на кавалачку паперы, а грошы вернеце потым.

Эжэн і Дэльфіна здзіўлена пераглянуліся, і на іх вочы навярнуліся слёзы. Расціньяк горача паціснуў руку старому.

— Ну, што тут асаблівага! Вы ж мае дзеці? — сказаў бацька Гар'ё.

— Даражэнькі татачка, але як вы гэта ўсё зрабілі? — запытала мадам дэ Нусінген.

— Ага, у гэтым уся штука! Калі я пераканаў цябе перасяліць яго бліжэй, я пачаў заўважаць, што ты купляеш дарагія рэчы, і падумаў: «Такімі выдаткамі яна сабе

нашкодзіць!», — бо наш павераны сцвярджае, што судовая справа супраць мужа аб вяртанні тваёй маёмасці працягнецца больш за паўгода. Тады я ўзяў ды прадаў маю бестэрміновую рэнту ў тысячу трыста пяцьдзесят франкаў гадавога прыбытку: пятнаццаць тысяч паклаў за пажыццёвы прыбытак у тысячу дзвесце франкаў, дастаткова забяспечаны нерухомасцю, а з астатніх грошай заплаціў, дзеці мае, вашым пастаўшчыкам. Тут наверсе я зняў пакойчык за сто пяцьдзесят франкаў у год. На сорак су ў дзень я буду жыць, як кароль, ды яшчэ што-кольвечы застанецца. Новага адзення мне амаль не трэба, я старое не знашу. Ужо трэці тыдзень я ціха пасмейваюся: «Вось дык будуць яны шчаслівыя!» Ну што, хіба вы цяпер не шчаслівыя?

— Ой, татачка, родненькі! — усклікнула Дэльфіна, скочыўшы бацьку на калені.

Яна абцалавала яго, пяшчотна прытулілася да шчакі белакурай галоўкай і акрапіла слязамі бацькаў ззяючы памаладзелы твар.

— Мілы мой татачка! Так, вы — сапраўдны бацька! Другога такога няма ў свеце. Эжэн любіў вас і раней, а цяпер тым больш.

Ужо гадоў дзесяць бацька Гар'ё не адчуваў, як побач з яго сэрцам б'ецца сэрца дачкі.

— Кіньце, кіньце, дзеці мае! Дэльфіна, ты зараз давядзеш мяне да таго, што я памру ад радасці! Маё сэрца гатова разарвацца. Паслухайце, спадар Эжэне, мы ўжо з вамі разлічыліся!

І стары сціснуў дачку ў абдымках так моцна, так нечакана, што яна ажно ўскрыкнула:

— Ой, ты робіш мне балюча!

Стары пабялеў і прамовіў:

— Дачушка, я зрабіў табе балюча!

Ён глядзеў на Дэльфіну з нечалавечым выразам пакуты. Калі б захацелася апісаць твар гэтага Хрыстоса-бацькі, то прыйшлося б пашукаць параўнанні сярод вобразаў, створаных вялікімі майстрамі пэндзля для выражэння мукі, праз якую прайшоў выратавальнік чалавецтва дзеля агульнага шчасця. Бацька Гар'ё асцярожна пацалаваў дачку ў тое месца, дзе пальцы замоцна націснулі на яе талію.

— Не, не, не я зрабіў табе балюча, — гаварыў ён з запытальнай усмешкай на вуснах, — а вось ты сваім крыкам зрабіла мне балюча. — Яшчэ раз пацалаваўшы

дачку, ён шэптам сказаў ёй: — Усё каштуе даражэй, але ж трэба адвесці яму вочы, бо яшчэ пакрыўдзіцца.

Эжэн, узрушаны надзвычайнай ахвярнасцю старога, пазіраў на яго з наіўным і шчырым захапленнем, у маладых людзей блізкім да пакланення.

— Я пастараюся быць вартым таго, што вы зрабілі для мяне!

— Мілы Эжэне, як добра вы зараз сказалі! — усклікнула мадам дэ Нусінген і пацалавала маладога чалавека ў лоб.

— Дзеля цябе ён адмовіўся ад мадэмуазель Тайфэр і яе мільёнаў, — дадаў бацька Гар'ё. — Так, дзяўчына вас кахала, цяпер, пасля смерці брата, яна зрабілася вельмі багатай.

— Ну навошта было казаць пра гэта? — папракнуў старога Расціньяк.

— Эжэн, — шапнула яму на вуха Дэльфіна, — цяпер увесь вечар мне будзе сумна. Але я буду любіць вас заўсёды.

— Гэта мой найлепшы дзень пасля вашых шлюбаў! — усклікнуў Гар'ё. — Няхай Бог пасылае мне любыя пакуты, абы яны былі не з-за вас, і я ўвесь час буду паўтараць: «У лютым таго года я хвіліну быў такім шчаслівым, як некаторыя людзі не бываюць за ўсё жыццё». Зірні на мяне, Фіфіна! — звярнуўся ён да дачкі. — Ці ж яна не прыгажуня? Скажыце, калі ласка, ці сустракалі вы калісьці жанчыну з такім колерам твару і з такой ямінкаю на падбародку? Не? Праўда, не? Гэта я стварыў такую дасканаласць! А цяпер, дзякуючы вам, яна будзе шчаслівай і стане яшчэ прыгажэйшай. Калі вам, дарагі суседзе, патрэбна маё месца ў раі, я вам яго саступаю, а сам магу пайсці ў пекла. Але давайце есці, давайце хутчэй есці, тут жа ўсё наша! — раптам усклікнуў ён, ужо не ведаючы, што сказаць.

— Мілы татачка!

Гар'ё ўстаў, падышоў да дачкі, абхапіў рукамі яе галаву і, цалуючы ў прабор, прамовіў:

— Дачушка мая, каб ты ведала, колькі шчасця можаш ты мне прынесці без асаблівых намаганняў! Я буду жыць там наверсе: табе дастаткова зрабіць два крокі, каб зайсці да мяне. Ты будзеш наведваць мяне, абяцай?

— Вядома, дарагі татачка.

— Паўтары.

— Абавязкова, мілы татачка.

— Цяпер маўчы, а то я дам сабе волю і прымушу цябе паўтарыць гэта сотню разоў. Давайце абедаць.

Увесь вечар прайшоў у дзівацтвах, прычым бацька Гар'ё паводзіў сябе, як дзіця. То ён клаўся ля ног дачкі і цалаваў іх, то глядзеў падоўгу ёй у вочы, то цёрся галавою аб яе сукенку. На такія дзівацтвы мог быць здольны толькі самы пяшчотны, самы юны каханак.

— Вось бачыце? — шапнула Расціньяку Дэльфіна. — Калі мой бацька з намі, яму трэба належаць поўнасцю. А гэта часам будзе нам замінаць.

Эжэн, у якім не раз успыхвалі агеньчыкі рэўнасці, усё-такі не мог не асудзіць гэткія думкі, што ўтрымлівалі ў сабе парасткі чорнай няўдзячнасці.

— А калі кватэра будзе канчаткова падрыхтавана? — спытаў Эжэн, азіраючыся навокал. — Мне падаецца, што сёння мы будзем вымушаны развітацца?

— Так, але заўтра вы будзеце абедаць у мяне, — адказала Дэльфіна з хітраватым выглядам. — Заўтра пойдзем у Італьянскую аперу.

— Я буду сядзець у партэры, — заявіў бацька Гар'ё.

Апоўначы за Дэльфінай прыехала карэта. Студэнт і бацька Гар'ё накіраваліся ў «Дом Ваке» і, гутарачы аб Дэльфіне, усё больш і больш захапляліся ёю, што ператварыла іх размову ў своеасаблівы слоўны турнір паміж двума ўсемагутнымі пачуццямі. Эжэн не мог не адзначыць таго факту, што бацькоўская любоў, пазбаўленая ўсялякага эгаістычнага інтарэсу, зацяняла яго любоў сваёй непахіснасцю і глыбінёй. Для бацькі кумір у асобе дачкі заставаўся нязменна чыстым і ўзвышаным, а пакланенне яму ўмацоўвалася не толькі думкамі аб будучыні, але і аб мінулым.

Вярнуўшыся дадому, яны ўбачалі, што ўдава Ваке адна сядзіць ля печкі ў кампаніі Сільвіі і Крыстофа. Старая гаспадыня нагадвала Ма́рыя сярод руін Карфагена. Яна чакала двух сваіх жыхароў, якія засталіся ў яе, і дзялілася з Сільвіяй сваім горам. Хоць і дужа красамоўныя скаргі на жыццё, укладзеныя лордам Байранам у вусны яго персанажа Таса[1], яны далёкія ад той жыццёвай праўды, што гучала ў словах удавы Ваке.

— Сільвія, дык, значыцца, заўтра раніцай давядзецца гатаваць толькі тры кубкі кавы. Дажыліся! Наш дом апусцеў. Сэрца рвецца на часткі. Ну, што цяпер за жыццё

[1] Маецца на ўвазе вершаваны твор Байрана «Скарга Таса».

без пансіянераў? Нішто! У пустым доме жыцця няма. Чым я саграшыла перад богам, што наклікала на сябе ўсе гэтыя беды? А бобу і бульбы назапашана на дваццаць чалавек. І тут раптам у маім доме — паліцыя! Цяпер нам прыйдзецца есці адну бульбу! Трэба будзе звольніць Крыстофа.

Крыстоф, які драмаў побач, страпянуўся і спытаў:

— Што загадаеце?

— Бедны хлопец. Ён стараецца, як вартавы сабака, — заўважыла Сільвія.

— Час зімні, усе даўна ўладкаваліся. Адкуль жа возьмуцца ў мяне кватаранты? Я звар'яцею. А тут яшчэ гэта ведзьма Мішано звяла ад мяне Пуарэ. Чым яна яму так дагадзіла, чым так прывязала да сябе, што ён бегае за ёю, быццам шчанюк.

— Як жа не прывязаць! Гэтыя старыя дзеўкі ведаюць, чым узяць, — адказала Сільвія, асуджальна ківаючы галавою.

— Беднага спадара Ватрэна павялі ў кайданах... А ведаеш, Сільвія, што хочаш рабі са мною, толькі не магу гэтаму паверыць. Такі весялун, заўсёды пажартуе... Піў «глорыю» на пятнаццаць франкаў у месяц і за ўсё заўжды плаціў.

— Чалавек шчодры! — дадаў Крыстоф.

— Відаць, тут нейкая памылка, — зрабіла выснову Сільвія.

— Ды не, ён сам прызнаўся, — працягвала ўдава Ваке. — І трэба ж было такому здарыцца ў маім доме, у квартале, дзе нават каты не блукаюць. Я быццам у сне, Божа мой, Божа. Чаго толькі мы не бачылі з табою за наш век: і як скінулі Людовіка Шаснаццатага, і як паў імператар, і як ён вярнуўся і зноў паў, — усё гэта ўкладваецца ў галаву. З сямейнымі пансіёнамі не так усё проста: без караля абыдзешся, а есці хочацца заўжды. І калі сумленнай удаве, ды яшчэ з роду дэ Канфлан, няма каго карміць разнастайнымі добрымі абедамі, тады гэта канец свету... Сапраўды, так яно і ёсць, гэта канец свету.

— Гэта ж падумаць, што ўвесь гэты вэрхал узняла мадэмуазель Мішано, ды яшчэ, кажуць, атрымала за гэта рэнту ў тысячу экю! — усклікнула Сільвія.

— Не кажы мне пра гэтую нягодніцу! — сказала мадам Ваке. — Да таго ж яшчэ яна перабіраецца да Бюно. Яна здольная на ўсё, пэўна, у свой час займалася жудаснымі

справамі: і крала, і забівала. Вось каго трэба саслаць на катаргу, а не Ватрэна.

У гэты момант пазванілі Эжэн і бацька Гар'ё.

— А-а! Гэтыя двое — мае самыя надзейныя, — уздыхнуўшы, прамовіла мадам Ваке.

«Надзейныя» захавалі толькі слабы ўспамін аб няшчасцях, якія нахлынулі на пансіён, і тут жа заявілі сваёй гаспадыні, што перасяляюцца на Шасэ-д'Антэн.

— Сільвія, мой апошні козыр біты! — з роспаччу ўсклікнула мадам Ваке. — Спадары, вы нанеслі мне смяротны ўдар! У самае сэрца! Быццам кол туды ўвагналі. Ну і дзянёк! Пастарэеш з-за яго на дзесяць гадоў. Божа ж мой, я звар'яцею. Што рабіць з фасоляй? Раз я застаюся адна, заўтра ты, Крыстоф, атрымаеш разлік. Бывайце, спадары! Дабранач!

— Што з ёю здарылася? — запытаўся Эжэн у Сільвіі.

— Ну як жа! Усё гэта з-за таго, што кватаранты раз'ехаліся. Узяла ў галаву. Чуеце, як плача. Няхай, можа, лягчэй стане. За ўвесь час, колькі служу тут, гэта ўпершыню.

На наступны дзень мадам Ваке, як яна сказала сама, адумалася. Вядома, што кожная гаспадыня будзе засмучоная, страціўшы ўсіх сваіх жыхароў і перажыўшы цэлы пераварот у жыцці, але спадарыня Ваке захавала здаровы сэнс і паказала, якім можа быць сапраўдны глыбокі смутак, выкліканы парушэннем матэрыяльных выгод і звычнага ладу жыцця. Калі закаханы пакідае тыя мясціны, дзе жыве яго каханая, калі ён глядзіць на іх апошні раз, яго позірк не такі сумны, якім быў позірк удавы Ваке, калі яна глядзела на апусцелы стол. Эжэн спрабаваў суцешыць яе, паведаміўшы, што праз некалькі дзён замест яго тут паселіцца Б'яншон, у якога скончыцца тэрмін практыкі ў шпіталі, ды й супрацоўнік музея неаднаразова выказваў жаданне заняць пакой спадарыні Куцюр, так што яна хутка папоўніць спіс сваіх кватарантаў.

— Вашыя б словы ды Богу ў вушы, даражэнькі Эжэн! Але тут пасялілася няшчасце. Убачыце, не міне і дзесяці дзён, як сюды ўвойдзе смерць, — сказала Ваке, аглядаючы сталовую злавесным позіркам. — Каго ж яна забярэ?

— Трэба выбірацца, — ціхенька сказаў Эжэн бацьку Гар'ё.

— Спадарыня, вось ужо тры дні, як я не бачу Місцігры, — заявіла спалоханая Сільвія.

— Божа, калі яшчэ мой кот памёр, калі ён знік, дык я...

Бедная ўдава, не скончыўшы фразы, пляснула ў далоні і адкінулася на спінку фатэля, уражаная гэтым жудасным прадказаннем.

Каля апоўдня, калі паштальёны разносяць лісты ў раёне Пантэона, Эжэн атрымаў ліст у прыгожым канверце, запячатаным гербавай пячаткай дэ Басэанаў. У канверце ляжала запрашэнне на імя спадарыні і спадара Нусінгенаў на вялікі баль да вікантэсы, аб якім было вядома ўсім яшчэ за месяц. Запрашэнне суправаджалася запіскай для самога Эжэна:

«Я падумала, што вы з задавальненнем возьмецеся быць выразнікам маіх пачуццяў у адносінах да мадам дэ Нусінген. Пасылаю вам запрашэнне, аб якім вы прасілі, і буду рада пазнаёміцца з сястрою мадам дэ Рэсто. Адным словам, прывозьце да мяне вашу прыгажуню, але пастарайцеся, каб яна не завалодала ўсёй вашай прыязнасцю, бо значную частку гэтага пачуцця вы павінны адшкадаваць мне — у адказ на тое, якое я адчуваю да вас.

Вікантэса дэ Басэан».

«Так, але мадам дэ Басэан даволі ясна намякае на тое, што прысутнасць барона дэ Нусінгена для яе непажаданая», — падумаў Эжэн.

Ён адразу ж накіраваўся да Дэльфіны, вельмі задаволены тым, што зможа парадаваць яе, і цвёрда спадзеючыся атрымаць за гэта заслужаную ўзнагароду. Мадам дэ Нусінген прымала ванну. Эжэн застаўся чакаць у будуары, смягнучы ад нецярпення, зусім натуральнага для палкага маладога чалавека, які ўжо два гады марыў аб сваёй каханай. У жыцці маладых людзей гэтыя перажыванні непаўторныя. У першай жанчыны, якой захапляецца мужчына, — жанчыны, сапраўды вартай кахання, такой, якую ён заўсёды бачыць у бліскучай аздобе, прадпісанай вышэйшым парыжскім грамадствам, — ніколі не будзе саперніц. Каханне ў Парыжы зусім не падобна на каханне ў правінцыі. Тут ні жанчын, ні мужчын не падманеш той паказной вітрынай, дзе кожны дзеля прыстойнасці вывешвае сцяг, распісаны пустымі фразамі аб уяўнай шчырасці сваіх гарачых пачуццяў. Тут жанчына павінна не толькі адказваць усім патрабаванням пачуццёвасці і душы, — яна добра ўсведамляе, што галоўны яе абавязак — прытрымлівацца мноства побытавых, часам недарэчных дробязяў, з якіх і складаецца жыццё. У парыжскім каханні столькі пахвальбы, пыхі, марнатраўства, нахабнасці і пустазвонства. Калі ўсе дамы пры

двары Людовіка Чатырнаццатага зайздросцілі мадэмуазель дэ Лавальер, калі гэты вялікі гасудар у парыве пачуцця забыўся, што кожная яго манжэта каштуе тысячу экю і разадраў іх абедзве, дапамагаючы з'яўленню на свет герцага дэ Вэрмандуа, — то чаго ж тады патрабаваць ад астатніх людзей? Спалучыце ў сабе багацце, маладосць, шляхетнасць, будзьце яшчэ больш удачлівым, калі можаце. Чым больш розных пахаў спаліце вы каля свайго куміра, тым добразычлівей ён будзе да вас, — вядома, калі вы маеце куміра. Каханне — гэта рэлігія, і яе культ, напэўна, абыходзіцца даражэй, чым усялякі іншы: каханне праходзіць хутка, але яно, нібы дваровы гарэза, спрабуе акрэсліць свой шлях разбурэннем. Багацце пачуццяў — гэта паэзія жыхароў гарышча: без такой раскошы ў што ператварылася б там каханне? Праўда, можна знайсці душы, непадлеглыя ўздзеянню парыжскіх драконаўскіх законаў, але мы сустракаем іх далёка ад мітуслівага свету, у тых людзях, якія не паддаліся ўладзе агульнапрынятых думак, жывуць недзе там, ля чыстай крыніцы, імклівай, але невычэрпнай, адданыя сваім зялёным шатам і, радасна слухаючы голас сусвету, які гучыць для іх ва ўсёй прыродзе і ў іх саміх, цярпліва чакаюць свайго ўзлёту, сумуючы па тых, хто прыкаваў сябе да зямлі. Эжэн, як і большасць юнакоў, што адчулі смак да славы, імкнуўся ступіць добра ўзброеным на арэну вышэйшага свету: ён заразіў яго гарачкай, мабыць, адчуўшы сябе дастаткова дужым, каб валадарыць над ім, але яшчэ не бачыў ні сродкаў ажыццяўлення, ні мэты для такой славы. Калі няма светлага і чыстага кахання, здольнага запоўніць жыццё, прага да ўлады можа стаць крыніцай добрых спраў, — варта толькі адмовіцца ад асабістых выгод, а паставіць мэтай веліч сваёй краіны. Але Расіньяк яшчэ не ўзняўся на тую вяршыню, з якой чалавеку лёгка ўбачыць і правільна вызначыць плынь жыцця. Ён пакуль яшчэ не мог скінуць з сябе зачараванне свежых, прыемных уяўленняў, якія быццам лістотай атуляюць юнацтва гадаванцаў правінцыі. Эжэн усё яшчэ не наважыўся перайсці парыжскі Рубікон[1]. Нягледзячы на прагу новых уражанняў, ён усё яшчэ не развітваўся з

[1] *Рубікон* — рачулка на поўначы Італіі, якую, паводле падання, перайшоў Юлій Цэзар, парушыўшы волю рымскага сената, і такім чынам пачаўшы грамадзянскую вайну. *Перайсці Рубікон* — азначае здзейсніць рашучы ўчынак, не дапускаючы ніякіх адступленняў.

патаемнай марай аб тым шчаслівым жыцці, якое вядзе на сваёй сядзібе сапраўдны дваранін. Аднак усе яго апошнія сумненні зніклі напярэдадні, калі ён апынуўся ў сваёй уласнай кватэры. Карыстаючыся матэрыяльнымі перавагамі багацця, як карыстаўся здавён перавагамі свайго паходжання, ён скінуў з сябе абалонку правінцыяла і паступова заняў становішча, з якога яму адкрываўся шлях да вялікай будучыні. І вось цяпер, чакаючы Дэльфіну, седзячы ў яе прыгожым будуары і адчуваючы сябе як дома, ён убачыў сябе такім далёкім ад былога Расціньяка, які прыехаў год назад у Парыж, што, разглядаючы самога сябе нейкім унутраным, духоўным позіркам, задаваў пытанне: «Ці падобны я цяпер сам на сябе?»

— Баранэса ў спальні, — паведаміла Тэрэза, з'явіўшыся так раптоўна, што ён схамянуўся.

Дэльфіна ляжала на канапцы ля каміна, бадзёрая і свежая. Убачыўшы гэтую жанчыну ў хвалях мусліну, яе нельга было не параўнаць з тымі прыгожымі індыйскімі раслінамі, дзе плод бывае акружаны пялёсткамі кветак.

— Ну, вось вы і прыйшлі! — пяшчотна сказала яна.

— Адгадайце, што я вам прынёс, — прамовіў Эжэн, сядаючы побач і цалуючы ёй руку.

Прачытаўшы запрашэнне, мадам дэ Нусінген весела страпянулася. Яна ўзняла на Эжэна вільготныя вочы і, абвіўшы яго шыю рукамі, прыціснула да сябе ў парыве нястрымнай радасці.

— Дык гэта ж вам (*табе*, — сказала яна яму на вуха, — але ў туалетным пакоі Тэрэза, таму будзем асцярожныя!), вам я абавязана сваім шчасцем. Так, я смела называю гэта шчасцем. Раз гэта дасягнута дзякуючы вам, то яно большае, чым перамога самалюбства. Ніхто не хацеў увесці мяне ў свецкае кола. У гэту хвіліну вы, мабыць, палічыце мяне дробязнай, пустой і легкадумнай парыжанкай, але памятайце, мой сябра, што я гатова ахвяраваць вам усім, і калі моцна, як ніколі, прагну трапіць у Сен-Жэрменскае прадмесце, дык толькі таму, што там бываеце і вы.

— Мадам дэ Басэан як быццам дае зразумець, што не разлічвае бачыць у сябе на балі барона дэ Нусінгена. Вам гэта не здаецца? — спытаўся Эжэн.

— Ну пэўна ж, — адказала баранэса, вяртаючы ліст Эжэну. — Такія жанчыны вельмі таленавіта умеюць быць няветлівымі. Але я ўсё адно паеду. Напэўна, там будзе і

мая сястра: я ведаю, яна шые сабе вельмі прыгожую сукенку. Эжэне, — ціха працягвала яна, — сястра едзе на гэты баль, каб развеяць жудасныя падазрэнні. Вы хіба не ведаеце, якія чуткі ходзяць пра яе? Барон завітаў да мяне сёння раніцай, каб расказаць, што аб ёй без сораму гаварылі ў клубе. Божа мой! Ад чаго залежыць гонар жанчыны і сям'і! Я адчувала, што крыўдзяць не толькі сястру, але і мяне праз яе. Па словах некаторых асоб, спадар дэ Трай выдаў вэксаляў на суму да ста тысяч франкаў, амаль усе яны пратэрмінаваныя, і цяпер вось-вось ён павінен трапіць пад суд. Бачачы яго нявыкрутку, сястра прадала нейкаму габрэю свае цудоўныя брыльянты. Вы, напэўна, бачылі іх на ёй, яна атрымала іх у спадчыну ад маці графа дэ Рэсто. Адным словам, вось ужо два дні толькі і размовы, што пра гэта. Зараз я разумею, для чаго Анастазі заказала сабе сукенку, шытую бліскаўкамі. Яна хоча прыцягнуць да сябе ўвагу на балі ў спадарыні дэ Басэан, з'явіўшыся ва ўсім бляску і ў гэтых брыльянтах. Але я не хачу саступіць ёй. Яна заўсёды старалася зацьміць і дрэнна ставілася да мяне, хоць я шмат рабіла дзеля яе і заўсёды пазычала ёй грошы, калі іх у яе не ставала. Але давайце кінем гэтыя свецкія тэмы, — сёння я хачу аддацца поўнаму шчасцю.

Калі ў гадзіну ночы Расціньяк абсыпаў мадам дэ Нусінген развітальнымі пацалункамі, якія абяцалі нямала радасцей і ў будучым, яна сумна прамовіла:

— Я нясмелая, я прымхлівая, называйце як хочаце мае прадчуванні, але я заміраю ад страху: як бы мне не паплаціцца за сваё шчасце страшэннай катастрофай.

— Дзіця? — выдыхнуў Эжэн.

— Гэта я сёння дзіця, — смеючыся, адказала яна.

Эжэн вярнуўся ў «Дом Ваке» з цвёрдым намерам пакінуць яго заўтра. Дарогаю ён аддаваўся тым чароўным марам, якімі бываюць ахоплены маладыя людзі, калі яшчэ захоўваюць на сваіх вуснах водар шчасця.

— Ну як? — запытаўся бацька Гар'ё, калі Эжэн праходзіў побач з яго пакоем.

— Заўтра я ўсё вам раскажу, — адказаў Расціньяк.

— Усё? Праўда? — усклікнуў стары. — Кладзіцеся спаць. Заўтра пачнецца наша шчаслівае жыццё.

На другі дзень Расціньяк і Гар'ё намерыліся пакінуць сямейны пансіён і толькі чакалі, калі прыйдзе насільшчык, калі раптам а дванаццатай гадзіне па вуліцы Нёў-Сент-Жэнеўеў прагрукацеў экіпаж і спыніўся ля

варот «Дома Ваке». З уласнай карэты выйшла мадам дэ Нусінген і спытала, ці тут яшчэ яе бацька. Атрымаўшы ад Сільвіі станоўчы адказ, яна спрытна ўзбегла па прыступках. Эжэн быў у сваім пакоі, але аб гэтым яго сусед не ведаў. У час снедання Эжэн папрасіў Гар'ё захапіць і яго рэчы і дамовіўся сустрэцца з ім а чацвёртай гадзіне на вуліцы д'Артуа. Але пакуль стары шукаў насільшчыкаў, Эжэн, збегаўшы ў Школу правазнаўства на паверку, вярнуўся, нікім не заўважаны, дадому, каб расплаціцца са спадарыняй Ваке перш за Гар'ё, які ў парыве фанатычнай любві мог заплаціць за юнака са сваёй кішэні. Гаспадыня выйшла з дому. Эжэн зазірнуў да сябе наверх — ці не забыўся ён штосьці, — і пахваліў сябе за гэтую думку, бо заўважыў у шуфлядцы свой бестэрміновы вэксаль, выдадзены Ватрэну, які валяўся тут з моманту скасавання. Печка не палілася, і ён ужо сабраўся разарваць вэксаль на дробныя кавалачкі, але, пачуўшы голас Дэльфіны, устрымаўся ад гэтага, вырашыў не рабіць ніякага шуму і прыслухаўся, спадзеючыся, што ў Дэльфіны не можа быць ад яго тайнаў. З першых жа слоў размова паміж бацькам і дачкой аказалася такой цікавай, што Расціньяк працягваў слухаць.

— Ах, татка, — сказала Дэльфіна бацьку, — дзякуй богу, што вам своечасова прыйшло ў галаву патрабаваць справаздачу аб маім матэрыяльным стане, пакуль мяне яшчэ не разарылі. Тут можна размаўляць?

— Зразумела, дома нікога няма, — адказаў бацька Гар'ё спалоханым голасам.

— Што з вамі, татка? — занепакоілася мадам дэ Нусінген.

— Ты як абухом ударыла мяне па галаве, — адказаў стары. — Хай бог цябе бароніць, дзіцятка! Ты не ведаеш, як я цябе люблю. Каб ведала, то не гаварыла б мне такога нечакана, асабліва калі непапраўнага нічога яшчэ не здарылася. Чаму ты паспяшалася прыехаць да мяне, не дачакаўшыся? Мы ж праз некалькі хвілін адпраўляемся на вуліцу д'Артуа.

— Ах, татачка, хіба ў хвіліну катастрофы авалодаеш сабою? Я сама не ведаю, што раблю. Ваш павераны папярэдзіў нас, што справа найхутчэй скончыцца банкруцтвам. Зараз так спатрэбіцца ваш шматгадовы вопыт, набыты ў камерцыі. Таму я не вытрымала і прыехала за вамі. Калі месье Дэрвіль убачыў, што Нусінген усялякімі хітрыкамі чыніць яму перашкоды, ён прыгразіў трыбу-

налам і заявіў, што пастанову старшыні суда атрымаць нядоўга. Сёння раніцай Нусінген зайшоў да мяне і спытаўся, ці не хачу я, каб і ён, і я былі даведзены да галечы. Я адказала, што нічога не разумею ва ўсіх гэтых справах, што ў мяне ёсць багацце, што я павінна ўступіць у валоданне ім і што разбірацца ва ўсёй гэтай блытаніне даручана майму паверанаму. Вы так раілі адказваць?

— Правільна, — адказаў бацька Гар'ё.

— Тады Нусінген растлумачыў мне, у чым справа. Аказваецца, ён уклаў усе сродкі, свае і мае, у толькі што заснаваныя прадпрыемствы і дзеля гэтага спатрэбілася размясціць суму за мяжой. Калі я прымушу яго вярнуць пасаг, яму прыйдзецца абвясціць сябе банкрутам, калі ж я пагаджуся год пачакаць, ён клянецца гонарам, што падвоіць або нават патроіць мой пасаг, уклаўшы грошы ў зямельныя аперацыі, а потым я буду поўнай гаспадыняй сваёй маёмасці. Дарагі татачка, ён гаварыў праўду і вельмі напужаў мяне гэтым. Нусінген маліў, каб я прабачыла яму за яго паводзіны, даў мне поўную свабоду, дазволіў паводзіць сябе так, як мне выгадна, пры ўмове, што я дам яму неабмежаванае права весці справы ад майго імя. У доказ сваёй сумленнасці ён абяцаў мне выклікаць Дэрвіля кожны раз, калі я захачу, — каб праверыць, наколькі правільна Нусінген склаў тыя паперы, на падставе якіх ён будзе перадаваць мне маю ўласнасць. Карацей кажучы, ён здаўся мне ў палон, звязаўшы сябе па руках і нагах. Ён прасіў, каб я яшчэ два гады вяла дом, і маліў мяне не выдаткоўваць на сябе больш таго, што ён вызначыў. Ён даказваў мне, што яму не застаецца нічога іншага, як захоўваць выгляд знешняга дабрабыту, што ён расстаўся са сваёю танцоркаю і будзе вымушаны трымацца самай строгай, але і самай тайнай эканоміі сродкаў, каб дачакацца сканчэння пачатых ім аперацый, не падрываючы свайго крэдыту. Я лаяла яго, я не хацела яму верыць, намагаючыся прыперці яго да сцяны і даведацца больш. Ён паказаў мне свае ўліковыя кнігі і расплакаўся. Я ніколі яшчэ не бачыла мужчыну ў такім стане. Ён быў у роспачы, гаварыў пра самазабойства, проста трызніў. Мне стала вельмі шкада яго.

— І ты паверыла таму, што ён табе нагаварыў! — усклікнуў бацька Гар'ё. — Гэта ж фігляр! Мне даводзілася мець справу з немцамі: амаль усе яны былі людзьмі шчырымі, добрасумленнымі, але калі ўжо яны, прыкрываючыся гэтым, пачынаюць хітрыць, то пераўзыдуць

усіх. Твой муж дурыць цябе. Яго прыціснулі, вось ён і прыкідваецца, што яму так цяжка. Ён збіраецца гаспадарыць ад твайго імя яшчэ вальней, чым ад свайго, і выкарыстае гэта становішча, каб адкруціцца на выпадак няўдачы ў сваіх справах. Хітры і вераломны мярзотнік. Не, не, я не збіраюся адпраўляцца на могілкі Пэр-Лашэз, пакінуўшы дачок жабрачкамі. Я нешта кемлю ў гэтых справах! Ён, бач ты, уклаў свае сродкі ў прадпрыемствы, — што ж, выдатна! У такім разе трэба, каб яго ўдзел быў адлюстраваны ў каштоўных паперах, распісках, дамовах! Няхай пакажа іх і разлічыцца з табой. Мы возьмем найбольш выгодныя справы і паспытаем шчасця. У нас будзе зацверджаная законам фірма на наша імя: *Дэльфіна Гар'ё, якая знаходзіцца ў маёмасным падзеле са сваім мужам баронам дэ Нусінгенам.* Ці ён лічыць нас за дурняў? Няўжо ён думае, быццам я магу пражыць хоць два дні, ведаючы аб тым, што ты застанешся без маёмасці, без кавалка хлеба? Ды я аднаго дня, адной ночы, нават двух гадзін не пражыву! Калі б гэта думка пацвердзілася, я б памёр! Вось яшчэ! Я сорак гадоў працаваў, цягаў на сабе мяхі, заліваўся потам, усё жыццё цярпеў нягоды дзеля вас, і толькі вы, мае анёлы, рабілі для мяне лёгкімі любую ношу, любую працу. А цяпер маё жыццё, маё багацце пойдзе дымам! Я проста сканаю ад злосці. Клянуся ўсім святым на небе й на зямлі, мы выведзем на чыстую ваду гэтага прайдзісвета, праверым усе кнігі, касу, справы! Я не буду спаць, не буду есці, пакуль мне не дакажуць, што маёмасць цэлая! Дзякуй богу, у вас раздзельнае валоданне маёмасцю і дзякуй богу, што павераны ў цябе чалавек сумленны — сам Дэрвіль. Бог літасцівы! Ты выратуеш свой мільёнчык, свае пяцьдзесят тысяч гадавога даходу да канца дзён сваіх, ці я нараблю ў Парыжы такога гоману, што ўсе ахнуць! Калі нам адмовяць у трыбуналах, я звярнуся ў Палату. Толькі б ведаць, што ўсё ў цябе добра і спакойна з грашыма: адно гэта ўсведамленне аблягчала мае ўсе няшчасці, суцішвала мой смутак. Грошы — гэта жыццё. Грошы — усё. А што да казак гэтага эльзаскага цурбана... Дэльфіна, прашу цябе, маё дзіцятка, не саступай ні на шэлег гэтаму тлустаму вепруку, які пасадзіў цябе на ланцуг і зрабіў няшчаснай. Калі ты яму патрэбна, мы моцна скруцім яго, будзе яму навука. Божа мой! Галава мая палае, нешта пячэ там, у сярэдзіне чэрапа. Мая Дэльфіна на саломе! Ты! Мая Фіфіна! Немагчыма ўявіць! Дзе мае пальчаткі?

Паедзем, я хачу паглядзець зараз жа ўсё: кнігі, наяўнасць, карэспандэнцыю, справы. Я не супакоюся, пакуль мне не дакажуць, што твая маёмасць не падвяргаецца небяспецы. Мне трэба ўсё пабачыць на свае вочы.

— Дарагі татачка, дзейнічайце асцярожна! Калі ў гэтай справе хоць трохі запахне помстай, калі вы пакажаце занадта варожыя намеры, я загіну. Ён вас ведае і лічыць зусім натуральным, што, па вашых парадах, я турбуюся за лёс майго пасагу, але, клянуся вам, ён у яго руках і ён вырашыў не выпускаць яго. Гэты чалавек здольны ўцячы з усімі капіталамі і пакінуць нас ні з чым! Ён добра ведае, што я не буду праследаваць яго і ганьбіць імя, якое нашу сама. Ён слабы і ў той жа час моцны. Я ўсё абдумала. Калі мы прыціснем яго да сцяны, ён мяне спустошыць.

— Дык, значыць, ён круцель?

— Але, тата, так яно і ёсць, — пацвердзіла Дэльфіна, з плачам падаючы ў фатэль. — Мне не хацелася прызнавацца ў тым, каб вы не засмучаліся, што выдалі мяне замуж за такога чалавека! Яго закулісныя гульні, яго сумленне, яго душа і цела — поўнасцю разбэшчаныя! Гэта жахліва! Я проста ненавіджу гэтага чалавека! Пасля таго што ён сказаў, як я магу паважаць гэтага нягодніка! Чалавек, здольны займацца тымі фінансавымі махінацыямі, аб якіх ён мне расказаў, пазбаўлены апошняй кроплі сумлення, і ўсе мае жахі заснаваны на тым, што я ўбачыла ў яго душы. Ён, мой муж, прапанаваў мне поўную свабоду, але я ведаю, што гэта азначае, — гэта з умовай, што ў выпадку правалу прадпрыемстваў, я згаджуся стаць зброяй у яго руках, гэта значыць, калі я згаджуся быць падстаўной асобай.

— Але ж на гэта існуюць законы! Для такіх зяцёў ёсць Грэўская плошча[1]! — усклікнуў бацька Гар'ё. — Калі не знойдзецца ка́та, я сам адсяку яму галаву на гільяціне.

— Не, тата, на яго няма ўправы. Слухайце, што хацеў сказаць Нусінген, калі ачысціць яго мову ад усялякіх акалічнасцей, якімі ён напускаў туман, і перадаць у некалькіх словах: «Або ўсё загіне і вы застанецеся без нічога, або вы дазволіце мне давесці справу да канца і будзеце маёй саўдзельніцай у гэтым». Вы разумееце? Пакуль што ён шануе мяне, мая жаночая сумленнасць служыць яму зарукай: ён ведае, што я не прысвою яго

[1] На Грэўскай плошчы праводзілі смяротныя прысуды.

маёмасць і задаволюся сваёй. Я вымушана даць згоду на гэта несумленнае, махлярскае супрацоўніцтва, інакш мне пагражае жабрацтва. Ён купляе маё сумленне і плаціць за яго, дазваляючы мне быць, не саромеючыся, жонкай Эжэна: «Я дазваляю табе рабіць грахі, дазволь і мне рабіць злачынствы, спусташаючы бедных!» Хіба вам не ўсё ясна? А ведаеце, што ён называе сваімі справамі? Ён купляе на сваё імя незанятыя кавалкі зямлі, затым даручае падстаўным асобам будаваць на іх дамы. Гэтыя людзі аддаюць падрады на будаўніцтва любым падрадчыкам і выплочваюць ім доўгатэрміновым вэксалем, а потым за невялікую суму выдаюць майму мужу распіску, што атрымалі ад яго грошы за пабудовы: тады ўладальнікам гэтых дамоў аказваецца Нусінген, а падстаўныя асобы пакідаюць падрадчыкаў у дурнях, абвясціўшы сябе банкрутамі. Фірма гандлёвага дома Нусінген служыць для таго, каб напусціць туману ў вочы няшчасным будаўнікам. Усё гэта я зразумела. Зразумела й іншае: на той выпадак, калі трэба будзе даказаць, што ў Нусінгена былі вялізныя плацяжы, ён перавёў грошы ў Амстэрдам, Неапаль, Лондан, Вену. Ці маглі б мы цяпер накласці на іх арышт?

Эжэн пачуў, як бацька Гар'ё, глуха грукнуўшы аб падлогу, укленчыў перад дачкой.

— Божа! За што караеш мяне? Мая дачка ў руках мярзотніка, і ён будзе патрабаваць ад яе ўсё, што захоча! Дачушка, даруй мне! — усклікнуў стары.

— Сапраўды, калі я трапіла ў бездань, дык у гэтым ёсць, мусіць, і ваша віна, татка, — прамовіла Дэльфіна. — Калі мы выходзім замуж, мы яшчэ такія неразумныя. Ці ж мы разумеем, што такое свет, справы, мужчыны, норавы? За нас павінны думаць бацькі. Дарагі тата, даруйце мне за мае словы, я вас не папракаю. У гэтым выпадку ўся віна ляжыць на мне. Тата, не трэба плакаць, — сказала яна, цалуючы яго ў лоб.

— Не плач і ты, мілая мая Дэльфіна. Дай я пацалую твае вочкі і асушу твае слёзкі. Вось што! Зараз я давяду да ладу сваю галаву і разблытаю клубок, які накруціў у справах твой муж.

— Не-не! Дазвольце дзейнічаць мне самой: я змагу кіраваць маім мужам па-свойму. Ён любіць мяне, што ж, выдатна! Я скарыстаю сваю ўладу над ім і хутка даб'юся таго, што частку капіталаў ён укладзе для мяне ў зямельную ўласнасць. Магчыма, што мне ўдасца прымусіць яго

выкупіць на маё імя былы эльзаскі фальварак Нусінгенаў, ён вельмі даражыць ім. Але заўтра я прашу вас зайсці, каб разабрацца ў яго справах і кнігах, таму што Дэрвіль мала што разумее ў гандлёвых абарачэннях... Не, заўтра лепш не прыходзьце. Не буду псаваць сабе настрой напярэдадні балю ў мадам дэ Басэан. Хочацца з'явіцца туды прыгожай, свежай, каб любы мой Эжэн мог мною ганарыцца! Пойдзем паглядзім яго пакой.

У гэты момант на вуліцы Нёў-Сент-Жэнеўеў спынілася карэта, і на лесвіцы пачуўся голас графіні дэ Рэсто, якая запытала ў Сільвіі:

— Бацька мой дома?

Гэтая акалічнасць выратавала Эжэна, бо ён ужо хацеў легчы на ложак ды прыкінуцца, што спіць.

— Ах, тата, вам нічога не казалі пра Анастазі? — спытала Дэльфіна, пазнаўшы голас сястры. — Здаецца, у яе сямейным жыцці таксама здарылася нешта нядобрае.

— Як гэта? — усклікнуў бацька Гар'ё. — Тады мне канец: бедная мая галава не вытрымае дзвюх бед.

— Добры дзень, тата, — сказала, уваходзячы, графіня. — А-а, Дэльфіна, і ты тут?

Сустрэча з сястрою, відаць, засмуціла графіню дэ Рэсто.

— Дзень добры, Назі, — адказала ёй баранэса. — Мая прысутнасць тут здаецца табе незвычайнай? Мы бачымся з татам штодня.

— З якога гэта часу?

— Калі б ты заходзіла сюды, то ведала б.

— Не чапляйся да мяне, Дэльфіна, — з плачам сказала графіня, — я такая няшчасная! Бедны тата, я прапала!.. І на гэты раз прапала канчаткова.

— Што з табою, Назі? — усклікнуў бацька Гар'ё. — Раскажы нам усё, дачушка. Бачыш, як яна збялела. Дэльфіна, дапамажы ёй, будзь лагоднай з ёю, прашу цябе! Я буду любіць цябе яшчэ больш, калі гэта магчыма!

— Бедная Назі! — пашкадавала сястру мадам дэ Нусінген, усаджваючы яе на крэсла. — Памятай, што толькі мы з татам будзем цябе любіць заўсёды, усё прабачым. Сямейныя пачуцці — самыя надзейныя.

Яна дала сястры панюхаць нюхальнай солі, і графіня акрыяла.

— Я памру ад усяго гэтага! — прамовіў з горыччу бацька Гар'ё. — Падыдзіце бліжэй да мяне, — сказаў ён

дочкам, перамешваючы ў печцы палаючы торф. — Нешта мне холадна. Расказвай, Назі, што з табою здарылася? Хутчэй кажы, ты загоніш мяне ў труну...

— Справа ў тым, што мой муж даведаўся пра ўсё, — сказала няшчасная жанчына. — Памятаеце, тата, той Максімаў вэксаль? Дык ён быў не першы. Я шмат іх аплаціла. Але ў пачатку студзеня мне здалося, што ў графа дэ Трая здарылася нейкае вялікае гора. Мне ён нічога не казаў, але няцяжка чытаць у душах блізкіх людзей: дастаткова аднаго намёку, ды яшчэ дадайце прадчуванні. Ён стаў такім пяшчотным, якім я ніколі яго не бачыла, і я адчула сябе яшчэ больш шчаслівай. Бедны Максім! Потым ён сказаў мне, што ў думках развітваўся са мною, надумаўшы скончыць жыццё самагубствам. Я так выпытвала ў яго, так прасіла на каленях перад ім на працягу дзвюх гадзін, і ў рэшце рэшт ён прызнаўся, што павінен сто тысяч франкаў. Тата! Сто тысяч! Я ледзь не звар'яцела. З вас я ўсё высмактала раней, вы нічога не мелі...

— Так, я не змог бы дастаць іх, — адказаў роспачна бацька Гар'ё, — хіба што ўкраў бы. Але я пайшоў бы і на гэта. І пайду!

Гэтыя словы, прамоўленыя жаласліва і слаба, як перадсмяротны хрып, выказалі такую агонію бацькоўскага пачуцця, даведзенага да бяссілля, што абедзве дачкі змоўклі. Ды й які эгаіст мог бы застацца абыякавым да гэтага крыку душы, што засведчыў усю глыбіню адчаю, як кінуты ў прорву камень дае ўяўленне аб яе глыбіні.

— Тата, я знайшла грошы, выкарыстаўшы тое, што не было маім, — сказала графіня, абліваючыся слязамі.

Дэльфіна расчулілася і заплакала таксама, прытуліўшы галаву да пляча сястры.

— Дык гэта праўда! — усклікнула яна.

Анастазі апусціла галаву. Дэльфіна абняла сястру і, прыціснуўшы да грудзей, пацалавала.

— Тут ты заўсёды знойдзеш не асуджэнне, а любоў, — дадала яна.

— Анёлачкі вы мае, — слабым голасам звярнуўся да іх Гар'ё, — чаму спатрэбілася бяда, каб паяднаць вас? Чаму гэта так?

— Дзеля выратавання жыцця Максіма, а разам з ім і майго шчасця, — працягвала графіня, падбадзёраная праявамі спагадлівай пяшчоты блізкіх, — я адправілася да аднаго ліхвяра — ды вы ўсе ведаеце гэтага бязлітаснага

Габсэка! І я прадала яму фамільныя дыяменты, якімі так даражыць граф дэ Рэсто, а таксама ўсе свае! Прадала! Вы разумееце? Максім выратаваны! Але я загінула. Рэсто пра ўсё даведаўся.

— Як гэта? Хто цябе выдаў? Я заб'ю яго! — крыкнуў бацька Гар'ё.

— Учора муж паклікаў мяне да сябе. Я пайшла... «Анастазі, — прамовіў ён такім тонам... (О, дастаткова было гэтага тону, каб я ўсё зразумела!) — Дзе вашы дыяменты?» — «У мяне». — «Не, — адказаў ён, гледзячы на мяне, — яны тут, на камодзе». — І ён паказаў мне на футарал, прыкрыты насоўкай. — «Вы ведаеце, адкуль яны тут?» — запытаў ён. Я ўкленчыла перад ім... Я плакала, я пыталася, якой смерцю мне належыць памерці.

— Ты так сказала? — усклікнуў бацька Гар'ё. — Клянуся святым імем божым, што той, хто ўчыніць вам зло, табе або ёй, пакуль я жывы, можа быць упэўнены, што я спалю яго на павольным агні! Я разарву яго на часткі, як...

Словы яго захраслі ў горле.

— Скончылася тым, даражэнькая, што ён запатрабаваў ад мяне горшага, чым смерць... Не дай, божа, ніводнай жанчыне пачуць тое, што пачула я!

— Я заб'ю гэтага чалавека, — спакойна прамовіў бацька Гар'ё. — Але ў яго адно жыццё, а мне ён павінен аддаць два. Што было далей? Расказвай! — пытаўся ён, гледзячы на Анастазі.

— А далей, — працягвала графіня крыху памаўчаўшы, — ён паглядзеў на мяне і сказаў: «Анастазі, я ўтаю ўсё, як у магіле, і мы застанемся жыць разам: у нас ёсць дзеці. Я не буду выклікаць спадара дэ Трая на дуэль: я магу й прамахнуцца. А калі адчапіцца ад яго іншым шляхам, то можна сутыкнуцца з правасуддзем. Забіць яго ў вашых абдымках — гэта зганьбіць *дзяцей*. А я не хачу ні гібелі вашых дзяцей, ні гібелі іх бацькі, ні сваёй уласнай. Таму я стаўлю вам дзве ўмовы. Адказвайце: у вас ёсць дзіця ад мяне?» — «Але», — адказала я. «Каторае?» — спытаў ён. «Старэйшы сын Эрнэст». — «Добра, — сказаў ён. — Цяпер кляніцеся падпарадкавацца майму патрабаванню». Я паклялася. «Вы падпішаце мне запродажную на вашу маёмасць, калі я гэтага запатрабую».

— Не падпісвай! — крыкнуў бацька Гар'ё. — Ні ў якім разе! Так, так, спадар дэ Рэсто, вы не ў стане даць шчасце

вашай жонцы, і яна шукае яго там, дзе яно магчымае, а вы караеце яе за вашу мужчынскую слабасць?.. Беражыся! Я тут! Не хвалюйся, Назі, я стану яму ўпоперак дарогі. Ага! Яму падабаецца наследнік! Добра, добра! Я забяру яго да сябе, ён жа мне ўнук! Хіба я не маю права забраць хлопчыка? Супакойся, я забяру яго да сябе ў вёску, буду клапаціцца аб ім. Я прымушу гэтую пачвару скарыцца, я скажу яму: «Пабачым, хто каго! Хочаш вярнуць сабе сына, вярні маёй дачцэ яе маёмасць і дазволь ёй жыць, як яна пажадае».

— Тата!

— Так, я твой бацька! О, я сапраўдны бацька. Няхай гэты нягоднік вяльможа не прыгнятае маю дачку. Халера! Я не ведаю, што цячэ ў маіх жылах. Можа, кроў тыгра, бо мне хочацца разарваць вашых мужоў. Дзеткі мае! Дык вось як вы жывяце! Мне ваша жыццё — як нож у сэрца... Што з вамі будзе, калі мяне не стане? Бацькі павінны жыць, пакуль жывуць іх дзеці. О, божа, як недасканала ты наладзіў свет! А яшчэ кажуць, што ў цябе ёсць сын. Табе ж належала пазбавіць нас ад пакут нашых дзяцей. Мілыя мае анёлачкі, што тут казаць! Я бачу вас ля сябе, толькі дзякуючы вашым бедам. Ад вас я не бачу нічога, акрамя вашых слёз. Ну што ж! Але, але, я ведаю, што вы мяне любіце. Прыходзьце, прыходзьце паскардзіцца да бацькі. Маё сэрца вялікае — усё змесціць. Вы можаце рваць яго на часткі, кожны кавалак зноў ператворыцца ў бацькоўскае сэрца. Я хацеў бы ўзяць на сябе ўсе вашы цяжкасці, пакутаваць замест вас. А якія вы былі шчаслівыя, калі былі маленькія...

— Толькі ў тую пару нам і было добра, — заўважыла Дэльфіна. — Куды падзеўся той час, калі мы гулялі ў вялікім свірне і скочваліся ўніз з гары мяхоў?!

— Тата, гэта яшчэ не ўсё, — сказала графіня на вуха бацьку. Гар'ё ажно падскочыў. — За дыяменты мне не далі сто тысяч. Максіма ўсё яшчэ выклікаюць у суд. Нам яшчэ трэба даплаціць дванаццаць тысяч франкаў. Ён абяцаў мне, што паразумнее і кіне азартныя гульні. У мяне нічога больш не засталося, акрамя яго любові, я дужа дорага за яе заплаціла, калі яна знікне, я памру. Я ахвяравала дзеля яго ўсім: гонарам, багаццем, спакоем, дзецьмі. О, вярніце хоць яму аднаму волю, сумленнае імя, каб ён мог застацца ў грамадстве, дзе зможа стварыць сабе кар'еру. Цяпер ён вінен мне не толькі за ўласнае шчасце, у нас з ім ёсць дзеці, і яны застануцца без сродкаў

існавання. Усё загіне, калі яго пасадзяць у Сент-Пелажы[1].

— У мяне няма грошай, Назі. Больш нічога няма, нічога! Гэта канец свету. Так, свет хутка згіне — інакш быць не можа! Ідзіце ж, ратуйцеся, пакуль яшчэ ёсць час! Та-ак! Засталіся ў мяне яшчэ сярэбраныя спражкі, шэсць сталовых прыбораў, тыя самыя, што я купіў упершыню ў жыцці! І што яшчэ?.. Толькі пажыццёвая рэнта ў тысячу дзвесце франкаў.

— А што вы зрабілі з вашай бестэрміновай рэнтай?

— Я прадаў яе, а сабе пакінуў на свае патрэбы толькі гэты маленькі прыбытак. Мне спатрэбілася дванаццаць тысяч, каб абсталяваць кватэру для Фіфіны.

— Сапраўды, Дэльфіна? У тваім доме? — спытала мадам дэ Рэсто ў сваёй сястры.

— Якая розніца, дзе? Дванаццаць тысяч франкаў ужо страчаны, — запярэчыў бацька Гар'ё.

— Здагадваюся, — заўважыла графіня. — Для месье Расціньяка! Няшчасная Дэльфіна, спыніся! Няўжо ты не бачыш, да чаго я дакацілася?

— Даражэнькая мая, месье Расціньяк не з тых маладых людзей, якія даводзяць да галечы сваіх палюбоўніц.

— Дзякуй, Дэльфіна, у маім цяжкім становішчы я чакала ад цябе лепшага. Але ты ніколі мяне не любіла.

— Няпраўда, Назі, яна цябе любіць! — усклікнуў бацька Гар'ё. — І толькі што сказала мне аб гэтым. Мы гаварылі пра цябе, і яна паўтарала, што ты прыгажуня, а яна нішто сабе.

— У яе бяздушная прыгажосць, — заўважыла графіня.

— Хоць бы і так, — запярэчыла Дэльфіна, ружавеючы. — А як ты ставілася да мяне? Ты адраклася ад мяне, намагалася зачыніць перада мной дзверы ўсіх дамоў, куды хацелася мне трапіць, ты ўвогуле не прапускала ніводнай нагоды, каб учыніць мне непрыемнасць. Хіба я прыходзіла сюды, як ты, толькі дзеля таго каб выцягнуць з бацькі тысячу за тысячай усе яго грошы? Хіба я давяла яго да такога стану? Гэта справа тваіх рук, сястрыца! Я бачылася з бацькам, калі толькі магла, не выганяла яго са свайго дома, не прыходзіла лізаць яму рукі, калі ён быў патрэбны. Я нават не ведала, што гэтыя дванаццаць тысяч франкаў ён патраціў на мяне: як табе

---

[1] Парыжская турма.

вядома, я люблю парадак у грашовых справах. А калі тата і рабіў мне час ад часу падарункі, то я іх не выпрошвала.

— Табе больш пашчасціла, чым мне: месье дэ Марсэ багаты, і што-кольвечы табе вядома пра гэта. Ты заўсёды была халодная, як нікчэмнае золата. Бывайце, няма ў мяне ні сястры, ні...

— Замаўчы, Назі! — крыкнуў бацька Гар'ё.

— Толькі такая сястра, як ты, можа паўтараць тое, у што ніхто не верыць. Ты маральны выродак, — адказала Дэльфіна.

— Дзеткі мае, дзетачкі, замаўчыце, інакш я тут жа, пры вас, загублю сябе.

— Слухай, Назі, я табе прабачаю, паколькі ты сапраўды няшчасная, — працягвала Дэльфіна. — Але я лепшая за цябе. Сказаць мне тое, што ты сказала, ды яшчэ ў тую хвіліну, калі я была гатова на ўсё, каб табе дапамагчы, нават пайсці ў спальню да майго мужа, чаго я не зрабіла б ні дзеля самой сябе, ні дзеля... гэта варты працяг тых непрыемнасцей, якія ты мне нарабіла за апошнія дзевяць год.

— Дзеці мае, дзетачкі, абдыміцеся! — упрошваў бацька. — Вы абедзве — анёлы.

— Не чапайце мяне! — крыкнула графіня, калі бацька ўзяў яе за руку, і вывернулася з яго абдымкаў. — Мой муж шкадуе мяне больш, чым сястра. Можна падумаць, што яна — сама дабрадзейнасць!

— Няхай пляткараць, што мяне ўтрымліваў месье дэ Марсэ: па-мойму, гэта лепш, чым прызнацца, што месье дэ Трай каштуе табе больш за сто тысяч, — адказала мадам дэ Нусінген.

— Дэльфіна! — закрычала графіня, падступаючы да сястры.

— Я кажу табе праўду, а ты паклёпнічаеш на мяне, — халодна адказала баранэса.

— Дэльфіна, ты...

Бацька Гар'ё кінуўся да графіні і не даў ёй дагаварыць, закрыўшы яе рот рукою.

— Божа мой, за што вы сёння хапаліся рукамі? — усклікнула Анастазі.

— Ах, выбачай, калі ласка, — засаромеўся няшчасны бацька, выціраючы рукі аб панталоны. — Я зараз перайздж аю і не чакаў вашага прыходу. — Ён быў задаволены, што гэтым папрокам адцягнуў на сябе гнеў дачкі. —

Ох-хо-хо! Вы раздзіраеце маё сэрца, — працягваў ён, апускаючыся ў крэсла. — Дзеткі мае, я паміраю! У галаве пячэ, як агнём. Ну, паслухайце бацьку: будзьце добразычлівыя, любіце адна адну! Вы загоніце мяне ў магілу. Назі, Дэльфіна, вы абедзве і маеце рацыю, і абедзве памыляецеся. Паслухай, Дэдэль, — гаварыў ён, узняўшы на баранэсу поўныя слёз вочы, — ёй патрэбны дванаццаць тысяч, давай пашукаем іх. Не трэба так сварыцца між сабою.

Ён стаў на калені перад Дэльфінай.

— Даражэнькая, папрасі ў яе прабачэння дзеля мяне, — шапнуў ён ёй на вуха, — яна ж больш няшчасная, чым ты, праўда ж?

— Бедная мая Назі, — сказала ёй Дэльфіна, спужаўшыся дзікага, вар'яцкага ад душэўнага болю выразу на бацькавым твары, — я памылялася, пацалуй мяне, калі ласка...

— О-о! Вы паліваеце гаючым бальзамам маё сэрца! — усклікнуў бацька Гар'ё. — Але дзе нам узяць дванаццаць тысяч франкаў? Хіба пайсці за каго-небудзь у рэкруты?

— Што вы, тата! Ніколі! — у адзін голас крыкнулі дочкі, падыходзячы да бацькі.

— Бог узнагародзіць вас толькі за адно гэта памкненне, усяго нашага жыцця не хопіць, каб аддзячыць вам! Праўда, Назі? — спытала Дэльфіна.

— Акрамя таго, дарагі тата, гэта была б кропля ў моры, — заўважыла графіня.

— Дык, значыць, і крывёю сваёю нельга дапамагчы? — з адчаем усклікнуў стары. — Я буду рабом у таго, хто выратуе цябе, Назі! Дзеля гэтага я пайду на забойства. Пайду на катаргу, як Ватрэн! Ды я... — Ён раптам змоўк, быццам ад удару перуна. — О, не, немагчыма! — прамовіў ён, ірвануўшы на сабе валасы. — Калі б ведаць, дзе можна ўкрасці... Толькі нялёгка знайсці такую нагоду. Каб абрабаваць банк, патрэбны людзі, час. Мабыць, настаў час мне паміраць: нічога іншага не застаецца. Я больш ні на што не варты, я больш не бацька! Не! Яна просіць, яе трэба выручаць! А ў мяне, лайдака, нічога няма! Ах ты, стары ліхадзей, у цябе дзве дачкі, а ты зрабіў сабе пажыццёвую рэнту! Дык, значыць, ты іх не любіш? Здыхай жа, стары, здыхай, як сабака! Ды я горшы за сабаку, сабака паводзіў бы сябе лепей! Ах, мая галава! У ёй усё кіпіць!

— Тата, будзьце разумным! — закрычалі абедзве жанчыны ў адзін голас, абступаючы бацьку, каб ён не ўздумаў біцца галавою аб сцяну.

Гар'ё рыдаў. Эжэн, ахоплены жахам, схапіў свой вэксаль, выдадзены Ватрэну, са штэмпелем на вялікую суму, перапраўіў лічбы, аформіў як вэксаль на дванаццаць тысяч *загаду Гар'ё* і рашуча ўвайшоў у пакой суседа.

— Мадам, вось патрэбныя вам грошы, — сказаў ён графіні, падаючы ёй вэксаль. — Я спаў, ваша размова разбудзіла мяне. Дзякуючы гэтаму я даведаўся, колькі я павінен месье Гар'ё. Вось вэксаль, які вы можаце ўлічыць, я аплачу яго ў тэрмін.

Графіня нерухома стаяла, трымаючы ў руках гербавую паперу.

— Дэльфіна, — прамовіла яна, бляднеючы і калоцячыся ад гневу, — я ўсё табе прабачала, бог мне сведка, але гэта!.. Месье дэ Расціньяк быў побач, і ты гэта ведала. У цябе хапіла подласці адпомсціць мне, прымусіўшы мяне міжволі даверыць яму мае таямніцы жыцця, жыццё маіх дзяцей, маю ганьбу, мой гонар! Дык ведай жа, ты цяпер для мяне нішто, я ненавіджу цябе, я буду помсціць табе як толькі змагу, я...

Зацятая злосць не давала ёй гаварыць, перасохла горла.

— Ды гэта ж мой сын, ён наш, твой брат, твой выратавальнік! — усклікнуў бацька Гар'ё. — Абдымі яго, Назі! Бачыш, я яго абдымаю, — працягваў стары, у нейкім шаленстве прыціскаючы да сябе Эжэна. — О мой сынок! Я буду для цябе больш, чым бацька, я пастараюся замяніць табе сям'ю. Я б хацеў быць богам і кінуць да тваіх ног увесь свет. Назі, ну, пацалуй жа яго! Гэта не чалавек, а проста анёл, сапраўдны анёл.

— Кінь яе, тата, зараз яна страціла розум, — прамовіла Дэльфіна.

— Я страціла розум!? Я страціла!? А ты сама? — істэрычна крычала графіня дэ Рэсто.

— Дзеткі мае, калі вы не спыніцеся, то я зараз жа сканаю! — крыкнуў бацька Гар'ё і паваліўся на ложак, быццам падкошаны куляй. — Яны забілі мяне! — прамармытаў ён.

Графіня зірнула на Эжэна, які застыў на месцы, збянтэжаны гэтай жудаснай сцэнай.

— Месье... — павольна вымавіла яна, астатняе чыталася на яе твары, позірку, інтанацыі; яна не звяртала

ўвагі на бацьку, якому Дэльфіна хуценька расшпільвала камізэльку.

— Я заплачу і буду маўчаць, — адказаў Расціньяк, не чакаючы пытання.

— Назі, ты забіла тату! — папракнула сястру Дэльфіна, паказваючы на старога, які ляжаў як нежывы, але графіня ўжо знікла.

— Прабачаю ёй, — слабым голасам вымавіў стары, адкрываючы вочы, — у яе становішча страшэннае, і не такая б галава пайшла кругам. Суцеш яе, будзь з ёй ласкавай, абяцай гэта хвораму бацьку, — прасіў Гар'ё, сціскаючы руку Дэльфіны.

— Але што з вамі такое? — не на жарт перапалохалася тая.

— Нічога, нічога, дачушка, зараз пройдзе, — адказваў бацька. — Нешта мне цісне на лоб, мабыць, мігрэнь. Бедная Назі, што з ёю будзе?

У гэтую хвіліну графіня вярнулася і кінулася да ног бацькі.

— Прабачце, тата! — роспачна ўсклікнула яна.

— Гэтым ты мучаеш мяне яшчэ больш, — прастагнаў бацька.

— Месье, — са слязамі на вачах звярнулася графіня да Расціньяка, — ад гора я была несправядлівая да вас. Хочаце быць маім братам? — спыталася яна і працягнула яму руку.

— Назі, Назі, сястрычка, давай усё забудзем! — усклікнула Дэльфіна, тулячы да сябе сястру.

— Не, гэта я буду помніць заўсёды!

— Анёлачкі мае, нейкі полаг зацямняў мне вочы, зараз вы знялі яго, вашы галасы вяртаюць мяне да жыцця! — радасна ўсклікнуў бацька Гар'ё. — Ну, пацалуйцеся яшчэ раз! Назі, ці выратуе цябе гэты вэксаль?

— Спадзяюся. Можа, тата, вы паставіце на ім і ваш подпіс?

— Які ж я дурань! Як жа я забыўся пра гэта! Толькі мне зараз блага, не крыўдуй на мяне, Назі. Прышлі каго-небудзь перадаць, калі скончацца твае пакуты. Не, лепш я сам прыйду. Не, не прыйду, не магу бачыць твайго мужа, я заб'ю яго на месцы. А што датычыцца продажу тваёй маёмасці, дык я сам за гэта вазьмуся. Ідзі хутчэй, дзіцятка, і прымусь Максіма адумацца.

Эжэн быў узрушаны.

— Бедная Анастазі заўсёды была запальчывая, але сэрцам яна добрая, — сказала мадам дэ Нусінген.

— Яна вярнулася за перадатачным подпісам, — шапнуў ёй на вуха Эжэн.

— Вы думаеце?

— Хацелася б не думаць. Будзьце з ёю асцярожней, — адказаў ён і ўзняў вочы на неба, давяраючы богу думкі, якія не наважваўся выказаць услых.

— Так, яе паводзінам ніколі не бракавала акцёрства, а бедны тата паддаецца на яе крыўлянні.

— Як адчувае сябе мілы татачка Гар'ё? — весела запытаўся Эжэн у старога.

— Мне хочацца спаць, — стомлена адказаў той.

Расціньяк дапамог яму легчы ў пасцель. Калі стары, трымаючы дачку за руку, заснуў, Дэльфіна вызваліла яе і нагадала Эжэну:

— Значыць, вечарам у італьянцаў. Там ты мне скажаш, як бацькава здароўе. А заўтра вы перабярэцеся. Пакажыце мне цяпер ваш пакой. Які жах! — сказала яна, увайшоўшы ў пакой Эжэна. — У вас горш, чым у бацькі. Эжэн, ты паводзіў сябе выдатна. Я б пакахала цябе мацней, калі б гэта было магчыма. Але, дарагі мой хлопчык, калі вы хочаце разбагацець, нельга раскідвацца дванаццаццю тысячамі франкаў, як вы толькі што зрабілі. Граф дэ Трай гуляе ў карты. Сястра не хоча нічога заўважаць. Ён знайшоў бы гэтыя дванаццаць тысяч там жа, дзе прайграе і выйграе цэлыя залатыя горы.

Пачуўся стогн, і яны вярнуліся да Гар'ё. Здавалася, што ён спаў, але калі закаханыя наблізіліся да яго, пачулі, як ён сказаў:

— Якія яны няшчасныя!

Спаў ён або не, аднак тон сказанай бацькам фразы крануў Дэльфіну за сэрца — яна падышла да беднага ложка і пацалавала бацьку ў лоб. Гар'ё расплюшчыў вочы:

— Гэта ты, Дэльфіна?

— Ну як ты сябе адчуваеш? — спыталася дачка.

— Добра, не турбуйся, я хутка выйду з дому. Ідзіце, ідзіце, дзеткі мае, будзьце шчаслівыя.

Эжэн правёў Дэльфіну дадому, але занепакоены станам, у якім пакінуў бацьку Гар'ё, адмовіўся ад абеду з Дэльфінай і хуценька вярнуўся ў «Дом Ваке». Калі ён увайшоў, стары ўжо ўстаў з ложка і з'явіўся да стала. Б'яншон размясціўся так, каб лепш назіраць за тварам

вермішэльшчыка. Гар'ё, узяўшы кавалак хлеба, панюхаў яго, быццам хацеў даведацца, з якой мукі ён выпечаны. Студэнт-медык запрыкмеціў у гэтым жэсце поўную адсутнасць таго, што можна было назваць усведамленнем сваіх дзеянняў, і спахмурнеў.

— Сядзь бліжэй да мяне, кашэнаўскі пансіянер[1], — сказаў яму Эжэн.

Б'яншон ахвотна перасеў, каб быць бліжэй да старога.

— Што з ім? — спытаўся Расціньяк.

— Калі не памыляюся, — яму канец! У ім адбываецца нешта незвычайнае, яму пагражае апаплексія. Ніжняя частка яго твару даволі спакойная, а рысы верхняй, незалежна ад яго волі, торгаюцца ўверх, бачыш? А потым паглядзі на яго вочы: яны быццам прысыпаныя нейкім дробным пылам, ці не так? Гэта акалічнасць паказвае на кровазліццё ў мозг. Заўтра раніцай стан яго здароўя будзе для мяне яснейшым.

— Ці існуюць якія-небудзь лекі ад гэтай хваробы?

— Ніякіх. Можа, удасца адтэрмінаваць смерць, калі знойдуцца сродкі, каб выклікаць адліў да ног, але калі заўтра да вечара гэтыя сімптомы не знікнуць, бедны стары памрэ. Ты не ведаеш прычыны ягонай хваробы? Відаць, ён перанёс нейкае моцнае нервовае ўзрушэнне, пагэтаму сілы яго не вытрымалі.

— Так, — сказаў Расціньяк, успомніўшы, як абедзве дачкі, не даючы перадышкі, наносілі ўдары ў бацькоўскае сэрца.

«Дэльфіна хоць любіць свайго бацьку», — падумаў Эжэн.

Вечарам, у тэатры, Эжэн загаварыў аб гэтым з Дэльфінай вельмі асцярожна, каб не надта ўстрывожыць яе. Аднак у адказ на першыя ж словы Расціньяка яна сказала:

— Не турбуйцеся, мой бацька досыць моцны чалавек. Але сёння раніцай мы крыху памучылі яго. Справа ідзе аб страце намі нашых капіталаў, вы ўяўляеце сабе наступствы гэткага няшчасця? Я не змагла б жыць далей, калі б ваша любоў не зрабіла мяне абыякавай да ўсяго, што так нядаўна здавалася мне смяротнай пакутай. Зараз у мяне няма іншай боязі, іншай бяды, як страціць любоў, дзякуючы якой я адчуваю радасць жыцця. Без гэтага

---

[1] Б'яншон жыў пры шпіталі імя Кашэна, дзе студэнты-медыкі праходзілі практыку.

пачуцця ўсё мне абыякавае, нішто мяне не радуе. Вы для мяне — усё. Калі мне і прыносіць асалоду багацце, то толькі таму, што яно дае мне магчымасць падабацца вам яшчэ больш. На мой сорам я больш палюбоўніца, чым дачка. Чаму так, не ведаю. Вы — усё маё жыццё. Сэрца мне даў бацька, але вы прымусілі яго забіцца. Няхай мяне асудзіць увесь свет, мне ўсё роўна, абы вы, не маючы ўрэшце падстаў быць незадаволеным мной, даравалі мне мае злачынствы, на якія мяне штурхае неадольнае пачуццё! Няўжо вы думаеце, што я бессардэчная дачка? О не, нельга не любіць такога добрага бацьку, як наш. Але ці магла я перашкодзіць таму, што ён у рэшце рэшт і сам заўважыў непазбежныя вынікі нашых няўдалых шлюбаў? Чаму ён не быў супраць нашых замужжаў? Ці не ён павінен быў усё абдумаць за нас? Я ведаю, ён цяпер пакутуе не менш, чым Назі і я, але што нам рабіць? Суцяшаць яго? Мы не змаглі б яго суцешыць нічым. Наша пакорлівасць лёсу засмучала яго больш, чым непрыемнасці ад нашых скаргаў і папрокаў. Бывае ў жыцці становішча, калі ўсё выклікае горыч.

Эжэн маўчаў, расчулены гэтай простай, сардэчнай споведдзю сапраўднага пачуцця. Парыжанкі нярэдка бываюць фальшывымі, ахопленымі самалюбствам, эгаізмам, какетлівасцю ці холадам, але можна з упэўненасцю сказаць, што калі яны любяць па-сапраўднаму, то аддаюцца свайму пачуццю больш, чым другія жанчыны. Яны перамагаюць сваю дробязнасць і ўзвышаюцца душой. Апрача таго, Эжэна ўразіў глыбокі, здаровы розум Дэльфіны, уласцівы жанчыне, калі яна спакойна абмяркоўвае простыя, натуральныя пачуцці, сама аддаленая ад іх якім-небудзь запаветным жаданнем і назіраючы іх як бы з боку.

Мадам дэ Нусінген была пакрыўджана маўчаннем Эжэна.

— Над чым гэта вы так задумаліся? — запытала яна.

— Я ўсё разважаю над тым, што вы сказалі. Дасюль я думаў, што люблю вас больш, чым вы мяне!

Яна ўсміхнулася, але перамагла сваю радасць, каб утрымаць размову ў пэўных межах. Ніколі яшчэ ёй не даводзілася чуць такое ўсхваляванае выяўленне шчырай юнацкай любові. Яшчэ крыху, і яна не стрымалася б.

— Эжэн, хіба вы не ведаеце, што адбываецца ў свеце? — змяніла яна тэму размовы. — Заўтра ўвесь Парыж будзе ў вікантэсы дэ Басэан. Маркіз д'Ажуда і Рошфіды

дамовіліся нічога не расказваць, аднак заўтра кароль зацвердзіць шлюбны кантракт, а ваша бедная кузіна яшчэ нічога не ведае. Яна не можа адмяніць прыём, але маркіз на баль не з'явіцца. Усе толькі і гавораць аб гэтай падзеі.

— А свет радуецца гэтай подласці і ў ёй удзельнічае! Няўжо вы не разумееце, што мадам дэ Басэан не вытрымае гэтага?

— Не, — усміхаючыся, адказала Дэльфіна, — вы не ведаеце жанчын такога кшталту. Так, заўтра да яе прыедзе ўвесь Парыж, і я таксама там буду. Гэтым шчасцем я абавязана вам.

— А можа, гэта адна з тых недарэчных плётак, якіх шмат ходзіць па Парыжы? — заўважыў Расціньяк.

— Заўтра мы будзем ведаць праўду.

Эжэн не вярнуўся ў «Дом Ваке». У яго не хапіла духу расстацца з новай уласнай кватэрай. Напярэдадні ён вымушаны быў пайсці ад Дэльфіны ў гадзіну ночы, цяпер Дэльфіна ў дзве гадзіны паехала дадому. На наступны дзень ён устаў позна і да паўдня чакаў Дэльфіну, якая прыехала снедаць да яго. Маладыя людзі настолькі пажадныя да гэтых мілых адчуванняў шчасця, што Расціньяк амаль забыўся пра бацьку Гар'ё. Звыкацца з кожнай рэччу прыгожа абсталяванай кватэры, сваёй кватэры, здавалася яму нейкім бесперапынным святкаваннем. У прысутнасці Дэльфіны ўсё набывала тут асаблівую каштоўнасць. Тым не менш, а чацвёртай гадзіне маладыя людзі падумалі пра бацьку Гар'ё, успомніўшы, які ён быў шчаслівы ад надзеі пераехаць у гэты дом. Эжэн заўважыў, што паколькі старому пагражае хвароба, яго трэба найхутчэй перавезці сюды. Таму, развітаўшыся з Дэльфінай, ён пабег у «Дом Ваке». За сталом не было ні Б'яншона, ні бацькі Гар'ё.

— Ну, наш бацька Гар'ё зусім скапыціўся, — сказаў яму мастак. — Б'яншон наверсе, у яго. Стары бачыўся з адной са сваіх дачок, графіняй дэ *Рэстарама*. Пасля гэтага ён надумаўся выйсці з дому, і яму зрабілася горш. Хутка наша кампанія пазбавіцца аднаго з найлепшых упрыгожанняў.

Расціньяк кінуўся наверх.

— Месье Эжэн! Месье Эжэн, вас кліча гаспадыня! — крыкнула яму Сільвія.

— Месье Эжэн, — звярнулася да яго ўдава, — вы і месье Гар'ё абавязваліся выехаць пятнаццатага лютага.

А пасля пятнаццатага прайшло ўжо тры дні, — сёння васемнаццатае. Цяпер вам абодвум давядзецца заплаціць мне за ўвесь месяц, але калі вы зможаце паручыцца за бацьку Гар'ё, то для мяне дастаткова вашага слова.

— Навошта? Няўжо вы яму не давяраеце?

— Давяраць? Яму? А калі ён так і сканае, не прыходзячы ў сябе, яго дочкі не дадуць мне ні шэлега, а ўвесь яго скарб не каштуе й дзесяці франкаў. Не ведаю навошта, але сёння раніцай ён некуды занёс свае апошнія сталовыя прыборы. Апрануўся, як франт, мне здалося, нават нарумяніўся і нібы памаладзеў.

— Я адказваю за ўсё, — прамовіў Эжэн, уздрыгнуўшы ад жаху і прадчуваючы няшчасце.

Падняўшыся наверх, ён убачыў, што стары бяссільна ляжыць на ложку, а побач з ім сядзіць Б'яншон.

— Добры дзень, бацька, — павітаўся Эжэн.

Стары пяшчотна ўсміхнуўся яму і, павярнуўшы на яго шкляныя вочы, спытаўся:

— Як яна?

— Добра. А вы?

— Ніякавата.

— Не стамляй яго, — сказаў Б'яншон, адводзячы Эжэна ў кут.

— Ну як? — спытаў Эжэн.

— Выратаваць яго можа толькі цуд. Адбылося крывазліццё, я паставіў яму гарчычнікі. На шчасце, ён іх адчувае, значыць, яны дзейнічаюць.

— Ці можна яго перавезці?

— І не думай! Давядзецца пакінуць яго тут: поўны спакой, ніякіх хваляванняў!

— Мілы Б'яншон, — прамовіў Эжэн, — мы будзем разам глядзець за ім.

— Я ўжо запрасіў з нашага шпіталя галоўнага ўрача.

— І што ж?

— Заўтра вечарам ён скажа сваю думку. Абяцаў завітаць сюды пасля дзённага абходу. На жаль, стары адпаліў раніцай нейкую штуку, а якую — невядома, не хоча гаварыць, упарты, як баран. Толькі я пачынаю размаўляць з ім, ён, каб не адказваць, робіць выгляд, што спіць, а калі яго вочы расплюшчаныя, то пачынае вохкаць. Сёння раніцай стары сышоў з дому і ўвесь дзень дзесьці бадзяўся па Парыжы. Забраў з сабою ўсё, што было ў яго каштоўнага, уладкаваў нейкую справу, — каб

яна спрахла! — і падарваў сабе гэтым сілы. Яго наведала адна з дачок.

— Графіня? — спытаў Эжэн. — Высокая, стройная брунетка, вочкі жывыя, точаныя ножкі?

— Так.

— Пакінь нас на хвілінку, — сказаў Расціньяк, — я паспрабую выпытаць у яго, што ён зрабіў. Мне ён павінен расказаць.

— Я пайду паабедаю. Толькі пастарайся дужа не хваляваць яго: нейкая надзея ўсё-такі ёсць.

— Я разумею.

— Заўтра яны павесяляцца, — сказаў бацька Гар'ё Эжэну, застаўшыся з ім сам-насам. — Яны едуць на вялікі баль.

— Тата, як вы давялі сябе да такога стану, што падвечар злеглі ў ложак? Чым вы займаліся сёння раніцай?

— Нічым.

— Анастазі прыязджала?

— Але.

— Чаго яна хацела ад вас, прасіла яшчэ нешта? Не ўтойвайце ад мяне нічога!

— Ведаеце, сын мой, якая яна няшчасная! Пасля гэтай гісторыі з дыяментамі ў Назі няма ніводнага су. А каб ехаць на баль, яна заказала сабе сукенку, вышытую бліскаўкамі. Яна, напэўна, будзе вельмі прыгожая ў ёй. Але нягодніца-краўчыха не захацела шыць у доўг. Тады пакаёўка Назі заплаціла ёй тысячу франкаў за сукенку. Бедная Назі! Дайсці да такога! У мяне сэрца разрывалася. Але пакаёўка заўважыла, што Рэсто пазбавіў Назі ўсялякага даверу, спалохалася за свае грошы і змовілася з краўчыхай не аддаваць сукенку, пакуль ёй не вернуць тысячу франкаў. Заўтра баль, сукенка гатовая, а Назі ў роспачы! Яна вырашыла ўзяць у мяне мае сталовыя прыборы і закласці іх. Муж патрабуе, каб яна ехала на баль паказаць усяму Парыжу брыльянты, бо ходзяць чуткі, што яна іх прадала. Хіба ж магла яна сказаць гэтай пачвары: «Я павінна тысячу франкаў — заплаціце»? Не. Я гэта, вядома, зразумеў. Дэльфіна паедзе ў раскошнай сукенцы, а Анастазі не можа саступіць малодшай сястры. Бедная дачушка, яна проста залівалася слязамі! Учора мне было так сорамна, што ў мяне не знайшлося дванаццаці тысяч франкаў! Я ахвяраваў бы рэшткамі майго нікчэмнага жыцця, каб паправіць гэту віну. Бачыце,

якая справа: у мяне хапіла сіл перанесці ўсё, але апошні раз гэтае безграшоўе перавярнула мне ўсю душу. Охо-хо-хо! Доўга не разважаючы, я прыфранціўся, падбадзёрыўся, прадаў за шэсцьсот франкаў спражкі і прыборы, а потым заклаў на год дзядзьку Габсэку сваю пажыццёвую рэнту за чатырыста франкаў наяўнымі. Ну і нічога: буду цяпер есці толькі хлеб! Жыў жа я гэтак, калі быў малады. Затое мая Назі правядзе выдатны вечар. У яе будзе прыгажэйшы за ўсіх убор. Паперка вартасцю ў тысячу франкаў у мяне пад падушкай. Магчымасць парадаваць бедную Назі грэе мне душу. Цяпер яна можа прагнаць гэту нягодніцу Віктарыну. Дзе вы бачылі, каб служанка не верыла сваім гаспадарам! Заўтра я папраўлюся. А дзесятай гадзіне прыйдзе Назі. Я не хачу, каб яны думалі, што я хворы, бо, чаго добрага, не паедуць на баль, а будуць глядзець за мной. Заўтра Назі пацалуе мяне, быццам сваё дзіця, і я адразу папраўлюся. Усё адно: хіба не патраціў бы я тысячу франкаў у аптэкара? Лепш аддаць іх маёй лекарцы, Назі. Суцешу бедную маю дачушку ў яе няшчасці. Гэтым я разлічуся за сваю віну, за тое, што я зрабіў сабе пажыццёвы прыбытак. Яна на дне прорвы, а я ўжо не магу выцягнуць яе адтуль. О, я зноў займуся гандлем. Паеду ў Адэсу па збожжа. Там пшаніца ў тры разы танней, чым у нас. Праўда, увоз зерневых у натуры забаронены, але мілыя людзі, якія пішуць законы, забыліся накласці забарону на вырабы з пшаніцы. Эх-хе-хе! Я дадумаўся да гэтага сёння раніцай. На крухмале можна будзе рабіць цудоўныя справы.

«Ён звар'яцеў», — падумаў Эжэн, гледзячы на старога, і сказаў:

— Ну-ну, супакойцеся, вам забаронена размаўляць.

Калі Б'яншон вярнуўся, Эжэн таксама схадзіў уніз паабедаць. Усю ноч яны на змену правялі ля хворага, — адзін чытаў медыцынскія кніжкі, другі пісаў лісты да маці і сясцёр.

На наступны дзень у хваробе старога адчуліся, на думку Б'яншона, добрыя сімптомы, але стан хворага патрабаваў пастаяннага догляду, і толькі гэтыя два студэнты маглі ажыццявіць яго ва ўсіх дэталях, ад апісання якіх лепш устрымацца, каб не замараць чысціні мовы той эпохі. Да аслабелага цела старога яны прыкладвалі п'явак, рабілі прыпаркі, парылі ногі, праводзілі шмат іншага лячэння, якое было магчыма дзякуючы самаахвярнасці і фізічнай сіле абодвух маладых людзей. Графі-

ня дэ Рэсто сама не прыехала, прыслала за грашыма пасыльнага.

— Я думаў, што яна прыедзе сама. Ну гэта нічога, а то б яна сапсавала сабе настрой, — казаў стары, быццам бы задаволены гэтай акалічнасцю.

А сёмай гадзіне вечара Тэрэза прынесла запіску ад Дэльфіны:

«Чым вы, мой сябра, заняты? Вы не паспелі палюбіць мяне, а ўжо грэбуеце мною? Падчас нашых размоў перада мною раскрылася ваша шчырае сэрца. Вы — з тых, хто разумее, якое багацце адценняў хаваецца ў пачуцці, і будзеце вернымі яму да канца. Як вы самі сказалі, слухаючы малітву Майсея[1], «для адных гэта ўсяго адна і тая ж нота, для другіх у ёй бязмежнасць музыкі!» Не забудзьце, што сёння вечарам мы едзем на баль да вікантэсы дэ Басэан, і я вас чакаю. Ужо дакладна вядома, што сёння раніцай у палацы кароль падпісаў шлюбны кантракт маркіза д'Ажуда, а бедная вікантэса даведалася аб гэтым толькі а другой гадзіне дня. Цяпер увесь Парыж кінецца да яе, як імкнецца народ на Грэўскую плошчу, калі там адбываецца смяротнае пакаранне. Ці ж гэта не агідна — ісці глядзець, зможа жанчына схаваць сваё гора ці не, зможа прыгожа памерці ці не? Я, вядома, не паехала б, калі б раней была ў яе; але, напэўна, больш спадарыня дэ Басэан прымаць не будзе, і ўсе намаганні, якія я прыклала, каб трапіць да яе, маглі б аказацца марнымі. Я не ў такім становішчы, як іншыя. Апрача таго, я еду і дзеля вас. Чакаю. Калі праз дзве гадзіны вы не будзеце ў мяне, то не ведаю, ці змагу я прабачыць вам такое падступства».

Расціньяк узяў пяро і напісаў у адказ:

«Я чакаю ўрача, каб даведацца, ці будзе жыць ваш бацька. Ён пры смерці. Я прывязу вам прысуд урача, баюся, што гэты прысуд будзе смяротны. Вырашайце самі, ці можна вам ехаць на баль. Пяшчотна цалую».

А палове дзевятай з'явіўся ўрач: ён не даў станоўчага заключэння, але і не лічыў, што смерць наступіць хутка. Ён папярэдзіў, што стан хворага будзе то паляпшацца, то пагаршацца: ад гэтага будзе залежыць і жыццё і розум старога.

---

[1] *Малітва Майсея* — арыя з оперы італьянскага кампазітара Расіні «Майсей у Егіпце».

— Лепш было б, каб ён хутчэй памёр! — былі апошнія словы ўрача.

Эжэн даручыў старога клопатам Б'яншона і паехаў да спадарыні дэ Нусінген з настолькі сумнымі весткамі, што яму, яшчэ прасякнутаму ўяўленнямі аб сямейным абавязку, здавалася, што ў дачкі бацькі Гар'ё павінна было б знікнуць ад гэтага ўсялякае пачуццё радасці. У тую хвіліну, калі ён адыходзіў, стары, здавалася, спаў, але як толькі малады чалавек выйшаў з пакоя, бацька Гар'ё раптам прыўзняўся і, седзячы на пасцелі, крыкнуў яму ўслед:

— Скажыце ёй: няхай весяліцца.

Засмучаны горам, малады чалавек пайшоў да Дэльфіны і ўбачыў яе ўжо прычасанай, у бальных чаравічках, — заставалася толькі надзець сукенку. Але апошнія зборы маюць падабенства з апошнімі мазкамі жывапісца, які завяршае сваю карціну: на гэта ідзе больш часу, чым на асноўную працу.

— Як, вы яшчэ не апрануліся? — здзівілася яна.

— Але ж ваш бацька...

— Зноў «мой бацька!» — усклікнула яна, не даючы яму дагаварыць. — Не вучыце мяне майму абавязку перад бацькам. Я даўна ведаю яго. Эжэн, маўчыце! Не буду слухаць вас, пакуль вы не адзенецеся. Тэрэза ўсё падрыхтавала для вас у вашай кватэры. Мая карэта гатова, едзьце і хутчэй вяртайцеся. Пра бацьку пагаворым па дарозе. Трэба выехаць загадзя, інакш мы апынемся ў хвасце ўсіх экіпажаў, і тады нам не трапіць на баль раней адзінаццатай гадзіны.

— Мадам, але...

— Ні слова больш, — прамовіла яна і знікла ў будуары, каб узяць калье.

— Месье Эжэн, ідзіце ж хутчэй, а то вы разлучыце баранэсу, — сказала Тэрэза, выпраўляючы маладога чалавека, узрушанага такім вытанчаным бацьказабойствам.

І ён паехаў апранацца, аддаючыся самым сумным, самым бязрадасным думкам. Свет уяўляўся яму акіянам бруду, куды чалавек адразу ж правальваецца па шыю, як толькі апускае ў яго сваю нагу.

«Усе яго злачынствы дробязныя, — думаў Эжэн. — Ватрэн значна вышэйшы». Расіньяк ужо бачыў тры галоўныя абліччы грамадства: Пакорлівасць, Барацьбу і Бунт — сям'ю, свет і Ватрэна. Эжэн не ведаў, да чаго

прыбіцца. Пакорлівасць — сумная; бунт — немагчымы; зыход барацьбы — сумніцельны. Ён перанёсся ў думках у сваю сям'ю. Успаміналіся чыстыя перажыванні гэтага ціхага жыцця, паўставалі ў памяці тыя дні, калі ён жыў сярод родных, якія моцна яго любілі. Дарагія яму людзі кіраваліся натуральнымі законамі хатняга побыту і ў гэтым знаходзілі шчасце, поўнае, пастаяннае і пазбаўленае душэўных пакут. Пры ўсіх сваіх добрых думках Эжэн не рашыўся б пайсці і выспаведаць веру чыстых душ перад Дэльфінай, патрабуючы дабрадзейнасці імем любові. Яго перавыхаванне пачалося і ўжо прыносіла плён. Нават яго любоў зрабілася сябелюбнай. Ён адчуў у Дэльфіне сутнасць яе душы і ўсвядоміў, што яго каханая здольна паехаць на баль, пераступіўшы праз бацькаў труп. Аднак яму не ставала ні сілы, каб стаць маралістам, ні мужнасці, каб пасварыцца, ні дабрадзейнага намеру, каб развітацца з ёю. «Калі я ў гэтым выпадку не падпарадкуюся ёй, яна ніколі мне не даруе», — думаў Эжэн. І ўслед за гэтым ён пачаў перабіраць думкі ўрачоў: яму хацелася пераканаць сябе, што хвароба бацькі Гар'ё не такая ўжо небяспечная, як ён гэта сабе ўяўляў. Інакш кажучы, ён пачаў шукаць здрадніцкія довады дзеля апраўдання Дэльфіны. Яна ж не ведае, у якім стане знаходзіцца яе бацька. Ды калі б яна зараз паехала да яго, то стары сам адправіў бы яе на баль. Грамадскі закон, бязлітасны ў сваіх фармальных прысудах, нярэдка прызнае вінаватасць там, дзе злачынства хоць і відавочнае, але можа быць апраўданае безліччу змякчаючых акалічнасцей, якія ствараюцца ў сямейнай атмасферы з-за непадабенства характараў, рознасці становішчаў і інтарэсаў. Эжэну хацелася падмануць самога сябе, ён быў гатовы ахвяраваць дзеля каханай сумленнем. За апошнія два дні ўсё змянілася ў яго жыцці. Жанчына ўжо ўнесла ў яе разруху, прымусіла зменшыць святло сям'і ў вачах юнака, завалодала ўсім. Расціньяк і Дэльфіна сустрэліся пры ўмовах, створаных як бы наўмысна для таго, каб яны маглі даць адзін другому як мага больш чуллівай асалоды. Іх добра выспелае пачуццё не толькі не патухла ад задавальнення — забойцы пачуццяў, — але разгарэлася яшчэ больш. Калі Дэльфіна ўжо стала яго палюбоўніцай, Эжэн зразумеў, што раней толькі жадаў яе, а пакахаў, толькі калі адчуў асалоду: мабыць, каханне, гэта і ёсць нішто іншае, як пачуццё ўдзячнасці за яе. Усё роўна, якой бы ні была Дэльфіна, несумленнай ці бездакорнай,

ён любіў яе і за тую чуллівую асалоду, якую, быццам шлюбны дар, ён сам прынёс ёй, і за тую, якой адарыла яго яна. Дэльфіна таксама любіла Расціньяка, як Тантал палюбіў бы анёла, што прылятаў бы, каб наталіць яго голад і супакоіць смагу перасохлага горла.

— А вось цяпер скажыце, як адчувае сябе тата? — запыталася мадам дэ Нусінген, калі Эжэн вярнуўся ў бальным гарнітуры.

— Вельмі блага, — адказаў ён. — Калі вы хочаце даказаць мне вашу любоў, заедзем да яго.

— Згодна, але пасля балю. Добры мой Эжэн, будзь мілым і не чытай мне натацый. Паедзем.

Яны паехалі. Палову шляху Эжэн маўчаў.

— Што з вамі? — спытала Дэльфіна.

— Я чую перадсмяротны хрып вашага бацькі, — раздражнёна адказаў ён.

І з палкім юнацкім красамоўствам ён пачаў апісваць ёй і бязлітасны ўчынак графіні дэ Рэсто, падказаны фанабэрыстасцю, і фатальны пералом у хваробе, выкліканы апошняй праявай бацькоўскай адданасці, і тое, якой цаной дастаўся Анастазі расшыты бліскаўкамі строй. Дэльфіна плакала.

«Я буду кепска выглядаць», — мільганула ў яе галаве, і слёзы высахлі.

— Я буду глядзець за татам, я ні на крок не адыду ад яго ложка, — адказала яна.

— Вось такой я і хачу бачыць цябе! — усклікнуў Расціньяк.

Пяцьсот экіпажаў асвятлялі сваімі ліхтарамі вуліцу перад палацам дэ Басэанаў. Па абодва бакі аздобленай ілюмінацыяй брамы стаялі два конныя жандары. Вышэйшы свет уліваўся ў дом такой плынню, так спяшаўся ўбачыць вікантэсу ў хвіліну яе падзення, што да прыезду спадарыні дэ Нусінген і Расціньяка ўсе пакоі на ніжнім паверсе былі запоўнены гасцямі. З таго часу, як Людовік XIV пазбавіў герцагіню дэ Манпансье, сваю кузіну, ад яе палюбоўніка[1] і ўсе прыдворныя кінуліся да яе ў палац, ніводнае любоўнае крушэнне не суправаджалася такім шумам, як крушэнне шчасця спадарыні дэ Басэан. У гэтай драме апошняя прадстаўніца дома амаль самадзяржаўных герцагаў Бургундыі даказала, што яна мац-

[1] Людовік XIV пасадзіў у турму герцага дэ Лазена, каб перашкодзіць яго шлюбу з Луізай Арлеанскай, герцагіняй Манпансье.

ней за сваю пакуту, і да апошняга імгнення царавала над свецкім грамадствам, робячы ласку яго пыхлівым інтарэсам, каб яны служылі на справу перамогі яе кахання. Самыя прыгожыя жанчыны Парыжа ажыўлялі яе гасцёўні сваімі ўсмешкамі і туалетамі. Вышэйшыя прыдворныя, пасланнікі, міністры, усе вядомыя людзі, абвешаныя ордэнамі, зоркамі і рознакаляровымі стужкамі, тоўпіліся вакол спадарыні дэ Басэан. Мелодыі аркестра луналі над пазалочанымі кроквамі палаца, які ператварыўся ў пустыню для яго царыцы. Спадарыня дэ Басэан, стоячы ў дзвярах першай гасцёўні, прымала сваіх так званых сяброў. Уся ў белым, без усялякіх упрыгожанняў, з проста ўкладзенымі на галаве косамі, зусім спакойная з выгляду, яна не выказвала ні гонару, ні суму, ні паказной весялосці. Ніхто не мог чытаць у яе душы. Можна сказаць — гэта была мармуровая Ніабея. Ва ўсмешцы, якой яна адорвала самых блізкіх сваіх сяброў, часам адбівалася горыч. Ва ўсім астатнім яна заставалася нязменнай, такой, якой і была, калі свяцілася промнямі шчасця. І нават бяздушныя людзі захапляліся яе сілай волі, як маладыя рымлянкі пляскалі ў далоні гладыятару, калі той паміраў з усмешкаю на вуснах. Здавалася, вышэйшы свет з'явіўся ва ўсім бляску, каб развітацца з адной са сваіх валадарак.

— Я так баялася, што вас не будзе, — сказала яна Расціньяку.

— Я прыехаў з тым, каб пакінуць ваш дом апошнім, — адказаў Расціньяк з хваляваннем у голасе, прыняўшы за папрок яе словы.

— Цудоўна, — сказала яна, падаючы яму руку. — Тут вы, мабыць, адзіны, каму б я змагла даверыцца. Мой сябра, любіце толькі адну жанчыну, тую, якую вы будзеце любіць заўсёды. І ніколі не кідайце ні адной.

Яна ўзяла Эжэна пад руку, завяла ў гасцёўню, дзе гулялі ў карты, і пасадзіла яго там на канапу.

— З'ездзіце да маркіза, — папрасіла яна Эжэна. — Мой лёкай Жак праводзіць вас туды і перадасць вам для яго ліст. Я прашу яго вярнуць мне мае лісты. Спадзяюся, што ён аддасць вам усё. Як толькі вы іх атрымаеце, вазьміце з сабою і падніміцеся да мяне ў пакой. Мне скажуць, як вы вернецеся.

Яна ўстала, каб сустрэць сваю лепшую прыяцельку, герцагіню дэ Ланжэ. Расціньяк загадаў ехаць проста да асабняка Рошфідаў, дзе разлічваў застаць вечарам маркі-

за д'Ажуда, і сапраўды, знайшоўшы там маркіза, папрасіў яго паклікаць. Маркіз адвёз яго да сябе і, аддаючы шкатулку Расціньяку, сказаў:

— Тут усё...

Відаць, яму хацелася пагаварыць з Эжэнам: магчыма, ён збіраўся распытаць яго пра баль і пра вікантэсу, а можа, хацеў прызнацца, што ён ужо цяпер у адчаі ад маючага адбыцца шлюбу, — і ён сапраўды будзе для яго няшчасным, — але ганарлівы агонь бліснуў у вачах маркіза, і з мужнасцю, нявартай пахвалы, ён стаіў у сэрцы самыя высакародныя пачуцці.

— Дарагі Эжэне, не гаварыце ёй пра мяне ні слова.

Д'Ажуда з пяшчотным сумам паціснуў руку Расціньяку і, кіўнуўшы галавою, адпусціў яго. Эжэн вярнуўся ў палац дэ Басэанаў. Яго правялі ў пакой вікантэсы, дзе ён заўважыў прыгатаванні да ад'езду. Расціньяк сеў ля каміна, зірнуў на кедравую шкатулку, і яго ахапіў вялікі сум. Сваёй веліччу мадам дэ Басэан нагадвала яму багіню з «Іліяды».

— А, гэта вы, мой сябра, — уваходзячы, сказала вікантэса і паклала руку на плячо Эжэну.

Ён паглядзеў на кузіну: яна плакала, утаропіўшы позірк у неба, рука на яго плячы дрыжала, другая бязвольна апусцілася. Раптам яна схапіла кедравую шкатулку, паклала яе ў камін і стала назіраць, як яна гарыць.

— Танцуюць! Усе прыйшлі дакладна ў прызначаны час, а вось смерць спозніцца. Ч-ш-ш! Мой сябра, — прамовіла яна, прыклаўшы палец да яго вуснаў, калі Эжэн хацеў загаварыць. — Я не ўбачу больш ні баляў, ні Парыжа — ніколі. А пятай гадзіне раніцы я еду хаваць сябе ў глушыні Нарманды. З трох гадзін дня я рыхтавалася да ад'езду, падпісвала паперы, уладжвала свае справы. Мне не было каго паслаць да...

Яна спынілася.

— Яго ж давялося б шукаць у...

І яна зноў спынілася прыгнечаная горам. У такія хвіліны ўсё выклікае боль душы, і некаторыя словы немагчыма прамовіць.

— Карацей кажучы, я спадзявалася, што толькі вы акажаце мне гэту апошнюю паслугу. Мне так хацелася б што-небудзь падарыць вам у знак сяброўства. Я буду думаць пра вас часта, вы мне здаваліся высакародным і добрым, юным і чыстым, а ў вышэйшым свеце гэтыя якасці дужа рэдкія. Я хачу, каб і вы час ад часу згадвалі

пра мяне. Чакайце, — сказала яна, аглядаючы пакой, — вось скрыначка, у якой ляжалі мае пальчаткі. Кожны раз, калі я даставала іх перад выездам на баль ці ў тэатр, я адчувала сябе прыгожай ад таго, што была шчаслівай, і, зачыняючы скрыначку, я нязменна пакідала ў ёй якую-небудзь прыемную думку, — у ёй шмат майго, у ёй памяць аб той спадарыні дэ Басэан, якой больш няма. Вазьміце яе сабе. Я распараджуся, каб яе даставілі да вас, на вуліцу д'Артуа. Сёння мадам дэ Нусінген выглядае цудоўна. Любіце яе па-сапраўднаму. Сябра мой, калі мы больш не ўбачымся, будзьце ўпэўнены, што я буду маліцца за вас. Вы былі вельмі добрым да мяне. Хадзем уніз, я не хачу даваць ім повад думаць, што я плачу. Перада мной цэлая вечнасць, я буду адзінокая, і ніколі ніхто не спытае, адкуль мае слёзы. Зірну яшчэ раз на гэты пакой.

Яна змоўкла. На хвіліну яна прыкрыла свае вочы рукою, потым выцерла іх, асвяжыла халоднай вадою і ўзяла Эжэна пад руку.

— Пойдзем! — сказала яна.

Эжэн ні разу не адчуваў такога душэўнага ўздыму, як цяпер, сутыкнуўшыся з гэтым ганарлівым стоеным сумам. Вярнуўшыся ў бальную залу, Эжэн абышоў яе пад руку са спадарыняй дэ Басэан, — апошні вытанчаны знак увагі да яго з боку гэтай цудоўнай жанчыны. Хутка ён заўважыў абедзвюх сясцёр: баранэсу дэ Нусінген і графіню дэ Рэсто. Графіня выставіла напаказ усе дыяменты і выглядала прыгажуняй, але яны, мусіць, апякалі яе: усё ж яна красуецца ў іх апошні раз. Якімі моцнымі ні былі гонар і каханне, ёй цяжка было глядзець у вочы мужу. Гэта відовішча, вядома, не магло настроіць на вясёлы лад думкі Расціньяка. Гледзячы на дыяменты сясцёр, ён бачыў перад сабою брудны ложак, на якім канаў бацька Гар'ё. Сумны выгляд Эжэна збянтэжыў вікантэсу, і яна вызваліла сваю руку.

— Не хачу пазбаўляць вас задавальненняў, — растлумачыла яна.

Яго адразу ж паклікала да сябе Дэльфіна, радуючыся свайму поспеху і моцна жадаючы скласці да ног Эжэна даніну пакланення, якую яна сабрала ў вышэйшым свеце, дзе яна так спадзявалася быць прынятай.

— Як вам падабаецца Назі? — спытала яна ў Эжэна.

— Яна не спынілася ні перад чым, нават перад смерцю бацькі, — адказаў Расціньяк.

Бліжэй да чацвёртай гадзіны натоўп у гасцёўнях пачаў радзець. Неўзабаве змоўклі гукі музыкі. У вялікай гасцёўні сядзелі толькі герцагіня дэ Ланжэ і Расціньяк. Вікантэса, спадзеючыся сустрэць Эжэна аднаго, прыйшла сюды, развітаўшыся з віконтам дэ Басэанам, які, перш чым пайсці спаць, сказаў ёй яшчэ раз:

— Дарэмна, дарагая, у вашым узросце вы надумалі стаць пустэльніцай! Заставайцеся з намі.

Убачыўшы герцагіню, мадам дэ Басэан, не стрымаўшыся, выказала здзіўленне.

— Клара, я здагадалася, — сказала герцагіня дэ Ланжэ. — Вы ад'язджаеце і больш не вернецеся. Але вы не ад'едзеце, пакуль не выслухаеце мяне і пакуль мы не зразумеем адна другую.

Яна ўзяла прыяцельку пад руку, завяла яе ў суседнюю гасцёўню і там, са слязамі на вачах, моцна абняла яе і пацалавала ў шчокі.

— З вамі, дарагая, я не магу развітацца холадна, гэта было б занадта цяжкім дакорам для майго сумлення. Вы можаце даверыцца мне, як самой сабе. Сёння вечарам вы даказалі вашу веліч, я адчула, што вы мне блізкая па душы, і мне хацелася б даказаць вам гэта. Я адчуваю сябе вінаватай, я не заўсёды добра ставілася да вас, прабачце мне, мая мілая. Я асуджаю ў сабе ўсё, што магло прычыніць вам боль, я хацела б забраць назад усе мае ранейшыя словы. Аднолькавае гора зрадніла нашы душы, і я не ведаю, хто з нас цяпер будзе больш няшчаснай. Генерал дэ Манрыво не прыехаў сюды сёння вечарам, — вы разумееце, што гэта значыць? Хто бачыў вас на гэтым балі, той не забудзе вас ніколі, Клара. А я? Я раблю апошнюю спробу. Калі мяне напаткае няўдача, я пайду ў манастыр! Але куды вы едзеце?

— У Нармандыю, у Курсель, любіць, маліцца да таго дня, пакуль бог не забярэ мяне з гэтага свету. Месье дэ Расціньяк, хадзіце сюды, — сардэчна сказала вікантэса, згадаўшы, што Эжэн яе чакае.

Расціньяк стаў на адно калена, узяў руку вікантэсы і пацалаваў яе.

— Бывайце, Антуанета, — прамовіла мадам дэ Басэан, — будзьце шчаслівая. Што датычыць вас, Эжэн, то вы і так шчаслівыя, — звярнулася яна да студэнта, — вы малады, вы яшчэ можаце ў нешта верыць. Як некаторыя шчаслівыя людзі ў іх смяротны час, так і я ў хвіліну свайго адыходу ад свецкай мітусні

знайшла тут каля сябе святыя, чыстыя хваляванні блізкіх мне людзей.

Расціньяк пайшоў у пяць гадзін раніцы, калі спадарыня дэ Басэан ужо села ў дарожны экіпаж і развіталася з ім у слязах, якія былі доказам таго, што і самыя высокапастаўленыя людзі падпарадкоўваюцца законам пачуццяў і ведаюць у жыцці гора, хоць ёсць асобы, якія, каб дагадзіць натоўпу, імкнуцца даказаць яму адваротнае. У халодную слату Эжэн вяртаўся пешшу ў «Дом Ваке». Яго адукацыя завяршылася.

— Нам не выратаваць нябогу Гар'ё, — сказаў Б'яншон, калі Эжэн увайшоў да свайго суседа.

— Сябра мой, паслухай, — звярнуўся да яго Эжэн, зірнуўшы на старога, які спаў, — ідзі да той сціплай мэты, якой ты абмежаваў свае жаданні. Я трапіў у пекла і ў ім застануся. Вер усяму кепскаму, што табе будуць расказваць пра вышэйшы свет! Няма Ювенала, які змог бы апісаць усю яго агіднасць, прыкрытую золатам і каштоўнымі камянямі.

На наступны дзень, дзесьці а другой гадзіне, Расціньяка разбудзіў Б'яншон, якому трэба было выйсці з дому, ён папрасіў Эжэна пабыць з бацькам Гар'ё, паколькі раніцай стан хворага значна пагоршыўся.

— Старому засталося жыць дні два, а можа, толькі шэсць гадзін, — сказаў медык, — аднак мы не павінны спыняць барацьбу з хваробай. Трэба будзе паспрабаваць лячэнне, якое каштуе дорага. Канечне, мы будзем сядзець ля старога, але ў мяне асабіста няма ніводнага су. Я абшарыў усе яго кішэні, перарыў усе шафы, але нічога не знайшоў. Калі стары апрытомнеў, я спытаўся пра грошы, і ён адказаў, што не мае ні шэлега. Колькі ёсць у цябе?

— У мяне засталося дваццаць франкаў, — адказаў Расціньяк, — але я пайду згуляю на іх і выйграю.

— А калі прайграеш?

— Буду патрабаваць грошай ад яго зяцёў і дачок.

— А калі не дадуць? — спытаўся Б'яншон. — Дарэчы, зараз самае неабходнае не здабываць грошы, а абкласці яму ногі гарачымі гарчычнікамі, ад ступней да паловы лытак. Як ставіць гарчычнікі, ты ведаеш. Ды й Крыстоф табе дапаможа. А я пайду да аптэкара і заручуся, што за ўсе лекі будзе заплочана. Шкада, што хворага нельга перанесці ў наш шпіталь, там яму было б лепш. Ну

пойдзем, я растлумачу табе ўсё на месцы, а ты не адлучайся, пакуль я не вярнуся.

Маладыя людзі ўвайшлі ў пакой, дзе ляжаў стары. Зірнуўшы на яго скажоны болем, бледны, схуднелы твар, Расціньяк аж жахнуўся, настолькі ён змяніўся.

— Ну як, тата? — запытаў ён, схіляючыся над ложкам.

Гар'ё ўзняў пагаслыя вочы і вельмі ўважліва паглядзеў на Эжэна, але не пазнаў яго. Студэнт не вытрымаў, у яго на вачах навярнуліся слёзы.

— Б'яншон, можа, зацягнуць фіранкі?

— Не, знешняе асяроддзе на яго ўжо не дзейнічае. Было б вельмі добра, калі б ён адчуваў цяпло і холад. Але ўсё адно давядзецца паліць у печы, каб прыгатаваць адвары, ды й для іншых патрэб. Я прышлю табе некалькі бярэмяў дроў, будзем паліць іх, пакуль не знойдзем яшчэ. Учора і сёння ноччу я спаліў твае дровы і ўвесь торф, які знайшоў у гэтага небаракі. Сырасць была такая, што капала са сцен, ледзьве прасушыў пакой. Крыстоф падмёў у ім, а то было як у канюшні. Я абкурыў ядлоўцам, бо занадта смярдзела.

— Божа мой! А яго дочкі?! — усклікнуў Расціньяк.

— Слухай, калі ён папросіць піць, дай яму вось гэта,— сказаў медык, паказваючы на вялікі белы збан. — Калі пачуеш, што ён скардзіцца на боль, а жывот будзе цвёрды і гарачы, тады няхай Крыстоф дапаможа паставіць яму... ты ведаеш што. Калі ён незнарок узбудзіцца, пачне шмат гаварыць, нават крышачку здзяцініцца і будзе вярзці глупства, не спыняй яго. Гэта неблагая прыкмета. Але ўсё-такі пашлі Крыстофа ў шпіталь Кашэна. Наш урач, мой сябар, ці я сам прыйдзем зрабіць яму прыпяканні. Сёння раніцай, пакуль ты спаў, мы сабралі вялікі кансіліум з удзелам аднаго вучня Галя, а таксама галоўнага ўрача з нашага шпіталю і галоўнага ўрача з Атэль-Д'е. Ім здаецца, што яны выявілі вельмі цікавыя сімптомы, і мы будзем сачыць за развіццём хваробы, каб высветліць шэраг пытанняў, вельмі важных з навуковага боку. Адзін з гэтых урачоў лічыць, што калі ціск серознай вадкасці дзейнічае на адзін орган мацней, чым на другі, дык гэта можа выклікаць зусім незвычайныя з'явы. У выпадку, калі ён загаворыць, прыслухайся ўважліва, каб вызначыць, у якім коле паняццяў будуць яго размовы: чым яны будуць выкліканы — успамінам, думкамі аб будучым або развагамі пра сённяшні дзень, займаюць яго пытанні

пачуцця або матэрыяльнага парадку, магчыма, ён будзе рабіць падлікі ці вяртацца да мінулага. Карацей кажучы, ты павінен даць нам дакладны адказ. Магчыма, што кровазліццё адбылося ў галаву, тады ён памрэ ў нянпоўным розуме, у такім стане, як цяпер. У такіх хваробах усё можа аказацца незвычайным. Калі ўдар адбываецца вось у гэтым месцы, — паказаў Б'яншон на патыліцу хворага, — то бываюць прыклады дзіўных з'яў: мозг часткова аднаўляецца, і тады смерць наступае пазней. Кровазліццё можа і не дайсці да мозга, а выбраць іншыя шляхі, але напрамак можа вызначыць толькі анатамірованне нябожчыка. У шпіталі для невылечных хворых ёсць адзін прыдуркаваты стары, у якога кровазліццё пайшло ўздоўж пазваночніка, ён страшэнна пакутуе, але жыве.

— Добра яны павесяліліся? — запытаў бацька Гар'ё, пазнаўшы Эжэна.

— Ён толькі і думае пра дачок, — сказаў Б'яншон. — За гэту ноч ён паўтарыў разоў сто: «Яны танцуюць! На ёй новая сукенка!» Клікаў іх па імені. Што за навала! Сваімі енкамі ён і мяне прымусіў заплакаць: «Дэльфіна, мая Дэльфіна! Назі!» Шчыра кажучы, было чаго плакаць.

— Дэльфіна тут, праўда? Я так і ведаў, — вымавіў стары.

І вочы яго з нейкай ненатуральнай рухавасцю аглядалі дзверы і сцены.

— Я пайду ўніз і загадаю Сільвіі падрыхтаваць гарчычнікі, бо гэта самы спрыяльны момант, — крыкнуў, выходзячы, Б'яншон.

Расціньяк застаўся сам-насам са старым і, седзячы ў яго нагах, не адрываў вачэй ад яго галавы: яму так жахліва і горка было глядзець на яе.

«Вікантэса дэ Басэан уцякла, гэты памірае, — падумаў Расціньяк. — Людзі з тонкай душой не могуць доўга заставацца на гэтым свеце. Ды і як высакародным, вялікім пачуццям зжыцца з дробязным, абмежаваным, нікчэмным грамадствам?»

Карціна велікасвецкага балю, дзе ён быў госцем, узнікла перад яго вачыма; якая вялікая розніца між палацам і гэтым ложкам смерці. Раптам увайшоў Б'яншон.

— Слухай, Эжэне, я толькі што бачыўся з нашым галоўным урачом і без перадыху памчаўся сюды. Калі ў хворага з'явяцца адзнакі розуму, калі ён пачне раз-

маўляць, прыкладзі яму прадольны гарчычнік так, каб ахапіць спіну ад шыі да крыжа, і пашлі каго-небудзь за намі.

— Які ты добры, Б'яншон, — прамовіў Эжэн.

— О, тут справа датычыць навукі! — адказаў медык з усім запалам неафіта.

— Значыць, толькі я гляджу за старым з-за сімпатыі? — спытаў Расціньяк.

— Ты не гаварыў бы гэтага, калі б убачыў мяне сёння раніцай, — адказаў Б'яншон, не крыўдуючы на гэту заўвагу. — Вопытныя ўрачы бачаць толькі хваробу, а я, сябра ты мой, бачу пакуль што яшчэ й хворага.

Ён пакінуў Эжэна са старым і пайшоў, прадчуваючы блізкі крызіс, які, сапраўды, неўзабаве наступіў.

— А-а! Гэта вы, мой сынку! — сказаў бацька Гар'ё, пазнаўшы Эжэна.

— Вам лепш? — запытаў студэнт, беручы яго руку.

— Так, мне сціснула галаву, быццам абцугамі, але зараз пачало адпускаць. Вы бачылі маіх дачок? Зараз яны прыбягуць сюды, зараз, як толькі даведаюцца, што я хворы. Як яны глядзелі за мною на вуліцы Жусьен! Божа ж мой! Мне хочацца, каб да іх прыходу ў пакоі было чыста. Тут ходзіць адзін малады чалавек, ён спаліў увесь мой торф.

— Я чую, што Крыстоф цягне сюды па лесвіцы дровы, іх вам прыслаў той малады чалавек.

— Гэта добра! Толькі чым я за іх заплачу? У мяне ж, сынок, няма ніводнага су. Я ўсё аддаў, я жабрак. А сукенка з бліскаўкамі хоць прыгожая была? (Ох, як мне баліць!) Дзякуй, Крыстофе, бог вам адплаціць, у мяне нічога няма.

— Я заплачу за ўсё і табе, і Сільвіі, — шапнуў Эжэн на вуха Крыстофу.

— Крыстоф, дочкі вам казалі, што зараз прыедуць, ці не так? Схадзі па іх яшчэ раз, я дам табе сто су. Скажы, што мне блага, што я хачу абняць іх перад смерцю і пабачыць апошні раз. Скажы ім гэта, толькі вельмі не пужай.

Расціньяк зрабіў знак Крыстофу, і той выйшаў.

— Яны прыедуць, — зноў загаварыў стары. — Я ж іх ведаю. Добрая мая Фіфіна, колькі гора я ёй прынясу, калі памру! Назі таксама. Я не хачу смерці, не хачу, каб яны плакалі. Мілы мой Эжэн, памерці — гэта ж больш не бачыць іх. Там, куды адыходзяць усе, я буду сумаваць.

Расстанне з дзецьмі — вось пакута для бацькі, і я ўжо рыхтаваў сябе да гэтага адразу ж, як яны выйшлі замуж. Вуліца Жусьен была сапраўдным раем! Дарэчы, калі я траплю ў рай, ці змагу я, як дух, вярнуцца на зямлю і быць з імі разам? Я чуў размовы пра такое. Праўда гэта ці не? Вось і зараз я быццам перад вачыма бачу, якімі яны былі, калі мы жылі на вуліцы Жусьен. Кожны ранак дочкі сыходзілі ўніз і казалі: «Добрай раніцы, тата». Я садзіў іх на калені, смяшыў, жартаваў. Яны былі такія ласкавыя са мною. Штодзень мы снедалі і абедалі разам, — адным словам, я адчуваў сябе бацькам, я меў вялікую асалоду ад блізкасці маіх дзяцей. Калі мы жылі на вуліцы Жусьен, яны не мудрагелілі, нічога яшчэ не разумелі ў жыцці і вельмі любілі мяне. Божа мой! Чаму яны не засталіся маленькімі назаўжды? (О-о-х! Мая галава расколваецца ад болю!) Вой, вой! Даруйце мне, мае дзеткі, мне вельмі баліць. Значыць, гэта па-сапраўднаму нясцерпна, бо вы ж прывучылі мяне цярпець боль. Божа мой! Толькі б патрымаць іх рукі ў сваіх, і я б не адчуваў ніякага болю. Як вы думаеце, яны прыйдуць? Крыстоф такі дурны! Лепш бы я сам пайшоў. А то не я, а ён убачыць іх. Во-ось! Учора вы былі на балі. Раскажыце мне пра іх, як яны там выглядалі. Канечне, яны нічога не ведалі пра маю хваробу? А то, пэўна, бедныя дзяўчаткі не змаглі б танцаваць! Я не хачу больш хварэць. Я ім яшчэ вельмі патрэбны. Іх багацце пад пагрозай. Якім мужам яны дасталіся! Вылечыце мяне! Вылечыце! Ох, як мне баліць! Вой, вой, вой! Вы самі бачыце, нельга мяне не вылечыць: ім патрэбны грошы, а я ведаю, куды паехаць, дзе іх можна зарабіць. Я паеду ў Адэсу рабіць чысты крухмал. Я кемлівы, я нажыву на гэтай справе мільёны. Ох, як мне блага!

Некалькі хвілін Гар'ё маўчаў, відаць, стараючыся перамагчы свой боль.

— Калі б яны былі тут, я б не скардзіўся, — сказаў ён. — Навошта было б мне скардзіцца?

Ён задрамаў. Вярнуўся Крыстоф. Расціньяк думаў, што Гар'ё спіць, і не спыніў Крыстофа, які пачаў гучна расказваць аб тым, як ён выканаў даручэнне.

— Месье, спачатку я прыйшоў да графіні, але ніяк не змог пагутарыць з ёю: у яе сёння вялікая сварка з мужам. Я настойваў, тады выйшаў сам граф і сказаў мне: «Ну дык што з таго, што месье Гар'ё памірае? Памірае і добра робіць. Мне трэба скончыць з графіняй важныя справы,

яна прыедзе, як усё скончыцца». Мабыць, ён быў не ў гуморы. Я ўжо сабраўся дадому, калі графіня выйшла ў пярэдні пакой, сам не памятаю праз якія дзверы, і сказала: «Крыстофе, перадай бацьку, што ў мяне з мужам сварка, я не магу адлучыцца: справа ідзе аб жыцці і смерці маіх дзяцей. Як усё скончыцца, я прыеду». А што датычыцца баранэсы, дык тут іншая гісторыя! Я зусім не бачыў яе, так што і гаварыць не давялося, толькі пакаёўка сказала мне: «Ах, баранэса вярнулася з балю а шостай гадзіне і зараз спіць. Калі разбуджу яе раней дванаццаці, яна будзе моцна сварыцца. Вось пазвоніць мне, тады я і скажу ёй, што бацьку зрабілася горш. Благую вестку сказаць заўсёды паспееш». Як я не стараўся, усё дарэмна. Прасіў пагаварыць з баронам, але яго не было дома.

— Дык не прыедзе ніводная з дачок? — усклікнуў Расціньяк. — Зараз я напішу абедзвюм.

— Ніводная! — азваўся стары, прыўзнімаючыся на ложку. — У іх справы, яны спяць, яны не прыедуць. Я так і ведаў. Толькі паміраючы, спазнаеш, што такое дзеці. Ах, мой сябра, не жаніцеся, не заводзьце дзяцей! Вы дорыце ім жыццё, а яны вам — смерць. Вы адкрываеце ім шлях у свет, а яны зжываюць вас са свету! Не прыйдуць! Мне гэта вядома ўжо дзесяць гадоў. Я неаднойчы прызнаваўся сабе ў гэтым, але не асмельваўся паверыць.

У куточкі яго чырвоных павек скаціліся дзве слязы, ды так і застылі.

— Эх, калі б я быў багаты, калі б не аддаў ім свае грошы, а захаваў у сябе, яны былі б тут, і мае шчокі блішчэлі б ад пацалункаў. Я жыў бы ў асабняку, у цудоўных пакоях, я меў бы прыслугу, мне было б цёпла. Мае дочкі прыйшлі б у слязах, а з імі разам — мужы і дзеці. Так бы яно й было! А цяпер я не маю нічога. За грошы купіш усё, нават дочак. О, грошы мае, дзе вы?! Калі б я пакінуў у спадчыну вялікія скарбы, мае дочкі даглядалі б мяне, лячылі, я чуў бы іх і бачыў. Ах, мой сыночак, маё адзінае дзіця, мне лепш быць беспрытульным жабраком. Ва ўсякім разе, калі любяць жабрака, ён можа быць упэўнены, што яго любяць проста так. Не, я хацеў бы быць багатым, каб бачыць іх. Хоць адкуль ведаць? У іх у абедзвюх каменныя сэрцы. Я занадта любіў іх, каб яны палюбілі мяне. Бацька абавязкова павінен быць багаты, ён павінен трымаць дзяцей у цуглях, як наравістых коней. А я кленчыў перад імі. Нягодніцы!

Гэта вартае завяршэнне адносін да мяне за апошнія дзесяць гадоў. Калі б вы ведалі, якія ўважлівыя былі яны да мяне ў першыя гады замужжа! (О, як мне баліць!) Я даў кожнай дачцэ пасагу па восемсот тысяч франкаў. У той час ім і іх мужам было няёмка ставіцца да мяне з непавагай. Мяне прымалі ветліва: «Мілы тата, сядайце сюды. Дарагі тата, сядзьце лепш там». Для мяне заўсёды стаяў прыбор на стале. Зяці адносіліся да мяне пачціва, і я абедаў разам з імі. Яны думалі, што ў мяне яшчэ нешта засталося. Адкуль, не ведаю. Я ніколі не гутарыў з імі пра свае справы. Але калі чалавек дае пасагу восемсот тысяч, яго варта дагледзець. І за мною глядзелі як маглі, вядома, дзеля маіх грошай. Людзі вельмі непрыглядныя. Колькі я на іх нагледзеўся! Мяне вазілі ў экіпажы па тэатрах, і на вечарынах я сядзеў у іх даволі. Яны прызнавалі мяне сваім бацькам, падкрэслівалі: «Мы твае дочкі». Але я не дурань, я ўсё бачыў. Гэта пранізвала мне сэрца. Я добра бачыў, што ўсё гэта прытворства, аднак дапамагчы майму гору ніяк не мог. У іх я адчуваў сябе не так вольна, як тут, з вамі, унізе, за сталом. Там я не ведаў, што і як сказаць. Здаралася, хто-небудзь з велікасвецкіх іхніх гасцей пытаўся на вуха ў маіх зяцёў:

— А гэта хто такі?

— Гэта бацька — залаты мяшок, багатыр.

— Ах ты д'ябал... — чулася ў адказ, і на мяне глядзелі з павагай... за мае грошы. Вядома, здаралася, што я ім замінаў, але я заўсёды загладжваў свае недахопы. Хіба ж існуюць людзі без недахопаў? (Мая галава — суцэльная рана!) Зараз я так пакутую, што можна памерці ад адных гэтых пакут, але гэта не можа параўнацца з тым болем, які прычыніла мне Анастазі адным сваім позіркам, калі я сказаў глупства і зганьбіў яе. Ад гэтага позірку ў мяне кроў адхлынула ад сэрца. Мне захацелася даведацца, што за прычына, але я даведаўся толькі адно: я лішні на гэтай зямлі. Каб суцешыцца, я пайшоў на другі дзень да Дэльфіны, але і там схібіў таксама. Ад гэтага я нібы звар'яцеў. Цэлы тыдзень я не ведаў, што мне рабіць: пайсці да іх я не асмельваўся, паколькі баяўся папрокаў, і здарылася, што дзверы іх дамоў зачыніліся перада мною. Божа мой, божа! Толькі ты адзін ведаеш, колькі я перажыў пакут, гора. Ты адзін вёў падлік маіх цяжкіх ран за ўвесь гэты час, які так мяне змяніў, састарыў, пакрыў сівізной, зусім забіў. Чаму ж ты прымушаеш мяне пакутаваць зараз? Я цалкам выкупіў свой грэх —

сваю празмерную любоў. Яны жорстка адплацілі мне за маё пачуццё — быццам каты, яны рвалі маё цела абцугамі. Што зробіш! Бацькі — такія дурні! Я так моцна любіў дачок, што мяне заўсёды цягнула да іх, як іграка за картачны стол. Дочкі былі маёй звадай, замянялі мне каханак — яны былі для мяне ўсім! Абедзвюм чаго-небудзь хацелася, нейкіх каштоўных цацак, пакаёўкі гаварылі мне аб гэтым, і я дарыў, каб яны лепей мяне прымалі. Усё ж такі дочкі далі мне некалькі ўрокаў, як трымаць сябе са свецкімі людзьмі, але яны не сталі чакаць вынікаў, а пачалі чырванець за мяне. Так, так, вось і давай сваім дзецям добрае выхаванне! Не мог жа я ў маім узросце пайсці ў школу. (Божа, які дзікі боль! Урачоў! Урачоў! Калі мне распатлашаць галаву, мне зробіцца лягчэй!) Дачушкі мае, Анастазі, Дэльфіна! Я хачу іх бачыць! Пашліце за імі жандараў, прывядзіце іх сілай! За мною правасуддзе, за мною ўсё — прырода, грамадзянскія законы. Я пратэстую. Калі бацькоў будуць таптаць нагамі, айчына загіне, гэта відавочна. Грамадства, увесь свет трымаецца на бацьках, усё разваліцца, калі дзеці перастануць любіць сваіх бацькоў. О, толькі б убачыць іх, пачуць, усё роўна, што яны будуць гаварыць, галоўнае, каб я чуў іх галасы, асабліва Дэльфіны, гэта палегчыла б мае пакуты. Але калі яны будуць тут, папрасіце іх не глядзець на мяне так холадна, як яны звычайна пазіраюць. Ах, добры мой сябра, месье Эжэн, вы не ведаеце, як робіцца балюча, калі бачыш, як золата, якое нядаўна блішчэла ў позірку, раптоўна ператвараецца ў шэры свінец. З таго дня, як іх вочы перасталі грэць мяне сваімі промнямі, для мяне тут назаўсёды надышла зіма, мне нічога не заставалася, як глытаць горыч крыўды. І я глытаў! Я жыў, каб цярпець адны толькі прыніжэнні ды знявагі. Я так любіў абедзвюх, што трываў усе крыўды, за іх я купляў у іх ганебную маленькую радасць. Каб бацька крадком бачыў сваіх дачок! Я аддаў ім усё сваё жыццё, а яны сёння не хочуць аддаць мне хаця б гадзіну. Мяне мучыць смага, голад, у сярэдзіне гарыць, а яны не прыйдуць, каб аблегчыць маю агонію, — я ж паміраю, я адчуваю гэта. Напэўна, яны не разумеюць, што такое прайсці нагамі па трупе свайго бацькі! Ёсць бог на небе, і ён помсціць за нас, бацькоў, без нашага ведама. Не, яны прыйдуць! Прыйдзіце, мае міленькія, прыйдзіце яшчэ раз пацалаваць мяне, дайце замест перадсмяротнага прычасця апошні пацалунак бацьку, ён будзе маліць бога

за вас, скажа яму, што вы былі добрымі дочкамі, будзе вашым абаронцам перад ім! У рэшце рэшт вашай віны тут няма. Сябра мой, яны не вінаватыя. Скажыце гэта ўсяму свету, каб не асуджалі іх з-за мяне. Гэта мой грэх! Я сам прывучыў іх таптаць мяне нагамі. Мне гэта падабалася. Але да гэтага няма справы нікому, ні чалавечаму, ні божаму правасуддзю. Бог будзе несправядлівы, калі пакарае іх за мяне. Я не здолеў паставіць сябе належным чынам, я зрабіў такое глупства, што адмовіўся ад сваіх правоў. Я ж абясцэніў сябе дзеля іх! Чаго ж вы хочаце! Самая лепшая натура, самая лепшая душа не ўтрымалася б, спакусілася б такой бацькоўскай слабасцю. Я нікчэмны чалавек і пакараны справядліва. Адзін я быў прычынай разбэшчанасці дачок: я іх распесціў. Цяпер яны патрабуюць асалоды, як раней патрабавалі цукерак. Я патураў усім іхнім дзявочым капрызам. У пятнаццаць гадоў яны мелі ўласны выезд! Ні ў чым я не мог ім адмовіць. Вінаваты адзін я, але ўся віна ў маёй любові да іх. Галасы дачок хапалі мяне за сэрца. Я чую іх зараз, яны ідуць. О так, яны прыйдуць. Закон патрабуе наведаць бацьку, калі той памірае, закон за мяне. Ды й гэта не вымагае выдаткаў, акрамя грошай на рамізніка. Я заплачу за яго. Напішыце ім, што я магу пакінуць мільёны! Слова гонару! Я паеду ў Адэсу рабіць вермішэль. Я ведаю, як яе рабіць. З маім праектам можна зарабіць мільёны. Да гэтага яшчэ ніхто не дапяў. Пры перавозцы вермішэль не псуецца, як збожжа або мука. Так! Так! А крухмал?! У ім мільёны! Вы не схлусіце, калі скажаце: мільёны. Калі нават яны прыйдуць ад сквапнасці, — лепей я падмануся, але іх убачу. Я патрабую, каб мае дочкі з'явіліся сюды! Я іх стварыў! Яны мае! — сказаў ён, узнімаючыся на ложку і паварочваючы да Эжэна галаву з сівымі раскудлачанымі валасамі і з пагрозлівым выразам у кожнай рысачцы твару.

— Ну-ну, ляжце, мілы татачка Гар'ё, зараз я напішу ім, — угаворваў яго Эжэн. — Як толькі вернецца Б'яншон, я сам пайду да іх, калі яны не прыедуць.

— Калі не прыедуць? — паўтарыў стары, рыдаючы. — Але ж я памру, памру ў прыступе вар'яцтва, так, вар'яцтва! Я ўжо вар'яцею. Я зараз бачу перад сабою ўсё маё жыццё. Мяне ашукалі! Яны мяне не любяць і не любілі ніколі! Гэта ясна. Раз ужо яны не прыйшлі, то й не прыйдуць. Чым больш яны будуць марудзіць, тым цяжэй ім будзе наважыцца парадаваць мяне. Я гэта ведаю. Яны

ніколі не адчувалі ні маіх турбот, ні маіх пакут, ні маіх патрэб — не адчуюць і таго, што я паміраю. Ім незразумелая нават таямніца маёй пяшчоты да іх. Але, я гэта бачу, яны прывыклі браць у мяне, і таму ўсё, што я рабіў для іх, страчвала цану. Захацелі б яны выкалаць мне вочы, я адказаў бы: «Ваша ласка, каліце!» Я зусім здурнеў. Яны думаюць, што ўсе бацькі такія дурні, як я. Трэба заўсёды трымаць сябе ў цане. Іх дзеці адплоцяць ім за мяне. Дзеля саміх сябе яны павінны прыйсці. Папярэдзьце іх, што яны рыхтуюць сабе такі ж смяротны час. Адным гэтым злачынствам яны робяць усе злачынствы, якія толькі можна ўявіць. Ідзіце ж, скажыце ім, што іх адмова прыйсці — бацьказабойства! За імі і так даволі злачынстваў. Крыкніце ім вось так: «Гэй, Назі! Гэй, Дэльфіна! Наведайце вашага бацьку, — ён быў такі добры з вамі, а цяпер яму блага». Нічога і нікога... Няўжо я здохну як сабака? Занядбаны ўсімі — вось мая ўзнагарода. Злачынцы! Сараматніцы! Яны агідныя мне, я праклінаю іх, я буду начамі ўставаць з труны і паўтараць свае праклёны, ці ж я ў рэшце рэшт не маю рацыю, сябры мае? Яны ж кепска паступаюць са мною, ці не так, га? Што гэта я кажу? Вы ж сказалі, што Дэльфіна тут! Яна лепшая за сваю сястру. Так, так, Эжэне, сыночак мой! Любіце яе, замяніце ёй бацьку. Яе сястра вельмі няшчасная. А іх багацце! Божа мой, божа! Настаў канец, вельмі ж мне баліць! Адрэжце мне галаву, пакіньце толькі сэрца.

— Крыстоф, схадзіце за Б'яншонам і прывядзіце рамізніка, — крыкнуў Эжэн, спалоханы енкамі і скаргамі старога. — Мілы татачка Гар'ё, я зараз паеду за вашымі дочкамі і прывязу іх.

— Сілаю, сілаю! Патрабуйце гвардыю, войска, усё, усё! — усклікнуў стары, кінуўшы на Эжэна апошні позірк, у якім яшчэ быў розум. — Скажыце ўраду, пракурору, каб іх прывялі да мяне, я патрабую гэтага!

— Вы ж праклялі іх!

— Хто вам сказаў? — здзіўлена запытаўся стары. — Вы ж выдатна ведаеце, як моцна я іх люблю! Я папраўлюся, калі ўбачу іх. Ідзіце, мой суседзе, дарагі мой сынку, ідзіце, вы добры. Хацелася б мне вас аддзячыць, ды няма чаго мне даць, акрамя бласлаўлення паміраючага. Ах, толькі б убачыць Дэльфіну, папрасіць яе ўзнагародзіць вас. Калі старэйшая не можа, то прывязіце мне Дэльфіну. Скажыце ёй, што калі яна не прыедзе, то вы разлюбіце яе. Яна так любіць вас, што прыедзе. Вады,

дайце мне вады! Усё гарыць усярэдзіне. Пакладзіце мне што-небудзь на галаву — найлепш руку дачкі, — я адчуваю, што гэта б выратавала мяне. Божа мой! Калі мяне не стане, хто ж верне ім багацце? Хачу ехаць у Адэсу дзеля іх... у Адэсу, рабіць вермішэль...

— Піце, — сказаў Эжэн, прыўзнімаючы паміраючага левай рукай, а правай трымаючы кубак з адварам.

— Вось вы, напэўна, любіце вашых бацьку й маці! — гаварыў стары, сціскаючы сваімі слабымі рукамі руку Эжэна. — Вы разумееце, што я памру, не ўбачыўшы маіх дачок. Я дзесяць гадоў абмяжоўваў сябе ў ядзе і ў вадзе. Зяці загубілі маіх дачок. Сапраўды, пасля таго як яны выйшлі замуж, я страціў іх. Бацькі, патрабуйце ад палат, каб яны выдалі закон аб шлюбе! Не выдавайце замуж дачок, калі вы іх любіце. Зяць — гэта нягоднік, які бэсціць душу дачкі, апаганьвае ўсё. Не трэба шлюбаў! Шлюб забірае нашых дачок, і калі мы паміраем, іх няма побач з намі. Абараніце законам правы бацькоў, якія паміраюць. Тое, што адбываецца, — проста жах! Я патрабую помсты! Гэта мае зяці не дазваляюць ім прыйсці. Забіце іх! Смерць гэтаму Рэсто, смерць эльзасцу, яны мае забойцы! Смерць вам, калі не адпусціце дачок! Канец! Я паміраю, не пабачыўшы іх! Іх! Прыйдзіце ж, Назі, Фіфіна! Ваш тата адыходзіць...

— Мілы мой Гар'ё, супакойцеся, ляжыце ціха, не хвалюйцеся, не думайце.

— Не бачыць іх — вось агонія!

— Вы хутка ўбачыце іх.

— Праўда?! — усклікнуў стары, трацячы прытомнасць. — О, бачыць іх! Я іх убачу, пачую іх галасы. Я памру шчаслівым. Ды я і не хачу больш жыць, жыццём сваім не даражыў, мае пакуты ўсё памнажаліся. Але бачыць іх, дакрануцца да іх сукенак, толькі да сукенак, гэта ж такая дробязь! Адчуць іх у чым-небудзь! Дайце мне памацаць іх валасы... вала...

Ён упаў галавой на падушку, быццам яго ўдарылі доўбняй. Рукі яго заторгаліся па коўдры, нібы ён шукаў валасы сваіх дачок.

— Я іх бласлаўляю, бласлаўляю, — з намаганнем выгаварыў ён і адразу ж страціў прытомнасць.

У гэту хвіліну ўвайшоў Б'яншон.

— Я сустрэў Крыстофа, зараз ён прывядзе табе карэту, — сказаў Б'яншон.

Затым ён агледзеў хворага, падняў яму павека, і абодва студэнты ўбачылі патухлае, пазбаўленае жыцця вока.

— Мне падаецца, што ён больш не апрытомнее, — заўважыў студэнт-медык.

Б'яншон памацаў пульс у старога, затым паклаў руку яму на сэрца.

— Рухавік працуе, але ў яго стане — гэта няшчасце. Лепш бы ён памёр!

— Так, сапраўды, — адказаў Расціньяк.

— Што з табой? Ты бледны як смерць.

— Толькі што я чуў такія стогны, такія енкі душы. Але ёсць жа бог! О так, бог ёсць і зробіць наш свет лепшым, інакш уся наша зямля — недарэчнасць. Калі б усё гэта было не так трагічна, я заліўся б слязамі, але жах скаваў мне грудзі і сэрца.

— Паслухай, яшчэ многа чаго спатрэбіцца, адкуль нам узяць грошы?

Расціньяк зірнуў на гадзіннік.

— Вазьмі і залажы яго хутчэй. Я не хачу затрымлівацца па дарозе, каб не страціць ні хвіліны, чакаю толькі Крыстофа. У мяне няма ні шэлега, рамізніку давядзецца заплаціць пасля вяртання.

Расціньяк збег уніз па лесвіцы і паехаў на вуліцу Эльдэр, да графіні дэ Рэсто. Дарогаю, пад уздзеяннем жудаснага відовішча, сведкаю якога ён толькі што быў, у ім разгарэлася абурэнне. Увайшоўшы ў пярэдні пакой, Эжэн спытаў графіню дэ Рэсто, але пачуў у адказ, што яна не прымае.

— Я прыехаў па даручэнні яе бацькі, ён памірае, — заявіў Эжэн лёкаю.

— Месье, граф загадаў нам самым строгім чынам...

— Калі граф дэ Рэсто дома, перадайце яму, у якім стане знаходзіцца яго цесць, і скажыце, што мне неабходна тэрмінова перамовіцца з ім.

Эжэну давялося чакаць доўга. «Магчыма, у гэту хвіліну стары памірае», — падумаў ён.

Нарэшце лёкай правёў яго ў першую гасцёўню, дзе граф дэ Рэсто, стоячы каля няпаленага каміна, чакаў Эжэна, але не прапанаваў яму сесці.

— Граф, — звярнуўся да яго Расціньяк, — ваш цесць памірае ў бруднай каморцы, і ў яго няма ні шэлега, каб купіць дроў. Ён памірае сапраўды і хоча пабачыцца з дачкой...

— Месье дэ Расціньяк, як вы маглі заўважыць, я не адчуваю асаблівай пяшчоты да спадара Гар'ё, — холадна адказаў граф дэ Рэсто. — Ён злоўжываў становішчам бацькі графіні дэ Рэсто, ён зрабіўся няшчасцем майго жыцця, я гляджу на яго як на парушальніка майго спакою. Памрэ ён ці застанецца жыць — мне ўсё роўна. Вось мае асабістыя пачуцці да яго. Няхай людзі папракаюць, мяне іх думка не цікавіць. Зараз я павінен скончыць вельмі важныя справы, а не займацца тым, што будуць думаць пра мяне дурні або людзі, да якіх я абыякавы. Што датычыць графіні дэ Рэсто, яна не можа паехаць. Да таго ж, я не хацеў бы, каб яна пакідала дом. Перадайце яе бацьку, што як толькі яна выканае свае абавязкі ў дачыненні да мяне і майго дзіцяці, яна наведае яго. Калі яна любіць свайго бацьку, то можа быць свабоднай праз некалькі секунд.

— Граф, не мне меркаваць аб вашых паводзінах, вы — галава вашай сям'і, але ці магу я разлічваць на ваша слова? У такім выпадку абяцайце мне толькі сказаць графіні, што яе бацька не пражыве і дня і праклянў ужо яе за тое, што яе няма каля яго ложка.

— Скажыце гэта ёй самі, — адказаў дэ Рэсто, крануты пачуццём абурэння, якое гучала ў голасе Эжэна.

У суправаджэнні графа Расціньяк увайшоў у гасцёўню, дзе графіня звычайна бавіла час. Яна сядзела, закінуўшы галаву на спінку крэсла, уся ў слязах, быццам прысуджаная да смерці. Эжэну зрабілася шкада яе. Перад тым як паглядзець на Расціньяка, яна кінула на мужа нясмелы позірк, які сведчыў аб поўным заняпадзе яе сіл, зломленых фізічнай і маральнай тыраніяй. Граф кіўнуў, і яна зразумела, што ён дазваляе ёй гаварыць.

— Месье, я ўсё чула. Скажыце тату, што ён прабачыў бы мяне, калі б ведаў, у якім я становішчы. Я не магла сабе ўявіць такой пакуты, яна вышэй маіх сіл, але я буду супраціўляцца да канца, — сказала яна, звяртаючыся да мужа. — Я маці!.. Перадайце тату, што я сапраўды не вінаватая перад ім, хоць з боку гэта выглядае не так, — у роспачы крыкнула яна Эжэну.

Расціньяк, здагадваючыся аб тым, які страшэнны пералом адбываўся ў яе душы, адбіў ім паклоны і пайшоў узрушаны. Тон графа дэ Рэсто ясна сведчыў аб марнасці намаганняў Эжэна, і ён зразумеў, што Анастазі страціла свабоду.

Ён кінуўся да мадам дэ Нусінген і знайшоў яе ў ложку.

— Я, мой сябра, хворая, — прамовіла яна. — Я застудзілася, вяртаючыся з балю, баюся, што падхапіла запаленне лёгкіх, і чакаю ўрача...

— Нават калі б вы стаялі адной нагой у магіле, вы хоць на карачках, хоць паўзком павінны з'явіцца да бацькі, — перапыніў яе Эжэн. — Ён кліча вас! Калі б вы пачулі хоць слабенькі яго крык, куды б падзелася ўся ваша хвароба.

— Эжэне, мабыць, бацька не такі ўжо хворы, як вы кажаце, аднак я была б у адчаі, калі б хоць крышку страціла ў вашых вачах, і буду рабіць так, як вы хочаце. Але я ведаю, што ён памрэ ад гора, калі мая хвароба зробіцца смяротнай пасля выезду. Добра! Я паеду, як толькі з'явіцца ўрач... О-о! Куды знік ваш гадзіннік? — запытала яна, заўважыўшы адсутнасць ланцужка.

Расціньяк пачырванеў.

— Эжэн! Эжэн, калі вы згубілі яго, прадалі... о, гэта было б нядобра!

Эжэн нахіліўся над ложкам і сказаў на вуха Дэльфіне:

— Вам карціць ведаць? Добра! Дык ведайце: вашаму бацьку нават няма за што купіць саван, у які яго загорнуць сёння вечарам. Я заклаў гадзіннік, у мяне больш нічога няма.

Дэльфіна ўмомант выслізнула з ложка, падбегла да сакрэтніка, дастала кашалёк і падала яго Расціньяку. Пасля пазваніла і крыкнула:

— Эжэн, я еду, еду! Дайце мне час, каб апрануцца. Так, я была б пачварай! Ідзіце, я прыеду раней за вас! Тэрэза, — паклікала яна пакаёўку, — папрасіце спадара дэ Нусінгена тэрмінова падняцца да мяне, мне трэба з ім пагаварыць.

Эжэн адчуваў сябе шчаслівым ад таго, што ён абвесціць смяротна хвораму бацьку аб хуткім прыездзе адной з дачок, і вярнуўся на вуліцу Нёў-Сент-Жэнеўеў амаль што вясёлы. Ён пачаў шукаць у кашальку, каб заплаціць рамізніку: у кашальку такой маладой, такой багатай, такой вытанчанай жанчыны знайшлося толькі семдзесят франкаў. Узняўшыся наверх, Эжэн убачыў, што Б'яншон падтрымлівае бацьку Гар'ё, а фельчар са шпіталя нешта робіць над старым пад наглядам урача. Старому прыпякалі спіну распаленым жалезам — апошні сродак медыцынскай навукі, апошні і бескарысны.

— Вы што-небудзь адчуваеце? — пытаўся ўрач у Гар'ё.

Але замест адказу бацька Гар'ё, заўважыўшы Эжэна, спытаў:

— Яны едуць, праўда?

— Можа, ён і выкараскаецца, паколькі ён яшчэ здольны размаўляць, — заўважыў фельчар.

— Так, за мною едзе Дэльфіна, — адказаў старому Эжэн.

— Слухай! Ён увесь час гаварыў пра дачок, патрабаваў іх да сябе і крычаў так, як, згодна паданням, крычалі пасаджаныя на кол, просячы вады.

— Даволі, — сказаў урач фельчару, — тут нічога больш не зробіш, выратаваць яго немагчыма.

Б'яншон з фельчарам зноў паклалі хворага на смярдзючы ложак.

— Усё ж такі трэба было б змяніць бялізну, — заўважыў урач. — Відавочна, што надзеі няма, але ж трэба паважаць годнасць чалавека. Я яшчэ прыйду, Б'яншон, — сказаў ён студэнту. — Калі хворы будзе зноў скардзіцца, прыкладзіце опіум да дыяфрагмы.

Фельчар і ўрач пайшлі.

— Чуеш, Эжэне, не падай, мой сябра, духам! — сказаў Б'яншон Расціньяку, калі яны засталіся ўдвух. — Зараз толькі трэба надзець яму чыстую кашулю і змяніць пасцельную бялізну. Схадзі скажы Сільвіі, каб яна прынесла прасціны і дапамагла нам.

Эжэн спусціўся ў сталовую, мадам Ваке і Сільвія ўжо накрывалі на стол. Не паспеў ён звярнуцца да Сільвіі, як да яго падышла ўдава з кісла-салодкім выглядам абачлівай гандляркі, якой не хочацца мець выдаткаў і пакрыўдзіць пакупніка.

— Дарагі мой месье Эжэн, — пачала яна, — вы ж ведаеце не горш за мяне, што ў бацькі Гар'ё няма больш ні шэлега. Калі чалавек вось-вось аддасць богу душу, даваць яму прасціны — значыць страціць іх, а і без гэтага давядзецца ахвяраваць адну на саван. Вы мне і так павінны сто сорак чатыры франкі, дадайце яшчэ сорак за прасціны ды яшчэ крышку за розныя іншыя дробязі, за тое, што Сільвія дасць вам яшчэ свечку, — усё разам складзе не менш двухсот франкаў, а такой беднай удаве, як я, губляць іх не варта. Будзьце справядлівыя, месье Эжэн, даволі я страціла за гэтыя пяць дзён, калі пасыпаліся на мяне ўсе няшчасці. Я сама дала б дзесяць экю, каб толькі наш старэнькі з'ехаў у тэрмін, як вы мне абяцалі. А гэткая непрыемнасць б'е па ўсіх маіх жыха-

рах. Паколькі за гэта не бяруць грошы, дык лепш адпраўлю я яго ў шпіталь. Уявіце сябе на маім месцы. Мая ўстанова — самае галоўнае для мяне, я ёй жыву.

Расціньяк хуценька падняўся да Гар'ё.

— Б'яншон, дзе грошы за гадзіннік?

— Там, на стале; засталося трыста шэсцьдзесят з лішкам. Я расплаціўся дакладна за ўсё, што браў сам. Квітанцыя ляжыць там жа.

— Давайце разлічымся з вамі, мадам Ваке, — сказаў Расціньяк з пачуццём агіды, зноў спусціўшыся па лесвіцы, — месье Гар'ё доўга не застанецца ў вас...

— Але, хутка нябогу вынесуць уперад нагамі, — не то сумна, не то радасна прамовіла яна, пералічваючы дзвесце франкаў.

— Спынім гэтую размову, — сказаў Расціньяк.

— Сільвія, дайце прасціны і ідзіце наверх, дапамажыце. Не забудзьце аддзячыць Сільвіі, — шапнула на вуха Эжэну ўдава Ваке, — яна не спіць ужо другую ноч.

Як толькі Расціньяк пайшоў, старая падбегла да кухаркі.

— Вазьмі пераніцаваныя прасціны, за нумарам восем. Даруй мне, Ісусе, для нябожчыка сыдуць і такія, — шапнула яна ёй на вуха. Эжэн падняўся ўжо на некалькі прыступак і таму не пачуў гэтых слоў гаспадыні.

— Слухай, — сказаў яму Б'яншон, — давай зменім яму кашулю. Патрымай яго.

Эжэн стаў каля галавы, падтрымліваючы паміраючага старога, а Б'яншон зняў з яго кашулю. Стары хапаўся за грудзі, быццам імкнуўся нешта на іх утрымаць, і застагнаў жаласна, працягла, як стогнуць жывёлы ад моцнага болю.

— Ой-вой! — успомніў Б'яншон. — Ён патрабуе, каб яму вярнулі ланцужок, сплецены з валасоў, і медальён, які мы знялі, калі рабілі прыпяканні. Небарака! Трэба зноў надзець яму гэты медальён. Ён там, на каміне.

Эжэн узяў з каміна ланцужок, сплецены з папялістых валасоў, — напэўна, з валасоў мадам Гар'ё. На адным баку медальёна ён прачытаў: «Анастазі», на другім — «Дэльфіна». Сімвал сэрца бацькі Гар'ё заўсёды спачываў на яго грудзях. Усярэдзіне ляжалі тонкія валасы, састрыжаныя ў самым раннім дзяцінстве ў абедзвюх дачок. Як толькі медальён датыкнуўся да яго грудзей, стары адгукнуўся цяжкім працяглым уздыхам, які выказваў задавальненне, жахлівае для тых, хто пры гэтым пры-

сутнічаў. У гэтым уздыху чуўся апошні водгук бацькоўскай пяшчоты, якая, здавалася, сыходзіла некуды ўсярэдзіну, у невядомы нам цэнтр — крыніцу і сховішча чалавечых сімпатый. Хваравітая радасць мільгнула на твары, знявечаным сутаргай. Абодва студэнты былі ўражаныя гэтай жудаснай успышкай вялікага пачуцця, якое перажыло думку, і не змаглі стрымацца: іх цёплыя слёзы ўпалі на старога, а ён адказаў на гэта гучным крыкам радасці:

— Назі! Фіфіна!

— Ён яшчэ крыху пажыве, — прамовіў Б'яншон.

— А навошта яму гэта? — заўважыла Сільвія.

— Каб пакутаваць, — адказаў Расціньяк.

Зрабіўшы знак сябру, каб той дапамагаў, Б'яншон укленчыў і падсунуў рукі пад ногі старога, а тым часам Расціньяк, стаўшы на калені з другога боку ложка, прасунуў рукі пад спіну хворага. Сільвія чакала, пакуль старога паднімуць, каб змяніць прасціны. Гар'ё, мабыць, падмануты слязамі маладых людзей, з апошніх сіл працягваў рукі і, намацаўшы з абодвух бакоў ложка галовы студэнтаў, ухапіўся за іх валасы, парывіста ўсклікнуў: «Ах, анёлачкі мае!» Пры гэтых словах душа яго адляцела ў іншы свет.

— Бедны чалавека, — прамовіла Сільвія, зачараваная гэтым воклічам, у якім прагучала самае высокае пачуццё, асветленае ў самы апошні момант гэтым жахлівым, зусім ненаўмысным падманам.

Апошні ўздых старога быў, несумненна, уздыхам радасці: у ім адбілася ўсё жыццё бацькі Гар'ё — ён зноў памыліўся.

Бацьку Гар'ё асцярожна паклалі на ложак. З гэтай хвіліны на яго твары хваравіта адбівалася барацьба паміж жыццём і смерцю, якая ішла ў механізме, дзе мозг ужо не дзейнічаў свядома, а менавіта ад гэтага ў чалавечай істоце залежыць пачуццё радасці і суму. Поўнае разбурэнне дзейнасці арганізма было пытаннем толькі часу.

— У такім стане ён прабудзе яшчэ некалькі гадзін, — сказаў Б'яншон, — і смерць наступіць непрыкметна — ён нават не захрыпіць. Відаць, мозг разбураны цалкам.

У гэту хвіліну на лесвіцы пачуліся крокі задыханай маладой жанчыны.

— Яна прыехала, але запозна, — сказаў Расціньяк.

Выявілася, што гэта не Дэльфіна, а яе пакаёўка, Тэрэза.

— Месье Эжэн, — паведаміла яна, — баранэса прасіла ў барона грошай для бацькі, між імі адбылася вялікая сварка. Баранэса самлела, выклікалі ўрача, давялося пусціць ёй кроў. Яна крычала: «Тата памірае, хачу развітацца з татам!» Гэты крык проста раздзіраў душу.

— Хопіць, Тэрэза! Ёй няма сэнсу прыходзіць: месье Гар'ё страціў прытомнасць.

— Бедны наш месье Гар'ё, няўжо яму так блага? — прамовіла Тэрэза.

— Я вам больш не патрэбна, дык пайду гатаваць вячэру, ужо хутка палова пятай, — заявіла Сільвія і ледзь не сутыкнулася на лесвіцы з графіняй дэ Рэсто.

З'яўленне графіні дэ Рэсто ўразіла і жахнула. Яна паглядзела на ложак, слаба асветлены адзінай свечкай, дзе ўжо гаспадарыла смерць, і залілася слязамі, убачыўшы бацькаў твар, падобны на маску, на якой яшчэ ліпелі апошнія проблескі жыцця. Б'яншон з-за сціпласці выйшаў.

— Я не магла вырвацца раней, — сказала графіня Расціньяку.

Эжэн сумна кіўнуў галавой. Графіня ўзяла бацькаву руку і пацалавала яе.

— Тата, даруйце мне! Вы казалі, што мой голас выклікаў бы вас з магілы: дык вярніцеся хоць на імгненне да жыцця, благаславіце мяне. Ваша дачка каецца. Пачуйце мяне. Які жах! Акрамя вас, тут, на зямлі, мне няма ад каго чакаць благаслаўлення! Усе мяне ненавідзяць, адзін вы любіце. Мяне зненавідзяць нават мае дзеці. Вазьміце мяне з сабою, я буду любіць вас, даглядаць вас. Ён ужо не чуе мяне, я не вытрымаю гэтага.

Прыпаўшы да яго ног, яна з вар'яцкім выразам твару глядзела на тое, што засталося ад бацькі.

— Усе беды звалiліся на мяне, — казала яна, звяртаючыся да Расціньяка. — Граф дэ Трай з'ехаў, пакінуўшы вялікія даўгі. Я даведалася, што ён здраджваў мне. Муж не прабачыць мне ніколі, а сваё багацце я аддала яму ў поўнае распараджэнне. Загінулі ўсе мае мары! На вялікі жаль! Дзеля каго я здраджвала адзінаму сэрцу, — яна паказала на бацьку, — якое малілася на мяне! Яго я не прызнала, адштурхнула, з-за мяне ён цярпеў тысячу пакут, — нізкі я чалавек!

— Ён усё ведаў, — адказаў Расціньяк.

Раптам бацька Гар'ё расплюшчыў вочы, але гэта была апошняя сутарга павек. Графіня кінулася да бацькі, і гэтае сузіранне марнае надзеі было такое ж жахлівае, як і позірк паміраючага старога.

— Можа, ён яшчэ чуе мяне! — усклікнула яна, але тут жа адказала сама сабе: — Не, — і села побач з ложкам.

Паколькі графіня дэ Рэсто выказала жаданне пабыць адна з бацькам, Эжэн спусціўся ўніз, каб нешта з'есці. Пансіянеры ўжо сядзелі за сталом.

— Здаецца, там, наверсе, здарыцца невялікая *смерцерама*? — спытаў мастак.

— Шарль, мне падаецца, што вы маглі б абраць для сваіх жартаў менш сумную нагоду, — адказаў Расціньяк.

— Дык што, цяпер нам тут і смяяцца нельга будзе? Б'яншон жа сказаў, што стары ўжо страціў прытомнасць, якая цяпер розніца? — упарціўся мастак.

— Значыць, як ён жыў, так і памрэ, — уставіў слова служачы музея.

— Тата памёр! — закрычала графіня.

Пачуўшы гэты страшэнны крык, Расціньяк, Сільвія, Б'яншон кінуліся наверх і ўбачылі непрытомную графіню. Яны прывялі яе ў прытомнасць і аднеслі ў фіякр, які чакаў на двары. Эжэн даручыў Тэрэзе, каб яна паклапацілася аб графіні і адвезла яе да мадам дэ Нусінген.

— Памёр, — абвясціў Б'яншон, сышоўшы ўніз.

— Ну, спадарства, прашу за стол, а то астыне суп, — запрасіла гаспадыня.

Студэнты селі поруч.

— Што цяпер трэба рабіць? — запытаўся Эжэн у Б'яншона.

— Я заплюшчыў яму вочы і паклаў яго як трэба. Калі ўрач з мэрыі па нашай заяве засведчыць смерць, старога зашыюць у саван і пахаваюць. А што ж, па-вашаму, з ім рабіць?

— Ужо болей ён не будзе нюхаць хлеб такім чынам, — сказаў адзін з нахлебнікаў, скрывіўшы твар, як гэта рабіў стары.

— Кіньце вы нарэшце нагадваць нам пра старога, — не ўтрымаўся рэпетытар. — Ужо добрую гадзіну падносяць нам яго пад рознымі соусамі. Адной з пераваг слаўнага горада Парыжа з'яўляецца магчымасць тут нарадзіцца, пражыць жыццё і памерці незаўважаным. Будзем жа карыстацца падарункамі цывілізацыі. Штодзень у Парыжы памірае шэсцьдзесят чалавек, дык што нам

зараз енчыць з-за кожнага? Бацька Гар'ё аддаў богу душу, дык тым лепш для яго! Калі ён вам такі дарагі, ідзіце і сядзіце побач з ім, а нам дазвольце спакойна паесці.

— Але, сапраўды, для яго лепш, што памёр! — сказала ўдава. — Відаць, у бедалагі было ў жыцці шмат непрыемнасцей!

Гэта была адзіная прамова з нагоды смерці чалавека, які для Эжэна здаваўся ўзорам бацькоўства. Пятнаццаць пансіянераў працягвалі гаманіць як заўсёды. За той час, пакуль Б'яншон і Расціньяк сядзелі за сталом, звон нажоў і відэльцаў, выбухі смеху сярод нястрымнай гаманы, выразы прагнасці да ежы ды абыякавасці да смерці бліжняга, — напоўнілі іх сэрцы ледзяным пачуццём гідлівасці. Сябры пайшлі з пансіёна, каб запрасіць святара да памёршага на начную малітву. Аддаючы нябожчыку апошні доўг, яны вымушаны былі ўлічваць свае сродкі, а іх было небагата. А дзевятай гадзіне вечара, у тым жа бедным пакоі, цела паклалі на збітыя дошкі паміж дзвюх свечак, побач сеў святар. Перад тым як легчы спаць, Расціньяк даведаўся ў святара, колькі будуць каштаваць пахаванне і памінальная імша, напісаў ліст барону дэ Нусінгену і графу дэ Рэсто з просьбай прыслаць сваіх даверaных асоб, каб яны аплацілі выдаткі за пахаванне. Адправіўшы да іх Крыстофа, ён лёг на ложак і, знемагаючы ад стомы, адразу ж заснуў.

Назаўтра Расціньяк і Б'яншон заявілі ў мэрыю аб смерці Гар'ё, і каля дванаццатай гадзіны смерць канстатавалі афіцыйна. Праз дзве гадзіны Расціньяк вымушаны быў сам расплаціцца са святаром, паколькі ад зяцёў з грашыма ніхто не з'явіўся. Сільвія запатрабавала дзесяць франкаў за тое, што падрыхтуе нябожчыка да пахавання і зашые яго ў саван. Эжэн з Б'яншонам падлічылі, і выявілася, што ў іх ледзь хапае сродкаў на пахаванне, калі сваякі нябожчыка не прымуць у гэтым удзелу. Студэнт-медык вырашыў сам пакласці цела ў труну для беднякоў, прывезеную са шпіталя Кашэна, там яе можна было набыць са скідкай.

— Пажартуй над гэтымі скнарамі, — сказаў ён Расціньяку. — Купі гадоў на пяць зямлю на могілках Пэр-Лашэз, закажы службу ў царкве і ў пахавальнай канторы — пахаванне па трэцяму разраду. Калі зяці і дочкі адмовяцца аплаціць выдаткі, загадай, каб высеклі на магільным камяні: «Тут спачывае месье Гар'ё, бацька

графіні дэ Рэсто і баранэсы дэ Нусінген, пахаваны на сродкі двух студэнтаў».

Эжэн зрабіў так, як яму раіў сябра, толькі пасля таго як беспаспяхова наведаў мадам дэ Нусінген і мадам дэ Рэсто. За парог яго не пусцілі. У абодвух месцах швейцары атрымалі вельмі строгія распараджэнні.

— Гаспадары нікога не прымаюць, — казалі яны. — У іх памёр бацька, і яны ў вялікай жалобе.

Эжэн ужо добра ведаў парыжскі свет, каб настойваць. Асабліва сціснула яго сэрца, калі ён пераканаўся, што не зможа трапіць да Дэльфіны. Тады ён напісаў ёй у пакойчыку швейцара наступную запіску:

«Прадайце што-небудзь з вашых каштоўнасцей, каб можна было годна правесці бацьку да месца яго апошняга спачыну!»

Ён запячатаў запіску і папрасіў швейцара аддаць Тэрэзе, каб яна перадала баранэсе, але швейцар перадаў запіску самому барону, а барон кінуў яе ў камін. Зрабіўшы ўсё, што мог, Эжэн вярнуўся пад трэцюю гадзіну ў пансіён і нечакана расплакаўся, убачыўшы каля брамы абы-як абабітую чорнай тканінай труну, што стаяла на двух крэслах на бязлюднай вуліцы. У меднай пасярэбранай місачцы мокла вартае жалю крапіла, але ніхто яшчэ да яго не датыкаўся. Нават на браму не накінулі чорнай тканіны. Гэта была смерць жабрака: смерць без урачыстасці, без родных, без праводзін, без сяброў. Б'яншон, заняты ў шпіталі, прыслаў Расціньяку запіску, дзе паведамлялася, на якіх умовах ён згаварыўся з прычтам. Студэнт-медык пісаў, што на абедню ў іх не хопіць сродкаў, таму давядзецца абмежавацца вячэрняй, больш таннай службай, і што ён паслаў Крыстофа з запіскай у пахавальную кантору. Калі Эжэн скончыў чытаць Б'яншонавы каракулі, ён раптам заўважыў у руках удавы Ваке медальён з залатым абадком, дзе захоўваліся валасы абедзвюх дачок Гар'ё.

— Як вы пасмелі ўзяць гэта? — запытаў ён.

— А што, класці ў магілу разам з нябожчыкам? Гэта ж золата! — запярэчыла Сільвія.

— Ну і што! — папракнуў Расціньяк з абурэннем. — Няхай з сабою забярэ адзіны напамінак аб дочках.

Калі прыехаў жалобны вазок, Эжэн загадаў занесці труну зноў наверх, адбіў вечка і з глыбокай пашанай паклаў на грудзі старому адзінае сведчанне тых часоў, калі Дэльфіна і Анастазі былі юныя, чыстыя, цнатлі-

выя і «не важнічалі», як скардзіўся іхні бацька ў час агоніі.

За жалобным вазком, які вёз няшчаснага бацьку ў царкву Сент-Эцьен-дзю-Мон, што побач з вуліцай Нёў-Сент-Жэнеўеў, ішлі толькі Расціньяк, Крыстоф і два чалавекі з паходнямі. Калі прыехалі, труну з целам паставілі ў цёмным нізкім бакавым алтары. Марна шукаў Расціньяк дачок бацькі Гар'ё або іх мужоў. Ля труны заставаўся толькі ён ды Крыстоф, які лічыў сваім абавязкам аддаць апошнюю пашану чалавеку, які нярэдка даваў яму добры гасцінец. Чакаючы двух святароў, хлопчыка-пеўчага і дзячка, Расціньяк не мог вымавіць ні слова і толькі моўчкі паціснуў руку Крыстофу.

— Так, месье Эжэн, — сказаў Крыстоф, — ён быў добры, сумленны чалавек, ні з кім не спрачаўся, нікому не быў перашкодай, нікога не пакрыўдзіў.

З'явіліся два святары, хлопчык-пеўчы, дзячок і зрабілі ўсё, што можна зрабіць за семдзесят франкаў у такі час, калі царква не настолькі багатая, каб маліцца бясплатна. Клір праспяваў адзін псалом: Libera і De profundis[1]. Уся служба працягвалася хвілін з дваццаць. Была толькі адна жалобная карэта для святара і пеўчага, але яны згадзіліся ўзяць з сабою Эжэна і Крыстофа.

— Павадыроў няма, — сказаў святар, — можна ехаць хутчэй, каб не затрымлівацца, а то ўжо неўзабаве палова шостай.

Але ў тую самую хвіліну, калі труну паставілі на вазок, пад'ехалі дзве карэты з гярбамі, праўда, парожнія — карэта графа дэ Рэсто і карэта барона дэ Нусінгена — і рушылі ўслед за працэсіяй да могілак Пэр-Лашэз. А шостай гадзіне цела бацькі Гар'ё апусцілі ў свежую магілу. Паабапал стаялі выязныя лёкаі абедзвюх дачок, але і яны адразу ж пайшлі разам са святарамі пасля кароткай паніхіды, праспяванай старому за небагатыя студэнцкія грошы. Два магільшчыкі, кінуўшы некалькі рыдлёвак пяску, каб прысыпаць труну, спыніліся. Адзін з іх звярнуўся да Эжэна і папрасіў на віно. Эжэн нічога не знайшоў у сваіх кішэнях і вымушаны быў пазычыць адзін франк у Крыстофа. Пасля гэтага нікчэмнага здарэння Расціньяка агарнула смяротная туга. Дзень згасаў, сырыя прыцемкі ціснулі на нервы. Эжэн зазірнуў у

[1] *«Выратуй мя»* і *«З глыбіні закліках»* (лац.), царкоўныя песнапенні.

магілу і пахаваў у ёй сваю апошнюю юнацкую слязу, цёплую ад агню святых пачуццяў, што гараць у чыстым сэрцы, — адну з тых, што, упаўшы на зямлю, узнімаюцца да нябёс. Ён склаў рукі на грудзях і пачаў глядзець на аблокі. Крыстоф зірнуў на юнака і пайшоў дахаты.

Застаўшыся ў адзіноце, студэнт прайшоў некалькі крокаў да вяршыні ўзгорка, на якім размясціліся могілкі, і ўбачыў увесь Парыж, што выгінаўся ўздоўж Сены і дзе-нідзе пачынаў зіхацець першымі агнямі. Вочы Эжэна спыніліся на прасторы між Вандомскай калонай і купалам Дома інвалідаў: там жыў вышэйшы парыжскі свет, куды яму так хацелася трапіць. Эжэн прагна агледзеў гэты гаманлівы вулей, нібы адчуваючы наперад смак яго мёду, і з пагардаю сказаў:

— А цяпер пабачым, хто каго!

І, кінуўшы свой выклік грамадству, ён для пачатку пайшоў вячэраць да мадам дэ Нусінген.

Сашэ, верасень 1834 года.

ЗМЕСТ

Габсэк. *Аповесць. Пераклад У. Палупанава* 5

Бацька Гар'ё. *Раман. Пераклад У. Палупанава і А. Дынько* 64

Літаратурна-мастацкае выданне

Школьная бібліятэка

Анарэ дэ БАЛЬЗАК

ГАБСЭК

Аповесць

БАЦЬКА ГАР'Ё

Раман

Рэдактар *Л. М. Цяляк*
Мастацкі рэдактар *Ю. Ц. Цярэшчанка*
Тэхнічны рэдактар *Г. Ф. Дуброўская*
Карэктар *Дж. Р. Лосік*

Здадзена ў набор 16.06.96. Падпісана да друку 25.10.96. Фармат $84\times108^{1}/_{32}$. Папера друкарская. Гарнітура школьная. Афсетны друк. Ум. друк. арк. 15,96. Ум. фарб.-адб. 16,38. Ул.-выд. арк. 17,55. Тыраж 15 000 экз. Зак. 1322.

Выдавецтва «Юнацтва» Дзяржаўнага камітэта Рэспублікі Беларусь па друку. Ліцэнзія ЛВ № 7. 220600, Мінск, Машэрава, 11.

Друкарня выдавецтва «Беларускі Дом друку». 220013, Мінск, пр. Ф. Скарыны, 79.

ШКОЛЬНАЯ БІБЛІЯТЭКА

«Бальзак быў адзін з першых сярод лепшых...

...Усе яго кнігі ўтвараюць адну кнігу, кнігу жывую, бліскучую, глыбокую, дзе жыве і рухаецца страшная, жудасная і разам з тым рэальная наша сучаснасць...»

Віктор Гюго

МІНСК «ЮНАЦТВА» 1996